НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.:

праблемы, здабыткі, перспектывы

Мінск
«Беларуская навука»
2006

УДК 930:94(476)«17/19»
ББК 63(4Беи)
Г51

А ў т а р ы:

Н. В. Анофранка, А. У. Ерашэвіч, А. Л. Кіштымаў,
Д. Ч. Матвейчык, Я. П. Насытка, М. А. Сакалова,
С. С. Рудовіч, А. М. Філатава, У. Г. Філякоў,
А. У. Унучак, В. В. Яноўская

Н а в у к о в ы р э д а к т а р:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Яноўская

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук,
прафесар В. А. Фядосік;
кандыдат гістарычных навук А. Б. Доўнар

Г51 **Гістарыяграфія** гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 447 с.

ISBN 985-08-0761-X.

У манаграфіі даецца аналіз тэарэтычных падыходаў да вывучэння ключавых праблем гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. У якасці іх абраны: тэрыторыя і насельніцтва; нацыянальная і саслоўная палітыка царскага ўрада ў Беларусі (1772–1860 гг.); ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі; рынак Беларусі; гістарыяграфічныя і метадалагічныя праблемы вывучэння грамадскіх рухаў Беларусі ў XIX ст.; гісторыя жанчын (канец XVIII – першая палова XIX ст.); беларуская культура ў кантэксце развіцця славянскіх культур; некаторыя праблемы канфесійнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. і стан сучаснай айчыннай гістарыяграфіі па канфесійнай гісторыі ў цэлым; беларускі нацыянальны рух у пачатку XX ст.

УДК 930:94(476)«17/19»
ББК 63(4Беи)

ISBN 985-08-0761-X

© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2006

УСТУП

Зусім не выпадкова ў пачатку XXI стагоддзя мы вырашылі звярнуцца да аналізу стану сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. Цяжка знайсці ў гісторыі гістарычнай навукі Беларусі яшчэ адно такое дзесяцігоддзе (маюцца на ўвазе 90-я гады XX ст.), якое б нарадзіла такі вялікі і супярэчлівы ўсплеск думак і меркаванняў пра беларускую мінуўшчыну. У выніку – песімістычны «дыягназ», які быў пастаўлены многімі айчыннымі і зарубежнымі гісторыкамі, аб «глыбокім крызісе беларускай гістарычнай навукі»[1].

Выбіраючы праблемы для навуковага аналізу, мы імкнуліся зыходзіць з іх навуковай, а не палітычнай значнасці. Разам з тым, мы разумеем, што цалкам пераадолець палітызацыю пры абмеркаванні навуковых праблем, як бы мы не імкнуліся да «захавання навуковай прыроды гістарычнага даследавання»[2], яшчэ нікому не ўдавалася. Заўсёды знойдуцца апаненты, што прытрымліваюцца іншых поглядаў і «знойдуць» такую палітыку ў тваіх творах, аб чым ты нават і не здагадваўся.

Шмат гадоў кожны з аўтараў гэтай кнігі прысвяціў вывучэнню адпаведнай праблемы, перш чым адважыцца зрабіць яе гістарыяграфічны аналіз, даць парады перспектыўнага напрамку развіцця. Высновы і ацэнкі нарадзіліся не толькі на падставе навуковага аналізу шматлікай замежнай і айчыннай літаратуры (як сучаснай, так і больш ранняга перыяду), але і прайшлі верыфікацыю архіўным і іншым дакументальным матэрыялам. Тым не менш, мы не імкнемся стаць «апошняй інстанцыяй» і не лічым, што нашы думкі, якія выказаны ў гэтай кнізе па той ці іншай навуковай праблеме, не могуць падвяргацца сумненням. Зусім не. Наша мэта – не спыніць дыскусіі, а наадварот – распачаць іх, зрабіць больш прадметнымі. Але не ў якасці палітычных спрэчак з навешваннем абразлівых «ярлыкоў», з дзяленнем гісторыкаў на «нацыянальных», «прапрэзідэнцкіх» і гэтак далей, а ў якасці заці-

каўленых, высокапрафесійных навуковых дыялогаў. Няхай замежныя (у тым ліку і расійскія) гісторыкі лічаць, што нам, беларусам, «не хапае гісторыі», але ж мы ведаем, што гэта не так. Ёсць у нас свая багатая і цікавая гісторыя, ёсць свае гістарычныя традыцыі, у тым ліку і навуковыя. Ёсць і свае перспектывы пазнання гісторыі. Прачытайце нашу кнігу і Вы пераканаецеся ў гэтым.

---

[1] Пытанне аб стане сучаснай айчыннай гістарыяграфіі неаднаразова абмяркоўвалася на навуковых канферэнцыях рознага кшталту на працягу апошніх пятнаццаці гадоў. Першай канферэнцыяй па гэтым пытанні ў XXI ст. стала навукова-тэарэтычная канферэнцыя, што адбылася ў Гродна 19–21 студзеня 2001 г. Падрабязней гл.: Гістарычны альманах. Гародня, 2001. Т. 4.

[2] Касцюк М. П. Палітызаваная гісторыя не можа быць сапраўднай навукай // Голас Радзімы. 1996. 8 жн.

Раздзел 1

ТЭРЫТОРЫЯ І НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў АЦЭНКАХ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

1.1. Тэрытарыяльная палітыка ўрада Расійскай імперыі

К пачатку XX ст. склалася канцэпцыя тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі. У тэарэтычным плане яе паспрабаваў разгледзець Л. Ціхаміраў, на думку якога гэтая палітыка павінна быць адным з галоўных клопатаў дзяржавы. У якасці свайго папярэдніка ён называў Б. Чычэріна, які лічыў, што «важнейшая задача тэрытарыяльнай палітыкі заключаецца ў тым, каб дзяржава атрымала прыродныя граніцы. Яны даюць яму і абарону супраць знешніх ворагаў, і ўнутраную замкнутасць, і сувязь частак. Пры гэтым дзяржава не можа іграць сусветнай ролі, калі не мае марскіх граніц»[1]. Практычна гэтага ж прытрымліваецца і Л. Ціхаміраў. Па яго канцэпцыі «естественные границы» звязаны з той замкнёнасцю, якая патрэбна для адзінства і сілы дзяржавы. А вось марскія межы даюць сувязь з сусветам і ўнутраную закрытую нацыю ўводзяць у міжнароднае жыццё.

Важным момантам канцэпцыі аўтара з'яўляецца такі аспект, як «законченность». Пакуль дзяржава не дасягнула канчатковых межаў, яе тэрытарыяльная палітыка лічыцца не завершанай, не дасягнуўшай канчатковых мэт. У адносінах да Расіі Л. Ціхаміраў лічыў, што яе тэрытарыяльная палітыка, якая пачалася з Рурыкавічаў, не была завершана да пачатку XX ст.[2].

На думку сучасных расійскіх даследчыкаў паняцце «тэрытарыяльная палітыка», якое пачало ўжывацца ў XIX ст., з'яўляецца больш вузкім аналагам «геапалітыкі». Так, А. Елацкоў даў шэраг інтэрпрэтацый паняцця «геапалітыка». Сярод іх: навука аб залежнасці палітыкі ад геаграфічных фактараў; кіраўніцтва геапрасторай; палітычная барацьба ў геаграфічным выразе; асобны метад даследавання; глабальны ўзровень палітычнай геаграфіі і інш. Ён вылучыў этапы нараджэння і станаўлення геапалітычнай думкі. Згодна яго перыядызацыі, XVIII ст. – пятроўска-кацярынінскі этап, які звязаны з рэалізацыяй шматлікіх геапалітычных імкненняў Расіі, еўрапеізацыяй, а таксама расколам думкі на кансер-

ватыўную і радыкальна-заходніцкую, але асобныя геапалітычныя ідэі ў гэты час яшчэ не складваліся ў канцэпцыі. Наступны этап быў звязаны з вайной 1812–1815 гг., якая аказала значны ўплыў на развіццё геапалітычнай думкі і змяніла геапалітычнае становішча Расіі ў Еўропе. Пасля вайны і да сярэдзіны XIX ст. вылучаны этап, для якога характэрны асэнсаванне вынікаў гэтай вайны, дзейнасць дзекабрыстаў, а з 30-х гг. – узнікненне руху славянафільства, акрамя таго абвастрэнне адносін з Англіяй і Францыяй. З сярэдзіны XIX ст. і да пачатку 90-х гг. назіраўся шэраг значных змен у жыцці Расіі, калі ўнутраныя рэформы змянілі геапалітычныя характарыстыкі дзяржавы, адбыўся выхад Расіі да важных «естественных рубежей» на Усходзе і Поўдні. І апошні этап – 1890-я гг. XIX ст. – пачатак XX ст. – гэта час, калі Еўропа ўвайшла ў перыяд супрацьстаяння двух блокаў дзяржаў. Менавіта ў канцы гэтага этапа ўзнік і сам тэрмін «геапалітыка»[3].

Сярод сучасных расійскіх даследаванняў выклікае цікавасць праца Б. Міронава[4], які прысвяціў асобную главу тэрытарыяльнай экспансіі імперыі. На яго думку, экспансію Расіі стымулявалі геапалітычныя меркаванні: неабходнасць забеспячэння трывалых межаў, незамярзаючых партоў, перашкоды захопам памежных тэрыторый сапернікамі, або ўключэння іх у сферу свайго ўплыву. Нягледзячы на тое, што ў тыя часы кіруючая эліта разглядала Расію, як ўзаконенага спадкаемца Кіеўскай Русі і Залатой Арды і імкнулася «собрать русские земли» пад скіпетр рускага цара, на думку аўтара, рускія ніколі не зганялі туземнае насельніцтва ў рэзервацыі, не забіралі зямель, не забаранялі міграцыю ні ў імперыі, ні за яе межамі[5].

А. Капелер лічыць, што да канца XIX ст. расійская экспансія вызначалася стратэгічнымі і знешнепалітычнымі меркаваннямі, а не эканамічнымі. На яго думку, экспансія Расіі на захад завяршылася ў 1815 г., а традыцыйнае «собирание русских земель» у гэты час ужо не з'яўлялася першапачатковай рухаючай сілай экспансіі, а толькі служыла мэтам яе легітымізацыі[6].

Патрэбна адзначыць, што ў сучасных даследаваннях працягваюць выкарыстоўваць паняцце «тэрытарыяльная палітыка». Так, А. Рэмнёў дае наступнае яму вызначэнне: «тэрытарыяльная палітыка – гэта рэалізацыя стратэгіі тэрытарыяльнага развіцця краіны з улікам спецыфікі рэгіёнаў»[7]. Але ўсё ж гэта некалькі абмежаванае разуменне такога напрамку палітыкі. У дадзеным канкрэтным выпадку тэрытарыяльная палітыка Расійскай імперыі ўключала некалькі аспектаў. З аднаго боку – гэта знешняя палітыка Расіі XVIII – пачатку XX ст., якая ў шэрагу выпадкаў прыводзіла да

змен граніц дзяржавы і далучэння новых тэрыторый, з другога – трансфармацыя гэтай палітыкі ва ўнутраную, або рэгіянальную палітыку, якая аказвала ўплыў на працягу ўсяго астатняга перыяду існавання імперыі. Адносна заходніх губерняў – гэта польскае пытанне, а таксама напрамкі той палітыкі, у выніку якой была праведзена ўніфікацыя далучаных зямель з цэнтральнымі рэгіёнамі Расіі.

Яшчэ Л. Ціхаміраў адзначаў, што вялікія дзяржавы далучаюць да сваёй тэрыторыі «нярэдка абломкі былой дзяржаўнасці». І менавіта яны ўносяць у дзяржаўнае жыццё мноства элементаў рознадумнасці, сварак і нават унутранай барацьбы[8]. Менавіта такой дзяржавай была Рэч Паспалітая (назва якой трансфармавалася ў XIX–XX стст. у Польшчу). Падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гг.) прывялі да змены заходняй мяжы Расіі: тэрыторыя Беларусі, Літвы, частка Латвіі і правабярэжная Украіна ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Пазней па Тыльзіцкаму міру 1807 г. (паміж Францыяй і Расіяй) ад Прускага каралеўства была адарвана (таксама атрыманая ў выніку гэтых падзелаў) і перададзена ў склад імперыі Беластоцкая вобласць. Уся гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад заходніх губерняў дзяржавы.

Падзеі, што непасрэдна папярэднічалі падзелам Рэчы Паспалітай (Барская і Таргавіцкая канфедэрацыі, паўстанне 1794 г. – у дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі яны вядомыя як тры руска-польскія вайны) і самі падзелы выклікалі вялікую цікавасць з боку даследчыкаў XIX – пачатку XX ст.[9]. У гістарычных даследаваннях прааналізавана знешняя палітыка Расіі, Аўстрыі і Прусіі – галоўных віноўнікаў падзелаў, эвалюцыя грамадскага і палітычнага ладу, канфедэратыўны і паўстанцкі рух у Рэчы Паспалітай, баявыя дзеянні, стварэнне расійскіх органаў улады на далучанай тэрыторыі, асобныя постаці дзеячаў таго часу і інш.

Спрэчным было і застаецца пытанне аб тым, хто павінен у падзелах Рэчы Паспалітай (або Польшчы): Расійская імперыя і Кацярына II, аўстрыйская імперыя і Марыя-Тэрэзія, Прускае каралеўства і Фрыдрых II? Як трапна пісаў польскі гісторык К. Валішэўскі: «Рускія гісторыкі крута, ад кнігі да кнігі, зменьвалі свой погляд на гэтае далікатнае пытанне, то тлумачачы падзел Польшчы законамі этнічных груповак, то, прасцей – законам права моцнага. Гэта адбылося і з самым прыкметным з іх, з Салаўёвым. Нямецкія гісторыкі выбіваліся з сіл, каб ачысціць памяць Фрыдрыха ад абвінавачванняў у тым, што ён быў зачыншчыкам гэтай справы. Але довады іх аспрэчваліся ў Расіі. Адно толькі недвухсэнса-

ва ўстаноўлена і тым і другім бокам – недастойны характар гэтага палітычнага пагадненне»[10].

І на самой справе, не толькі С. Салаўёў, але і Ф. Сміт і іншыя расійскія гісторыкі схіляліся да думкі, што ў падзелах Польшчы была вінавата не Расія, а Прусія. С. Салаўёў бачыў адной з прычын «падения» гэтай дзяржавы – «заваёўніцкія імкненні Прусіі»[11]. На думку Ф. Сміта, у час другога падзелу Кацярына II мела правы на адкрытую вайну, але яна «предпочитая кроткие, мирные меры» вырашыла пайсці на вядомы ў падобных выпадках ў Польшчы сродак – канфедэрацыю[12]. Праўда, наконт таго, што гэта былі мірныя сродкі, не зусім згодзен Н. Кастамараў. Ён пісаў, што ўзятая рускай зброяй польская тэрыторыя, зрабілася «ўласнасцю Расіі па праву захопніка»[13]. Пры гэтым апраўдваліся ў некаторай ступені ваенныя дзеянні тым, што маса рускага народа, што знаходзіўся пад уладай Польшчы, несумненна «желала соединения с Россиею»[14]. Ён адзначаў, што Польшча стала ахвярай палітыкі, якая вызваліла кабінеты суседніх дзяржаў ад неабходнасці кіравацца маральнымі асновамі справядлівасці і дзейнічаць у адпаведнасці з законам[15]. Разам з тым ён лічыў, што падзенне гэтай дзяржавы адазвалася «благодетельными последствиями» для рускага народа[16].

У сваёй прадмове да зборніка дакументаў, прысвечанага знешняй палітыцы Расіі XVIII ст., Ф. Мартэнс прыводзіць словы Кацярыны II аб тым, што ўся палітыка «змяшчаецца ў трох словах: акалічнасць, меркаванне і выпадковасць». Зыходзячы з гэтага ён спрабаваў разгледзець знешнюю палітыку Расіі і яе ўдзел у падзелах. На яго погляд, менавіта выпадковасцю была смерць караля Аўгуста III, але Кацярына II меркавала, што яе ўмяшанне ў справы па выбарах новага караля прывялі б Расію да вайны з Атаманскай імперыяй. Але акалічнасці склаліся так, што Расія аказалася ўцягнутаю ў справы Рэчы Паспалітай[17].

У канцы XIX ст. з'яўляюцца працы гістарыяграфічнага характару, прысвечаныя аналізу думак і меркаванняў папярэднікаў[18]. Аўтары гэтых даследаванняў, характарызуючы палітыку Расіі падчас падзелаў Рэчы Паспалітай, не заўсёды пагаджаліся з імі. Падставай для з'яўлення іншых думак і меркаванняў паслужыў новы погляд на насельніцтва далучаных тэрыторый. Як пісаў А. Пыпін, пасля апошняга «польскага» паўстання 1863–1864 гг. у расійскім грамадстве ўсвядомілі, што заходні край – рускі і патрэбна яго вывучаць і вызваляць рускую народнасць ад чужаземнага прыгнёту[19].

М. Карэеў ускладваў віну за падзелы, у асноўным, на Прусію. Ён адзначаў, што грамадская думка Еўропы спачатку выказвалася за саюз паміж Расіяй і Прусіяй на карысць польскіх дысідэнтаў, якім урад Рэчы Паспалітай адказваў у верацярпімасці. Аўтар спасылаецца на Вальтэра, які знаходзіўся ў перапісцы з галоўнымі дзеячамі першага падзелу, прадстаўляў падзеі часоў Барскай канфедэрацыі, як рэлігійныя войны і лічыў, што суседзі ўвайшлі ў Польшчу па праву, згодна з якім уваходзяць у дом суседа, калі ў ім пажар. Вальтэр пісаў Фрыдрыху II: «гавораць, што падзел Польшчы – ваша справа і я гэтаму ахвотна веру, таму што гэта – рэч геніяльная»[20]. На думку М. Карэева, менавіта інтарэсы прускай манархіі патрабавалі аддзялення ад Польшчы тэрыторыі, якая знаходзілася паміж Заходняй і Усходняй Прусіяй[21].

Вядомы расійскі гісторык М. Каяловіч выступіў супраць ідэалізацыі асобнымі аўтарамі палітыкі Кацярыны II. Асабліва гэта тычылася перыяду першага падзелу Рэчы Паспалітай. Ён лічыў, што Кацярына II пакінула тэрыторыю, якая ўжо была вызвалена ад барскіх канфедэратаў і гайдамакаў пад уладай Польшчы, і толькі ўскосным чынам далучыла да сябе частку Беларусі. Але пры гэтым яна дазволіла Прусіі і Аўстрыі ўзяць бясплатна больш багатыя правінцыі з захаду і паўднёвага захаду. На яго думку, гэта было звязана з «вядомай тэорыяй рэлігійнай верацярпімасці» імператрыцы: абарона Расіяй правоў не толькі праваслаўных, але і пратэстантаў, дазвол ордэну езуітаў дзейнічаць у Беларусі. І замест таго, каб забраць ад Польшчы «рускія вобласці» і абараняць іх ад немцаў, Кацярына II дзейнічала так, што выходзіла наадварот. У той час, як у Беларусі многія дзесяткі тысяч рускага народа з нецярпеннем чакалі аднаўлення рускай ўлады, каб пакінуць гвалтоўна навязаную унію і вярнуцца ў праваслаўе. І толькі ў часы другога і трэцяга падзелаў, лічыць даследчык, Кацярына II дзейнічала ў «чисто русских интересах»[22].

А. Карнілаў адзначаў, што пытанне аб адваяванні старажытных рускіх зямель, як першапачатковай дзяржаўнай задачы, было цалкам вызначана яшчэ пры Іване III[23]. Ф. Кудрынскі вылучыў два галоўныя аспекты знешняй палітыкі Расіі адносна заходніх межаў: першы – вызваленне «православно-русского населения» Польшчы ад каталіцкага панавання, дзеля чаго неабходна было адабраць у яе «древне-русские земли»; другі – неабходнасць дасягнуць «естественных территориальных границ» на поўдні дзяржавы, дзеля чаго патрэбна было забраць у туркаў Крым і паўночныя берагі Чорнага мора. Пры гэтым першы напрамак адзначаўся

як важная царкоўна-нацыянальная справа. На думку аўтара, Расія не магла дапусціць, каб руская нацыянальнасць была расколатай, а яе заходняя частка цярпела ад іншавернага ўрада. Другі напрамак чыста эканамічнага характару, бо руская народная гаспадарка не магла на поўдні развівацца без чарназёмнай стэпавай зоны. Аўтар лічыў, што польскімі і турэцкімі войнамі імператрыца давяла тэрыторыю рускай дзяржавы да сваіх «естественных границ»: на поўдні – да мора, на захадзе – да старой «этнографической черты славянства»[24].

Нягледзячы на некаторыя разыходжанні па асобных пытаннях, гэтыя працы мелі адзіную канцэптуальную аснову – яны выключалі Расію з ліку віноўнікаў падзелаў і разглядалі яе ўдзел у гэтым працэсе як працяг палітыкі збірання рускіх зямель. Такія падыходы з'яўляліся агульнымі для ўсёй дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі, як кансерватыўнага, так і ліберальнага напрамку. Але пастаўленая праблема адказнасці вялікіх дзяржаў за падзелы Рэчы Паспалітай надоўга замацавалася ў гістарыяграфіі і разглядалася рознымі нацыянальнымі школамі ў залежнасці ад іх грамадскіх поглядаў і палітычнага становішча.

У некаторай ступені гэта праблематыка працягвала цікавіць гісторыкаў, якія аказаліся пасля рэвалюцыі 1917 г. у эміграцыі. Так, даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага І. Лапо разгледзеў трансфармацыю назвы «Рэч Паспалітая – Польшча» польскай нацыянальнай партыяй, якая паставіла аднаўленне Айчыны сваёй задачай, але не ў старых рамках (Польшча «Карона»), а ў сэнсе польска-літоўскай Рэчы Паспалітай, пры гэтым ўключаючы і ВКЛ («Літва») у панятце «Польшча». Такім чынам, на думку аўтара, змяняўся сам характар федэратыўнага саюза дзвюх дзяржаў, які існаваў да падзелаў. А на яго месца ставілася ніколі не існаваўшая ў рэчаіснасці адзіная Польшча «от моря до моря». Ён нагадваў, што Кацярына II, пасланнік расійскага двара ў Варшаве князь М. Рэпнін і іншыя кіраўнікі польскай палітыкі добра ведалі, што «з Польшчай жа Літва, як асобная дзяржава ніколі не змешвалася» ні ў сваёй дзяржаўнай тэрыторыі, ні ў сваім самастойным значэнні ў іх федэратыўным саюзе[25]. Д. Адзінец адзначаў, што за перыяд свайго тэрытарыяльнага росту Расіі прыходзілася падпарадкоўваць зброяй іншыя народы. Але гэта былі народы малакультурныя, якія лёгка мірыліся з новай для іх рускай дзяржаўнасцю. У адрозненне ад іх Польшча ўнутры Расіі стала ачагом прыроднага сепаратызму, што аказала ракавы ўплыў на імперскую палітыку рускай улады, псіхалогію народаў і як вынік – на далейшы лёс Расіі[26].

У адрозненне ад дарэвалюцыйных расійскіх гісторыкаў польскія гісторыкі[27] ў розныя часы лічылі галоўнай віноўніцай падзелаў Расію. Але ўжо ў другой палове XIX ст. з'яўляюцца працы, аўтары якіх мелі некалькі іншы пункт гледжання. Так, М. Бобжынскі выказаў думку, што толькі ўнутраны разлад, які пачаўся з XVI ст., давёў Польшчу да страты дзяржаўнага існавання[28]. Дыскусія па гэтай праблеме ажывілася ў час Першай сусветнай вайны і II Рэчы Паспалітай. Менавіта на гэты перыяд прыходзіцца шэраг фундаментальных выданняў, у якіх падрабязна разглядаюцца падзеі часоў Барскай, Таргавіцкай канфедэрацый і паўстання 1794 г. Частка гэтых прац была перавыдадзена ў 90-х гг. XX ст. У іх сутыкаліся два пункты гледжання: 1 – заняпад Польшчы ўваходзіць сваімі каранямі ў XVI ст. і звязаны з заняпадам манархіі; 2 – рашаючым фактарам знішчэння дзяржавы была агрэсія з боку суседніх дзяржаў. Сучасныя польскія гісторыкі лічаць, што сярод пераплеценых паміж сабой знешніх і ўнутраных фактараў не было адзінай прычыны заняпаду Польшчы[29].

Сваю ацэнку польскай палітычнай дактрыне, якая была сфарміравана ў XIX – пачатку XX ст. і падтрымлівалася гістарычнымі аргументамі, даў літоўскі гісторык Д. Сталюнас. Згодна з ёй, піша аўтар, усё, што было звязана з цывілізацыяй і культурай ў Літве, прыпісвалася палякам і польскаму ўплыву. І падкрэсліваючы польскасць гэтых зямель (у той час гэта быў «Западный край» Расіі, а для палякаў – забраныя землі) польскі нацыяналізм у першую чаргу сапернічаў з расійскай гістарычнай дактрынай, якая сцвярджала, што ВКЛ ад яго стварэння да Люблінскай уніі было рускай дзяржавай. І таму літоўскі гістарычны наратыў фарміраваўся, як піша Д. Сталюнас, у яўнай апазіцыі к польскай гістарычнай дактрыне[30].

На думку нямецкага гісторыка М. Мюлера, асноўнай прычынай падзелаў Рэчы Паспалітай была палітыка еўрапейскіх дзяржаў[31]. Амерыканскі даследчык Д. ЛеДонн лічыць, што для расійскай эліты былі не пажаданы падзелы Рэчы Паспалітай, бо яны абмяжоўвалі расійскую прысутнасць толькі ўсходнімі ўскраінамі Рэчы Паспалітай і вымушалі Расію траціць немалыя сродкі на кіраванне і абарону гэтай новай часткі імперыі. У той жа час яны ўзмацнялі ўплыў Прусіі і Аўстрыі ў польскіх цэнтральных рэгіёнах[32].

Савецкая гістарыяграфія гэтай праблемы мізэрная. Афіцыйна ніхто не забараняў даследаванне падзелаў Рэчы Паспалітай, але неафіцыйна рабілася ўсё, каб не дапусціць гісторыкаў да матэрыялаў адпаведных фондаў Архіва знешняй палітыкі Расіі пры МУС

СССР. Лічылася, што ўдзел Расіі ў падзелах – гэта цёмнае пляма яе гісторыі, а таму лепей аб іх не ўспамінаць і не даследаваць[33]. Пры неабходнасці тэма падзелаў уключалася ў розныя падручнікі і кнігі па знешняй палітыцы Расіі, але ў іх адсутнічалі якія-небудзь новыя матэрыялы і ацэнкі ў параўнанні з дарэвалюцыйнай гістарыяграфіяй. І як адзначаў Т. Кручкоўскі, ацэнка гэтай праблемы ў многім супадала з аргументамі рускай кансерватыўнай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пач. XX ст.[34].

Тыповы погляд для савецкай гістарыяграфіі на гэтую праблему, як на карэнны пераварот у лёсе Беларусі, адлюстраваны ў манаграфіі Я. Карнейчыка. Ён пісаў, што ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай і ўз'яднання з Расіяй ажыццявіліся спрадвечныя спадзяванні беларускага народа, а тры адзінакроўныя па сваім паходжанні, блізкія па мове, культуры і тэрыторыі народы аб'ядналіся ў адзінай дзяржаве. Расія ж забяспечыла Беларусі тэрытарыяльную цэласнасць і працяглае мірнае развіццё[35]. Але ўсё ж у «Гісторыі БССР», што было новым для таго часу, былі разгледжаны падзеі часоў Барскай канфедэрацыі. Аўтар гэтага параграфа А. Грыцкевіч вызначыў падзелы Рэчы Паспалітай, як акт «рэакцыйны, тым больш, што ён адбыўся ў абставінах рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Еўропе»[36], што таксама было традыцыйным пунктам гледжання для таго часу.

Новы этап у даследаваннях тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі пачаўся з 90-х гадоў XX ст., калі былі зроблены спробы не толькі сабраць новы фактычны матэрыял, аднавіць стары, але і тэарэтызаваць[37]. Расійскія даследчыкі не забываюць і пра старыя, часоў Расійскай імперыі, думкі, што сведчыць аб іх не змяніўшымся да нашага часу пункце гледжання. Так, лічыцца, што ў ходзе падзелаў Рэчы Паспалітай завяршыўся прагрэсіўны і гістарычна абумоўлены працэс «воссоединения» Беларусі і Украіны з Расіяй і гэта «отвечало воле и закономерностям исторического развития украинского, белорусского и русского народов». Зберагаецца ўсё той жа міф аб тым, што Расія не захоплівала, а вяртала свае землі: «в ходе разделов Польши Россия не приобрела ни пяди национальной польской территории»[38]. Падзелы ж, на думку аўтара, прынеслі новыя ўскладненні і мелі яўна адмоўныя вынікі. А ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе з'явілася польскае пытанне – «праклятае» пытанне ўнутранай і знешняй палітыкі ўсяго XIX ст., Першай і Другой сусветных войн[39].

У сувязі з польскім пытаннем выклікае цікавасць праца Л. Гарызонтава[40], які таксама лічыць, што падзелы Рэчы Паспалітай

і напалеонаўскія войны перавялі расійска-польскія супярэчнасці са знешнепалітычных праблем імперыі ва ўнутрыпалітычныя. На яго думку, з пункту гледжання ўнутранай палітыкі Расіі, польскае пытанне заключалася ва ўсеабдымнай інтэграцыі былых зямель Рэчы Паспалітай ў імперскі арганізм і пераўтварэнні палякаў у вернападданых кіруючай дынастыі. А польская русафобія істотна паўплывала на вобраз Расіі ў вачах Захаду і аказала ўплыў на нацыянальную ідэалогію ўкраінскага і беларускага рухаў. У той час як для другой удзельніцы падзелаў – Аўстрыі – гэтае пытанне не мела такога фундаментальнага значэння[41].

Даследчык П. Стэгній адхіліў распаўсюджаны тэзіс аб тым, што асноўным матывам дзеянняў Кацярыны II у польскім пытанні было вяртанне ў склад Расіі тэрыторый пераважна з праваслаўным насельніцтвам. На яго думку, падобныя настроі былі абсалютна нехарактэрныя для становішча пачатку 1770-х гадоў, калі задумваўся і ажыццяўляўся першы падзел Рэчы Паспалітай. Нацыянальная матывацыя ўдзелу Расіі ў падзелах з'яўляецца толькі ў перыяд другога і трэцяга падзелаў Польшчы[42].

У даследаванні «Западные окраины Российской империи» аўтары ўздымаюць не новую для расійскай гістарыяграфіі думку, аб тым, што Расія не жадала падзелаў. На іх погляд, да першага падзелу Кацярына II разглядала Рэч Паспалітую як кантралюемага саюзніка. І нават пасля другога падзелу, пры ўсім недаверы к палякам, яна яшчэ дапускала магчымасць выкарыстання Рэчы Паспалітай як буфернай дзяржавы. У працы адзначалася, што пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ва Усходняй Еўропе склалася прынцыпова новае геапалітычнае становішча. Імперыі Рамановых, Габзбургаў і Гогенцалернаў пачалі непасрэдна гранічыць паміж сабой, а агульны «скелет в шкафу» стаў фактарам, які вызначаў узаемаадносіны трох дзяржаў да іх краху ў выніку Першай сусветнай вайны[43].

А. Камзолава нагадвае, што ў першай палове і нават у сярэдзіне XIX ст. губерні на тэрыторыі ВКЛ называліся «губерниями, от Польши возвращенными». Новая ўласнасць Расіі не разглядалася ў якасці асобнай, гістарычна сфарміраванай этнічнай адзінкі, як Царства Польскае або Княства Фінляндскае. Як правіла, піша аўтар, гэтыя тэрыторыі ўключаліся ў паняцце «прародительской вотчины» рускіх цароў, адарванай іншай дзяржавай – Польшчай, а затым зноў вернутыя[44].

Разам з тым, сучасная расійская гістарыяграфія адзначае, што для краю, які дэкларатыўна абвяшчаўся «древним достоянием»

Расіі, Літва, Беларусь, ды і Правабярэжная Украіна нават да сярэдзіны XIX ст. былі недастаткова інтэгрыраваны ў структуры імперскага кіравання, і яшчэ меней – імперскага мыслення. Эканамічны, сацыяльны і культурны ўплыў вышэйшага польскамоўнага слоя, сцвярджае М. Даўбілаў, надаваў гэтым землям «обескураживающе «инакий» облик»[45].

Беларускія гісторыкі[46] звярнулі ўвагу на дадзеную праблему ў пачатку 90-х гг. XX ст. У сувязі з тым, што ў беларускай гістарыяграфіі гэтая праблема амаль не распрацоўвалася і патрэбен быў час для яе вывучэння, аўтары карысталіся ў асноўным дарэвалюцыйнымі расійскімі і польскімі выданнямі. Гэтыя артыкулы і даследаванні цікавыя сваім фактычным матэрыялам. Але зробленыя аўтарамі высновы не з'яўляюцца новымі, яны хутчэй традыцыйныя. Нягледзячы на гэта, нельга пагадзіцца з некаторымі катэгарычнымі выказваннямі Я. Анішчанкі наконт характарыстыкі беларускай гістарыяграфіі паўстання 1794 г., што «нацыянальная беларуская гістарыяграфія яшчэ не выбілася з кампілятыўна-аглядных схем асвятлення паўстання на ўласных землях і простага пераказу ўжо вядомага»[47]. Для таго, каб зрабіць новыя і цікавыя высновы, патрэбен дастаткова працяглы час для рознабаковага вывучэння праблемы, і на сённяшні дзень гэты працэс яшчэ не завершаны.

Я. Анішчанка прапаноўвае змяніць канцэпцыю анархіі ў Рэчы Паспалітай на больш, на яго думку, рэчаісную: з боку знешніх прычын – гэта прага да гегемоніі ў Рэчы Паспалітай зацікаўленых суседзяў, пераважна Расіі; з боку ўнутраных – барацьба за дамінаванне ў краіне пэўных магнацкіх колаў, якія не былі стабільнымі[48]. Аўтар, ускладваючы віну за падзелы на Расію, выказаў зусім не новыя думкі. Яны традыцыйныя для польскай гістарыяграфіі XIX – пач. XX ст. Я. Анішчанка, разглядаючы галоўным чынам адзін аспект – умяшанне Расіі ва ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай – робіць высновы па знешняй палітыцы Расіі ў цэлым.

В. Швед пісаў аб тым, што страта незалежнасці Рэччу Паспалітай адбывалася па адным сцэнарыі: дыпламатычныя перамовы з будучымі захопнікамі; стварэнне там прарасійскіх канфедэрацый; увод расійскіх войск на тэрыторыю Рэчы Паспалітай; анексія зямель Беларусі; легалізацыя апошняга на сейме; прысяга насельніцтва захопленых зямель расійскаму імператару. А Беларусь апынулася паміж Польшчай, якая ўвасабляла заходнюю цывілізацыю і яе вольнасці, і Расіяй, якая ўяўляла сабою ўсходні, азіяцкі дэспатызм[49].

Арыгінальнай, па пастаноўцы тэмы, з'яўляецца кандыдацкая праца М. Заікіна. Ён адзначыў, што пры вызначэнні памераў тэрыторыі пры падзелах Рэчы Паспалітай Расія, Аўстрыя і Прусія кіраваліся крытэрыем «равных долей» і «равных сил». Гэты падыход у пачатку XIX ст. складаў аснову тэорыі «естественных границ». У той жа час Расія імкнулася да прынцыпу «округления границ», пад якім падразумявалася неабходнасць набыцця тэрыторыі, якая забяспечвала ёй стратэгічную ініцыятыву пры ваенных дзеяннях. Пры гэтым усталяванне граніц пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай па вялікіх і судаходных рэках (Заходняя Дзвіна і Днепр) было прызнана расійскім бокам памылковым. Новыя межы, як гэта і было зроблена пасля другога падзелу, было вырашана праводзіць па дробных рэках, балотах, цяжкапрахадзімых мясцовасцях[50].

Арганічнай часткай агульнай праблемы з'яўляецца такі аспект, як палітыка царскага ўрада па стварэнні новых органаў улады на далучаных тэрыторыях. Але гістарыяграфія дадзенага пытання невялікая[51]. Каштоўнасць прац П. Жуковіча[52] заключаецца ў вялізным фактычным матэрыяле, што сабраны аўтарам. Матэрыял падаецца храналагічна, у адпаведнасці з паступленнем указаў Кацярыны II і Паўла I. Аўтар адзначаў, што Кацярына II не паспела распаўсюдзіць фактычнае дзеянне сістэмы абласнога судова-адміністрацыйнага кіравання на землі, далучаныя пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, але яна змагла «залажыць грунтоўны фундамент для ўзвядзення сваёй сістэмы»[53]. Сярод іншых даследчыкаў можна адзначыць працы В. Грыгор'ева і Д. Мілюціна[54].

Перыяд рэфармавання тэрыторыі, далучанай пасля трэцяга падзелу, у розных галінах яе жыцця разглядаў Л. Жытковіч[55]. Пераход зямельнай уласнасці пасля падзелаў, асабліва праз падараванні, якія былі зроблены Кацярынай II і Паўлам I разглядаў В. Шмідт[56].

М. Ільяшэвіч, разглядаючы інкарпарацыю зямель «былога беларуска-літоўскага гаспадарства» ў склад Расіі, вылучыў такі напрамак, як дэманстрацыйнае ўпарадкаванне зямель. Кацярына II жадала тут, практычна ў першы раз, выпрабаваць свой праект новага адміністрацыйнага падзелу Расіі. З часоў Кацярыны II, на думку аўтара, імкнучыся да поўнага зліцця далучаных беларускалітоўскіх зямель з іх насельніцтвам, былі намечаны галоўныя вехі расійскай палітыкі. Але нягледзячы на рашучасць і гібкасць сваёй палітыкі, яна не здолела знішчыць гэтыя асаблівасці[57].

Шэраг аспектаў, прысвечаных стварэнню новых органаў кіравання на далучанай тэрыторыі закранае і сучасны даследчык

Я. Анішчанка[58]. У сваіх даследаваннях ён не абыходзіў пытанні палітыкі царскага ўрада на беларускіх землях пасля далучэння да імперыі. Аўтар назваў перыяд 1772–1778 гг. часам русіфікаванага кіравання з аўтарытарна-валявымі метадамі, бо ў гэты перыяд папярэдняе ваяводска-павятовае дзяленне Рэчы Паспалітай было скасавана з мэтай адразу запоўніць усе кіруючыя пасады прамым назначэннем. Аднак жыллёвая неўладкаванасць, кадравая чахарда, залежнасць службовага ўзвышэння ад меркавання вярхоў не прынеслі хуткасці ва ўніфікацыі існуючых парадкаў[59].

Такім чынам, у развіцці гістарыяграфіі па праблеме тэрытарыяльнай палітыкі, якая ў Беларусі цесна звязана з праблемай падзелаў Рэчы Паспалітай можна вылучыць некалькі перыядаў: 1795–1917 гг. – яе дастаткова інтэнсіўнае вывучэнне ў дарэвалюцыйнай расійскай і замежнай гістарыяграфіях; 1918–1990 гг. – гэтыя пытанні вывучаліся ў асноўным за межамі СССР, у значнай ступені ў Польшчы. Савецкая, у тым ліку і беларуская гістарыяграфія, абмяжоўвалася толькі ўключэннем гэтых аспектаў у падручнікі, абапіраючыся на дарэвалюцыйную гістарыяграфію, але з выкарыстаннем марксісцка-ленінскай тэорыі аб класавай барацьбе і станоўчых выніках «воссоединения» тэрыторыі Беларусі з Расіяй. У сучаснай расійскай і польскай гістарыяграфіях адбылося вяртанне да далейшага вывучэння фактычнага матэрыялу. Разам з тым вызначаліся некаторыя спробы яго тэарэтычнага абгрунтавання ў рамках тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі. Але яны, як і ў мінулыя часы, не вельмі цікавяцца спецыфікай беларускай або літоўскай тэрыторыі, захоўваючы погляды мінулых часоў. Нягледзячы на некаторыя зрухі, сучасная беларуская гістарыяграфія ў галіне дадзенай праблемы застаецца ў большасці сваёй на ступені друкавання фактычных матэрыялаў.

---

[1] Цыт. па кн.: Тихомиров Л. А. Монархическая государственность. СПБ., 1992 [упершыню надрукавана у 1905 г.]. С. 633.

[2] Там жа. С. 632, 639.

[3] Елацков А. Отечественная геополитическая мысль: содержание и исторические формы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://politreg.Pu.Ru/work/elatskoval.htm.

[4] Миронов Б. Н. Социальная история России: В 2 т. СПб., 1999. Т. 1. С. 26.

[5] Там жа. С. 20, 26.

[6] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. Возникновение. История. Распад. М., 1997. С. 81.

[7] Ремнев А. В. Региональные параметры имперской «географии власти» (Сибирь и Дальний Восток) // Ab Imperio. 2000. № 3/4. С. 343–358.

[8] Тихомиров Л А. Монархическая государственность. С. 646.

[9] Rulhiér C. C. Histoire de l'anarchie de Pologne et du demembrement de cette republique. Paris, 1807; Raumer F. Polens Untergang. Leipzig, 1832; Гегемейстер Ю. А. О распространении Российского государства с единодержавия Петра I до смерти Александра I. СПб., 1838; Lelewel I. Panowanie króla Polskiego Stanisława Augusta Poniatowskiego. Bruxelle, 1847; Соловьев С. М. История падения Польши. М., 1863; Смитт Ф. Суворов и падение Польши. СПб., 1866; Вяземский П. О политике Фридриха Великого с 1763 по 1775 год. М., 1868; Костомаров Н. И. Последние годы Речи Посполитой. СПб., 1870; Иловайский Д. И. Гродненский сейм 1793 г. М., 1870; Дубровин Н. Накануне первого раздела Польши 1770 гг. // Вестник Европы. 1870. Кн. 7. С. 191–251; Де Пуле М. Станислав-Август в Гродно. Литва в 1794–1797 гг. СПб., 1871; Beer F. Die erste Teilung Polens. Wien, 1873; Bobrzyński M. Dzieje Polski w zarysie. W-wa, 1880; Кареев Н. И. Падение Польши в исторической литературе. СПб., 1888; Кареев Н. И. Польские реформы XVIII века. СПб., 1890; Чечулин Н. Д. Внешняя политика России в начале царствования Екатерины II. СПб., 1896; Ильенко А. К. Начало конца Польши. СПб., 1898; Суворов в сообщениях профессоров Николаевской академии генерального штаба. СПб., 1900; Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. СПб., 1901; Kraszewski J. I. Polska w czasie trzech rożbiorów. 1772–1794. W-wa; Kraków, 1903; Smoleński W. konfederacija targowicka. Kraków, 1903; Значение царствования императрицы Екатерины II для Северо-Западного края. Вильна, 1904; Кудринский Ф. А. Императрица Екатерина II и разделы Польши. Вильно, 1905; Moscicki H. Dzieje porozbiorowie Litwy i Rusi. Wilno, 1911; Lord R. H. The Second Partition of Poland. Cambridge; London, 1915; Корнилов А. А. Русская политика в Польше со времени разделов до начала XX века. Птг., 1915; Moscicki H. Generał Jasiński i powstanie kość iuszkowskie. W-wa, 1917 і інш.

[10] Валишевский К. Роман императрицы. СПб., 1908. С. 397.

[11] Соловьев С. М. История падения Польши. М., 1863. С. 6.

[12] Смитт Ф. Суворов и падение Польши. СПб., 1866. С. 319.

[13] Костомаров Н. И. Последние годы Речи Посполитой. СПб., 1870. С. 860.

[14] Там жа. С. 767.

[15] Там жа. С. 865.

[16] Там жа. С. 870.

[17] Мартенс Ф. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россиею с иностранными державами. СПб., 1875. Т. 2. С. 4–6.

[18] Кареев Н. И. Падение Польши в исторической литературе. СПб., 1888; Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. СПб., 1901.

[19] Пыпин А. Н. История русской этнографии. СПб., 1892. С. 22.

[20] Кареев Н. И. Падение Польши в исторической литературе. С. 65–66.

[21] Там жа. С. 382.

[22] Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. С. 349, 350.

[23] Корнилов А. А. Русская политика в Польше со времени разделов до начала XX века. Птг., 1915. С. 8.

[24] Кудринский Ф. А. Императрица Екатерина II и разделы Польши. Вильно, 1905. С. 89, 96–98.

[25] Лаппо И. И. Западная Россия и ея соединения с Польшей в их историческом прошлом. Прага, 1924. С. 20, 21.

[26] Одинец Д. Национальный вопрос // AB IMPERIO. 2001. № 1–2. С. 328.

[27] Lelewel I. Panowanie króla Polskiego Stanisława Augusta Poniatowskiego. Bruxelle, 1847; Kalinka W. Ostatnie lata panowania Stanisława Augusta. Kraków, 1868; Kraushar A. Książę Repnin i Polska w pierwszym czteroleciu panowania Stanisława Augusta (1764–1768). Kraków, 1879; Bobrzyński M. Dzieje Polski w zarysie. W-wa, 1880; Korzon T. Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764–1794). W-wa, 1898; Kraszewski J. I. Polska w czasie trzech rożbiorów. 1772–1794. W-wa; Kraków, 1903; Smoleński W. Konfederacija targowicka. Kraków, 1903; Moscicki H. Dziej porozbiorowie Litwy i Rusi. Wilno, 1911; Moscicki H. Generał Jasiński i powstanie kość iuszkowskie. W-wa, 1917; Smoleński W. Dzieje narodu polskiego. W-wa, 1921; Kykiel M. Zarys historii wojskowości w Polsce. W-wa, 1922; Zytkowicz L. Litwa i Korona w r. 1794. Wilno, 1937; Konopczyński W. Konfederacij Barska. T. 1, 2. W-wa, 1938; Michalski J. Schzylek konfederacji Barskiej. W-wa, 1970; Копчевский Я. Тадеуш Костюшко. Варшава, 1970; Lord R. N. Drugi rozbior Polski. W-wa, 1984 (пераведзена на польскую мову з англійскай); Wolański A. Wojna polsko-rosyjska 1792 r. W-wa, 1996; Szyndler B. Powstanie kościuszkowskie 1794. W-wa, 1994; Cegielęski T., Rądziela L. Rozbiory Polski: 1772–1793–1795. W-wa, 1999; Grodziński S. Polska w czasach przelomu: 1764–1815. Kraków, 1999; Unia Lubelska i tradycje integracyjne w Europe Środkowo-Wshodniej. Lublin, 1999; Zielińska Z. Studia z dziejów stosunków polsko-rosyjskich w XVIII wieku. W-wa, 2001 і інш.

[28] Bobrzyński M. Dzieje Polski w zarysie. Kraków, 1882. T. 2. S. 336.

[29] Бардах Ю., Леснодорский Б., Пиетрчак М. История государства и права Польши. М., 1980. С. 310.

[30] Сталюнас Д. Имперский режим в Литве в XIX веке (по литовским учебникам истории) // AB IMPERIO. 2002. № 4. С. 369.

[31] Müller M. Die Teilung Polens 1772, 1793, 1795. München, 1984. S. 8.

[32] LeDonne J. The Grand Strategy of the Russian Empire, 1650–1831. New York, 2004. P. 103–105.

[33] История внешней политики России. XVIII век. М., 1998. С. 170.

[34] Кручковский Т. Т. Польская проблематика в русской историографии II пол. XIX века // Наш радавод. Кн. 6 (частка II). Гродна, 1994. С. 376.

[35] Карнейчык Я. Беларуская нацыя. Мн., 1969. С. 38.

[36] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. Мн., 1972. С. 404.

[37] Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы. М., 1997; Имперский строй России в региональном измерении (XIX – начало XX века). М., 1997; Исламов Т. М. Заговор против Польши. О роли русско-прусско-австрийского альянса 1772–1773 в разделе польского государства // Польша и Европа в XVIII веке: меж-

дународные и внутренние факторы разделов Речи Посполитой. М., 1999. С. 124–125; Friedrich K. The Other Prussia: Prussia, Poland and Liberty, 1569–1772. New York, 1999; Носов Б. В. Установление российской господства в Речи Посполитой. 1756–1768 гг. М., 2004; Стегний П. В. Разделы Польши и дипломатия Екатерины II. 1772. 1793. 1795. М., 2002; LeDonne J. The Grand Strategy of the Russian Empire, 1650–1831. New York, 2004; Западные окраины Российской империи. М., 2006 і інш.

[38] История внешней политики России. XVIII век. М., 1998. С. 196, 197.

[39] Там жа.

[40] Горизонтов Л. Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. М., 1999.

[41] Там жа. С. 8, 9.

[42] Стегний П. В. Разделы Польши и дипломатия Екатерины II. С. 140–141.

[43] Западные окраины Российской империи. С. 67, 72, 73.

[44] Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 4.

[45] Долбилов Михаил. Культурная идиома возрождения России как фактор имперской политики в Северо-Западном крае в 1863–1865 гг. // AB IMPERIO. 2001. № 1–2. С. 230.

[46] Юхо Я. А. За вольнасць нашу і вашу. Мн., 1990; Філатава А. Тры падзелы Рэчы Паспалітай // Крыжовы шлях. Мн., 1993. С. 96–117; Емельянчык У. Паланез для касінераў. Мн., 1994; Емельянчык У., Юхо Я. А. «Нарадзіўся я ліцвінам...»: Тадэвуш Касцюшка. Мн., 1994; Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гродна, 2001; Анішчанка Я. Інкарпарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мн., 2003; Гісторыя Беларусі. Мн., 2004. Т. 3; Анішчанка Я. Палітычная гісторыя часоў падзелаў Рэчы Паспалітай. Мн., 2006 і інш.

[47] Стогн: Паўстанне 1794 г. новыя дакументы. Мн., 2002.

[48] Анішчанка Я. Палітычная гісторыя часоў падзелаў Рэчы Паспалітай. С. 208.

[49] Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). С. 85–86.

[50] Заикин Н. В. Формирование, охрана и прикрытие западной границы Российской империи (на примере белорусского участка). 1772–1822. Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2005. С. 60, 100.

[51] Гістарыяграфія па асноўных напрамках палітыкі царскага ўрада ў 1772–1860 гг. разгледжана ў іншых параграфах.

[52] Жукович П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II // Журнал министерства народного просвещения (далее ЖМНП). 1914. № 2. С. 265–315; № 3. С. 88–120; № 4. С. 314–355; № 5. С. 1–43; Жукович П. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II // ЖМНП. 1915. № 1. С. 76–109; № 2. С. 257–321; № 5. С. 130–178; Жукович П. Западная Россия в царствование императора Павла I // ЖМНП. 1916. № 6. С. 183–226; № 8. С. 207–263; № 9. С. 186–275.

[53] Жукович П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II // ЖМНП. 1914. № 2. С. 265–315; № 3. С. 88–120; № 4. С. 314–355; № 5. С. 1–43.

[54] Григорьев В. Реформа местного управления при Екатерине II (Учреждение о губерниях 7 ноября 1775 г.). СПб., 1910; Милютин Д. М. Гродно в 1794, 1795 и 1796 г. Гродно, 1905.

[55] Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794-7. Wilno, 1938.

[56] Schmidt W. Geneza prywatnej rosyjskiej własności. W-wa, 1923.

[57] Ільяшэвіч М. Расейская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваньня Кацярыны II і Паўла I. (1772–1801). Вільня, 1933. С. 23.

[58] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне на Беларусі. Мн., 1996; Анішчанка Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II. Мн., 1996; Анищенко Е. К. Черта оседлости. Мн., 1998.

[59] Анішчанка Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II. Мн., 1998. С. 184.

1.2. Колькасць і склад насельніцтва як прадмет гістарычнага даследавання

У дасавецкай літаратуры дэмаграфічная гісторыя Беларусі прадстаўлена ў кантэксце вывучэння народанасельніцтва Расійскай імперыі ў цэлым або яе еўрапейскай часткі. Займацца дадзенай праблемай у вучоных стала магчымым пасля з'яўлення матэрыялаў рэвізій, якія праводзіліся ў Расіі з 1719 па 1858 гады (усяго 10 рэвізій). Рэвізскі ўлік насельніцтва, у параўнанні з тагачаснымі царкоўным і адміністрацыйным, быў найбольш поўным і дакладным. Нягледзячы на тое, што рэвізіі перапісвалі толькі падатныя катэгорыі насельніцтва, іх зводныя матэрыялы – акладныя кнігі і пераліковыя ведамасці – змяшчалі даныя, запазычаныя з адпаведных ведамстваў і аб непадатных саслоўях (дваране, духавенства), унесеныя ў спісы «для аднаго толькі ліку».

Першыя абагуленыя звесткі аб насельніцтве ўсходняй Беларусі паводле 4 рэвізіі (1782 г.) з'явіліся ў публікацыях канца XVIII ст. Так, С. Пляшчэеў прывёў звесткі аб агульнай колькасці насельніцтва Полацкага і Магілёўскага намесніцтваў – адпаведна каля 620,6 і 663,5 тыс. чалавек[1]. Дадзеныя лічбы ўключаюць толькі падатныя катэгорыі, звесткі аб колькасці непадатных саслоўяў у аўтара адсутнічаюць. У працы пералічаны ўсе гарады (23) і найбольш буйныя мястэчкі (6), размешчаныя на дадзенай тэрыторыі, але колькасць жыхароў у іх не прыводзілася. У этнічных адносінах жыхары тут, паводле аўтара, «суть паляки и Литва, римско-католического закона, из которых малое число греческого испо-

ведания и жиды». Палякі, як сцвярджаў С. Пляшчэеў, праваслаўнага, каталіцкага і уніяцкага веравызнання[2].

Даволі поўныя даныя аб колькасці насельніцтва прыводзяцца ў працах А. Шторха «Статыстычны агляд найбольш культурных адносін у намесніцтвах дзяржавы Расійскай» і «Гісторыка-статыстычная карціна Рускай дзяржавы ў канцы XVIII ст.», выдадзеных на нямецкай мове[3]. Ім выкарыстаны не толькі рэвізскія, але і звесткі адміністратыўнага ўліку прывілеяваных саслоўяў, што дазволіла аўтару прыблізіць канчатковую лічбу насельніцтва да рэальнай. Разыходжанні звязаны з недаўлікам дваран і духавенства ў заходніх губернях. Прыблізныя, хаця і недалёкія ад сапраўднасці, прыведзеныя А. Шторхам звесткі аб жаночым поле, якія ён атрымаў шляхам падваення колькасці рэвізскіх (мужчынскіх) душ. Пэўную цікавасць выклікаюць звесткі аб колькасці насельніцтва ў гарадах, відаць, па стану на 1793–1794 гг. Аднак гэтыя дадзеныя можна лічыць прыблізнымі, таму што па большасці гарадоў яны атрыманы, зыходзячы з колькасці дамоў. Так, найбуйнейшым горадам Беларусі, па звестках аўтара, быў Магілёў – 12,5 тыс. жыхароў, а на другім месцы знаходзіўся Віцебск – 11,7 тыс. (даныя па Мінску адсутнічаюць)[4].

У першай палове XIX ст. дэмаграфічныя даследаванні паводле рэвізскай статыстыкі значна пашырыліся. Прычым яны станавіліся больш дасканалымі і грунтоўнымі. Аўтары больш ўвагі засяроджвалі на крыніцазнаўчым аспекце праблемы, спрабавалі даць сваю ацэнку зменам у народанасельніцтве.

У самым пачатку XIX ст. выйшла з друку праца вучонага-металурга, утрымальніка шэрагу металургічных заводаў на Урале І. Германа[5]. Па сутнасці гэта была першая спроба сістэматычнага аналізу ўсіх статыстычных даных 1–5-й рэвізій. У дадзеным выпадку нас найбольш цікавіць пятая (1795 г.), паколькі яна ахапіла ўсе далучаныя да Расійскай імперыі беларускія землі. І тут трэба заўважыць, паколькі праца пісалася ў той час, калі яе канчатковыя вынікі не былі яшчэ ўдакладнены, то лічбы колькасці насельніцтва па ёй у аўтара заніжаны. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, колькасць «прыпісаных» першапачаткова не ўлічаных душ у беларускіх губернях аказалася значнай. І. Герман крытычна ставіўся да рэвізій, лічыў, што іх даныя не вельмі дакладныя нават у адносінах да катэгорый насельніцтва, што падлягалі рэвізскаму ўліку[6].

Значны ўклад у распрацоўку рэвізскай статыстыкі ўнёс вядомы эканаміст К. Герман, праца якога па сённяшні дзень не страціла навуковага значэння[7]. Аўтар аналізаваў лічбавыя даныя па 1–6-й

рэвізіях і яго аналіз адрозніваецца значнай руплівасцю. Знамянальна, што К. Герман выкарыстаў не толькі статыстыку рэвізій, але прыцягнуў да паўнаты свайго даследавання таксама нерэвізскія матэрыялы і даныя іншых аўтараў. Так, насельніцтва Рэчы Паспалітай па стану на 1772 г. ён ацэньваў колькасцю ў 14 млн. чалавек. І адзначаў, што ў выніку трох яе падзелаў Расія атрымала тэрыторыю з насельніцтвам 6381,0 тыс. чалавек[8].

У кнізе К. Германа прыведзены даныя аб колькасці насельніцтва па губернях. Але гэтыя звесткі выклікаюць пярэчанні. Так, параўноўваючы даныя за 1804 і 1810 гг. можна заўважыць, што ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях насельніцтва паменшылася на 137,3 тыс. чалавек[9], але такога, у сапраўднасці, не магло быць. Магчыма гэта звязана з недабраякаснымі дэмаграфічнымі звесткамі, якія ў пачатку XIX ст. збіраліся ў губернскіх канцылярыях. І акрамя таго аўтар не ўлічыў тэрытарыяльных змен, якія адбыліся ў той час. У табліцы аб колькасці і саслоўным складзе насельніцтва прыведзенай аўтарам (прыкладна на 1808–1810 гг.) пазначана 37 гарадоў (на тэрыторыі сучаснай Беларусі) з насельніцтвам 102804 чалавек. Буйнейшыя з іх: Віцебск – 16905, Мінск – 11205, Гродна – 10518 чалавек. На жаль, вызначыць удзельную вагу гарадскога насельніцтва Беларусі немагчыма, бо адсутнічаюць звесткі аб колькасці жыхароў па паветах. Затое маюцца цікавыя пагубернскія даныя аб саслоўным складзе гараджан. Насельніцтва гарадоў пяці заходніх губерняў складалася з мяшчан (63,1%), дваран (6,1), духавенства (1,3), купцоў (1,3), вайскоўцаў (6,9), служыцеляў (чыноўнікаў) (1,6) і іншых (19,7%)[10].

Усё насельніцтва К. Герман падзяляе на дваран, духавенства, сялян (панскіх і дзяржаўных), купцоў, мяшчан і свабодных людзей. Аўтар звярнуў увагу на скарачэнне колькасці дзяржаўных сялян у Віцебскай і Магілёўскай губернях паміж 1782 і 1795 гг. са 104,9 да 71,1 тыс. Ён выказаў абсалютна правільнае меркаванне, «што казённыя сяляне раздадзены памешчыкам»[11]. Сапраўды, гэта быў перыяд масавых раздач дзяржаўных сялян расійскім чыноўнікам, ваенным, вяльможам і іншым чынам.

Вельмі прынцыповым з'яўляецца параўнанне даных 5-й і 6-й рэвізій, што дае магчымасць убачыць дынаміку насельніцтва паміж 1796 і 1811 гг. Асаблівую ўвагу К. Герман удзяліў колькасным зменам сярод сялянскага саслоўя. Пры гэтым пяць заходніх губерняў ён падзяляе на Беларускія (Віцебская, Магілёўская) і Літоўскія (Віленская, Гродзенская, Мінская). У выніку падлікаў аўтара атрымалася, што з 1796 па 1811 гг. народанасельніцтва Ві-

цебскай і Магілёўскай губерняў вырасла толькі на 15310 чал. Каменціруючы дадзеную лічбу ён зазначае: «…у Беларусі народанасельніцтва робіць вельмі марудныя поспехі. Балоцістая зямля, беднасць сялянства, прамысловасць яўрэяў прыпыняюць яго рост і смяротнасць заўсёды была там значна вышэйшай чым у сапраўднай Расіі»[12]. У астатніх трох губернях сітуацыя аказалася іншай – у Віленскай і Гродзенскай сялянскае саслоўе страціла 3867 душ, у Мінскай – 17521, а ўсяго – 51438 душ[13]. Інакш кажучы, страты сялянскага насельніцтва мелі месца на тэрыторыях, далучаных да Расіі пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай.

Ці адпавядала гэта сапраўднасці? На гэтае пытанне можна адказаць адназначна – у пачатку XIX ст., ва ўсялякім выпадку да расійска-французскай вайны 1812 г., рост насельніцтва быў устойліва паступальным. Уся справа заключаецца ў якасці дэмаграфічных крыніц гэтага часу. Шостая рэвізія 1811 г. праводзілася вельмі паспешна з прычыны напружанай міжнароднай абстаноўкі. Але галоўнае ў тым, што праверка яе вынікаў увогуле не праводзілася і вялікая колькасць «прыпісных душ» так і засталася неўлічанай. Іх колькасць, як паказала папярэдняя 5-я рэвізія, была найбольшай менавіта ў гэтых губернях. Прычына – нязвыкласць дадзенага мерапрыемства для жыхароў заходняй часткі Беларусі, якая апынулася ў складзе новай дзяржавы ў першай палове 90-х гадоў XVIII ст. Ва ўсходняй жа частцы Беларусі ў гэтых адносінах быў ужо накоплены пэўны вопыт. Гэтую акалічнасць аўтар нідзе не агаворвае.

Пэўны этап у вывучэнні народанасельніцтва Расійскай імперыі першай паловы XIX ст. звязаны з імем вядомага статыстыка К. Арсеньева. Першая яго праца выйшла ў 1818 г.[14]. У ёй аўтар прыводзіць звесткі ва ўсерасійскім маштабе аб колькасці ўсяго насельніцтва па 1–7-й і асобных яго катэгорый па 6 і 7 рэвізіях. Структура насельніцтва ў аўтара выглядае наступным чынам: дваране, духавенства, вайскоўцы, разначынцы і служачыя, купцы, мяшчане, вольныя людзі, сяляне (панскія, казённыя, удзельныя). Як і яго папярэднікі, К. Арсеньеў не агаворвае прынцыпы групавання стракатага саслоўя сельскіх «обывателей» у адпаведныя катэгорыі сялян і вольных людзей. Беларускі матэрыял у манаграфіі прадстаўлены толькі акругленымі лічбамі насельніцтва па губернях, хутчэй за ўсё па 7-й рэвізіі, хаця ў тэксце прамога ўказання на гэта няма. Разам з тэрыторыяй будучай Ковенскай губерні (да 1842 г. уваходзіла ў склад Віленскай) у пяці заходніх губернях пражывала 5150 тыс. чалавек, у тым ліку ў Беластоцкай вобласці

200 тыс. Акруглены лічбы насельніцтва і па гарадах, якіх ў Беларусі К. Арсеньеў налічыў 41[15].

Другая праца К. Арсеньева «Статистические очерки России» ў роўнай ступені носіць гісторыка-дэмаграфічны і гісторыка-геаграфічны характар[16]. У ёй аўтар упершыню прасачыў змены тэрытарыяльна-адміністрацыйных межаў Расіі з 1710 па 1846 гг. І ў гэтым яе галоўная вартасць. Прыведзеныя звесткі аб колькасці жыхароў Магілёўскага і Полацкага намесніцтваў паводле 4 рэвізіі ў аўтара не новыя, а ўзятыя ў С. Пляшчэева. Дэмаграфічных даных пра Мінскае, Віленскае і Слонімскае намесніцтвы К. Арсеньеў не прывёў, а абмяжоўваўся толькі ўказаннем даты іх утварэння. Адсутнічаюць звесткі і аб колькасці насельніцтва гарадоў.

Выкарыстаны таксама і матэрыялы справаздач губернатараў, на падставе якіх К. Арсеньеў склаў табліцу «Число жителей обоего пола в 1846 году». Паводле яе ў пяці заходніх губернях пражывала 4297633 чал. На жаль, супаставіць дадзеную лічбу з папярэдняй таго ж аўтара па 7-й рэвізіі не магчыма, бо ў 1842 г. была створана Ковенская губерня, і неабходныя для супастаўлення павятовыя даныя ў абедзвюх працах не прыводзяцца.

Неўлік большасцю рэвізій жанчын доўгі час пакідаў адкрытым пытанне аб рэальных суадносінах мужчынскага і жаночага палоў. Каб атрымаць дадзеныя аб агульнай колькасці жыхароў прыходзілася падвойваць лік рэвізскіх душ. Пры гэтым шэраг аўтараў лічылі, што мужчыны ў насельніцтве павінны пераважаць. К. Арсеньеў, аналізуючы матэрыялы 8-й рэвізіі (1833 г.), прыйшоў да іншай высновы: у Расіі на 100 мужчын прыходзілася 102 жанчыны[17]. Далейшыя даследаванні паказалі правільнасць такога вываду. Перавага жаночага полу – характэрная асаблівасць для еўрапейскіх краін не толькі для XIX ст., але і для сённяшняга часу.

Пэўную цікавасць у дэмаграфічных адносінах уяўляе праца, якая была надрукавана ў часопісе Міністэрства ўнутраных спраў у 1843 г. без указання аўтара[18]. Па ўсёй верагоднасці ім з'яўляецца Надзеждзін. У ёй даецца гісторыка-геаграфічная характарыстыка губерняў: утварэнне, змены межаў, унутранае дзяленне, плошча. Найбольш цікавая і інфармацыйная частка прысвечана гарадам і мястэчкам, дзе аўтарам выкарыстаны матэрыялы справаздач губернатараў. Прыведзены лічбы колькасці насельніцтва абодвух полаў (відаць на 1842 г.) у гарадах і буйных мястэчках (звыш 500 жыхароў), а таксама купцоў трох гільдый у гарадах[19].

У вывучэнні народанасельніцтва Расіі першай паловы XIX ст. бадай самае прыкметнае месца належыць выдатнаму вучонаму,

акадэміку РАН П. Кепену. Яго навуковая спадчына – яркі ўзор грунтоўнага, крытычнага выкарыстання шматлікага рэвізскага матэрыялу, умення з веданнем справы праверыць і дапоўніць яго іншымі крыніцамі: звесткамі, атрыманымі з кліравых ведамасцей, Міністэрства дзяржаўнай маёмасці і інш. Усё гэта дало магчымасць аўтару прывесці максімальна дакладныя лічбы насельніцтва паводле 8-й рэвізіі[20]. Прычым, што пададзены яны не толькі па губернях, але і паветах. Так, насельніцтва 37 беларускіх паветаў у 1838 г. складала 1567038 душ м. п., а пяці заходніх губерняў (без Беластоцкай вобласці) – 2344083 рэвізскія душы[21]. Лічбы вельмі блізкія да рэальных, таму што аўтар меў магчымасць максімальна ўлічыць прыпісаных і збеглых, запісаных і пакладзеных у склад ужо пасля рэвізіі.

П. Кепену належыць таксама крыніцазнаўчая праца, прысвечаная супастаўленню асабістых падлікаў з данымі справаздач губернатараў за 1846 г.[22], якія былі апублікаваны[23]. Апошнія не задаволілі вучонага сваёй непаўнатой і вызвалі ў яго справядлівую крытыку. Сапраўды, дадзеныя справаздачы губернатараў значна заніжаны. Паводле іх у 1846 г. насельніцтва пяці заходніх губерняў склала 4297633 чал., П. Кепен называе значна большую лічбу – 4538000, г. зн. на 240367 чал. болей[24]. Высвятленне ісціны застаецца адной з перспектыўных дэмаграфічных праблем.

Матэрыялы апошняй, 10-й рэвізіі (1858 г.) не сталі прадметам шырокага вывучэння. На іх аснове А. Трайніцкім прааналізавана толькі адна катэгорыя насельніцтва – прыгоннае сялянства[25]. Галоўнай заслугай аўтара можна лічыць падрабязнае тлумачэнне прынцыпу аб'яднання дробных груп сельскага насельніцтва ў разрад прыгонных. Разам з тым, пры падліках удзельнай вагі прыгонных сялян А. Трайніцкі няправільна суадносіць яго колькасць па 10-й рэвізіі з лічбай наяўнага насельніцтва, узятай з дадзеных статкамітэтаў, што некалькі заніжае ўдзельную вагу прыгонных.

Па матэрыялах 10-й рэвізіі напісана ўнікальная ў сваім родзе праца аб узроставай структуры насельніцтва 55 губерняў па саслоўях[26]. Звернем увагу на некаторыя асаблівасці. Сярод мяшчан і цэхавых удзельная вага працаздольнай узроставай групы (18–60 год) у Беларусі была некалькі большай – 65,9% супраць 54,9 у сярэднім па Расіі. Затое колькасць дзяцей да 5 год амаль удвая меншай – 6,9% супраць 12,8. Прыкладна тая ж узроставая структура назіралася і ў асяроддзі дзяржаўных сялян: ва ўзростах 18–60 год у Беларусі яны складалі 52,7%, па Расіі – 48,6, да 5 год – адпаведна 13,4 і 18,0%. Перавага працаздольнага ўзросту ў Беларусі ся-

род панскіх сялян і дваравых была менш значнай – 52,9% супраць 51,0. Больш блізкімі былі паказчыкі ўдзельнай вагі дзяцей да 5 год: 14,0% у Беларусі і 15,8% у сярэднім па Расіі. Некалькі меншым у Беларусі быў працэнт панскіх сялян ва ўзросце звыш 60 год: 2,6% супраць 3,6[27].

З дадзеных лічбаў можна зрабіць некаторыя высновы. Па-першае, сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця панскіх сялян Беларусі былі горшымі, што абумовіла іх адносна меншую дажываемасць да сталага ўзросту, па-другое, дзетнасць беларускіх сем'яў падатных саслоўяў была адносна нешматлікай.

Дэмаграфічны крызіс 40–50-х гг. XIX ст., які праявіўся ў зніжэнні ўдзельнай вагі панскіх сялян і тэмпаў росту насельніцтва Расіі ў цэлым, не мог не прыцягнуць увагу тагачасных вучоных. У гэтым сэнсе паказальнай з'яўляецца запіска Г. Галагана «Аб прыгонным стане ў цяперашні час і аб магчымасці яго знішчэння» ад 17 красавіка 1857 г. У ёй гаворыцца: «павелічэнне народанасельніцтва паралізавана ў нашай айчыне найперш прыгонным становішчам. Прыгонныя людзі павялічваюцца вельмі марудна, або колькасна памяншаюцца. Дарэмна шукаюць прычыны скарачэння народа ў многіх маёнтках у знешніх наступствах, г. зн. павальных хваробах і г. д. Павальныя хваробы аднолькава існуюць і для дзяржаўных сялян. Можна толькі сказаць у гэтым выпадку адно, што прыгонныя людзі значна больш падвергнуты такім хваробам з прычыны парушэння арганізма…»[28].

Пэўны рэзананс напярэдадні адмены прыгону мела праца вядомага эканаміста М. Бунге «Изменение сословного состава населения России в промежутках времени между 7 и 8, 8 и 9 рэвізиями»[29]. Аўтар прааналізаваў зрухі, якія адбыліся за 1816–1850 гг. у складзе насельніцтва ў цэлым і ў наступных саслоўных групах: дваран (патомных і служылых), духавенства, купцоў, мяшчан, сялян (панскіх, дзяржаўных, свабодных і ўдзельных), каланістаў і адстаўных салдат. У той час, калі іншыя групы насельніцтва мелі тэндэнцыю да росту, адзначаў аўтар, панскія сяляне з 1834 па 1850 гг. скараціліся як па абсалютнай, так і па ўдзельнай вазе.

Супастаўляючы натуральны прырост насельніцтва па губернях з удзельнай вагой у кожнай з іх панскіх сялян, аўтар выявіў важную акалічнасць. У губернях з высокай удзельнай вагой панскіх сялян прырост насельніцтва быў самы нізкі. Складзеная ім табліца сведчыць, што пяць беларускіх губерняў па прыросце насельніцтва займалі апошняе месца. З 1838 па 1851 гг. у чатырох з іх прырост не перавысіў 1%, а ў Магілёўскай нават на 1% колькасць

насельніцтва паменшылася. У той жа час у дадзеных губернях была самая высокая ўдзельная вага панскіх сялян. Гэта дало падставу М. Бунге зрабіць выснову, што «…скарачэнне колькасці прыгонных сялян не залежала ад пераводу іх у казённае ведамства... Адзіная прычына заключаецца ў пагаршэнні дабрабыту земляробчага насельніцтва, асабліва панскіх сялян. Гэта не галаслоўнае меркаванне але несумненны факт». Так у навуковай літаратуры з'явіўся тэзіс аб выміранні панскай вёскі з-за цяжкіх сацыяльна-эканамічных умоў і, як вынік, – нізкіх тэмпах натуральнага прыросту.

Іншай думкі прытрымліваўся А. Трайніцкі. Не ўступаючы непасрэдна ў палеміку з М. Бунге, ён паспрабаваў абгрунтаваць сваю канцэпцыю скарачэння прыгоннага сялянства. Галоўную прычыну не толькі застою, але і памяншэння колькасці сялян ён бачыў у тым, што калі ўзяцці на ваенную службу «із прыгоннага саслоў'я выключаюцца назаўсёды, прыпісваючыся пасля заканчэння тэрміну службы не толькі асабіста, але і часткай сваіх сем'яў да якога-небудзь свабоднага стану»[30].

І хаця ў другой сваёй працы А. Трайніцкі прызнаваў, што ўмовы натуральнага прыросту прыгонных і ўвесь іх эканамічны быт знаходзіцца ў ненармальным становішчы[31], тым не менш ён заставаўся прыхільнікам канцэпцыі міжсаслоўных пераходаў.

У другой палове XIX ст. пасля адыходу ў небыццё рэвізій, даследаванні па дэмаграфіі Расіі першай паловы XIX ст. амаль спыніліся. Усталяванне адміністрацыйна-паліцэйскага падліку насельніцтва ў якасці галоўнага, значнае ўдасканаленне царкоўнага ўліку праз метрычныя кнігі і кліравыя ведамасці паставілі на павестку дня задачу паказаць ступень дакладнасці ўсіх трох відаў дэмаграфічных крыніц, іх пераемнасці і ўзаемадапаўняльнасці. З'явіўся шэраг прац крыніцазнаўчага характару.

Уступленне Расіі на капіталістычны шлях развіцця, інтэнсіфікацыя палітычнай і гаспадарчай дзейнасці дзяржавы патрабавалі па прыкладу еўрапейскіх краін правядзення навукова арганізаванага перапісу ўсяго наяўнага насельніцтва. Гэта добра ўсведамляла навуковая грамадскасць. Актыўным прыхільнікам агульнага перапісу быў Ю. Янсан, які пераканаўча паказаў яго перавагу над рэвізіямі, усе недахопы якіх ён добра бачыў. Пры гэтым ён неабаснавана рэзка выступіў супраць метадаў правядзення рэвізій і яе вынікаў, лічачы іх зусім непрыдатнымі для вызначэння колькасці насельніцтва і яго саслоўнага складу[32].

Проціглых поглядаў прытрымліваўся ўрач і вучоны М. Экк. Супаставіўшы даныя рэвізій з агульнарасійскімі падлікамі Цэнт-

ральнага статыстычнага камітэта за 1856, 1858, 1863, 1870, 1882, 1883 і 1885 гг. і выкарыстаўшы лічбы сяроднегадавога прыросту, ён упершыню ў навуцы зрабіў выснову аб прыблізна дакладным уліку насельніцтва рэвізіямі і ЦСК. М. Экк адзначыў, што паміж дадзенымі відамі ўліку насельніцтва няма вялікай пропасці, а ёсць заканамерная пераемнасць. Важнай падаецца і заўвага аўтара аб тым, што адміністрацыйна-паліцэйскі ўлік некалькі завышае агульную колькасць насельніцтва[33].

Праца М. Экка была працягнута В. Міхайлоўскім. Маючы ў сваім распараджэнні папярэднія вынікі перапісу 1897 г. і супаставіўшы іх з лічбамі колькасці насельніцтва па 9-й рэвізіі, аўтар атрымаў сяроднегадавы працэнт прыросту, што дазволіла яму паказаць адносную блізкасць вынікаў рэвізій, бягучага адміністрацыйнага падліку і перапісу[34].

У 1915 г. выйшла каштоўная праца П. Жуковіча аб саслоўным складзе насельніцтва 9 заходніх губерняў (тэрыторыя Беларусі, Літвы, Правабярэжнай Украіны) у канцы XVIII ст.[35]. Абапіраючыся пераважна на архіўны матэрыял, ён узнавіў карціну стракатай саслоўнай структуры далучаных зямель, паказаў колькасныя структурныя змены ў насельніцтве, якія адбыліся, на яго думку, пад уздзеяннем палітыкі ўрада. Сацыяльна-эканамічных жа фактараў дэмаграфічных перамяшчэнняў аўтар не заўважыў.

Такім чынам, дарэвалюцыйная літаратура па дэмаграфічнай гісторыі Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі, назапасіла значны вопыт. У навуковы ўжытак было ўведзена шырокае кола крыніц, перш за ўсё матэрыялаў рэвізій, праведзены іх крыніцазнаўчы аналіз. Аднак усе вышэйназваныя працы мелі адзін істотны недахоп – прыведзеныя ў іх лічбы колькасці насельніцтва ў цэлым і па асобных катэгорыях у некаторай ступені заніжаны. А вывучэнне колькасных паказчыкаў асобных саслоўяў толькі пачыналася.

У 20–30-я гг. XX ст. пытанні народанасельніцтва даследаваліся вельмі рэдка. Выдадзеных у гэты час прац, прысвечаных пытанням дынамікі колькасці насельніцтва і яго саслоўна-класавай структуры ў XIX – пач. XX ст., дзе ў той ці іншай ступені фігуруе беларускі матэрыял, ці проста цікавых сваёй грунтоўнасцю, можна назваць усяго некалькі[36]. Манаграфія Я. Волкава «Население СССР за 80 лет», выдадзеная ў 1930 г. гэта адна з першых гісторыка-дэмаграфічных прац у савецкай навуцы. У ёй шмат табліц, дзе па кожнай губерні прыводзяцца лічбы колькасці насельніцтва, пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. Але ў кнізе «закралася» вельмі істотная рэдакцыйная памылка, якая скажае дынаміку насельніцтва

Беларусі і яго агульную колькасць. Статыстычныя даныя табліцы пад назвай «Минская губерния» адносяцца да Ліфляндскай губерні і наадварот.

Значныя зрухі ў вывучэнні дэмаграфічнай гісторыі адбыліся ў сярэдзіне 50-х гадоў. У 1956 г. з'явілася буйная праца А. Рашына, у якой ён разглядае дынаміку ўсяго насельніцтва, а таксама ў гарадах на працягу ста гадоў[37]. Даследаванне пабудавана выключна на апублікаваных крыніцах, пры гэтым адсутнічае крыніцазнаўчы аналіз прац папярэднікаў і выкарыстаных дакументаў. Аўтар не ўлічвае таксама адміністрацыйна-тэрытарыяльных змен губерняў, што робіць яго даныя за шэраг гадоў несупаставімымі. Усё гэта, несумненна, зніжае каштоўнасць працы, якая тым не менш паказала неабходнасць выяўлення і асэнсавання новых архіўных крыніц.

Аб тым што гісторыя народанасельніцтва – адстаючы напрамак савецкай навукі, аргументавана паказаў на старонках часопіса «История СССР» В. Яцункі[38]. Ён падкрэсліў, што ўсе без выключэння дэмаграфічныя крыніцы аднолькава слаба ўведзены ў навуковы ўжытак і нездавальняюча вядзецца іх крыніцазнаўчы аналіз.

У сваіх працах В. Яцуескі абгрунтаваў тэзіс аб залежнасці дэмаграфічных працэсаў ад сацыяльна-эканамічных умоў. Ён азначаў, што «… да 1861 г. Беларусь адрозніваласа вельмі нізкім прыростам насельніцтва. Гэта, відавочна, было наступствам вельмі цяжкага становішча беларускага сялянства пры прыгонным праве, калі не толькі панскія сяляне мелі меншыя,... надзелы, але і дзяржаўныя вёскі здаваліся ў арэнду памешчыкам, якія трымалі іх на паншчыне»[39].

Абагульняючая праца, у якой разгледжаны змены колькасці і саслоўнага складу насельніцтва Расіі па раёнах на працягу 400 гадоў, належыць пяру расійскага гісторыка Я. Вадарскага[40]. Як і В. Яцункі, ён супастаўляе лічбы прыросту ў дарэформенны і парэформенны час і фактычна прыходзіць да тых жа высноў. Павышаны прырост насельніцтва Беларусі і Правабярэжнай Украіны пасля рэформы ён звязвае з больш выгаднымі тут умовамі адмену прыгону.

Вялікі ўклад у распрацоўку гісторыка-дэмаграфічнай праблематыкі Расіі першай паловы XIX ст. унёс У. Кабузан[41]. Яго працы адрозніваюцца глыбокім крыніцазнаўчым аналізам. Аўтар прадпрыняў даволі ўдалую спробу вызначыць ступень верагоднасці рэвізскага, царкоўнага і адміністрацыйнага ўліку насельніцтва.

Упершыню ў навуковы ўжытак уведзены агромісты пласт статыстычных матэрыялаў, якія згрупаваны ў табліцы.

У 60–70-я гг. XX ст. узнавілася дыскусія, пачатая сто год таму, аб запаволеных тэмпах росту прыгоннага насельніцтва. Пункт гледжання М. Бунге адстойвалі М. Дружынін, А. Рашын, І. Кавальчанка, Н. Шэпукова, У. Кабузан, С. Струмілін. Процілеглыя погляды выказваў П. Рындзюнскі, які працэс абсалютнага і адноснага скарачэння колькасці дадзенай катэгорыі насельніцтва следам за А. Трайніцкім зводзіў да сацыяльных перамяшчэнняў прыгонных у іншыя саслоўі. Пры гэтым ён не адмаўляе дрэнных умоў іх узнаўлення, аднак дадзены фактар лічыць другасным у параўнанні з сацыяльнай мабільнасцю[42].

На нашу думку, канцэпцыя П. Рындзюнскага далёка не бясспрэчная. Вызваліцца з прыгоннага стану было вельмі цяжка, калі не сказаць, што амаль не магчыма. Архіўныя матэрыялы сведчаць, што з 1828 па 1851 гг. у Расійскай імперыі было адпушчана на волю памешчыкамі і па рашэнні суда ўсяго 108570 душ. Але не было і вымірання прыгонных у біялагічным сэнсе.

Некаторыя дэмаграфічныя пытанні беларускай вёскі знайшлі адлюстраванне ў працах М. Дружыніна. Апіраючыся на шырокую базу крыніц, аўтар прыводзіць шмат даных аб пагубернскім размяшчэнні, механічным і натуральным прыросце дзяржаўных сялян[43].

Апошнім часам выйшла грунтоўная праца расійскага гісторыка Б. Міронава, у якой даецца шырокая панарама ўсяго сацыяльнага жыцця Расіі перыяду імперыі[44]. У ёй можна знайсці шмат статыстычнага і дэмаграфічнага матэрыялу па беларускіх губернях.

У беларускай гісторыка-дэмаграфічнай літаратуры абагульняючай працы па народанасельніцтву Беларусі дасавецкага часу няма. Маецца шэраг прац, у якіх дэмаграфічныя матэрыялы прысутнічаюць у сувязі з вывучэннем тых ці іншых сацыяльна-эканамічных пытанняў. Дэмаграфічны раздзел папярэднічае асноўнаму матэрыялу манаграфіі М. Доўнар-Запольскага, прысвечанай народнай гаспадарцы Беларусі парэформеннага перыяду[45]. Аўтар прыводзіць даныя аб дынаміцы насельніцтва за азначаны час, міграцыях, саслоўнай і нацыянальнай структуры паводле перапісу 1897 г. Матэрыял не носіць праблемны характар, але ўпершыню перад шырокім чытачом паўстала карціна структуры беларускага грамадства канца XIX ст. І у гэтым заслуга аўтара.

Матэрыялы перапісу 1897 г. для характарыстыкі саслоўнага складу насельніцтва выкарыстаны У. Ігнатоўскім і А. Смолічам[46].

Вось, бадай, і усё што было апублікавана ў даваенны час у Беларусі па дадзенай праблематыцы.

Важкі уклад у даследаванне народанасельніцтва Беларусі XIX ст. унёс М. Улашчык. Выяўляючы перадумовы адмены прыгону ў Літве і Заходняй Беларусі, ён абсалютна правільна палічыў неабходным паказаць складаную структуру сельскага насельніцтва Беларусі, якая засталася ў спадчыну ад Рэчы Паспалітай і прасачыць яе трансфармацыю да сярэдзіны XIX ст.[47]. Аўтарам праведзена вялікая крыніцазнаўчая праца. Ён не абмяжоўваецца звесткамі сваіх папярэднікаў, а паспяхова праводзіць самастойны пошук матэрыялаў. Слушнай, на нашу думку, з'яўляецца заўвага М. Улашчыка аб непрыдатнасці да аналізу матэрыялаў 6-й рэвізіі, як няпоўных і несупаставімых. Шмат увагі аўтар надае характарыстыцы сацыяльнага і прававога становішча панскіх і дзяржаўных сялян, вольных людзей, грамадзян і аднадворцаў, дваран. Абсалютную большасць апошніх складалі асобы, што не мелі ні зямлі, ні прыгонных. Сярод іншых вывадаў М. Улашчыка можна назваць наступныя. Насельніцтва трох заходніх губерняў (Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай) за першую палову XIX ст. выросла нязначна. Пры гэтым колькасць панскіх сялян скарацілася. Вольныя людзі былі рэзервам для папаўнення прыгонных. У Літве і Заходняй Беларусі налічвалася шмат незапрыгоненых, як дробных уласнікаў, так і пралетарыязаваных, што спрыяла развіццю капіталістычных адносін[48].

З усімі гэтымі тэзісамі можна пагадзіцца, бо у тэксце яны дастаткова аргументаваны. Адзінае, што патрабуе ўдакладнення – гэта прычыны скарачэння прыгоннага сялянства. М. Улашчык абмяжоўваецца агульным выказваннем, што прычына ў існаванні прыгоннага права.

Некаторыя дэмаграфічныя даныя змешчаны у працах В. Чапко[49], але яны не новыя, а запазычаныя ў П. Кепена, А. Трайніцкага, П. Жуковіча і іншых.

У 70–80-я гг. у працах па урбаністыцы сталі асвятляцца дэмаграфічныя пытанні гарадоў. Насельніцтва гарадоў Беларусі, яго дынаміку, крыніцы папаўнення, саслоўны, веравызнальны і нацыянальны склад на шырокай базе крыніц прааналізаваў А. Люты[50]. Ён прыйшоў да высновы, што з 1796 па 1861 гг. насельніцтва гарадоў расло хуткімі тэмпамі і павялічылася з 80 да 320 тыс. Але трэба адзначыць, што дэмаграфічная частка яго манаграфіі не пазбаўлена недахопаў. Не зусім карэктна, з навуковага пункту гледжання, пабудаваны табліцы. На некаторыя гады па шэрагу

гарадоў адсутнічаюць даныя, але аўтар тым не менш выводзіць выніковыя лічбы. Супастаўленне іх з гадамі, дзе па ўсіх гарадах маюцца звесткі, скажае дынаміку агульнай колькасці насельніцтва і яго асноўных катэгорый.

Шырокім спектрам пастаўленых і грунтоўна даследаваных праблем жыцця беларускіх гарадоў другой паловы XIX – пачатку XX ст. вылучаецца манаграфія З. Шыбекі[51]. Аўтар прасачыў дынаміку гарадскога і местачковага насельніцтва, паказаў месца і ролю ў гэтым руху натуральнага і механічнага прыросту, раскрыў саслоўны, веравызнальны і нацыянальны склад гараджан, месца і ролю сялянства ў структуры гарадоў.

У манаграфіі У. Сосны разгледжаны пытанні фарміравання саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў першай палове XIX ст.[52]. Дадзеная праблема непазбежна патрабуе вызначэння колькасных паказчыкаў сельскіх груп насельніцтва феадальнага грамадства. Аднак аўтар не робіць уласных пошукаў, а выкарыстоўвае даныя, якія прыведзены А. Каралёвай у першым томе «Гісторыі сялянства Беларусі», якія, на нашу думку, вызываюць шэраг пытанняў, ды і заканчваюцца 1851 г. Пры гэтым У. Сосна не ставіць пытанне аб іх дакладнасці, а запазычвае без усякага крытычнага аналізу. Таму табліца аб колькасці сялян па катэгорыях існуе ў кнізе як быццам сама па сабе. Яе лічбы часам разыходзяцца з выказанымі палажэннямі. Так, У. Сосна салідарны з М. Улашчыкам у тым, што колькасць вольных людзей увесь час скарачалася, аднак табліца сведчыць пра адваротнае – за 1796–1851 гг. іх колькасць вырасла з 22,9 да 32,1 тыс.[53].

Дэмаграфічная характарыстыка беларускага сялянства другой паловы XIX ст. у агульных рысах прадстаўлена ў манаграфіі В. Панюціча[54]. На падставе апублікаваных адміністрацыйных крыніц і перапісу 1897 г. ён паказаў дынаміку колькасці міграцыі, адыходныя промыслы, пісьменнасць, нацыянальны склад сельскага насельніцтва.

А. Каханоўскі зрабіў спробу па матэрыялах перапісу 1897 г. і ваенна-конскіх перапісаў з дапамогай матэматычных метадаў больш дэталёва разгледзець сацыяльна-класавую структуру насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст.[55].

Пэўную цікавасць да дэмаграфічнага мінулага Беларусі праяўляе польскі гісторык П. Эберхарт. У 1994 г. на польскай мове выйшла яго кніга «Дэмаграфічныя змены ў Беларусі 1897–1987 гг.», якая ў 1997 г. была перакладзена на беларускую мову[56]. Аўтар паставіў мэту на падставе матэрыялаў першага ўсерасійскага пе-

рапісу 1897 г., польскіх перапісаў 20–30-х гг. XX ст., а таксама савецкіх прасачыць змены нацыянальнага і веравызнаўчага (дзе гэта магчыма) складу насельніцтва. Пры дасягненні сваёй мэты аўтар у шэрагу выпадкаў дапускае некалькі тэндэнцыйнае тлумачэнне першакрыніц. Што тычыцца разглядаемага намі перыяду, то ён, напрыклад, схільны ўсіх католікаў Гродзенскай губерні лічыць палякамі.

Такім чынам, дэмаграфічная гісторыя Беларусі часоў Расійскай імперыі, а менавіта ў частцы колькасці і складу насельніцтва, належным чынам не даследавана. Патрабуюць удакладнення першакрыніцы першай паловы XIX ст., найперш рэвізіі, даныя якіх па заходніх губернях маюць сваю спецыфіку. Ёсць неабходнасць увядзення ў навуковы ўжытак новых крыніц. Варта звярнуць увагу на асобныя саслоўі і групы насельніцтва не толькі з боку сацыяльна-эканамічных, а і дэмаграфічных асаблівасцей. Зрэшты патрэбна комплекснае даследаванне па вывучэнні пытанняў дынамікі колькасці насельніцтва, яго сацыяльнага, канфесійнага, нацыянальнага, полаўзроставага і прафесійнага складу.

---

[1] Плещеев С. И. Обозрение Российской империи в нынешнем её новоустроенном состоянии. СПб., 1787. С. 74–76.

[2] Там жа. С. 36, 73, 75.

[3] Storch H. Statistische Üebersicht der Staathalterschaften des Russischen Reichs nach ihren merkwurdigsten Kulturverhältnissen in Tabellen. Riga, 1795; Ён жа. Historisch-statistisches Gemälde des Russischen Reichs am Ende ächtzehnten Jahrhundert, 8 Theil und Supplementband. Riga; Leipzig, 1797–1803.

[4] Storch H. Statische Ubersicht … S. 119.

[5] Герман И. Ф. О народонаселении в России // Статистический журнал. СПб., 1806. Т. 1. Ч. 1. С. 29–44; Ч. 2. С. 11–32.

[6] Там жа. Ч. 2. С. 20–21.

[7] Герман К. Ф. Статистические исследования относительно Российской империи. Ч. 1. О народонаселении. СПб., 1819.

[8] Там жа. С. 65, 66.

[9] Там жа. С. 39, 68.

[10] Там жа. С. 232–368.

[11] Там жа. С. 128.

[12] Там жа. С. 120–121.

[13] Там жа. С. 128–130.

[14] Арсеньев К. И. Начертание статистики Российского государства. Ч. 1. О состоянии народа. СПб., 1818.

[15] Там жа. С. 56, 67–91.

[16] Арсеньев К. И. Статистические очерки России. СПб., 1848.

[17] Арсеньев К. И. Исследования о численном отношении полов в народонаселении России // Журн. МВД. 1844. Кн. 1. С. 5–47.

[18] Северо-западный край империи в прошлом и настоящем виде // Журн. МВД. 1843. Кн. 3.

[19] Там жа. С. 393–447.

[20] Кеппен П. И. О числе жителей в России в 1838 году // Журн. МВД. 1839. Кн. 4. С. 137–169.

[21] Там жа. С. 138–150.

[22] Кеппен П. И. Несколько слов по поводу ведомостей о народонаселении России составленной при статистическом отделении Совета МВД. СПб., 1850.

[23] Ведомость о народонаселении России по уездам губерний и областей, составленная из всеподданейших отчетов губернаторов при стат. отд. МВД за 1846 г. СПб., 1850.

[24] Кеппен П. И. Несколько слов по поводу ведомостей о народонаселении России составленной при статистическом отделении Совета МВД. С. 7–8.

[25] Тройницкий А. Г. Крепостное население России по 10 народной переписи. СПб., 1861.

[26] Ган И. А. О ревизии. Записка члена комиссии И. А. Гана. СПб., 1861 // Труды комиссии высочайше утвержденной для пересмотра системы податей и сборов. СПб., 1863. Т. 1.

[27] Там жа. С. 6–11.

[28] Цыт. па: Перковский А. Л. Кризис демографического воспроизводства крепостного крестьянства России в первой половине XIX столетия // Брачность, рождаемость, смертность в России и СССР. М., 1977. С. 169, 170.

[29] Экономический указатель. 1857. № 44. С. 1022–1030.

[30] Тройницкий А. О числе крепостных людей в России // Журн. МВД. 1858. Т. 30. Кн. 5. Отд. 3. С. 30.

[31] Тройницкий А. Г. Крепостное население… С. 55–56.

[32] Янсон Ю. Э. Устройство правильной переписи населения в России // Сборник государственных знаний В. П. Безобразова. СПб., 1887. С. 148–152.

[33] Экк Н. Опыт обработки статистических материалов о смертности в России. СПб., 1888. С. 26–28.

[34] Михайловский В. Факты и цифры из русской действительности // Новое слово. 1897. Кн. 9. С. 97–117.

[35] Жукович П. Н. Сословный состав населения Западной России в царствие Екатерины II // Журн. Министерства народного просвещения. 1915. № 1, 2, 3; 1916. № 6.

[36] Волков Е. З. Динамика народонаселения СССР за 80 лет. М.; Л., 1930; Воблый В. К., Пустоход П. И. Переписи населения (Их история и организация). М.; Л., 1936. 2-е изд. 1940; Боярский А. Я. Переписи населения в капиталистических странах. М., 1938; Гозулов А. И. Переписи населения СССР и капиталистических стран. М., 1936; Труды Демогра-

фического института. Л., 1934. Т. 1. Урланис Б. Ц. Рост населения в Европе. М., 1941.

[37] Рашин А. Г. Население России за 100 лет (1811–1913 гг.). М., 1956.

[38] Яцунский В. К. О некоторых отстающих участках советской исторической науки // История СССР. 1959. № 3.

[39] Яцунский В. К. Роль различий в уровне естественного прироста населения в географических сдвигах в размещении населения России в XIX–XX вв. // Историческая география России. М., 1970. С. 61.

[40] Водарский Я. Е. Население России за 400 лет. XVI – начало XX в. М., 1973.

[41] Кабузан В. М. Народонаселение России в XVIII – первой половине XIX в. (по материалам ревизий). М., 1963; Ён жа. Изменения в размещении населения России в XVIII – первой половине XIX в. М., 1971.

[42] Рындзюнский П. Г. Вымирало ли крестьянство перед реформой 1861 // Вопросы истории. 1967. № 7. С. 54–67.

[43] Дружинин Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева. М.; Л., 1946–1958. Т. 1–2. Ён жа. Русская деревня на переломе, 1861–1880 гг. М., 1978.

[44] Миронов Б. Н. Социальная история России периода империи: В 2 т. СПб., 1999.

[45] Довнар-Запольский М. М. Народное хозяйство Белоруссии в 1861–1914 гг. Мн., 1926. С. 8–30.

[46] Игнатовский В., Смолич А. Белоруссия: территория, население, экономика, важнейшие моменты истории. Мн., 1920.

[47] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и западной Белоруссии. М., 1965. С. 30–101.

[48] Там жа. С. 94, 101.

[49] Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966. С. 110; Яна ж. Классовая борьба в Белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972. С. 21–33.

[50] Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. Мн., 1987. С. 25–74.

[51] Шыбека Захар. Гарады Беларусі. 60-я гады XIX – пачатак XX ст. Мн., 1997. С. 44–82.

[52] Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 2000.

[53] Там жа. С. 31.

[54] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990. С. 28–69.

[55] Кохановский А. Г. Социально-классовая структура народонаселения Белоруссии во второй половине XIX в.: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1989.

[56] Эберхардт П. Дэмаграфічныя змены на Беларусі 1897–1989. Мн., 1997.

1.3. Дэмаграфічныя працэсы

Асноўнай крыніцай для вывучэння працэсаў узнаўлення насельніцтва з'яўляюцца даныя метрычных запісаў. Спробы вызначыць на іх падставе ўзровень нараджальнасці і смяротнасці ў Расійскай імперыі, а таксама спрагназаваць рост насельніцтва былі распачаты вучонымі ў пачатку XIX ст. Зыходзячы з дадзеных Св. Сінода, І. Герман прыйшоў да высновы, што ў Расіі нараджальнасць вышэйшая за іншыя дзяржавы. У той жа час смяротнасць, на думку аўтара, даволі нізкая[1].

Абапіраючыся на падлікі І. Германа, К. Арсеньеў пазней пісаў: «Смяротнасць у Расіі адносна іншых дзяржаў Еўропы найменшая, з 40 памірае 1. Дадзеныя працэсы ў Германіі ёсць як 32:1, а ў Францыі 30:1. Галоўная прычына меншай смяротнасці ў Расіі ёсць вясковае жыццё і земляробчыя заняткі большай часткі народа»[2]. Але гэта былі вельмі прыблізныя падлікі і, як паказалі наступныя даследаванні, далёкія ад ісціны.

Наступныя даследаванні правёў К. Герман. У якасці крыніцы ён выкарыстаў даныя метрычных кніг аб памерлых за 1786–1799 і 1801–1805 гг. і табелі аб народжаных і памерлых за 1806–1909 гг. сярод мужчынскага праваслаўнага насельніцтва. Што тычыцца жаночай паловы, то ў метрычных кнігах іх узрост сярод памерлых у той час не адзначаўся і таму з аўтарскага даследавання быў выключаны. На іх аснове ён пабудаваў табліцы смяротнасці, якія далі магчымасць убачыць колькасць тых, хто дажыў да пэўнага ўзросту. Атрыманыя вынікі аўтар параўнаў з аналагічнымі паказчыкамі некаторых краін Заходняй Еўропы. Параўнанне атрымалася не на карысць Расійскай імперыі. Асабліва гэта тычылася малодшых узростаў[3]. Разам з гэтым падлічаны агульны каэфіцыент смяротнасці (25%) сведчыў аб адваротным – даволі нізкай смяротнасці ў Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст.

Такая супярэчлівасць прымушае даволі крытычна ставіцца да табліц К. Германа і яе выніковых даных. Тут бачацца дзве прычыны: недакладнасць зыходных даных і недасканалы метад пабудовы табліц. У пачатку XIX ст. рэгістрацыя дэмаграфічных працэсаў, найперш памерлых, характарызавалася значнай непаўнатой. У метрычныя кнігі не пападалі пахаваныя без абраду адпявання, у прыватнасці памерлыя да хрышчэння немаўляты. Акрамя таго малаадукаванасць сярэдняга і малодшага царкоўнага персаналу, якія павінны былі весці метрычныя кнігі, станавілася прычынай шматлікіх недакладнасцей і пропускаў у запісах. У су-

вязі з гэтым Св. Сінодам быў выдадзены шэраг указаў, накіраваных на ўдасканаленне вядзення метрычных кніг і павышэнне адказнасці за іх якасць настаяцеляў прыходаў. Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што зыходныя лічбы памерлых, якімі карыстаўся К. Герман, былі заніжанымі, што і дало недакладны каэфіцыент смяротнасці.

З другога боку, метад пабудовы табліц, якім першапачаткова карысталіся не толькі расійскія, але і замежныя (Э. Э. Дзювіяр, И. П. Зюсмільх, П. В. Варгенцін) вучоныя, які носіць назву метад спісаў памерлых, некалькі завышаў паказчыкі смяротнасці. Згодна дадзенага метаду, табліца будавалася шляхам уліку ўсіх памерлых за пэўны тэрмін з размеркаваннем іх па ўзростах. Сапраўднае становішча пры гэтым метадзе магло быць адлюстравана толькі ва ўмовах стацыянарнага насельніцтва, г. зн. працяглы час колькасць народжаных павінна быць роўнай колькасці памерлых. Але расійская дэмаграфічная рэальнасць была далёкай ад гэтага.

На больш высокім навуковым узроўні праблема была вырашана ў другой палове XIX ст. Гэтаму садзейнічалі значнае павышэнне якасці ўліку руху насельніцтва і з'яўленне новых больш дасканалых метадаў іх апрацоўкі. Значны ўклад у распрацоўку праблем смяротнасці ўнёс У. Я. Бунякоўскі[4]. Прааналізаваўшы вопыт і памылкі папярэднікаў ён прапанаваў іншую методыку вызначэння рэальнага ўзроўню смяротнасці: калі колькасць памерлых у пэўных узростах суадносіцца не з колькасцю ўсіх памерлых, але з колькасцю народжаных за адпаведныя гады. Гэты метад увайшоў у гісторыю пад назвай метаду Бунякоўскага. Для аналізу аўтар выбраў 1862 г., які адрозніваўся адсутнасцю неўраджаю, значных эпідэмій, войнаў і іншых адмоўных уздзеянняў на дэмаграфічную сітуацыю. Колькасць памерлых за гэты год ён размеркаваў па пяцігадовых узроставых групах.

Супастаўленне вынікаў табліц Бунякоўскага з аналагічнымі паказчыкамі Англіі і Швецыі за 1860–1861 гг. паказвае, што смяротнасць насельніцтва ў Расійскай імперыі значна вышэйшая ва ўсіх узроставых групах. Асабліва высокая смяротнасць назіралася ў дзіцячых узростах, зніжэнне якой, на думку У. Бунякоўскага, магло паставіць Расію па ўзроўню агульнай смяротнасці ў лік перадавых еўрапейскіх краін[5].

Але гаварыць аб тэндэнцыі зніжэння смяротнасці ў Расіі да пачатку 70-х гг. XIX ст. не прыходзіцца. На гэта звярнуў увагу ў свой час У. Грэбяншчыкоў, прааналізаваўшы табліцы смяротнасці У. Бунякоўскага і табліцы К. Андрэева за 1851–1860 гг.[6]. Ён засяродзіўся

на наступных лічбах узроставай смяротнасці, якія паказалі, што ў перыяд 1851–1860 гг. павышаныя страты назіраліся ва ўзростах 20–45 гадоў, што было звязана з Крымскай вайной. Аўтар заўважыў таксама негатыўную тэндэнцыю павелічэння дзіцячай смяротнасці (0–5 год). За перыяд 1863–1872 гг. паміралa дзяцей да пяцігадовага ўзросту на 2,3%, а ў перыяд 1863–1873 гг. – на 3,7% больш, чым у 1851–1860 гг. Зыходзячы з гэтага У. Грэбяншчыкоў робіць даволі змрочны дэмаграфічны прагноз: «Калі мы дапусцім, што колькасць паміраючых да пяцігадовага ўзросту дзяцей у разліку на 1000 нованароджаных у наступныя дзесяцігоддзі будзе павышацца на 3%, то мы з поўным правам можам сказаць, што не пройдзе і 150 год, як пачнецца безумоўнае выміранне насельніцтва»[7]. Каб гэтага не адбылося, ён прапанаваў заняцца аздараўленнем насельніцтва.

Не менш песімістычны погляд на дэмаграфічнае становішча Расійскай імперыі выказваў М. Экк. На пасяджэнні таварыства рускіх урачоў 5 снежня 1885 г. ён выступіў з дакладам, у якім пераканаўча паказаў, што высокая смяротнасць у краіне звязана з паўсюдным панаваннем заразных хвароб, якія носяць эпідэмічны характар. Пры гэтым урадам не прымаецца ніякіх мер для паляпшэння санітарнага становішча насельніцтва, медыцынскага абслугоўвання і г. д. У выніку смяротнасць у Расіі не зніжаецца як у Еўропе, а наадварот – павышаецца[8]. Вынікі даследавання М. Экка былі надрукаваны ў выглядзе асобнай манаграфіі, якая стала здабыткам шырокай навуковай грамадскасці[9].

Адказ на пытанне, ці быў няўхільным рост смяротнасці ў Расіі, аб чым так катэгарычна гаварыў М. Экк, даюць даследаванні канца XIX ст. Значны ўклад у вырашэнне дадзенай праблемы ўнеслі Л. Бесер і К. Болад. Яны пабудавалі табліцу смяротнасці за перыяд 1851–1890 гг. па дзесяцігадовых узроставых групах, што дазволіла ўбачыць дынаміку смяротнасці на працягу адносна працяглага часу. Атрымлівалася, што ніякага павышэння смяротнасці насельніцтва не было. Наадварот, ішоў павольны працэс яе зніжэння. Што ж тычыцца даследавання М. Экка, то трэба заўважыць, што яно будавалася на матэрыялах 60–70-х гг. XIX ст., калі панавалі масавыя хваробы, смяротнасць ад якіх была вельмі высокай. Таму ў аўтара склалася ўражанне, што гэта не часовая з'ява, а ўстойлівая тэндэнцыя. У сапраўднасці ж дэмаграфічная сітуацыя ў 80-я гады некалькі палепшылася.

На падставе складзеных табліц Л. Бесер і К. Болад разлічылі агульны каэфіцыент смяротнасці асобна для мужчын і жанчын,

які азначае колькі чалавек паміралa на тысячу жыхароў. Ён аказаўся роўным адпаведна 36,7‰ і 34,0‰ (праміляў). Гэта азначала, што ўзровень смяротнасці ў Расіі быў значна вышэйшым у параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі. У 70-х гг. XIX ст. самая адносна высокая смяротнасць назіралася ў Германіі – 28‰ сярод мужчын і 26‰ сярод жанчын. Самая ж нізкая была ў Швецыі – 22‰ і 20,5‰ адпаведна. Доля асоб, якія паміралі да ўзросту 15 гадоў у Расіі складала 49%, у той час як у Францыі толькі 26%[10].

У 80–90-я гг. XIX ст. выйшла шмат навуковых артыкулаў, у якіх на канкрэтным дэмаграфічным матэрыяле былі паказаны прычыны высокай смяротнасці насельніцтва, галоўныя з якіх адсутнасць неабходнай медыцынскай дапамогі, цяжкія санітарныя ўмовы жыцця асноўнай масы народа, недастатковае харчаванне і г. д.

З'явіліся даследаванні, заснаваныя на рэгіянальным матэрыяле. Знаёмства з імі паказвае, што ў розных губернях Еўрапейскай Расіі існавалі адны і тыя ж прычыны заўчаснай смяротнасці насельніцтва. Значная ўвага надавалася выяўленню прычын катастрафічнай гібелі дзяцей і павышанай смяротнасці жанчын у параўнанні з мужчынамі.

Паказальная ў гэтых адносінах праца Я. Святлоўскага. Аўтар прыйшоў да высновы, што большасць жанчын уступала ў шлюб да 20-гадовага ўзросту, пэўная частка з іх нават не дасягнуўшы палавой сталасці. У гэтых адносінах ён падкрэсліваў, што пачынаючы з уступлення ў шлюб, жыццё сялянкі атручвалася пастаяннай цяжарнасцю, хваробамі, кармленнем і г. д.[11]. Такая ж сітуацыя была характэрна і для беларускіх губерняў.

З цягам часу сталі з'яўляцца даследаванні з выкарыстаннем гісторыка-параўнальных метадаў. Так, В. Нікіценка ў сваёй доктарскай дысертацыі прааналізаваў стан дзіцячай смяротнасці па губернях Еўрапейскай Расіі за першую палову 90-х гг. XIX ст. Аказалася, што ўсе пяць заходніх губерняў знаходзяцца на адных з апошніх месцаў, а ў Віленскай губерні смяротнасць дзяцей аказалася самай нізкай[12].

Шэраг прац было выканана выключна на беларускім матэрыяле. Трэба адзначыць, што ля вытокаў вывучэння дэмаграфічных працэсаў у Беларусі стаялі медыкі-гігіеністы. Так, Л. Галынец выкарыстаў дэмаграфічную статыстыку г. Магілёва за 1876–1885 гг. Усё насельніцтва ён падзяліў на прывілеяваных, непрывілеяваных і яўрэяў. Аўтар падрабязным чынам прааналізаваў стан шлюбнасці, нараджальнасці і смяротнасці ў дадзеных групах і прый-

шоў да шэрагу высноў. У прывілеяваным саслоўі мужчыны бралі шлюб у больш сталым узросце, жанчыны – у раннім, нараджальнасць і смяротнасць сярод іх былі прыкметна ніжэйшымі. У двух апошніх групах дэмаграфічныя паказчыкі прыкладна аднолькавыя: шлюбы заключаліся ў больш раннім узросце і рознасць у гадах шлюбных пар нязначная. Узровень смяротнасці быў ніжэйшы, чым у сярэднім па Еўрапейскай Расіі, але вышэй, чым у першай групе. І была заўважана сувязь паміж смяротнасцю, сярэдняй працягласцю жыцця і матэрыяльным становішчам насельніцтва. У цэлым Л. Галынец лічыць умовы натуральнага руху насельніцтва горада спрыяльнымі, і галоўную прычыну гэтага ён бачыў ва ўмераным клімаце[13].

Аналагічнае даследаванне па г. Мінску за 1878–1886 гг. правёў А. А. Бекарэвіч. Насельніцтва горада ён падзяліў на хрысціян, яўрэяў і мусульман. У сваю чаргу хрысціян размежаваў на дзве групы. Да першай аднёс дваран, духавенства і купцоў, да другой – мяшчан, сялян і адстаўных салдат. А. Бекарэвіч, як і Л. Галынец, падрабязна разбіраў працяканне дэмаграфічных працэсаў: нараджальнасць па полу, гадах, месяцах, смяротнасць і шлюбнасць па полу, узросту і порам года. Аўтар паспрабаваў даць сваё тлумачэнне атрыманым лічбавым паказчыкам, але з-за нявывучанасці многіх дэмаграфічных сітуацый, вымушаны быў абмежавацца простай канстатацыяй. Напрыклад, А. Бекарэвіч не здолеў даць тлумачэнне неадпаведнасці фізіялагічнаму закону, зафіксаванаму метрычнымі кнігамі суадносін нараджэння па полу сярод яўрэяў, дзе на 100 дзяўчынак, паводле афіцыйнай статыстыкі, нараджалася 178 хлопчыкаў. Гэта неверагодная прапорцыя. Зараз дасканала вядома, што прычына ў значным недаўліку сярод яўрэяў народжаных дзяўчынак. Такая ж сітуацыя назіралася і ў прапорцыі смяротнасці дадзенай этнаканфесійнай групы[14]. Сучасныя даследчыкі ў гэтых адносінах робяць папраўку на недаўлік, зыходзячы з прынятай у дэмаграфіі прапорцыі: па фізіялагічных законах, нягледзячы на нацыі і расы, на 100 дзяўчынак фактычна нараджаецца 104–110 хлопчыкаў.

На матэрыялах дэмаграфічнай статыстыкі г. Магілёва другой паловы 90-х гг. XIX ст. (1896–1901 гг.) пабудаваў сваё даследаванне В. Кошалеў. Ён размежаваў насельніцтва горада на прамысловых, прывілеяваных і яўрэяў, што, на нашу думку, з навуковага пункту гледжання з'яўляецца некарэктным, бо тут змешаны паняцці саслоўныя і этнічныя. Акрамя натуральнага руху насельніцтва па матэрыялах перапісу 1897 г., аўтар прывёў звесткі

яго полава-ўзроставай структуры, размеркаванні па занятках, ўзроўню пісьменнасці і стану адукацыі ў горадзе[15].

Галоўны недахоп прац другой паловы XIX ст., дзе разглядаюцца дэмаграфічныя працэсы, іх апісальны характар. Вучоныя не маглі яшчэ растлумачыць многія статыстычныя паказчыкі, таму абмяжоўваліся іх канстатацыяй. Праўда, былі спробы нейкім чынам растлумачыць рэгіянальныя асаблівасці дэмаграфічных працэсаў у Расіі. Паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца артыкул Н. Кудраўцава. Аўтар прааналізаваў статыстыку нараджальнасці і смяротнасці за 1882–1888 гг. па губернях і паветах і зрабіў спробу ўвязаць узровень дэмаграфічных працэсаў з многімі геаграфічна-тапаграфічнымі фактарамі. У прыватнасці ён сцвярджаў, што чым мясцовасць вышэй над узроўнем мора, тым вышэй нараджальнасць. Тое ж назіралася і ў прыморскіх губернях. У лясістых жа губернях нараджальнасць паніжаная з-за цяжкасці свабоднага абмену паветра і павышанай вільготнасці. Адзначаў таксама такія ўплывовыя фактары, як геалагічны склад глебы, узровень грунтовых вод, колькасць балот і г. д.[16].

Вылучаліся і іншыя ўплывовыя фактары. Так, М. Увараў даказваў залежнасць размеркавання нараджэнняў па месяцах ад інтэнсіўнасці адыходных промыслаў[17]. С. Караманенка сцвярджаў, што ўсплёск нараджальнасці вясною і восенню значна павышае эпідэмічнасць і дзіцячую смяротнасць. Названая праблема, як правільна падкрэсліваў аўтар, у меншай ступені характэрна для заходніх губерняў, дзе адыходныя промыслы развіты слабей.

Значны ўклад у вывучэнне дэмаграфічных працэсаў унёс Ю. Янсан. Ім выдадзена шэраг манаграфій па дадзенай тэме, у якіх упершыню выказаны некаторыя тэарэтычныя аспекты народанасельніцтва. Ён крытыкаваў апісальную статыстыку, лічыў, што прадмет статыстыкі – грамадства, якое яна даследуе лічбавымі метадамі. Даў таксама сваю класіфікацыю праблем: да статыстыкі народанасельніцтва Ю. Янсан аднёс пытанні яго колькасці і складу па полу, узросту, сямейным стане, занятасці і гаспадарчым стане; да дынамікі – шлюбнасць, нараджальнасць, смяротнасць, міграцыі. Шырока выкарыстоўваў гісторыка-параўнальны метад пры аналізе дэмаграфічных працэсаў губерняў Расіі і замежных краін[18].

Перапіс насельніцтва 1897 г. даў даследчыкам шматлікі матэрыял для доказу ці абвяржэння тых палажэнняў натуральнага руху насельніцтва, якія выказваліся дагэтуль. У прыватнасці,

звесткі перапісу аб узроставай структуры далі магчымасць пабудаваць больш дакладным дэмаграфічным спосабам табліцы смяротнасці і ўбачыць рэальнае становішча дэмаграфічнай сферы. Гэта ўпершыню з поспехам зрабіў выдатны дэмограф С. Навасельскі, які даказаў, што смяротнасць у краіне, хоць і павольна, але зніжаецца[19]. Ім таксама былі распрацаваны прыёмы стандартызацыі каэфіцыентаў нараджальнасці, вымярэння дзіцячай смяротнасці, зглажвання ўзроставай акумуляцыі.

У даваенны савецкі перыяд дэмаграфічным пытанням не надавалася дастатковай увагі. Можна назваць толькі некалькі прац, у якіх сустракаюцца матэрыялы па беларускіх губернях, або цікавых сваім фактычным матэрыялам ці метадалогіяй[20]. Даследаванні натуральнага руху насельніцтва пашырыліся з 50-х гг. XX ст. У працы А. Рашына прыводзяцца пагубернскія каэфіцыенты нараджальнасці за 1861–1913 гг., якія паказалі значнае зніжэнне ўзроўню нараджальнасці ў Беларусі ў параўнанні з сярэднім паказчыкам па Еўрапейскай Расіі[21].

У Беларусі многія дэмаграфічныя пытанні народанасельніцтва ўпершыню былі распрацаваны эканамістам А. Ракавым. Дасавецкі перыяд у аўтара ў асноўным грунтаваўся на матэрыялах перапісу 1897 г. Ім разлічаны не толькі агульныя каэфіцыенты натуральнага руху насельніцтва, але і спецыяльныя – брута і нета каэфіцыенты яго ўзнаўлення, шлюбнай пладавітасці і інш.[22].

З эканамічнага пункту гледжання даследаваў смяротнасць насельніцтва Беларусі Л. Маськоў[23]. Ён прасачыў яе дынаміку ў дарэвалюцыйны (з другой паловы XIX ст.) і савецкі часы, раскрыў уплывовыя, на яго думку, фактары, прааналізаваў узровень смяротнасці па полу і ўзросту паводле перапісаў. Недахопам працы з'яўляецца аднабаковы паказ прычын вагання смяротнасці, якія зводзяцца толькі да сацыяльна-эканамічных.

Пытанні, звязаныя з нараджальнасцю, закранала ў сваім артыкуле і манаграфіях Л. Шахоцька[24]. Выкарыстаўшы дадзеныя А. Рашына аўтар сцвярджала, што ўзровень нараджальнасці ў Беларусі ў 60-я гг. XIX ст. быў высокі і амаль не адрозніваўся ад сярэдніх паказчыкаў па Еўрапейскай Расіі. Затым тэмпы зніжэння яе ў другой палове XIX – пачатку XX ст. былі больш хуткімі, чым ў цэлым па імперыі.

Высокі ўзровень нараджальнасці, лічыць Л. Шахоцька, быў звязаны з неабходнасцю вялікай колькасці дзяцей, як будучых працаўнікоў, што прыносілі сям'і дабрабыт, а таксама кармільцаў сваіх бацькоў пад старасць. Інакш кажучы, развіваецца тэзіс аб

эканамічнай карыснасці дзяцей, які панаваны ў савецкай дэмаграфічнай навуцы. Адным з фактараў высокай нараджальнасці абсалютна правільна названы такі, як значная ўдзельная вага ранніх шлюбаў.

Зніжэнне нараджальнасці аўтар бачыць, найперш, у росце капіталістычных адносін у горадзе і вёсцы, бурным нарастанні міграцыйных працэсаў, разбурэнні абшчыны, урбанізацыі, а таксама зніжэнні долі ранніх шлюбаў. Тым самым дэмаграфічныя працэсы разглядаюцца пераважна праз прызму эканамічнай дэтэрмінанты.

Паўстае пытанне, а якім чынам рост капіталістычных адносін ўплываў непасрэдна на нараджальнасць. Прамога адказу ў Л. Шахоцькі мы не знойдзем. Паміж радкоў прасочваецца тэзіс аб унутрысямейным рэгуляванні колькасці дзяцей. Але ці было яно? У шырокіх маштабах, вядома, не. Хаця пэўныя сацыяльныя слаі грамадства, найперш у горадзе, яно ў некаторай ступені закранула. Вёска ж працягвала заставацца яшчэ традыцыйнай з яе дзедаўскай установкай на тое, каб мець дзяцей колькі Бог пашле і галоўную ідэалагічную ролю ў гэтым адыгрывала царква[25]. Акрамя таго, значную ролю ў існаванні высокай нараджальнасці ігралі фізіялагічныя фактары: наяўнасць ранніх шлюбаў і высокая смяротнасць, якая стымулявала і высокую нараджальнасць.

Паступовае зніжэнне нараджальнасці звязана з апераджальнымі тэмпамі зніжэння смяротнасці, дзякуючы дасягненням медыцыны і барацьбе з заразнымі хваробамі. Гэтыя два працэсы фізіялагічна ўзаемазвязаны. Важнай таксама з'яўляецца тэндэнцыя павышэння ўзросту ўступлення ў першы шлюб, якая даволі яскрава праявілася ў Беларусі, асабліва сярод каталіцкага насельніцтва. Уплыў капіталістычных адносін непасрэдна на нараджальнасць быў (урбанізацыя, эміграцыя), але яшчэ ў большай ступені яны ўздзейнічалі на смяротнасць (навукова-тэхнічны прагрэс). Таму да Першай сусветнай вайны ў дэмаграфічных адносінах Беларусь падыйшла з адносна нізкай нараджальнасцю і смяротнасцю і па дадзеных паказчыках стаяла паміж Цэнтральнай Расіяй і Заходняй Еўропай, бліжэй да апошняй.

Што тычыцца шлюбнасці, то ў дэмаграфічных адносінах яна фактычна не вывучалася, а толькі ў этнаграфічных. У айчыннай навуцы ёсць некалькі прац беларускіх этнографаў, прысвечаных вывучэнню структуры гарадской і сельскай сям'і[26].

Апошнім часам распрацоўкі дэмаграфічных праблем Беларусі некалькі ажывіліся. Я. Насытка, даследаваўшы шлюбную струк-

туру насельніцтва Беларусі ў парэформенны перыяд (узроставы склад, узрост уступлення ў шлюб і ступень ахопу ім дарослага насельніцтва ў этнаканфесійным аспекце, цыклічнасць нараджэнняў і смяротнасці і іх узаемасувязь, змены ў дэмаграфічных паводзінах насельніцтва пад уздзеяннем росту капіталістычных адносін), прыйшоў да высновы, што напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі, асабліва заходнім яе рэгіёне, намеціўся пераход ад традыцыйнага, аграрнага тыпу ўзнаўлення насельніцтва з яго высокімі паказчыкамі нараджальнасці і смяротнасці, амаль поўным ахопам шлюбам усіх паўналетніх жанчын, раннім узростам уступлення ў першы шлюб, значнай доляй паўторных шлюбаў да так званага сучаснага, характэрнага для індустрыяльнага грамадства і які ўжо ў той час існаваў у Заходняй Еўропе[27].

Нетрадыцыйны падыход да дэмаграфічных праблем характэрны для прац В. Насевіча. Ён даследуе праблему сям'і і хатняй гаспадаркі ў рамках вывучэння мікрагісторыі. Аналізуючы інвентар і метрычныя кнігі м. Корань (сучасная в. Новы Двор) Барысаўскага павета, аўтар атрымаў наступныя вынікі: у 1740 г. доля шматсямейных двароў складала 34,8%, простых 56,5%, а ў 1841 г. адпаведна 51,7 і 21,3%[28]. Тэндэнцыя ўзрастання долі шматсямейных дамоў на працягу XVIII – першай паловы XIX ст. была характэрнай для Усходняй Еўропы, аб чым сведчаць вынікі даследаванняў замежных аўтараў. Як гэта не парадаксальна, але згодна дадзеных беларускіх гісторыкаў, у XVI–XVII ст. доля шматсямейных гаспадарак складала толькі 14%[29], у той час як ў паўночна-заходняй Расіі звыш 40%. Беларусь у гэтых адносінах знаходзілася паміж Расіяй і Захадам, дзе шматдваровыя гаспадаркі не перавышалі 5%. Пасля адмены прыгону ў Беларусі, як і Расіі ў цэлым, пайшоў зваротны працэс – доля малых семьяў стала паступова расці. В. Насевіч заключае, што дынаміку «ўсходняй» мадэлі сям'і трэба тлумачыць не толькі роллю прыгоннага права, але патрэбны пошук іншых фактараў, перш за ўсё культурных і псіхалагічных.

У другім артыкуле В. Насевіч шырока выкарыстоўвае рэвізскія сказкі і метрычныя кнігі Кораньскага прыходу за першую палову XIX ст., робіць іх крыніцазнаўчы аналіз. На іх аснове праводзіць рэканструкцыю колькасці двароў, гаспадарак, структуры сям'і, дэмаграфічных працэсаў (нараджальнасці, смяротнасці, натуральнага прыросту, міграцый за 1765–1858 гг.). Аўтарам заўважана розніца ва ўзроўнях нараджальнасці і смяротнасці паміж католікамі і праваслаўнымі. У апошніх паказчыкі аказаліся

большымі. Ён правільна тлумачыць гэту розніцу рознай сацыяльнай структурай двух канфесій. Сярод католікаў было шмат дваран, мяшчан, аднадворцаў, дэмаграфічныя паводзіны якіх адрозніваліся, што абумоўлена культурнымі традыцыямі дадзеных сацыяльных слаёў[30].

Такім чынам, аналіз вышэй названай літаратуры паказвае, што дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі азначанага перыяду асветлены яшчэ недастаткова. Адсутнічаюць манаграфічныя працы па народанасельніцтве. Тыя артыкулы, якія маюцца, не вычэрпваюць праблему. У агульных рысах ахарактарызаваны толькі нараджальнасць і смяротнасць, прычым з аднабаковай трактоўкай уплываючых фактараў сацыяльна-эканамічнага кшталту. Не бярэцца пад увагу этнакультурныя і рэлігійныя, якія ў шэрагу выпадкаў аказваюць больш значны ўплыў на дэмаграфічную сферу, чым эканамічныя і сацыяльныя. Пакуль аб гэтым пытанне толькі ставіцца.

Характэрнай асаблівасцю прац з'яўляецца абсалютная перавага сярод іх аўтараў эканамістаў і дэмографаў. І гэта невыпадкова. Дадзеная тэматыка патрабуе крапатлівай працы з мноствам лічбаў, з якімі неабходны вялікія і часам шматступенчатыя падлікі, выкарыстанне матэматычных і дэмаграфічных метадаў аналізу. Між тым наяўнасць базы крыніц дазваляе зрабіць комплекснае даследаванне працэсу ўзнаўлення насельніцтва Беларусі з улікам новых поглядаў і падыходаў.

---

[1] Герман И. Ф. О числе жителей в России // Статистический журнал. 1806. Т. 1, ч. 2. С. 17, 21.

[2] Арсеньев К. Начертательная статистика Российского государства. Ч. 1. О состоянии народа. СПб., 1818. С. 95.

[3] Герман К. Ф. Статистические исследования относительно Российской империи. Ч. 1. О народонаселении. СПб., 1819. С. 204, 205, 212.

[4] Буняковский В. Я. Опыт о законах смертности в России и о распределении православного населения по возрастам. СПб., 1865.

[5] Там жа. С. 60.

[6] Андреев К. А. О таблицах смертности. Опыт теоретического исследования о законах смертности и составления таблиц смертности для России. М., 1871.

[7] Гребенщиков В. И. К вопросу об уменьшении смертности в России // Врач. 1888. № 31. С. 627.

[8] Экк Н. О чрезмерной смертности в России и необходимости оздоровления // Международная клиника. 1886. № 3. С. 3–41.

[9] Экк Н. В. Опыт обработки статистических данных о смертности в России. СПб., 1888.

[10] Бессер Л., Боллад К. Смертность, возрастной состав и долговечность православного народонаселения обоего пола в России за 1851–1890 годы. СПб., 1897. С. 60–61.

[11] Святловский Е. Материалы по вопросу о санитарном положении русского крестьянства. Медико-топографическое описание Волчанского уезда Харьковской губернии. Харьков, 1897. С. 183.

[12] Никитенко В. П. Детская смертность в Европейской России за 1893–1896 год. СПб., 1901. С. 156.

[13] Голынец Л. К изучению в медико-топографическом и статистическом отношении губернского города Могилева. СПб., 1887. С. 55.

[14] Бекаревич А. А. К изучению в медико-топографическом и статистическом отношении губернского города Минска. СПб., 1890. С. 55–58, 66–67.

[15] Кошелев В. В. Медико-топографическое описание города Могилева на Днепре. СПб., 1901. С. 30–76.

[16] Кудрявцев Н. В. Медико-топографические соотношения // Вестн. общественной гигиены, судебной и практической медицины. 1893. Т. 20, кн. 2. Отд. 2. С. 49–80; Кн. 3. Отд. 2. С. 103–165.

[17] Уваров М. С. О влиянии отхожих промыслов на санитарное положение России // Вестн. общественной гигиены… 1896. Т. 3, кн. 1. Отд. 2. С. 1–49.

[18] Янсон Ю. Э. Теория статистики. Изд. 1–5. СПб., 1886–1913; Сравнительная статистика России и западноевропейских государств. Т. 1. Территория и население. СПб., 1886; Сравнительная статистика населения. СПб., 1892.

[19] Новосельский С. А. Смертность и продолжительность жизни в России. Пг., 1916; Новосельский С. А., Паевский В. В. Таблицы смертности населения в СССР.

[20] Уиппль Дж. Ч., Новосельский С. А. Основы демографической и санитарной статистики. М., 1929; Внуков Р. Я. Противоречия старой крестьянской семьи. Орел, 1929; Куркин П. Н. Рождаемость и смертность в капиталистических государствах Европы. М., 1938; Птуха М. В. Смертность 11 народностей Европейской России в конце 19 в. Киев, 1927.

[21] Рашин А. Г. Население России за 100 лет. С. 167.

[22] Раков А. А. Население БССР. Мн., 1969; Белоруссия в демографическом измерении. Мн., 1974.

[23] Маськов Л. И. Экономико-статистическое исследование смертности населения в Белоруссии. Дис. … канд. экон. наук. Мн., 1974.

[24] Шахотько Л. П. Рождаемость в дореволюционной Белоруссии // Проблемы народонаселения и трудовых ресурсов. Мн., 1970. Вып. 1. С. 19–37; Рождаемость в БССР. Мн., 1975. С. 28–41; Воспроизводство населения Белорусской ССР. Мн., 1985. С. 7–11.

[25] Миронов Б. Н. Традиционное демографическое поведение крестьян в 19 – начале 20 века // Брачность, рождаемость и смертность в России и СССР. М., 1977. С. 104.

[26] Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мн., 1990; Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. Мн., 1990; Беларусы. Т. 5. Сям'я. Мн., 2001.

[27] Насытка Я. П. Шлюб і шлюбная структура насельніцтва Беларусі ў 60-х гг. 19 ст. – 1914 г. // Гіст. альманах. Гародня, 2002. Т. 6. С. 152–164.

[28] Насевіч В. Структуры сям'і і двара гаспадаркі ў гісторыі Еўропы // Бел. гіст. агляд. Мн., 2000. Т. 6. Сш. 2 (13). С. 469.

[29] Капыскі З., Капыскі Б. Беларуская вёска і яе насельніцтва ў канцы 16 – першай палове 17 ст. Вопыт дэмаграфічнай характарыстыкі // Бел. гіст. часоп. 1993. № 2. С. 43.

[30] Носевич В. Демографические показатели белорусского крестьянства во второй половине XVIII – первой половине XIX в. // Компьютер и историческая демография. Барнаул, 2000. С. 173–198.

1.4. Міграцыі

Перамяшчэнне насельніцтва або яго механічны рух па краіне, ці за яе межы ў той ці іншай ступені існавала ва ўсе часы, але істотна адрозніваласа па прычынах, формах, маштабах і асноўных наступствах. У тэрытарыяльна-адміністрацыйных адносінах міграцыя падзяляецца на знешнюю і ўнутраную. Таму для абазначэння руху насельніцтва за межы пэўнай краіны ўжываецца тэрмін «эміграцыя», а для прыбыўшых з іншых краін «іміграцыя». Перамяшчэнні жыхароў у межах сваёй краіны абазначаюцца тэрмінам «міграцыя». Гэты тэрмін ужываецца і для абазначэння механічнага руху насельніцтва ў цэлым. Беларусь, якая ў разглядаемы час не мела сваёй дзяржаўнасці, з пункту гледжання міграцый насельніцтва можа разглядацца адносна Расійскай імперыі ў цэлым. Менавіта такі падыход і пакладзены ў дадзены аналіз. Міграцыі ў цэлым можна даследаваць з розных пунктаў погляду. Нас у дадзеным выпадку яны цікавяць як складовая частка дэмаграфічных працэсаў, як механічны рух насельніцтва ў яго колькасным і якасным (этнічны, саслоўны, веравызнальны, полава-ўзроставы склад) выражэнні.

Самымі масавымі міграцыямі былі сялянскія перасяленні ў Сібір. Не выпадкова, што менавіта гэтай з'яве была прысвечана большасць даследаванняў тагачасных вучоных. Адным з першых яшчэ ў пачатку 80-х гг. XIX ст. звярнуў увагу на дадзеную праблему М. Ядрынцаў[1]. Кніга яго носіць характар гістарычнага нарыса сібірскага краю, пачынаючы з характарыстыкі прыродна-кліматычных умоў. Значнае месца займаюць сюжэты аб Сібіры як месцы адбыцця катаргі і яе каланізацыі выхадцамі з унутраных

губерняў. Прыведзеныя аўтарам разрозненыя статыстычныя даныя сведчаць, што з 1849 па 1858 гг. у Табольскую губерню перасяліліся 2343 выхадцы з Віцебскай губерні, асноўная маса якіх прыпадае на 1853 г. – 1700 чалавек. У Томскую губерню з пяці заходніх губерняў з 1871 па 1878 гг. прыбыла толькі 24 перасяленцы, а ў Горны Алтай ў 1869 г. – 10 чалавек з Магілёўшчыны[2]. Асноўны ж паток мігрантаў у Сібір да 90-х гг. XIX ст., як сведчыць статыстыка, узятая аўтарам з Казённых палат, ішоў з усходніх губерняў Еўрапейскай Расіі.

З пашырэннем міграцыйных патокаў на ўсход і правядзеннем у гэтых адносінах пэўнай дзяржаўнай палітыкі з мэтай упарадкавання перамяшчэння вялікіх людскіх рэсурсаў навуковая цікавасць да праблемы стала ўзрастаць. Значнае месца тэма міграцый заняла ў навуковай дзейнасці віднага статыстыка і эканаміста А. Каўфмана. Працуючы з 1887 па 1906 гг. у міністэрстве земляробства і дзяржаўных маёмасцей, ён непасрэдна кіраваў перасяленнямі, шмат займаўся пытаннямі аграрнага перанасялення Расіі. Галоўную прычыну гэтага ён бачыў толькі ў нізкай культуры сельскагаспадарчай вытворчасці, ігнаруючы адносіны ўласнасці. А. Каўфман адзначаў, што перасяленні на ўсход у прынцыпе не вырашаць праблему «зямельнай цеснаты», аднак памылкова лічыў павышэнне культуры земляробства сялянскіх гаспадарак адзіным сродкам вырашэння аграрнага пытання.

Адну са сваіх прац А. Каўфман прысвяціў перасяленням у Сібір за перыяд 1895–1899 гг.[3]. Аўтар за кожны год называе пяць губерняў, якія ішлі ў авангардзе перасяленчага руху, у лік якіх з 1896 г. стала ўваходзіць і Віцебская. Канкрэтнай статыстыкі па кожнай губерні ён не дае, а толькі адзначае, што за ўказаны перыяд беларускія і літоўскія губерні «выпусцілі» 13516 сем'яў, больш 1/10 агульнай колькасці і больш за палову ўсіх выхадцаў з нечарназёмнай паласы. Тым самым яны «занялі месца ўсходніх і паўднёва-ўсходніх, дзе перасяленчы рух некалькі аслаб напрыканцы XIX ст.»[4]. Прыводзіцца таксама працэнт самавольных перасяленняў. У заходніх губернях ён найменшы, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, гэтак жа як і ўдзельная вага зваротных перасяленцаў – 12,4% (254 сям'і)[5]. Адзначаецца таксама, што большасць перасяленцаў належыць да сялян сярэдняга дастатку таму, што «багатыя ад дабра дабра не шукаюць, а бедныя не могуць перасяліцца ад нястачы»[6].

У другой працы А. Каўфман больш увагі надае юрыдычным і сацыяльна-эканамічным пытанням перасяленняў: урадавым ука-

зам, іх рэалізацыі і наступствам, эканамічнаму стану каланістаў, іх уладкаванні на новым месцы і г. д.[7]. Прыводзіць таксама акругленыя лічбы перасяленцаў у Сібір з губерняў найбольш масавага выхаду за пэўныя адрэзкі часу. Паводле іх за 1885–1900 гг. Віцебская і Магілёўская губерні далі па 32 тыс. перасяленцаў, Віленская – 13 тыс., прычым толькі за 1899–1902 гг. з Віцебскай перасялілася прыблізна 39, Магілёўскай – 43, Мінскай – 17, Віленскай – 14 тыс. Лічбы яскрава сведчаць аб нарастанні сібірскай міграцыі з Беларусі на мяжы стагоддзяў. Аўтар асноўную ўвагу надае перасяленням з украінскіх губерняў, якія складалі падаўляючую большасць сярод каланістаў і звязвае гэта з найбольшай удзельнай вагой у гэтых губернях зямельных надзелаў меней за 2 дзесяціны на двор[8].

Урадавую перасяленчую палітыку і яе рэалізацыю на практыцы даволі падрабязна апісвае ў сваёй працы С. Патканаў. Штуршком да масавых перасяленняў за Урал, на думку аўтара, паслужылі часовыя правілы ад 10 ліпеня 1881 г., якія давалі пэўныя палёгкі жадаючым пакінуць родныя мясціны. Аднак, баючыся адтоку рабочых рук з цэнтральных рэгіёнаў і развіцця бадзяжніцтва, а таксама ўсведамляючы непадрыхтаванасць да прыёму на новым месцы вялікай людской масы, урад «выдаў дазвол на перасяленне толькі тым асобам, якія па водгуках сялянскіх устаноў сапраўды мелі ў гэтым патрэбу»[9].

Закон ад 13 ліпеня 1889 г. «Аб перасяленні сельскіх абываценяў і мяшчан на казённыя землі» вызваляў ад выплаты недаімак, даваў права на ссуды. Пры гэтым пакідалася ў сіле неабходнасць мець дазвол, самавольныя перасяленцы вярталіся назад у адміністрацыйным парадку. Тым не менш, як піша С. Патканаў, «перапыніць самавольныя перасяленні ўраду аказалася не пад сілу». Аб гэтым сведчаць лічбы: па стану на 1892 г. пераехалі за Урал 28911 сем'яў, у той час як было выдадзена дазволаў на гэта толькі 17289 сем'ям[10]. Гэта вымусіла ўрад указам ад 6 сакавіка 1892 г. часова прыпыніць выдачу дазволаў. Пачалося будаўніцтва Сібірскай чыгункі, разгарнулася падрыхтоўка да прыёму і ўладкавання новых каланістаў[11]. Закон ад 15 красавіка 1896 г. даў новы больш магутны штуршок перасяленчаму руху. Ён даваў права на паніжаны чыгуначны тарыф і дазволіў, хаця і з пэўнымі агаворкамі, самавольныя перасяленні. У тым жа годзе было створана Перасяленчае ўпраўленне, якое кіравала ўсім міграцыйным працэсам[12].

У дарэвалюцыйны час выйшлі і іншыя працы, прысвечаныя каланізацыі Сібіры, у якіх змешчаны некаторыя звесткі аб выхад-

цах з Беларусі[13]. Ёсць даследаванне Н. Простнева, якое цалкам грунтуецца на беларускім матэрыяле і паказвае сялянскія перасяленні ў Сібір з Магілёўскай губерні[14].

Шматлікія пытанні міграцыйных працэсаў у імперыі знаходзілі адлюстраванне на старонках часопіса «Вопросы колонизации», які стаў выходзіць у пачатку XX ст. Аднак з усіх дарэвалюцыйных прац, у якіх даследаваліся міграцыі ў Сібір, сваёй грунтоўнасцю і асабліва наяўнасцю поўнай статыстыкі за кожны год вылучаюцца манаграфіі М. Турчанінава і А. Домрачава, якія даследавалі перасяленчы рух з 1896 па 1914 гг.[15]. Аўтары прыводзяць лічбавыя паказчыкі перасяленцаў за Урал па губернях, а таксама колькасць тых, хто па розных прычынах вярнуўся назад. Аналізуюцца таксама ўмовы, у якія траплялі перасяленцы, цяжкасці і перашкоды, што сустракаліся на іх шляху і г. д.

У 1908 г. Магілёўская губерня выйшла на першае месца ў імперыі па колькасці перасяленцаў у Сібір. Адзначаючы гэта, аўтары не аналізуюць прычыны. Аднак яны вядомы. Для Усходняй Беларусі былі характэрны больш дробныя надзелы зямлі, наяўнасць абшчыны, змешанай сістэмы вядзення панскай гаспадаркі, больш высокі натуральны прырост насельніцтва, у параўнанні з астатняй часткай Беларусі.

У міжваенны час даследаванняў па праблемах міграцый у Сібір было няшмат. У асноўным яны разглядаліся ў сувязі з аграрнай рэформай П. Сталыпіна, як, напрыклад, праца М. Карпава[16]. Сярод беларускіх даследчыкаў у самых шырокіх рысах тэму закраналі М. Доўнар-Запольскі[17], У. Ігнатоўскі[18], А. Смоліч[19].

У 50-я гг. XX ст. даследаванні працягваліся. У 1951 г. выйшла ў свет манаграфія В. Пакшышэўскага[20], а пазней з'явіліся працы С. Дубраўскага[21], С. Сідзельнікава[22], Л. Склярава[23]. Пытанне аб міграцыях беларускіх сялян у сібірскім напрамку ў другой палове XIX ст. даследаваў гісторык Д. Верашчагін[24]. Ён раскрыў прычыны, дынаміку і значэнне міграцый, даў сацыяльна-эканамічную характарыстыку перасяленцаў, прааналізаваў перасяленчую палітыку ўлад. Адзначана, што першая хваля перасяленцаў з Беларусі эпізадычнага характару адбылася ў канцы 60-х гг. XIX ст. Слушна было заўважана, што галоўнымі напрамкамі міграцый з Беларусі ў 60–80-я гг. былі паўднёва-ўсходнія губерні Расіі. У Сібір за дзесяцігоддзе (1885–1895 гг.) перасяліліся толькі 3,9 тыс. чалавек. Усяго, па звестках Д. Верашчагіна, у другой палове XIX ст. з Беларусі ў Сібір перасялілася 104,6 тыс. чалавек. Пры гэтым абсалютная іх большасць прыпадае на апошнія пяць год XIX ст. – 96,2%[25].

Міграцыі з Беларусі дасягалі і Далёкага Усходу. Аб гэтым знаходзім звесткі ў даследаванні У. Кабузана[26]. Аўтар дае перыядызацыю перасяленняў. Першы перыяд пачынаецца ў сярэдзіне XIX ст., калі пачалося засяленне краю і заканчваецца 1882 г. У гэты час перасяленцаў з Беларусі яшчэ не было. У другім перыядзе (1883–1905 гг.) з 4 заходніх губерняў толькі ў Амурскую вобласць прыбылі 3,3 тыс. чалавек. Падаўляючую большасць складалі выхадцы з Магілёўшчыны – 3,2 тыс. А разам з Усурыйскім краем зафіксавана 4,1 тыс. чалавек. Пры гэтым Ковенская і Гродзенская губерні ў перасяленчым руху не ўдзельнічалі[27].

Роля беларускіх губерняў у каланізацыі краю – адзначаў У. Кабузан, – значна ўзрастае ў трэцім перыядзе (1906–1917 гг.), асабліва шмат было выхадцаў з Мінскай і Магілёўскай губерняў. Агульная лічба прыбыўшых склала 19,5 тыс. чалавек, прычым 67,1% – з Магілёўскай губерні. Максімальны паток мігрантаў прыпадае на 1907–1910 гг. У колькасным выражэнні размеркаваліся яны па Амурскай вобласці і Прыморскім краі прыкладна ў аднолькавых долях[28].

У адносінах якаснага складу мігрантаў на усход, што знайшоў адлюстраванне ў літаратуры, можна адзначыць наступнае. Гэта былі, галоўным чынам, перасяленні сялянскія. Распрадаўшы сваю маёмасць, ехалі людзі сярэдняга і маладога ўзросту. Прычым не на часовы тэрмін, з мэтай заробку, а на пастаяннае жыхарства. І ў гэтым прынцыповае адрозненне міграцый у Сібір і Дальні Усход ад механічнага руху насельніцтва ў межах Еўрапейскай Расіі, які ў значнай ступені насіў форму часовых адыходных промыслаў. Знамянальна і тое, што адзінай паўнавартаснай крыніцай для вывучэння руху ў межах Еўрапейскай Расіі з'яўляецца перапіс 1897 г., у той час як перасяленні на ўсход фіксаваліся ўрадавымі органамі кожны год.

Грунтоўнае даследаванне міграцый у межах Еўрапейскай Расіі па матэрыялах перапісу і пашпартнай статыстыкі другой паловы XIX ст. здзейсніў Б. Ціханаў[29]. Аналізуючы колькасць і тэрміны выбраных для часовых заробкаў пашпартоў, ён робіць выснову, што ў беларускіх губернях пераважалі кароткатэрміновыя і гадавыя пашпарты, а сярэдняя працягласць адыхода вагалася ад 4,7 месяцаў (у Мінскай губерні) да 5,9 (у Віленскай)[30].

Перапіс дазволіў вызначыць і напрамкі міграцый, якія аўтар падзяліў на значныя, сярэднія і дробныя. З прыведзенай табліцы відаць, што значны паток насельніцтва з Віцебскай губерні і ў меншай ступені з Віленскай быў накіраваны ў Санкт-Пецярбург-

скую губерню, з Магілёўская і Мінскай – у Кіеўскую, Екацярынаслаўскую і Херсонскую, з Гродзенскай – у Варшаўскую[31]. Б. Ціханаў разлічыў таксама баланс міграцый па губернях. Для гэтага была знойдзена розніца паміж колькасцю немясцовых ураджэнцаў губерняў і тых, хто знаходзіўся па-за межамі сваёй губерні. Лік апошніх ва ўсіх пяці заходніх губернях аказаўся большым. У прыватнасці, у Магілёўскай губерні на 71,8 тыс., Віленскай – 47,4, Мінскай – 34,5, Віцебскай – 32,5, Гродзенскай – на 11,1 тыс. чалавек. А у цэлым адмоўнае сальда міграцый склала 19,7 тыс. чалавек[32].

Колькі ж усяго ўраджэнцаў беларускіх губерняў знаходзілася за іх межамі ў канцы XIX ст.? Перапіс 1897 г. дае лічбу 511,2 тыс. чалавек. Абсалютная большасць (77,0%) асела ў межах Еўрапейскай Расіі, перасяленцы ў Царства Польскае склалі 12,6%, у Сібір і Далёкі Усход – 6,6, на Каўказ, Сярэднюю Азію і Казахстан – 4,8%[33].

Паўстае пытанне, кім лічыць іх – сталымі жыхарамі тых мясцін, дзе яны зафіксаваны перапісам, ці часовымі адыходнікамі? Відавочна, што канкрэтнага і адназначнага адказу знайсці нельга. Не дазваляюць крыніцы. Можна толькі паразважаць. Да прыкладу, М. Аганоўскі лічыць, што паколькі перапіс праводзіўся зімой і часовы адыход быў нязначным, то ў месцах перапісу ўраджэнцаў іншых рэгіёнаў і губерняў трэба лічыць пастаяннымі перасяленцамі[34]. Пагадзіцца з такім меркаваннем можна толькі часткова і толькі ў дачыненні сельскагаспадарчых прац. Між тым значная частка адыходнікаў накіроўвалася на прамысловыя прадпрыемствы поўдня Расіі і Царства Польскага, а таксама на іншыя працы, не звязаныя з парой года. А многія ішлі на заробкі якраз пасля заканчэння палявых работ.

У гэтых адносінах паказальным з'яўляецца раздзел манаграфіі У. Філякова, прысвечаны міграцыям з Беларусі, заснаваны на матэрыялах перапісу 1897 г.[35]. Аўтар устанавіў, што найбольшая колькасць перасяленцаў з пяці заходніх губерняў на момант перапісу зафіксавана на Украіне (147,6 тыс.), асабліва ў Екацярынаслаўскай, Херсонскай і Кіеўскай губернях. Хуткае развіццё паліўна-металургічнай базы на поўдні імперыі – зазначае У. Філякоў, – патрабавала значных рабочых рук. На шахтах Данбаса і рудніках Крывога Рога працавалі беларусы з усіх губерняў, але пераважная большасць з Магілёўскай. Выхадцы з апошняй складалі 10,3% ад усіх рабочых Крыварожскіх руднікоў[36].

У Пецярбургу налічвалася 24,6 тыс. мігрантаў з пяці заходніх губерняў, пераважна з Віцебскай. Яны былі заняты на ўсіх прадпрыемствах і будоўлях горада. Акрамя таго, адзначыў У. Філякоў,

значныя калоніі выхадцаў з Беларусі меліся ў Рызе (11,4 тыс.), Вільні (6,5 тыс.), Маскве і губерні (7,5 тыс.)[37].

Пытаннямі адыходніцтва і міграцыі ў рамках вывучэння сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі і фарміравання пралетарыяту займаўся В. Панюціч[38]. Аўтар разглядзеў прычыны, дынаміку міграцый, якія, на яго думку, насілі эканамічны характар. Ён піша: «Селянін меў права адлучыцца з месца жыхарства па часовых пашпартах і адпускных білетах на тэрмін да аднаго года незалежна ад наяўнасці недаімак выкупных і іншых плацяжоў. Значная частка лішняга сялянскага насельніцтва, не знаходзячы ўжытку сваёй працы ў суседніх памешчыкаў і кулакоў, у мясцовай прамысловай вытворчасці, адпраўлялася ў адыходныя промыслы, пераважна за межы Беларусі»[39].

В. Панюціч адзначае нарастанне адыходніцтва і звязвае гэта з узмацненнем пралетарызацыі і разарэння асноўнай масы сялян. З 1861 па 1900 гг. колькасць адыходнікаў узрасла ў 6,6 разы і дасягнула ў сярэднім да 300 тыс. чалавек у год[40].

Прац, прысвечаных міграцыйным рухам з Беларусі ў канкрэтныя (акрамя ўсходніх) рэгіёны імперыі, няшмат. Звесткі аб перасяленцах з заходніх губерняў у першай палове XIX ст. змешчаны ў даследаванні У. Кабузана[41]. Лічбы, прыведзеныя аўтарам паводле рэвізій, сведчаць аб пачатку асвойвання беларусамі стэпавай зоны. З 1814 па 1830 гг. у Херсонскую і Екацярынаслаўскую губерні перасялілася адпаведна толькі 97 і 69 рэвізскіх душ, у асноўным панскіх сялян[42].

Па звестках В. Зелянчука ў Бесарабіі, згодна перапісу 1897 г., знаходзілася 2400 беларусаў, якія ў асноўным (1600 чал.) пражывалі ў Хацянскім павеце[43]. Праўда В. Бутовіч лічыў, што ў лік беларусаў было ўключана шмат рускіх стараабрадцаў з Беларусі і Літвы[44].

Унутраная міграцыя ў межах Беларусі была накіравана выключна з вёскі ў горад. Дадзенае пытанне па першай палове XIX ст. закранаў у сваёй працы А. Люты[45]. На падставе гістарычных дакументаў ён паказаў, што беларускія гарады раслі пераважна за кошт перасялення туды розных саслоўных груп мясцовага жыхарства: вольных людзей, аднадворцаў шляхты, дзяржаўных сялян, якія на падставе шэрагу ўказаў маглі запісацца ў купцы і мяшчане[46]. Вымушанай міграцыяй у Беларусі былі масавыя перасяленні яўрэяў у гарады і мястэчкі. Гэты працэс, як адзначае А. Люты, у асноўным завяршыўся ў 40-я гг. XIX ст.[47].

Перасяленні ў гарады ў другой палове XIX ст. закрануў В. Панюціч. На падставе афіцыйнай статыстыкі ён падлічыў колькасць

і ўдзельную вагу сялян у гарадах, якіх у 1866 г. налічвалася 12,1 тыс. чалавек, што складала 3,4% гараджан. У тым ліку 66,7% дзяржаўных і 32,3% былых панскіх сялян. Нягледзячы на адносную перанаселенасць гарадоў, праз 30 гадоў колькасць сялян у гарадах вырасла больш як у 10 разоў і склала 123,9 тыс. чалавек. Удзельная вага іх у гарадскім насельніцтве пры гэтым вырасла да 19,1% пры некаторым скарачэнні гарадскіх абывацеляў, мяшчан, купцоў, ганаровых грамадзян[48].

Разам з гэтым В. Панюціч падкрэсліваў, што ў Беларусі прыток сялян у гарады быў значна меншым, чым у іншых рэгіёнах імперыі. Калі ў 1858 г. у цэлым па Расіі сельскае саслоўе складала 30%, то у 1897 г. – 43% гарадскога насельніцтва. Пры гэтым аўтар правільна называе асноўныя прычыны марудных міграцый у гарады Беларусі: адносная перанаселенасць іх яўрэямі і невысокі ўзровень развіцця прамысловасці[49].

Больш падрабязны аналіз міграцый у межах Беларусі правёў З. Шыбека[50]. Аўтар падлічыў, што асноўнай крыніцай папаўнення гараджан у другой палове XIX ст. быў механічны прырост. У 1866–1897 гг. ён склаў 52,4%, натуральны ж – толькі 47,6%. З. Шыбека адзначыў, што сярод перасяленцаў у гарады вядучае месца займалі сяляне-беларусы і мяшчане-яўрэі[51]. Узважваючы крыніцы папаўнення гараджан, З. Шыбека падкрэслівае, што прыток яўрэяў у гарады перакрываўся яшчэ большым іх адтокам у мястэчкі, на Украіну і за мяжу[52].

Асноўны вывад, які робіць аўтар з даследавання, заключаецца ў тым, што галоўным рэсурсам, з якога папаўняліся беларускія гарады ў парэформены час была вёска. Яўрэйства іграла толькі эпізадычную ролю, паколькі многія гарады яшчэ ў першай палове XIX ст. складаліся з яўрэйскага этнасу, які ў «моры» беларускага не мог быць вырашальнай крыніцай папаўнення гарадоў Беларусі[53].

Такім чынам, праблема міграцый беларускага насельніцтва ў дэмаграфічным сэнсе ў Расійскай імперыі ў гістарычнай літаратуры вывучана даволі поўна і аб'ектыўна. Зрабіць гэта ўдалося, дзякуючы наяўнасці неабходнага архіўнага і апублікаванага матэрыялу, які дазваляе вызначыць асноўныя напрамкі міграцый, іх саслоўны і, у шэрагу выпадкаў, пола-ўзроставы склад.

Перамяшчэнні насельніцтва ў Расійскай імперыі адбываліся не толькі ў межах краіны. У канцы XIX ст. пачалася эміграцыя за яе межы, якая ахапіла найперш заходнія губерні. Гэта было новай з'явай у грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Гістарыяграфію па эміграцыі праблематыцы можна падзяліць на наступныя пе-

рыяды: 1) дарэвалюцыйны час; 2) 20–30-я гг. XX ст.; 3) 50–80-я гг.; 4) 90-я гг. XX ст. – пач. XXI ст.

Дарэвалюцыйная гістарыяграфія дадзенай праблемы прысвечана замежным перамяшчэнням насельніцтва Расіі ў цэлым, у тым ліку і з заходніх губерняў. Аўтары ставілі цэлы шэраг праблем, на якія ў той ці іншай ступені спрабавалі даць адказ. Тэматыку прац гэтага перыяду можна ўмоўна падзяліць на тры часткі: прысвечаныя эміграцыі за акіян, у краіны Еўропы, а таксама агульнай эміграцыйнай праблематыцы.

У канцы XIX ст. Германія, якая хуткімі тэмпамі развівала сваю прамысловасць, цалкам паглынула адносна свабодныя рабочыя рукі, якія меліся ў сельскай гаспадарцы. Многія немцы перасяліліся на свабодныя землі ў Паўночнай Амерыцы. У выніку сельская гаспадарка краіны аказалася ў дэмаграфічным вакууме. Асабліва абязлюдзела Прусія, дзе панавала буйное землеўладанне памешчыкаў. Палітыка ўрада ў такіх умовах была накіравана на прыцягненне іншаземнай рабочай сілы. Шырокі размах набыла сезонная іміграцыя рабочых з Італіі, Аўстра-Венгрыі і Расіі.

Праблеме сезоннага адыходу з Расіі прысвяціў сваю працу К. Лейцэс[54]. Аўтар зрабіў спробу вырашыць шэраг пытанняў: прычыны нарастаючай сезоннай іміграцыі ў Германію; уплыў адыходу на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё; эканамічнае і прававое становішча эмігрантаў; залежнасць германскай сельскай гаспадаркі ад рабочых рук з Расіі; колькасць, роля і значэнне зароблены сродкаў і інш.

К. Лайтэс, спасылаючыся на апублікаваную германскую статыстыку, сведчыць, што расійскія рабочыя складалі абсалютную большасць сярод імігрантаў і іх прыток з гадамі нарастаў. Паводле падлікаў аўтара прыкладна 90% сезонных імігрантаў у Германіі складалі палякі[55].

На значную дыспрапорцыю палякаў і рускіх сярод адыходнікаў у Германію звярнуў увагу К. Воблый. Ён пісаў: «Сярод выхадцаў з Расіі асноўную масу складаюць палякі... Нізкая лічба рускіх рабочых здзіўляе мяне. Магчыма, што тут вінаваты рэгістрацыйныя органы, якія нацыянальнасць прышлых рабочых устанаўліваюць не вельмі дасканала»[56].

Што да беларусаў, ці дакладней сказаць выхадцаў з беларускіх і літоўскіх губерняў, то афіцыйная статыстыка іх прылічвала да палякаў. На гэтую акалічнасць, абапіраючыся на архіўныя матэрыялы, звярнуў увагу С. Дуброўскі[57]. Значная частка беларусаў, відаць, была аднесена да рускіх. Справа ў тым, што выхадцы

з цэнтральных расійскіх губерняў у адыходзе на сезонныя работы ў Германію значнага ўдзелу не прымалі. Ускосна аб геаграфіі выхаду імігрантаў-адыходнікаў у Германію сведчыць табліца, якую прыводзіць у сваёй працы Я. Палфёраў. Аўтар не ўказвае на якія крыніцы ён спасылаўся, тым не менш можна зрабіць выснову: у адыходніцкім руху ўдзельнічалі тэрыторыі, якія геаграфічна былі адносна бліжэйшымі да краіны адыходу. Паводле Я. Палфёрава, гэта жыхары Царства Польскага, Прыбалтыйскага, Паўночна-Заходняга краю, Маларасіі і Новарасіі. Як бачым, цэнтральныя губерні Расіі нават не фігуруюць.

У цэлым вызначыць колькасць расійскіх імігрантаў у Германію на сезонныя работы дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, якая была нешматлікай, не ўдалося і найперш з прычыны вузкай базы крыніц. Асноўны пафас, які гучыць у згаданых працах і больш дробных артыкулах, гэта, на нашу думку, «псеўдапатрыятызм». Яскрава апісваецца бяспраўнае становішча адыходнікаў, цяжкасці пры атрыманні пашпартоў, шкодная дзейнасць агентаў-вярбоўшчыкаў, штрафы за пратэрміноўку пашпартоў і г. д.

Значна больш дарэвалюцыйнай літаратуры прысвечана імігранцкаму руху з Расіі за акіян, а менавіта ў ЗША[58]. Сапраўды, на мяжы XIX і XX стст. выезд у ЗША з Еўропы насіў масавы характар. Першынство ў гэтай справе належала Расіі і Аўстра-Венгрыі.

У кнізе Ю. Філіпава аналізуюцца розныя бакі эмігранцкага руху і заканадаўства вядучых краін Еўропы і ЗША па імігранцкім пытанні, рост кантынгенту неквалiфікаваных рабочых і ўмовы іх жыцця, склад эмігрантаў і інш. Пры гэтым іміграцыі з Расіі прысвечана нязначная частка працы[59].

Коратка закрануў расійскую іміграцыю за акіян, у асноўным з польскіх губерняў, К. Воблый. Ён правільна вызначыў яе прычыны: наяўнасць буйнога панскага землеўладання, значны працэнт малазямельных сялян, высокая арэндная плата, недастатковае развіццё прамысловасці.

Пэўную цікавасць вызывае праца С. Патканава, прысвечаная расійскай эміграцыі ў ЗША за першае дзесяцігоддзе XX ст.[60]. Прааналізаваўшы значны статыстычны матэрыял, ён прыйшоў да высновы, што большасць выхадцаў з Расіі, якія працуюць у шахтах, рудніках, на фабрыках і заводах, на радзіме не займаліся сельскай гаспадаркай. На самой жа справе было якраз наадварот. Большасць імігрантаў былі сялянамі. У ЗША яны ехалі на часовыя заробкі, але звязаць сябе там з сельскай гаспадаркай было вельмі складана. Асноўная прычына ў тым, што прыгодныя землі былі

ўжо занятыя першай хваляй эмігрантаў з краін Заходняй Еўропы.

Аб'ектыўную крытыку іміграцыйнай палітыкі Расіі змяшчае праца П. Цізенкі. Ён лічыў, што з-за розных перашкод, якія чынілі ўлады краіны, большасць эмігрантаў імкнулася дасягнуць германскіх портаў, а не галоўнага расійскага – Лібавы. Гэта прыводзіла, на думку аўтара, да значных фінансавых страт чыгуначнага і марскога транспарту Расіі. А стрымліванне руху спарадзіла сітуацыю, калі значная частка жадаючых пакінуць радзіму выязджала за акіян употай. Удзельная вага такіх эмігрантаў, паводле П. Цізенкі, у пачатку XX ст. складала 75%[61].

Ці можна вызначыць колькасць заакіянскіх імігрантаў менавіта з Беларусі? Дарэвалюцыйная гістарыяграфія адказу на гэтае пытанне не дае. І справа тут заключаецца ў стане першакрыніц. Расійская і замежная статыстыкі не пакінула нам звестак аб беларусах таму, што яны, як і ўкраінцы, аб'ядноўваліся ў адну групу – рускія. І гэта пры тым, што з 1899 г. іміграцыйная служба ЗША рэгістравала імігрантаў, зыходзячы не з месца прыбыцця, а па роднай мове. Моўны крытэрый быў пакладзены і ў аснову перапісу насельніцтва краіны 1910 г.

Л. Афросімаў, які даследаваў эміграцыю з Віленскай губерні ў 1908–1910 гг., пісаў: «Групавання імігрантаў па нацыянальнасці мне не ўдалося зрабіць з той прычыны, што большая частка ад'ехаўшых і вярнуўшыхся і сама не магла вырашыць, да якой нацыянальнасці сябе далучыць. Называлі сябе літоўцамі толькі тыя, хто дрэнна размаўляе па-руску; той хто непасрэдна валодае альбо польскай, альбо рускай мовай ужо называе сябе католікам, а на пытанне, ці не паляк ён звычайна адказвае, што магчыма католік і паляк адно і тое ж. Праваслаўнае насельніцтва лічыць сябе рускім на той жа падставе, уяўляючы, што праваслаўны і рускі – гэта сінонім. Пры такіх умовах наўрад ці прадставіцца магчымасць разгрупаваць эмігрантаў па нацыянальнасці»[62]. Што да колькасці эмігрантаў з Беларусі, то гэта вельмі значная праблема. Л. Афросімаў падлічыў, што з Віленскай губерні за 3 гады (1908–1910) у Амерыку выехала 9959 чалавек[63].

Рэдактар «Нашай нівы» А. Уласаў прапанаваў сваю методыку падліку. За ўзор ён узяў прыклад Радашковіцкай воласці, адкуль на кожныя 100 жыхароў выехала 7 чалавек. У Беларусі ў той жа час было 1008 валасцей. Газета апублікавала і больш канкрэтныя лічбы: у 1913 г. праз Лібаву ў Амерыку выехала 58507 чалавек, з іх 21791 – з пяці заходніх губерняў, пераважна з Мінскай і Гродзен-

скай (адпаведна 8,4 і 7,0 тыс.)[64]. Дадзеныя лічбы цяжка праверыць, паколькі спасылкі па першакрыніцы адсутнічаюць. Адно бясспрэчна – эміграцыя за акіян з кожным годам нарастала.

Аб гэтым сведчаць даследаванні 20–30-х гг. XX ст. З манаграфій гэтага перыяду можна вылучыць працу В. Абаленскага (Асінскага), які ўпершыню паспрабаваў даць перыядызацыю іміграцыйных працэсаў у Расіі і аналіз імігрантаў рабіў на падставе не рэлігійнай, а нацыянальнай прыналежнасці. З прыведзенай аўтарам табліцы вынікае, што з 1899 па 1913 гг. сярод усіх імігрантаў з Расіі 41% складалі яўрэі, 29% – палякі, 9% – літоўцы і латышы, 7% – рускія. Да апошніх былі аднесены таксама беларусы і ўкраінцы[65]. Сярод рускіх 88,1% складалі сяляне, некваліфікаваныя рабочыя і прыслуга. Пры гэтым паказальна, што з іх 29,2% вярнуліся на радзіму[66].

У 20-я гг. XX ст. тэма эміграцыі знайшла некаторае адлюстраванне ў працах навукоўцаў Беларусі: гісторыка У. Ігнатоўскага і географа А. Смоліча[67]. Затым праблемы эміграцыі фактычна не распрацоўваліся. Узнавіліся яны толькі з сярэдзіны 50-х гадоў. Бадай што першай была манаграфія Л. Баграмава[68]. Характэрнай асаблівасцю «новай» хвалі іміграцыі ў ЗША, паводле аўтара, з'яўлялася часовае знаходжанне там з мэтай заробку. На 100 прыбыўшых у 1901–1910 гг. прыходзілася 38 выбыўшых. Характарызуючы нацыянальны склад эмігрантаў, аўтар робіць выснову, што расійская эміграцыя ў ЗША складалася ў асноўным з нацыянальных меншасцей. Пры гэтым прыводзіць лічбавыя паказчыкі: за 1899–1910 гг. з усіх прыбыўшых 43,8% складалі яўрэі, 27 – палякі, 9,6 – літоўцы, 8,5 – фіны, 5,8 – немцы, 4,4% – рускія[69]. Пазней з'явіліся працы, прысвечаныя агульным праблемам іміграцыі ў ЗША, у тым ліку і ў дарэвалюцыйны перыяд[70].

Некалькі манаграфій прысвечаны непасрэдна праблемам дарэвалюцыйнай іміграцыі[71]. У агульным кантэксце найбольш матэрыялу па Беларусі прысутнічае ў кнізе Л. Тударану. Яго праца прысвечана працоўнай іміграцыі ў еўрапейскія краіны (Германію і Данію) і ЗША[72].

Упершыню ў савецкай гістарыяграфіі вызначыць колькасць расійскіх сельскагаспадарчых рабочых у Германіі паспрабаваў С. Дуброўскі. У выніку ён прыйшоў да высновы, што адыходам у Германію і Данію штогод было ахоплена каля 800 тыс. чалавек[73]. Гэтую лічбу аспрэчваў Л. Тударану, які лічыў, што значная колькасць эмігрантаў з Расіі праз Германію адпраўлялася далей за акіян. Рэальнай лічбай, на думку аўтара, будзе не болей за 406 тыс., з іх

каля 350 тыс. працавалі ў Германіі, і каля 50 тыс. – у іншых еўрапейскіх краінах.

З 90-х гг. XX ст. пачынаецца новы перыяд у вывучэнні масавага выхаду беларускага насельніцтва ў краіны Еўропы і Амерыкі. Атрыманне Беларуссю незалежнасці, кантакты з беларускім замежжам, доступ да новых крыніц стымулявалі цікавасць да праблемы сярод айчынных вучоных і дыяспары. Праўда большасць даследаванняў прадстаўлены ў выглядзе артыкулаў газет і часопісаў. Так, А. Латышонак зрабіў спробу даць кароткую характарыстыку напрамкаў беларускай іміграцыі на працягу XX ст.[74]. Ён называе тры яе хвалі: на мяжы XIX і XX ст., у міжваенны перыяд і пасляваенны. На захад, на думку А. Латышонка, спачатку рушыла каталіцкае насельніцтва заходняй часткі Беларусі. Затым хваля іміграцыі ахапіла цэнтральную Беларусь і, у меншай ступені, усходнюю. Першая хваля насіла чыста эканамічны характар, у якой удзельнічалі пераважна сяляне, якія былі цалкам пазбаўлены нацыянальнай свядомасці, паколькі, на думку аўтара, уліліся ў польскую і рускую дыяспары. Акрамя ЗША з 90-х гг. XIX ст., і асабліва ў 1912–1913 гг., беларусы накіроўваліся ў Канаду, Бразілію, Аргенціну. Усяго да Першай сусветнай вайны, па меркаванні А. Латышонка, з Беларусі выехала каля 800 тыс. чалавек, з іх 600 тыс. вярнуліся на радзіму. Цікавы матэрыял пра беларусаў у Аргенціне змешчаны ў серыі артыкулаў К. Шалястовіча[75]. Па яго падліках з Беларусі ў Бразілію і Аргенціну да 1914 г. выехала 30–40 тыс. чалавек.

Беларусам у ЗША прысвяціў сваю манаграфію В. Кіпель, у якой на вялікім фактычным матэрыяле паказаў працэс натуралізацыі беларускіх эмігрантаў у амерыканскае грамадства, стварэнне і ролю беларускіх арганізацый і г. д.[76].

Важкі ўклад у распрацоўку дадзенай праблематыкі ўнёс беларускі гісторык А. Ціхаміраў, які даследаваў беларускую эміграцыю ў дакастрычніцкі час[77]. Ім асветлены такія пытанні, як пачатак фарміравання беларускай дыяспары, сацыяльна-эканамічнае становішча эмігрантаў, іх грамадска-палітычнае жыццё. Акрамя апублікаваных крыніц і прац сваіх папярэднікаў аўтар шырока выкарыстаў архіўныя матэрыялы. Ён высветліў, што першымі эмігрантамі за акіян былі яўрэі, якія сталі пакідаць заходнія губерні з 1880 г. Масавы характар яўрэйская эміграцыя набыла пасля першай рэвалюцыі. Прычыны былі як эканамічныя, так і палітычныя. Ад'езд за мяжу беларусаў тлумачыцца амаль выключна эканамічнымі прычынамі.

Першую хвалю эміграцыі А. Ціхаміраў называе самай масавай у гісторыі Беларусі. Пры гэтым адзначае, што канкрэтныя лічбы выезду яўрэяў і беларусаў прывесці цяжка з-за адсутнасці дасканалай статыстыкі і вялікай колькасці нелегалаў[78]. Аб тым, што рух нарастаў, адзначае аўтар, сведчаць справаздачы губернатараў.

Аўтар аналізуе таксама структуру эмігрантаў па полу, узросту, занятках. Калі яўрэі ехалі звычайна з сем'ямі на сталае пражыванне, то сярод беларусаў пераважалі нежанатыя мужчыны ва ўзросце 18–35 гадоў, што сведчыла аб часовым знаходжанні апошніх за мяжой з мэтай заробку[79].

Пры ўсёй шматпланавасці эміграцыйных працэсаў самым важным падаецца пытанне аб колькасці выехаўшых за межы краю. Адназначнага адказу на дадзенае пытанне няма. Па падліках беларускіх дэмографаў і эканамістаў каля 40 год таму за перыяд з 1867 па 1917 г. Беларусь пакінула 1387 тыс. чалавек[80]. А. Ціхаміраў лічыць, што з іх каля 733 тыс. мігравала ў межах імперыі, каля 150 тыс. выходзіла ў еўрапейскія краіны, а прыкладна 500 тыс. аказаліся на Амерыканскім кантыненце. Гэтай жа лічбы прытрымліваліся географ А. Смоліч[81], дэмограф С. Мацюхін[82], гісторык В. Кіпель[83].

Ёсць і іншыя меркаванні, нават палярныя. Так, дэмограф А. Пешкава лічыць, што за акіянам апынулася толькі 100 тыс. выхадцаў з Беларусі[84], Я. Дыла называе лічбу 1 млн[85]. А. Латышонак салідарны з В. Шчарбаковым – каля 800 тыс.[86]. В. Панюціч спыняецца на лічбе 600 тыс.[87].

Такія разыходжанні звязаны з недакладнасцю дарэвалюцыйнай статыстыкі і рознай методыкай падлікаў, якую ўжывае кожны даследчык. Таму відаць, мае рацыю В. Кіпель, калі піша, што больш дакладныя лічбы і навукова абгрунтаваныя вынікі могуць быць дасягнуты ў будучыні, калі будуць ужыты новыя методыкі і стануць даступнымі новыя крыніцы[88].

Апошнім часам даследчыкі сталі вывучаць беларускую дыяспару ў іншых краінах. У прыватнасці Н. Гардзіенка выдала кнігу, прысвечаную аўстралійцам – выхадцам з Беларусі[89]. Праўда, дакастрычніцкая іміграцыя на далёкі кантынент прадстаўлена нязначна. Згадваюцца толькі асобы, якія нечым праславіліся там у пэўнай сферы дзейнасці. Невялікі экскурс у мінулае засялення Аўстраліі робіць сын нашага славутага земляка, віднага палітычнага дзеяча Аўстраліі А. Алехнік[90]. Асноўны паток імігрантаў з Беларусі, адзначыў ён, прыпадае на пасляваенны перыяд.

Матэрыялы, прысвечаныя беларусам замежжа, часта змяшчаюцца на старонках часопіса «Кантакты і дыялогі». У прыватнасці асвятляюцца пытанні навукова-культурных асяродкаў дыяспары, беларускага друку на Захадзе, увасабленне мадэлі нацыянальнага быцця ў прозе беларускай іміграцыі і інш.

Яшчэ адну праблему іміграцыі, што патрабуе вывучэння, абазначыў В. Кіпель. Ён піша: «Мне здаецца, што гаворачы пра беларускую іміграцыю ў Амерыцы, мы недаацэньваем тую яе хвалю, што пачалася пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і мела, у значнай ступені, палітычны характар. Важна падкрэсліць, што перасяленцы пачатку XIX ст., пераважна каталіцкага веравызначэння, акцэнтавалі ўвагу на тым, што яны ліцвіны, ліцвінскага роду... Гэтая частка дыяспары была ў нас апошняй, хто яшчэ трымаўся назову ліцвіны. Яе прадстаўнікі, як пра гэта сведчыць англамоўны друк і шмат якія архіўныя дакументы, перапіска з роднымі, папярэджвалі Захад аб небяспецы для Еўропы Расійскай імперыі, а таксама вынішчэння традыцыйных звычаяў мясцовага жыхарства, іх тоеснасці»[91].

Такім чынам, у дарэвалюцыйнай, савецкай і асабліва беларускай гістарыяграфіі апошняга часу назапашаны значны вопыт у асэнсаванні такой важнай і складанай грамадскай з'явы, як эміграцыя. Вызначаны яе асноўныя прычыны і напрамкі. Аўтары не разыходзяцца ў думцы, што матывы пакідаць родны край насілі амаль выключна эканамічны характар. У далейшым неабходны новыя даследаванні з прыцягненнем новых крыніц і выкарыстаннем перадавых методык колькасных падлікаў.

---

[1] Ядрынцев Н. М. Сибирь как колония. СПб., 1882.

[2] Там жа. С. 456–457, 459–461.

[3] Кауфман А. А. Сибирское переселение на исходе XIX века. Историко-статистический очерк. СПб., 1901.

[4] Там жа. С. 48, 49.

[5] Там жа. С. 53, 97.

[6] Там жа. С. 51.

[7] Кауфман А. А. Переселение и колонизация. СПб., 1905.

[8] Там жа. С. 170, 171.

[9] Патканов С. Краткий очерк колонизации Сибири // Ежегодник России. 1907 г. СПб., 1908. С. XXIX.

[10] Там жа. С. XXII–XXIX.

[11] Там жа. С. XXVIII–XXIX.

[12] Там жа. С. XXIX.

[13] Гурвич И. А. Переселение крестьян в Сибирь. СПб., 1888; Ставровский Я. Ф., Алексеев В. В. Переселение крестьян в Сибирь. СПб.,

1906; Ядринцев Н. М. Из наблюдений над переселенцами в Западной Сибири летом 1892 г. // Землеведение. М., 1894. Кн. 4; Серповский Н. О переселении в древнее и новое время. СПб., 1885.

[14] Простнев Н. Г. Крестьянские переселения Могилёвской губернии с 1 января 1897 по 1 мая 1909 г. (за пределы губернии). Могилев-на-Днепре, 1910.

[15] Турчанинов Н. Итоги переселенческого движения за время с 1896 по 1909 г. (включительно). СПб., 1910; Турчанинов Н., Домрачев А. Итоги переселенческого движения за время с 1910 по 1914 г. Пг., 1916.

[16] Карпов Н. Аграрная политика Столыпина. Л., 1925.

[17] Довнар-Запольский М. М. Народное хозяйство Белоруссии. 1961–1914 гг. Мн., 1926.

[18] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1926. С. 171; Белоруссия. Территория, население, экономика и важнейшие мотивы истории. Мн., 1924.

[19] Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. Мн., 1924.

[20] Покшишевский В. В. Заселение Сибири (историко-географический очерк). Иркутск, 1951.

[21] Дубровский С. М. Столыпинская аграрная реформа. М., 1963.

[22] Сидельников С. М. Аграрная реформа Столыпина. М., 1973.

[23] Скляров Л. Ф. Переселение и землеустройство в Сибири в годы столыпинской аграрной реформы. Л., 1962.

[24] Верещагин Д. П. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.). Мн., 1978; Ён жа. Из истории аграрных миграций крестьянства Белоруссии в период капитализма. (Некоторые выводы из статистики крестьянских переселений в 80-х – первой половине 90-х годов) // Из истории крестьянства Белоруссии. Мн., 1978.

[25] Верещагин Д. П. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.). С. 68–70, 74–75, 94–95.

[26] Кабузан В. Н. Дальневосточный край в XVII – начале XX вв. (1640–1917). Историко-демографический очерк. М., 1985.

[27] Там жа. С.122.

[28] Там жа. С. 147–148, 199–200.

[29] Тихонов Б. В. Переселения в России во второй половине XIX в. М., 1978.

[30] Там жа. С. 140, 142.

[31] Там жа. Дадатак 2.

[32] Там жа.

[33] Общий свод по империи результатов разработки данных первой всеобщей переписи населения. СПб., 1905. Вып. 1. С. 2, 124–127, 142–145.

[34] Огановский Н. П. Обновление земледельческой России и аграрная политика. Население. Переселенческий вопрос. М., 1914. Вып. 1. С. 48.

[35] Филяков В. Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. Мн., 1987.

[36] Там жа. С. 24.

[37] Там жа. С. 22–23.

[38] Панютич В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861–1914 гг.; Ён жа. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990.

[39] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. С. 56.

[40] Там жа. С. 57–58.

[41] Кабузан В. М. Заселение Новороссии в XVIII – первой половине XIX века. М., 1976.

[42] Там жа. С. 299–301, 304–305.

[43] Зеленчук В. М. Население Бессарабии и Поднестровья в XIX в. Кишинёв, 1979. С. 225.

[44] Бутович В. Н. Материалы для этнографической карты Бессарабской губернии. Киев, 1916. С. 11.

[45] Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. Мн., 1987.

[46] Там жа. С. 37–38, 43, 52, 60.

[47] Там жа.

[48] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. С. 49.

[49] Там жа. С. 50.

[50] Шыбека З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). Мн., 1997.

[51] Там жа. С. 150.

[52] Там жа.

[53] Там жа.

[54] Лейтес К. С. Русские рабочие в германском сельском хозяйстве. Пг., 1914.

[55] Там жа. С. 17, 23, 24, 27.

[56] Воблый К. Г. Отход на заработки в Германию и русско-германский торговый договор // Труды юго-западного отделения Российской экспортной палаты. Киев, 1914. С. 7.

[57] Дубровский С. М. Сельское хозяйство и крестьянство в России. М., 1975. С. 350.

[58] Филиппов Ю. Д. Эмиграция. СПб., 1906; Тизенко П. Эмиграционный вопрос в России. 1820–1910. Либава, 1909; Паткапов С. Итоги статистики иммиграции в Соединенные Штаты Северной Америки из России за десятилетие 1900–1909. СПб., 1911; Курчевский Б. О русской эмиграции в Америку. Либава, 1914; Щербатский А. А. Русская эмиграция в Соединенные Штаты // Известия МИД. 1914. Кн. VI; Бородин Н. А. Северо-Американские Соединенные Штаты и Россия. Пг., 1915; Офросимов Л. С. Отхожий промысел за океан: Обследование Виленской губернии. Вильно, 1912 и др.

[59] Филиппов Ю. Д. Эмиграция. СПб., 1906.

[60] Патканов С. Итоги статистики иммиграции в Соединенные Штаты Северной Америки за десятилетие 1900–1909 гг. СПб., 1911.

[61] Тизенко П. Эмиграционный вопрос в России. 1820–1910. С. 34.

[62] Офросимов Л. С. Отхожий промысел за океан: Обследование Виленской губернии. С. 7–8.

[63] Там жа. С. 8.

[64] Наша Ніва. 1913. № 43.

[65] Оболенский (Осинский) В. В. Международные и межконтинентальные миграции в довоенной России и СССР. М., 1928. С. 23.

[66] Там жа. С. 25.

[67] Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. Мн., 1924; Ігнатоўскі У. М. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX ст. Мн., 1928.

[68] Баграмов Л. А. Иммиграция в США. М., 1957.

[69] Там жа. С. 29, 32.

[70] Плетнев Э. П. Международная миграция рабочей силы в капиталистической системе мирового хозяйства. М., 1962; Шлепаков А. Н. Иммиграция и американский рабочий класс в эпоху империализма. М., 1966; Нации Латинской Америки. Формирование. Развитие. М., 1964; Берзина М. Я. Формирование этнического состава населения Канады. М., 1971; Филиппов В. П. США: иммиграция и гражданство. Политика и законодательство. М., 1973; Национальные проблемы Канады. М., 1972; Национальные процессы в США. М., 1973; Стрелко А. А. Славянское население в странах Латинской Америки. Киев, 1980; Афанасьев А. Л. Полынь в чужих полях. М., 1987.

[71] Королев Н. В. Страны Южной Америки и Россия (1890–1917 гг.). Кишинев, 1972; Тудоряну Л. А. Очерки российской трудовой эмиграции периода империализма. 1890–1914. Кишинев, 1986; Черненко А. М. Российская революционная эмиграция в Америке (конец XIX в. – 1917 г.). Киев, 1989.

[72] Тудоряну Н. Л. Очерки российской трудовой эмиграции периода империализма. Кишинев, 1986.

[73] Дубровский С. М. Сельское хозяйство и крестьянство в России в период империализма. М., 1975. С. 350.

[74] Латышонак А. Беларуская эміграцыя на працягу стагоддзя // Чырвоная змена. 1991. 28 студз. – 3 лютага.

[75] Шалястовіч К. І. Беларусы Аргенціны // Голас Радзімы. 1993. 8 красав. – 6 мая.

[76] Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993.

[77] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Мн., 2005. Т. 4.

[78] Гісторыя Беларусі. Т. 4. С. 376–377.

[79] Там жа. С. 378.

[80] Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет. Мн., 1967. С. 20.

[81] Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі… С. 54.

[82] Советская Белоруссия. 1990. 25 марта.

[83] Кіпель В. Беларусы ў ЗША. С. 40.

[84] Літ. і мастацтва. 1989. 3 сакав.

[85] Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі… С. 125.

[86] Шчарбакоў В. К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя. Мн., 1930. С. 125; Латышонак А. Беларуская эміграцыя на працягу стагоддзя.

[87] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни. 1861–1900 гг. Мн., 1990. С. 58.

[88] Кіпель В. Беларусы ў ЗША. С. 40.

[89] Гардзіенка Н. Беларусы ў Аўстраліі. Мн., 2004.

[90] Алехнік А. Нашы аўстралійцы // Бел. мінуўшчына. 1994. № 4. С. 55.

[91] Кантакты і дыялогі. 2002. № 3–4. С. 16–17.

Раздзел 2

САСЛОЎНАЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРСКАГА ЎРАДА Ў БЕЛАРУСІ: НАПРАМКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ. БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ

2.1. Саслоўная палітыка

Дасавецкая расійская гістарыяграфія прадстаўлена адзінай працай В. Ключэўскага[1], у якой разглядаецца гісторыя ўсіх саслоўяў Расійскай імперыі комплексна. Акрамя гістарычнага працэсу іх фарміравання да XIX ст., аўтар прааналізаваў заканадаўчыя меры, якія прымаліся ўрадам імперыі, даў ацэнку сучаснай яму гістарыяграфіі па гэтай праблеме. Падкрэсліўшы пры гэтым, што вывучэнне гісторыі саслоўяў пачалося не раней 50-х гг. XIX ст.

Гісторыя саслоўяў і адпаведна палітыка царскага ўрада ў адносінах да іх разглядаліся паасобку. Большасць грунтоўных даследаванняў прысвечана дваранству. Сярод іх вылучаюцца працы М. Яблачкава, С. Корфа і А. Рамановіча-Славацінскага[2]. Іх агульнай рысай з'яўляецца вялікі фактычны матэрыял, на аснове якога паказана структура, сістэма кіравання, заканадаўчыя акты, якія прымаў урад, фарміруючы і падтрымліваючы гэтае саслоўе, як вышэйшае ў дзяржаве. Палітыку Паўла I у адносінах да дваранства разгледзеў і М. Клачкоў[3]. Ён вызначыў некаторыя рысы абмежавальнага напрамку палітыкі тагачаснага ўрада ў адносінах да вышэйшага саслоўя. Сярод іх: адносіны да дваранскіх сходаў (скасаваны губернскія сходы; зменшылася колькасць асоб, якія мелі правы ў іх удзельнічаць; яны былі пастаўлены ў большую залежнасць ад мясцовай і цэнтральнай адміністрацыі); адносіны да дваранскіх выбараў (устанаўленне новага скарочанага абраду; значнае скарачэнне колькасці асоб, якія выбіраліся дваранствам на пасады і прызначэнне на некаторыя пасады замест выбарнасці)[4]. Рэформам мясцовага кіравання ў час праўлення Кацярыны II прысвечана праца В. Грыгор'ева[5], у якой ён разглядзеў выбары асоб дваранскага саслоўя на пасады ў земскія і гарадскія суды.

Значна менш было даследаванняў па гісторыі іншых саслоўяў. Працэсу фарміравання духоўнага і гарадскога саслоўяў прысвяцілі свае працы І. Знаменскі, І. Дзіцяцін, А. Кізеветэр[6] і інш. Эканаміч-

нае становішча рускага сялянства разглядаў І. Гурвіч[7]. Аўтары вышэйназваных прац, хаця і закранаюць асобныя аспекты саслоўнай палітыкі, але практычна не робяць ніякіх высноў. Яны толькі прапануюць, у храналагічнай паслядоўнасці, грунтоўны і каштоўны фактычны матэрыял, што было характэрна для гістарыяграфіі таго часу.

У дачыненні да канца XVIII – першай паловы XIX ст. у працах даследчыкаў дваранства асаблівых разыходжанняў не назіралася. Разам з тым, гэтыя ж аўтары выказваюць розныя думкі аб зменах, якія адбываліся ў другой палове XIX ст., у час так званых «вялікіх рэформ». М. Яблачкаў, напрыклад, палічыў, што пасле рэформ 60-х гг. у Расіі ўсе саслоўі аказаліся роўнымі перад законам і вярхоўнай уладай, але асобныя правы і абавязкі кожнага саслоўя павінны былі застацца без змен[8]. На думку ж С. Корфа, разам з адменай прыгоннага права была знішчана «істотная прыкмета дваранства» (валоданне прыгоннымі. – *Аўт.*), а астатнія рэформы канчаткова разбурылі саслоўны лад[9]. Цікавую думку, адносна вынікаў гэтых рэформ, выказаў А. Пазухін[10]. Ён палічыў, што адмена прыгоннага права паставіла дваранства і сялянства ва ўмову эканамічнай барацьбы. А земская і гарадская рэформы парушылі гістарычны лад жыцця, бо яны «вельмі хутка разладзілі парадак, які трымаўся на моцнай сувязі саслоўных карпарацый з вярхоўнай уладай». Аўтар пісаў, што разам з паступовым разбурэннем саслоўяў пачало павялічвацца «бессаслоўнае грамадства», якое атрымала назву інтэлігенцыя, а бессаслоўнасць, на яго думку, не магла стаць асновай грамадскага жыцця[11]. Такія думкі сучаснікаў сведчылі аб тым, што нягледзячы на зберажэнне саслоўяў у краіне ў час рэформ ішоў працэс іх ломкі.

Шэраг прац быў прысвечаны саслоўнай гісторыі Беларусі і Літвы. Так, спробе кадыфікацыі літоўска-польскага права прысвечана даследаванне А. Нольдэ[12]. Аўтар на прыкладзе праекта «Свода местных законов Западных губерний» (які быў падрыхтаваны да 1838 г. пры 1-м аддзяленні Я. І. В. канцылярыі) дастаткова дэталёва разгледзеў спецыфіку саслоўяў беларуска-літоўскіх губерняў, іх адрозненні ад расійскіх, адзначыў іх сувязь з мясцовым заканадаўствам і гістарычнае паходжанне саслоўных груп. Так, для духоўнага саслоўя праект Збору законаў вызначаў асобныя правілы толькі для грэка-уніяцкага і рымска-каталіцкага духавенства. Усе астатнія траплялі пад агульнае дзяржаўнае заканадаўства. Асабліва падрабязна разглядалася юрыдычнае становішча рымска-каталіцкага духавенства: парадак зацвярджэння манастыроў,

касцёлаў, капліц і іх правы, як юрыдычных асоб на маёмасць[13]. Але ў сувязі з рэзкай зменай ўрадавай палітыкі ў адносінах да заходніх губерняў і разглядам у 1838 г. пытання аб адмене мясцовых законаў, выданне гэтага праекта стала немагчымым. 25 чэрвеня 1840 г. Мікалай I падпісаў указ аб распаўсюджванні на заходнія губерні агульных законаў[14].

Вялізны фактычны матэрыял, які быў прысвечаны саслоўнай палітыцы Кацярыны II і Паўла I на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, утрымліваецца ў творах П. Жуковіча[15]. Аўтар вылучыў наступныя аспекты саслоўнай палітыкі: прынясенне прысягі рознымі слаямі насельніцтва; заканадаўчае афармленне расійскіх саслоўяў і спробы пераносу іх структур на насельніцтва далучанай тэрыторыі; удзел шляхты ў працы судовых, саслоўных і мясцовых органаў улады. П. Жуковіч прыйшоў да высноў, што Кацярына II не паспела распаўсюдзіць дзеянне сваёй сістэмы судова-адміністрацыйнага кіравання на гэтыя землі, але пры ёй быў закладзены грунтоўны фундамент[16].

Канчаткова саслоўі былі адменены дэкрэтам ад 10 (23) лістапада 1917 г. «Об уничтожении сословий и гражданских чинов»[17]. Гісторыяй саслоўяў на некаторы час савецкія гісторыкі перасталі цікавіцца, аддаючы перавагу марксісцка-ленінскай класавай тэорыі, згодна якой вывучаліся асноўныя класы грамадства. Структуру гарадскога насельніцтва разглядалі П. Рындзюнскі і Б. Міронаў[18]. Аўтары абапіраліся на ўрадавыя ўказы і статыстыку таго часу і вызначылі асноўныя групы гарадскога насельніцтва: духоўныя (акрамя манаства), ваенныя, стацкія, пасадскія (купцы, мяшчане, цэхавыя), сяляне, дваровыя, раскольнікі і разначынцы[19]. Значная колькасць даследаванняў савецкай гістарыяграфіі прысвечана сялянству. Сярод іх працы І. Кавальчанкі, Б. Літвана, П. Зайянчкоўскага, Н. Дружыніна[20]. У працах разгледжаны ўрадавыя ўказы адносна сялянства, ступень яго залежнасці ад памешчыка і дзяржавы, вылучаны яго асноўныя групы (памешчыцкія, дзяржаўныя і ўдзельныя). Некаторыя з гэтых аўтараў, як напрыклад Б. Міронаў, лічылі саслоўныя групы насельніцтва асобнымі саслоўямі, што было памылкова, бо яны ўваходзілі ў саслоўі «городских обывателей», або «сельских обывателей».

Ужо ў 70–80-х гг. XX ст. у савецкай гістарыяграфіі вылучаюцца асобныя працы, прысвечаныя дваранству Расійскай імперыі, або ўзаемаадносінам паміж дваранствам і іншымі сацыяльнымі слаямі. Так, А. Карэлін[21] імкнуўся прадставіць расійскае дваранства як саслоўе ў цэлым, з яго юрыдычнымі атрыбутамі,

прасачыць яго эвалюцыю. На яго думку, у выніку мер, якія прымаў царскі ўрад, дваранства на працягу XIX ст. заставалася «первенствующим сословием». Яго колькасць узрасла, матэрыяльная база палепшылася не толькі за кошт павышэння каштоўнасці зямлі, лясоў, нетраў, але і ў выніку яго прадпрымальніцкай дзейнасці[22]. М. Духанаў[23] даследаваў узаемаадносіны прыбалтыйскага дваранства з расійскімі ўладамі. Ён лічыў, што ў гэтых губернях больш шырокая кампетэнцыя дваранскіх сходаў у вырашэнні кардынальных праблем губернскага жыцця (наданне дваранства, занясенне ў матрыкулы новых сямей) адбывалася не па волі расійскіх улад, а рашэннем ландтагаў (сходаў). І гэта адрознівала ўрадавую палітыку ў прыбалтыйскіх губернях не толькі ад заходніх, але і ад цэнтральных.

Адносінам самадзяржаўя да розных сацыяльных і нацыянальных груп дваранства Беларусі, а таксама да мясцовага сялянства і прыроўненых да яго груп сельскага насельніцтва (аднадворцаў, вольных людзей, чыншавікоў і стараверaў) прысвечана манаграфія С. Самбук[24]. Палітыка царскага ўрада ў адносінах да гэтых двух «антаганістычных класаў-саслоўяў» была ўзаемаабумоўленая, асабліва па аграрным пытанні. Супярэчнасці, на думку аўтара, паміж памешчыцкім лагерам і царызмам не насілі антаганістычнага характару. Бо не толькі з рускімі, але і з польскімі землеўладальнікамі самадзяржаўе магло б прыйсці да пагаднення пры некаторых саступках з боку ўрада. Толькі адсутнасць гнуткасці ў царызму па нацыянальным пытанні ў адносінах да польскага памеснага дваранства і сацыяльная накіраванасць паўстання 1863 г. вымусілі частку гэтых памешчыкаў часова перайсці ў дэмакратычны лагер[25].

Сялянству Беларусі былі прысвечаны працы М. Улашчыка і В. Чапко[26]. Даследуючы сялянства Заходняй Беларусі і Літвы, М. Улашчык вылучыў цікавы аспект урадавай палітыкі, сутнасць якога заключалася ў недапушчальнасці якога-небудзь падбухторвання сялян на памешчыкаў, нават у час паўстанняў. Урад лічыў, што з усяго беларускага насельніцтва найбольш верным яму было праваслаўнае духавенства. Аднак, калі духавенства спрабавала падтрымаць інтарэсы сялянства супраць памешчыкаў (палякаў і каталікоў), то ўрадавыя ўстановы без хістання станавіліся на бок памешчыкаў[27].

Структуру гарадскога насельніцтва даследавалі В. Чапко і А. Люты[28]. Яны адзначалі, што сацыяльны склад насельніцтва гарадоў Беларусі ўяўляў сабой складаны кангламерат розных саслоўных груп. В. Чапко лічыла, што класы капіталістычнага грамадства

ў першай палове XIX ст. яшчэ не склаліся, аднак ужо адбываліся працэсы, якія сведчылі аб пачатку эвалюцыі феадальных адносін[29]. На думку ж А. Лютага, саслоўныя групы горада ў гэты час размываліся і кансалідаваліся ў класы нараджаючага капіталістычнага грамадства[30]. Гэтая тэма закраналася ў працах, прысвечаных гісторыі пралетарыяту Беларусі[31]. Але многія з дадзеных прац маюць ускоснае значэнне для тэмы, бо асноўнай мэтай іх быў паказ не саслоўнай, а класавай палітыкі царскага ўрада, нягледзячы на відавочнае: заканадаўча ўрад не імкнуўся гэтую палітыку праводзіць, зберагаючы саслоўную структуру.

90-я гг. XX ст. прывялі да некаторага адмаўлення ад марксісцка-ленінскай тэорыі ў гістарычнай навуцы, у тым ліку і пры распрацоўцы пытанняў саслоўнай гісторыі. Прававое становішча саслоўяў, праз урадавыя ўказы, было разгледжана ў працы «Развитие русского права в первой половине XIX века»[32]. Фундаментальная праца Б. Міронава[33] прысвечана генезісу грамадства расійскай дзяржавы ў XVIII – пач. XX ст. Аўтар вылучыў асноўныя прыкметы, якія былі характэрныя для саслоўяў і адрознівалі іх ад класаў. Па-першае, кожнае саслоўе мела спецыфічныя правы і сацыяльныя функцыі, якія юрыдычна былі замацаваны ў звычаях або законе. Па-другое, саслоўныя правы надаваліся па спадчыне, значыць, набываліся пры нараджэнні. Па-трэцяе, прадстаўнікі саслоўя аб'ядноўваліся ў саслоўныя арганізацыі або карпарацыі. Па-чацвёртае, саслоўі валодалі спецыфічным менталітэтам і ўсведамленнем. Па-пятае, саслоўі мелі права на самакіраванне і ўдзел у мясцовым кіраванні або цэнтральным дзяржаўным кіраванні (у саслоўна-прадстаўнічых установах). З гэтага пераліку ўжо бачна, якая ўвага надавалася ўрадам саслоўнай палітыцы ў імперыі. Акрамя таго, існавалі і знешнія прыкметы саслоўнай прыналежнасці – адзенне, прычоска, асобныя ўпрыгожванні і г. д.[34].

Б. Міронаў прыйшоў да высноў, што дваранства ў Расійскай імперыі да 1917 г. юрыдычна страціла ўсе свае саслоўныя правы, а яго прэстыж абапіраўся, галоўным чынам, на традыцыі, падтрымку манарха і яго ўрада. Пазбаўленне саслоўных рыс духавенства завяршылася ўжо ў пачатку XX ст. А ўзровень няроўнасці сярод гарадскога саслоўя на працягу XVIII–XIX стст. меў тэндэнцыю павышэння, як гэта было ў ЗША і заходнееўрапейскіх краінах. Да рэформ 1860-х гг. сяляне даволі лёгка пераходзілі з адной страты ў іншую: больш за 80% сялян на працягу свайго жыцця змянілі свой першапачатковы статус. Але ў паслярэформенны час выявілася тэндэнцыя да замаруджвання гэтага працэсу. У выніку чаго

ў пачатку XX ст. толькі каля паловы сялян пераходзілі з першапачатковай страты ў іншую, другая ж палова заставалася ў сваёй[35].

Аўтар лічыў, што працэс пераўтварэння саслоўяў у класы да 1917 г. не завяршыўся, але яны страцілі важнейшыя спецыфічныя саслоўныя прывілеі. Акрамя таго існаванне саслоўяў з рознымі, часам варожымі субкультурамі, з вялікай маёмаснай дыферэнцыяцыяй ускладнялі фарміраванне не толькі сярэдняга класа і грамадзянскай супольнасці, але і адзінай расійскай нацыі з адзінай культурай, сістэмай каштоўнасцей і законам. Наяўнасць, на думку Б. Міронава, у складзе Расійскай імперыі розных нацыянальнасцей яшчэ больш замарудзілі гэты працэс, у выніку чаго складванне расійскай нацыі і расійскай нацыянальнай дзяржавы да 1917 г. не завяршылася[36].

Грунтоўна, з выкарыстаннем шырокага кола крыніц і вялікай гістарыяграфіі, разгледжана ўрадавая палітыка ў адносінах да духавенства розных канфесій І. Смолічам[37]. Адносіны ўрада да розных груп гарадскога насельніцтва аналізуюцца ў працах В. Калініна і інш.[38].

Даволі плённа вывучаецца гісторыя саслоўяў і ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Дваранству Беларусі прысвечаны працы С. Лугаўцовай і Г. Туміловіч[39]. С. Лугаўцова ў сваім даследаванні асаблівую ўвагу звярнула на заканадаўчую палітыку ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі і Літвы. Г. Туміловіч вылучыла этапы ўрадавай палітыкі па «разбору» дробнай шляхты: першы – да 30-х гг. XIX ст.; другі – пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. На яе думку, першы этап вызначаўся павольным ходам «разбора», няўзгодненасцю ў дзеяннях цэнтральнай і мясцовых улад. А на другім этапе ўжо праглядвала тэндэнцыя, якая была накіравана на затрымку ўваходжання ў лік даказаўшых дваранскія правы і на рэзкае абмежаванне праў аднадворцаў і грамадзян у параўнанні з прадстаўнікамі прывілеяванага саслоўя. Па падліках аўтара, гэта прывяло да скарачэння долі дробнай шляхты ва ўнутрысаслоўнай структуры і адпаведна павялічвалася ўдзельная вага дваран, якія валодалі зямлёй і прыгоннымі (з 5–6% у апошняй чвэрці XVIII ст. да 14% да сярэдзіны XIX ст.). Але за кошт пераводу значнай часткі дробнай шляхты ў падатныя саслоўі адбылося змяншэнне ўдзельнай вагі дваран у адносінах да ўсяго насельніцтва Беларусі (з 10–12% да 6–4%)[40].

Новым даследаваннем па адпаведнай тэме ў беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца манаграфія А. Жытко[41]. Яе аўтар паспрабаваў вызначыць гістарычную ролю і месца дваранства ў сацыяль-

на-эканамічным жыцці Беларусі ад скасавання прыгону і да пачатку Першай сусветнай вайны.

Манаграфія А. Лютага[42] закранула сацыяльныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Аўтар прыйшоў да высновы, што разлажэнне феадальнага ладу суправаджалася эвалюцыяй саслоўяў у класы буржуазнага грамадства. На яго думку, раней за ўсё гэты працэс закрануў гарадскіх жыхароў. І ў гэты перыяд можна вылучыць толькі першую фазу фарміравання перадумоў складвання класаў капіталістычнага грамадства – пралетарыята і буржуазіі[43]. Некаторыя аспекты саслоўнай палітыкі царскага ўрада былі закрануты і ў даследаваннях Я. Анішчанкі[44]. Саслоўныя катэгорыі сялянства былі разгледжаны ў калектыўнай працы «Гісторыя сялянства Беларусі» і манаграфіі У. Сосны[45]. Цяжка пагадзіцца з думкай аўтара, што царскі ўрад свядома праводзіў у Беларусі палітыку па захаванні толькі дзвюх асноўных груп сялян: дзяржаўных і памешчыцкіх, а ў далейшым прадугледжвалася іх скасаванне, як феадальных саслоўяў, што стварала перадумовы для фарміравання буржуазных элементаў і паўпралетарскіх пластоў[46]. Наўрад ці ўрад ведаў, а тым больш рыхтаваў перадумовы такога напрамку. Хутчэй за ўсё ён імкнуўся правесці ўніфікацыю саслоўных груп сялянства па ўзору з цэнтральнымі рэгіёнамі імперыі. Наогул, у працах прысвечаных гісторыі сялянства і рабочага класу, відаць, пад уплывам даследаванняў савецкіх часоў, адчуваецца даволі значны ўплыў марксісцка-ленінскай тэорыі.

Н. Палетаева прысвяціла сваю працу купецтву Беларусі. Аналіз саслоўных праў купецтва (якое яна памылкова лічыць асобным «саслоўем») ў другой палове XIX ст. дазволіў ёй прыйсці да высноў, што купецтва было аб'ектам пільнай ўвагі з боку дзяржавы, а палітыка ў беларускіх губернях адрозніваласа ад цэнтральных рэгіёнаў. Гэта было звязана з абмежаваннямі асоб іудзейскага веравызнання[47].

У розны час не пакідалі без увагі гісторыю саслоўяў Расійскай імперыі і замежныя даследчыкі. Становішчу саслоўяў заходніх губерняў прысвечаны працы польскіх даследчыкаў Г. Масціцкага, В. Шмідта, Л. Жытковіча, І. Сікорскай-Кулешы, І. Рухліковай і інш.[48]. Так, Л. Жытковіч небеспадстаўна лічыў, што адносіны царскага ўрада да мясцовай шляхты былі не адназначнымі: лаяльныя да магнатэрыі і зусім іншыя да шматлікай дробнай шляхты, аб чым і сведчыла праверка дакументаў на пацвярджэнне шляхецкай годнасці. А асноўнай тэндэнцыяй урада Кацярыны II была ўніфікацыя грамадскай структуры далучаных зямель з расійскімі[49].

Нельга сказаць, што гэта новыя думкі, бо іх раней ужо выказаў П. Жуковіч. Але, відаць, яны адпавядалі тым крыніцам, якія былі ў аўтара, а разам з тым і рэчаіснасці.

Палітыка царскага ўрада ў адносінах да шляхты беларуска-літоўскіх губерняў разгледжана ў артыкуле І. Рухліковай[50]. Гэтую ж праблему, з акцэнтам на палітыку ў адносінах да татар беларуска-літоўскіх губерняў, разглядзела літоўская даследчыца Т. Байрашаўскайте[51]. Сярод узаемаадносін паміж урадам і татарскім насельніцтвам аўтар адзначыла наступныя: удзел у дваранскіх выбарах; прынясенне прысягі ў мячэцях, а не ў касцёлах; доказы іх шляхецкага паходжання і інш. Спрэчным пытаннем, на якое звярнулі ўвагу абедзве даследчыцы было прызнанне царскім ўрадам значнай часткі татарскай шляхты дваранствам, бо ў Рэчы Паспалітай, з-за сваёй канфесійнай прыналежнасці, яе саслоўнае становішча не было выразна акрэслена[52].

Французскі даследчык Д. Бавуа[53] разгледзеў становішча польскай шляхты на Украіне паміж паўстаннямі – з 1831 па 1863 г. і пасля 1863 г. Ён адзначыў, што ў пераломны момант шляхта Украіны стала на бок Расіі, а не Польшчы[54]. А ў сваю чаргу паўстанне 1863 г. на Украіне стала ідэальным повадам для ўлад, каб ударыць па дваранству. «Ціхая вайна» ўрада была накіравана ў самае сэрца польскай дваранскай магутнасці – на зямлю. Пры гэтым аўтар піша, што паўстанне на Украіне, у адрозненне ад паўстання ў Каралеўстве Польскім і Літве, знаходзілася ў зародкавым стане. Структура, створаная Нацыянальным урадам, была слабай, а колькасць белых і чырвоных – вельмі нешматлікай[55]. У цэлым гэтыя высновы можна перанесці і на Беларусь. Паўстанні яе ахапілі толькі часткова, а вось меры па падаўленні паўстанняў, што прымаў урад, тычыліся ўсёй тэрыторыі.

За паўтара стагоддзя па гісторыі саслоўяў Расійскай імперыі створана даволі вялікая гістарыяграфія. На канцэпцыі гэтых даследаванняў уплывалі сацыяльна-палітычныя і эканамічныя змены, якія адбываліся ў грамадстве ў розныя гістарычныя адрэзкі часу і якія непасрэдна былі звязаны з палітыкай ўрада. У асноўным усе аўтары прыйшлі да высноў, што працэс заканадаўчага фарміравання саслоўяў пайшоў быстрымі тэмпамі ў XVIII ст., калі паслядоўна праведзеныя рэформы Кацярыны II паклалі саслоўны прынцып у аснову ўсяго мясцовага кіравання і судовага ладу, надаючы яму вялікае дзяржаўнае значэнне. Сацыяльная структура расійскага грамадства, як строга саслоўная, атрымала яшчэ больш выразнае юрыдычнае афармленне ў IX томе («Законы о состояниях») Збора законаў Расійскай імперыі, які быў надрукаваны

ў 1832 г. і ўвайшоў у дзеянне з 1835 г. Закон вызначыў чатыры галоўныя саслоўі дзяржавы – дваране, духавенства, гарадскія абывацелі і сельскія абывацелі. Паколькі да 1917 г. Збор законаў карэнным чынам не перапрацоўваўся, яго саслоўная канцэпцыя надавала ўсім новым заканадаўчым актам саслоўную афарбоўку, якой яны па замыслу стваральнікаў былі зусім пазбаўлены. Апошняе выданне IX тома ў 1899 г. паклала ў аснову сацыяльнага заканадаўства тую ж класіфікацыю саслоўяў, хаця і не магло так жа паслядоўна, як у 1832 г., правесці саслоўны прынцып.

На думку многіх аўтараў, рэформы 60-х гг. XIX ст. (судовая, ваенная, паліцэйская) хаця і мелі на ўвазе адрозненні паміж саслоўямі ў адукацыі і матэрыяльнай забяспечанасці, але былі пазбаўлены строгай саслоўнай асновы. Адзінай буйной рэформай, якая па неабходнасці мела саслоўны характар, было вызваленне сялян. Дзякуючы праведзеным урадам рэформам у парэформенны час саслоўі пачалі страчваць свае спецыфічныя правы і ў прававых адносінах набліжаліся адзін да аднаго.

У савецкай гістарыяграфіі лічылася, што ленінскае вызначэнне класаў[56] мела ўніверсальнае значэнне і было прыдатным да ўсіх гістарычных эпох. Лічылася, што класавы падыход у навуцы дазволіў, сярод мноства розных прычын чалавечых імкненняў і дзеянняў, вылучыць дамінуючы напрамак у грамадстве – класавыя інтарэсы. І тым самым даў навуцы магчымасць да адкрыцця заканамернасцей у хаосе і лабірынце складанага жыцця класава-антаганістычнага грамадства[57]. Вядома, што пры такой пастаноўцы пытання, надоўга адпала неабходнасць да вывучэння саслоўнай структуры дарэвалюцыйнага расійскага грамадства. Але адносіны да гэтай праблемы пачалі мяняцца ўжо ў 70-я гг. XX ст.

Новы этап пачаўся ў 90-я гг. Аднак, нягледзячы на некаторыя грунтоўныя даследаванні, значная частка іх, як і ў дарэвалюцыйныя часы, зводзіцца да апісання фактычнага матэрыялу і ўрадавых загадаў. Усе працы, у той або іншай ступені, закранаюць саслоўную палітыку царскага ўрада, але практычна ніхто з аўтараў не вылучыў асноўныя напрамкі гэтай палітыкі. Сучасная расійская і замежная гістарыяграфіі, як і ў былыя часы, практычна не вылучаюць саслоўную гісторыю Беларусі. А ў некаторай ступені і сучасныя беларускія даследчыкі, абапіраючыся ў асноўным на дасавецкія або польскія даследаванні, не заўважаюць спецыфіку беларуска-літоўскага рэгіёна.

---

[1] Ключевский В. О. История сословий в России. Сочинения. М., 1989. Т. VI.

[2] Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб., 1876; Корф С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие 1762–1855 годов. СПб., 1906; Романович-Словатинский А. Дворянство в России. Киев, 1912.

[3] Клочков М. В. Очерки правительственной деятельности времен Павла I // Записки историко-филологического факультета императорского Петроградского университета. Петроград, 1916. Т. CXXXII.

[4] Там жа. С. 445–446.

[5] Григорьев В. Реформа местного управления при Екатерине II (Учреждение о губерниях 7 ноября 1775 г.). СПб., 1910.

[6] Знаменский И. Положение духовенства в царствование Екатерины II и Павла I. М., 1880; Ён жа. Приходское духовенство в России со времени реформы Петра. Казань, 1873; Дитятин И. Устройство и управление городов России. СПб., 1875. Т. 1; Ён жа. Городское самоуправление в России. Ярославль, 1877. Т. 2; Кизеветтер А. А. Местное самоуправление в России IX–XIX вв. Петроград, 1917; Ён жа. Городовое положение Екатерины II. 1775: У 2 т. СПб., 1885; Градовский. История местного управления в России. СПб., 1868.

[7] Гурвич И. А. Экономическое положение русской деревни. М., 1896.

[8] Яблочков М. История дворянского сословия в России. С. XXXII.

[9] Корф С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие 1762–1855 годов. С. 563, 654.

[10] Пазухин А. Современное состояние России и сословный вопрос. М., 1886.

[11] Там жа. С. 39, 42.

[12] Нольде А. Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском. СПб., 1906. Вып. 1.

[13] Там жа. С. 142–143.

[14] Там жа. С. 249.

[15] Жукович П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II // Журнал министерства народного просвещения (далей ЖМНП). 1914. № 2. С. 265–315; № 3. С. 88–120; № 4. С. 314–355; № 5. С. 1–43; Жукович П. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II // ЖМНП. 1915. № 1. С. 76–109; № 2. С. 257–321; № 5. С. 130–178; Жукович П. Западная Россия в царствование императора Павла I // ЖМНП. 1916. № 6. С. 183–226; № 8. С. 207–263; № 9. С. 186–275.

[16] Жукович П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II // ЖМНП. 1914. № 5. С. 43.

[17] Советская историческая энциклопедия. М., 1971. Т. 13. С. 347.

[18] Рындзюнский П. Г. Городское гражданство дореформенной России. М., 1958; Миронов Б. Н. Русский город в 1740–1860-е годы. Л., 1990.

[19] Миронов Б. Н. Русский город в 1740–1860-е годы. С. 139.

[20] Ковальченко И. Д. Русское крепостное крестьянство в первой половине XIX в. М., 1967; Литван Б. Г. Русская деревня в реформе 1861 года. М., 1972; Зайончковский П. А. Отмена крепостного права в России. М., 1988; Дружинин Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева. М.; Л., 1946. Т. 1.

[21] Корелин А. П. Дворянство в пореформенной России. 1861–1904 гг. М., 1979.

[22] Там жа. С. 285, 286.

[23] Духанов М. М. Остзейцы. Рига, 1978.

[24] Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980.

[25] Там жа. С. 9, 21, 22.

[26] Улащик Н. П. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. Чепко В. В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972.

[27] Улащик Н. П. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. С. 451.

[28] Чепко В. В. Города Белоруссии в первой половине XIX века. Экономическое развитие. Мн., 1981; Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. Мн., 1987.

[29] Чепко В. В. Города Белоруссии в первой половине XIX века. Экономическое развитие. С. 117.

[30] Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. С. 162.

[31]Абезгауз З. Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1971; История рабочего класса БССР. Мн., 1984. Т. 1.

[32] Развитие русского права в первой половине XIX века. М., 1994.

[33] Миронов Б. Н. Социальная история России: В 2 т. СПб., 1999.

[34] Миронов Б. Н. Социальная история России. Т. 1. С. 76–77.

[35] Там жа. С. 97, 98, 105, 106, 121, 128, 142.

[36] Там жа. С. 147.

[37] История русской церкви. М., 1997. Т. 8. Ч. 1–2.

[38] Калинин В. Д. Из истории городского самоуправления в России (XVII – нач. XX в.). М., 1994; Калинин В. Д. Организация предпринимательства в России (XIX – нач. XX в.). М., 1993; Предпринимательство и предприниматели России от истоков до начала XX века. М., 1997.

[39] Луговцова С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века. Мн., 1997; Тумилович Г. Н. Дворянство Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в.: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1995.

[40] Тумилович Г. Н. Дворянство Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. С. 17.

[41] Жытко А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. Мн., 2003.

[42] Люты А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя. Мн., 2004.

[43] Там жа. С. 234.

[44] Анішчанка Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II. Мн., 1996; Анищенко Е. К. Черта оседлости. Мн., 1998.

[45] Гісторыя сялянства Беларусі. Мн., 1999. Т. 1; Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 2000.

[46] Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. С. 112.

[47] Полетаева Н. И. Купечество Беларуси 60-е XIX – начало XX в. Мн., 2004. С. 34, 35.

[48] Mościcki H. Sprawa włościańska na Litwie w pierwszej czwierci XIX stulecia. Warszawa, 1908; Schmidt W. Geneza prywatnej rosyjskiej własności zemskiej. Warszawa, 1923; Żytkowicz L. Rzady Repnina na Litwie w latach 1794-7. Wilno, 1938; Sikorska-Kulesza I. Drobna szlachta w zachodniej Białorusi na Litwie w XIX w. Warszawa, 1990; Pychlikowa I. Carat wobec polskiej szlachty na ziemiach zabranych w latach 1772–1831 // Kwartalnik historyczny. 1991. T. XCVIII. № 3; Ruchlikowa I. Tatarzy litewscy 1764–1831 czecia szlacheckiego stany? // Kwartalnik historyczny. 1990. T. XCXII. № 3–4 і інш.

[49] Żytkowicz L. Rzady Repnina na Litwie w latach 1794-7. C. 296–297, 334, 335.

[50] Pychlikowa I. Carat wobec polskiej szlachty na ziemiach zabranych w latach 1772–1831. S. 51–83; Ruchlikowa I. Tatarzy litewscy 1764–1831 czecia szlacheckiego stany? S. 77–121.

[51] Байрашаускайте Т. Литовские татары в дворянских собраниях XIX века // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемаадносіны з беларускай і іншымі культурамі. Мн., 1996. Ч. 1. С. 136; Bairasanskaite T. Lietuvos totarial XIX amziuje. Vilnius, 1995.

[52] Bairasanskaite T. Lietuvos totarial XIX amziuje. Vilnius, 1995.

[53] Бовуа Д. Шляхтич, кріпак і ревізор. Київ, 1985; Бовуа Д. Битва за землю в Україні. 1963–1914. Поляки в соціо-етнічних конфліктах. Київ, 1998.

[54] Бовуа Д. Шляхтич, кріпак і ревізор. С. 29.

[55] Бовуа Д. Битва за землю в Україні. 1863–1914. Поляки в соціо-етнічних конфліктах. С. 23.

[56] «Класамі называюцца вялікія групы людзей, якія разлічваюцца па іх месцы ў гістарычна вызначанай сістэме грамадскай вытворчасці, па іх адносінах (большай часткай зацаваных і аформленых у законах) да сродкаў вытворчасці, па іх ролі ў грамадскай арганізацыі працы, а значыцца, па спосабах атрымання і памерах той долі грамадскага багацця, якой яны распалагаюць». Ленин В. И. Великий почин // Полн. собр. соч. М., 1977. Т. 39. С. 15.

[57] В. И. Ленин и история классов и политических партий в России. М., 1970. С. 12, 16.

2.2. Нацыянальная палітыка

У пачатку XX ст. даследчык манархічнай дзяржаўнасці Л. Ціхаміраў пісаў, што вялікія дзяржавы далучаюць да сваёй тэрыторыі не толькі розныя плямёны, але і «цэлыя нацыянальнасці, нярэдка абломкі былой дзяржаўнасці»[1]. І менавіта яны ўносяць у дзяржаўнае жыццё мноства элементаў рознадумнасці, сварак і нават унутранай барацьбы. А таму для стварэння ўнутранага адзінства дзяржавы патрэбна было «зліццё ўсіх народнасцяў дзяржавы ў адну вялікую нацыю»[2]. Для гэтага на далучаных тэрыторыях царскі ўрад павінен быў праводзіць палітыку, накіраваную на стварэнне культурных і навуковых асноў развіцця, адной дзяржаўнай мовы (якая, праўда, не павінна была падаўляць мясцовыя мовы, а развіваць іх), агульнасці веры і інтарэсаў, аднадумнасці, сумеснасці матэрыяльнай працы[3]. Гэта практычна адзіная навуковая праца, у якой дастаткова выразна былі абазначаны напрамкі нацыянальнай палітыкі дзяржавы. Бо, нягледзячы на шматлікую публіцыстычную літаратуру, гэтае пытанне не распрацоўвалася даследчыкамі.

Што тычыцца канца XVIII – першай паловы XIX ст. то ў гэты час расійскае грамадства і царскія ўлады толькі пачалі ўяўляць сутнасць «окраинных» пытанняў. Тэарэтычна іх пачалі абгрунтоўваць у пачатку XX ст., што было звязана з агульнай палітыкай русіфікацыі ў імперыі, з развіццём нацыянальных рухаў, у тым ліку польскага і яўрэйскага, а таксама і з узмацненнем антысемітызму. Але сама нацыянальная палітыка, нягледзячы на цікавасць грамадства Расійскай імперыі да насельніцтва далучаных тэрыторый, не прыцягвала асаблівай увагі даследчыкаў таго часу.

У пачатку 20-х гг. XX ст. савецкія ўлады, адпаведна і гісторыкі, не толькі аднадушна кляймілі царскі рэжым за прыгнятанне нацыянальных меншасцей, але і ганьбілі «вялікадзяржаўны шавінізм». Вялікай «турмой народаў» называў Расійскую імперыю і беларускі гісторык У. Ігнатоўскі[4]. Калі ў пачатку 1930-х гг. «нацыянальна-вызваленчыя рухі», якія ў 20-х станоўча ацэньваліся, пачалі лічыцца «буржуазна-нацыяналістычнымі», то з'явілася і новая фармулёўка, згодна з ёй уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай імперыі не супярэчыла волі народа, а пайшло на карысць, як і сяброўства з рускім народам.

У пачатку 1950-х гг. дактрына «дружбы народаў» зацвердзіла погляд, што нацыянальныя меншасці ніколі не блыталі царскі рэжым з рускім народам. Не адмаўляючыся ад рашучага асуджэння

царызму, савецкая гістарыяграфія з гэтага часу некалькі аслабіла ўласцівую ёй бескампраміснаю крытыку ўціску меншасцей самадзяржаўем і пачала мяняць канцэпцыю «турмы народаў» на карысць «вялікай дружбы».

Класічнымі даследаваннямі па гэтай праблематыцы ў савецкі час можна лічыць працы Т. Бурмістравай[5]. У іх яна, праз прызму нацыянальнай палітыкі партыі бальшавікоў, разгледзела і палітыку царскага ўрада. Патрэбна гэта было для таго, каб паказаць наколькі значнымі былі адрозненні палітыкі бальшавікоў ад нацыянальнай палітыкі Расійскай імперыі. Сярод асноўных напрамкаў нацыянальнай палітыкі царскага ўрада аўтар вылучыла наступныя: абмежаванне нацыянальных меншасцей «у магчымасці развіцця эканомікі»[6]; прыгнечанасць у палітычных адносінах[7], у галіне культуры і правядзенне «прымусовай русіфікацыі»[8]; праследаванне не праваслаўных веравызнанняў[9]. Характэрнымі рысамі палітыкі называліся: моцны нацыянальны гнёт, забарона нацыянальным меншасцям распараджацца сваёй тэрыторыяй, самастойна развіваць сваю эканоміку, адсутнасць палітычных правоў, вынішчэнне культуры, праследаванне рэлігіі[10]. У якасці адпраўнога пункта гэтай палітыкі аўтар называе выдадзены Аляксандрам II заканадаўчы акт «Высочайше утвержденные 26 марта 1870 года правила о мерах образования населяющих Россию инородцев». Згодна яму народы Поўначы, Сібіры, Сярэдняй Азіі, Каўказа, а таксама татары, яўрэі былі названы «неполноправными инородцами». У далейшым, на думку аўтара, расійскае заканадаўства паступова развівала і ўзмацняла тэндэнцыю прававога аддзялення нацыянальных меншасцей ад рускіх. Гэта выклікала насцярожанасць сярод нярускіх народаў, пачуццё нацыянальнай крыўды, «зласлівасць, якая даходзіла да варожасці»[11].

Па іншаму трактаваліся напрамкі гэтай палітыкі ў працах эмігрантаў, якія былі перавыдадзены або надрукаваны ўпершыню толькі ў 90-х гг. XX ст. Так, І. Смоліч[12] вызначыў дзяржаўнае разуменне тэрміна «инородец». Заканадаўства 1832 г. адносіла аселае насельніцтва Паволжа (татар, чувашоў, мардву і інш.), далучаных яшчэ ў XVI ст., да рускіх[13]. Закон гарантаваў свабоду веравызнання і адпраўлення культа нехрысціянскім рэлігіям. Аднак, адрозненні, якія меліся паміж іудзеямі, мусульманамі, ламаістамі, язычнікамі, былі на карысць мусульман. Так аўтар, у прыватнасці адзначаў, што ў 1854–1864 гг. выйшаў у свет мільён падручнікаў, часопісаў і іншай друкаванай прадукцыі толькі на татарскай мове. Вялікую ролю для ўзмацнення ісламу, на думку аўтара, адыграў

эканамічны пад'ём краіны. Дзякуючы яму ў татар сфарміравалася багатае купецтва, якое не толькі адыгрывала значную ролю ў народнай гаспадарцы Паволжа, але і заставалася верным ісламу. Праваслаўным місіям практычна немагчыма было прабіць адтуліну ў гэтым татарскім маналіце[14].

Другі эмігрант Д. Адзінец[15] падкрэсліў, што пачынаючы з Пятра I і да пачатку царавання Аляксандра III, палітыка царскага ўрада па нацыянальным пытанні характарызавалася нацыянальнай і рэлігійнай памяркоўнасцю. Але ўсё ж некаторыя выключэнні былі і тычыліся яны яўрэйскага пытання. У дачыненні да Польшчы пачала прымяняцца палітыка нацыянальнага ўціску толькі ў час праўлення Мікалая I. На думку аўтара, гэта было адхіленнем улад ад гістарычнага напрамку «імперскай» палітыкі. Польскае пытанне стала адным з самых «хворых» нацыянальных пытанняў Расіі[16]. Праўда, аўтар разглядаў узаемаадносіны царскага ўрада толькі непасрэдна з Польшчай, пакідаючы па-за ўвагай Беларусь, Літву і Украіну.

Як бачна, думкі савецкіх і эмігранцкіх гісторыкаў не толькі не супадалі, але і былі супярэчлівымі. Магчыма, гэта было звязана з уплывам марксісцка-ленінскай ідэалогіі на высновы гісторыкаў савецкага часу.

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі з'явіўся шэраг прац, якія разглядаюць розныя аспекты нацыянальнай палітыкі[17]. Іх пункт гледжання ўвасобіў думкі дарэвалюцыйных, савецкіх і эмігранцкіх даследчыкаў па рэабілітацыі ўнутранай палітыкі імперскіх улад у дачыненні да няруского насельніцтва. Напрыклад, сцвярджаецца, што Расійская імперыя ў XVIII – пачатку XX ст. – «гэта кантынентальная шматнацыянальная дзяржава, якая здолела гарантаваць свайму насельніцтву бяспеку, стабільнасць і развіццё, якая валодала неабходным эканамічным патэнцыялам і ваеннай магутнасцю для падтрымкі баланса сіл на сусветнай арэне»[18]. Расія разглядаецца як своеасаблівы саюз народаў, велізарная натуральна сфарміраваўшаяся супольнасць людзей, у якой розныя народы і культуры навучыліся жыць разам[19].

Некаторыя беларускія гісторыкі таксама дастаткова спакойна ставіліся да палітыкі імперскай улады ў адносінах да нацыянальных меншасцей, адзначаючы, што прадстаўнікоў некаторых народаў вызвалілі ад абавязкаў выплаты падаткаў і рэкрутчыны, а пазней ад воінскай павіннасці, што «садзейнічала іх зберажэнню і выжыванню»[20].

Сярод сучасных расійскіх даследчыкаў выклікае цікавасць праца Б. Міронава[21]. Аўтар вылучыў 2 этапы нацыянальнай палі-

тыкі: да і пасля 1863 г. з пераходным перыядам паміж 1830 і 1863 гг. Ён лічыў, што да 1830 г. палітыка царскага ўрада была прагматычнай і талерантнай да нацыянальных асаблівасцей. Абставіны змяніліся пасля паўстання 1830 г., якое Б. Міронаў (што традыцыйна для расійскай гістарыяграфіі) называе «польскім». Нацыянальная палітыка ўрада стала больш жорсткай, але толькі ў заходніх землях імперыі яна прыняла форму рэпрэсій і была накіравана на скасаванне іх адміністрацыйна-палітычнай аўтаноміі. Да другога «польскага» паўстання 1863 г. нацыянальная палітыка, на думку Б. Міронава, не мела культурна-моўнай накіраванасці, а яе жорсткасць праяўлялася толькі ў адносінах да польскіх сепаратыстаў і тых, хто іх падтрымліваў. З 1863 г. палітыка, накіраваная на адміністратыўную інтэграцыю нацыянальных ускраін у склад імперыі, стала ўсеагульнай і да яе далучылася моўна-культурная ўніфікацыя ў выглядзе русіфікацыі.

Даючы характарыстыку нацыянальнай палітыкі Расійскай імперыі, Б. Міронаў вылучыў яе асноўныя прынцыпы. Першы з іх – захаванне на інкарпарыраваных тэрыторыях адміністрацыйнага парадку, мясцовых законаў і устаноў, адносін да зямельнай уласнасці, веравызнанняў, мовы і культуры. Пры праявах варожасці і сепаратызму аўтаномія звужалася, як гэта адбывалася з Польшчай пасля паўстанняў 1830 і 1863 гг. Асновапалагаючым прынцыпам нацыянальнай палітыкі з'яўлялася супрацоўніцтва цэнтральнага ўрада з нярускімі элітамі, якія ў большасці атрымалі правы рускага дваранства. Другі прынцып – дараванне некаторых прывілеяў у прававым становішчы нярускім народам у параўнанні з рускімі. Нават яўрэі, адзначае Б. Міронаў, хаця і жылі ў межы аселасці і падвяргаліся дыскрымінацыі, усё ж не запрыгоньваліся, не рэкрутаваліся ў войска нараўне з рускімі, мелі падатковыя ільготы.

Характэрнай рысай палітыкі адзначалася і тое, што ўрад з дапамогай падатковай сістэмы мэтанакіравана падтрымліваў такое становішча ў імперыі, каб матэрыяльны ўзровень жыцця нярускіх быў вышэй, чым у рускіх. Гэта рэгулявалася тым, што нярускія народы заўсёды плацілі менш падаткаў і карысталіся ільготамі. Пералічаныя прынцыпы заставаліся, на думку аўтара, агульнымі для ўсяго перыяду імперыі. Але іх рэалізацыя ў значнай ступені залежала ад адносін да рускай дзяржавы з боку эліты інкарпарыраванага народа і іншых фактараў. Сярод іх – традыцыі дзяржаўнасці і высокаразвітая культура далучанага народа. Традыцыі, на думку Б. Міронава, уплывалі як на палітыку расійскага ўрада, так і на паводзіны нацыянальных меншасцей[22].

Значную ўвагу надае сучасная расійская гістарыяграфія і польскаму пытанню. Сярод даследаванняў гэтай праблемы вылучаецца манаграфія Л. Гарызонтава[23]. На яго думку, падзелы Рэчы Паспалітай і напалеонаўскія войны перанеслі расійска-польскія супярэчнасці з разраду знешнепалітычных у плоскасць унутрыпалітычных праблем імперыі. З пункту гледжання ўнутранай палітыкі Расіі польскае пытанне заключалася ў «інтэграцыі былых земляў Рэчы Паспалітай ў імперскі арганізм, пераўтварэнні палякаў у вернападданых правячай дынастыі»[24]. А рускае палонафобства, сцвярджаў аўтар, паўплывала на агульную «инородческую» палітыку самадзяржаўя[25].

Свае думкі аб нацыянальнай палітыцы царскага ўрада Расійскай імперыі выказвалі і беларускія даследчыкі. Так, А. Смалянчук[26] лічыў, што антыпольскі курс палітыкі царскага ўрада знайшоў адлюстраванне ў працэдуры г. зв. «разбору» («дэкласацыі») шляхты, спробе пашырэння рускага памешчыцкага і сялянскага землеўладання, масавым з'яўленні рускіх чыноўнікаў, скасаванні Статуту ВКЛ 1588 г., ліквідацыі уніяцкай царквы, закрыцці Віленскага універсітэта і русіфікацыі сістэмы адукацыі, антыкаталіцкіх мерапрыемствах і інш.[27]. Прааналізаваўшы ўрадаваю палітыку на беларускіх і літоўскіх землях у апошняй трэці XIX ст., ён робіць выснову аб паступовым ператварэнні Расійскай імперыі ў нацыянальную дзяржаву[28].

Падобныя аспекты палітыкі вылучылі і аўтары нарысаў па гісторыі Беларусі (З. Шыбека[29]) і Украіны (Я. Грыцак[30]). Гэтае падабенства думак сведчыць аб тым, што падобная палітыка праводзілася не ў адносінах да аднаго канкрэтнага народа, а была агульным напрамкам дзейнасці ўрада ў адносінах да ўсіх заходніх губерняў. У якасці адрозненняў можна адзначыць больш крытычны падыход украінскага аўтара, які нават абвінаваціў расійскую адміністрацыю ў тым, што яна нічога не рабіла для таго, «каб з дапамогаю украінскіх сялян пабароць польскія нацыянальныя дамаганні»[31].

Палітыка царскага ўрада ў адносінах да розных народаў Беларусі знайшла сваё адлюстраванне і ў зборніку артыкулаў «Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў»[32]. Матэрыялы, якія там прадстаўлены, разглядаюць палітыку ў адносінах да рускіх, яўрэяў, татар, народаў Прыбалтыкі. Пры гэтым вылучаюцца такія яе аспекты, як культурны, рэлігійны, саслоўны і адукацыйны. У некаторых артыкулах іншых выданняў (напрыклад, С. Кузняевай, В. Са-

балеўскай, А. Скеп'ян[33]) разглядаецца заканадаўства вызначанага часу. Аўтары лічаць, што ўлады часта карысталіся гвалтоўнымі і жорсткімі мерамі, калі яўрэйскае асяроддзе не падпарадкоўвалася загадам урада. Шэраг матэрыялаў беларускія гісторыкі прысвяцілі не толькі яўрэйскаму, але і польскаму пытанням. Сярод іх манаграфія і артыкулы В. Шведа, артыкулы А. Філатавай і інш.[34].

Дастаткова доўгі час заходняя гістарыяграфія звяртала ўвагу толькі на асабліва прыкметныя этнічныя меншасці Расійскай імперыі. І ўціск на фінаў, палякаў і яўрэяў разглядаўся як маральна недапушчальны[35]. Толькі адносна нядаўна яна прызнала, што ўзаемаадносіны паміж рускімі і іншымі этнічнымі групамі ў царскай імперыі былі рознабаковымі і вельмі складанымі. Да ліку такіх прац адносіцца і даследаванне А. Каппелера[36]. Разглядаючы нацыянальную палітыку ў 1831–1904 гг., аўтар адзначаў, што да пачатку XIX ст. расійская палітыка ў адносінах да нярускіх народаў імперыі была традыцыйнай. Прыярытэтам для ўрада была ўнутраная і знешняя бяспека. Калі дзяржаве пагражалі змоўшчыкі, або мяцежнікі, то ўрад выкарыстоўваў ваенную сілу. А калі нярускія эліты лаяльна ставіліся да манарха і забяспечвалі сацыяльна-палітычную стабільнасць у сваіх рэгіёнах, то іх прымалі ў якасці партнёраў. Пры Аляксандры I гэтая палітыка ажыццяўлялася, галоўным чынам, у заходніх абласцях імперыі. Але на працягу XIX ст., на думку аўтара, вызначыўся шэраг новых фактараў, якія павінны былі змяніць гэтую палітыку. І сярод іх – нацыянальныя рухі нярускіх народаў, у першую чаргу палякаў, і нацыянальная самасвядомасць часткі рускага грамадства. Гэта паставіла пад пытанне асновапалагаючыя прынцыпы існавання дынастычнай поліэтнічнай дзяржавы і яе саслоўна-дэнацыянальную палітыку. Акрамя таго, на палітыку ўплывалі і такія фактары, як неабходнасць мадэрнізацыі імперыі, і змены, што адбываліся ў Еўропе. Расійская палітыка аказалася пад уплывам гэтых фактараў і дасягнула свайго апагея ў так званай палітыцы «русіфікацыі»[37]. На думку аўтара, у 60-я гг. XIX ст. на першы план пачалі выходзіць задачы адміністрацыйнай уніфікацыі і моўна-культурнай русіфікацыі[38].

Новыя падыходы ў вызначэнні нацыянальнай палітыкі Расійскай імперыі праяўляліся ў вывучэнні заходняй гістарыяграфіяй такой з'явы, як русіфікацыя. Як пісаў Р. Пірсан, некаторыя даследчыкі прапаноўвалі адрозніваць «адміністрацыйную русіфікацыю» (працэс, які прапаноўваў магчымасць набыцця прыкметных матэрыяльных выгод) ад «культурнай русіфікацыі» (палітыкі, якая звычайна лічылася страшэнна несправядлівай і бясплоднай).

Крытэрыямі палітыкі русіфікацыі для замежных аўтараў вызначаліся канфесійны (праваслаўная вера) і моўны (руская мова). Не забыліся пры гэтым пра ваенны і тэрытарыяльны аспекты[39].

На думку Р. Суні, насельніцтва ў Расійскай імперыі падзялялася гарызантальнымі лініямі па рэлігійнай і этнічнай адзнаках і вертыкальнымі бар'ерамі паміж кіруючай элітай і прывілеяванымі саслоўямі – з аднаго боку і вялізнай масай сялянскага насельніцтва – з другога. Гэтыя адрозненні былі фармалізаваны заканадаўчым шляхам і фіксавалі дыскрымінацыю шматлікіх народаў і народнасцей. Канцэпцыя нацыі была растворана ў рэлігійнай і дзяржаўнай ідэнтычнасці і не змагла праявіць сябе як супольнасць, аддзеленая ад дзяржавы і рэлігійнага згуртавання[40]. Аўтар сцвярджаў, што агульнапрыняты вобраз царскай палітыкі ў галіне нацыянальнага пытання пацвярджаў яе прыхільнасць да русіфікацыі. Ён адзначыў, што ў сярэдзіне XIX ст. асабліва ўплывовай тэндэнцыяй была спантанная русіфікацыя, а культурная – была параўнаўча познім інструментам у арсенале царскага дзяржаўнага будаўніцтва і з'яўлялася рэакцыяй на нацыяналізм нярускіх народаў[41]. Б. Андэрсан падкрэсліваў, што толькі ў час праўлення Аляксандра III русіфікацыя стала афіцыйнай палітыкай дынастыі[42]. Спробы русіфікацыі палякаў у Беларусі разгледзеў і польскі даследчык Р. Радзік[43].

Грунтоўным даследаваннем па дадзенай тэме з'яўляецца праца амерыканскага даследчыка Т. Вікса[44]. Ён выказаў думку, што яшчэ ў другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі не было такой з'явы, як «нацыянальная палітыка». Была толькі некаторая спецыфіка палітычных, адміністрацыйных або мясцовых патрабаванняў, якія, пры пануючай ролі рускай нацыянальнасці, дапамагалі царскаму ўраду ўцягваць рэгіёны і нярускае насельніцтва ў імперскае жыццё[45].

У адносінах да другой паловы XIX ст. з такой думкай нельга пагадзіцца, бо ўжо ў сярэдзіне 80-х гг. Расійская імперыя закончыла далучэнне тэрыторый і пачала праводзіць узмоцненую палітыку па яе русіфікацыі, аб чым сведчылі вышэйназваныя працы. У заходніх жа губернях, пасля не зусім удалай русіфікацыі 30–40-х гг., узмоцненую русіфікацыю працягвалі пасля падаўлення паўстання 1863 г. Акрамя таго, да канца XIX ст. пачало фарміравацца або ўжо сфарміравалася нацыянальнае самавызначэнне многіх этнасаў і пачалі ствараццца і развівацца нацыянальныя рухі. Усе гэтыя фактары не маглі не выклікаць адпаведную рэакцыю з боку ўрада. Тым не менш, на наш погляд, такая думка Т. Вікса супадае

з аспектамі нацыянальнай палітыкі царскага ўрада на далучаных тэрыторыях у першай палове XIX ст.

Праблема міжнацыянальных адносін у Расійскай імперыі, цікавасць да якой значна ўзрасла пасля распаду Савецкага Саюза, пераўтварылася ў апошнія гады ў адну з галоўных тэм айчыннай, расійскай і заходняй гістарыяграфіі. Вывучэнне імперскай праблематыкі выйшла на новы узровень – ад пераважна-рэгіянальнага да праблемна-тэматычнага падыходу і паглыбленага аналізу асобных аспектаў гісторыі Расіі. Але патрэбна адзначыць, што канцэптуальна погляды сучасных расійскіх гісторыкаў не вельмі адрозніваюцца ад дарэвалюцыйных. Як і ў мінулыя часы, на першае месца выходзіць агульнаімперская палітыка, сугуба польскімі лічацца паўстанні XIX ст. І нягледзячы на тое, што гэтыя падзеі з'яўляюцца практычна для ўсіх аўтараў вызначальнымі вехамі нацыянальнай палітыкі, разглядаюцца яны, у асноўным, толькі ў дачыненні да Польшчы. Пры гэтым расійскія аўтары практычна не заўважаюць або не ведаюць працы па адпаведнай тэматыцы беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх даследчыкаў, што сведчыць аб пэўнай навуковай ізаляцыі.

---

[1] Тихомиров Л. А. Монархическая государственность. СПб., 1992. С. 646. [Упершыню надрукавана ў 1905 г.].

[2] Там жа. С. 652.

[3] Там жа. С. 646–652.

[4] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. [Упершыню надрукавана ў 1926 г.]. С. 166.

[5] Бурмистрова Т. Ю. Ленинская политика пролетарского интернационализма в период образования РСДРП (1894–1903 гг.). Л., 1962; Бурмистрова Т. Ю., Гусакова В. С. Национальный вопрос в программах и тактике политических партий в России. М., 1974.

[6] Бурмистрова Т. Ю. Ленинская политика пролетарского интернационализма в период образования РСДРП (1894–1903 гг.). С. 23.

[7] Там жа. С. 30.

[8] Там жа. С. 32.

[9] Там же. С. 39.

[10] Там жа. С. 83.

[11] Там жа. С. 20.

[12] Смолич И. К. История русской церкви. М., 1997. Кн. 8. Ч. 2.

[13] Там жа. С. 203.

[14] Смолич И. К. История русской церкви. Кн. 8. Ч. 2. С. 237, 238.

[15] Одинец Д. Национальный вопрос // AB IMPERIO. 2001. № 1–2. С. 323–359.

[16] Там жа. С. 328.

[17] Нации и национализм. М., 1997; Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления. М., 1998; Национальная политика России: История и современность. М., 1997; Этнос и политика. М., 2000 і інш.

[18] Национальные интересы Росии и реальные приоритеты государственной политики за полтора века // Отечественная история. 1996. № 6. С. 46.

[19] Там жа.

[20] Оржеховский И. В. Некоторые особенности национального вопроса в дореволюционной России // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на пераломе тысячагоддзяў. Мн., 2000. С. 234–237.

[21] Миронов Б. Н. Социальная история России: В 2 т. СПб., 1999. Т. 1.

[22] Там жа. С. 28–45.

[23] Горизонтов Л. Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. М., 1999.

[24] Там жа. С. 8.

[25] Там жа.

[26] Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864–1917 гг. СПб., 2004.

[27] Там жа. С. 56.

[28] Там жа. С. 124.

[29] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795–2002. Мн., 2003. С. 28–55.

[30] Грицак Я. Нарис історії України. Формування модерної української нації XIX–XX століття. Київ, 2000. С. 32–34.

[31] Там жа. С. 33.

[32] Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. Мн., 1995.

[33] Кузняева С. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII – начале XX века. Мн., 1998; Сабалеўская В. Палітыка расійскага самаўладдзя адносна яўрэйскай супольнасці Беларусі (1772–1855 гг.) // Гіст. альманах. 2001. Т. 5. С. 113–121; Скеп'ян А. А. Заканадаўчыя акты расійскіх улад у дачыненні да яўрэяў у першай палове XIX ст. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Мн., 2001. С. 125–129.

[34] Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гродна, 2001; Швед В. Польскае пытанне і Беларусь у 1772–1863 гадах // Канферэнцыя шлях да ўзаемнасці. Ч. П. Беласток, 2001. С. 273–283; Філатава А. Да пытання аб паланізацыі і русіфікацыі на Беларусі // Беларусіка. Мн., 1992. Кн. 2; Філатава А. Польская нацыянальная ідэя на Беларусі. XIX ст. // Наш радавод. Гродна; Беласток, 1999–2000; Філатава А. Польскае і яўрэйскае пытанні і палітыка царскага ўраду ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 2001. С. 106–110.

[35] Пирсон Р. Привилегии, права и русификация // Ab Imperio. 2003. № 3. С. 35–55.

[36] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. Возникновение. История. Распад. М., 1997.

[37] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. Возникновение. История. Распад. М., 1997. С. 182.

[38] Там жа. С. 203.

[39] Пирсон Р. Привилегии, права и русификация // Ab Imperio. 2003. № 3. S. 35–55.

[40] Суни Р. Империя как она есть: имперская Россия, «национальное» самосознание и теория империи // AB IMPERIO. 2001. № 1–2. С. 48, 49.

[41] Там жа. С. 64.

[42] Андерсен Б. Уявлені спільноти. Міркування щодо походження й поширення націоналізму. Київ, 2001. С. 114.

[43] Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Lublin, 2000.

[44] Weeks T. Nation and State in Late imperial Russia. Illinois, 1996.

[45] Там жа. С. 70.

2.3. Беларускі нацыянальны рух: асноўныя напрамкі развіцця

Сярод першых даследчыкаў беларускага нацыянальнага руху вылучаецца адзін з яго пачынальнікаў – Антон Луцкевіч, які апісаў і даў сваю ацэнку нацыянальнаму руху ў 1909 г., у знакамітым артыкуле «Белоруссы». Вядомы знаўца спадчыны А. Луцкевіча А. Сідарэвіч сцвярджае, што гэты артыкул «з'яўляецца першай спробай апісання і асэнсавання гісторыі беларускага руху»[1].

Паводле А. Луцкевіча ў XIX ст. творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў не здолелі «даць штуршок беларускаму нацыянальнаму руху, што развіваецца на нашых вачах»[2]. На яго думку першай беларускай арганізацыяй быў гурток навучэнцаў Мінскай гімназіі, які ўзнік у канцы 1890-х гг.[3].

У гэтым месцы патрэбна зазначыць, што сур'ёзны даследчык беларускай літаратуры і таленавіты літаратурны крытык А. Луцкевіч стварыў тэорыю, якая мела істотны ўплыў на далейшую гістарыяграфію беларускага руху. Сутнасць гэтай тэорыі ў тым, што ад моманту зараджэння «беларушчыны» ў XIX ст. у ёй існавалі дзве плыні – *шляхецкія рамантыкі і дэмакраты-народнікі*[4]. Да першых належалі «Баршчэўскі, Рыпінскі, Чачот, Дунін-Марцінкевіч, Вярыга-Дарэўскі, Каратынскі... і А. Ельскі», да другіх – П. Багрым, У. Сыракомля і К. Каліноўскі. Прычым «шляхецка-рамантычны кірунак» «зжыўся не здалеўшы абудзіць у душы народу тэй святой іскры, каторая падняла бы яго да новага, вольнага і свядомага жыцця»[5]. Як вынікае з ходу думкі А. Луцкевіча, сапраўдны нацыянальны ідэал, абвешчаны Ф. Багушэвічам, і пастаўлены «на народны грунт» «песнярамі рэвалюцыйнае пары (1905–1906 г.)»,

выйшаў з «дэмакратычна-народніцкай плыні». Менавіта тэорыя двух плыняў, адна з якіх фактычна была абвешчана тупіковай, у 1920–1930-я гг. прымяняецца і да «нашаніўскага руху» (В. Ластоўскі)[6], а пазней, у пасляваенны савецкі час яе ўзялі на ўзбраенне беларускія літаратуразнаўцы (М. Ларчанка, М. Верабей, М. Смолкін і інш.), каб «рэабілітаваць» беларускі нацыянальны рух пачатку XX ст. перад камуністычнай уладай.

Падрабязны аналіз беларускага нацыянальнага руху Антон Луцкевіч робіць у альманаху «Маладая Беларусь» (1912). Аўтар разважае пра гісторыю руху, яго мэты і іх рэалізацыю. Гісторыю руху ён падзяляе на тры этапы: *першы*, да 1904 г., калі «нацыянальная беларуская работа пачыналася і канчалася тым, што народу тлумачылі цэннасць і значэнне яго «простай» мовы»; *другі* прыпадае на рэвалюцыйны ўздым 1905 – паловы 1906 гг., калі «рэвалюцыя, хаця толькі на адзін мамэнт, паставіла мужыка нараўне з усімі людзьмі», менавіта ў гэты час БСГ выпускае «сотні тысяч» улётак і шэраг «брашурак»; *трэці*, гэта этап самаарганізацыі беларускай інтэлігенцыі, калі ўтвараюцца суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца» і газета «Наша ніва», і пачынаецца прапаганда ідэі беларускага нацыянальнага Адраджэння[7]. Сярод найважнейшых мэт апошняга перыяду – праца дзеля культурнага і эканамічнага падняцця краю, моцная інтэграцыя ў адно падзеленых рэлігіяй на дзве часткі беларусаў, утварэнне нацыянальнай інтэлігенцыі, ідэйнае супрацьстаянне «заходнерусізму» і польскаму нацыяналізму. Поспех бачыўся Луцкевічу ў тым, што значная частка сялянства ў розных кутках Беларусі пачынала чытаць «Нашу ніву» і ўспрымала яе *«сваёй»* (курсіў Луцкевіча. – *Аўтар*) газетай[8]. Апроч гэтага, маладыя навучэнцы ва універсітэцкіх гарадах Расійскай імперыі стваралі гурткі, большая частка якіх, паводле А. Луцкевіча, была «дужа блізка да ідэалогіі «Нашае нівы»»[9].

Нарысы А. Луцкевіча можна лічыць адначасова і гістарыяграфіяй і крыніцай гісторыі беларускага руху. Але ўсё ж аналіз падзей, спробы асэнсавання гісторыі руху пераважаюць над асабістымі ўспамінамі, таму лічым лагічным далучыць іх да гістарыяграфічнага агляду.

У гэты ж час піша сваю працу «Літва і Беларусь» польскі палітык і навуковец Л. Васілеўскі. Аўтар апісвае беларускі рух XX ст. ад самых яго пачаткаў. Л. Васілеўскі пісаў, што пра нейкую сур'ёзную плынь у беларускім руху можна казаць толькі пачынаючы з першых гадоў XX ст., калі ў Пецярбургу ўтвараецца «Круг бе-

ларускай народнай прасветы», які выдаў «дзве чытанкі» (відаць, маюцца на ўвазе «Калядная пісанка на 1904 год» (1903) і «Велікодная пісанка» (1904). – *Аўтар*). Але, паводле Л. Васілеўскага, толькі ў 1904–1905 гг. беларускі рух перастае быць «рухам сімпатыкаў беларушчыны палякаў і расійцаў» і ператвараецца з утварэннем «Грамады» ў сапраўдны «адраджэнчы народны рух беларускага нацыянальнага характару»[10]. Апроч гэтага Л. Васілеўскі аналізуе склад карэспандэнтаў «Нашай нівы» і прыходзіць у цэлым да абгрунтаванай высновы, што ў заходняй Беларусі нацыянальны рух карыстаўся значна большай папулярнасцю чым ва ўсходняй[11]. Разам з гэтым, для вышэйзгаданага аўтара, як і для большасці польскіх даследчыкаў і публіцыстаў таго часу, перспектыва выхаду на вялікую гістарычную арэну беларускай нацыі была сумнеўнай. Беларуская нацыянальная інтэлігенцыя паказвалася збольшага штучнай з'явай, скажэннем польскай ці расійскай свядомасці. Вартасць і адначасова хіба гэтага і падобных даследаванняў у тым, што даследчыкам з'яўляўся чалавек сам задзейнічаны ў грамадскай дзейнасці, так Л. Васілеўскі быў ідэолагам і актыўным дзеячам ППС. Гэта з аднаго боку дазваляла ўбачыць беларускі рух, умоўна кажучы «з сярэдзіны», але з іншага боку, тут мела месца вельмі высокая ступень суб'ектыўнасці і асабістай зацікаўленасці аўтара працы.

Да гонару Л. Васілеўскага трэба зазначыць, што ён даволі рэалістычна адлюстроўваў пашырэнне ўплыву беларускай нацыянальнай ідэалогіі, што пацвердзілі пазнейшыя даследчыкі, а таксама іншыя ўдзельнікі беларускага руху[12].

Погляды беларускага гісторыка і публіцыста Я. Канчара на «беларускае пытанне» выкладзены ў адмысловай працы, ці хутчэй зборніку артыкулаў[13]. У падыходзе гэтага аўтара (які быў ідэйна блізкі да беларускіх камуністаў) маецца арыгінальнасць і таму ён заслугоўвае ўвагі. На пачатку ён сцвярджае, што беларускі нацыянальны рух пачаўся толькі з 1904 г., праз некалькі старонак дата ўзнікнення гэтай з'явы пераносіцца на 90-я гг. XIX ст. Беларускае грамадства ён падзяляў на 4 няроўныя часткі: прарасійскую (у асноўным сяляне), прапольскую (значная частка беларускай каталіцкай шляхты), пралітоўскую (частка літуанізаванай інтэлігенцыі) і прабеларускую (частка «незалежніцкай інтэлігенцыі»)[14]. Варта адзначыць, што Я. Канчар сам быў удзельнікам беларускага нацыянальнага руху, да якога далучыўся пасля Лютаўскай рэвалюцыі і таму яго погляды мелі практычнае вымярэнне і неабстрактны характар. Дарэчы будзе адзначыць, што пазней, у БССР,

быў афіцыйна прызнаны падзел беларускага грамадства на 4 часткі, праз увядзенне 4-х дзяржаўных моў, толькі «замест» літоўскай была ўведзена габрэйская. Калі прасочваць ідэйныя карані тэорыі падзелу грамадства Беларусі на чатыры (ці пяць) частак, якія маюць прыкладна роўны ўдзел у культурнай спадчыне краю, то становіцца зразумелым, што дзеячы беларускага нацыянальнага руху ўзялі гэта з арсеналу «краёўства». Тут мы бачым выразную сувязь гістарыяграфіі з палітычнымі ідэалогіямі і актуальнай палітыкай. На пэўным этапе ідэолагі «Нашай нівы» стаялі на «краёвым» грунце[15], што ў наступную эпоху ў пэўнай ступені адбілася і на поглядах беларускіх камуністаў.

Беларускі гісторык Ф. Турук, у адрозненне, напрыклад, ад малодшага Луцкевіча, падае «дзейнасць пісьменнікаў і вучоных даследчыкаў, пераважна палякаў мясцовага паходжання» другой чвэрці XIX ст. як адпраўны пункт беларускага нацыянальнага руху[16]. У другой палове XIX ст. з'яўляецца «новы тып беларускага патрыёта» – гэта беларуска-польская шляхта, якая любіць Беларусь як польскую правінцыю. Як прыклад ён прыводзіць В. Дуніна-Марцінкевіча[17]. Пачатак уласнабеларускага нацыянальна-культурнага руху гэтым навукоўцам выводзіцца з «народнікаў», да якіх аўтар адносіць Ф. Багушэвіча. Далей ідуць «Круг беларускай народнай прасветы», БСГ і «Наша ніва». Нарыс Ф. Турука з факталагічнага гледзішча не змяшчае новых момантаў у параўнанні з артыкуламі А. Луцкевіча. Варта адзначыць толькі, што момант нараджэння беларускага руху А. Луцкевіч звязвае з пачаткам дзейнасці беларускіх нацыянальных гурткоў, а Ф. Турук з нараджэннем беларускай «народніцкай» літаратуры.

Першую спробу аналізу беларускага нацыянальнага руху па-акадэмічнаму прафесійна, канцэптуальна і метадалагічна стройна зрабіў адзін з пачынальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі У. Ігнатоўскі[18]. Істотным, на наш погляд, з'яўляецца тое, што гісторык імкнуўся тэарэтычна асэнсаваць вытокі нацыянальнага руху і нацыянальнай ідэі. На яго думку, нацыянальная ідэя як з'ява і беларуская нацыянальная ідэя ў прыватнасці, нарадзілася са спадчыны Французскай рэвалюцыі. Другой крыніцай паўстання нацыянальных ідэалогій гісторык назваў рамантызм. Зыходзячы з такіх тэарэтычных установак, У. Ігнатоўскі выкладае гісторыю беларускага «адраджэньня».

Беларускі нацыянальны рух і нацыянальная ідэя з'яўляюцца галоўнымі тэмамі навуковага даробку гэтага гісторыка. «Гісторыя Беларусі у XIX і пачатку XX сталецьця»[19] найлепшае таму па-

цверджанне. Храналагічна пачатак беларускага руху У. Ігнатоўскі выводзіць ад першай чвэрці XIX ст., ад моманту стварэння «беларускай школы» ў польскай літаратуры – творчасці і дзейнасці Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага і Я. Чачота[20]. Даследчык апісваў беларускі рух у духу «нашаніўскай традыцыі» (адчуваецца ўплыў А. Луцкевіча) і аналізаваў яго праз метадалогію марксізму. У. Ігнатоўскі больш увагі звяртае на погляды тых ці іншых дзеячаў эпохі, чым на іх паходжанне. Погляды і ідэі ён характарызуе ў двух катэгорыях – сацыяльнай і нацыянальнай. Пасля перыяду «польскіх пісьменнікаў беларускай школы», якія разважалі пра Беларусь выключна ў польскім кантэксце, надыходзіць, на думку гісторыка, перыяд К. Каліноўскага і паўстання 1863 г., якое «высунула на першы план пабудаванне незалежнай Беларусі»[21]. Нацыянальная ідэя аўтарства К. Каліноўскага магла быць сфармулявана ў лозунгу «вуніяцтва, мужыцка-народніцкая Беларусь і беларуская народнасць»[22]. Але менавіта ў гэтым моманце надыходзіць падзел беларускага руху на 2 кірункі – *ліберальна-народніцкі* (В. Дунін-Марцінкевіч) і *рэвалюцыйна-народніцкі* (К. Каліноўскі). Пры гэтым першы кірунак ацэньваецца як утапічны, а другі як прагрэсіўны. Напрыканцы XIX ст., на думку У. Ігнатоўскага, з'яўляюцца яшчэ два кірункі ў беларускім руху – «*радыкальна-дэмакратычны*» (Фр. Багушэвіч, Я. Лучына) і «*ліберальна-культурніцкі*» (А. Ельскі). Розніца паміж гэтымі кірункамі ў стаўленні да палітычнай рэчаіснасці – першыя лічылі, што неабходна змяніць самаўладства, а другія – што магчымасці легальнай працы пры гэтым ладзе не вычарпаныя. Аднак абодва гэтыя кірункі ўжо ставяць на парадак дня пытанне аб культурнай асобнасці Беларусі. Далей гісторык вельмі коратка апісвае дзейнасць «Гоману» і нарысна, чыста апісальна, паведамляе пра дзейнасць БСГ і Сацыялістычнай Партыі Белай Русі. «Нашаніўскую» інтэлігенцыю У. Ігнатоўскі характарызуе як «народніцка-ідэалістычную», якая здолела аб'яднаць нацыянальнае пытанне з сацыялізмам і стварыць шырокую праграму будучага грамадскага развіцця Беларусі.

Выклад У. Ігнатоўскім свайго бачання гісторыі беларускага руху фактычна запачаткаваў прафесійную гістарыяграфію гэтай з'явы. Яго думка зрабіла значны ўплыў на беларускіх гісторыкаў, незалежна ад іх ідэйных перакананняў. На грунце марксісцкай метадалогіі Ігнатоўскім фактычна была заснавана адметная гістарычная школа, якую ўмоўна можна назваць *нацыянальна-марксісцкай*. Схема, прапанаваная У. Ігнатоўскім, безумоўна, не без

уплыву А. Луцкевіча, па-рознаму ацэньвалася на розных этапах развіцця беларускай гістарыяграфіі, крытыкавалася, рэабілітоўвалася, але фактычна прымалася ў якасці базавай.

У. Ігнатоўскі быў не толькі гісторыкам, але і ідэолагам нацыянальнага будаўніцтва ў БССР. У 1924 г. ён укладае зборнік пад назвай «Нацыянальнае пытанне і камуністычная партыя»[23]. Зборнік уяўляе сабой падборку матэрыялаў (тэарэтычных і практычных) да тэмы бачання ідэолагамі бальшавізму нацыянальнага пытання і практычнай рэалізацыі гэтых поглядаў. Тут змешчаны артыкулы Леніна, Сталіна, Троцкага, самога Ігнатоўскага, рэзалюцыі партыйных мерапрыемстваў, пастановы пра ўзбуйненне БССР. Галоўная думка, якая праходзіць праз увесь зборнік, што нацыя павінна мець права на самавызначэнне, але камуністычная партыя можа быць толькі інтэрнацыянальнай, і менавіта яна вызначае, што такое самавызначэнне ў кожным канкрэтным выпадку. З усяго відаць, што на тым этапе У. Ігнатоўскі лічыў такую канцэпцыю карыснай для Беларусі.

Такім чынам, да сярэдзіны 1920-х гг. у БССР быў сфармуляваны погляд беларускай падсавецкай гістарычнай навукі на нацыянальны рух. У гэтым жа часе выходзіць даволі значная колькасць прац, прысвечаных асобным аспектам гэтага руху.

Былы нашанівец Хв. Імшэннік у 1926 г. прааналізаваў ролю «першай беларускай газеты з рысункамі» ў беларускім нацыянальным руху. Ён пісаў: «...з усіх газет Беларусі, якія выходзілі на розных мовах, «Наша ніва» была найболей радыкальнай і левай газетай». Пішучы пра ўплывы газеты на розныя пласты насельніцтва, Імшэннік сцвярджаў, што большасць маладога настаўніцтва Беларусі было пад уплывам «Нашай нівы», і далей – гэта газета для рабочых, сялян і «асабліва бядняцка-серадняцкага класа». Разважаючы пра гэты момант, аўтар прыходзіць яшчэ да адной, вельмі смелай высновы, што бядняцка-сялянскія масы Беларусі *цалкам* знаходзіліся пад уплывам «Нашай нівы». Усіх людзей, заангажаваных у беларускім нацыянальным руху, гэты аўтар называе «нашаніўцы». Ён кажа, што няслушна было б параўноўваць іх з нарадавольцамі, бо тыя былі інтэлігентамі, пераапранутымі ў сялянскую вопратку і праводзілі агітацыю ў цалкам незнаёмым асяроддзі, а «нашаніўцы» – гэта дзеці беднаты, якія агітавалі ў знаёмых ім мясцінах. Яшчэ адзін цікавы тэзіс аўтара, што рэагуючы на дзейнасць і ідэалогію «Нашай нівы», улада вымушана была адзін за адным ствараць альтэрнатыўныя ёй выданні – для сялян «Крестьянин», для інтэлігенцыі – «Народное Образование»[24].

Што датычыць высноў Хв. Імшэнніка, то, на нашу думку, яны не зусім адпавядаюць рэчаіснасці. Асабліва перабольшаныя ўплывы «Нашай нівы» на сялянства і рабочых. Яны не маглі «цалкам» знаходзіцца пад уплывам «Нашай нівы», хоць бы з увагі на яе сярэдні наклад у 2890 ас. Артыкул Хв. Імшэнніка выйшаў у часе «беларусізацыі» і «ўзбуйненняў» БССР. Аўтар, хутчэй за ўсё, быў пад уздзеяннем нацыянальнай палітыкі ў БССР і таму яўна перабольшыў дасягненні нашаніўскага перыяду.

Сярод гістарыёграфаў беларускага руху першай трэці XX ст. вызначаецца А. Шлюбскі[25], які жыў у БССР, апублікаваў і пракаментаваў успаміны А. Луцкевіча, В. Ластоўскага і Р. Зямкевіча пра «Нашу долю» і «Нашу ніву». У іх пераважная ўвага надаецца арганізацыйнаму станаўленню першых беларускіх выданняў. А. Шлюбскі з'яўляецца адным з пачынальнікаў факталагізму ў гістарыяграфіі нацыянальнага руху, для яго прац характэрныя максімум фактаў і мінімум каментарыяў.

Пачатак сталінскіх рэпрэсій сярод іншага азначаў і перагляд гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Адной з першых прац у гэтым кірунку была брашура А. Гаруновіча[26], у якой адмысловы раздзел «Сапраўдны твар БСГ і «Нашай нівы» быў прысвечаны крытыцы ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. А. Гаруновічам БСГ характарызавалася як «дробнабуржуазная арганізацыя», а «Наша ніва» – як «буржуазна-ліберальная» газета[27]. У згаданай брашуры аўтар выкарыстоўваў заведама непраўдзівыя звесткі. Так ён пісаў, што «Наша ніва» хацела «паставіць Беларусь на становішча калоніі ў царскай Расіі»[28], што газета выступала супраць канфіскацыі абшарніцкай зямлі[29] і г. д. Гэтая праца была заклікана паставіць ідэалагічны штамп на беларускім руху пачатку XX ст., як на варожым «інтарэсам працоўных масаў» з усімі палітычнымі наступствамі ў дачыненні ягонай спадчыны.

Больш грунтоўным, з факталагічнага пункту погляду, быў зборнік «Дыскусія аб «Нашай ніве» (1932). Хоць, насамрэч, гэта была не «дыскусія», а адна знішчальная крытыка «нашаніўства» з пазіцый марксізму-ленінізму. Напрыклад, гісторык Дз. Дудкоў жорстка раскрытыкаваў пазіцыі Хв. Імшэнніка, Зм. Жылуновіча і А. Цвікевіча ў гэтым пытанні. Жылуновіча ён абвінавачваў у тым, што ён «пастараўся загрыміраваць нашаніўцаў пад бальшавікоў»[30]. Затым Дудкоў крытыкуе «Нашу ніву» за: 1) ідэалізацыю дзяржаўнага ладу буржуазных краін, у прыватнасці Англіі, Германіі, ЗША ды інш.[31]; 2) патрабаванне беларусізацыі царквы[32]; 3) падтрымку сталыпінскай рэформы[33]; 4) падмены класавага пы-

тання – нацыянальным (спробу памірыць сялянства з абшарнікамі)[34] ды інш. Тут відавочна, што аўтар у некаторых месцах перабольшвае, хоць у цэлым ён слушна ацаніў (з марксісцка-ленінскіх пазіцый) вышэйзгаданыя прыярытэты выдання. Пытанні, з перспектывы сённяшняга дня, узнікаюць толькі на ацэначным узроўні, г. зн. добра, што «Наша ніва» была такой, ці кепска? Такім чынам, у выніку гэтай «дыскусіі» на «Нашу ніву» было пастаўлена ідэалагічнае кляймо, яна была абвешчана «буржуазна-ліберальным выданнем». Тым самым і ўвесь беларускі нацыянальны рух сацыялістычнага кірунку быў абвешчаны «буржуазна-ліберальным».

Філосаф С. Вальфсон, кніга якога выйшла ў 1931 г., імкнуўся даць панарамны аналіз «нацыянал-дэмакратызму»[35]. Ён вызначыў *фазы* гэтай з'явы, відавочна абапіраючыся на працы У. Ігнатоўскага, і рэзка раскрытыкаваў увесь беларускі нацыянальны рух ад сярэдзіны XIX ст. да пачатку 1930-х гг. Ф. Багушэвіча і Я. Лучыну ён ахарактарызаваў як «ідэолагаў дробнай шляхты і вясковага кулацтва», «так званы нашаніўскі перыяд» быў вельмі адмоўным таму, што ў арбіту «нацыянал-дэмакратызму» была ўцягнута значная частка разначыннай інтэлігенцыі[36].

У плане канцэптуальнага аналізу беларускага руху 1930-я гг. амаль нічога не далі, апроч разгляду публіцыстыкі «Нашай нівы». Навешваючы ярлыкі «нацдэмаў» гісторыкі і філосафы той эпохі карысталіся напрацоўкамі тых самых «нашаніўцаў» і У. Ігнатоўскага, паварочваючы высновы гэтых даследчыкаў супраць іх саміх.

У Заходняй Беларусі да тэмы нацыянальнага руху праяўлялі вялікую цікавасць, апроч А. Луцкевіча, кс. А. Станкевіч[37], І. Дварчанін[38]. Апошні вылучыў тэрмін «нашаніўскі перыяд» і падрабязна характарызаваў творчасць нашаніўскіх аўтараў. Але зрабіў гэта ў першую чаргу як філолаг і філосаф. Даследаванні А. Станкевіча прысвечаны гісторыі беларускай палітычнай думкі і беларускага руху. Ён характарызаваў іх як вынік з'яўлення ідэй рамантызму ў XIX ст. і звязваў ідэі беларускага руху з хрысціянствам. Такім чынам, мы можам канстатаваць, што ў гістарыяграфіі з'явіўся канцэптуальна новы падыход да вытокаў нацыянальнай ідэі і руху. Паводле А. Станкевіча, толькі хрысціянскае грамадства, у аснове жыцця якога ляжыць духоўны ідэал, здольнае нарадзіць і захаваць нацыянальную ідэю, у той час як матэрыялізм сам па сабе разбуральны для нацыянальнага жыцця.

Сярод пасляваенных даследчыкаў беларускай ідэі і руху рэй вялі літаратуразнаўцы. Важнае месца належыць С. Александровічу. У сваіх манаграфіях «Гісторыя і сучаснасць»[39] і асабліва «Пуця-

віны роднага слова»[40] ён падрабязна прааналізаваў працэс стварэння ды ідэйны змест «Нашай нівы», яе дачыненні з уладамі, месца сярод іншых перыядычных выданняў Беларусі, кнігавыдавецкую справу ў пачатку XX ст. Аналіз робіцца на аснове архіўных крыніц, як беларускіх, так і замежных. Працы вызначаюцца высокай грунтоўнасцю падбору і аналізу матэрыялу. Да таго ж яны напісаны, наколькі гэта было магчымым у той час, зыходзячы з беларускіх нацыянальных пазіцый. Аднак зноў жа ідэалагічныя рамкі, у якіх вымушаны быў працаваць даследчык, не дазволілі яму падрабязна спыніцца на аналізе поглядаў і ідэйнай спадчыны такіх выбітных дзеячаў тагачаснага беларускага нацыянальнага руху, як І. і А. Луцкевічы, В. Іваноўскі, В. Ластоўскі, А. Уласаў ды інш.

Што тычыцца падручнікаў па гісторыі Беларусі, то там і ў пасляваенны савецкі час (1954 г.) паўтаралася ацэнка 1930-х гг. пра «буржуазна-ліберальны» характар беларускага нацыянальнага руху[41].

У сувязі з вышэйсказаным, у 60–80-я гг. XX ст., калі немагчыма было станоўча пісаць пра ідэйную спадчыну пачынальнікаў беларускага руху, увага даследчыкаў засяродзілася на «Нашай ніве». Даследчыкі (пераважна філолагі) пісалі, у большасці, з мэтай яе «рэабілітацыі» і вызначэння яе месца ў расійскім рэвалюцыйным руху[42]. Літаратуразнаўцы намагаліся давесці, што газета была левым выданнем і ў сваёй ідэалогіі набліжалася да бальшавікоў, а таксама, што ў нашаніўстве існавалі дзве плыні: «рэвалюцыйна-дэмакратычная», якая ў асноўным складалася з пісьменнікаў і паэтаў, ды «буржуазна-ліберальная» – ідэолагі выдання. У той жа час афіцыйныя гісторыкі ў асноўным крытыкавалі нашаніўцаў за «класавую і нацыянальную абмежаванасць»[43]. Але былі і выключэнні. Напрыклад, артыкул М. Вераб'я пра эканамічную думку на старонках «Нашай нівы», дзе аўтар імкнуўся даказаць, што ўсе эканамічныя ідэі нашаніўцаў былі выключна ў рэчышчы марксізму-ленінізму[44]. Апошняе, на нашу думку, не зусім адпавядала рэчаіснасці.

Агульным было тое, што, як першы, так і другі бакі разглядалі адзін ці некалькі асобных аспектаў беларускай ідэалогіі «нашаніўскага перыяду», а не імкнуліся паказаць яе цалкам, на фоне іншых нацыянальных рухаў і палітычных падзей. Таму ацэнкі беларускага нацыянальнага руху, якія даваліся ў той час, былі фрагментарнымі і непаслядоўнымі.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што асноўную вартасць у 1960–1980-х гг. мелі эмпірычныя працы пазітывісцкага кшталту на

сумежжы літаратуразнаўства і гісторыі. Лідэрам тут, безумоўна, з'яўляецца, апроч вышэйадзначанага С. Александровіча, Г. Кісялёў[45]. Ён выявіў, сабраў і апублікаваў вялізную колькасць матэрыялаў пра беларускія інтэлектуальныя і палітычныя постаці XIX ст. і тым самым стварыў грунт для далейшага асэнсавання тэмы. Для беларускай гістарыяграфіі нацыянальнага руху перыяд 1960–1980-х фактычна з'яўляецца часам «першапачатковага назапашвання капіталу».

У абагульняльным выданні «Гісторыя БССР» у 5-ці тамах, якое выйшла ў 1970-я гг., погляды ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху кан. XIX – пач. XX ст. характарызаваліся як «ліберальныя»[46]. Насамрэч, некаторыя элементы лібералізму прысутнічалі, напрыклад, у нашаніўскай публіцыстыцы. Гэта датычылася стаўлення рэдакцыі выдання да Думы, як да адзінага правамоцнага органа дзяржаўнай улады, і некаторых іншых аспектаў. Але ў цэлым, усё ж пераважала сацыялістычная арыентацыя большасці беларускіх дзеячаў. Пра гэта сведчаць палажэнне пра абагульненне зямлі ў аграрнай праграме БСГ[47], падтрымка «Нашай нівай» кандыдатаў сацыялістычнай арыентацыі на думскіх выбарах і г. д.

Асобна патрэбна падкрэсліць даследаванні філосафа У. Конана, які імкнуўся асэнсаваць ідэйны змест «Нашай нівы» і «нашаніўства»[48]. Ён «адкрыў» шмат асоб тагачаснага нацыянальнага руху, іх творчасць, ідэйныя пошукі. Але зноў жа недастаткова, на нашу думку, надаваў увагі палітычнай і эканамічнай думцы ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху.

Варта таксама адзначыць сярод познесавецкіх даследаванняў працу І. Ігнаценкі[49], які прысвяціў сваю навуковую кар'еру даследаванню рэвалюцыі 1917 г. і іх наступстваў для Беларусі. Даследчык закранае пытанні беларускага нацыянальнага руху, які ён называў «нацыянальна-вызвольны рух». Зараджэнне якога адбылося ў пачатку XIX ст., афармленне пасля 1861 г., а арганізацыйныя формы гэты рух набыў у канцы XIX – пач. XX ст.[50]. Гісторык, грунтуючыся на марксісцкай метадалогіі, прыходзіць да высновы, што беларускі рух не мог быць масавым у той гістарычнай сітуацыі, таму што ніводны з сацыяльных класаў не мог яго масава падтрымаць. На думку І. Ігнаценкі, беларускі нацыянальны рух быў унутрана размежаваны па лініі буржуазія – дэмакратычная інтэлігенцыя, а Першая сусветная вайна толькі паглыбіла гэты падзел – адны лічылі, што для Беларусі выгадная перамога Расіі, другія – параза. Пагадзіцца з гэтымі высновамі можна толькі часткова. Сапраўды, была пэўная спрэчка ў беларускім руху ў пла-

не поглядаў на будучыню Беларусі. Напрыклад, паміж А. і І. Луцкевічамі, з аднаго боку, і В. Ластоўскім – з другога[51]. Але гэтая спрэчка ў 1914 г. не падзяліла рух і датычылася пытанняў хутчэй нацыянальных, а не класавых (спрэчка вялася вакол «краёвай ідэі», якой прытрымліваліся Луцкевічы і супрацьстаяў В. Ластоўскі). Да таго ж непаразуменні былі ў большасці тактычнымі і асабістымі.

Для беларускай эміграцыйнай гістарыяграфіі праблемы і пытанні беларускага нацыянальнага руху былі сярод прыярытэтных. Некаторыя эміграцыйныя гісторыкі самі былі духоўнымі нашчадкамі «Нашай нівы» і нават непасрэднымі ўдзельнікамі выдання тыднёвіка, як, напрыклад, Я. Станкевіч. У 1957 г. ён змясціў у нью-йоркскай беларускай газеце «Бацькаўшчына» сваё даследаванне, прысвечанае 50-м угодкам выхаду «Нашай нівы»[52]. Нарыс Станкевіча складаецца часткова з даследаванняў, а часткай з асабістых успамінаў, дзе даволі сістэмна разглядаецца беларускі рух, вылучаюцца яго плыні: сацыялістычная (лідэры браты І. і А. Луцкевічы), «народная» (нефармальны правадыр В. Ластоўскі), праваслаўная (аўтар прызнае, што да 1918 г. знаходзілася ў зародкавым стане) і каталіцкая (паводле падлікаў Я. Станкевіча на 1915 г. каля 150 святароў былі «свядомымі беларусамі»). На нашу думку, вылучэнне з беларускага руху «народнай» ідэйнай плыні даволі штучнае. За крытэрый бярэцца існаванне «чыстай» беларускай свядомасці, без «лішняга» ідэйнага напаўнення. Але гэта вельмі недасканалы крытэрый, бо яго цяжка спраўдзіць. Што датычыць падзелу Я. Станкевічам беларускага грамадства на 4 часткі, то як было сказана вышэй, гэтая ідэя не новая і мае свае карані ў ідэалогіі «краёўства».

Другі вядомы эміграцыйны гісторык – Я. Запруднік – у 1960-я гг. даследаваў беларускі нацыянальны рух і абараніў дысертацыю па гэтым перыядзе[53]. Ён даволі грунтоўна прааналізаваў палітычную сітуацыю ў Расійскай імперыі пачатку XX ст. і грамадскую пазіцыю «Нашай нівы». У адрозненні ад сваіх папярэднікаў і наступнікаў Я. Запруднік пісаў, што стаўка «Нашай нівы» выключна на сялянства як сацыяльную базу нацыянальнага руху была памылкай.

Што датычыць паваеннай замежнай гістарыяграфіі беларускага руху, то найбольш значны ўнёсак у распрацоўку тэмы зрабілі польска-беларускія даследчыкі А. Бергман[54] і Ю. Туронак[55], а таксама польскія навукоўцы Р. Радзік[56] і С. Ланец[57]. Калі А. Бергман цікавіла ў асноўным арганізацыйнае станаўленне «Нашай нівы», то Ю. Туронак, Р. Радзік і С. Ланец імкнуліся асэнсаваць увесь

беларускі рух пачатку XX ст. Ю. Туронак гэта зрабіў праз напісанне біяграфіі В. Іваноўскага. Р. Радзік сваёй даследчыцкай задачай паставіў растлумачыць прычыны незавершанасці працэсу фарміравання беларускай нацыі, якія ён бачыць таксама і ў яе «сялянскасці», якая шмат у чым вынікала з ідэалогіі беларускіх сацыялістаў пачатку XX ст. С. Ланец правёў сістэмны аналіз жыцця ў Беларусі ў перадваенны перыяд, зрабіўшы асноўны акцэнт на апісанні рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. Значную ўвагу ён звярнуў і на нацыянальны рух, падзяліўшы не зусім абгрунтавана, беларускую інтэлігенцыю на прапольскую (каталікі), прарасійскую (праваслаўныя) і праўкраінскую (прыхільнікі вуніі)[58].

З пачаткам 1990-х гг. надыйшоў новы этап у развіцці беларускай гістарыяграфіі. Атрыманне Беларуссю незалежнасці дазволіла і адначасова выклікала патрэбу звярнуцца да вытокаў беларускай дзяржаўнасці. У 1992 г. пачалося факсімільнае выданне «Нашай нівы», з'явіліся публікацыі ў друку, прысвечаныя беларускаму нацыянальнаму руху, вытокам нацыянальнай ідэі[59]. Галоўнай рысай навуковай атмасферы таго часу было пераасэнсаванне ідэйнага паслання нацыянальнай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. Выходзілі працы на сумежжы літаратуразнаўства і гістарыяграфіі, дзе рабіліся спробы прааналізаваць узаемны ўплыў літаратуры і беларускага палітычнага руху[60].

У гэтым жа часе пачынаецца фундаментальны праект – выданне 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Гэта своеасаблівы тэст на сталасць беларускай гістарычнай навукі. Выданне ўжо паводле свайго фармату мусіла надоўга замацаваць навуковы погляд на шэраг важных пытанняў нацыянальнай гісторыі. Беларускі нацыянальны рух у гэтым сэнсе займае адмысловае месца, як непасрэдны папярэднік адраджэння дзяржаўнасці. У адпаведным энцыклапедычным артыкуле даецца не толькі апісанне руху, але і яго перыядызацыя. Аўтар А. Каўка вылучае два асноўныя этапы: 1. (1794–1863) – «рух у сабе» здзейснены ў рамках пераважна польскага «нацыянальна-вызваленчага працэсу»; 2. (1863–1918) – «рух для сябе» – усведамленне і змаганне за ўласнабеларускія нацыянальныя інтарэсы, для дасягнення канчатковай мэты – адраджэння беларускай дзяржаўнасці.

Адначасова з'явілася праца вядомага гісторыка М. Біча[61], прысвечаная нацыянальнаму руху. М. Біч напачатку 1990-х гг. паставіў пытанні да гісторыі нацыянальнага руху і нацыянальнага будаўніцтва і распрацаваў тэарэтычныя асновы даследавання гэтай праблематыкі. Ён пісаў, што напачатку XX ст. рэзка ўзмацні-

лася дзейнасць расійскіх і польскіх колаў, накіраваная на асіміляцыю беларусаў, і таму беларускі нацыянальны рух найчасцей быў вымушаны займацца абаронай сваіх ідэй, а не пашырэннем іх у грамадстве. Гісторык больш засяродзіўся на апісанні нацыянальных ідэй беларускай інтэлігенцыі, чым на грамадскім і палітычным аспектах.

У 1994 г. выйшаў першы том «Нарысаў гісторыі Беларусі», дзе навукоўцы акадэмічнага Інстытута гісторыі паспрабавалі пераасэнсаваць гістарычны шлях беларускага народу. Пра «нашаніўскі перыяд» напісаў М. Біч. Ён зрабіў кароткі агляд нашаніўскай публіцыстыкі, акцэнтуючы ўвагу на ідэйным супрацьстаянні беларускага тыднёвіка з «заходнерусізмам» і польскім нацыяналізмам. Даючы палітычную ацэнку тыднёвіку, даследчык пісаў, што «кіраўнікі «Нашай нівы» ў перыяд рэакцыі сышлі на ліберальна-народніцкія, асветніцкія пазіцыі»[62]. Беларускі нацыянальны рух гэтага часу М. Біч характарызаваў як «сялянскі, народніцкі па характары»[63]. На нашу думку, у ацэнцы беларускага руху М. Біч быў не зусім дакладны, бо гэты рух у нашаніўскім часе быў пераважна інтэлігенцкім, ён яшчэ не карыстаўся шырокай падтрымкай сялянства, хоць і быў ідэйна скіраваны на гэтую частку грамадства. Што датычыць ідэйнай характарыстыкі беларускага руху як «народніцкага», то яна, на нашу думку, не зусім слушная, бо марксісты таксама мелі значны ўплыў на яго ідэалогію.

Аўтары падручніка «Гісторыя Беларусі» пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля лічаць, што беларускі нацыянальны рух «нашаніўскай пары» быў «народніцкім» і выключна інтэлігенцкім, а «Наша ніва» была «абаронцам правоў і свабодаў беларускага працоўнага народу»[64].

У сярэдзіне 90-х гг. была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя «Янка Купала і Наша ніва», па выніках працы якой быў выдадзены зборнік матэрыялаў[65]. Аўтары зборніка – у большасці філолагі, таму характар матэрыялаў мае літаратуразнаўчы характар. Але ў «Дадатку» да зборніка ёсць артыкулы, прысвечаныя непасрэдна гістарыяграфіі «нашаніўства» – гэта артыкулы эмігрыйнага гісторыка С. Станкевіча і публіцыста В. Сянькевіча[66]. С. Станкевіч аналізуе стаўленне беларускай савецкай гістарыяграфіі да «Нашай нівы» і «нашаніўства», пачынаючы з 1954 г., калі выйшаў першы том «Гісторыі БССР», дзе газета была названа органам беларускіх буржуазных нацыяналістаў і заканчваючы другім выданнем «Гісторыі БССР» у 1961 г., дзе гэтая ацэнка паўтарылася. Пасля ён разглядае «спробы рэабілітацыі «Нашай ні-

вы» ў савецкія часы. Сам С. Станкевіч адкідае ўсялякую ідэйную сувязь «Нашай нівы» з бальшавізмам. Артыкул В. Сянькевіча прысвечаны поглядам В. Ластоўскага, а таксама М. Доўнар-Запольскага на гісторыю Беларусі і на беларускі нацыянальны рух.

Варта згадаць даследаванні беларускага гісторыка А. Смалянчука, які займаецца «краёвай ідэяй» у беларускай грамадска-палітычнай думцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. У сярэдзіне і канцы 1990-х ён робіць шэраг грунтоўных публікацый у навуковай перыёдыцы[67], дзе спрабуе высветліць вельмі важныя пытанні беларускай гістарыяграфіі. Напрыклад, што такое «польскае пытанне» на беларускіх землях у XIX – пач. XX ст., як паўплывала «краёвая» ідэя на беларускі нацыянальны рух, шляхі фарміравання нацый на абшарах былога ВКЛ ды інш. У сваіх даследаваннях ён непасрэдна закранае пытанне «нашаніўства» і мяркуе, што «краёвасць» была свайго роду альтэрнатывай таму грамадска-палітычнаму выбару, які зрабіла «Наша ніва». Ён даволі шмат піша пра погляды нашаніўцаў і цытуе саму газету, але найчасцей у сувязі з «польскім пытаннем», як і вынікае з яго даследчыцкай задачы. У 2001 г. А. Смалянчук выдаў манаграфію «Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй» (другое, дапрацаванае, выданне выйшла ў 2004 г.). Там, у асобным параграфе, ён разглядае сувязь «польскай грамадскасці» ў Беларусі з беларускім і літоўскім нацыянальнымі рухамі. У працы ён шырока асвятляе дзейнасць братоў Луцкевічаў, А. Уласава, В. Ластоўскага ды інш., але зноў жа ў кантэксце сувязей з «краёўцамі». На нашу думку, «краёвасць» была альтэрнатывай нацыянальнай ідэі ў разуменні «Нашай нівы», якая з'яўлялася ідэалагічным рупарам беларускага нацыянальнага руху толькі тэарэтычна, а на практыцы гэта было неажыццяўляльным, бо «краёўцы» выявіліся няздольнымі ідэйна і ментальна адмежавацца ад «польскасці». Разам з гэтым А. Смалянчук робіць сваё даследаванне на новых метадалагічных асновах, адрозных ад умоўнай схемы А. Луцкевіча – У. Ігнатоўскага. Яго цікавяць канцэпцыі беларускай нацыянальнай ідэалогіі ў іх стратэгічнай мэце – спосабе згуртавання народу. Тут было 2 варыянты: 1) на этналінгвістычным грунце («Наша ніва»); 2) на аснове канцэпцыі «краёўцаў», якія сцвярджалі, што будучыня за «палітычнай нацыяй».

У гэты ж час даследаванні беларускага нацыянальна руху досыць шырока публікуюцца ў навуковым перыядычным друку і ў разнастайных гістарычных зборніках. Адметнасцю гэтых публікацый ёсць іх засяроджанасць на пэўных асобных момантах і аспектах. Як, напрыклад, матэрыял А. Каўкі «Наша ніва» – Лондан», дзе

публікуецца дакумент, разам з каментарыямі публікатара, які асвятляе дачыненні рэдакцыі «Нашай нівы» з ППС у 1907 г. і змяшчаецца кароткі аналіз сітуацыі ў тагачасным беларускім друку[68]. А. Каўка працягвае традыцыю даследавання і асэнсавання сувязі беларускага руху з літаратурай і іх узаемнага ўплыву[69].

Даследуюцца таксама жыццяпісы асобных адраджэнцаў – А. Луцкевіча, В. Ластоўскага, У. Самойлы, А. Станкевіча – сферы іх дзейнасці, закранаюцца некаторыя пытанні ідэалогіі, палітычнага жыцця, разгортвання беларускага нацыянальнага руху[70]. Аўтары досыць добра справіліся з задачай, якая стаяла перад імі, але гэта ўсё ж былі аналізы творчых біяграфій прытым з пэўнай доляй ідэалізацыі галоўных постацей беларускага руху. Шмат увагі надаецца апісанню іх асабістых заслуг і вельмі мала месца займае аналіз іх ідэйнай спадчыны. Недастаткова даследаваны таксама ўплыў ідэй беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. на лёс беларускай нацыянальнай ідэі ў гістарычнай перспектыве.

Вялікі ўнёсак у гэтым плане належыць А. Сідарэвічу, які займаецца пытаннямі беларускага сацыялістычнага руху і вывучэннем спадчыны А. Луцкевіча[71]. Ён сабраў і апублікаваў шмат важнага фактычнага матэрыялу, грунтоўна яго пракаментаваўшы[72]. Працы А. Сідарэвіча характарызуюцца высокай ступенню факталагічнай дакладнасці і глыбокімі, добра прадуманымі высновамі. Сюды трэба дадаць таксама высокую тэарэтычную падрыхтаванасць гэтага аўтара. А. Сідарэвіч, напрыклад, спрабуе напісаць псіхалагічныя партрэты дзеячаў тагачаснага беларускага руху[73].

Даследаваў пытанні беларускага нацыянальнага руху беларускі гісторык М. Сташкевіч[74]. Ён прааналізаваў працэс партыйнага будаўніцтва ў беларускім нацыянальным руху ў пачатку XX ст., эвалюцыі поглядаў кіраўніцтва БСГ, часткова закранае дзейнасць рэдакцыі «Нашай нівы». М. Сташкевіч сцвярджае, што ў «грамадаўскім руху» існавалі «дзве рэвалюцыйныя плыні марксісцкая і народніцкая»[75].

Варта адзначыць таксама працу нямецкага гісторыка Р. Ліндэнэра, якая выйшла па-беларуску ў 2003 г.[76]. У ёй даследчык прысвяціў асобны раздзел аналізу гістарычных парадыгмаў «Нашай долі» і «Нашай нівы» і паспрабаваў асэнсаваць іх ролю ў станаўленні беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, а таксама ўплыў на беларускую нацыянальную ідэю. Аўтар аналізуе гістарычную публіцыстыку гэтых выданняў і піша, што апісанне гісторыі Беларусі на іх палосах мела перш за ўсё мабілізацыйныя, нацыятворчыя функцыі, а не навуковую распрацоўку пытанняў айчын-

най гісторыі. Р. Ліндэнр піша, што такая стратэгія характэрная і для ўкраінскага руху і для іншых «структурна слабых, не да канца сфармаваных нацыяў»[77].

Значную даследчыцкую працу правёў сучасны беларускі гісторык М. Забаўскі[78]. Сферай яго навуковай зацікаўленасці з'яўляюцца падзеі, працэсы і ідэі, звязаныя з выбарамі ў расійскі парламент на тэрыторыі сённяшняй Беларусі ў пачатку XX ст. У сваёй манаграфіі ён прысвяціў адзін з параграфаў аналізу пазіцыі «Нашай нівы» ў дачыненні II Дзяржаўнай Думы і закрануў супрацьстаянне беларускага руху з «заходнерусізмам». Аднак, гісторык не праводзіць комплекснага аналізу беларускай публіцыстыкі, а значыць і беларускай нацыянальнай ідэалогіі з прычыны таго, што гэта не ўваходзіла ў яго даследчыцкую задачу.

У 2000 г. у БДПУ імя М. Танка выйшаў навучальны дапаможнік, прысвечаны «Нашай ніве», аўтарства В. Лукіна[79]. Аўтар паспрабаваў сістэматызаваць назапашаныя веды пра «Нашу ніву» і «нашаніўскі перыяд» і паказаць яго месца ў гісторыі Беларусі. Зыходзячы з навучальных задач В. Лукін падрабязна тлумачыць асноўныя тэрміны. Напрыклад, *адраджэнне* – «заканамернасць у жыцці асобных народаў, якая выяўляецца ў паскораным руху да больш высокага ўзроўню грамадскага быцця, культуры і нацыянальнай свядомасці пасля перыяду застою або заняпаду»[80]. Гэтае азначэнне вельмі падобнае да азначэння А. Луцкевіча, які пісаў, што адраджэнне – гэта «падняцце шырокіх народных мас на вышэйшую ступеню культурнага і грамадскага жыцця»[81]. Такім чынам, можна казаць, што гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што погляды ідэолагаў беларускага руху пачатку XX ст. на тагачасны беларускі рух увайшлі і замацаваліся ў беларускай гістарыяграфіі. А з другога боку, тут паўстае праблема новага асэнсавання беларускага нацыянальнага руху з пункту гледжання сённяшняй навукі. Да хібаў дапаможніка можна аднесці неабгрунтаванае сцвярджэнне, што «БСГ была на пачатку стагоддзя адной з самых уплывовых палітычных партыяў сацыял-дэмакратычнага кірунку»[82], а таксама спробу «апраўдаць» «Нашу ніву» ад абвінавачванняў 1931 г. у «контррэвалюцыйнасці» і «нацыянал-дэмакратызме»[83]. Апошняе абсалютна не адпавядае стану сучаснай беларускай гістарычнай навукі і вяртае чытача да спрэчак 1940-х – пач. 1980-х гг.

Гісторык М. Цуба[84] паспрабаваў даць шырокую панараму нацыянальнага руху на фоне палітычных падзей, культурнага і ідэйнага супрацьстаяння ў пяці губернях «паўночна-заходняга краю

Расійскай імперыі». Недахопам працы можна лічыць тое, што аўтар шмат у чым паўтарае папярэднія ёй творы беларускай гістарыяграфіі.

Па дадзенай тэматыцы ёсць публікацыі А. Унучака, у якіх аўтар разглядае ідэалогію беларускага нацыянальнага руху, у асноўным засяродзіўшыся на «Нашай ніве»[85].

З найноўшых прац, дзе разглядаецца «нашаніўства» трэба адзначыць «Нарыс гісторыі Беларусі» З. Шыбекі[86]. Гэты аўтар падрабязна разглядае варыянты свядомасці беларусаў у пачатку XX ст. і прыходзіць да высновы, што іх было тры – беларуская нацыянальная свядомасць, «заходнеруская» і польска-беларуская «краёвая». Даследчык назваў «Нашу ніву» «шчаслівым выпадкам», бо газета здолела «замяніць», на яго думку, шмат якія дзяржаўныя і культурныя інстытуты беларускага грамадства.

Прааналізаваны беларускі нацыянальны рух у 4-м томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі». Адпаведныя раздзелы напісалі М. В. Біч і В. В. Яноўская[87]. У кнізе атрымалі асвятленне праграмы БСГ, узаемаадносіны беларускага руху з іншымі палітычнымі рухамі і партыямі, барацьба з «заходнерусізмам», аналіз зместу «Нашай долі» і «Нашай нівы». Матэрыялы кнігі даюць цэласнае ўяўленне пра беларускі нацыянальны рух пачатку XX ст. Важным момантам з'яўляецца тое, што пачаткам беларускага нацыянальнага руху ў кнізе названы «развіццё славяназнаўства разам з вывучэннем гісторыі Беларусі, фальклору, мовы, звычаяў»[88]. У цэлым можна сказаць, што гісторыя беларускага нацыянальнага руху адпавядае схеме А. Каўкі, выкладзенай ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі».

Падсумоўваючы, належыць зазначыць, што ў беларускай гістарычнай навуцы яшчэ недастаткова даследаваныя палітычная, эканамічная і рэлігійная дактрыны беларускага нацыянальнага руху; «нашаніўскі перыяд» часцей знаходзіўся ў полі даследавання філолагаў, а не гісторыкаў; у беларускай гістарычнай навуцы яшчэ канчаткова не выпрацаваны крытэрыі ацэнкі беларускага руху з гістарычнай перспектывы.

Беларускія гісторыкі засяроджваліся ў асноўным на *падзейнай* гісторыі, пакідаючы часта па-за ўвагай *сацыяльную* гісторыю. У асноўным гэта тычыцца даследавання сацыяльнага аспекту беларускай нацыянальнай ідэалогіі.

Што тычыцца розных ідэйных кірункаў у беларускім руху другой пал. XIX – пач. XX ст., то тут важна, на нашу думку, асэнсаваць і ацаніць іх каштоўнасць з пункту погляду пабудовы гра-

мадзянскай супольнасці ў краі (асабліва гэта датычыцца спадчыны К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча і В. Дуніна-Марцінкевіча).

Таксама наспела патрэба зрабіць параўнальны аналіз беларускага нацыянальнага руху з тыпалагічна падобнымі нацыянальнымі рухамі, перш за ўсё ўкраінскім і літоўскім.

Нарэшце, недастатковым, на нашу думку, з'яўляецца даследаванасць канфесійнага фактару ў беларускім нацыянальным руху.

---

[1] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху / Укладанне і прадмова А. Сідарэвіча. Мн., 2003. С. 36.

[2] Там жа.

[3] Там жа. С. 143.

[4] Навіна А. Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры. Вільня, 1921.

[5] Там жа. С. 11.

[6] Ластоўскі В. Мае ўспаміны аб М. Багдановічы // Крывіч. Месячнік літаратуры, культуры і грамадзкага жыцьця. 1926. № 1(11). С. 62–66; Ён жа. Успаміны аб Янку Купалу // Ластоўскі В. Выбраныя творы. Мн., 1997. С. 197–202.

[7] Там жа. С. 47–48.

[8] Там жа. С. 49.

[9] Там жа. С. 51.

[10] Wasilewski L. Litwa i Białoruś. Przeszłość – teraźniejszość – tendencje rozwojowe. Kraków, 1912. S. 278.

[11] Ibid. S. 281.

[12] Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (кан. XIX – пач. XX ст.). Мн., 1971; Верас З. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Беларускі каляндар. Беласток, 1981. С. 180–189.

[13] Канчер Е. С. Белорусский вопрос. Петроград, 1919.

[14] Там же. С. 44–45.

[15] А. У. Край с пяцьцю націямі // Наша ніва. 1912. 14 чэрв. С. 2–3.

[16] Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. Мн., 1994. С. 9.

[17] Там жа. С. 11.

[18] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэньня Беларусі (Лекцыі, чытаныя для студэнтаў Менскага Пэдагагічнага Інстытуту ў г. Яраслаўлі ў 1917–1918 року). Менск, 1921.

[19] Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі у XIX і пачатку XX сталецьця. Менск, 1925. 2-е выд.

[20] Там жа. С. 86.

[21] Там жа. С. 120.

[22] Там жа. С. 161.

[23] Нацыянальнае пытаньне і комуністычная партыя. Зборнік артыкулаў, прамоваў і пастановаў / Укл. У. Ігнатоўскага. Менск, 1924.

[24] Імшэньнік Хв. «Наша ніва» і дваццацігадовы юбілей беларускае пэрыодычнае прэсы // Полымя. 1926. № 7. С. 51–64.

[25] Шлюбскі А. Новыя матэрыялы да гісторыі «Нашае Долі» // Полымя. 1927. № 3. С. 198–206.

[26] Гаруновіч А. Супроць нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў розных колераў. Менск, 1930.

[27] Там жа. С. 12.

[28] Там жа. С. 14.

[29] Там жа. С. 16.

[30] Дыскусія аб «Нашай ніве». Менск, 1932. С. 13.

[31] Там жа. С. 38, 57.

[32] Там жа. С. 40.

[33] Там жа. С. 50.

[34] Там жа. С. 56.

[35] Вольфсон С. Я. Ідэолёгія і мэтодолёгія нацдэмократызму. Менск, 1931. Т. 1. Ч. 1.

[36] Там жа. С. 8.

[37] Stankievič Ad. Rodnaja mova ŭ śviatyniach. Wilnia, 1929; Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934; Stankievič Ad. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939.

[38] Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 году). Вільня, 1927.

[39] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968.

[40] Александровіч С. Х. Пуцявіны роднага слова. Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст. Мн., 1971.

[41] История Белорусской ССР. Мн., 1954. Т. 1. С. 464.

[42] Ларчанка М. Некаторыя пытанні гісторыі беларускай літаратуры // Літ. і мастацтва. 1956. 17 ліст. С. 2–4; Смолкін М. Плямы царскай цэнзуры // Полымя. 1966. № 3. С. 162–170.

[43] Абэцэдарскі Л., Сідарэнка А. За ідэйную чыстату нашых літаратурных пазіцый // Звязда. 1957. 12 студз.

[44] Верабей М. Ленінскі твор на старонках газеты «Наша ніва» (Да гісторыі марксісцкай эканамічнай думкі ў Беларусі ў эпоху імперыялізму) // Полымя. 1963. № 2. С. 132–136.

[45] Кісялёў Г. З думай пра Беларусь. Мн., 1966; Ён жа. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1988; Пачынальнікі: З гіст.-літар. матэрыялаў XIX ст. / Укл. Г. В. Кісялёў. Мн., 2003 і інш.

[46] Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1972. Т. 2. С. 553.

[47] Mieleszko Jan. Z Białej Rusi (program agrarny) // Gazeta Wileńska. 1906. 13(26) kwiet.

[48] Конон В. Демократическая эстетика Белоруссии (1905–1917). Мн., 1971; Конан У. Пачатак, які не забудзецца // Мастацтва Беларусі. 1986. № 9. С. 20–24.

[49] Игнатенко И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986.

[50] Там жа. С. 35.

[51] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай Рэспублікі (АР БАНЛР). Ф. 21. С. 251. А. 1.

[52] Станкевіч Я. Беларускае нацыянальнае адраджэньне (1912–1915): Нашаніўцы, людзі й плыні // Бацькаўшчына. 1957. № 6–12.

[53] Zaprudnik J. Political struggle for Byelorussia in the tsarist State Dumas (1906–1917). New-York, 1969.

[54] Bergmanowa A. Białoruski tygodnik «Nasza Niwa» (10.XI.1906 – 7.VIII.1915) \\ Kwartalnik Historyczny. 1972. № 79. S. 563–582.

[55] Turonek J. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. W-wa, 1992.

[56] Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia. Lublin, 2000; Radzik R. Kim są Białorusini? Toruń, 2002.

[57] Łaniec St. Białoruś w dobie kryzysu społeczno-politycznego (1900–1914). Olsztyn, 1993.

[58] Ibid. S. 101.

[59] Ермаловіч М. Слова пра «Нашу ніву» (да выхаду факсімільнага выдання) // Полымя. 1990. № 2. С. 164–168; Сидаревич А. Антон Луцкевич: Главы из книги // Нёман. 1990. № 7. С. 91–167; Сідарэвіч А. З жыцця Антона Луцкевіча // Літ. і мастацтва. 1991. 18–25 студз. С. 13.

[60] Бяляцкі А. Літаратура і нацыя. Менск, 1991.

[61] Біч М. В. Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. Гістарычныя асаблівасці, узаемаадносіны з іншымі народамі. Мн., 1993.

[62] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1. С. 429.

[63] Там жа. С. 435.

[64] Гісторыя Беларусі: Падруч.: У 2 ч. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. Мн., 2003. Ч. 1. С. 363.

[65] Янка Купала і «Наша ніва». Зборнік матэр. Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск 7–8 кастрычніка 1996. Мн., 1997.

[66] Станкевіч С. Савецкае асуджэнне «Нашай нівы» й спробы ейнае рэгаблітацыі // Янка Купала і «Наша ніва». С. 150–176; Сянькевіч В. Вытокі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі і «Наша Ніва» // Янка Купала і «Наша ніва». С. 177–185.

[67] Смалянчук А. Беларускае пытанне і польскі рух (1905–1917) // Полымя. 1994. № 6. С. 176–192; Смалянчук А. Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў XIX – пач. XX стст. // Гіст. альманах. 1999. № 2. С. 3–19; Смалянчук А. «Краёвасць» у беларускай і літоўскай гісторыі (1905–1940) // Бел. гіст. агляд. 1997. Т. 4. Сш. 1–2. С. 19–33; Смалянчук А. Краёвец Антон Луцкевіч (Выдавецкая дзейнасць А. Луцкевіча ў 1912–1915 гг. і «краёвая» ідэалогія) // Гіст. альманах. 1998. № 1. С. 27–51; Смалянчук А. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг. Гародня, 2000; Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. СПб., 2004. – 406 с.

[68] Каўка А. «Наша ніва» – Лондан // Жывом! Старонкі беларускага самапазнання. Масква; Менск, 1997. С. 56–58.

[69] Ён жа. От Скорины до Купалы. Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения. М., 2006.

[70] Вяртання маўклівая споведзь. Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. Мн., 1994.

[71] Сідарэвіч А. Хроніка // Крыніца. 2000. № 11–12. С. 134–137; Сідарэвіч А. Сацыял-дэмакратыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 2001. Т. 6. Ч. 1. С. 235.

[72] Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў / Падр. А. Сідарэвіч // Arche. 2006. № 4. С. 153–174; № 5. С. 221–229.

[73] Сідарэвіч А. Луцкевічы і Луцэвіч. Мн., 2003.

[74] Сташкевіч М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. – люты 1917 г.) // Бел. гіст. часоп. 1999. № 3. С. 18–23; № 4. С. 13–19; Сташкевіч М. Гістарычны выбар на пачатку 20 стагоддзя // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000. С. 91–110.

[75] Сташкевіч М. Гістарычны выбар на пачатку 20 стагоддзя // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000. С. 106.

[76] Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст. СПб., 2003. С. 99–109.

[77] Там жа. С. 97.

[78] Забаўскі М. М. Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў час выбараў у II Дзяржаўную Думу Расіі // Весці НАН Беларусі. Сер. грам. навук. 1998. № 2. С. 69–77; Ён жа. Палітычная барацьба ў Беларусі ў перыяд выбараў у III Дзяржаўную Думу // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1987. № 5. С. 74–82; Ён жа. Палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі ў Расійскай Дзяржаўнай Думе // Весці НАН Беларусі. Сер. грам. навук. 2000. С. 68–75; Ён жа. Расійская Дзяржаўная Дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.). Мн., 1999.

[79] Лукін В. С. «Наша ніва» – цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння (1906–1915): Вучэб. дап. Мн., 2000.

[80] Там жа. С. 6.

[81] Навіна А. Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры. Вільня, 1921. С. 6.

[82] Лукін В. С. «Наша ніва» – цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння (1906–1915). С. 11.

[83] Там жа. С. 12–14.

[84] Цуба М. В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 гг.). Брэст, 2003.

[85] Унучак А. Арганізацыйнае станаўленне «Нашай нівы» // Гісторыя: праблемы выкладання. 2004. № 4. С. 46–53; Ён жа. Газета «Наша ніва» аб выбарах у II Дзяржаўную Думу Расійскай імперыі // Весці НАН Беларусі. Сер. грам. навук. 2004. № 4. С. 61–68; Ён жа. «Наша ніва» і ідэйнае выхаванне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі // Бел. гіст. часоп. 2005. № 4. С. 16–22; Ён жа. «Нашаніўскія» дакументы ў фондах рукапіснага аддзелу Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы // Спадчына. 2003. № 4–5. С. 46–51.

[86] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мн., 2003.

[87] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Мн., 2005. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (кан. XVIII – пач. XX ст.). Мн., 2005.

[88] Там жа. С. 269.

Раздзел 3

ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: НАВУКОВАЯ СПАДЧЫНА

3.1. Вайна 1812 г. і Беларусь

Падзеям вайны 1812 г. прысвечана вялізная і рознабаковая літаратура. Ужо праз 4 гады пасля вайны, па падліках М. Пісарава, налічвалася 155 рускіх, 36 французскіх твораў і 114 публікацый на іншых мовах, якія ў той ці іншай ступені асвятлялі падзеі вайны. Колькасць твораў аб вайне 1812 г. у другой палове XIX ст. імкліва ўзрастала: па падліках ваеннага публіцыста І. Ліпрандзі да 1876 г. было выдадзена 400 рускіх і 678 замежных твораў (у лік якіх аўтар залічыў раманы, аповесці, драмы, анекдоты, вершы, песні, маршы і нават танцы). У сувязі са стогадовым юбілеем вайны 1812 г. выйшла каля 600 новых твораў[1]. Савецкія гісторыкі зафіксавалі 2,5 тыс. кніг і артыкулаў, выдадзеных да 1917 г. (лічба яўна заніжана).

Адлюстраванню падзей 1812 г. на беларускіх землях прысвечана шматлікая і рознабаковая літаратура рознай навуковай вартасці, як айчынных, так і замежных аўтараў. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі разглядаліся ў асноўным у даследаваннях ваенных гісторыкаў, у гісторыка-краязнаўчых працах і інш. Першыя абагульняючыя работы – агульныя ваенна-стратэгічныя агляды кампаніі 1812 г., напісаныя сучаснікамі і непасрэднымі ўдзельнікамі падзей, у якіх апісваліся асобныя баі на тэрыторыі Беларусі з пункту гледжання афіцыйнай ідэалогіі, з'явіліся адразу ж пасля вайны[2]. Аўтары гэтых прац імкнуліся перадаць свае пачуцці, настроі, асабістыя ўражанні аб падзеях нядаўняй вайны. Адлюстроўваліся найперш баявыя поспехі расійскіх войскаў, прыводзілася шмат прыкладаў патрыятычнага запалу, адначасова замоўчваліся баявыя няўдачы і прагалы расійскага ваеннага камандавання.

Асвятленне баявых дзеянняў расійскіх войскаў на беларускіх землях у гэтых творах мела фрагментарны характар і зводзілася да апісання асобных баёў. Да падобнага роду выданняў можна аднесці ўспаміны ўдзельнікаў вайны. Характэрная ў гэтых адносі-

нах праца падпалкоўніка, камандзіра батальёна казакоў 2-га Украінскага палка І. Похвіснева[3]. Да галоўных недахопаў першых прац, прысвечаных падзеям 1812 г. можна аднесці наступныя: фактычныя памылкі і недакладнасці ў геаграфічных назвах, вызначэнні месцаў баёў і скажэнні ў датаванні падзей, пафасны стыль выкладання, амаль поўная адсутнасць навукова-крытычнага аналізу, што надавала падобным творам рысы «одаў-усхваленняў» расійскім военачальнікам (М. Кутузаву, П. Вітгенштэйну і інш.).

Расійская гістарыяграфія першай паловы XIX ст. звярнула асноўную ўвагу на батальны аспект вайны: размяшчэнне і перадыслакацыю войскаў проціборствуючых бакоў, стратэгічнае планаванне і тактычнае манеўраванне і іх рэалізацыю ў ходзе баявых аперацый, падрабязнае апісанне аперацый і асобных баёў і г. д. Гэтыя праблемы даволі грунтоўна асвятляліся на старонках твораў ваенных гісторыкаў Д. Ахшарумава, Д. Бутурліна, М. Акунёва, А. Міхайлоўскага-Данілеўскага, М. Багдановіча і інш.[4]. Працы ўтрымлівалі характэрныя рысы ўрадавай канцэпцыі вайны: апісанне ваенных дзеянняў з акцэнтаваннем подзвігаў расійскіх генералаў і арміі, тэзісы аб адзінстве саслоўяў вакол прастола на аснове адзінства веры, любові і вернасці да цара і айчыны, паказ разгортвання «народнай вайны» як масавага гераізму жыхароў, узвышэнне ролі Аляксандра І і інш. Разам з тым гэтыя работы станоўча вылучаюцца значнай крыніцазнаўчай базай, багаццем апрацаванага і сістэматызаванага фактычнага матэрыялу, элементамі крытычнага аналізу падзей.

Першай абагульняючай навуковай працай аб вайне 1812 г. у расійскай гістарыяграфіі можна лічыць працу генерал-маёра Д. Ахшарумава[5]. Але падзеі на беларускіх землях не атрымалі ў ёй дастатковага раскрыцця, таму што аўтар засяродзіў сваю ўвагу на апісанні найважнейшых падзей вайны пераважна на тэрыторыі вялікарасійскіх губерняў.

З апублікаваннем двухтомнай працы ўдзельніка вайны 1812 г. Д. Бутурліна, напісанай пераважна на аснове афіцыйных матэрыялаў расійскага Галоўнага штаба і некаторых трафейных напалеонаўскіх дакументаў, звязана станаўленне афіцыйнай расійскай гістарыяграфіі 1812 г. Гэты твор, напісаны па загаду Аляксандра І, быў надрукаваны спачатку на французскай, а потым перакладзены на рускую мову і вытрымаў два выданні[6]. На думку Д. Бутурліна, Расія рыхтавалася да абарончай вайны супраць захопніцкіх і славалюбівых намаганняў Напалеона. Таму на старонках першага тома гэтай працы значнае месца было адведзена апісан-

ню падрыхтоўкі французскага імператара да нападу на Расійскую імперыю і адпаведна падрыхтоўчым мерапрыемствам царскага ўрада да ўмацавання будучага тэатра ваенных дзеянняў у 1810 – чэрвені 1812 г. Пры ацэнцы вынікаў асобных баёў, у тым ліку і на беларускіх землях, Д. Бутурлін указваў на відавочныя прагалы расійскага ваеннага камандавання ў Полацкіх бітвах, Бярэзінскай аперацыі і г. д. Д. Бутурлін намагаўся ахарактарызаваць і крытычна пераасэнсаваць ваенна-аперацыйныя прагалы абодвух бакоў. Д. Бутурлін па сутнасці ўпершыню апісаў усе найважнейшыя баявыя сутычкі на беларускіх землях.

У кнізе палкоўніка Н. Акунёва[7] асноўная ўвага ўдзялялася аналізу прагалаў расійскага ваеннага камандавання. Крытычна ацэньваючы ваенна-стратэгічныя дзеянні абодвух бакоў, аўтар імкнуўся да гістарычнай аб'ектыўнасці. Аднак паглыбіўшыся ў ваенна-тэарэтычныя абагульненні, часта, на нашу думку, не прыводзіў пераканаўчых доказаў і не пацвярджаў фактычным матэрыялам свае падыходы і думкі пры асэнсаванні хода і вынікаў, напрыклад, Полацкіх бітваў, Салтанаўскага бою і інш. Павярхоўны разгляд падзей абумовіў пэўную спрэчнасць вывадаў аўтара[8].

Найбольш вядомым, аўтарытэтным і разнапланавым творам афіцыйнай расійскай гістарыяграфіі 30–40-х гг. XIX ст. стала 4-томная манаграфія генерал-лейтэнанта А. Міхайлоўскага-Данілеўскага, у якой асвятляліся розныя аспекты вайны. Акрамя традыцыйнага апісання баявых дзеянняў, аўтар паспрабаваў у агульных рысах высветліць становішча тэрыторый, занятых напалеонаўскімі войскамі, вынікі вайны і г. д.[9]. Да безумоўных вартасцей даследавання А. Міхайлоўскага-Данілеўскага можна аднесці яркасць літаратурнага стылю і большую, чым у папярэднікаў, крыніцазнаўчую базу, бо гісторык карыстаўся матэрыяламі спецыяльна адкрытых для яго расійскіх архіваў. Тым не менш у пэўных кругах грамадскасці ён праславіўся як «рускі байкапісец», бо, нягледзячы на значны фактычны матэрыял, пэўныя падзеі скажаліся пад пяром пісьменніка, каб дагадзіць расійскім афіцыйным колам. У выніку чаго ўзвялічвалася слава расійскай зброі і прыніжаліся ваенна-стратэгічныя, аператыўныя і баявыя поспехі напалеонаўскіх войскаў.

Трохтомнае даследаванне М. Багдановіча ўяўляла сабой самае падрабязнае апісанне падзей вайны 1812 г. у расійскай гістарыяграфіі дарэформеннага перыяду[10]. Ваенны гісторык лічыў, што «апісанне дзеянняў павінна быць складзена так, каб гэтыя вывады нараджаліся самі сабою з разгляду падзей, а не былі вынікам ні

абстрактных тэорый, ні галаслоўных заключэнняў гісторыка»[11]. Таму М. Багдановіч, разглядаючы пэўную праблему, перапісваў амаль цалкам з розных крыніц (сярод якіх былі не толькі матэрыялы расійскай афіцыйнай перапіскі, але і выдадзеныя да гэтага часу ўспаміны ўдзельнікаў вайны расійскага і напалеонаўскага бакоў), у выніку чаго часткі тэкста амаль не звязваліся ў адзіную лагічную структуру і мелі выгляд кампілятыўнасці. Ён таксама паспрабаваў перагледзець стэрэатыпы і домыслы на некаторыя з'явы, пераасэнсаваць пэўныя падзеі з элементамі іх навуковай крытыкі. Напрыклад, ён крытычна ацаніў дзеянні царскіх улад па падрыхтоўцы будучага тэатра ваенных дзеянняў у інтэнданцкіх адносінах, пралікі і памылкі М. Кутузава ў час Бярэзінскай аперацыі і г. д.

А. Папоў быў заснавальнікам крытычнага напрамку ў гістарыяграфіі і так званай буржуазнай канцэпцыі расійскай гістарыяграфіі вайны 1812 г. Галоўныя яе пастулаты: развенчванне тэзісаў канцэпцыі аб адзінстве саслоўяў вакол ідэі «выратавання Айчыны»; супрацьпастаўленне рашаючай ролі дваранства і Аляксандра I у вайне «рускаму грамадству», узвышэнне ролі М. Кутузава ў параўнанні з іншымі расійскімі палкаводцамі ў разгроме арміі Напалеона і інш.[12].

Ідэі А. Папова развівалі ў сваіх працах У. Харкевіч і К. Ваенскі. У сваіх працах У. Харкевіч паглыбіў і навукова абгрунтаваў уяўленні аб баявых дзеяннях у час вайны 1812 г., прааналізаваў асобныя баі, больш аб'ектыўна і доказна ацаніў дзеянні палкаводцаў, прычым абодвух бакоў. Шэраг прац У. Харкевіч прысвяціў апісанню баявых дзеянняў менавіта на беларускіх і літоўскіх землях[13]. У даследаванні, прысвечаным разгляду ваенных дзеянняў расійскіх войскаў у пачатковы перыяд вайны (ад Нёмана да Смаленска), У. Харкевіч даволі падрабязна апісаў рух напалеонаўскіх і расійскіх войскаў па беларускай зямлі, баі пад Мірам, Раманавым, Салтанаўкай, Астроўнай і інш. Праца змяшчае цікавыя звесткі аб прычынах і падрыхтоўцы да баявога сутыкнення напалеонаўскіх і расійскіх войскаў. Шырокае выкарыстанне надрукаваных дакументаў «Вялікай арміі» дазволіла аўтару пазбегнуць аднабаковасці пры апісанні баёў. Акрамя традыцыйных батальных сюжэтаў на старонках кнігі можна знайсці цікавыя матэрыялы наконт арганізацыі напалеонаўскай разведкі ў Расійскай імперыі напярэдадні вайны 1812 г., выпрацоўцы і ажыццяўленні ваенна-стратэгічных планаў расійскага ваеннага камандавання і інш.

У манаграфіі, прысвечанай разгляду Бярэзінскай аперацыі У. Харкевіч высветліў планы па правядзенні аперацыі, адлюст-

раваў яе ход і вынікі, даў ацэнку дзеянняў расійскіх военачальнікаў (П. Вітгенштэйну, які марудзіў; П. Чычагаву, які блытаў; М. Кутузаву, які заставаўся сведкам падзей убаку ад іх)[14]. На думку У. Харкевіча, Бярэзінская аперацыя была добра спланавана, але дрэнна ажыццёўлена.

Значна актывізавалася вывучэнне батальных падзей вайны 1812 г. пасля стварэння Рускага ваенна-гістарычнага таварыства (1907) і ў сувязі са 100-гадовым юбілеем вайны. У Варшаўскай, Віленскай і Кіеўскай ваенных акругах выйшлі юбілейныя працы, у якіх апісваліся баявыя дзеянні 1812 г. на тэрыторыі пэўнай акругі. Аднак гэтыя працы не вылучаліся навуковай вартасцю, бо аўтары складалі гэтыя творы на аснове ўжо апублікаваных даследаванняў[15].

У сувязі са 100-гадовым юбілеем вайны 1812 г. выйшлі ў свет ваенна-гістарычныя нарысы, прысвечаныя падрыхтоўцы да вайны і баявым дзеянням расійскіх войскаў на беларускіх землях у пачатковы перыяд. Так, В. Буркоўскі ў сціслай форме ахарактарызаваў асноўныя напрамкі практычных мерапрыемстваў ваеннага кіраўніцтва Расійскай імперыі па падрыхтоўцы да вайны ў заходніх губернях[16]. В. Мірны апісаў Віленскую наступальную аперацыю «Вялікай арміі» і адступленне расійскіх войскаў да Дрысы і Нясвіжы[17]. Даследаванне М. Інастранцава аб баявых аперацыях 2-й Заходняй арміі П. Баграціёна падчас яе адступлення ад заходніх межаў да Смаленска было напісана на аснове ўжо раней надрукаваных дакументаў і матэрыялаў[18]. Тым не менш, гэта адно з найбольш поўных апісанняў баявых дзеянняў арміі П. Баграціёна на беларускай зямлі са змястоўнымі вытрымкамі з дакументаў.

У савецкай гістарыяграфіі да сярэдзіны 30-х гг. XX ст. панавала ацэнка падзей вайны 1812 г. у інтэрпрэтацыі акадэміка М. Пакроўскага. Ён выказаў шэраг арыгінальных, аднак не заўсёды абгрунтаваных і пераканаўчых сцвярджэнняў і меркаванняў. Гісторык паглыбіў пункт гледжання У. Харкевіча наконт ацэнкі вынікаў Бярэзінскай аперацыі, заўважыўшы, што план разгрома «Вялікай арміі» не быў здзейснены, таму што «ў нашы рукі не трапіў не толькі Напалеон, але і ні адзін з яго маршалаў, ні адзін батальён яго гвардыі». А нерашучасць галоўнага віноўніка правалу аперацыі М. Кутузава, на думку М. Пакроўскага, абумовіла неабходнасць правядзення новай кампаніі 1813 г. супраць Напалеона[19]. У сваёй манаграфіі Я. Тарле[20], найбольш значнага даследавання падзей вайны 1812 г. у савецкай гістарыяграфіі, у асноўным зводзіў правал Бярэзінскай аперацыі, пагібельнай для «Вялікай

арміі», да спазнення на месца дзеяння войскаў М. Кутузава, П. Чычагова і П. Вітгенштэйна.

У другой палове 30-х – першай палове 50-х гг. фарміруецца сталінская канцэпцыя разумення гісторыі вайны 1812 г.[21]. У пачатку 50-х гг. савецкія ваенныя гісторыкі абгрунтоўвалі тэзіс І. Сталіна аб тым, што «наш геніяльны палкаводзец Кутузаў... загубіў Напалеона пры дапамозе добра падрыхтаванага контрнаступлення», паклаўшы тым самым пачатак ідэалізацыі М. Кутузава ў расійскай гістарыяграфіі[22].

У другой палове 50-х – першай палове 80-х гг. XX ст. погляды на падзеі вайны 1812 г. характарызаваліся тэндэнцыяй ідэалізацыі военачальнікаў і герояў вайны 1812 г. П. Жылін, М. Гарніч узвялічвалі і перабольшвалі баявыя поспехі расійскіх войскаў на чале з М. Кутузавым, прымяншалі іх няўдачы і страты[23]. Больш стрыманым у катэгарычных ацэнках было абагульняючае даследаванне Л. Бяскроўнага, дзе ён разгледзеў даваенны ваенна-эканамічны патэнцыял Расійскай імперыі і часткова Францыі, асвятліў дзеянні расійскіх армій у пачатку вайны. Аднак і ён не пазбег перадузятасці, намагаючыся ўславіць рускае ваеннае майстэрства. Так, ён лічыў Бярэзінскую аперацыю прыкладам «умела праведзенага акружэння і знішчэння арміі праціўніка»[24].

У той жа час шэраг савецкіх гісторыкаў плённа працавалі над вывучэннем пэўных аспектаў вайны 1812 г.: даследавалі асобныя аперацыі (В. Вялікаў)[25], працэс расійскага ваенна-стратэгічнага планавання напярэдадні і ў пачатку вайны (В. Пугачоў[26]), дзейнасць ваенных разведак Расіі і Францыі напярэдадні і ў час кампаніі 1812 г., уплыў разведдадзеных на распрацоўку планаў бакоў (В. Безатосны[27]), удзел народнага апалчэння ў баявых дзеяннях (Б. Ліўчак[28], В. Бабкін[29]), баявыя дзеянні з напалеонаўскімі войскамі на паўднёвым стратэгічным флангу, вызначэнні месца і ролі ўкраінскіх зямель у час вайны 1812 г., выкарыстанні людскіх і матэрыяльных рэсурсаў украінскіх губерняў расійскім ваенным камандаваннем у перыяд падрыхтоўкі да вайны і для ўзмацнення забеспячэння дзеючых войскаў усім неабходным у час баявых дзеянняў на землях Беларусі (Б. Абаліхін[30]), дзейнасць М. Барклая дэ Толі на пасту галоўнакамандуючага 1-й Заходняй арміяй (В. Татфалушын[31]) і інш.

У перыяд перабудовы навізной аўтарскіх падыходаў, імкненнем развянчаць ненавуковыя пастулаты і стэрэатыпы савецкай гістарыяграфіі, прысвечанай падзеям 1812 г. вызначалася даследаванне М. Троіцкага. На жаль, аўтар не засяродзіў увагі на падзеях на землях Беларусі[32].

Пасля распаду СССР расійскія гісторыкі звярнуліся да паглыбленага вывучэння, у тым ліку на новай метадалагічнай аснове і больш шырокай крыніцазнаўчай базе, маладаследаваных аспектаў вайны 1812 г., перасэнсавання спрэчных і дыскусійных праблем. З канца XX ст. яны даследуюць асобныя баі на тэрыторыі Беларусі з выкарыстаннем замежных крыніц і літаратуры[33]. У даследаваннях І. Васільева і А. Сакалова перагледжаны ранейшыя ацэнкі Бярэзінскай аперацыі[34]. У цэнтры ўвагі даследчыкаў аказаліся і праблемы забеспячэння расійскай арміі, яе колькаснага складу і страт[35].

З 90-х гадоў XX ст. беларускія гісторыкі пачалі сістэматызаванае вывучэнне баявых дзеянняў у пэўнай мясцовасці[36], якое працягвалася пазней у сувязі з выхадам з друку гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Акрамя агульнага агляду ўзброенай барацьбы на беларускіх землях[37] і даведачных артыкулаў[38] была звернута ўвага і на баявыя дзеянні 3-й Заходняй арміі і корпуса Ф. Эртэля на поўдні Беларусі[39].

Такім чынам, гістарыяграфічны аналіз сведчыць аб тым, што ў рознай ступені дакладнасці, паўнаты і якасці даследаваны асобныя баі на тэрыторыі Беларусі ў час вайны 1812 г. Найбольшая ўвага надавалася вывучэнню самых значных баёў, асабліва Бярэзінскай аперацыі. Таму настала патрэба апісання ўсіх баявых сутычак (больш за 100) на беларускай зямлі паміж напалеонаўскімі і расійскімі войскамі ў час вайны 1812 г., а таксама дэталёвай рэканструкцыі буйных вайсковых аперацый і баёў з выкарыстаннем крыніц абодвух бакоў.

У дасавецкай расійскай гістарыяграфіі закраналася і дзейнасць органаў напалеонаўскай адміністрацыі, узаемаадносіны мясцовага насельніцтва з французскімі войскамі. У даследаваннях ваенных гісторыкаў адлюстроўвалася сітуацыя ў занятых напалеонаўскімі войскамі рэгіёнах Расійскай імперыі, у тым ліку і беларускіх зямель. М. Багдановіч[40] быў адным з першых расійскіх ваенных гісторыкаў, які паспрабаваў ахарактарызаваць падзеі, што адбыліся на тэрыторыях, занятых напалеонаўскімі войскамі[41]. Ён расказаў аб стварэнні органаў напалеонаўскай адміністрацыі ў Беларусі і Літве, адлюстраваў асноўныя напрамкі іх дзейнасці па забеспячэнні войскаў «Вялікай арміі», арганізацыі ўзброеных фарміраванняў, зборы грашовых сродкаў. Аўтар паспрабаваў высветліць умовы фарміравання адзінак войска ВКЛ, апісаў баявыя сутычкі беларуска-літоўскіх фарміраванняў з расійскімі рэгулярнымі часцямі, прасачыў яго далейшы лёс у 1813–1814 гг.

У цэлым, дарэвалюцыйныя расійскія ваенныя гісторыкі першай паловы XIX ст. больш падрабязна разглядалі агульныя праблемы вайны пераважна на тэрыторыі вялікарасійскіх губерняў, абмяжоўваючыся схематычным апісаннем ваенных дзеянняў і толькі закраналі, даючы агульныя, адрывачныя, а часам супярэчлівыя і тэндэцыйныя звесткі аб сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці тэрыторый Расійскай імперыі, часова занятых напалеонаўскай арміяй.

У 60-я гг. XIX – пачатку XX ст. больш сістэматызавана ў спецыяльных творах пачала разглядацца сітуацыя ў герцагстве Варшаўскім і заходніх губернях Расійскай імперыі напярэдадні і ў час вайны 1812 г. У працах генерала М. Дубровіна была зроблена спроба разгляду некаторых аспектаў функцыянавання органаў напалеонаўскай адміністрацыі на землях Беларусі, адносін мясцовага насельніцтва да войскаў «Вялікай арміі»[42].

Побач з ваенна-гістарычнымі даследаваннямі асобныя аспекты дзейнасці напалеонаўскіх улад у заходніх губернях Расійскай імперыі першапачаткова закраналіся ў працах М. Без-Карніловіча, П. Кукальніка, Я. Тышкевіча, Ч. Янкоўскага і інш.[43]. Так, у нарысах па гісторыі населеных пунктаў М. Без-Карніловіч прывёў звесткі аб становішчы Полацка, Віцебска і Магілёва ў час вайны 1812 г.[44]. Стан беларускіх зямель у час вайны 1812 г. і яе сацыяльна-эканамічныя вынікі разглядаліся таксама ў А. Семянтоўскага, В. Далгарукава, М. Фурсава, Я. Арлоўскага[45], па гісторыі асобных паветаў і гарадоў[46]. Шэраг успамінаў удзельнікаў вайны 1812 г., а таксама гісторыка-краязнаўчых нататкаў было надрукавана на старонках неафіцыйных аддзелаў губернскіх ведамасцей[47].

У канцы XIX – пачатку XX ст., у сувязі з падрыхтоўкай да 100-гадовага юбілею вайны 1812 г., з'яўляецца шэраг даследаванняў па гісторыі асобных рэгіёнаў. У гэты час выйшлі з друку навукова-папулярныя нарысы аб падзеях вайны 1812 г. у Віцебскай[48], Магілёўскай[49] і Гродзенскай[50] губернях, у Вільні[51] і ў Магілёве[52]. Сярод іх асобай увагі заслугоўваюць грунтоўныя працы У. Краснянскага аб становішчы Мінска і Барысаўскага павета ў час вайны 1812 г.[53]. У працы, прысвечанай апісанню Барысаўскага павета ў час вайны 1812 г.[54], аўтар на аснове аналізу выдадзеных дакументаў Барысаўскай падпрэфектуры і іншых афіцыйных матэрыялаў падрабязна ахарактарызаваў працэс стварэння і функцыянавання органаў напалеонаўскай адміністрацыі ў Барысаўскім павеце, ахарактарызаваў асабістыя, маёмасныя і грашовыя павіннасці, накладзеныя новымі ўладамі, высветліў матэрыяльны стан,

абавязкі і адносіны да рэжыму розных колаў грамадства, прывёў даныя аб рэлігійным жыцці, аб матэрыяльных стратах павета і г. д. У. Краснянскі на аснове матэрыялаў Мінскага губернскага архіва і ўспамінаў сучаснікаў апісаў эвакуацыйныя мерапрыемствы расійскіх улад у пачатку вайны, адносіны мясцовага насельніцтва да войскаў «Вялікай арміі», становішча Мінска ў час заняцця яго напалеонаўскімі войскамі[55].

Грунтоўнае 7-томнае даследаванне «Отечественная война и русское общество»[56] закранула стан расійскага грамадства ў час вайны 1812 г., у тым ліку і ў беларуска-літоўскіх губернях. Асобныя працы былі прысвечаны апісанню стаўлення да падзей вайны 1812 г. розных слаёў грамадства. С. Гінзбург прысвяціў сваё даследаванне адносінам яўрэяў Расійскай імперыі да падзей вайны 1812 г.[57]. Паводзінам праваслаўнага і уніяцкага духавенства ў час вайны прысвечаны працы па канфесійнай гісторыі[58]. Сярод іх неабходна адзначыць брашуру протаіерэя А. Мацюшанскага, у якой ён часткова ахарактарызаваў паводзіны і пазіцыю праваслаўнага і уніяцкага святарства і вернікаў Полацкай епархіі і іх стаўленне да падзей вайны[59].

У другой палове 30-х гг. XX ст. выйшлі з друку яркія даследаванні Я. Тарле, якія ўтрымлівалі цікавыя аўтарскія назіранні, заўвагі і высновы па дадзенай праблеме. Ён сфармуляваў асноўную мэту «рускай кампаніі» французскага імператара: «… стварыць супраць Расіі вечную пагрозу ў выглядзе васальнай, суцэльна залежнай ад французаў Польшчы, да якой далучыць Літву і Беларусію…», а сутнасць палітыкі Напалеона ў гістарычнай Літве прадставіў наступным чынам: «…неабходна было, нічога не даючы самой Літве, арганізаваць планамернае выпампоўванне з гэтай краіны хлеба, сена, аўса і навабранцаў»[60]. А. Прадцечанскі ў невялікім артыкуле заўважыў, што ў Літве і Беларусі «палітычная сітуацыя была больш складанай», чым у вялікарасійскіх губернях[61].

Аб дзейнасці органаў напалеонаўскай адміністрацыі згадвалася ў абагульняючых даследаваннях па гісторыі Расіі і міжнародных адносін канца XVIII – пачатку XIX ст. Так, напрыклад, С. Окунь лічыў галоўнай мэтай стварэння напалеонаўскай адміністрацыйнай сістэмы ў Беларусі і Літве – неабходнасць выкарыстання мясцовых людскіх і харчовых рэсурсаў для патрэб «Вялікай арміі». Таму для паспяховай рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў было неабходна захаваць памешчыцкія прывілеі[62].

У сувязі з 150 і 175-гадовымі юбілеямі вайны 1812 г. пашырылася вывучэнне яе падзей у пэўных рэгіёнах. У цэлым, савецкія

гісторыкі асвятлялі падзеі вайны 1812 г. на землях Беларусі з мэтай даказаць сілу сяброўства і баявога адзінства рускага і беларускага народаў і таму прыводзілі прыклады супрацоўніцтва беларускіх сялян з расійскімі войскамі[63]. Значную ўвагу савецкія гісторыкі ўдзялялі праблеме антыпрыгонніцкіх выступленняў сялян, у тым ліку і на тэрыторыях, занятых войскамі «Вялікай арміі». Цікавыя факты наконт сялянскіх хваляванняў на землях Беларусі ў час вайны 1812 г. прыведзены ў раздзелах шэрагу абагульняючых даследаванняў, асобных артыкулах[64].

Беларускія гісторыкі ў гэты час таксама прытрымліваліся афіцыйных меркаванняў у асвятленні падзей вайны 1812 г.: адзінства беларускага і рускага народаў у барацьбе з агульным ворагам. У гэтых рамках былі напісаны артыкулы пра ўсталяванне і дзейнасць напалеонаўскай адміністрацыі ў Гродне[65].

У 40–60-я гг. XX ст. спецыяльна падзеі напярэдадні і падчас вайны 1812 г. у Беларусі вывучаў Я. Карнейчык[66]. У працы выдадзенай да 150-годдзя вайны 1812 г. ён зрабіў агульны агляд баявых дзеянняў, у пэўнай ступені асвятліў палітыку напалеонаўскіх улад у Беларусі, дастаткова поўна апісаў дапамогу беларускіх сялян расійскім войскам і дзеянні сялян-партызан, дапамагаўшых расійскай арміі. Але ў цэлым кніга мае тэндэнцыйны, прарасійскі ўхіл. Яе аўтар намагаўся «на яскравых і пераканаўчых фактах» паказаць «баявую садружнасць паміж рускім і беларускім народамі, умацаванне роднасці абодвух братэрскіх народаў у вайне 1812 года»[67]. З прычыны выкарыстання вузкага кола апублікаваных крыніц і пэўных ідэалагічных абмежаванняў аўтару не ўдалося поўна і ўсебакова раскрыць тэму, пазбегнуць фактычных памылак, скажэнняў, аднабаковасці і прадузятасці.

У 90-х гг. абагуленую характарыстыку падзей напярэдадні і ў час вайны 1812 г. у Беларусі падаў у энцыклапедычных артыкулах В. Антонаў[68]. І. Кудрашоў звярнуў увагу на своеасаблівасць сітуацыі ў Беларусі і Літве ў час вайны 1812 г. У кароткім, але змястоўным нарысе, ён разгледзеў арганізацыю асноўных відаў і родаў войска ВКЛ 1812 г., апісаў іх уніформу, прывёў прыклады ўдзелу ў баявых дзеяннях[69]. Працягам гэтай працы стала даследаванне па вывучэнні асобных нацыянальных частак «Вялікай арміі»[70]. В. Бяссонаў паспрабаваў вызначыць колькасць і ўмовы ўтрымання ваеннапалонных «Вялікай арміі» ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі[71]. А. Папоў[72] прысвяціў сваю манаграфію аналізу арганізацыі і функцыянаванню тылавых устаноў і камунікацый напалеонаўскай арміі ў Расійскай імперыі ў час вайны 1812 г.

Ён звярнуў увагу на тое, што тэрыторыя Беларусі і Літвы ўваходзіла ў сферу геапалітычных інтарэсаў Расіі і Францыі ў супрацьборстве за спрэчныя землі былой Рэчы Паспалітай, і таму французскі імператар спрабаваў разыграць польскую «карту». У заходніх губернях вайна 1812 г., на думку даследчыка, мела нацыянальна-вызваленчы характар. Аднак насельніцтва сустрэла войскі «Вялікай арміі» без пачуцця варожасці, але і без асаблівага запалу. Аўтар прыйшоў да слушнай высновы, што прычынай паражэння напалеонаўскай арміі ў Расіі з'яўляліся стратэгічныя памылкі французскага імператара, якія вынікалі па палітычных матывах[73]. У асобным артыкуле А. Папоў вызначыў прычыны, якія вымусілі Напалеона захаваць прыгоннае права ў так званай Белай Русі[74].

Я. Панасенкаў звярнуў увагу на дыскусійныя праблемы вайны 1812 г., асабліва на тэмы, якія практычна не вывучаліся ці скажаліся ў спецыяльнай і вучэбнай літаратуры. Ён паспрабаваў развеяць догмы і памылковыя погляды на падзеі вайны 1812 г., разгледзеў гісторыю шостай антыфранцузскай кааліцыі 1812 г. у кантэксце войн напалеонаўскай эпохі. Гісторык паказаў спробу ўкаранення на занятых войскамі «Вялікай арміі» тэрыторыях французскай сістэмы мясцовага кіравання[75].

Зразумела, што некаторыя аспекты падзей вайны 1812 г. у Беларусі сталі аб'ектам пільнай увагі прадстаўнікоў нацыянальнай гістарыяграфіі, асабліва з часу абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. З'явілася шмат публікацый навукова-папулярнага і палемічнага плана наконт розных аспектаў дзейнасці напалеонаўскай адміністрацыі ў Беларусі[76]. Даследчыкі звярнулі ўвагу на фарміраванне і баявы шлях войска ВКЛ 1812–1814 гг.[77], палітыку Напалеона ў Беларусі[78]. В. Піліпчык паспрабаваў абгрунтаваць грамадзянскі характар вайны 1812 г. у адносінах да Беларусі[79]. Л. Несцярчук адзначыў, што «вялікая частка беларускага насельніцтва варожа адносілася да расійскага войска ў перыяд вайны 1812 года»[80].

Спробы навуковага аналізу і асэнсавання падзей палітычнага жыцця ў Беларусі пад напалеонаўскім панаваннем зрабілі С. Таляронак і В. Швед. С. Таляронак паказаў фарміраванне дзяржаўных структур ВКЛ 1812 г.[81], выказаў шэраг меркаванняў па спрэчных і дыскусійных праблемах вайны 1812 г. на землях Беларусі[82]. Галоўнай мэтай створанай Напалеонам сістэмы кіравання (дзяржаўных структур ВКЛ) было, на думку гісторыка, арганізаванае забеспячэння войскаў «Вялікай арміі»[83]. В. Швед справядліва падкрэсліў нераспрацаванасць праблемы «вайна 1812 г. і Бе-

ларусь»[84], звярнуў увагу на адсутнасць нацыянальнай канцэпцыі па праблеме «Землі Беларусі ў час напалеонаўскіх войн»[85], на аснове некаторых апублікаваных матэрыялаў і дакументаў мясцовага архіва разгледзеў працэс арганізацыі дзяржаўных інстытутаў ВКЛ 1812 г.[86].

Сучасныя даследчыкі ўдзяляюць увагу даследаванню дзейнасці напалеонаўскай адміністрацыі ў пэўнай мясцовасці, сведчаннем чаго з'яўляецца даволі вялікая колькасць прац[87]. Э. Іофе, на аснове раней апублікаваных прац, прааналізаваў адносіны беларускіх яўрэяў да ваюючых бакоў і зрабіў выснову, што ў час узброенай барацьбы большасць яўрэяў Беларусі засталася адданай Расійскай імперыі[88]. У. Сосна прыйшоў да высноў, што працэс секвестру памешчыцкіх маёнткаў як аднаго з эфектыўных сродкаў барацьбы з пранапалеонаўскімі настроямі ў дваранскім асяроддзі ў рамках папераджальных мер па палітычным супакаенні краю[89]. У асобным артыкуле даследчык паспрабаваў вызначыць ролю беларускіх сялян у ваенна-палітычных падзеях 1812 г.[90]. Палітыку канфіскацый зямельнай маёмасці як адной з мер пакарання прыхільнікаў Напалеона на землях Беларусі ў 1809–1813 гг. прааналізаваў А. Радзюк[91].

У артыкулах і кандыдацкай дысертацыі Ю. Літвіноўскай[92] прыведзены факты рабаўніцтва прадстаўнікоў «Вялікай арміі», адлюстраваны дзейнасць мясцовых органаў напалеонаўскай адміністрацыі, пазіцыя дваранства і духавенства ў час вайны 1812 г., паказаны матэрыяльныя і людскія страты зямель Беларусі пасля вайны, разгледжаны некаторыя пытанні дзейнасці расійскай адміністрацыі напярэдадні і ў час вайны 1812 г. Аднак, на наш погляд, выкарыстанне аўтаркай вузкага кола, у большасці толькі рускамоўных, крыніц і шырыня праблематыкі даследавання не дазволілі ёй у дастатковай ступені пераканаўча абгрунтаваць некаторыя прыведзеныя высновы. Працэс арганізацыі і дзейнасці напалеонаўскай адміністрацыі на ўсіх землях Беларусі, а таксама асаблівасці іх функцыянавання ў асобных тэрытарыяльных рэгіёнах вывучае А. Ерашэвіч[93].

Для сучаснай беларускай гістарыяграфіі вайны 1812 г. характэрны колькасны рост даследаванняў, пашырэнне кола аўтараў, разнастайнасці праблематыкі і канцэптуальных падыходаў да вывучэння праблемы. Так, І. Груца даследаваў лёс маскоўскіх трафеяў Напалеона[94]. Л. Лісава праводзіць археаграфічную распрацоўку дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, на аснове якіх узняла праблему матэрыяльных страт[95]. А. Лука-

шэвіч вывучае месца і значэнне зямель Беларусі ў даваенным расійскім ваенна-стратэгічным планаванні[96]. У вучэбна-метадычным комплексе для студэнтаў гістарычных факультэтаў – першай спробе комплекснага выкладання тэмы «Беларусь напярэдадні і ў час вайны 1812 г.» – аўтар узняў і новыя аспекты вайны 1812 г.: праблему абвяшчэння вайны і ваеннага становішча ў памежных губернях, арганізацыю расійскай эвакуацыі, аднаўлення расійскай адміністрацыі восенню 1812 г. і інш.[97].

У цэлым, у кантэксце супрацьборства Францыі і Расіі ваенна-палітычная і эканамічная сітуацыя на землях Беларусі не лічылася настолькі складанай і спецыфічнай, каб заслужыць спецыяльнага разгляду. У шматлікіх працах вывучаўся пераважна фактычны ход ваенных аперацый і баёў, а разгляд пэўных падзей, з'яў, працэсаў не насіў праблемнага характару. Нягледзячы на тое, што падзеям вайны 1812 г. прысвечана значная гістарыяграфія, праблема ўсталявання і дзейнасці напалеонаўскай адміністрацыі на землях Беларусі пакуль што дасканала не распрацавана. Ёсць патрэба перагляду шматлікіх састарэлых ацэнак і поглядаў на падзеі, якія замацаваліся ў гістарыяграфіі. Застаюцца маладаследаванымі пытанні вынікаў і наступстваў вайны 1812 г.; адносіны да падзей вайны 1812 г. розных слаёў насельніцтва; сутнасць, напрамкі, асноўныя рысы, рэгіянальныя асаблівасці, характар і вынікі палітыкі расійскага царызму на землях Беларусі ў час вайны 1812 г.

---

[1] Писарев М. Н. Военные письма и замечания, наиболее относящиеся к незабвенному 1812 году. М., 1817; Липранди И. П. Опыт каталога всем отдельным сочинениям об Отечественной войне 1812 года. СПб., 1876; Дубровин Н. Ф. Отечественная война в письмах современников (1812–1815). СПб., 1882. С. 577–677.

[2] Известия о военных действиях российской армии против французов. СПб., 1813; Поход Наполеона в Россию и бегство его из оной. М., 1813; [Ахшарумов Д. И.]. Историческое описание войны 1812 года. СПб., 1813; [Чуйкевич П. А.]. Покушение Наполеона на Индию 1812 года или разговор двух офицеров российского и французского на аванпостах армий с замечаниями и некоторыми приказами, отданными в французской армии изданы П. Ч. СПб., 1813; Чуйкевич П. А. Рассуждения о войне 1812 г. СПб., 1813; Деминский Я. Поход Наполеона в Россию или описание происшествий, бывших в России в 1812 году. СПб., 1813; Анекдоты достопамятной войны россиян с французами… СПб., 1814. Ч. 1; [Булгаков А. Я.] Русские и Наполеон Бонапарте… 2 изд. М., 1814; Примечательные происшествия, случившиеся в настоящую войну с французами. СПб., 1814; Тихонов Я. Т. Поражение французов на Севере, или военная история знаменитых подвигов российских полководцев и воинов против францу-

зов в 1812 году. М., 1814; Военные подвиги и анекдоты графа П. Х. Витгенштейна, выбранные из достоверных источников и иностранных журналов. М., 1814; Писарев М. Н. Военные письма и замечания, наиболее относящиеся к незабвенному 1812 году: В 2 т. М., 1817; Ушаков С. И. Победы графа П. Х. Витгенштейна. СПб., 1813–1815; [Ушаков С. И.]. Деяния российских полководцев и генералов, ознаменовавших себя в достопамятную войну с Францией в 1812–1815 гг. СПб., 1822. Ч. 1–4.

[3] Похвиснев И. Журнал или записки войны, открытой французами в России 1812 года июня 12 дня. М., 1830.

[4] Ахшарумов Д. И. Описание войны 1812 года. СПб., 1819; Бутурлин Д. П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 году. СПб., 1823–1824. Ч. 1–2; Бутурлин Д. П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 году: с официальных документов и других достоверных бумаг российского и французского генерал-штабов сочиненная его императорского величества флигель-адъютантом, полковником Д. Бутурлиным: В 2 ч. 2 изд. СПб., 1837–1838; Окунев Н. А. Рассуждение о больших военных действиях, битвах и сражениях, происходивших при вторжении в Россию в 1812 году. СПб., 1833; Михайловский-Данилевский А. И. Описание Отечественной войны в 1812 году по высочайшему повелению сочиненное генерал-лейтенантом Михайловским-Данилевским. СПб., 1839; Богданович М. И. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам: В 3 т. СПб., 1859–1860.

[5] Ахшарумов Д. И. Описание войны 1812 года. СПб., 1819; Старынкевіч М. А., дырэктар канцылярыі галоўнакамандуючага 2-й Заходняй арміі П. І. Багратіёна, складваў апісанне дзеянняў 2-й Заходняй арміі, але яго рукапіс «Гісторыя вайны 1812 г.» не быў надрукаваны, а яго матэрыялы выкарыстоўваў пазней М. Інастранцаў.

[6] Бутурлин Д. П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 году. СПб., 1823–1824. Ч. 1–2; Бутурлин Д. П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 году: с официальных документов и других достоверных бумаг российского и французского генерал-штабов сочиненная его императорского величества флигель-адъютантом, полковником Д. Бутурлиным: В 2 ч. СПб., 1837–1838.

[7] Упершыню апублікавана ў Парыжы на французскай мове ў 1829 г. Окунев Н. А. Рассуждение о больших военных действиях, битвах и сражениях, происходивших при вторжении в Россию в 1812 году. СПб., 1833.

[8] Переправа через реку Березину в 1812 г. // Военный журнал. 1830. Кн. 4. С. 1–50.

[9] Михайловский-Данилевский А. И. Описание Отечественной войны в 1812 году по высочайшему повелению сочиненное генерал-лейтенантом Михайловским-Данилевским. СПб., 1839.

[10] Богданович М. И. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам: В 3 т. СПб., 1859–1860.

[11] Бескровный Л. Г. Очерки военной историографии России. М., 1962. С. 192.

[12] Попов А. Н. Эпизоды из истории 1812 года // Русский архив. 1892. № 2. С. 145–185; № 3. С. 341–378; № 4. С. 417–446; Попов А. Н. Отечественная война 1812 года: от Малоярославца до Березины. СПб., 1877.

[13] Харкевич В. И. Война 1812 года. От Немана до Смоленска. Вильно, 1901; Харкевич В. И. Березина. 1812 г. СПб., 1893; [Харкевич В. И.]. Действия князя Багратиона в 1812 году (из бумаг покойного В. Харкевича) // Военно-исторический сборник. 1913. № 1–4; Харкевич В. И. Действия Платова в арьергарде Багратиона в 1812 году. Кавалерийские бои при Мире и Романове. СПб., 1901.

[14] Харкевич В. И. Березина. 1812 г. СПб., 1893. С. 208.

[15] Терехов, Туношенский. Памятка о боевых столкновениях, происшедших на территории Варшавского военного округа в 1812 году. Варшава, 1912.

[16] Бурковский В. Подготовка к войне 1812 года и действия до переправы Наполеона через Неман включительно. М., 1912.

[17] Мирный В. А. Отступление армий в 1812 году до Дриссы и Несвижа. Кавалерийские бои под Миром. М., 1912.

[18] Иностранцев М. А. Отечественная война 1812 года. Операции 2 Западной армии князя Багратиона от начала войны до Смоленска. СПб., 1914.

[19] Покровский М. Н. Дипломатия и войны царской России в XIX столетии: Сб. ст. М., 1923. С. 60–61.

[20] Тарле Е. В. Нашествие Наполеона на Россию. 1812 год. М., 1992.

[21] Шеин И. А. Сталин и Отечественная война 1812 года: опыт изучения советской историографии 1930–1950-х гг. // Отечественная история. 2001. № 6. С. 97–108.

[22] Жилин П. А. Контрнаступление Кутузова в 1812 г. М., 1950; Жилин П. А. Контрнаступление русской армии в 1812 г. М., 1953; Бескровный Л. Г. Отечественная война 1812 г. и контрнаступление Кутузова. М., 1951; Гарнич Н. Ф. 1812 год. М., 1952.

[23] Жилин П. А. Гибель наполеоновской армии в России. М., 1968; 1974; Ён жа. Отечественная война 1812 г. М., 1988.

[24] Бескровный Л. Г. Отечественная война 1812 года. М., 1962.

[25] Вяликов В. И. Первая смоленская операция русских войск в 1812 г. М., 1947.

[26] Пугачёв В. В. Подготовка России к Отечественной войне 1812 г.: Дис. … канд. ист. наук. Саратов, 1947; Пугачёв В. В. К вопросу о первоначальном плане войны 1812 г. // 1812 год. М., 1962. С. 31–46; Пугачев В. В. Подготовка России к войне с Наполеоном в 1810–1811 гг. // Горьковский государственный университет: Учёные записки, серия историко-филологическая. 1964. Вып. 72. Т. 1. С. 93–123; Пугачёв В. В. О форме выработки русского стратегического плана Отечественной войны 1812 г. // Учёные записки Горьковского государственного университета: Серия историко-филологическая. 1966. Вып. 78. Т. 2. С. 625–646; Пугачёв В. В. Толстой об отступлении русской армии в 1812 году и историческая действи-

тельность // Учёные записки Горьковского государственного университета. 1963. Т. 60. Вып. 5. С. 196–225.

[27] Безотосный В. М. Французская и русская разведки и планы сторон в 1812 году: Автореф. дис. … канд. ист. наук. М., 1987; Безотосный В. М. Разведка Наполеона в России перед 1812 г. // Вопросы истории. 1982. № 10. С. 86–94; Безотосный В. М. Разведка и планы сторон в 1812 году. М., 2005.

[28] Ливчак Б. Ф. Народное ополчение в вооружённых силах России 1806–1856 гг. // Учёные труды Свердловского юридического института. Т. 4. Серия «История государства и права». Свердловск, 1961.

[29] Бабкин В. И. Народное ополчение в Отечественной войне 1812 г. М., 1962.

[30] Абалихин Б. С. Борьба с наполеоновской армией на Юго-Западе России в период Отечественной войны 1812 года: Автореф. дис. … д-ра ист. наук. Саратов, 1979; Абалихин Б. С. Отечественная война 1812 года на юго-западе России: Учебное пособие по спецкурсу. Волгоград, 1987; Абалихин Б. С. Контрнаступление русских войск в 1812 г.: планы и их реализация. Наступление 3-й Западной армии на Минск и Борисов // 1812 год: актуальные проблемы истории. Элиста, 2000. С. 113–170; Абалихин Б. С. Украинское ополчение в 1812 г. // Исторические записки. 1962. Т. 72. С. 87–118; Абаліхін Б. Український народ у Вітчизняній війні 1812 р. Київ, 1962; Абалихин Б. С. Роль Украины в обеспечении армии в Отечественной войне 1812 года // Вопросы военной истории России XVIII и первая половина XIX вв. М., 1969. С. 187–204.

[31] Тотфалушин В. П. М. Б. Барклай де Толли в Отечественной войне 1812 года. Саратов, 1991.

[32] Троицкий Н. А. 1812 год. Великий год России. М., 1988.

[33] Васильев И. Н. Кобринское сражение 15 июля 1812 г. // Сержант. 2001. № 3 (20). С. 13–16; Шэраг артыкулаў у тэматычным даведачным выданні: Отечественная война 1812 года. Энциклопедия. М., 2004.

[34] Соколов О. Армия Наполеона. СПб., 1999; Васильев И. Н. Несколько громких ударов по хвосту тигра: Операция на р. Березине осенью 1812 г., или Реабилитация адмирала Чичагова. М., 2001.

[35] Гаврилов С. В. Организация снабжения русской армии накануне и в ходе Отечественной войны 1812 г. и заграничных походов 1813–1815 гг.: Исторические аспекты.: Автореф. дис. … канд. ист. наук. СПб., 2003; Шведов С. В. Комплектование, численность и потери российской армии в Отечественной войне 1812 года: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Саратов, 2005.

[36] Нестерчук Л. М. Отечественная война 1812 года на Брестчине. Брест, 1990; Мазинг Г. Ю., Ерусалимчик Л. Ф. Березина, год 1812-й. Мн., 1991.

[37] Данилов. Гроза двенадцатого года // Армия. 1997. № 3. С. 44–46; № 4. С. 42–49; № 5. С. 52–57; № 6. С. 42–49; 1998. № 2. С. 42–51.

[38] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993–2003.

[39] Несцярчук Л. М. Баявыя дзеянні 3 Заходняй рускай арміі ў Айчынную вайну 1812 года на тэрыторыі Беларусі: Дыс. ... канд. гістар. навук. Мн., 1996; Лякин В. Мозырь в 1812 году: Историческая хроника. Мн., 2005.

[40] Богданович М. И. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам: В 3 т. СПб., 1859–1860; Михайловский-Данилевский А. И. Описание Отечественной войны в 1812 году: В 4 ч. СПб., 1839. Ч. 1. С. 453–462.

[41] Богданович М. И. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам. СПб., 1860. Т. 2. С. 94–110.

[42] Дубровин Н. Ф. Наполеон I и поляки в 1812 году. Исторический эскиз. Вильно в 1812 году // Отечественные записки. 1866. Кн. 1. № 2. С. 405–448; Дубровин Н. Ф. Русская жизнь в начале XIX века // Русская старина. 1902. Т. 112. № 12. С. 417–450; 1903. Т. 113. № 1. С. 37–65.

[43] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. СПб., 1855; Кукольник П. В. Исторические записки о Северо-западном крае с 1794 года // Вестник Западной России. 1864. Т. 2. Декабрь. С. 65–139; Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim... Wilno, 1847; Jankowski Cz. Powiat Oszmiański: Materiały do dziejów ziemi i ludzi: W 2 cz. Petersburg, 1896–1897. 1896. Cz. 1; 1897. Cz. 2.

[44] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с привосокуплением и других сведений к ней же относящихся. С. 30–37, 100–104, 178–181.

[45] Сементовский А. М. Витебск и уездные города Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии на 1864 г. Витебск, 1984. С. 99–108, 155–163; Витебская губерния: Историко-географический и статистический обзор. Вып. 1. История, природа, население, просвещение. Витебск, 1890. С. 59–67; Фурсов М. В. Исторический очерк Могилёвской губернии. Могилёв, 1882. С. 130–153; Орловский Е. Ф. Гродненская старина. Ч. 1. г. Гродно. Гродно, 1910. С. 226–234.

[46] Довгялло Д. И. Лепель, уездный город Витебской губернии. Витебск, 1905. С. 38–40; Аникиевич. Сенненский уезд Могилёвской губернии. Могилёв, 1907. С. 70–76.

[47] Коркозевич М. Воспоминания о нашествии французов на Россию в 1812 году (рассказ современника-очевидца) // Минские губернские ведомости. 1869. № 45–46; Тое ж. // Вестник Западной России. 1869. Т. 4. Кн. 12. № 1. Отд. 2. С. 111–121; Соколов С. Вступление в Могилёв и пребывание в нем французской армии в 1812 г. // Могилёвские губернские ведомости. 1859. № 27, 30, 31, 36; Французы в Чечерске // Могилёвские губернские ведомости. 1863. № 11; К эпохе 1812 г.: из семейных преданий могилёвцев // Могилёвская старина: сборник статей «Могилёвских губернских ведомостей» / Под ред. Е. Р. Романова. Вып. 1. 1898 и 1899. Могилёв, 1900; Романов Е. Французы в 1812 г. в Кутеинском Богоявленском монастыре // Могилёвская старина. 1901. Вып. 2. С. 32–34; Слупский Ф. Занятие Витебска французами // Витебские губернские ведомости. 1864. № 34, 39, 49, 50; Цехановецкий В. П. Краткое описание военных действий в Витебской губернии во время Отечественной войны 1812 года. Витебск, 1892.

[48] Глыбовский В. И. 1812 год в Витебской губернии. Витебск, 1910; Добровольский В. К. Витебская губерния в Отечественную войну. Витебск, 1912.

[49] Бриллиантов Л. И. Година тяжкого испытания и великой неувядаемой славы русского народа. Город Могилёв во власти французов. Могилёв, 1912; Главнейшие события из Отечественной войны, происходившие в пределах Могилёвской губернии // Памятная книжка Могилёвской губернии на 1912 год. Могилёв, 1912. Отд. 3. С. 77–86; Лучин А. П. 1812 год. Наполеон в пределах Могилёвской губернии. Исторический очерк. Могилёв, 1912.

[50] Орловский Е. Ф. Гродненская губерния в 1812 году: исторический очерк. Гродно, 1912.

[51] Бориславский. События в Вильне в 1812 году. СПб., 1903; Бернацкий Н. Н. События в Вильне во время Отечественной войны. Вильна, 1912; Кудринский Ф. А. Вильна в 1812 году. Вильна, 1912.

[52] Чистяков С. Д. Борисовцы в Могилёве на Днепре 1811–1812. Эпизод Отечественной войны. СПб., 1897.

[53] Краснянский В. Г. Минский департамент Великого княжества Литовского (эпизод из истории войны 1812 года). СПб., 1902; Краснянский В. Г. Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 года. Гродно, 1913.

[54] Краснянский В. Г. Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 года. Гродно, 1913.

[55] Краснянский В. Г. Минский департамент Великого княжества Литовского (эпизод из истории войны 1812 года). СПб., 1902.

[56] Отечественная война и русское общество. 1812–1912. СПб., 1912. Т. 3–5.

[57] Гинзбург С. М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. СПб., 1912.

[58] Могилёвская епархия: историко-статистическое описание. Могилёв, 1910. Т. 1. Вып. 2. Ч. 2; Рункевич С. Г. История Минской архиепископии 1793–1832 гг. СПб., 1892; Свидерский Л. Ф. И. Красовский, полоцкий униатский архиепископ. Витебск, 1911; Гаврилов А. В. Дело о поступках могилёвского архиепископа Варлаама во время нашествия французов в 1812 г. // Сборник Археологического института. 1879. Кн. 2. С. 93–111; Гаврилов А. В. Дополнительные сведения по делу могилёвского архиепископа Варлаама во время нашествия французов в 1812 г. // Сборник Археологического института. 1880. Кн. 3. Отд. 3. С. 3–10; Хойнацкий А. Ф. Варлаам Шишацкий, бывший архиепископ могилёвский // Исторический вестник. 1881. Т. 5. Июль. С. 522–543; Соколов О. Варлаам Шишацкий, бывший архиепископ могилёвский и витебский: Исторический очерк. Вильна, 1883; Браиловский С. Н. Могилёвская церковная смута // Исторический вестник. 1893. № 10. С. 231–245.

[59] Матюшенский А. Униатское и православное духовенство Полоцкой епархии в войну 1812 года. Читано 5 декабря 1912 г. в зале Алексеевской женской гимназии в день торжественного собрания Витебской

археологической комиссии по случаю открытия памятника павшим воинам под Витебском в Отечественную войну 1812 года в г. Витебске. Витебск, 1913.

[60] Тарле Е. В. Нашествие Наполеона на Россию. 1812 год. М., 1992. С. 3, 73.

[61] Предтеченский А. Отечественная война 1812 года // Исторический журнал. 1941. № 7/8. С. 88.

[62] Окунь С. Б. История СССР: Лекции в 2 ч. Л., 1974–1978. 1978. Ч. 2: 1812–1825 гг. С. 19.

[63] Канстанцінаў Ф. Роля беларускага народа ў разгроме Напалеона // Бальшавік Беларусі. 1945. № 4. С. 59–61.

[64] Абалихин Б. С. Особенности классовой борьбы в России в 1812 году // Из истории классовой борьбы в дореволюционной и советской России. Волгоград, 1967. С. 106–147; Бабкин В. И. Новые материалы о классовой борьбе крестьян в 1812 году // Вопросы военной истории России XVIII и первая половина XIX веков. М., 1969. С. 343–351; Бабкин В. И. Специфика классовой борьбы в период Отечественной войны 1812 г. // История СССР. 1972. № 2. С. 111–121; Тартаковский А. Г. Из истории одной забытой полемики: Об антикрепостнических диверсиях Наполеона в 1812 году // История СССР. 1968. № 2. С. 25–43; Игнатович И. И. Крестьянское движение в России в первой четверти XIX века. М., 1963. С. 76–100; Чепко В. В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века. Минск, 1972. С. 111–119.

[65] Бяркоўскі В. Гродна ў 1812 годзе // Беларусь. 1946. № 4. С. 56–58; Кудий С. А. Гродно в 1812 году // Вопросы истории: Межведомственный сборник / Минский государственный педагогический институт. 1984. Вып. 11. С. 134–142.

[66] Корнейчик Е. И. Белоруссия в Отечественной войне 1812 г. Дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1941; Карнейчык Я. І. Становішча беларускага народа напярэдадні Айчыннай вайны 1812 года // Весці АН БССР. Аддзяленне грамадскіх навук, серыя гісторыя. 1947. № 1. С. 26–42; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года. Минск, 1962; Корнейчик Е. И. Белоруссия в Отечественной войне 1812 года // История Белорусской ССР. Мн., 1954. Т. 1. С. 218–227; Карнейчык Я. Акупацыйны рэжым. Партызански рух // Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1972–1975. Т. 1. С. 459–465.

[67] Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года. Мн., 1962. С. 2.

[68] Антонаў В. В. Айчынная вайна 1812 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 73–78; Антонаў В. В. Генеральная канфедэрацыя 1812 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 509–510.

[69] Кудряшов И. Призрак Великой Литвы // Родина. 1992. № 6–7. С. 32–35; Кудряшов И. Ю. Вооружённые силы Литовского княжества 1812 г. М., 1991.

[70] Калинин С. Е., Кожановский В. Ю., Шпагин С. В. Вооруженные силы Великого княжества Варшавского и Великого княжества Литовского. 1806–1814 гг. Ч. I. Генералитет, штаб, пехота, артиллерия. М., 1998.

[71] Бессонов В. …Не считая шаромыжников: численность военнопленных 1812 года в России // Родина. 2002. № 8. С. 55–59.

[72] Попов А. И. Великая армия в России. Погоня за миражом. Самара, 2002.

[73] Шеин И. А. Рецензия на монографию А. И. Попова «Великая армия в России. Погоня за миражом» // Вопросы истории. 2003. № 7. С. 162–163.

[74] Попов А. Белорусский эксперимент Бонапартия: что побудило французов сохранить зависимость крепостных от помещиков // Родина. 2002. № 8. С. 36–39.

[75] Понасенков Е. Правда о войне 1812 года. М., 2004.

[76] Несцярчук Л. У агні 1812 года, альбо на якім баку змагаліся беларусы? // Настаўн. газ. 1993. 23 чэрв.; Літвінскі А. У плыні сцюдзёнай Беразіны згібела надзея адраджэння Вялікага княства Літоўскага // Беларус. мінуўшчына. 1993. № 5–6. С. 43–45; Тарасаў К. Беларусы ў напалеонаўскай гвардыі // Звязда. 1992. 24 верасня; Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. Мн., 1994. С. 231–244; Цуба М. Якой была вайна 1812 г. для беларусаў // Літ. і мастацтва. 1991. 7 чэрв.; Філатава А. Паміж Парыжам і Масквой: 1812 год і Беларусь // Культура. 1992. 9 лістап.; Філатава А. Далёкая вайна // Чырвон. змена. 1994. 5 лістап. С. 23; Жучко М. Страчаныя ілюзіі // Рэсп. 1997. 10 студз. і інш.

[77] Галубовіч В. Напалеон на Беларусі // За передовую науку. 1990. 22 июня. № 24. С. 5; 29 июня. № 25. С. 6; Таляронак С. В., Блінец А. Апошняя армія ВКЛ (1812–1814) // Беларус. гіст. часоп. 1996. № 2. С. 22–34. Блінец А. Беларускія татары ў гвардыі Напалеона // Спадчына. 1997. № 6. С. 123–128.

[78] Ліс Я. Палітыка Напалеона на Беларусі // Спадчына. 1996. № 5. С. 117–122.

[79] Піліпчык В. 1812 год: Грамадзянская вайна // Літ. і мастацтва. 1993. 12 сакав. С. 14–15.

[80] Несцярчук Л. М. Баявыя дзеянні 3 Заходняй рускай арміі ў Айчынную вайну 1812 года на тэрыторыі Беларусі: Дыс. ... канд. гіст. навук: 070002. Мн., 1996. С. 12.

[81] Толеренок С. В. Создание французскими оккупационными властями государственных структур ВКЛ (1812 год). Мн., 1998.

[82] Таляронак С. В. Да пытання аб пазіцыі беларускага дваранства і сялянства ў час французска-рускай вайны 1812 года // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў: Тэзісы дакладаў і паведамленняў, Мінск, 3–5 лютага 1993 года. Мн., 1993. Ч. 1. С. 111–112; Таляронак С. Рабавалі і французы, і рускія // Навіны Беларускай акадэміі. 1992. 18 верас. С. 5; Таляронак С. Напалеон і герцагства Варшаўскае // Чырвон. змена. 1997. 8–9 красав.

[83] Толеренок С. В. Создание французскими оккупационными властями государственных структур ВКЛ (1812 год). С. 17–18.

[84] Швед В. В. Аб распрацаванасці тэмы «Вайна 1812 года і Беларусь» // Французская рэвалюцыя і лёсы свету. Мн., 1999. С. 211– 212.

[85] Швед В. В. Беларусь часоў напалеонаўскіх войн (1805–1815 г.): стан і перспектывы даследаванняў // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 9–17.

[86] Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гродна, 2001. С. 278–288; Швед В. В. Вялікае княства Літоўскае 1812 года // Беларус. гіст. часоп. 2000. № 3. С. 9–15; Швед В. В. Дыстрыкт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1996. Т. 3. С. 372; Швед В. В. Дэпартамент // Там жа. С. 342; Швед В. В. Муніцыпалітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1999. Т. 5. С. 237; Швед В. В. Літоўскія войскі 1812 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1997. Т. 4. С. 386; Швед В. В. Фарміраванне і дзейнасць арміі ВКЛ (1812–1815 гг.) // Веснік Брэсцкага універсітэта: мовазнаўства, літаратуразнаўства, права, гісторыя, педагогіка. 2000. № 1. С. 49–56.

[87] Потапёнок Г. 1812 год на Гродненщине // Гродн. правда. 1992. 13 окт.; Каляга А. Докшыцы ў вайне 1812 г. // II Усебеларускі фестываль «Студэнцкая вясна»: Матэрыялы навуковай гуманітарнай студэнцкай канферэнцыі 6–7 мая 1993 г. Віцебск, 1993. С. 77–80; Супрун В. За смугою часу: даследаванні і меркаванні. Мн., 1994. С. 79–84; Лютынский В. П. Орша в войне 1812 года: ист. очерк. Орша, 1995; Gaiba N. Novogrodok, en Biélorussie, pendant la guerre de 1812 // Études Napoléoniennes: Revue historique de la société de sauvegarde du château impérial de Pont-de-Briques, quartier-général de Napoléon I^{er} au camp de Boulogne. Levallois-Perret, 1998. V. 4. P. 471–476; Abramova I. Napoléon et la Grande Armée à Vitebsk en 1812 // Études Napoléoniennes. P. 477–507; Абрамава І. Н. Вайна 1812 года ў Віцебску // Памяць: Віцебск. Мн., 2002. Кн. 1. С. 131–135; Агееў А. Магілёўшчына падчас вайны 1812 года // Магілёўская даўніна. 1995. № 3. С. 51–61; Агееў А. Р., Марзалюк А. І., Пушкін І. А. Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах. Магілёў, 1999. С. 78–96; Агееў А. Р. Напалеонаўскія войны і лёс яўрэяў усходняй Беларусі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Мн., 2001. С. 117–121; Швед В. В. Отечественная война 1812 года // Наш край: Гродненщина в конце XVIII – первой половине XIX вв. Гродно, 1990. С. 13–17; Швед В. В. В «грозу 1812 года» // По следам Гродненской старины. Гродно, 1993. С. 16–24; Швед В. В. Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. Гродна, 1995; Швед В. В. У «навальніцу 1812 года» // Губернскі Гродна: Аповяды з гісторыі горада (канец 18 – пачатак 20 ст.). Баранавічы, 2003. С. 41–49; Шыдлоўскі К. Вайна 1812 г. на Браслаўшчыне // Памяць: Браслаўскі раён. Мн., 1998. С. 159–166 і інш.

[88] Иоффе Э. Г. Отечественная война 1812 года и белорусские евреи // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 57–68.

[89] Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 2000.

[90] Сосна У. А. Лёс беларускай вёскі ў вайне 1812 г. // Французская рэвалюцыя і лёсы свету. Мн., 1999. С. 205–208.

[91] Радзюк А. Канфіскацыя як сродак барацьбы з сепаратысцкімі настроямі на землях Беларусі ў часы Аляксандра I // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 68–79.

[92] Литвиновская Ю. И. Беларусь в войне 1812 года: Социально-экономический аспект: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2004; Литвиновская Ю. И. Мародерство наполеоновских солдат на территории Беларуси // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 3. Гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права. 2003. № 1. С. 19–24; Литвиновская Ю. Деятельность органов местной власти в Беларуси, созданных Наполеоном // Гісторыя: праблемы выкладання. 2005. № 2. С. 40–46; Литвиновская Ю. И. Дворянство Беларуси в период войны 1812 г. // Гуманитарно-экономический вестник. 2002. № 2. С. 45–54; Литвиновская Ю. Духовенство Беларуси в период войны 1812 г. // Гісторыя: праблемы выкладання. 2004. № 4. С. 54–61; Литвиновская Ю. И. Ущерб нанесённый Беларуси войной 1812 года // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 85–97.

[93] Ерашэвіч А. У. Камісія Часовага ўрада ВКЛ 1812 г.: Асаблівасці фарміравання, структура, функцыі, умовы дзейнасці // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 44–57; Ерашэвіч А. У. Камісія Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага 1812 г.: Асноўныя напрамкі дзейнасці // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: Стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспублік. навук. канферэнцыі: У 4 ч. Гродна, 2003. Ч. 2. С. 73–79; Ерашэвіч А. Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 2003. Т. 6. Кн. 2. С. 156; Ерашэвіч А. Магілёў у час вайны 1812 г. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва. Магілёў, 2001. С. 124; Ерашэвіч А. У. Старонкі гісторыі Берасцейскага павета ў перыяд напалеонаўскіх войн (1805–1815) // Берасцейскі храногаф. Брэст, 2002. Вып. 3. С. 192–201.

[94] Груцо И. А. Судьба московских трофеев Наполеона в Отечественной войне 1812 года. Мн., 2004.

[95] Лісава Л. М. Становішча цэркваў пасля вайны 1812 г. // Памяць: Мінск. Мн., 2001. Кн. 1. С. 409–410; Лисова Л. Лыко для Наполеона // Совет. Белоруссия. 2002. 26 окт.; Лисова Л. М. Обзор первоисточников по войне 1812 г. на территории Беларуси, хранящихся в НИАБ // Беларускі археаграфічны штогоднік. Мн., 2003. Вып. 4. С. 103–112.

[96] Лукашэвіч А. Арганізацыя і дзейнасць расійскай службы контрразведкі ў Беластоцкай вобласці напярэдадні вайны 1812 г. // Białoruskie zeszyty historyczne. Białystok. 2003. T. 20. S. 49–68; Лукашевич А. Укреплённый лагерь в стратегических планах Карла Фуля: от абстрактной идеи до реализации в Дриссе (1811–1812) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2004. № 1. С. 43–48; Лукашевич А. М. Водные пути Беларуси в военно-стратегических планах России. Себежская коммуникация (1811–1812 гг.) // Весн. Віцебскага дзярж. ун-та. 2004. № 1. С. 18–23; Лукашевич А. Беларусь в документах военно-стратегического планирования Российской империи (1810–1812 гг.) // Французска-руская вайна 1812 года: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. Мн., 2003. С. 17–36; Лукашэвіч А. Планаванне і падрыхтоўка расійска-прускай наступальнай аперацыі супраць Княства Варшаўскага восенню 1811 г. // Biuletyn historii pogranicza.

Białystok. 2003. № 4. S. 5–20; Лукашевич А. М. Проекты восстановления Речи Посполитой и Великого княжества Литовского и их место в военно-стратегическом планировании Российской империи (1810–1812 гг.) // Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе. Мн., 2002. С. 46–59; Лукашевич А. М. Российские планы крепостного прикрытия западных границ империи (1772–1812 гг.) // Сб. научных трудов Центра пограничных исследований Объединённого научного центра Пограничного комитета Союзного государства. Мн., 2003. С. 6–35 і інш.

[97] Лукашэвіч А. М. Беларусь напярэдадні і ў час вайны 1812 г. Мн., 2004.

3.2. Палітыка царскага ўрада ў час паўстання 1830–1831 гг. Эміграцыя з беларускіх зямель

У першай палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі адбылася не толькі вайна 1812 г., але і паўстанне 1830–1831 гг., якое яшчэ называлася руска-польскай вайной. Цікавасць да гэтай падзеі з боку гісторыкаў пачалася амаль што адразу. Нягледзячы на вельмі вялікую гістарыяграфію, даследчыкі ў асноўным разглядалі ў храналагічнай паслядоўнасці ваенныя дзеянні, падрабязна апісвалі асобныя баі або асоб, якія ў іх удзельнічалі. Такія даследаванні характэрны не толькі для расійскай, але і для польскай, літоўскай гістарыяграфій розных часоў. У савецкі час, за невялікім выключэннем, гэтая праблема практычна не распрацоўвалася.

Гістарыяграфію, прысвечаную паўстанню 1830–1831 гг. можна падзяліць на агульныя працы[1], даследаванні падзей на асобных тэрыторыях[2], працы, прысвечаныя палітыцы Мікалая I і дзейнасці чыноўнікаў у час паўстання[3] і інш. Паўстанне ўвайшло ў польскую гістарыяграфію пад назвай лістападаўскае, а ў дарэвалюцыйную, савецкую і сучасную расійскую – польскае. Падзеі ж, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, у асноўным разглядаліся ва ўзаемасувязі з паўстаннем у Царстве (Каралеўстве) Польскім, ці ў Літве.

Некаторыя з дарэвалюцыйных даследчыкаў (напрыклад, Ф. Сміт) лічылі, што палякі не былі прыгнечаныя ў Расійскай імперыі, але яны «забыліся, што дзяржава не можа быць адноўлена пры дапамозе тых самых сродкаў, якімі яна была ліквідавана». На яго думку, паўстанне 1830–1831 гг. практычна паўтарыла паўстанне 1794 г.: змовы, масавыя забойствы з-за помсты, сваркі, крыкі аб здрадзе, патрабаванні крыві і інш.[4]. Паўстанне звязвалі і з неканстытуцыйнай палітыкай царскага ўрада ў заходніх губернях Расіі і Царстве Польскім (М. Любаўскі, А. Пагодзін)[5]. Польскі

гісторык Ш. Аскеназі сцвярджаў, што асноўнай прычынай гэтага паўстання стала скасаванне Рэчы Паспалітай як дзяржавы. Разам з тым ён адзначаў, што падзеі 1830–1831 гг. «з'яўляюцца перш за ўсё вайной Польшчы з Расіяй за Літву»[6].

Сярод мясцовых даследаванняў, непасрэдна звязаных з тэрыторыяй Беларусі, вылучаюцца працы С. Дангеля і Б. Брэжга. С. Дангель асобна вылучыў падзеі, якія мелі месца на Міншчыне. Аўтар прааналізаваў дзейнасць следчых органаў Мінскай губерні і склаў (на базе спраў следчых камісій) разгорнуты спіс удзельнікаў паўстання вызначанага рэгіёна[7]. Б. Брэжга разглядаў меры, якія прымаліся Віцебскім, Смаленскім і Магілёўскім генерал-губернатарам князем М. Хаванскім пасля атрымання ім звестак аб пачатку паўстання ў Варшаве, на тэрыторыі Віцебшчыны і Інфлянтаў. На думку аўтара, гэта былі практычна рэпрэсіўныя меры, паколькі генерал-губернатар забараніў з'езды шляхты, выслаў пераехаўшую ў горад шляхту ў свае маёнткі, пачаў рабіць замену мясцовых чыноўнікаў на рускіх; звярнуў увагу на дзейнасць каталіцкага і уніяцкага духавенства, якое мела вялікі ўплыў на мясцовае насельніцтва. Акрамя таго, расійскія ўлады пачалі сачыць за кожным падазроным чалавекам. Паветы Віцебскай губерні ўваходзілі ў склад імперыі ў розны час, і таму адносіны да паўстання ў іх, як адзначыў аўтар, складваліся па рознаму. У Інфлянтах, якія былі далучаны пазней (1793 г.), знаходзіўся ваенны губернатар генерал-маёр Данілаў і быў узмоцнены гарнізон дынабургскай крэпасці. У Віцебскай губерні была павялічана колькасць войск, якія прыбылі з Мінскай і Магілёўскай губерняў, і былі раскватэраваны ў гарадах. Адзначыў аўтар і напрамкі рэпрэсій супраць удзельнікаў паўстання: маёнткі ўдзельнікаў былі ўзяты ў секвестр, усе асобы, што, на погляд улад мелі адносіны да паўстання, а таксама манахі манастыра місіянераў у Крэслаўцы, знаходзіліся пад наглядам паліцыі[8].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўвага да вывучэння падзей 1830–1831 гг. праявілася з 90-х гг. XX ст. Гісторыкі пачалі больш дэталёва даследаваць пытанні краязнаўчага плана і дзейнасць канкрэтных постацей беларускай гісторыі, вызначаць ступень удзелу ў паўстанні асобных сацыяльных груп насельніцтва Беларусі[9].

Паўстанню прысвечана спецыяльнае даследаванне В. Гарбачовай[10] і глава ў манаграфіі В. Шведа[11]. В. Гарбачова ўпершыню ў храналагічнай паслядоўнасці разгледзела меры, якія прымаліся царскім урадам у час паўстання. З 1 снежня 1830 г. было аб'яўлена і ўведзена ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях і Бе-

ластоцкай вобласці ваеннае становішча. Гэтая тэрыторыя была падначалена галоўнакамандуючаму расійскіх войскаў графу І. Дзібічу-Забалканскаму. Паміж Царствам Польскім і беларуска-літоўскімі губернямі была абмежавана сувязь, уведзена цэнзура перапіскі, узмацніўся паліцэйскі нагляд, а неблаганадзейных высылалі ўглыб Расіі. Секвестру падвяргаліся маёнткі тых памешчыкаў, якія ў пачатку паўстання ад'ехалі ў Польшчу. У некалькі разоў былі павялічаны абавязковыя пастаўкі харчавання і фуражу для арміі. Аўтар адзначыла, што рэпрэсіўныя меры царскага ўрада супраць удзельнікаў паўстання былі распачаты задоўга да яго канчатковага падаўлення. Так, у адпаведнасці з указам Мікалая І ад 22 сакавіка 1831 г. Сенатам быў зацверджаны парадак «пра асуджэнне і выкананне прыгавораў над мяцежнікамі», згодна з якім паўстанцаў падзялілі на асобныя групы. У дачыненні да кожнай групы прызначаліся адпаведныя пакаранні. Па гэтай пастанове дваранскае саслоўе, якое са зброяй удзельнічала ў паўстанні, належыла судзіць ваенным судом па палявому крымінальнаму ўлажэнню. Прыгаворы суда рэкамендавалася выконваць на месцы «з зацвярджэння Асобнага Атраднага Начальніка», а нерухомую маёмасць забіраць у казну. Ваеннаму суду падлягалі таксама тыя, хто на працягу паўстання меў дачыненне да забойстваў. Удзел дробнапамесснай і беззямельнай шляхты ў паўстанні канчаткова падарваў давер да яе царскага ўрада. Мікалай І адзначаў летам 1831 г.: «…шляхта ёсць той зброд людзей, які дашукваецца дваранства, не маючы на тое ні права, ні дакументаў, бадзяецца без заняткаў ці знаходзіцца на службе і складае клас самы шкодны і разбэшчаны»[12]. Прадстаўнікі «простанароддзя», якія прымусова былі ўцягнуты ў паўстанне і пасля абвяшчэння дадзенага ўказа вярталіся на месца жыхарства, атрымлівалі дараванне.

Пакаранні былі рознымі. Прадстаўнікі дваранскага саслоўя пазбаўляліся дваранства і адпраўляліся радавымі ў Каўказскі асобны корпус, ці на пасяленне ў Сібір. Сялян і прадстаўнікоў іншых падатковых саслоўяў за актыўны ўдзел у паўстанні каралі яшчэ больш жорстка. Акрамя ссылкі ў Каўказскі асобны корпус, Мікалаеўскі рэзервовы батальён, сібірскія лінейныя батальёны радавымі, іх адпраўлялі на бестэрміновую катаргу, у арыштанцкія роты. Шырока выкарыстоўваліся ў адносінах да сялян і цялесныя пакаранні.

У сучаснай расійскай і беларускай гістарыяграфіях існуюць істотныя разыходжанні. Расійскія даследчыкі адназначна лічаць гэтае паўстанне польскім. У той час як беларускія, ў большасці

сваёй, ацэньваюць яго як адзін з этапаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Закранулі ў некаторай ступені паўстанне 1830–1831 гг. такія сучасныя расійскія даследчыкі, як Л. Гарызонтаў і Б. Міронаў[13]. А. Каппелер, прааналізаваўшы польскі нацыянальны рух у Расійскай імперыі, прыйшоў да высноў, што паражэнне ў 1831 г. і рэпрэсіўныя меры расійскага ўрада паскорылі працэс трансфармацыі польскай шляхты. Працягвалася сацыяльная дэградацыя большасці дваран і павялічвалася значэнне інтэлігенцыі дваранскага паходжання. Звыш 19 тыс. палякаў эмігрыравалі за мяжу імперыі і працягвалі там барацьбу «за нашу і вашу свабоду»[14].

Менавіта палітыка царскага ўрада стала непасрэднай прычынай таго, што многія ўдзельнікі паўстання 1830–1831 гг., пасля яго паражэння, вымушаны былі пакінуць Расійскую імперыю. Так з'явілася «Вялікая эміграцыя». Гэтае паняцце было ўведзена для вызначэння беспрэцэдэнтнай з'явы – небывалага шматколькаснага выхаду [адсюль яшчэ адзін сінонім тэрміну «эміграцыя», прыняты ў польскай гістарыяграфіі – «выходства» («wychodźstwo»)] з радзімы па палітычных матывах. Да гэтага такой масавай і прадстаўнічай хвалі эміграцыі ў краіны Заходняй Еўропы і ўсяго свету не было. Тэрмін «Вялікая эміграцыя» вызначаецца ў польскай гістарыяграфіі, як «польская палітычная эміграцыя пасля лістападаўскага паўстання, названая так з пункту гледжання на выдатную ролю, якую яна адыграла ў палітычным і інтэлектуальным жыцці польскага народу, а таксама на яе колькасць»[15]. Краіну пакінулі сябры Нацыянальнага Ураду, паслы на паўстанцкі сейм, якія галасавалі за дэтранізацыю Мікалая I з польскага трону, многія кіраўнікі польскага войска, а таксама тысячы іншых удзельнікаў паўстання, якія не змаглі (ці не пажадалі) атрымаць царскую амністыю. Гэты тэрмін увайшоў не толькі ў польскую, але і ў беларускую гістарыяграфію[16].

Колькасць тых, хто пасля паражэння паўстання пакінуў радзіму да гэтага часу дакладна не названа. Яшчэ самімі эмігрантамі закраналася гэтае пытанне. У «Каляндарыку Польскіх Пілігрымаў за 1839 г.» называецца лічба ў 7 тыс. эмігрантаў у краінах усяго свету[17]. Адным з першых гісторыкаў, які ў 1901–1902 гг. выдаў фундаментальную працу па «Вялікай эміграцыі», быў Л. Гадон. Ён адзначаў, што «агульную колькасць эмігрантаў без перабольшвання магчыма ацаніць як мінімум у 9500–10000 асобаў»[18]. В. Лукашэвіч адзначыў, што эміграцыя налічвала ад 8 да 9 тыс. чал., з якіх каля 6 тыс. знаходзіліся ў Францыі[19]. У працы

С. Калембкі колькасць эмігрантаў у Францыі ў асобныя гады называецца ў 4200–5500 чал. (без указання агульнай колькасці эмігрантаў, якія там знаходзіліся ў 1830–1840-я гг.). А ў адносінах колькасці ўсёй эміграцыі за 1831–1847 гг. (разам з удзельнікамі рэвалюцыйных падзей у Польшчы ў 1846 г.) выказваецца меркаванне ў верагоднасці 11–12 тыс. чал.[20].

З самага пачатку існавання «Вялікай эміграцыі» у ёй склалася ліцвінскае асяроддзе. Гэта было вызначана своеасаблівасцю паўстання на землях былых Вялікага княства Літоўскага і усходняй часткі Рэчы Паспалітай – Украіны, а таксама стаўленнем да эмігрантаў з гэтых тэрыторый з боку паўстанцаў-выхадцаў з Каралеўства Польскага. У час паўстання яго ўдзельнікі з тэрыторый Беларусі, Літвы і Украіны не атрымалі такой падтрымкі ад польскага рэгулярнага войска, на якую яны спадзяваліся і якая была ім патрэбна. У эміграцыі ж у першыя гады выхадцы з Каралеўства Польскага лічылі сябе, як пісаў Л. Гадон, «найвышэйшым гатункам палякаў і з пагардлівай знявагай пазіралі на землякоў з-за Нёмана і Буга»[21].

Даследаванні дзейнасці ліцвінскага асяроддзя пачаліся яшчэ ў XIX ст. Перыяд з 1880 па 1910 гг. стаў тым часам, калі з'явілася значная колькасць прац, у якіх была закранута гэтая праблема. Усе яны былі прысвечаны адной арганізацыі – Таварыству Літоўскаму і Рускіх Зямель (у далейшым ТЛРЗ). Першым да гэтай тэмы звярнуўся А. Вярніцкі ў напісанай ім біяграфіі аднаго з сакратароў таварыства – Леанарда Ходзькі[22]. За А. Вярніцкім і іншыя гісторыкі гэтага часу пачалі звяртацца да тэмы ТЛРЗ: З. Васілеўскі, Л. Гадон, У. Клышэўскі і інш. У пачатку XXI ст. да даследавання ліцвінскага асяроддзя звярталіся А. Новак[23], В. Гарбачова[24].

Найбольш важная праблема, якая яшчэ цалкам не вырашана, гэта колькасць ураджэнцаў з Беларусі, Літвы, Украіны і Беласточчыны, якія пасля паражэння паўстання пакінулі краіну. На сённяшні дзень толькі адзінкавымі даследчыкамі рабілася спроба назваць гэтую лічбу. Першай гэта зрабіла А. Баршчэўская. У сваёй працы яна называе лічбу ў 1000–1200 чал., з якіх каля 700 чалавек паходзілі з Беларусі і Літвы і каля 150 – з Беласточчыны, якія знаходзіліся ў Францыі[25].

Праз тры гады была зроблена яшчэ адна спроба вызначыць колькасць эмігрантаў з заходніх губерняў Расійскай імперыі. М. Міціна на падставе аналізу звестак, сабраных віленскім ваенным, гродзенскім, мінскім, беластоцкім губернатарам М. Даўгарукавым і адасланых ім у Пецярбург, прыводзіць наступныя лічбы жыха-

роў Віленскай, Мінскай, Гродзенскай губерній і Беластоцкай вобласці, якія «эміграваліці схаваліся ад рэпрэсій». Паводле яе звестак, такіх жыхароў у Беластоцкай вобласці было 182, у Гродзенскай губерні – 258, у Мінскай губерні – 193, у Віленскай – 1416. Аднак і сама М. Міціна заўважыла хібы гэтых спісаў. Але ў іх ёсць некаторыя паўторы (напрыклад, князь Адам Чартарыскі паўтараецца двойчы). Таксама ў іх трапілі асобы, якія маглі хавацца ад арышту на тэрыторыі Расійскай імперыі. Такім чынам, лічба, пададзеная М. Міцінай, хаця і не з'яўляецца цалкам бездакорнай, але ступень яе абгрунтаванасці магчыма вызначыць як высокую[26].

Метадам, які дазволіць найбольш аргументавана назваць лічбу эмігрантаў, можа быць стварэнне іх паіменнага спісу з уключэннем у яго звестак пра месца нараджэння, удзел у паўстанні, месца эміграцыі, а таксама некаторых іншых біяграфічных звестак. Разнастайныя спісы эмігрантаў, створаныя ў 1830–1840-я гг., дазваляюць ацэньваць колькасць эмігрантаў прыкладна ў 1500–1700 чалавек[27].

Важным аспектам гісторыі ліцвінскага асяроддзя з'яўляецца пытанне супярэчнасцей паміж «ліцвінамі» і «караняжамі» (выхадцамі з Каралеўства Польскага). Першым звярнуўся да гэтай праблематыкі А. Вярніцкі. Ён бачыць прычыну гэтых супярэчнасцей у спрэчках з-за вайсковых чыноў. На яго погляд, яны выцякалі з таго, што афіцэры рэгулярнага польскага войска не лічылі роўнымі сабе тых удзельнікаў паўстання, якія на момант яго пачатку з'яўляліся грамадзянскімі асобамі. Адпаведна, «старыя жаўнеры» не прызнавалі чыноў «новых». А. Вярніцкаму ўдалося яскрава паказаць апазіцыю «патранташаў» (старых рэгулярных войскаў) і «апалчэнцаў» (пол. – «ruchawka»).[28] Аднак, ён закранаў толькі адзін бок гэтых супярэчнасцей. А іх было значна больш, што і было паказана ў працах іншых гісторыкаў. На думку Л. Гадона, такое становішча склалася па віне «караняжаў». Ён пісаў, што іх зняважлівае стаўленне да эмігрантаў з усходніх тэрыторый былой Рэчы Паспалітай вымушала апошніх думаць пра гуртаванне для абароны сваёй годнасці і сваіх правоў. Такая пазіцыя «караняжаў» абумоўлівала іх перакананне, што «ліцвіны» не годныя тых вайсковых чыноў, якімі яны карысталіся ў эміграцыі. Таксама ён зазначыў, што ліцвінаў «здзекліва папракалі» літоўскім правінцыяналізмам[29]. Л. Гадон найбольш увагі ўдзяляе паказу праяў супярэчнасцей, у меншай ступені ім закрануты іх прычыны.

Больш грунтоўна да гэтага пытання падышла А. Баршчэўская. У сваім артыкуле, які доўгі час з'яўляўся найбольш значнай

працай па гісторыі ТЛРЗ, яна называла некалькі прычын супярэчнасцей. Па-першае, гэта палітыка кансерватыўнага лагера ў эміграцыі, прадстаўнікі якога імкнуліся да адраджэння Каралеўства Польскага ў межах, вызначанных Венскім кагрэсам 1815 г. Гэта азначала пакіданне беларуска-літоўскіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Па-другое, услед за А. Вярніцкім і Л. Гадонам яна піша пра ганарлівасць «караняжаў». Таксама А. Баршчэўкая ў сваёй працы, разам з паказам прыкладаў супярэчнасцей і імкнення іх палагодзіць, адзначае, што найбольш яны праяўляліся ў правінцыяльных калоніях (пол. – «zakład», фр. – «dépôt»), куды эмігранты пасяляліся пасля прыбыцця ў Францыю[30].

А. Новак, выкарыстаўшы напрацоўкі папярэднікаў, па-новаму праінтэрпрэтаваў прычыны супярэчнасцей. На яго погляд, іх выклікалі памкненні «караняжаў» у дамінацыі ў рэпрэзентацыі насельніцтва былой Рэчы Паспалітай у эміграцыі, і выцясненне з гэтага поля дзейнасці «ліцвінаў» і «русінаў»[31].

В. Гарбачова вылучыла ў існаванні ліцвінскага асяроддзя праблему жыцця і дзейнасці ў эміграцыі ў 1830–1840-х гг. моладзі з беларуска-літоўскіх зямель. Спецыфіка гэтай групы эмігрантаў заключалася ў тым, што на момант паўстання яны амаль усе з'яўляліся грамадзянскімі асобамі, а ў паўстанні ўдзельнічалі не ў складзе рэгулярнага войска, а асобных паўстанцкіх вайсковых фарміраванняў. У эміграцыі яны апынуліся ў складаным матэрыяльным становішчы з-за адсутнасці зацверджаных вайсковых чыноў. В. Гарбачова разгледзела таксама дзейнасць некаторых эмігранцкіх арганізацый (ТЛРЗ, Таварыства навуковай дапамогі) па дапамозе гэтай групе паўстанцаў, а таксама ўдзел гэтай групы ў палітычнай і грамадскай дзейнасці. Яна звярнула ўвагу і на працэс навучання маладых эмігрантаў у французскіх навучальных установах.

Значная ўвага была нададзена паказу праяў супярэчнасцей у мемуарнай спадчыне эмігрантаў (дзённікі Ю. Патрыкоўскага, П. Капчынскага), эпісталярыі ТЛРЗ (дакументы ТЛРЗ у Бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве, Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве). Меншая ўвага надавалася паказу іх прычын. Усё ж некаторыя з іх называюцца: палітыка кансерватыўнага лагера ў эміграцыі, супярэчнасці паміж «старымі» і «новымі» вайскоўцамі, «караняжская» ганарлівасць. Аднак, крыніцы сведчаць, што названымі прычынамі спіс не вычэрпваецца. Да іх варта яшчэ далучыць нерашучую палітыку Нацыянальнага Урада ў Варшаве ў час паўстання ў адносінах да ўсходніх зямель былой Рэчы Паспалі-

тай, за што ён быў моцна крытыкаваны ў эміграцыі прадстаўнікамі ліцвінскага асяроддзя[32].

Як ужо адзначалася найбольш даследаваным бокам існавання ліцвінскага асяроддзя ў «Вялікай эміграцыі» з'яўляецца дзейнасць Таварыства Літоўскіх і Рускіх Зямель. Нягледзячы на гэта, даследчыкі часам значна разыходзяцца ў ацэнцы некаторых аспектаў, звязаных з ім. У агульнай праблеме дзейнасці ТЛРЗ магчыма вылучыць шэраг больш вузкіх пытанняў. Адно з іх – гэта прычыны ўзнікнення таварыства. Глыбіннымі прычынамі гэтага былі тыя ж, што названы вышэй у кантэксце размовы пра супярэчнасці паміж «ліцвінамі» і «караняжамі». Але на стварэнне ТЛРЗ некаторыя з іх ўплывалі ўскосна. А вось ганарлівасць «караняжаў» уплывала непасрэдна. Л. Гадон, а за ім і А. Баршчэўская, прыводзяць такую цытату з дзённіка аднаго з сяброў таварыства: «Бачачы, як у Варшаве любяць свае ўчынкі, шануюць толькі сваю самаадданасць, а пра Літву і Валынь мала хочуць ведаць, мы прынялі рашэнне заснаваць Таварыства Літоўскае, якое павінна займацца паведамленнем падзей, якія ў нас мелі месца. Варта паказаць, што рабілі тыя, што ўзнялі сцяг волі без падтрымкі рэгулярнага войска»[33].

У той жа час, цяжка пагадзіцца з тым, што палітыка кіраўніцтва паўстанням стала непасрэднай прычынай стварэння ТЛРЗ. Аналіз крыніц сведчыць[34], што яна хутчэй стварыла ў радах ліцвінаў глыбокую незадаволенасць яго працай, што ў сваю чаргу, улічваючы практычную адсутнасць у яго складзе прадстаўнікоў ад «Літвы», вылілася ў караняжска-ліцвінскія супярэчнасці ўжо ў эміграцыі і паўплывала на стварэнне таварыства. Таму, непасрэднымі прычынамі стварэння ТЛРЗ можна лічыць тыя самыя супярэчнасці ва ўсім іх багацці праяў.

Таксама не да канца высветленым засталося пытанне аб колькасці сяброў ТЛРЗ. Да гэтага часу назваць лічбу сяброў спрабавалі некалькі разоў. Першай гэта зрабіць А. Баршчэўская. На яе думку, у ТЛРЗ уваходзіла 99 сапраўдных і 14 ганаровых сяброў[35]. Каштоўнасць гэтай спробы моцна зніжае яе галаслоўнасць, у працы не прыводзяцца доказы гэтага сцвярджэння. Таксама называе лічбу сяброў ТЛРЗ і А. Новак. Паводле яго, у ТЛРЗ было 126 сяброў[36]. Але ён нічым не пацвярджае свае дадзеныя. В. Гарбачова ў адным з сваіх артыкулаў прыводзіць два варыянты адказу на гэтае пытанне. Паводле матэрыялаў ТЛРЗ на 22 сакавіка 1832 г. у яго складзе налічвалася 75 сяброў. Аднак, існуе яшчэ спіс, які склаў Л. Ходзька ў 1831–1833 гг., дзе змешчаны імёны 126 чал.[37]. Увогуле, даку-

менты ТЛРЗ сведчаць[38], што адказ на гэтае пытанне не можа быць адназначным. Тут неабходна ўлічваць статус кожнага сябра (сапраўдны ці ганаровы), а таксама ўмовы яго прыняцця (ці была завершана працэдура прыняцця, ці яна не была даведзена да канца).

Дзейнасць ТЛРЗ з'яўляецца найбольш даследаваным бокам яго гісторыі. Усе працы, у якіх яно даследуецца, у той ці іншай ступені закранаюць розныя бакі яго дзейнасці. Ад храналагічна першай працы (А. Вярніцкага) і да апошняй (А. Новака) гэтая традыцыя прасочваецца яскрава. А. Вярніцкі найбольшую ўвагу звярнуў на такія значныя мерапрыемствы таварыства: святкаванне ім першай гадавіны дня паўстання ў землях былога ВКЛ 25 сакавіка 1832 г. і выданне адозвы ад 23 жніўня 1832 г. Ён прыходзіць да высновы, што наладжванне ўрачыстасці асобна ад іншых эмігранцкіх колаў – гэта «найважнейшае выступленне» таварыства. Адозва ад 23 жніўня 1832 г., на яго думку, значна паўплывала на далейшую дзейнасць таварыства, бо яно ў ёй брала на сябе пэўныя абавязкі, якіх вымушана было прытрымлівацца. Акрамя гэтага А. Вярніцкі закранаў пытанне наяўнасці памкненняў у таварыстве па стварэнні ў яго складзе палітычнай секцыі для зносін «з землякамі, што знаходзяцца ў калоніях», а таксама стварэнне Літоўскага Вайсковага Камітэта[39].

Л. Гадон найбольшую ўвагу звярнуў на ўнутраную арганізацыю і палемікі ў таварыстве. Галоўны кірунак заняткаў у таварыстве, на яго думку, быў «літаратурна-навуковай прыроды». Аднак, ён не абмінае ўвагай і той факт, што ў складзе ТЛРЗ меліся дзеячы, якія імкнуліся надаць яму палітычны характар (напрыклад, Канстанцін Залескі). У якасці паказу плёну працы таварыства прыводзяцца сабраныя і выдадзеныя ім мемуарныя матэрыялы па паўстанні 1830–1831 гг. на землях былога ВКЛ, выбіты медаль на памяць пра паўстанне ў гэтых землях, а таксама матэрыялы святкаванняў гадавіны 25 сакавіка ў 1832 і 1833 гг.[40].

Артыкул У. Клышэўскага амаль цалкам прысвечаны гісторыі выбіцця медаля на памяць пра паўстанне ва ўсходніх землях былой Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, паказаны мэты выбіцця медаля і асноўныя ідэйныя яго падставы (дэманстрацыя непарыўных сувязей усіх «польскіх» зямель). Тут жа адзначаецца, што ТЛРЗ не адыграла такой ролі, «як гэтага магчыма было спадзявацца», што яно абмежавалася толькі знешнімі «ўрачыстымі выступленнямі»[41].

Прынцыпова па-іншаму да даследавання дзейнасці ТЛРЗ падышла А. Баршэўская. Яна не стала абмяжоўвацца выключнай

канстатацыяй асобных мерапрыемстваў таварыства. Усю яго дзейнасць яна падзяліла на тры вялікія галіны: навукова-літаратурная, палітычныя палемікі ўнутры таварыства, удзел у вырашэнні надзённых пытанняў эмігрантаў з «літоўска-рускіх» зямель. Паводле яе, у межах таварыства была створана найбольш значная частка ўспамінаў пра паўстанне. Каля 30 гэтых твораў асвятлялі паўстанне ў розных частках былой Рэчы Паспалітай. ТЛРЗ таксама ўдзельнічала ў палітычным жыцці эміграцыі, яно не раз афіцыйна звярталася да эмігрантаў шляхам выдання адозваў, напісання лістоў і да т. п. Апрача таго, на думку А. Баршчэўскай, таварыства імкнулася аблегчыць побыт ліцвінам у Францыі шляхам дапамогі ў выбары месца жыхарства, урэгулявання вайсковых чыноў, уладкавання ў навучальных установах[42]. Увогуле ж, праца А. Баршчэўскай з'яўляецца на сённяшні дзень найбольш поўным аналізам дзейнасці ТЛРЗ.

Д. Рэдэрова разглядзела ўклад ТЛРЗ у навуковыя дасягненні эміграцыі. Найбольшым сярод іх яна лічыць збор і выданне ўспамінаў і дзённікаў. Таксама быў закрануты праект Ігнація Дамейкі па рэарганізацыі таварыства і выдзяленні з яго навуковай секцыі. На яе думку, заслугай ТЛРЗ была таксама спроба стварыць першыя ў эміграцыі архіў і бібліятэку, што прадугледжваў праект І. Дамейкі. Але тут жа адзначаецца няўдаласць гэтай спробы[43].

А. Новак у адносінах да дзейнасці ТЛРЗ найбольшую ўвагу звярнуў не столькі на навукова-літаратурны напрамак прац таварыства, колькі на яго ролю ў ідэйных палеміках у эміграцыі. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на імкненне пераадолець супярэчнасці паміж «ліцвінамі» і «караняжамі», на дзейнасць у напрамку прапаганды свайго краю ў Заходняй Еўропе. Менавіта ў гэтым кантэксце разглядаюцца такія мерапрыемствы ТЛРЗ, як святкаванне ў 1832 і 1833 гг. гадавіны паўстання ў «Літве», выбіццё медаля, публіцыстычная дзейнасць. А. Новаку ўдалося лепей за ўсіх яго папярэднікаў паказаць ідэйную базу стварэння таварыства і яго дзейнасці. Аналізуючы дакументы ТЛРЗ, ён прыходзіць да высновы, што ў той час паняцці «ліцвін», «русін», «караняж» разумеліся як «рэгіянальныя» «народы/народнасці» большага, грамадзянскага, надэтнічнага народу «палякаў»[44].

Вялікую ўвагу навуковай дзейнасці ТЛРЗ удзяліла В. Гарбачова. Ёю было падрабязна прасочана, якім чынам адбываўся збор мемуарнай спадчыны паўстанцаў, як яна апрацоўвалася, рыхтавалася да выдання. Таксама яна падрабязна прааналізавала праект І. Дамейкі па рэарганізацыі таварыства.

Гаворачы пра дзейнасць ТЛРЗ, неабходна згадаць пра створаны пры ім Літоўскі Вайсковы Камітэт. У яго склад уваходзілі кіраўнікі ці актыўныя ўдзельнікі асобных паўстанцкіх атрадаў. Усе даследчыкі, што закраналі ў сваіх даследаваннях яго дзейнасць, прыкладна аднолькава разглядалі яе. У якасці мэт яго заснавання называлася зацвярджэнне вайсковых чыноў «ліцвінаў» і «русінаў», якія не атрымалі гэтага ў час паўстання. Такія захады рабіліся з мэтай паляпшэння іх складанага матэрыяльнага стану ў калоніях, таму як французскі ўрад выплачваў грашовыя субсідыі ў адпаведнасці менавіта з гэтымі чынамі. Таксама ва ўсіх выпадках апісання гэтага камітэта адзначалася негатыўнае да яго стаўленне з боку «караняжаў»[45].

Слаба распрацаваным бокам гісторыі ТЛРЗ з'яўляецца пытанне навуковага абгрунтавання яго дзейнасці. Увагу на гэта звярнуў А. Вярніцкі, які ў сваёй працы аддаў разгляду гэтага пытання асобную главу. Ён прааналізаваў погляды Л. Ходзькі на гісторыю зямель Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы, выказаныя ім у заходнееўрапейскіх перыядычных выданнях у перыяд з 1826 па 1833 гг., галоўным чынам з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці насельніцтва гэтых дзяржаў. А. Вярніцкі паказаў, што Л. Ходзька сцвярджаў і даказваў неславянскую прыналежнасць рускіх (пол. – «Rosjan»), ад якіх моцна адрозніваліся «ліцвіны» і «русіны», якія знаходзяцца вельмі блізка да палякаў па мове, культуры і гісторыі[46]. Менавіта гэтыя ідэі выкарыстоўваліся ТЛРЗ у сваёй дзейнасці, пра што яскрава сведчаць яго адозвы. У адной з іх сцвярджаецца: «…няма Польшчы без Літвы і Русі, …Русь і Літва з'яўляюцца Польшчай»[47].

Разам з агульнымі працамі па гісторыі ТЛРЗ даследчыкі не раз звярталіся да дзейнасці ў яго складзе асобных сяброў. Гэта не дзіўна, калі ўлічыць, што таварыства мела ў сваім складзе вялікую колькасць дзеячаў, якія ў далейшым заслужылі вядомасць сваімі працамі. Як пісаў А. Вярніцкі, «амаль палова [ТЛРЗ. – *Аўт.*] паслужыла нашаму народу альбо ў галіне пісьменства, … альбо ўвогуле ў прыгожых мастацтвах»[48]. Сам А. Вярніцкі і з'яўляўся пачынальнікам у гэтым напрамку, падрабязна прасачыўшы дзейнасць у межах ТЛРЗ аднаго з яго найбольш актыўных сяброў.

Сярод прац, у якіх даследавалася дзейнасць асобных сяброў ТЛРЗ, варта вылучыць працы, прысвечаныя двум найбольш знакамітым паэтам, што ўваходзілі ў яго склад – Адаму Міцкевічу і Юліўшу Славацкаму. Зыгмунд Васілеўскі падрабязна прасачыў удзел абодвух паэтаў у яго працы, пачынаючы ад заснавання і да

заканчэння яго актыўнай дзейнасці ў 1833 г.[49]. Традыцыю даследавання дзейнасці гэтых двух паэтаў у ТЛРЗ працягнула М. Страшэўская. Яе, як літаратуразнаўцу, зацікавіў уклад таварыства ў эмігранцкую літаратуру. Яна не толькі паказвае творы, якія былі напісаны паэтамі ў межах таварыства, але і прасочвае гісторыю іх напісання, адносіны да іх сучаснікаў і г. д. Варта адзначыць, што большасць згаданых твораў належаць хутчэй да публіцыстыкі, чым да ўласна літаратуры. Напрыклад, сярод твораў А. Міцкевіча аналізуюцца яго публіцыстычныя артыкулы, надрукаваныя ў 1833 г. у газеце «Польскі Пілігрым» («Pielgrzym Polski»). У гэтай працы закранаецца таксама і іншы бок дзейнасці ТЛРЗ – збор мемуарных матэрыялаў. На думку М. Страшэўскай, «найкаштоўнейшым пісьменніцкім здабыткам» таварыства стала выданне ўспамінаў і дзённікаў з часоў паўстання 1831 г.[50]. У цэлым, праца М. Страшэўскай дастаткова поўна паказвае як увесь літаратурны кірунак працы ТЛРЗ, так і ўдзел у ёй двух знакамітых літаратараў свайго часу.

Удзел у працы ТЛРЗ іншых дзеячаў таксама закрануты ў навуковай літаратуры. Так, Б. Ліманоўскі ў біяграфіі эмігранцкага дэмакрата С. Ворцэля апісаў яго дзейнасць у таварыстве. Тут акрэслены асноўныя ініцыятывы С. Ворцэля, якія ён імкнуўся правесці праз таварыства, а таксама мерапрыемствы і дыскусіі, у якіх ён прымаў удзел. Наконт дзейнасці С. Ворцэля у ТЛРЗ Б. Ліманоўскі сцвярджаў, што ён належаў да «найактыўнейшых яго сяброў»[51]. Праца падае агульную карціну дзейнасці С. Ворцэля ў таварыстве, але дакументы ТЛРЗ[52] паказваюць, што гэтую карціну магчыма дапоўніць. У 1882 г. выйшла ў свет біяграфія яшчэ аднаго (храналагічна першага) сакратара ТЛРЗ – Уладзіслава Плятэра, які займаў гэтую пасаду з 10.12.1831 па 15.03.1832. У ёй ананімны аўтар даў невялікае апісанне прац У. Плятэра ў межах таварыства, а таксама сцвярджаў, што У. Плятэр быў «адным з найактыўнейшых яго сяброў»[53]. У біяграфіі яшчэ аднаго сябра ТЛРЗ – Міхала Валовіча К. Сідаровіч-Чарнеўскай, таксама ёсць невялікая згадка пра ТЛРЗ, але яна абмяжоўваецца сцвярджэннем прыналежнасці М. Валовіча да яго[54].

Нягледзячы на актыўную распрацоўку праблемы дзейнасці ТЛРЗ, паміж даследчыкамі агульнай згоды няма наконт даты заканчэння яго існавання. А. Вярніцкі, не называючы дакладнай даты, абмежаваўся сцвярджэннем, што каля 1838 г. спынілася святкаванне дня 25 сакавіка[55]. А. Баршчэўская назвала датай заканчэння існавання таварыства 1836 г.[56]. А. Новак заканчэнне дзейнасці ТЛРЗ

датуе 1833 г., калі скончыліся пасяджэнні таварыства. Гэтую дату магчыма прыняць як дату заканчэння актыўнай дзейнасці ТЛРЗ, але неабходна ўлічваць, што некаторыя традыцыі, закладзеныя таварыствам (святкаванне асобнай гадавіны паўстання, выданне мемуараў) працягваліся да канца 1830-х гг. В. Швед, услед за А. Брукнэрам, датай заканчэння дзейнасці таварыства называе 1834 г. і звязвае яе са смерцю «актыўных сяброў таварыства Ф. Бурбы, М. Акелевіча і Лафайета»[57]. Але В. Шведам была выкарыстана навуковая літаратура, якая ў крайне малой ступені закранала ТЛРЗ[58]. У выніку быў зроблены шэраг недакладнасцей. Генерал Лафайет, які ім называецца старшынёй ТЛРЗ, не толькі ніколі такім не з'яўляўся, але і не належаў да актыўных сяброў. Ён уваходзіў у склад таварыства толькі ў якасці ганаровага сябра. На працягу ўсяго існавання таварыства яго старшынёй быў Ц. Плятэр[59]. Ф. Бурба і М. Акелевіч увогуле ніколі не былі ў яго складзе. Яны належалі да пазнейшай хвалі эміграцыі – пасля паўстання 1863–1864 гг.[60]. Таму дата 1834 г. відавочна памылковая.

Неадназначнасць адказу на пытанне даціроўкі заканчэння існавання ТЛРЗ вызначыла вынясенне В. Гарбачовай асобнага пытання храналагічных межаў яго дзейнасці. Паказваючы неадназначнаць, ёю прыводзяцца версіі вырашэння гэтага пытання А. Баршчэўскай і А. Новакам. Не называючы канкрэтнай даты заканчэння, яна сцвярджае, што датай заканчэння святкавання гадавіны літоўскага паўстання з'яўляецца 1840 г.[61].

Такая вялікая розніца ў поглядах розных аўтараў выклікана адсутнасцю канкрэтнай даты, калі таварыства самараспусцілася ці было ліквідавана звонку. Безумоўна, яго актыўная дзейнасць спынілася ў 1833 г., са спыненнем рэгулярных пасяджэнняў. Далей магчыма казаць толькі пра падтрыманне, але ўжо не ў яго межах, некаторымі сябрамі пэўных традыцый, якія былі закладзены таварыствам.

Даволі складаным з'яўляецца і праблема выкарыстання эмігрантамі яго ідэйнай спадчыны. Іншымі словамі, наколькі пытанні, узнятыя ў яго межах атрымалі ў далейшым сваё вырашэнне. Праблему пачаў распрацоўваць А. Новак. Ён паказаў, як ідэя пра адзінства і адрозненне сярод «палякаў» у эміграцыі дыскутавалася на старонках эмігранцкай прэсы ў 1834–1835 гг., у прыватнасці, яе дэмакратычнага напрамку. На яго думку, гэта сведчыла пра крызіс «перадсучаснага» польскага народу і пачатак яго распаду[62].

ТЛРЗ не была адзінай арганізацыяй, створанай ліцвінамі ў эміграцыі. 25 красавіка 1832 г. у французскім горадзе Безансон, дзе

існавала вялікая калонія эмігрантаў, у тым ліку і вялікая колькасць ліцвінаў, было створана Таварыства Братэрскага Аб'яднання («Towarzystwo Zjednoczenia się Braterskiego») (далей – ТБА). Першай увагу на яго звярнула М. Страшэўская, але з-за неадпаведнасці зададзенай тэматыкі яе працы, яго дзейнасць не была падрабязна прасочана[63]. Крыху больш увагі ўдзяліў яму А. Новак. Ён разглядаў гэтае таварыства як адзін з шэрагу іншых адказаў «ліцвінаў» і «русінаў» на пагрозу «караняжскай» дамінацыі ў рэпрэзентацыі і інтэрпрэтацыі «польскаці». А. Новак указваў на шчыльную сувязь паміж ТЛРЗ і ТБА, якое было створана менавіта сябрамі ТЛРЗ у Безансоне: Е. Булгарынам, Ю. Каменскім, Г. Калусоўскім і іншымі дзеячамі. Аднак, апісанне ТБА далёка не поўнае. Згаданы толькі некаторыя моманты яго існавання (дата заснавання, заснавальнікі, мэты)[64].

Гісторыя ТБА – адзін з найменш вывучаных аспектаў існавання ліцвінскага асяроддзя. І хаця праіснавала яно нядоўга і не пакінула ў жыцці эміграцыі значны след[65], яно заслугоўвае пільнай увагі, таму як сведчыць пра невыпадковасць і заканамернасць гуртавання ліцвінаў у эміграцыі і наяўнасць для гэтага глыбокіх перадумоў.

У кантэксце размовы пра іншыя арганізацыі, у дзейнасці якіх ліцвіны актыўна прымалі ўдзел, неабходна звярнуць увагу на Польскі Нацыянальны Камітэт (ПНК) («Komitet Narodowy Polski»), створаны ў Парыжы 8–9 снежня 1831 г. пад кіраўніцтвам І. Лялевеля. Цікавасць да гэтай арганізацыі ў даследаванні ліцвінскага асяроддзя выклікана дамінацыяй у ім ураджэнцаў Беларусі, Літвы і Украіны. Апрача І. Лялевеля ў яго склад уваходзілі Л. Ходзька, А. Глушневіч (ураджэнец Вільні), А. Пшацішэўскі (нарадзіўся ў Расіенскім павеце), К. Э. Вадзінскі (паходзіў з Украіны). Менавіта на гэта звярнуў увагу А. Новак. На яго думку, дамінацыя «ліцвінаў» і «русінаў» у ПНК – «першай палітычнай фармацыі эміграцыі» – прыводзіла да адсутнасці ў іх патрэбы стварэння асобнай палітычнай арганізацыі для прадстаўніцтва інтарэсаў паўстанцаў з гэтых зямель. Ён звяртае ўвагу на сувязь паміж ТЛРЗ і ПНК, доказам чаго з'яўляецца прапанова, выказаная на адным з пасяджэнняў ТЛРЗ, пра супольную агітацыю гэтых арганізацый у калоніях. Таксама ў кантэксце супярэчнасцей паміж «караняжамі» (з аднаго боку) і «ліцвінамі» і «русінамі» (з другога) разглядаецца барацьба двух камітэтаў, якія прэтэндавалі на рэпрэзентацыю ўсяе эміграцыі – ПНК і Нацыянальнага Камітэта Польскай Эміграцыі пад кіраўніцтвам генерала Ю. Двярніцкага, у якім дамінавалі «караняжскія» вайскоўцы[66].

Разам з тым, трэба адзначыць, што праблема існавання Таварыства Братэрскага Аб'яднання і ролі ліцвінскага асяроддзя ў дзейнасці ПНК толькі пастаўлена. Патрабуецца глыбокі аналіз дакументаў гэтых абедзвюх арганізацый для паказу іх сувязі з ТЛРЗ і ўсім ліцвінскім асяроддзем, а таксама прычыны іх хуткага заняпаду.

У гістарычнай літаратуры дастаткова слаба асветлена і пытанне сувязей прадстаўнікоў ліцвінскага асяроддзя з радзімай. Толькі ў некаторых працах закранаецца прыналежнасць ТЛРЗ да арганізацыі партызанскай экспедыцыі ў 1833 г. у землі былой Рэчы Паспалітай, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі, пад кіраўніцтвам Ю. Заліўскага. А. Вярніцкі абмежаваўся толькі сцвярджэннем прыналежнасці, што «як толькі з'явіўся намер партызанскі і энэргічны Заліўскі ўзяўся за вярхоўнае кіраўнцтва, усё таварыства [Літоўскае і Рускіх Зямель. – *Аўт.*] стала на яго бок»[67]. К. Сідаровіч-Чарнеўская ў біяграфіі аднаго з герояў гэтай экспедыцыі і актыўнага сябра ТЛРЗ Міхала Валовіча сцвярджала, што ТЛРЗ належала да шэрагу тых арганізацый, якія мелі дачыненне да падрыхтоўкі гэтай акцыі[68]. Пра слушнасць, ці памылковасць гэтых сцвярджэнняў меркаваць цяжка, таму як і ў першым, і ў другім выпадках яны галаслоўныя і не пацверджаны ў тэксце ніякімі дакументамі. Тым не менш, выказванне падобнага меркавання цалкам лагічнае, калі прыняць пад увагу, што у ТЛРЗ уваходзіла большая частка сяброў ПНК, які непасрэдна займаўся падрыхтоўкай экспедыцыі[69]. Апрача таго, трэба згадаць ідэйную блізкасць канцэпцыі партызанскай вайны, якую прапагандаваў Заліўскі, з дзеяннямі ў паўстанні заснавальнікаў ТЛРЗ і многіх яго сяброў, якія амаль усе ваявалі ў якасці партызан і не належалі (хаця б пачаткова) да рэгулярнага войска.

Пытанне сувязей з радзімай і ўплыву эміграцыі на грамадска-палітычны рух на землях Беларусі было закранута В. Шведам. На яго думку, эміграцыя аказала непасрэдны ўплыў на развіццё вызваленчага руху ў Беларусі на працягу ўсяго перыяду 1830–1840-х гг. Для прыкладу ім прыводзяцца ужо згаданая экспедыцыя Заліўскага, дзейнасць Ш. Канарскага, Ф. Кеневіча і іншых асоб. Апрача таго, закрануты і асабістыя сувязі некаторых прадстаўнікоў ліцвінскага асяроддзя (І. Дамейкі, А. Міцкевіча) са сваімі сваякамі і землякамі на радзіме праз карэспандэнцыю[70]. Увогуле, пытанне сувязей эмігрантаў з Беларусі і Літвы з родным краем з'яўляецца адным з найбольш важных у разглядаемай праблематыцы. Галоўнай мэтай эмігрантаў было вызваленне Айчыны

з-пад ярма расійскага царызму. Адпаведна, кантакты з радзімай з-за мяжы з'яўляюцца жыццёва неабходнымі для дасягнення гэтай мэты. З іншага боку падтрыманне сувязей з радзімай станавілася маральнай неабходнасцю для тых, хто яе пакінуў. Амаль усе паўстанцы-эмігранты пакінулі там сваіх сваякоў (бацькоў, жонак, дзяцей) і натуральна хацелі наладзіць двухбаковую сувязь з імі для атрымання ад іх звестак і паведамлення пра свой лёс[71].

Падсумоўваючы ўсё вышэй сказанае, варта адзначыць, што тэматыка існавання і дзейнасці ў складзе «Вялікай эміграцыі» ліцвінскага асяроддзя адносіцца да катэгорыі слаба распрацаваных. У асноўным дадзенай тэматыкай займаліся польскія гісторыкі. І ў большасці вышэй названых прац закранаецца толькі адзін бок існавання ліцвінскага асяроддзя – Таварыства Літоўскае і Рускіх Зямель. Іншыя ж бакі не атрымалі належнага асвятлення. Толькі ў двух працах (М. Страшэўская, А. Новак) былі названы іншыя арганізацыі, створаныя ўраджэнцамі зямель былога ВКЛ. Таксама да гэтага часу слаба асветлены ўдзел «ліцвінаў» і «русінаў» у іншых эмігранцкіх арганізацыях, колькасць эмігрантаў з зямель былога ВКЛ дакладна не ўстаноўлена. Нягледзячы на дастаткова значную бібліяграфію прац, у якіх даследуецца ТЛРЗ, многія пытанні, звязаныя з яго дзейнасцю, так і засталіся неасветленымі ўвогуле ці асветленымі слаба. Застаецца адкрытым пытанне яго ўплыву на грамадска-палітычную сітуацыю на землях Беларусі і Літвы.

---

[1] Смит Ф. История польского восстания и войны 1830–1831 годов: В 3 т. СПб., 1863–1864; Пузыревский А. К. Польско-русская война 1831 г.: В 2 т. СПб., 1890; Брянцев П. Д. Восстание поляков в 1830 и 1831. Вильна, 1896; Гомулицкий В. Польская революция 1830–1831. СПб., 1906; Очерки польской кампании в 1831 г. кн. Варшавского, графа И. Ф. Паскевича Эриванского. СПб., 1907; Воронков И. А. Польское восстание 1830–1831 г. в Литве и Белоруссии: Автореф. дис. … канд. ист. наук. М., 1951; Ён жа. Восстание 1830–1831 г. в Белоруссии // Вестн. Московского ун-та. Серия IX, история. 1966. № 2. С. 44–45; Воронков И. А. Позиция польских повстанческих властей по вопросу их отношений к царскому правительству, русскому, украинскому, белорусскому, литовскому народам в период восстания 1830–1831 гг. // Славяне в эпоху феодализма. М., 1978. С. 228–238; Дьяков В. А., Зайцев В. М., Обушенкова Л. А. Социальный состав участников восстания 1830–1831 гг. (по материалам западных губерний Российской империи) // Историко-социологические исследования. М., 1970. С. 16–168; Баженов Л. В. Восстание 1830–1831 годов на Правобережной Украине: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Киев, 1973; Слесарюнас Ф. Восстание 1830–1831 гг. в Литве: Автореф. дис. … канд. ист. наук.

Вильнюс, 1971; Mochnacki M. Powstanie narodu polskiego w r. 1830–1831. T. 1–2. Paryż, 1833–1834; Lelevel J. Porównanie dwu powstanie narodu polskiego 1794 i 1830 do 1831. Paryż, 1848; Sokolnicki M. Wojna polsko-rosyjska w roku 1831. Poznań, 1919; Powstania polskie 1794. 1830–1831. 1863. Wieden, б. г.; Tokarz W. Wojna polsko-rosyjska 1830 i 1831. Warszawa, 1930; Barzykowski S. Historia powstania listopadowego. Poznań, 1883–1884. T. 1–5; Śliwiński A. Powstanie listopadowe. Warszawa, 1918; Janułajtis A. Chłopi Litewscy w roku 1831. Wilno, 1921; Krzemicka Z. Powstanie Listapadowo. 1830–1831. Lwów, 1930; Bortnowski W. Walka o cele powstania listopadowego. Łódź, 1960; Кеневич С. Лелевель. М., 1970; Lotek J. Opinia publiczna a geneza Powstania Listopadowego. W-wa, 1982; Kieniewicz S. Historia Polski. 1795–1918. W-wa, 1969; Zaejwski W. Walki wewnętrzne ugrupowań politycznych w powstaniu listopadowym. Gdańsk, 1967; Powstanie Listopadowe 1830–1831. Geneza, uwarunkowania, bilans, porównania / Pod red. J. Skowroneka i M. Żmigrodzkiej. Wrocław, 1983; Powstanie Listopadowe 1830–1831. Dzieje wewnętrzne. Militaria. Europa wobec powstania / Red. Wł. Zajewski. W-wa, 1990; Kieniewicz S., Zagorski A., Zaejwski W. Trzy powstania narodowe. W-wa, 1992; Zajewski W. Powstanie listopadowe 1830–1831. W-wa, 1998.

[2] Wrotnowski F. Historia powstania w 1831 roku na Wołyniu, Podolu, Źmudzi i Litwie. T. 1. Lipsk, 1875; Bieliński K. Rok 1831 w powiecie Zawilejskim (Święciańskim). Wilno; Święciany, 1930; Gulczyński E. Rok 1830–1831 w Wilnie. Wilno, 1933; Rabinowiczówna S. Wilno w powstaniu roku 1830/1831. Wilno, 1932; Bieliński K. Powstanie listopadowe w Wilne i na Wileńszczyźnie. Wilno, 1934.

[3] Шильдер Н. К. Император Николай I и Польша в 1825–1831 гг. // Русская старина. 1900. Кн. 3. С. 1–27; Кн. 4. С. 51–69; Кн. 5. С. 237–259; Кн. 6. С. 477–504; Кн. 7. С. 3–32; Кн. 8. С. 225–264; Кропотов Д. А. Жизнь графа М. Н. Муравьева в связи с событиями его времени и до назначения его губернатором в Гродно. Биографический очерк. СПб., 1874.

[4] Смит Ф. История польского восстания и войны 1830–1831 годов. СПб., 1864. С. 717, 721.

[5] Любавский М. К. Царство Польское и конституция 1815 г. // Книга для чтения по истории нового времени. М., 1912. Т. 3. С. 687–710; Погодин А. Польша перед восстанием 1830 г. // Русское богатство. 1912. № 8. С. 30–52.

[6] Аскенази Ш. Царство Польское. 1815–1830 гг. М., 1915.

[7] Dangel S. Rok 1831 w Mińszczyźnie. W-wa, 1925.

[8] Brežgo B. Odglosy powstania 1830–1831 roku na Witebszczyźnie i Inflantach // Pamiętnik V powszechnego zjazdu historyków polskich w Warszawe. 28 listopada do 4 grudnia 1930. Lwów, 1930. S. 369–385.

[9] Швед В. В. По следам гродненской старины. Гродно, 1993; Ён жа. Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. Гродна, 1995; Смяховіч М. Арганізацыі і асобы. Паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі // Спадчына. 1996. № 4. С. 218–234; Талерчык А. Лістападаўскае паўстанне 1830 г. і ўдзел у ім Міхала Валовіча // Спадчына. 2000. № 2. С. 58–85; Гарбачова В. В.

Сялянскі рух у гады паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага). Матэрыялы навук. канф. Мн., 1997. С. 185–191. Гарбачова В. В. Заклікі і адозвы часоў паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1993. № 4. С. 53–59; Яна ж. Публіцыстыка часоў паўстання 1831 г. на Беларусі // Славянские литературы в контексте мировой культуры: Материалы докл. науч. конф. Минск, 17–20 октября 1995 г. Мн., 1996. С. 77–80.

[10] Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі. Мн., 2001.

[11] Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гародня, 2001.

[12] Цыт. па: Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі. Мн., 2001. С. 159.

[13] Горизонтов Л. Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. М., 1999; Миронов Б. Н. Социальная история России. СПб., 1999. Т. 1.

[14] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. Возникновение. История. Распад. М., 1997. С. 159.

[15] Encyklopedia powszechna Polskiego Wydawnictwa Naukowego. W-wa, 1987. Wyd. II. T. 4. S. 705.

[16] Гарбачова В. Вялікая эміграцыя // ЭГБ. Мн., 2003. Т. 6. Ч. 2. С. 351.

[17] Bielecki R. Zarys rosproszenia Wielkiej emigracji we Francji. Materiały z archiwów francuskich. 1831–1837. W-wa; Łódź, 1986. S. 21–22.

[18] Gadon L. Wielka emigracja w pierwszych latach po powstaniu listopadowym. Wyd. II / Wyd. M. Kukiel. Paris, 1960. S. 509–510.

[19] Łukaszewicz W. Wielka emigracja (1832–1864). Obozy ideologiczne, polityka, publicystyka // Prace Polonistyczne. Seria IX. Łódź; Wrocław, 1951. S. 148.

[20] Kalembka S. Wielka emigracja. 1831–1863. Toruń, 2003. S. 53–54.

[21] Gadon L. Emigracja polska. Pierwsze lata po upadku powstania listopadowego: W 3 t. Kraków, 1901–1902. T. 3. S. 37.

[22] Wernicki A. Leonard Chodźko i jego prace. Krótki rys biograficzny i naukowy. Lwów, 1880.

[23] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich (1831–1833) w laboratorium rozpadu «przednowoczesnego» narodu Rzeczypospolitej // Nowak A. Od Imperium do Imperium. Spojrzenia na historię Europy Wschodniej. Kraków, 2004. S. 196–223.

[24] Горбачева О. Молодежь белорусско-литовских земель в эммиграции во Франции (1830–1840 гг.) // Kobiety i młodzież w migracjach (Migracja i społeczeństwo, № 10) / Red. J. E. Zamojcki. W-wa, 2005; Gorbaczewa O. Działalność kulturalno-oświatowa i naukowa Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich na emigracji we Francji // Migracja i kultura (Migracje i społeczeństwo, № 11). W-wa, (w druku).

[25] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich w popularyzacji wiedzy o Litwie i Białorusi na emigracji (1831–1836) // Zeszyty Naukowe Uniwersitetu Łodzkiego. Seria 1. Z. 53. Łodź, 1967. S. 46; Barszczew-

ska A. Emigracja i kraj. Wokół modernizacji polskiej świadomości społecznej i narodowej. 1831–1863. Łodź, 1999; Barszczewska A. Société Lituanienne et des Territoires Biélorusses et Ruthènes à Paris. 1831–1836 // Acta Baltico-Slavica. T. 6. Białystok, 1969. S. 77.

[26] Митина Н. П. Социальный состав участников польского восстания 1830–1831 гг. (по спискам эмигрировавших и скрывшихся от репрессий) // Историко-социологические исследования (на материалах славянских стран). М., 1970. С. 169–197.

[27] НГАБ у Гродна, ф. 4, воп. 1, спр. 106, 134, 135, 162, 196; Krosnowski A. Almanach historique ou souvenir de l'émigration polonaise. Paris, 1837–1838, 1846; Lista żołnierzy byłej armii polskiej rewolucyjnej, którzy odpłyneli z Prus do Ameryki. W-wa, 1834 i інш.

[28] Wernicki A. Leonard Chodźko i jego prace. Krótki rys biograficzny i naukowy. Lwów, 1880. S. 219-220.

[29] Gadon L. Emigracja polska… T. 3. S. 37–38.

[30] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich… S. 57–59.

[31] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 208, 212.

[32] Les Polonais, les Lithuaniens et les Russiens célébrant en France les premiers anniversaires de leur révolution nationale du 29 novembre 1830 et du 25 mars 1831. Paris, 1832. S. 43.

[33] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego… S. 58; Gadon L. Emigracja polska… T. 3. S. 37–38.

[34] Les Polonais, les Lithuaniens… S. 43–44; Rps BN, II. 7871 (Odpisy dokumentów Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich z lat 1831–1836), k. 168–170.

[35] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego… S. 50.

[36] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 197.

[37] Gorbaczewa O. Działalność kulturalno-oświatowa…

[38] Rps BN, II.7871, II.7872, II.7873, III.7875.

[39] Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 211–248.

[40] Gadon L. Emigracja polska… T. 3. S. 39–40.

[41] Kłyszewski W. Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich // Tygodnik illustrowany. 1907. № 4.

[42] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego… S. 45–67.

[43] Rederowa D. Polski emigracyjny ośrodek naukowy we Francji w latach 1831–1872. Wrocław, 1972. S. 76–80.

[44] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 196–223.

[45] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego… S. 65–66; Gadon L. Emigracja polska… T. 3. S. 41–42; Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 221.

[46] Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 224–233.

[47] Odezwa Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich z 20.08.1832 // Borkowski K. Pamiętnik historyczny… S. 14–15.

[48] Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 211.

[49] Wasilewski Z. Mickiewicz i Słowacki jako członkowie Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich // Dziennik Poznański. № 293. 24.12.1893 (dodatek III) (не да канца); Wasilewski Z. Śladami Mickiewicza. Szkice i przyczynki do dziejów romantyzmu. Lwów, 1905; Яго ж. Mickiewicz i Słowacki jako pamiętnikarze // Wasilewski Z. Mickiewicz i Słowacki. W-wa, etc., [1921] (тое ж самае).

[50] Straszewska M. Życie literackie Wielkiej Emigracji we Francji (1831–1840). W-wa, 1971. S. 91–93, 95–101.

[51] Limanowski B. Stanisław Worcell. Kraków, 1910. S. 72–75.

[52] Rps BN, II.7871, II.7872, II.7873, III.7875.

[53] Wieniec pamiątkowy półwiekowej rocznicy powstania listopadowego. Rapperswyl, 1882. Z. 2. S. 132–134.

[54] Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza w r. 1833. Grodno, 1934. S. 11, 22–23.

[55] Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 247-248.

[56] Barszczewska A. Rola Towarzystwa Litewskiego… S. 67.

[57] Швед В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1771–1863 гг.). С. 178–201.

[58] Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza…; Mickiewicz W. Emigracja polska. 1860–1890. Kraków, 1908. S. 138; Sudolski Z. Mickiewicz: opowieść biograficzna. W-wa, 1997. S. 135; Brückner A. Dzieje kultury polskiej. Kraków; W-wa, 1946. T. 4. S. 417.

[59] Rps BN, II.7871.

[60] Borejsza J. W. Emigracja polska po powstaniu styczniowym. W-wa, 1966.

[61] Gorbaczewa O. Działalność kulturalno-oświatowa…

[62] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 217–223.

[63] Straszewska M. Życie literackie… S. 391–392.

[64] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 214.

[65] Potrykowski J. Tułactwo Polaków we Francji. Dziennik emigranta. Kraków, 1974. T. 1. S. 124–126.

[66] Nowak A. Emigracyjne Towarzystwo Litewskie i Ziem Ruskich… S. 200, 212–213.

[67] Wernicki A. Leonard Chodźko… S. 220.

[68] Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza… S. 11, 22–23.

[69] Djakow W., Nagajew A. Partyzanka Zaliwskiego i jej pogłosy (1832–1835). W-wa, 1979; Naglerowa H. Wyprawa Zaliwskiego 1833 r. // Przewodnik Naukowy i Literacki. W-wa, 1919.

[70] Швед В. Паміж Польшчай і Расіяй… С. 178–201.

[71] Słowacki J. Dzieła. T. 13 (Listy do matki). Wrocław, 1959.

3.3. Духавенства і паўстанне 1863–1864 гг.

Паўстанне 1863 г. на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі – адна з яркіх старонак еўрапейскай гісторыі XIX ст. – неаднаразова станавілася прадметам даследаванняў гісторыкаў розных краін. Літаратура гэта (галоўным чынам расійскіх і польскіх аўтараў) не толькі багатая, але і даволі супярэчлівая ў канцэптуальных адносінах. Што тычыцца беларускай гістарыяграфіі, яе станаўленне, на думку аднаго з аўтарытэтных даследчыкаў гэтай праблемы М. Біча, пачалося ў 20-я гг. XX ст.[1]. І калі, адзначае ён, у работах расійскіх і польскіх аўтараў галоўным чынам давалася канцэптуальная ацэнка паўстання (менавіта з такога пункту погляду і разглядаліся падзеі падчас паўстання), то беларускія гісторыкі засяродзілі сваю ўвагу галоўным чынам на постацях, што ўдзельнічалі ў ім[2]. Галоўнай асобай, вакол якой не сціхаюць дыскусіі навукоўцаў, стала асоба К. Каліноўскага[3].

Пра ўдзел каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863 г. спецыяльных работ у расійскай і беларускай гістарыяграфіі няма. Аднак большасць работ, што прысвячаліся гэтай падзее, у той ці іншай меры дакраналіся да гэтай праблемы. Адны аўтары вельмі катэгарычна заяўлялі, што каталіцкія ксяндзы і манахі з'яўляліся галоўнай ідэйнай сілай паўстання[4]. Іншыя былі менш катэгарычнымі, але сутнасць заставалася той жа: «Аб'ядноўваючы ў сабе каталіцызм, як сілу духоўную і паланізм, як сілу палітычную, лаціна-польскае ксяндзоўства, не высоўваючыся наперад, змагло зрабіцца кіраўніком панства і … пастаяннай дзеючай асобай рэвалюцыі»[5].

Думку расійскіх аўтараў раздзялялі і некаторыя беларускія савецкія гісторыкі. Так, С. Азгур, даючы ацэнку характара паўстання і асобы аднаго з яго кіраўнікоў – К. Каліноўскага – адзначаў, што паўстанне было арганізавана польскімі памешчыкамі і каталіцкім духавенствам і адбывалася пад шавіністычнымі лозунгамі[6].

Вялікую вартасць для рэканструкцыі падзей таго часу маюць працы удзельнікаў паўстання[7]. Яны грунтуюцца не толькі на асабістых назіраннях, але і выкарыстоўваюць вялізны масіў дакументальных матэрыялаў, што не дайшлі па розных прычынах да нашага часу. Разам з тым, гэтая акалічнасць не дае магчымасці ўдакладніць некаторыя супярэчлівыя факты і вымушае даследчыкаў прымаць іх, нават калі яны выклікаюць сумненні. Да аднаго з такіх фактаў адносяцца звесткі пра ўдзел у падрыхтоўцы паў-

стання на тэрыторыі Беларусі аднаго з відных дзеячаў каталіцкай царквы (на той час дэкана Гродзенскага дэканата) Гінтаўт-Дзевалтоўскага. У «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» аўтар адпаведнага артыкула А. Госцеў, спасылаючыся на ўспаміны аднаго з удзельнікаў падзей Ф. Ражанскага[8], адзначае, што Гінтаўт-Дзевалтоўскі «Член Гродзенскай рэв.-дэмакр. арг-цыі, створанай К. Каліноўскім і В. Урублеўскім у 1861 г.»[9].

Сумненні ўзнікаюць у сувязі з далейшай кар'ерай Гінтаўт-Дзевалтоўскага: у 1883 г. ён становіцца архіепіскапам Магілёўскім, мітрапалітам усіх рымска-каталіцкіх Расійскай імперыі цэркваў, а таксама старшынёй духоўнай рымска-каталіцкай калегіі Дэпартамента Духоўных спраў замежных веравызнанняў у Санкт-Пецярбурзе і адміністратарам рымска-каталіцкіх цэркваў былой Мінскай епархіі (скасавана урадам Расійскай імперыі ў 1869 г., але факт скасавання так і не быў прызнаны Рымам). І яшчэ адзін дакумент, знойдзены ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве даследчыцай А. Казачонак, пацвярджае падобныя сумненні. Гэта «Записка об отношениях Гродненского декана, настоятеля Гродненского побернардинского костёла, Белостокского Архидиакона А. Гинтовта», дададзеная да ліста Віленскага генерал-губернатара, якая датуецца 23 снежня 1869 г. У дакуменце сказана: «Дэкан Аляксандр Гінтаўт у час беспарадкаў, што адбываліся ў краі, дзеяннямі сваімі даказаў асобую адданасць ураду і застаўся верным сваёй справе. Працягваючы і зараз рабіць тое ж самае, ён, як старэйшая асоба рымска-каталіцкага духавенства ў Гродзенскай губерні, з'яўляецца добрым прыкладам для іншых, назірае за імі… ён сваімі звесткамі шмат садзейнічае вырашэнню многіх пытанняў, што тычацца асабовага складу рымска-каталіцкага духавенства, адносінаў яго са свецкім начальствам і абавязкаў перад урадам. Наогул дэкан Гінтаўт дабранадзейнасцю сваёй і стараннасцю **заўсёды** (падкрэслена мною. – *Аўт.*) звяртаў на сябе ўвагу»[10].

Разам з тым, аналізуючы дзейнасць і прымаючы да ўвагі непакорлівы характар мітрапаліта, яго неаднаразовыя выпады ў бок расійскага ўрада (асабліва ў сувязі з увядзеннем рускай мовы ў дадатковае набажэнства і казанні), аб чым сведчаць як аўтарскія работы[11], так і архіўныя матэрыялы можна пагадзіцца, што ва ўспамінах Ражанскага можа ісці гаворка менавіта аб ім. Чаму гэтыя звесткі не дайшлі да улад, можна меркаваць, што такое магло адбыцца па прычыне добрай канспірацыі, бо на пачатку 60-х г. Папа Пій IX неаднаразова асуджаў удзел каталіцкага духавенства ў рэвалюцыйна-дэмакратычных рухах супраць улад, як дзейства

несумяшчальнае з царкоўнымі канонамі. Што магло паўплываць (і як сведчыць гісторыя ўплывала) на пазіцыю некаторых прадстаўнікоў каталіцкага духавенства. А, магчыма, паўплывалі і другія абставіны, невядомыя яшчэ беларускім даследчыкам па прычыне цяжкай даступнасці ў сучасных абставінах матэрыялаў, што захоўваюцца ў гістарычным архіве Санкт-Пецярбурга.

Сярод успамінаў сучаснікаў падзей для вызначэння ролі каталіцкага, і не толькі каталіцкага, духавенства асобае значэнне маюць, на наш погляд, успаміны генерала расійскай арміі Пятра Чарэвіна[12]. Яны доўгі час былі невядомыя ў беларускай гістарыяграфіі. Адбылося гэта, відаць, па дзвюх прычынах. Па-першае, выдадзеныя ў савецкія часы яны не прыцягнулі ўвагі даследчыкаў, бо вельмі шмат увагі ў іх надаецца менавіта канфесіянальнаму фактару. А падобная тэматыка была выключана з гістарыяграфіі дэкрэтамі аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і наогул тымі адносінамі да яе, што характарызавалі палітыку савецкай дзяржавы на працягу сямі дзесяцігоддзяў. І па-другое, дадзеныя мемуары на сённяшні дзень з'яўляюцца сапраўднай бібліяграфічнай рэдкасцю ў Беларусі: адзіны асобнік гэтага выдання знаходзіцца ў Беларускім дзяржаўным архіве музеі літаратуры і мастацтва. Зараз вытрымкі з мемуараў (у перакладзе на беларускую мову) надрукаваны ў часопісе «Наша вера» (№ 2, 1998).

Можна пагадзіцца з расійскімі даследчыкамі ў тым, што каталіцкае духавенства і сапраўды адыгрывала вялікую ролю ў паўстанні. Але канцэптуальныя падыходы да самаго паўстання, як антырускага, і да паўстанцаў, як да дзяржаўных злачынцаў, не даюць магчымасці стварыць аб'ектыўную карціну падзей на падставе работ расійскіх даследчыкаў. Бо многія з іх за галоўную мэту ставілі палітычную ацэнку падзей, а фактычны матэрыял, статыстычныя звесткі адсоўвалі на другі план. Таму неабходна звяртацца да работ польскіх даследчыкаў, якія ўтрымліваюць багаты фактаграфічны матэрыял, а таксама да архіўных матэрыялаў. Тым больш, што шматграннасць праблемы дае магчымасць і сёння вылучыць недаследаваныя або слаба даследаваныя аспекты тагачасных падзей. Менавіта да такіх, практычна невядомых у айчыннай гістарыяграфіі праблем адносяцца пытанні узаемаадносін Рымскай курыі і ўрада Расійскай імперыі напярэдадні і падчас паўстання і тое, якое месца ў іх займалі беларускія тэрыторыі.

Асаблівая роля ў высвятленні дадзенай праблемы належыць дакументальнаму зборніку, што быў выдадзены ў Вроцлаве ў 1960 г. «Papiestwo wobec sprawy polskiej w latach 1772–1864.

Wybór zrodeł». Значная частка дакументаў прысвечана праблеме ўсталявання адносін паміж расійскім імператарам Аляксандрам II і Папам Рымскім Піем IX. Ужо з самага пачатку праўлення Аляксандра II Рымская курыя імкнулася не толькі ўтрымаць тыя пазіцыі, што былі дасягнуты ў гады праўлення яго бацькі (маецца на ўвазе падпісанне канкардата ў 1847 г.), але і пайсці далей. Меркавалася, што ўсталяванне цесных кантактаў з Расіяй будзе спрыяць замацаванню статуса рымска-каталіцкай царквы ў гэтай дзяржаве. Акрамя таго Ватыкану на той час была да спадобы актыўная роля імперыі ва ўдушэнні вызваленча-дэмакратычнага руху ў Еўропе. Звяртаючыся з лістом да Аляксандра II (ад 31 студзеня 1859 г.), Папа Пій IX адзначаў: «Адно толькі слова (маецца на ўвазе роля расійскага імператара пад час заключэння ў 1856 г. парыжскага мірнага пагаднення) вярнула спакой усёй Еўропе і ніколі не забудзе апошняя такой дабрадзейнасці. Няхай жа другое слова выканае выказаныя намі пажаданні, каталіцкая ж царква обоіх абрадаў назаўсёды захавае ўдзячнасць В. І. Вялікасці»[13].

Дакументы, змешчаныя ў зборніку, паказваюць, што паступова адносіны Рыма да патрыятычнага руху ў Польшчы пачынаюць мяняцца. Па меры распаўсюджвання яго ідэй, у тым ліку і дзякуючы намаганням каталіцкага духавенства, на тэрыторыю Літвы і Беларусі з'яўляецца магчымасць выкарыстаць яго як фактар ціску на расійскі ўрад для дасягнення незалежнасці рымска-каталіцкай царквы ад свецкіх улад імперыі, ураўноўвання яе ў правах з царквой праваслаўнай і ўсталявання жаданай нунцыятуры ў Санкт-Пецярбургу. Разам з тым, як сведчыць шэраг дакументаў, што змешчаны ў вышэй названым зборніку, адзначаныя хваляванні мелі неадназначную ацэнку з боку св. прастола. Бо, з'яўляючыся часткай агульнаеўрапейскага пад'ёму барацьбы за незалежнасць, яны ўяўлялі сабой у вачах Ватыкана «святатацкія замахі на свецкую ўладу царквы»[14].

Характарыстыка паўстання супраць дзяржаўнай улады як несумяшчальнага для духавенства дзейства з канонамі рымска-каталіцкай царквы засталіся і надалей, але падзеі 1863–1864 гг. прымусілі Рым да больш жорсткай пазіцыі ў адносінах да Расійскай імперыі. Гэта добра праявілася ў энцыкліцы «Urbi Urbaniano» Пія IX да епіскапаў Расіі і Польшчы ад 30 ліпеня 1864 г. У ёй адзначаецца: «Мы пераканаліся ў праўдзівасці звестак … аб зверствах, з якімі расійскі ўрад з кожным днём усё больш люта пераследуе каталіцкую веру, яе служыцеляў і вернікаў… Пад відам барацьбы з хваляваннямі жорстка пераследуе нашу свяцейшую веру і ўсіх католікаў…

У гэтай барацьбе, што аб'яўлена расійскім урадам каталіцкай царкве, яе святым правам, святарам і справе, вымушаны Мы … новы ў гісторыі царквы і раней не бывалы дэспатызм адкрыта асудзіць»[15].

Праз два гады (29 кастрычніка 1866 г.) Пій IX выступіў з прамовай на тайнай кансісторыі. Прамова ўтрымлівае ўсебаковую ацэнку тых падзей, што адбыліся падчас паўстання і незадаволенасць палітыкай расійскіх улад у адносінах да каталіцкай царквы пасля паўстання. Такая пазіцыя Рыма пагоршыла адносіны з Расійскай імперыяй, якая разарвала канкардат 1847 г., увяла рэжым выключных законаў на тэрыторыі Беларусі, якія мелі дачыненне не толькі да рымска-каталіцкай царквы, яе свяшчэннаслужыцеляў, але і ўсіх вернікаў.

Паўстанне, што адбылося на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі ў 1863–1864 гг., аказала вялікі ўплыў на канфесіянальнае становішча Беларусі. У першую чаргу гэта тычылася дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій – праваслаўнай і каталіцкай, іх статуса і ўзаемаадносін. Паўстанне высветліла і наглядна прадэманстравала варожасць і супярэчнасці, якія здаўна існавалі паміж імі, а ў экстрэмальнай сітуацыі ўспыхнулі з новай сілай. Напярэдадні паўстання рымска-каталіцкае духавенства Польшчы звярнулася (1862 г.) да праваслаўнага духавенства Беларусі і Літвы з адозвай. Дакумент гэты, надрукаваны ў зборніку «Виленский временник»[16], сведчыць аб добрым разуменні каталіцкім духавенствам таго, што роля праваслаўя ў краі пасля далучэння да Расійскай імперыі і скасавання уніі ўзмацнілася, але і спадзявалася, што ўспаміны пра унію яшчэ жывуць сярод былога уніяцкага духавенства.

Праўда, як сведчыць расійская гістарыяграфія дасавецкага часу, былыя уніяцкія вернікі, як і былыя уніяцкія святары, што сталі праваслаўнымі ў выніку скасавання уніі ў 1839 г., не падтрымалі паўстання. Чаму? Думаецца, тут паўплывала тое, што і ўлады, і ў першую чаргу вышэйшае праваслаўнае духавенства, вельмі пільна сачылі за падзеямі, не прапускаючы ніводнага выпадку хістання ці слабасці. На што звярнуў увагу ў сваім творы Г. Кіпрыяновіч. Ён прыводзіць наступныя звесткі. Калі два маладыя святары з Гродзенскай губерні – Бялевіч (с. Гавейнавічы) і Жаброўскі (с. Мілавіды) – пад прымусам падпісалі за непісьменных сялян прысягу народнаму жонду, на іх адразу ж было накладзена спагнанне. Адзіным «непатрыятычным учынкам» сярод духавенства Літоўскай праваслаўнай епархіі, адзначае Кіпрыяновіч, быў учынак святара Нарачанскай царквы Скабалановіча. Ён і дзве яго дачкі,

ахрышчаныя па рымска-каталіцкім абрадзе і выхаваныя ў каталіцкіх традыцыях сваёй маці, былі западозраны ў сувязях з паўстанцамі і забеспячэнні іх харчаваннем. Свяшчэннік быў змешчаны ў Гродзенскі манастыр, а яго дачок Мураўёў саслаў у Гомель[17].

Найбольш падрабязнае адлюстраванне тагачасных гістарычных падзей знаходзім у «Литовских епархиальных ведомостях». Яны расказвалі пра жорсткія расправы з боку паўстанцаў над праваслаўнымі святарамі, якія ў той ці іншай форме выказалі сваю падтрымку расійскім уладам. Распраўляліся па-рознаму: святару Жытлінскай царквы Слонімскага павета Мікалаю Ступніцкаму паўстанцы пагалілі галаву і забралі прадуктовыя прыпасы. Расказвалася на старонках епархіяльнага друку і пра жудасныя забойствы. Так, у «Литовских епархиальных ведомостях» апісвалася забойства святара праваслаўнай царквы ў мяст. Сураж Гродзенскай губерні. Мясцовы благачынны сцвярджаў: «Узброеныя мяцежнікі ў колькасці да 40 чалавек, пасля апоўначы… акружылі хату свяшчэнніка Пракаповіча і з крыкам – «адчыняй» – пачалі стукаць у дзверы. Айцец Пракаповіч, пачуўшы крык і шум натоўпу каля хаты і разумеючы, што задумана нешта кепскае, паспеў схавацца на гарышчы… Не паспелі адчыніць дзверы, як яны ўжо былі выламаны; сталі біць і ламаць шыбы. Калі айца Пракаповіча знайшлі, яго білі коллямі і дубінамі, потым застрэлілі і павесілі»[18].

Нярэдка здаралася, што праваслаўных святароў прымушалі прысутнічаць у час прывядзення ксяндзамі да прысягі паўстанцкаму ўраду праваслаўнага насельніцтва, чытання маніфеста паўстанцкага ўрада на польскай мове і г. д. У цэрквах, духоўных семінарыях, дамах свяшчэннікаў з'яўляліся розныя адозвы, маніфесты, пракламацыі. У адным з нумароў «Литовских епархиальных ведомостей» за 1863 г. быў надрукаваны адказ семінарыстаў на гэтыя адозвы. Вось што ў ім гаварылася: «Наша духавенства, слава Богу, не такое, якім яго лічаць здраднікі: яно вернае прысязе, мужна разрывае ўсе хітрыя сеці нячыстага, а некаторыя з яго членаў сваю адданасць цару, веры праваслаўнай і праваслаўнай рускай айчыне даказалі тым, што перанеслі ганьбу над іх свяшчэнным санам, цялесныя і духоўныя пакуты, і нават сваёй смерцю…».

Прадстаўнікі расійскага грамадства выказалі сваё спачуванне праваслаўнаму духавенству Беларусі праз газету «День». У нумары ад 22 чэрвеня 1863 г. быў надрукаваны зварот да беларускага праваслаўнага духавенства. У ім гаварылася: «Мы вінаваты перад вамі; даруйце нам… Мы, Рускае грамадства, як быццам забыліся пра існаванне Беларусі; мы доўгі час не ведалі аб той глухой, не-

вядомай барацьбе, якую вялі беларусы за сваю народнасць і веру з магутнымі, моцнымі, хітрымі і багатымі, з усіх бакоў акружаючымі іх ворагамі – пальшчызнай і лацінствам. Якія высокія подзвігі здзейсніла ты, Беларускае духавенства, – беднае, прыгнечанае, не маючае ніякай падтрымкі грамадскай і дзяржаўнай – подзвігі доўгацярплівасці і пакутніцтва»[19].

Але трэба мець на ўвазе, што афіцыйны друк (у тым ліку і праваслаўныя выданні) асвятляе толькі адзін бок падзей. На самой справе ўсё было больш складана. Аналізуючы архіўныя матэрыялы, а таксама літаратуру, прысвечаную гэтаму аспекту падзей, з іншага боку, мы бачым, што забойствы праваслаўных святароў былі рэакцыяй на фізічныя расправы над каталіцкімі свяшчэннаслужыцелямі. Што дае нам падставы сцвярджаць: абвастрэнне сітуацыі, узаемаадносін паміж каталіцкім і праваслаўным лагерамі правакавалася царскімі ўладамі дзеля таго, каб апраўдаць прымяненне жорсткіх метадаў задушэння паўстання.

Першай ахвярай стаў вікарны ксёндз Ішора (мяст. Жалудок, Лідскі павет, Гродзенская губерня). Ваенны суд прыгаварыў яго да расстрэлу за чытанне маніфеста нацыянальнага ўрада ў студзені 1863 г. і заклік насельніцтва да паўстання. Пакаранне ксяндза Ішоры адбылося 22 мая 1863 г. у Вільні: «Ад дамініканскага манастыра, які быў ператвораны ў турму, пад канвоем яго павялі па вуліцах горада на Лукішскі пляц і тут пакаралі прынародна, не здымаючы сану свяшчэннаслужыцеля»[20]. Пра гэтыя падзеі распавядае і П. Чарэвін у сваіх успамінах: «Да пакарання смерцю быў прыгавораны ваенным судом парафіяльны ксёндз Ішора, абвінавачаны ў чытанні з амбона абуральнага польскага маніфеста і ў прывядзенні да прысягі асобаў, якія ішлі ў банды мяцежнікаў. М. Мураўёў ухваліў прысуд, і ксёндз па загаду М. Мураўёва быў расстраляны без папярэдняга пазбаўлення духоўнага сану, як таго патрабавалі агульныя законапалажэнні»[21]. Як бачым, і адзін, і другі аўтары падкрэсліваюць, што пакаранне смерцю адбывалася з парушэннямі дзяржаўных законаў: свяшчэннаслужыцеляў па законах Расійскай імперыі павінны быў судзіць спачатку духоўны суд. На гэтую акалічнасць звяртае ўвагу ў сваёй рабоце і В. Ратч, праўда, ён падкрэслівае іншы аспект падзей: «Ксянзы кідаліся ў вір мяцежа, лічачы сябе не падуладнымі занонам міран. Яны ведалі, што ў сваёй духоўнай іерархіі заўсёды знойдуць абаронцаў, а не судзей. Перакананасць гэтая пахіснулася 22 мая, калі быў прыведзены ў выкананне смяротны прыгавор, вынесены вікарнаму ксянзу Станіславу Ішоры. У натоўп былі кінуты чуткі, што рускія

ўлады на такія меры не адважацца, што ўся лацінская Еўропа ўварвецца ў межы Расіі шукаць адплаты, што гэта толькі жарт для тэатральнага эфекта – напуск страху і потым памілаванне»[22].

Цікавы момант, які не акцэнтуецца ў працах расійскіх аўтараў, але добра прагледжваецца праз іх. Пералом у адносінах да каталіцкага касцёла (маюцца на ўвазе пакаранні смерцю прадстаўнікоў каталіцкага духавенства без узгаднення з духоўным кіраўніцтвам) звязаны непасрэдна з асобай М. Мураўёва. Да яго прызначэння і прыезда ў Вільню ніхто не адважваўся прывесці смяротны прысуд у дзеянне, відаць, баючыся рэзанансу ў Еўропе. Мураўёў жа, па словах П. Чарэвіна, імкнуўся «паказаць, асабліва заходнім дзяржавам, злачынны ўдзел у мецяжы рыма-каталіцкага духавенства. Паказаць, што ўрад не спыніцца ні перад якімі мерамі, каб пакласці канец хваляванням і беспарадкам»[23]. Аб тым, што пачатак рэпрэсіўных мер супраць каталіцкага духавенства супадае з прыездам ў Вільню М. Мураўёва гаворыць і польскі аўтар кс. З. Нагродскі[24]. Звяртаецца ўвага на гэтую акалічнасць і беларускім даследчыкам паўстання 1863 г. В. Шалькевічам: «Паўстанне 1863 года ў Беларусі і Літве прымусіла Аляксандра II прызначыць Мураўёва віленскім генерал-губернатарам… За час знаходжання Мураўёва на пасадзе віленскага генерал-губернатара (з мая 1863 па май 1865) было павешана і расстраляна 128 чалавек, тысячы былі сасланы ў Сібір, у арыштанцкія роты, на катаргу»[25].

Аб агульнай характарыстыцы мер Мураўёва і тым, як яны ўспрымаліся законнай уладай сведчыць В. Ратч: «Меры, што прымаў Мураўёў ставілі адзіную мэту: «**русскую землю очистить от всего польского наноса, истребить, искоренить всё, что интеллигенция польская, русской жизни враждебная, исподволь успела вдавить крамольного в русскую почву и которая в течение пяти веков терзала русскую землю**. Народ – *русский*; шляхетство – *ополяченное*, новый костёл – *новое знамя для мятежной борьбы против русской жизни*: таков окончательный вывод исследований»[26].

І яшчэ адно назіранне, якое з'явілася пры аналізе літаратуры і дакументальных матэрыялаў, прысвечаных падзеям 1863 г. Увядзенне ў навуковы ўжытак зборніка дакументаў, выдадзенага ў Вроцлаве «Papiestwo wobec sprawy polskiej w latach 1772–1864»[27], аб якім ішла гаворка вышэй, растлумачвае, чаму творы польскіх аўтараў XIX ст. (сярод якіх пераважаюць духоўныя асобы) засяроджваюць сваю ўвагу не на непасрэдным удзеле каталіцкіх ксяндзоў і манахаў у паўстанні, а на тых наступствах, што

адбыліся пасля яго падаўлення. Справа ў тым, што на ўсіх этапах перадрэвалюцыйных падзей і падчас іх Папа рымскі падкрэсліваў, што падобныя дзеянні не сумяшчальныя з канонамі рымска-каталіцкай царквы. А гэта азначае, што ўдзел каталіцкага духавенства ў падзеях быў парушэннем гэтых канонаў. Таму, відаць, на іх і не засяроджвалася ўвага.

Амаль усе работы беларускіх даследчыкаў савецкага часу, якія ўсё ж звярталі ўвагу на канфесіянальны фактар у паўстанні, адзначалі адступніцкую пазіцыю вышэйшага каталіцкага клера падчас яго спаду. Гэта пацвярджаецца і дакументальнымі архіўнымі матэрыяламі. У кнізе В. Яноўскай адзначаецца: «Як толькі стала відавочным, што масавае паўстанне не ўдалося, вышэйшае каталіцкае духавенства звярнулася да насельніцтва каталіцкага веравызнання з заклікам скласці зброю і падпарадкавацца законнаму царскаму ўраду Расійскай імперыі. 13 верасня 1863 г. Віленская рымска-каталіцкая кансісторыя вырашыла «зрабіць цыркулярнае распараджэнне на польскай мове па ўсёй епархіі аб прызванні народа да гарачых малітваў з чыстасардэчным раскайваннем і просьбай да Госпада Бога палажыць канец гэтым няшчасцям і ўсталявання міру…»[28]. Складзеная адозва *«Do rzymsko-katolickego Duchowenstwa i Ludu wiernego po Dyecezyi Wilenskej»* (тэкст якой захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Літвы. – *Аўт.*) была даведзена праз дэканаў да ўсяго каталіцкага духавенства для зачытання яе з амбонаў у першую ж нядзелю або свята пасля атрымання дакумента»[29].

Успаміны П. Чарэвіна ўдакладняюць гэтыя падзеі, раскрываючы тыя моманты, што не атрымалі дакументальнага сведчання. Ідэя выкарыстаць вышэйшае каталіцкае духавенства дзеля паралізавання актыўнай дзейнасці духавенства прыходскага і змяншэння іх уплыву на вернікаў належыць М. Мураўёву. Ён запрасіў да сябе віленскага епіскапа Адама Красінскага з членамі капітула і звярнуўся да іх з прамовай: «Усё, што я чуў і што мне было вядома пра беспарадкі ў тутэйшых мясцінах, далёка не абмалёўвала вартага жалю становішча, у якім знаходзіцца край. Я пакладу канец мецяжу. Вы, напэўна, чулі, што я даводжу справу да жаданага канца. Але што мяне сапраўды засмуціла, дык гэта абыякавасць, з якой рыма-каталіцкае духавенства глядзіць на цяперашняе становішча. Мне вядома, які аграмадны ўплыў мае гэтае духавенства на сваіх аднаверцаў – але ці было з вашага боку зроблена хоць што-небудзь, каб прывесці да розуму сваю паству? Скажу больш: некаторыя з вас, панове, спачувалі мяцежнікам, благас-

лаўлялі іх, прыводзілі да прысягі на вернасць рэвалюцыйнаму ўраду, нярэдка самі кіравалі бандамі»[30]. Мураўёў настойліва «папрасіў» епіскапа звярнуцца да сваёй паствы з заклікам «спыніць як … шаноўнае духавенства, так і жыхароў краю ў згубнай для іх дзейнасці». Епіскап не выканаў распараджэнне, за што быў асланы ў Вятку. Прызначаны на яго месца прэлат Юзаф Баўкевіч падпарадкаваўся Мураўёву і зрабіў усё, што ад яго патрабавалася.

Найбольш часта прадметам аналізу расійскай і беларускай гістарыяграфіі (розных перыядаў) станавіліся падзеі, што папярэднічалі 1863 г. Гэтая праца пачалася ў беларускіх касцёлах у пачатку 60-х гг. і асабліва актывізавалася пасля падзей, што адбыліся ў Варшаве ў лютым 1861 г., або, як іх афіцыйна называлі расійскія чыноўнікі, «беспарадкаў у Варшаве». Тады, у час разгону дэманстрацыі, загінула некалькі чалавек. У касцёлах Беларусі, як і ў іншых месцах Расійскай імперыі, служылі паніхіды па забітых у Варшаве, многія каталікі насілі жалобнае адзенне са спецыяльнымі знакамі. Даволі падрабязныя звесткі аб гэтым з апісаннем тых упрыгожванняў, якія насілі каталікі, а найбольш каталічкі на Беларусі даюцца ў артыкуле В. Касмылёва «Польская эмблематыка ў грамадска-палітычным руху на Беларусі ў пачатку 60-х гадоў XIX ст.»[31].

Аб спяваннях у касцёлах Беларусі польскіх патрыятычных гімнаў (часцей за ўсё гучала «Божа, які Польшчу!…», «Яшчэ Польшча не загінула!…»), паніхідах і іншых падзеях таго часу расказваецца і ў польскіх, і ў расійскіх выданнях дасавецкага часу. У кнізе «Bojownicy kaplani za sprawe kościoła i ojczyzny w latach 1861–1915» прыводзяцца дакументальныя звесткі з тых падзей. У прыватнасці, справаздача мінскага губернатара да міністра ўнутраных спраў П. Валуева (ад 24 кастрычніка 1861 г.) паведамляла: «Адчуваецца ўплыў апошніх Варшаўскіх падзей. Спевы ў касцёлах паўтараюцца з шалёным фанатызмам да такой ступені, што моладзь патушыла святло ў касцёле мінскіх бенедыкцінак, зневажала прыстава, які быў там у час службы. Знайсці вінаватых немагчыма»[32].

Аб тым, што адбывалася ў Віцебску ў сувязі з варшаўскімі падзеямі 1861 г. сведчыць ліст архіепіскапа Полацкага В. Лужынскага да обер-пракурора Св. Сінода графа А. Талстога. Урачыстая памінальная літургія і паніхіда адбываліся тут у па-дамініканскім касцёле. Пасля богаслужэння ксёндз Ваўчанскі абвясціў падпіску на ўсталяванне ў Віцебску пры касцёле св. Варвары помніка ў памяць пра загінуўшых. «Мяркуйце ж, Ваша сіяцельства, самі, – пісаў архіепіскап, што можа адбывацца ў паветах і вёсках па-за вачыма начальства. Бо ў Віцебску ўсё адбывалася на вачах маёра світы Яго Вялікасці г. Галынскага і маіх»[33].

Але, бадай, найбольш за ўсё звярталіся даследчыкі (і звяртаюцца да гэтага часу) да тых мерапрыемстваў, што распачаліся пасля падаўлення паўстання. Усталяванне ў краі рэжыма выключных законаў, рэпрэсіі супраць каталіцкага касцёла – тэма, якая да гэтага часу застаецца актуальнай і патрабуе асобага аналізу. Вялікая колькасць літаратуры па дадзенай тэме адрозніваецца рознагалоссем, у розных выданнях прыводзяцца розныя даныя, што выклікае неабходнасць правядзення дадатковых архіўных пошукаў, аналізу і параўнання крыніц. Да гэтага часу гістарыяграфія прадстаўлена па сутнасці адзінай фундаментальнай крыніцазнаўчай працай[34], ды і тая, на жаль, не апублікавана. Дысертацыя Л. Абушанкавай грунтуецца на аналізе шматлікіх архіўных дакументаў, што не ўвайшлі ў склад серыйнага выдання, прысвечанага 100-годдзю паўстання 1863 г.[35]. Паводле артыкула Г. Макаравай[36], дысертацыя Абушанкавай утрымлівае цікавыя звесткі, многія з якіх (адносна канфесіянальнай кампаненты паўстання) да гэтага часу невядомыя беларускай гістарыяграфіі. Прычына зразумелая. У 60–80-я гады XX ст. даследчыкі дадзенай праблемы не цікавіліся гэтым яе аспектам, а пазней архіў Расійскай Акадэміі навук, як і іншыя архівы Масквы, становяцца цяжкадаступнымі для іх. Разам з тым складваецца ўражанне, што некаторыя высновы аўтара дысертацыі патрабуюць удакладнення. Найбольшую цяжкасць, па сцвярджэнні аўтара дысертацыі, выклікала ў яе вызначэнне нацыянальнага складу удзельнікаў паўстання, бо ва ўсіх афіцыйных дакументах адзначалася толькі месца нараджэння ўдзельніка паўстання і яго веравызнанне. Гэта спарадзіла даследчыцу зрабіць выснову, што «палякі-паўстанцы, як правіла, былі католікамі, маларосы – праваслаўнымі, беларусы – у большасці сваёй – уніятамі».

Адна з прычын завышанай колькасці скасаваных касцёлаў і падвергнутых рэпрэсіўным мерам прадстаўнікоў каталіцкага духавенства ў Беларусі, што сустракаецца ў некаторых працах, бачыцца нам у тым, што частка аўтараў не зусім добра знаёмыя з гістарычнай геаграфіяй тэрыторыі. Прывядзем такі прыклад. У артыкуле М. Ракоўскага «Супрацьстаянне», змешчаным у часопісе «Наша вера», відаць, дзеля таго, каб прыдаць сваім словам большую перакананасць у тым, што «царызм жадаў цалкам знішчыць каталіцызм у Мінскай губерні» ў спіс ліквідаваных манастыроў па Мінскай епархіі ўключаны манастыры ў Мінску (бернардынаў і бенедыктынак), Нясвіжы (дамініканаў, бенедыктынаў, бернардынаў), Навагрудку (дамініканак), Цытавянах (бернардынаў), Гродна (дамініканаў)[37].

Аб тым, як адбываліся акцыі закрыцця касцёлаў і ператварэння іх у праваслаўныя цэрквы засталося не так і шмат апісанняў. Таму вельмі важнай крыніцай служыць «Минская старина», якая захавала нам успаміны пра гэтыя падзеі ў м. Юравічы, што ў 20 вярстах ад Мазыра. Успамінае тагачасны вікарны ксёндз Сенчыкоўскі (у далейшым зацяты прыхільнік распалячвання касцёла). Вось як ён апісваў вышэйазначаныя падзеі: «У Юравічах я сустрэў роту салдат, якія на працягу чатырох гадзін сякерамі рубілі ў касцёле алтары, статуі 12 апосталаў і арган, які каштаваў 6 тысяч рублёў. Гэта ўзрушыла мяне да глыбіні душы… Рота салдат была пад камандаваннем ваеннага начальніка павета маёра Стэфановіча, зацятага фанатыка-паляка. Але для таго, каб паказаць сваю адданасць Расіі, ён загадаў рубіць алтары... Пасля такога вандалізму і зневажання Бога ў прысутнасці маёй і каталікоў, – працягвае Сенчыкоўскі, – Стэфановіч звярнуўся да каталікоў са словамі: «Глядзіце, Ваш касцёл ужо праваслаўны, «Матка Боская» (мелася на ўвазе цудатворная ікона Божай Маці. – *Аўт.*) ужо прыняла праваслаўе. Таму і вы прымайце праваслаўе, а ўрад кожнаму, хто прыняў праваслаўе, дасць узнагароду – па 30 руб.». Але тут выйшаў наперад 80-гадовы старац, пакланіўся і сказаў: «Ня хочам мяняць лепшую веру на горшую». – «Як на горшую?» – крыкнуў маёр Стэфановіч. Старац нікольк не збянтэжыўся і адказаў: «А як жа, пане, не горшая, калі вы нават да нашай веры яшчэ 30 руб. у прыдачу даеце! Я, калі мяняю каня, дык заўсёды даю ўпрыдачу, калі мой конь горшы. І так усе робяць»[38]. Далейшае апісанне развіцця падзей (на падставе матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) даецца ў кнізе В. Яноўскай[39].

Такім чынам, як сведчыць гістарыяграфічны аналіз, галоўнымі дзеючымі асобамі ў паўстанні 1863–1864 гг. былі дзве хрысціянскія канфесіі – каталіцкая і праваслаўная, іх вернікі і свяшчэннаслужыцелі. Іншыя хрысціянскія канфесіі і іх духоўныя асобы імкнуліся не ўмешвацца ў вышэйазначаныя падзеі. Цікава, што стараверы, нягледзячы на іх, здавалася б, непрымірымыя адносіны з царскім урадам і афіцыйным праваслаўем, не прынялі бок паўстанцаў. Яны заставаліся вернымі як заўсёды «истинно русскому духу». Па назіраннях М. Мураўёва і П. Чарэвіна, па прыбыцці ў край складвалася ўражанне, што «адны толькі стараабрадцы сапраўды заставаліся вернымі свайму абавязку». Мабыць, адыграла тут сваю ролю і некаторае паслабленне, што было даравана ім урадам Аляксандра II у 1858 г.

Звярнулі ўвагу на гэтую акалічнасць і аўтары кнігі «Русское православие: вехи истории». У ёй адзначаецца, што падчас паўстан-

ня ідэйныя кіраўнікі стараверaў – стараверы Рагожскіх могілак і беспапоўцы Праабражэнскай багадзельні – прыслалі імператару «верноподданнические адреса». Аляксандр II прыняў іх у Белай зале Зімняга палаца і сказаў: «Я рады бачыць вас і ўдзячны за спачуванне агульнай справе. Мне хацелі вас ачарніць, але я гэтаму не паверыў і ўпэўнены, што вы – такія ж падданыя, як і ўсе іншыя. Вы – мае дзеці, а я – ваш бацька і малю Бога за вас таксама, як і за іншых»[40].

Далейшыя гістарычныя падзеі сведчаць, што «клапатлівы бацька» дазволіў адкрыць шэраг стараверскіх малельных дамоў, што былі апячатаны. Напрыклад, 9 верасня 1863 г. выйшаў указ «О распечатании моленной в д. Кубличизна». Тэкст указа паведамляў: «… прымаючы ва ўвагу палітычныя падзеі і той удзел, які прымала ў іх раскольніцкае насельніцтва Заходніх губерняў, дазволіць распячатаць маленную ў вёсцы Кублічызна, не прыдаючы гэтаму факту віду ўрадавай меры»[41].

Пра пазіцыі пратэстанцкага духавенства і іх вернікаў у паўстанні 1863 г. практычна нічога няма. У манаграфіі В. Яноўскай са спасылкамі на матэрыялы віленскіх архіваў адзначаецца, што паўстанцаў падтрымала большая частка выкладчыкаў і выхаванцаў Слуцкай гімназіі. За ўдзел у паўстанні ў 1863–1864 гг. з яе было выключана 280 вучняў, што складала 62% іх агульнай колькасці. Не абмінулі рэпрэсіі і выкладчыкаў. Частка з іх за падтрымку паўстанцаў была саслана ў Сібір[42].

Аналіз уплыву каталіцкага духавенства на выяўленне характару паўстання яшчэ напярадзе. Калі пагадзіцца з расійскімі (а таксама і многімі беларускімі) даследчыкамі аб вялікім уплыве і актыўным удзеле ў паўстанні каталіцкага духавенства (а яны як мы лічым у гэтым маюць рацыю), то гэта даказвае яго прапольскі характар. Бо большасць каталіцкага духавенства ў Беларусі складалі менавіта прадстаўнікі польскай нацыянальнасці. І быць носьбітам беларускай нацыянальнай ідэі яны проста не маглі. А, маючы шляхецкае паходжанне, прадстаўлялі акрамя таго і інтарэсы свайго саслоўя. Хаця нельга зусім скідваць з разліку і тое, што сярод каталіцкага духавенства, удзельнікаў паўстання, маглі быць і беларусы па паходжанні. Але гэтая акалічнасць не цікавіла ні расійскі, ні польскі бок і таму да гэтага часу застаецца не высветленай. Думаецца, што гэтая старонка ў паўстанні калі-небудзь прыцягне ўвагу беларускіх даследчыкаў.

---

[1] Біч М. В. К. Каліноўскі і паўстанне 1863 г. у працах беларускіх савецкіх гісторыкаў // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук. 1989. № 3. С. 110.

[2] Біч М. Паўстанне 1863–1864 гг. Кастусь Каліноўскі // Гіст. альманах. Гродна, 2002. Т. 6. С. 23.

[3] Гл.: Казбярук У. Маякі і міражы // Літ. і мастацтва. 1990. 7 снеж.; Біч М. В. Хай народзіцца ісціна // Літ. і мастацтва. 1991. 22 лютага; Ён жа. У крывым люстэрку. К. Каліноўскі: праўда і вымыслы // Настаўн. газ. 1991. 17, 24, 27 ліп.; Ён жа. Нацыянальнае і аграрнае пытанне ў час паўстання 1863–1864 гг. // Бел. гіст. часоп. 1993. № 3.

[4] Брянцев П. Д. Польский мятеж 1863 г. Вильна, 1892. С. 66.

[5] Миловидов А. И. Заслуги графа М. Н. Муравьёва для православной церкви в Северо-Западном крае. Харьков, 1900. С.7.

[6] Падрабязна эвалюцыя поглядаў беларускіх савецкіх гісторыкаў разглядаецца ў артыкуле М. В. Біча «К. Каліноўскі і паўстанне 1863 г. у працах беларускіх савецкіх гісторыкаў» // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук. 1989. № 3.

[7] Giejsztor J. Pamiętniki z lat 1857–1865. Wilna, 1913. T. 1–2; Janowski J. Pamiętniki o powstaniu Styczniowym. Lwów, 1923. T. 1; W-wa, 1925. T. 2; Авейде О. Записки о польском восстании 1863 года. Варшава, 1866; Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России. Вильно, 1867 и др.

[8] Из воспоминаний Ф. Рожанского // К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988.

[9] Госцеў Алесь. Гінтаўт-Дзевалтоўскі Аляксандр Казімір // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1996. Т. 3. С. 6.

[10] РДГА у Санкт-Пецярбургу. Ф. 821. Воп. 3. Спр. 953. Арк. 13–13 адв.

[11] Шишова Т. Гинтовт-Дзевалтовский // Католическая энциклопедия. М., 2002. Т. 1. С. 1323; Kumor B. Ustrój i organizacja Kościoła Katolickiego w okresie niewoli narodowej (1772–1918). Kraków, 1980.

[12] Воспоминания П. А. Черевина. 1863–1865. Кострома, 1920.

[13] List papeża Piusa IX do cara Aleksandra II, z dnia 31 stycznia 1859 roku // Papiestwo wobec sprawy polskiej w latach 1772–1864. Wybór źródeł. Wrocław, 1960. S. 187.

[14] Encyklika «Nullis certe verbis» papeża Piusa IX z dnia 19 stycznia 1860 roku // Там же. С. 189.

[15] Encyklika «Urbi Urbaniano» papeża Piusa IX do biskupów w Rosji i w Polsce, z dnia 30 lipca 1864 roku // Там же. С. 257, 258.

[16] Виленский временник. Вильна, 1913. Кн. 4. С. 47–48.

[17] Киприанович Г. Я. Жизнь Иосифа Семашки митрополита Литовского и Виленского и воссоединение западнорусских униатов с православною церковию в 1839 г. Вильна, 1897. С. 411, 412.

[18] Литовские епархиальные ведомости за 1863 год. Вильна, 1864. С. 334, 335.

[19] Цыт. па: Литовские епархиальные ведомости за 1886 год. Вильна, 1887. С. 53.

[20] Лясковский А. И. Литва и Белоруссия в восстании 1863 г. Берлин, 1939. С. 119.

[21] Цыт. па: П. Чарэвін. Паўночна-Заходні край. Успаміны // Наша вера. 1998. № 2. С. 48.

[22] Ратч В. Назв. твор. С. 224.

[23] Наша вера. 1998. № 2. С. 48.

[24] Nagrodski Zygmunt. Rola duchoweństwa katolickiego w godzinie prób i cierpień na terenach Litwy i Białorusi (1863–1883). Wilno, 1935. S. 10–14.

[25] Шалькевіч В. Сыны і пасынкі Беларусі. Мн., 1996.

[26] Ратч В. Назв. твор. С. 239.

[27] Матэрыялы выяўлены і перакладзены з польскай мовы на рускую А. Казачонак, за што аўтар выказвае ёй шчырую падяку.

[28] НГА Літвы. Ф. 604. Воп. 5. Спр. 331. Арк. 7.

[29] Яноўская В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мн., 2002. С. 120.

[30] Наша вера. 1998. № 2. С. 48.

[31] Касмылёў В. Польская эмблематыка ў грамадска-палітычным руху на Беларусі ў пачатку 60-х гадоў XIX ст. // Бел. гіст. часоп. 1993. № 3.

[32] Bojownicy kaplani za sprawe kościoła i ojczyzny w latach 1861–1915. Sandomerz, 1936. S. 4.

[33] Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого. Казань, 1885. С. 263–264.

[34] Обушенкова Л. А. Документальные материалы о восстании 1863 года в архивах Советского Союза. Дис. … канд. ист. наук. М.: Институт славяноведения АН СССР, 1964.

[35] Восстание 1863 года. Материалы и документы. Москва; Вроцлав. 1961–1986. Т. 1–25.

[36] Макарова Г. В. Материалы об участниках польского восстания 1863 г. в архиве Института славяноведения Российской Академии наук // Российско-польские научные связи в XIX–XX вв. М., 2003. С. 233–241.

[37] Ракоўскі Мар'ян. Супрацьстаянне // Наша вера. 1996. № 1. С. 74.

[38] Минская старина // Труды Минского церковного историко-археологического комитета. Вильно, 1911. Вып. 3. Ч. 1. С. 10–11.

[39] Яноўская В. Назв. твор. С. 123–125.

[40] Русское православие: вехи истории. М., 1992. С. 370.

[41] Собрание постановлений по части раскола. СПб., 1875. С. 599.

[42] Яноўская В. Назв. твор. С. 128.

3.4. Беларусь у Першай сусветнай вайне

Першая сусветная вайна (1914–1918 гг.) – адна з найбуйнейшых сацыяльных катастроф у гісторыі чалавецтва. У вайну былі ўцягнуты 33 дзяржавы, у якіх (разам з калоніямі) пражывала 1,5 млрд чалавек. Яна суправаджалася беспрэцэдэнтнымі разбурэннямі, пакутамі і гібеллю людзей: было забіта 10 млн чалавек, паранена і скалечана больш за 20 млн, ад голаду, хвароб і іншых няшчасцяў загінула больш за 5 млн цывільнага насельніцтва. Вайна загубіла столькі людскіх жыццяў, колькі ўсе еўрапейскія войны за тысячагоддзе да яе.

Тэрыторыя Беларусі апынулася ў рэгіёне сутыкнення геапалітычных інтарэсаў Расіі і Германіі і стала адным з эпіцэнтраў сусветнага ўзброенага канфлікту. З канца 1915 г. да канца 1918 г. яна была падзелена на дзве часткі лініяй фронту. Для абодвух праціўнікаў тэрыторыя Беларусі з'яўлялася тэатрам ваенных дзеянняў, прыфрантавой зонай і тылавым раёнам. За чатыры гады вайны насельніцтва беларускіх зямель перажыло чаргаванне некалькіх уладных рэжымаў: царскага самадзяржаўя, германскіх акупантаў, расійскага Часовага ўрада, савецкай улады. Неад'емнымі атрыбутамі штодзённасці сталі тут надзвычайныя законы ваеннага часу, рэквізіцыі, масавыя міграцыі людзей, пастаянная небяспека для жыцця. Усё гэта прывяло да хуткацечнага некантраляванага разбурэння ўстойлівых сацыяльных інстытутаў, развалу эканомікі краю, рэзкіх дэфармацый структуры насельніцтва, сур'ёзных маральных страт.

Айчыннымі і замежнымі гісторыкамі створаны значны аб'ём навуковай літаратуры, якая ў той або іншай ступені адлюстроўвае падзеі і працэсы перыяду вайны на тэрыторыі Беларусі. Прадметам нашага гістарыяграфічнага даследавання будуць працы айчынных аўтараў, што маюць дачыненне да названай тэмы. Пры гэтым пад «айчыннай гістарыяграфіяй» маюцца на ўвазе ў першую чаргу і галоўным чынам працы, выкананыя ў Беларусі або беларускімі ўраджэнцамі па-за яе межамі. Разам з тым нельга абстрагавацца ад той акалічнасці, што ў часы існавання Савецкага Саюза гістарычная навука БССР у метадалагічных і тэматычных адносінах не выступала як самастойная навуковая школа, а з'яўлялася інтэгральнай часткай усёй савецкай гістарыяграфіі. Таму гістарыяграфічны аналіз прац беларускіх савецкіх аўтараў магчымы толькі ў кантэксце агульных працэсаў і тэндэнцый, што мелі месца ў гістарычнай навуцы ўсяго Савецкага Саюза, найперш яго вядучых навуковых цэнтраў – Масквы і Ленінграда. З гэтай прычыны ўзнікае неабходнасць звярнуцца і да расійскіх савецкіх даследаванняў Першай сусветнай вайны, асабліва тады, калі ў іх закранаюцца гістарычныя рэаліі беларускага рэгіёна. Названай акалічнасцю абумоўлена таксама вялікая ўвага ў нашым гістарыяграфічным аглядзе да публікацый пра рэвалюцыйны рух у гады вайны, барацьбу палітычных партый, лютаўскую і кастрычніцкую рэвалюцыі, савецкае будаўніцтва, бо менавіта гэтыя сюжэты дамінавалі ў савецкай гістарыяграфіі, прысвечанай падзеям 1914–1918 гг.

Першыя публікацыі, у якіх знайшлі адлюстраванне асобныя сюжэты з гісторыі Вялікай вайны (як яе называлі сучаснікі), нале-

жалі пяру ўдзельнікаў і відавочцаў падзей. Гэтыя працы мелі прапагандысцкі гісторыка-публіцыстычны або мемуарны характар. Так, яшчэ ў ходзе вайны набыткам чытача сталі брашуры пра баявыя дзеянні на расійска-германскім фронце, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі. Надрукаваныя з дазволу царскай цэнзуры, кароткія агляды баявых аперацый вызначаліся апалагетыкай у дачыненні да расійскага камандавання, у прыватнасці, мелі на мэце апраўдаць адступленне царскіх войск у 1915 г., вынікам чаго стала акупацыя немцамі заходніх рэгіёнаў Расійскай імперыі[1].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., калі была скасавана палітычная і паслаблена ваенная цэнзура, у друку з'явіліся артыкулы, прасякнутыя крытычным пафасам адносна дзеянняў царскіх улад і генералітэту[2]. Рэгулярна публікаваліся даволі падрабязныя, праілюстраваныя картамі-схемамі агульныя нарысы баявых падзей на франтах вайны, у якіх асэнсоўваліся стратэгічныя і палітычныя вынікі ваенных кампаній[3]. Гэтыя публікацыі ўтрымлівалі рэалістычныя назіранні і аб'ектыўныя ацэнкі становішча ў расійскім войску.

У гады вайны быў пакладзены пачатак вывучэнню такой маштабнай сацыяльнай з'явы з вельмі значнымі наступствамі, як перамяшчэнне мірнага насельніцтва з франтавых і прыфрантавых раёнаў углыб Расійскай імперыі – бежанства. Першымі цікавасць да гэтай тэмы праявілі прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх дабрачынных арганізацый, што апекаваліся бежанцамі, а таксама публіцысты[4]. Сярод аўтараў першых прац па гісторыі бежанства былі дзеячы беларускага нацыянальнага руху, многія з якіх актыўна ўключыліся ў справу дапамогі бежанцам і арганізацыі іх вяртання на радзіму. Становішча беларускіх бежанцаў у Казані, працэс абуджэння ў іх нацыянальнай свядомасці асветлены ў нататках В. Грыневіча[5]. Высокай кампетэнтнасцю ў бежанскай праблематыцы, багаццем факталагічнага матэрыялу, вызначаюцца працы Я. Станкевіча, А. Цвікевіча[6]. М. Краўцоў, які ўвосень 1915 г. знаходзіўся ў складзе расійскіх войск, што адступалі з Вільні да Мінска, пакінуў яскравыя замалёўкі вымушанага руху беларускіх бежанцаў з усімі яго нягодамі, людскімі пакутамі і смерцю[7].

Да тэмы бежанства звяртаўся вядомы беларускі грамадскі дзеяч Я. Канчар. У яго артыкуле «Лёс бежанцаў» разгледжаны агульныя пытанні, звязаныя з перамяшчэннем беларусаў у гады вайны, прыведзены звесткі пра тое, адкуль, калі і як эвакуіравалася насельніцтва. Грунтуючыся на статыстычных даных рэгістрацыі беларускіх бежанцаў у Петраградзе, Я. Канчар даў падрабязную характарыстыку зарэгістраваных бежанцаў[8].

Работы, напісаныя ў перыяд вайны, каштоўныя як першы досвед асэнсавання падзей сучаснікамі. Гэтыя работы вызначаліся фрагментарнасцю і схематызмам, сістэматычная праца з крыніцамі не праводзілася. Для ажыццяўлення паўнавартасных гістарычных даследаванняў патрабаваўся час.

Перыяд станаўлення савецкай гістарычнай навукі (1920–1930-я гг.) характарызаваўся ўсталяваннем бальшавіцкай канцэпцыі Першай сусветнай вайны як вайны імперыялістычнай, развязанай рэакцыйнымі коламі міжнароднай буржуазіі дзеля дасягнення яе класавых інтарэсаў. У сувязі з панаваннем класавага падыходу, вайна цікавіла савецкіх даследчыкаў пераважна не як самастойны феномен гісторыі, а найперш як адзін з фактараў наспявання сацыялістычнай рэвалюцыі – яе пярэдадзень і паскаральнік. Таму ў даследаваннях, тэматыка якіх упісвалася ў храналагічныя рамкі Першай сусветнай вайны, галоўным аб'ектам увагі былі рэвалюцыйныя падзеі 1917 года, асабліва Кастрычніцкая рэвалюцыя. У савецкі перыяд вывучэнне Кастрычніцкай рэвалюцыі лічылася самым прыярытэтным абавязкам гістарычнай навукі. Публікацыі па гэтай тэме ўсяляк заахвочваліся, але разам з тым яны падвяргаліся пільнаму ідэалагічнаму кантролю. Факты, высновы і абагульненні гэтых работ павінны былі абгрунтоўваць апрыёрны пастулат ідэалагічнай дактрыны аб «заканамернасці» і «непазбежнасці» Кастрычніцкай рэвалюцыі, яе «сусветна-гістарычным» значэнні. Першымі працамі, створанымі ў такім рэчышчы, былі кнігі, брашуры, артыкулы кіраўнікоў бальшавіцкіх партыйных арганізацый на Заходнім фронце А. Мяснікова, В. Кнорына, Н. Пятрова, В. Фаміна, М. Хатаевіча і інш.[9]. Асноўная ўвага ў іх надаецца рэвалюцыйным падзеям у Беларусі і на Заходнім фронце, барацьбе бальшавікоў з сацыялістамі-рэвалюцыянерамі, меншавікамі і партыямі нацыянальнай дэмакратыі. Напісаныя з пазіцый непрыкрытай бальшавіцкай «партыйнасці», яны вызначаюцца тэндэнцыйнасцю, выбарачнай падачай гістарычных фактаў. Іх гістарычная каштоўнасць можа заключацца ў тым, што яны даюць магчымасць уявіць прыёмы і метады барацьбы бальшавіцкіх арганізацый за дасягненне і ўтрыманне ўлады.

У 20-я – пачатку 30-х гг. у СССР выйшлі першыя даследаванні па гісторыі рабочага, сялянскага, салдацкага рухаў[10]. Яны ўтрымлівалі шматлікія факты і высновы, што характарызавалі становішча, стаўленне да вайны, сацыяльную актыўнасць названых пластоў грамадства. Створаныя на агульнарасійскім матэрыяле дадзеныя публікацыі толькі фрагментарна закраналі адпаведныя

працэсы ў беларускіх губернях і на Заходнім фронце. Спецыяльнае вывучэнне сацыяльна-палітычных рухаў рабочых, сялян і салдатаў у межах беларускага рэгіёна толькі пачыналася[11]. Так, у манаграфіі К. Кернажыцкага «Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной» асобны раздзел прысвечаны хваляванням сялян і запасных у Мінскай і Магілёўскай губернях падчас ваеннай мабілізацыі 1914 г. Аднак разгляд гэтага сюжэта ажыццёўлены ілюстрацыйным спосабам, статыстычныя даныя ў кнізе адсутнічаюць, таму агульная карціна, маштабы сялянскага руху засталіся не высветленымі[12].

Першая сусветная вайна і рэвалюцыя 1917 г. стымулявалі дэзінтэграцыйныя працэсы ў Расійскай імперыі, з-за чаго на парадак дня паўставала праблема стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці народаў, у тым ліку беларускага. Гэтая праблема таксама стала прадметам адлюстравання ў гістарычных публікацыях, найперш – у працах удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, заснавальнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі і БССР.

Беларускія нацыянальныя дзеячы Я. Варонка, А. Цвікевіч, А. Луцкевіч, К. Езавітаў, В. Гадлеўскі, М. Касцевіч і іншыя разглядалі падзеі 1914–1918 гг. скрозь прызму барацьбы беларусаў за нацыянальную незалежнасць. У іх працах канцэнтравалася ўвага на разгортванні беларускага нацыянальнага руху ў перыяд вайны і першыя пасляваенныя гады[13]. Пададзеныя ім шматлікія факты, дакументальныя звесткі асвятляюць найперш «унутраныя» працэсы ў руху, дзейнасць беларускіх партый і арганізацый, асобных лідэраў, але не заўсёды даюць уяўленне пра размах і выніковасць гэтай дзейнасці, пра рэальнае месца беларускага руху сярод іншых грамадска-палітычных сіл, пра значнасць яго ўплыву на падзеі. Толькі часткова закраналіся ў публікацыях адраджэнцаў міжнародныя, унутрыпалітычныя і ваенна-стратэгічныя фактары актуалізацыі і вырашэння беларускай праблемы.

Такая тэматычная скіраванасць была ўласціва і першым савецкім працам па гісторыі зараджэння нацыянальнай дзяржаўнасці, аўтарамі якіх былі А. Бурбіс, Ф. Турук, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч – таксама выхадцы з беларускага руху[14]. Варта адзначыць, што У. Ігнатоўскі ў «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі» выказваў каштоўную з метадалагічнага пункту гледжання думку, што Першая сусветная вайна «ломіць старыя рамкі жыцця і пачынае сабою новы перыяд гісторыі як Расіі, так і Беларусі»[15]. Такім чынам, быў сфармуляваны погляд на вайну як на асобны этап айчыннай гісторыі, які падвёў рысу пад папярэднім развіццём і знаменаваў

сабой драматычны старт у сучасную (найноўшую) гісторыю. Аднак, такі погляд не атрымаў развіцця ў савецкай гістарыяграфіі. У адпаведнасці з афіцыйнымі ўстаноўкамі савецкага часу Першая сусветная вайна па-ранейшаму разглядалася выключна з перспектывы сацыялістычнай рэвалюцыі – для абгрунтавання яе заканамернасці і неабходнасці ўстанаўлення савецкай улады.

У 1920–1930-я гг. частка савецкіх гісторыкаў, эканамістаў і дэмографаў звярнуліся да вывучэння змен у структуры народанасельніцтва, выкліканых Першай сусветнай вайной. Спроба прааналізаваць уплыў вайны на дэмаграфічныя працэсы, у тым ліку ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, была зроблена ў кнізе Л. Лубны-Герцыка[16]. Аднак тэрыторыя Беларусі, якая ў 1921 г. адышла да Польшчы, даследаваннем Л. Лубны-Герцыка не ахоплена.

Праца Я. Волкава адлюстроўвае развіццё насельніцтва Расійскай імперыі і СССР (уключаючы беларускія губерні) за васьмідзесяцігадовы адрэзак часу. У прыватнасці, аўтарам зроблены разлікі страт бежанцаў з заходніх губерняў на 1917 г., звернута таксама ўвага на бежанцкі рух у другой палове 1917 – пачатку 1918 гг., які не быў улічаны афіцыйнай статыстыкай[17].

У 1920-я гг. у БССР быў выдадзены шэраг прац, прысвечаных грамадска-палітычнай барацьбе ў Беларусі і размешчаным тут расійскім войскам у гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Гісторыя захопу бальшавіцкімі сіламі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве разглядалася ў кнізе Г. Лялевіча (Л. Калмансона)[18]. Праца ўяўляла сабой першую спробу раскрыць гэтую важную і цікавую тэму. У кнігу ўключаны 12 нумароў «Бюллетеня», які выдаваўся Агульнаармейскім камітэтам пры Стаўцы. Гэтая крыніца ўтрымлівае каштоўныя звесткі аб становішчы на фронце і палітычнай атмасферы, што панавала ў Стаўцы ў кастрычніку-лістападзе 1917 г. Пяру Г. Лялевіча належыць таксама гістарычны нарыс пра антыбальшавіцкае выступленне ў Гомелі ў сакавіку 1919 г. двух чырвонаармейскіх палкоў на чале з М. Стракапытавым[19].

У кнізе былога камісара па польскіх справах С. Гельтмана з бальшавіцкіх пазіцый асвятляўся канфлікт паміж савецкімі ўладамі і польскім корпусам І. Доўбар-Мусніцкага, прыводзіліся факты з гісторыі Саюза вайсковых палякаў і іншых польскіх арганізацый у Беларусі ў гады вайны і рэвалюцыі[20].

У 20-х – пачатку 30-х гг. XX ст. у СССР актыўна вывучалася вайскова-стратэгічная гісторыя вайны. У адкрытых і закрытых ваенна-акадэмічных выданнях былі ўведзены ў навуковы ўжытак

шматлікія факты аб ваенных дзеяннях у 1914–1918 гг. Сярод гэтых прац вылучаліся апублікаваныя ў 1923–1929 гг. ваенна-гістарычныя нарысы былога расійскага генерала, прафесара Ваеннай акадэміі А. Заянчкоўскага, перавыдадзеныя ў наш час асобнай кнігай[21]. Гэтыя даследаванні ўяўлялі сабой першую апрацоўку архіўных дакументаў з выкарыстаннем замежных крыніц, яны з'яўляюцца вельмі каштоўнымі паводле сабранага ў іх багатага фактычнага матэрыялу, які адлюстроўвае баявыя аперацыі ў кожны год вайны на ўсіх франтах. Некалькі старонак прысвечаны наступальным аперацыям германскіх войск 1915 г. у Польшчы, Літве і Заходняй Беларусі. Асобна разглядаюцца Свянцянскі прарыў і яго ліквідацыя, чэрвеньскае (1917 г.) наступленне рускіх войск на Паўднёва-Заходнім і Заходнім франтах, сітуацыя на расійска-германскім фронце ў 1918 г. Неабходна, аднак, адзначыць, што, нягледзячы на грунтоўную дакументальную аснову, праца А. Заянчкоўскага не выглядае цалкам аб'ектыўнай і бесстаронняй: баявыя поспехі расійскіх войск старанна падкрэсліваюцца, няўдачы ж апісваюцца мімаходзь.

У міжваенны час былі таксама выдадзены распрацоўкі ваенных гісторыкаў, спецыяльна прысвечаныя асобным баявым аперацыям, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1916 гг.[22].

Выданні 20-х гг. стваралі неабходны падмурак, на падставе якога маглі разгортвацца далейшыя даследаванні. Аднак з канца 20-х – пачатку 30-х гг. савецкую гістарычную навуку, у тым ліку ў БССР, значна ўзмацніўся ідэалагічны націск, пашырылася ўмяшальніцтва партыйнага кіраўніцтва ў вызначэнні не толькі напрамкаў гістарычных даследаванняў, але і іх асноўных вынікаў.

З гэтай прычыны грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў перыяд вайны і рэвалюцыі атрымала ў гістарыяграфіі скажонае, крайне аднабокае асвятленне. Прадмет даследавання амаль цалкам быў зведзены да дзейнасці бальшавікоў сярод рабочых і сялян беларускіх губерняў, салдат Заходняга фронту, падрыхтоўкі і ажыццяўлення ўзброенага паўстання.

Непрыкрыта тэндэнцыйны характар мелі, напрыклад, публікацыі па гісторыі грамадскага і палітычнага руху, што належалі аўтарству С. Агурскага. Ён змяніў ролю і значэнне беларускага нацыянальнага руху, лічыў Беларускую сацыялістычную грамаду амаль фіктыўнай арганізацыяй, даваў аднабокія ацэнкі небальшавіцкім сілам. Паводле даследчыка, за выключэннем РСДРП, дзейнасць усіх астатніх палітычных партый, што захавалі ў Беларусі свае арганізацыі падчас сусветнай вайны, была «апартуністычнай і абаронніцкай, яна прыносіла рабочаму класу толькі шкоду»[23].

Гэтыя ж матывы прагучалі ў падрыхтаванай супрацоўнікамі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б Ю. Майзелем і М. Шапавалавым кнізе «Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б». У ёй усе небальшавіцкія партыі, незалежна ад іх палітычнай арыентацыі і сацыяльнага складу, характарызаваліся адназначна як «варожая сіла», супрацьстаячая бальшавікам і савецкай уладзе. Сцвярджалася, што над усімі гэтымі партыямі, уключаючы і рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі, вісіць класавая віна, якая аб'ектыўна і падвяла іх да разгрому[24].

Абслугоўваючы рэпрэсіўную кампанію барацьбы з т. зв. нацыянал-дэмакратызмам, афіцыйныя гісторыкі і ідэолагі асабліва зацята кляймілі беларускі нацыянальны рух як «контррэвалюцыйны», «антынародны», тым самым фактычна адкідвалі саму ідэю самавызначэння беларускага народа, а яе носьбітаў – беларускіх адраджэнцаў – прыраўнялі да фашыстаў[25].

Паралельна з беларускімі савецкімі гісторыкамі да праблемы гісторыі Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны звярталіся аўтары, якія пражывалі па-за межамі БССР. На іх працу ў меншай ступені ўплывалі ідэалагічныя ўстаноўкі, што забяспечвала больш свабодны выбар тэматыкі і метадалогіі даследаванняў, дазваляла абапірацца на багацейшую фактуру і карыстацца шырэйшым дыяпазонам ацэнак і меркаванняў. Пры гэтым акцэнт рабіўся не на сацыяльна-класавым, а на нацыянальным аспекце грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў перыяд вайны.

Так, у кнізе А. Станкевіча «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення» барацьба за рэалізацыю ў гады Першай сусветнай вайны беларускай ідэі асвятляецца ў шырокім міжнародным кантэксце распаду еўрапейскіх імперый. У кнізе адлюстраваны грамадска-палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі, занятай у 1915 г. кайзераўскімі войскамі, разглядаецца дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый і іх кіраўнікоў ва ўмовах германскай акупацыі. У 1917–1918 гг., паводле А. Станкевіча, прынцып нацыянальнага самавызначэння стаў фактам грамадскай свядомасці беларускай палітычнай эліты. Шмат увагі надаецца ў кнізе працы і рашэнням Усебеларускага з'езда, аналізуюцца ўстаўныя граматы БНР, разглядаюцца адносіны да яе германскіх акупацыйных улад. У асобным раздзеле сваёй кнігі А. Станкевіч прааналізаваў спробы дзеячаў БНР стварыць свае структуры ўлады, іх дыпламатычную дзейнасць у Еўропе і Расіі, заснаванне сеткі беларускай школьнай адукацыі. А. Станкевіч не замоўчвае палітычных супярэчнасцей паміж рознымі беларускімі партыямі і іх лідэ-

рамі. Рэалізацыя беларускай ідэі, паводле аўтара кнігі, аказалася толькі частковай, незакончанай: Беларусь падзялілі паміж сабой Польшча і Савецкая Расія паводле Рыжскага міру 1921 г.[26].

Істотнае месца адводзіцца перыяду Першай сусветнай вайны і ў кнізе Я. Найдзюка «Беларусь учора і сёння», якая ўпершыню ўбачыла свет у 1940 г., а ў пасляваенны час дапоўнена і дапрацавана І. Касяком[27]. Асноўным аб'ектам аўтарскай увагі тут таксама выступае беларускі нацыянальны рух. У кнізе падагульняюцца звесткі пра дзейнасць у гады Першай сусветнай вайны беларускіх грамадска-палітычных арганізацый, малююцца палітычныя партрэты беларускіх адраджэнцаў, прыводзяцца тэксты некаторых дакументаў БНР.

Пасля 1945 г. прадстаўнікі беларускай савецкай гістарыяграфіі асвятлялі гісторыю Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны ў кантэксце агульнага савецкага дыскурсу гэтай тэмы. Да XX з'езда КПСС (1956 г.) савецкая навука па-ранейшаму была скута ўмовамі культу асобы Сталіна, якія абавязвалі гісторыкаў разглядаць Першую сусветную вайну як пярэдадзень сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі. Больш за тое, у гэты час вайна 1914–1918 гг. апынулася «ў цені» не толькі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., але і Другой сусветнай вайны, вывучэнне якой лічылася больш актуальным. Таму ўвага савецкіх даследчыкаў перыяду Першай сусветнай вайны скіроўвалася галоўным чынам на асвятленне рэвалюцыйнага руху, дзейнасці бальшавіцкіх арганізацый, развіцця бальшавіцкага друку і г. д.[28]. Ва ўзаемасувязі з названымі сюжэтамі беларускія савецкія даследчыкі прасочвалі гісторыю ўтварэння Беларускай ССР[29]. Пры гэтым праводзілася ідэя класавай непрымірымасці да палітычных апанентаў бальшавікоў, замоўчваліся, а часам і скажаліся гістарычныя факты.

Пасля смерці Сталіна (1953 г.) і XX з'езда КПСС (1956 г.) сітуацыя ў савецкай гістарычнай навуцы паволі пачала мяняцца. Актывізаваліся ваенныя гісторыкі, узбагачаныя вопытам Другой сусветнай вайны. З'явіліся артыкулы і абагульняючыя працы па стратэгічнай гісторыі, у прыватнасці, ваенна-гістарычны нарыс савецкіх палкоўнікаў Д. Вяржхоўскага і Р. Ляхава[30].

У 1975 г. выйшла калектыўная двухтомная праца савецкіх ваенных гісторыкаў пад рэдакцыяй І. Растунова, прысвечаная ваенным дзеянням на ўсіх франтах на працягу ўсёй вайны[31]. Яна стала важнай вяхой вывучэння дадзенай тэматыкі. Неўзабаве была таксама выдадзена манаграфія І. Растунова па гісторыі баявых дзеянняў на расійска-германскім фронце[32]. У гэтых працах на аснове

шырокага матэрыялу нанова даследаваліся праблемы падрыхтоўкі да вайны, аналізаваліся найважнейшыя аперацыі на ўсіх франтах, публікаваліся шматлікія фотаілюстрацыі, карты і схемы. Разам з тым, названыя даследаванні неслі ў сабе і шэраг недахопаў, абумоўленых ідэалагічнай сітуацыяй у СССР у час «халоднай вайны» і брэжнеўскага застою. Пазначыўся відавочны адрыў і нават супрацьстаўленне баявых дзеянняў на ўсходнім і заходнім тэатрах вайны, празмерна падкрэсліваліся поспехі рускай арміі нават там, дзе яны былі больш чым сціплымі. Спрашчаліся складаныя адносіны расійскага грамадства і арміі, змякчаліся супярэчнасці паміж афіцэрскім корпусам і салдатамі. Як і ў літаратуры папярэдняга часу, недастаткова асвятляліся пытанні баявога забеспячэння арміі, харчавання войск, франтавога і тылавога побыту, адпачынку.

Значны размах пасля 1945 г. атрымала вывучэнне эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны. Адной з першых савецкіх прац паслявае́ннага часу, у якой даследаваўся эканамічны крызіс у Расіі 1914–1917 гг., была манаграфія І. Маеўскага «Экаиоміка рускай прамысловасці ва ўмовах першай сусветнай вайны» (М., 1957). Сярод іншага ён закрануў пытанні аказання дапамогі бежанцам з заходніх губерняў імперыі. Аўтар лічыў, што для царскага ўрада бежанцы з'яўляліся рэзервуарам, з якога меркавалася атрымаць значную колькасць таннай рабочай сілы. Дзейнасць шэрагу ўстаноў па аказанні дапамогі бежанцам (Таццянінскі камітэт, УЗС і УСГ, нацыянальныя арганізацыі) І. Маеўскі звёў да «палявання» на бежанцаў з мэтай прыцягнення іх да працы.

У працы А. Анфімава аб становішчы расійскай вёскі ў гады Першай сусветнай вайны (да лютага 1917 г.) закрануты пытанні выкарыстання працы бежанцаў у сельскай гаспадарцы. Аўтар адзначыў цяжкае становішча бежанцаў у месцах іх часовага жыхарства і невялікія памеры дапамогі з боку дзяржавы[33].

У працы В. Дзякіна «Руская буржуазія і царызм у гады першай сусветнай вайны» (Л., 1967) разглядалася дзейнасць Усерасійскага земскага саюза і Усерасійскага саюза гарадоў у прыфрантавых раёнах. Аўтар адмоўна ацэньваў намаганні актыву земскіх і гарадскіх самакіраванняў па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, рабіў акцэнт на «здрадзе» ліберальна-буржуазных дзеячаў народным інтарэсам шляхам супрацоўніцтва з памешчыкамі і царом. Апазіцыйнасць буржуазіі ў адносінах да ўрада разглядалася аўтарам як палітычная гульня з мэтай атрымання ільгот і прывілеяў.

У фундаментальнай працы А. Сідарава «Эканамічнае становішча Расіі ў гады першай сусветнай вайны» былі закрануты некаторыя аспекты эвакуацыі з заходніх губерняў. Аўтар паказаў незавершанасць падрыхтоўкі Расіі да вайны і менавіта ў гэтым бачыў прычыны паражэнняў і адступлення царскай арміі ў 1915 г. А. Сідараў адзначыў стыхійны характар эвакуацыі прамысловасці з заходніх губерняў, што тлумачыў нераспрацаванасцю эвакуацыйных планаў у пачатку вайны[34].

Выдадзеная ў 1985 г. манаграфія Т. Кітанінай «Вайна, хлеб і рэвалюцыя» была прысвечана аналізу харчовага пытання ў Расіі ў 1914 – кастрычніку 1917 г. у кантэксце агульнага крызісу эканомікі імперыі. У кнізе закранаецца праблема бежанцаў, якія выкарыстоўваліся для забеспячэння сельскай гаспадаркі працоўнай сілай. Кніга ўтрымлівае цікавыя назіранні аб барацьбе паміж грамадскімі дабрачыннымі арганізацыямі і губернатарамі за кіраўніцтва справай уладкавання бежанцаў на месцах[35].

Да 40-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў СССР была разгорнута публікацыя крыніц па гісторыі рэвалюцыйнага руху, якая дала імпульс далейшым даследаванням. Выдадзеная ў Маскве ў 1957–1963 гг. дакументальная серыя з 10 кніг пад агульнай назвай «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя» змясціла нямала новых на той час матэрыялаў і па гісторыі Беларусі. У 1957 г. ажыццёўлена аналагічнае беларускае выданне ў 2-х тамах[36]. Адначасова быў апублікаваны зборнік успамінаў удзельнікаў барацьбы за ўсталяванне ў Беларусі і на Заходнім фронце савецкай улады[37]. Нягледзячы на тое, што ўспаміны старанна адрэдагаваны і ў цэлым тэндэцыйна адлюстроўваюць падзеі грамадска-палітычнага жыцця, яны ўтрымліваюць пэўны факталагічны матэрыял, які дазваляе глыбей зразумець логіку і характар розных форм рабочага, сялянскага, салдацкага рухаў.

Па меры ўвядзення ў навуковы ўжытак новых груп крыніц пашырыўся тэматычны дыяпазон даследаванняў. У Савецкім Саюзе з'явіліся працы, якія ўтрымлівалі нетрафарэтныя меркаванні пра стан расійскага грамадства, і масавую свядомасць і сацыяльныя паводзіны яго асноўных пластоў на розных этапах Першай сусветнай вайны. Прадстаўнікі т. зв. «новага напрамку» ў савецкай гістарыяграфіі П. Валабуеў, Ю. Кір'янаў, С. Цюцюкін, Г. Собалеў і інш. здолелі больш аб'ектыўна, чым гэта рабілася раней, ахарактарызаваць склад, становішча, формы арганізацыі і сацыяльнага пратэсту рабочага класа, сялянства і салдат напярэдадні 1917 г. Вынікі іх даследаванняў фактычна ставілі пад сумненне права-

мернасць ідэалізацыі расійскага пралетарыяту, нібыта прасякнутага выключна сацыялістычным светапоглядам «гегемона рэвалюцыі», аспрэчвалі завышаныя ацэнкі ўзроўню рэвалюцыйнасці сялянства і яго апазіцыйнасці адносна вайны, канстатавалі наяўнасць шматлікіх элементаў архаікі ў масавай псіхалогіі і свядомасці працоўных (веры ў добрага цара, абагаўлення носьбітаў вярхоўнай улады, шырокай распаўсюджанасці рэлігійных поглядаў і г. д.)[38]. Падобныя меркаванні не ўпісваліся ў схемы тагачаснай афіцыйнай ідэалогіі, таму былі неўзабаве падвергнуты разгромнай крытыцы.

У Беларускай ССР з другой паловы 1950-х гг. таксама актывізаваліся навуковыя даследаванні перыяду Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі 1917 г., больш грунтоўнай стала іх крыніцавая база. Тым не менш, адносна спрыяльныя магчымасці для навуковай творчасці, што ўзніклі ва ўмовах хрушчоўскай палітычнай «адлігі», не выклікалі ў беларускай гістарыяграфіі прыкметнага абнаўлення звыклых метадалагічных падыходаў і ўстаялых інтэрпрэтацый гістарычнай рэчаіснасці. Значная частка даследаванняў, якія закраналі перыяд Першай сусветнай вайны, па-ранейшаму выконваліся ў рэчышчы «гісторыка-партыйнай» тэматыкі[39]. Галоўным іх аб'ектам заставаліся бальшавіцкія арганізацыі Беларусі і Заходняга фронту. Сутнасным недахопам гэтых прац было тое, што, імкнучыся ў найдрабнейшых дэталях разглядзець гісторыю бальшавіцкага руху на беларускіх землях, савецкія даследчыкі не давалі адказу на прынцыпова важнае пытанне аб ступені ўплыву бальшавікоў на розныя групы мясцовага насельніцтва, а толькі паўтаралі афіцыйныя клішэ. Дзейнасць іншых палітычных партый і рухаў належным чынам не аналізавалася, усе яны разглядаліся як ворагі рэвалюцыі і падвяргаліся знішчальным ацэнкам.

Больш аб'ектыўна праблема тактыкі сацыялістычных партый ў барацьбе за масы распрацавана ў манаграфіі У. Салашэнкі[40]. Асобныя аспекты гісторыі небальшавіцкіх партый, пытанне аб суадносінах партыйных сіл у беларускім нацыянальным руху закраналіся ў публікацыях Н. Каменскай, М. Шкляра, Я. Карнейчыка[41].

З гісторыяй партыйных арганізацый у працах савецкіх даследчыкаў шчыльна ўвязана праблема рабочага руху падчас Першай сусветнай вайны. У пасляваенныя дзесяцігоддзі ў Беларускай ССР было апублікавана некалькі манаграфій на гэтую тэму[42]. Усе яны напісаны ў традыцыйным ключы. Рабочы рух цікавіў іх аўтараў не як самастойны гістарычны феномен, а як асноўная рухаючая сіла, «гегемон» Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтым абумоўлі-

валася абмежаванне храналагічных рамак даследаванняў пераважна толькі 1917 г., а таксама затушоўванне ідэйна-палітычнай неаднароднасці рабочага руху, цяжкасцей і супярэчнасцей у яго развіцці. Ідэалагічная зададзенасць мела вынікам тое, што сфармуляваныя ў названых публікацыях абагульненні і высновы нярэдка супярэчылі прыведзенаму ў іх дакументальнаму матэрыялу.

Даследаванні Л. Ліпінскага і Я. Лук'янава прысвечаны гісторыі сялянскага руху напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны[43]. У іх закранаюцца таксама праблемы памешчыцкага і сялянскага землеўладання ў перыяд вайны, аднак гэты сюжэт грунтуецца толькі на матэрыялах усходняй часткі Беларусі (акупаваныя немцамі Гродзенская і беларускія паветы Віленскай губ. засталіся па-за ўвагай аўтараў). Выступленні сялян класіфікуюцца ў манаграфіях паводле іх накіраванасці супраць памешчыкаў, дзяржаўнай улады, кулакоў. Пры гэтым у разрад класавых выступленняў сялян беспадстаўна залічаны ўсе без выключэння падпалы будынкаў, забойствы памешчыкаў і іх службоўцаў, у тым ліку ажыццёўленыя з чыста крымінальнымі мэтамі. Аўтары робяць акцэнт на дзейнасць сярод сялянскіх мас сацыял-дэмакратычных арганізацый, але аналагічную працу іншых рэвалюцыйных партый замоўчваюць.

Прыкметнай з'явай у беларускай савецкай гістарыяграфіі часоў палітычнай «адлігі» стала манаграфія І. Ігнаценкі «Бяднейшае сялянства – саюзнік пралетарыяту ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі (1917–1918 гг.)». Яе змест выходзіць за рамкі тэмы, абазначанай у назве, і фактычна адлюстроўвае ўвесь спектр грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі акрэсленага перыяду. Сярод іншых сюжэтаў у манаграфіі характарызуецца тактычная лінія палітычных партый у 1917–1918 гг. Упершыню ў савецкай гістарыяграфіі зроблена спроба даць разгорнуты сацыяльна-класавы аналіз беларускага нацыянальна-палітычнага руху[44].

Узровень беларускай савецкай гістарыяграфіі першых пасляваенных дзесяцігоддзяў, супярэчлівыя тэндэнцыі ў яе развіцці адлюстравала калектыўная манаграфія пра перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце, выдадзеная да 50-годдзя гэтай падзеі[45]. Кніга ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял пра сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны, асвятляе падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і абстаноўку ў Беларусі і на Заходнім фронце пасля яе перамогі. На падставе падрабязнага апісання рэвалюцыйных паводзін рабочых, сялян і салдатаў

аўтары імкнуцца давесці, што прыход да ўлады бальшавікоў у кастрычніку 1917 г. заканамерна вынікаў з грамадска-палітычнай барацьбы ў папярэднія месяцы і адпавядаў карэнным інтарэсам і спадзяванням працоўных. Такая ідэалагічная зададзенасць прадвызначыла структуру кнігі, усе яе падагульненні і высновы. У манаграфіі выразна перабольшваецца роля ў кастрычніцкіх падзеях 1917 г. мясцовага пралетарыяту і ў той жа час недаацэньваецца актыўнасць салдат Заходняга фронту. Вельмі схематычна адлюстравана эвалюцыя палітычных настрояў беларускага «працоўнага» сялянства, якое нібыта хутка пазбаўлялася «дробнабуржуазных ілюзій» і безаглядна пераходзіла на бок бальшавікоў. Недахопам працы з'яўляецца амаль поўнае ігнараванне беларускага нацыянальнага пытання. Са старонак кнігі Беларусь паўстае звычайным расійскім рэгіёнам без ніякай нацыянальнай спецыфікі, праблема самавызначэння беларускага народа не закранаецца. Агульная выснова аўтараў была сфармулявана ў поўнай адпаведнасці з афіцыйнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі: «Пытанне аб уладзе, галоўнае пытанне Кастрычніцкай рэвалюцыі, у беларускіх губернях, як і ва ўсёй Расіі, было вырашана на карысць рабочых і працоўных сялян, якія паўсталі супраць панавання буржуазіі і памешчыкаў»[46].

У 1970–1980-я гг. савецкая гістарычная навука развівалася даволі супярэчліва. З аднаго боку на яе стан выразны адбітак накладвалі ўмовы «эпохі застою». Назіралася дагматызацыя «марксісцка-ленінскіх» метадалагічных установак, кансерваваліся састарэлыя навуковыя пастулаты. У даследаваннях па эканамічнай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны штучна падкрэсліваўся дыктат манаполій. Усе выступленні супраць вайны трактаваліся як рэвалюцыйныя, перабольшвалася роля рабочага класа і бальшавікоў. З другога боку, для названага перыяду развіцця гістарычнай навукі характэрна большая маштабнасць і рознабаковасць даследаванняў, выкарыстанне новых дакументальных матэрыялаў. Аб'ектам даследчыцкай увагі гісторыкаў сталі новыя сюжэты айчыннай гісторыі.

У гэты перыяд акрэслілася цікавасць даследчыкаў да вывучэння міжнароднага кантэксту падзей у Беларусі ў перыяд сусветнай вайны. Наватарскай у гэтым сэнсе была дысертацыйная праца А. Бабкова[47]. Аўтар упершыню ў гістарыяграфіі прааналізаваў планы розных грамадска-палітычных сіл Германіі адносна Беларусі, даследаваў акупацыйны рэжым, эканамічную палітыку немцаў на занятай тэрыторыі, паспрабаваў даць ацэнку іх захадам у нацыянальна-культурнай сферы.

Больш традыцыйна выглядала апублікаваная ў 1981 г. манаграфія Э. Савіцкага па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. уключна)[48]. Аўтар ставіў перад сабой задачу «паказаць на канкрэтным матэрыяле сапраўдную глыбіню рэвалюцыйнага крызісу, сілу і размах класавай барацьбы беларускага народа супраць царызму, буржуазіі і памешчыкаў у гады вайны»[49]. Даследчыкам уведзены ў навуковы ўжытак і прааналізаваны шэраг новых крыніц пра сацыяльную актыўнасць рабочых, сялян і салдацкіх мас. Асаблівая ўвага ў кнізе надавалася «раскрыццю дзейнасці бальшавікоў па ўмацаванні саюза рабочага класа і сялянства, мабілізацыі працоўных мас на рэвалюцыйную барацьбу». У адпаведнасці з такой устаноўкай у кнізе выкладаецца канкрэтны гістарычны матэрыял.

Этапным рубяжом у вывучэнні савецкімі даследчыкамі гісторыі беларускай дзяржаўнасці XX ст. стала фундаментальная манаграфія В. Круталевіча «Нараджэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі»[50]. У першай частцы гэтай працы адлюстраваны ўплыў Першай сусветнай вайны на пастаноўку і шляхі вырашэння праблемы беларускай дзяржаўнасці, паказаны стан і ўнутраная дыферэнцыяцыя беларускага нацыянальнага руху, аналізуецца палітыка германскіх акупацыйных улад і бальшавіцкіх органаў па беларускім пытанні. Нягледзячы на тое, што праца В. Круталевіча не пазбаўлена тагачасных афіцыйных ідэалагем, яе вылучае высокі прафесіяналізм, уніклівы аналіз шырокага кола архіўных дакументаў і друкаваных крыніц.

Важкім укладам у вывучэнне барацьбы партыйна-палітычных сіл у Беларусі ў час рэвалюцыі 1917 г. і ў наступны перыяд зрабіліся працы М. Сташкевіча. У цэнтры ўвагі даследчыка знаходзілася праблема адносін розных палітычных партый і рухаў да ідэі стварэння беларускай дзяржаўнасці[51].

Новымі даследаваннямі напоўнілася літаратура аб рэвалюцыйных падзеях 1917 г., якія разглядаліся (у той ці іншай ступені) у кантэксце працэсаў, выкліканых Першай сусветнай вайной. У манаграфіі І. Ігнаценкі ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі спецыяльным аб'ектам вывучэння стала Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.[52]. Яна паказана як заканамерны вынік распаду ў гады вайны эканамічнага арганізма, пагаршэння становішча шырокіх мас насельніцтва, абвастрэння сацыяльна-класавых адносін.

П. Башко апублікаваў даследаванне па гісторыі саветаў Беларусі ў перыяд рэвалюцыі, дзе паспрабаваў высветліць іх класавую

сутнасць, ролю і значэнне ў рэвалюцыйным руху, у перамозе бальшавікоў[53]. Дакументальны матэрыял, прыведзены ў кнізе, сведчыць пра вельмі значную ролю вайскоўцаў Заходняга фронту ва ўтварэнні і дзейнасці саветаў у Беларусі, хоць аўтар, кіруючыся тагачаснай афіцыйнай устаноўкай аб гегемоніі пралетарыяту ў рэвалюцыі, пазбягае падобнай высновы. Падрыхтаваная ўжо на схіле савецкай эпохі манаграфія М. Смалянінава прасочвае эвалюцыю сацыяльнай свядомасці салдат Заходняга фронту ў 1917 г. з гледзішча таго, «як у выніку набыванага салдатамі практычнага досведу і ідэалагічнага ўздзеяння партыі бальшавікоў адбывалася ўспрыняцце імі ленінскага курсу на сацыялістычную рэвалюцыю»[54].

Падсумаванне напрацовак беларускай савецкай гістарыяграфіі пасляваенных дзесяцігоддзяў было ажыццёўлена ў фундаментальным акадэмічным выданні – «Гісторыя Беларуская ССР» у пяці тамах. Другі том гэтага выдання ўтрымлівае раздзел «Беларусь у перыяд Першай сусветнай вайны. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя» (аўтары Я. Карнейчык і Ц. Саладкоў). У адпаведнасці з ленінскай канцэпцыяй імперыялізму Першая сусветная вайна кваліфікуецца аўтарамі як «вайна за перадзел свету і сферу ўплываў». Палітычнай прычынай яе развязання называецца «імкненне імперыялістаў задушыць узрослы за апошняе дзесяцігоддзе магутны рэвалюцыйны рух»[55]. Даволі падрабязна, але са спрашчэннямі паказана становішча ў беларускіх губернях у першыя гады вайны. Так, у якасці прычын спаду рэвалюцыйнага руху ў 2-й палове 1914 г. называюцца толькі «жорсткія рэпрэсіі» і «масавыя мабілізацыі рабочых і сялян», але замоўчваецца прыкметны ўздым ваенна-патрыятычных, шавіністычных настрояў, якія ахапілі шырокія масы насельніцтва, у тым ліку рабочых. Сцвярджэнне, што ўжо ў той момант пралетарыят «адкрыта выступіў супраць вайны» выглядае галаслоўным. У кнізе адлюстраваны баявыя дзеянні на расійска-германскім фронце 1914–1915 гг., рэалістычна паказаны драматычны лёс бежанцаў. Пры гэтым заўважаецца імкненне аўтараў прыменшыць намаганне ўрадавых устаноў і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанскай масе. Вялікі фактычны матэрыял прыцягнуты аўтарамі для характарыстыкі нямецкага акупацыйнага рэжыму ў заходняй частцы Беларусі, неад'емнымі атрыбутамі якога былі рэквізіцыі, разнастайныя штрафы і іншыя паборы з насельніцтва, вываз людзей на работы ў Германію. Але пытанне нацыянальна-культурнай палітыкі акупацыйных улад, якая вызначалася большай гнуткасцю, у кнізе

не закранаецца. Пры гэтым на ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, што засталіся на акупаванай тэрыторыі, навешваюцца шаблонныя абвінавачванні ў іх імкненні «садзейнічаць перамозе германскай зброі», ператварыць Беларусь у «калонію германскага імперыялізму» і г. д.

У трэцім томе пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР» у раздзеле, што храналагічна адпавядаюць перыяду Першай сусветнай вайны[56] асноўная ўвага надаецца рэвалюцыйнаму руху, барацьбе бальшавікоў за заваяванне і ўтрыманне ўлады. Падзеі Першай сусветнай вайны служаць толькі гістарычным фонам для асвятлення названых сюжэтаў. У аналагічным ключы разглядаецца перыяд Першай сусветнай вайны ў шматтомных падагульняючых працах па гісторыі рабочага класа і сялянства Беларусі[57].

Пасля распаду Савецкага Саюза ўмовы гістарыяграфічнага працэсу кардынальна змяніліся. Пачалося пераасэнсаванне старых пастулатаў, адмова ад схематычных уяўленняў, падпарадкаваных палітычнаму заказу. Прыкметна выросла на постсавецкай прасторы і цікавасць да Першай сусветнай вайны – асабліва з боку расійскіх даследчыкаў. З 1992 г. у Расіі дзейнічае Асацыяцыя гісторыкаў Першай сусветнай вайны. За мінулае дзесяцігоддзе асацыяцыяй было арганізавана мноства канферэнцый, сімпозіумаў, калоквіумаў і «круглых сталоў» з удзелам навукоўцаў не толькі з Расіі, але і з іншых краін. Многія матэрыялы гэтых навуковых форумаў апублікаваны[58].

У цэнтры ўвагі іх удзельнікаў былі розныя аспекты праблемы «вайна, чалавек і грамадства». У прыватнасці, пытанні аб ўзрастанні ў гады вайны ролі гвалту, абсалютызацыі сілавых метадаў вырашэння сацыяльных праблем, зараджэнні таталітарных тэндэнцый; аб масавай мабілізацыі мужчын у войска і ўцягненні жанчын і падлеткаў у вытворчасць як спецыфічных, антыгуманных спосабах сацыялізацыі, аб дэпартацыях і бежанстве з тэатра ваенных дзеянняў у кантэксце феномена маргіналізацыі насельніцтва; аб выкліканай вайною дэмаграфічнай катастрофе; аб сацыяльна-класавым расколе грамадства і нарастанні партыйна-ідэалагічнай нецярпімасці; аб уплыве вайны на рост этнічнай самасвядомасці, феномене палітызацыі этнічнасці; аб разгортванні нацыянальных рухаў, распадзе імперый і ўтварэнні новых нацыянальных дзяржаў. Усе гэтыя сюжэты вельмі актуальныя і для вывучэння гісторыі Беларусі.

Расійскі даследчык С. Неліповіч прыцягнуў увагу да такой недаследаванай раней з'явы, як дэпартацыя расійскімі ўладамі

падданых Германіі і Аўстра-Венгрыі з заходніх губерняў углыб імперыі. Пры гэтым аўтар падкрэслівае непадрыхтаванасць ваеннай і цывільнай адміністрацыі да арганізацыі руху і ўладкавання дэпартаванага насельніцтва, адзначае адмоўныя вынікі высялення мірных жыхароў для ўнутранага становішча краіны[59].

Цікавасць з боку сучасных расійскіх гісторыкаў выклікае праблема бежанства часоў Першай сусветнай вайны. У публікацыях А. Курцава, напрыклад, разглядаюцца пытанні руху і ўмоў пражывання бежанцаў на новых месцах, арганізацыі для іх дзяржаўнай дапамогі, узаемаадносін бежанцаў з мясцовым насельніцтвам, агульнай колькасці бежанцаў і іх нацыянальнага складу. Значная ўвага надаецца дзейнасці ўстаноў па аказанні дапамогі бежанцам: Таццянінскага камітэту, мясцовай адміністрацыі, галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах, нацыянальных арганізацый[60].

Тэма бежанства пачынае займаць прыкметнае месца і ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Сярод беларускіх даследчыкаў адным з першых да праблематыкі бежанства звярнуўся А. Мікалаевіч[61]. У яго артыкулах ператварэнне значнай колькасці насельніцтва ў бежанцаў разглядаецца як сапраўдная катастрофа беларускага народа. Аўтар робіць акцэнт на прымусовым характары высялення насельніцтва, падкрэслівае жудаснае становішча бежанцаў, іх неўладкаванасць на новым месцы жыхарства. Закранаючы дзейнасць устаноў па аказанні дапамогі бежанцам, А. Мікалаевіч засяроджвае ўвагу на працы беларускіх нацыянальных арганізацый як у Беларусі, так і ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі.

Плённа даследуе праблему бежанства і А. Бабкоў. Ім уведзена ў навуковы ўжытак шмат новых гістарычных крыніц, у тым ліку дакументы Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва ў Маскве. У артыкулах А. Бабкова даецца агульная характарыстыка бежанства ў 1915–1916 гг., асвятляецца становішча бежанцаў на Гомельшчыне і ў Віцебскай губерні, разглядаецца дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый дапамогі бежанцам. Аналізуючы становішча пацярпелых ад вайны, аўтар паказвае адмоўныя наступствы бежанства, разглядае лёс бежанцаў як чалавечую трагедыю[62].

Лёс беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны стаў прадметам дысертацыйных даследаванняў. Дзейнасць дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам Беларусі ў 1914 – кастрычніку 1917 г. разглядаецца ў кандыдацкай дысертацыі С. Лапановіча. Аўтар аналізуе прычыны ўзнікнення бежан-

ства і яго характэрныя рысы, разглядае эвакуацыйныя дзеянні расійскіх ваенных і цывільных улад на тэрыторыі Беларусі, выяўляе ўдзел розных дзяржаўных устаноў і недзяржаўных арганізацый у справе дапамогі бежанцам[63].

У дысертацыі В. Утгоф аналізуецца сацыяльны, полаваўзроставы, рэлігійны склад беларускіх бежанцаў; даследуецца іх матэрыяльнае становішча, шляхі і формы эвакуацыі і рээвакуацыі; разглядаецца палітыка дзяржаўнай улады па стварэнні сістэмы дапамогі бежанцам, вызначаецца месца ў гэтай сістэме нацыянальных арганізацый; выяўляюцца асаблівасці і спецыфіка дзейнасці беларускіх нацыянальных арганізацый дапамогі пацярпеламу ад вайны насельніцтву[64].

Асаблівасці руху бежанцаў праз Беларусь, звязаныя з неаднароднасцю іх этнічнага складу, разглядаюцца ў артыкуле С. С. Рудовіча[65].

Новыя для беларускай гістарыяграфіі праблемы ставяцца ў дысертацыі В. Карнялюка «Фактары гісторыка-дэмаграфічных змен у складзе насельніцтва Беларусі ў 1913–1918 гг.». У якасці такіх фактараў называецца мабілізацыя мужчынскай часткі насельніцтва ў войска, бежанства і эвакуацыя. Зроблена спроба вызначыць колькасць мабілізаваных і бежанцаў з пяці заходніх губерняў. На думку В. Карнялюка, колькасць мабілізаваных з 5 губерняў за перыяд 1914–1918 гг. склала 0,9 млн чалавек (8,3% ад лічбы даваеннага насельніцтва гэтых губерняў, якую аўтар вызначае як 10,8 млн).

В. Карнялюк спрабуе размежаваць паняцці «бежанства» і «эвакуацыя». Пад бежанствам аўтар разумее сыход насельніцтва з месца пастаяннага жыхарства, а пад эвакуацыяй – вываз людзей пры пэўнай арганізацыі і кантролі. Вывучэнне сацыяльнага становішча беларусаў-бежанцаў прывяло В. Карнялюка да высновы аб іх маргінальным статусе, што, на думку даследчыка, садзейнічала росту іх нацыянальнай самасвядомасці[66]. Шляхам складаных падлікаў даследчык прыйшоў да высновы, што ў цэлым з Беларусі ў бежанства сышлі каля 2 млн чалавек, але гэтая лічба з'яўляецца ацэначнай і патрабуе дакументальнага абгрунтавання.[67] У якасці прычын выхаду людзей у бежанства аўтар вызначае: планавае высяленне; згон пад прымусам з мэтай вызвалення тэрыторыі для будучых баявых дзеянняў; запалохванне з боку ўлад і праваслаўнай царквы; натуральны страх людзей перад вайной. У дысертацыйнай працы В. Карнялюка зроблена спроба прасачыць эвалюцыю настрояў бежанцаў падчас іх працяглага знаходжання ўдалечыні ад родных мясцін. Адзначаецца супярэчлівасць у паводзінах

і настроях бежанцаў і эвакуіраваных з беларускіх губерняў (недавер да любых улад, але вымушаная неабходнасць звяртацца да гэтых улад для вырашэння жыццёвых праблем; няўпэўненасць у новых, нярэдка экстрэмальных умовах, і актыўнасць у пошуках спосабаў і сродкаў выжывання; палітычная дэзарыентаванасць і пэўная актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці – галоўным чынам для дасягнення мэты вярнуцца на радзіму; станоўчыя ўражанні ад добразычлівасці мясцовага насельніцтва і ўзмацненне пачуцця сваёй этнічнай адметнасці ад карэнных жыхароў унутраных губерняў імперыі).

З канца 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. прыярытэтнае месца ў гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны заняла праблема нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа. Актывізацыі навуковых даследаванняў у гэтым напрамку садзейнічала перавыданне прац дзеячаў беларускага нацыянальнага руху (Я. Варонкі, А. Луцкевіча, А. Цвікевіча і інш.).

У 1989 г. М. Сташкевіч выступіў з аспрэчваннем поглядаў тых гісторыкаў, якія лічылі БНР марыянеткай у руках кайзераўскай Германіі. На думку даследчыка, БНР не магла быць марыянеткавай дзяржавай, паколькі яна наогул не з'яўлялася дзяржавай у поўным сэнсе гэтага слова: не мела свайго войска, органаў улады на месцах, не была вызначана яе тэрыторыя і межы, не было правамоцнай адказнасці яе кіраўнічых структур. Паводле М. Сташкевіча, БНР была не дзяржавай, а ідэяй дзяржаўнасці, якую намагаліся рэалізаваць «радаўскія дзеячы», спадзеючыся на падтрымку знешніх сіл, у прыватнасці – Германіі[68].

Абноўленыя погляды на гісторыю нараджэння на схіле Першай сусветнай вайны сучаснай беларускай дзяржаўнасці абнародваў у 1992 г. акадэмік І. М. Ігнаценка ў манаграфіі «Кастрычніцкая рэвалюцыя і самавызначэнне Беларусі». У адрозненне ад сваіх ранейшых публікацый, у названай манаграфіі аўтар не адмаўляў рэальнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, але адначасова рабіў акцэнт на тым, што яна не атрымала масавай падтрымкі. Спрабуючы выявіць прычыны такога становішча, І. Ігнаценка пісаў: «…Трэба думаць, БНР успрымалася народам як фармаванне, створанае групай інтэлігентаў неканстытуцыйным шляхам»[69]. Аднак дадзенае меркаванне не выглядае пераканаўчым, бо пры нізкім узроўні прававой культуры асноўная маса насельніцтва наўрад ці кіравалася крытэрыем канстытуцыйнасці/неканстытуцыйнасці той або іншай структуры.

Больш дыялектычна ацэньвае І. Ігнаценка адносіны кіраўнічых структур БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі. На яго

думку, пакуль у Радзе БНР колькасна пераважалі сацыялісты, Германія досыць непрыхільна ставілася да гэтага ўтварэння. Пасля таго, як Рада стала кааліцыйным органам з перавагай кансерватыўных сіл, давер да яе з боку германскага камандавання павысіўся.

У 1992 г. было апублікавана даследаванне Р. Платонава і М. Сташкевіча, прысвечанае генезісу беларускай дзяржаўнасці[70]. Аўтары дадзенай працы таксама прызналі факт існавання Беларускай Народнай Рэспублікі. Але, на іх думку, БНР пацярпела крах з-за ізаляванасці яе дзеячаў ад народа, захопленага ідэяй Саветаў. Відавочна, дадзеная канстатацыя не вычэрпвае сутнасці праблемы, бо не ўскрывае глыбінных прычын падобнай палітычнай арыентацыі насельніцтва тагачаснай Беларусі.

Частка гісторыкаў і ў 90-я гг. заставалася на пазіцыях савецкай гістарыяграфіі. П. Петрыкаў катэгарычна адмаўляе існаванне беларускай дзяржаўнасці ў 1918 г. Паводле яго ўяўлення, БНР узнікла без юрыдычнай падставы і не з'яўлялася дзяржавай, таму сцвярджэнні аб легітымнасці БНР скажаюць гістарычную карціну[71].

У пачатку новага стагоддзя апублікавана манаграфія С. Рудовіча, у якой робіцца спроба разгледзець тэндэнцыю да нацыянальна-дзяржаўнага самасцвярджэння беларусаў у 1917 г. у кантэксце выкліканага рэвалюцыяй працэсу распаду Расійскай імперыі[72].

Шырокі спектр пытанняў генезісу беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. застаецца ў цэнтры даследчыцкай увагі В. Круталевіча[73]. Арганічна працягваючы ранейшыя працы, аўтар у апошніх сваіх публікацыях паглыбляе вывучэнне праблемы на новай аснове. Шмат месца ў іх адведзена характарыстыцы апазіцыйных да бальшавіцкай улады палітычных сіл, дзейнасць якіх прывяла да абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Закранаючы пытанне аб дачыненні Германіі да абвяшчэння БНР, даследчык паказвае, што германскі ўрад кіраваўся інтарэсамі ўмацавання акупацыйнага рэжыму, імкнуўся да максімальнай эксплуатацыі сыравінных і харчовых рэсурсаў Беларусі. Заключыўшы Брэсцкі мір, які расчляняў Беларусь на некалькі частак, кайзераўская Германія не збіралася дзяліцца ўладай з якой-небудзь паралельнай структурай, і таму не прызнала Беларускай Народнай Рэспублікі. Акупацыйная адміністрацыя не дапусціла ўтварэння беларускага войска, чым асудзіла на няўдачу палітычныя мэты і ідэалы заснавальнікаў БНР. На думку В. Круталевіча, гэта выразна сведчыць, што Германія не мела дачыненняў да абвяшчэння ў сакавіку 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі.

Гісторыя беларускага нацыянальнага руху, станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці стала ў апошнім дзесяцігоддзі тэмай некалькіх дысертацыйных даследаванняў. У дысертацыі М. Цубы «Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907–1917 гг.)» тры раздзелы з шасці прысвечаны перыяду Першай сусветнай вайны. Аўтар коратка характарызуе палітыку царызму па абмежаванні грамадскай дзейнасці ў прыфрантавой паласе (забарона шэсцяў, увядзенне ваеннай цэнзуры і г. д.). Робіцца спроба прааналізаваць адносіны да вайны розных грамадскіх колаў у Беларусі. Для гэтага аналізуюцца матэрыялы беларускай прэсы, неперыядычных выданняў. Прасочваецца дзейнасць непалітычных нацыянальных арганізацый дабрачыннай накіраванасці (таварыстваў дапамогі пацярпелым ад вайны). Асобны раздзел прысвечаны дзейнасці беларускіх актывістаў на акупаванай немцамі тэрыторыі. Пры гэтым у навуковы ўжытак уводзяцца некаторыя дробныя факты. Аднак у цэлым праца грунтуецца на агульнавядомых матэрыялах і не вызначаецца ні шырокай базай крыніц, ні новымі канцэптуальнымі падыходамі.

Дысертацыя М. Шчаўлінскага спецыяльна прысвечана гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны[74]. Яна ўключае раздзелы пра нацыянальны рух ад пачатку вайны да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.; развіццё нацыянальнага руху з сакавіка па кастрычнік 1917 г.; размежаванне ў беларускім нацыянальным руху пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі; становішча ў нацыянальным руху на завяршальнай стадыі вайны. Меркаванні і высновы аўтара не выклікаюць прынцыповых пярэчанняў. Але, як і папярэдняе, дадзенае дысертацыйнае даследаванне грунтуецца на добра вядомых даследчыкам матэрыялах, таму можа разглядацца толькі як падагульненне напрацовак па дадзенай тэме, зробленых папярэднікамі.

У кандыдацкай дысертацыі Т. Паўлавай разглядаецца знешнепалітычная дзейнасць БНР[75]. Цікавымі ўяўляюцца разважанні даследчыцы наконт прычын, якія выклікалі ў Рады БНР ілюзіі аб магчымай падтрымцы новаабвешчанай беларускай дзяржавы з боку Германіі. На думку Т. Паўлавай, гэтаму паспрыяла прызнанне Германіяй незалежнасці Украіны, а таксама падтрымка Літоўскай Тарыбы і антыбальшавіцкай улады на Каўказе. Такія дыпламатычныя дэмаршы Германіі нараджалі надзеі, што аналагічныя крокі будуць зроблены і ў дачыненні да Беларусі.

Нягледзячы на пашырэнне ў апошнія 10–15 гадоў тэматычнага дыяпазону даследаванняў, узбагачэнне базы крыніц, разняво-

ленне творчай думкі навукоўцаў, у беларускай гістарыяграфіі адсутнічае падагульняючая праца, у якой комплексна і ўсебакова асвятлялася б гісторыя Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны. Паводле сваёй назвы на ролю такога падагульняючага даследавання магла б прэтэндаваць кніга эмігранцкага гісторыка Ю. Весялкоўскага «Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс)»[76]. Але па сутнасці кніга ўяўляе сабой не цэльную працу, а зборнік навукова-папулярных нарысаў, змест якіх не ў поўнай меры адпавядае тэме, абазначанай у назве.

У раздзелах кнігі, што ахопліваюць непасрэдна гады сусветнай вайны (1914–1918), зыходным тэзісам аўтара з'яўляецца наступны: у ходзе вайны вялікую вагу набралі нацыянальныя праблемы, прычым не толькі з прычыны разгортвання нацыянальна-вызваленчых рухаў, але і дзякуючы імкненню вялікіх дзяржаў выкарыстаць нацыянальнае пытанне ў сваіх уласных мэтах. У выніку яны стварылі такую сітуацыю, «што і самі не былі задаволены»[77]. Спыняючыся на асаблівасцях нацыятворчага працэсу ў Беларусі, Ю. Весялкоўскі адзначае, што нацыянальнае адраджэнне пачалося тут пазней (чым, напрыклад, у палякаў і ўкраінцаў), і да пачатку сусветнай вайны не змагло ахапіць масы і ўзняць іх на барацьбу за нацыянальнае вызваленне. Усё гэта адмоўна адбілася на арганізацыі і кансалідацыі ў перыяд вайны беларускіх нацыянальных сіл, якія, да таго ж, аказаліся падзеленыя лініяй фронту і раскіданыя па расійскіх абшарах у выніку мабілізацыі ў войска і бежанства. Але «нягледзячы на сваю арганізацыйную кволасць і варожыя абставіны, беларусы арыентаваліся своечасова і адпаведна рэагавалі на ход падзеяў». Закранаючы пытанне аб нацыянальнай палітыцы немцаў на акупаванай тэрыторыі, Ю. Весялкоўскі прызнае, што «гаспадарча, культурна і гуманітарна немцы ставіліся аднолькава да ўсіх нацыяў». Аднак яны ўлічвалі небяспеку міжэтнічных канфліктаў у шматэтнічным краі, таму забаранялі палітычную дзейнасць, імкнуліся «захаваць гэты край у спакоі, каб ён працаваў эканамічна на ваенныя мэты немцаў»[78]. На жаль, эканамічная палітыка германскіх, як і расійскіх улад, ды і ў цэлым сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў гады вайны аўтарам практычна не разглядаецца.

Такім чынам, аналіз айчыннай гістарыяграфіі, прысвечанай гісторыі Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны, дазваляе зрабіць наступныя высновы. У савецкай гістарычнай навуцы гэтая праблема не адносілася да ліку прыярытэтных. Даследчыкі звычайна закраналі яе не як самастойную гістарычную з'яву, а ў

сувязі з даследаваннем перыяду Кастрычніцкай рэвалюцыі як яе пярэдадзень і паскаральнік. Асобныя сюжэты з гісторыі Беларусі перыяду вайны знаходзілі адлюстраванне ў працах, прысвечаных іншым пытанням: гісторыі рэвалюцыйнага руху, сацыяльна-эканамічнаму развіццю, генезісу беларускай дзяржаўнасці. Апісанне баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ўтрымліваюць працы савецкіх ваенных гісторыкаў. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі беларускія даследчыкі звярнуліся да розных аспектаў. Але абагульненая праца яшчэ наперадзе.

---

[1] Я. Великая война. 1915 год. Очерк главнейших операций. Русский Западный фронт. 2-е изд., доп. Пг., 1916; Вильно-Молодеченская операция. Август-сентябрь 1915 г. Пг., 1916.

[2] Гальперин С. Я. Голос солдата // Фронт. 1917. 26 августа; Поручик Ч. Письмо с фронта. 25 авг. 1917 г. 1. Причины неудач // Дело народа. 1917. 16 сент.; Апухтин А. Трагедия армии // День. 1917. 24 окт.

[3] Новое время. 1917. 1(14) янв.; Касимов К. Что сумел и что дал 1917 год. (Военный анализ и обзор) // Власть народа. 1918. 3 янв.; Фишгендлер А. Армия в год революции // Там же.

[4] Организация и условия работы по устройству беженцев Северо-Западного фронта. Пг., 1915; Шведер Е. Беженцы: рассказы из великой войны. М., 1915; Беженцы и выселенцы. М., 1915; Сурина-Масальская Е. А. Записки беженца. Пг., 1916 (перадрук: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Глыбокскага раёна. Мн., 1995. С. 95–102); Кудринский Ф. Людские волны (Беженцы). Пг., 1917 (Скароч. перадрук: Нёман. 1997. № 6. С. 79–193).

[5] Грыневіч В. На рэках Вавілону. (Успамінкі ўцекача) // Бел. шлях. 1918. 22 чэрв.–10 ліп. (Перадрук: Спадчына. 1997. № 4. С. 165–181).

[6] Станкевіч Я. Беларусы-ўцекачы ў Расіі // Гоман. 1917. 12 кастрыч.; Цвікевіч А. Адраджэнне Беларусі і Польшча. Берлін, 1921.

[7] Краўцоў М. Сумныя ўспаміны // Бел. звон. 1921. 2 верас.

[8] Канчер Е. С. Судьбы беженцев // Канчер Е. С. Белорусский вопрос. Пг., 1919. С. 112–121.

[9] Мясников (Мясникян) А. Ф. Избранные произведения. М., 1985; Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи. Мн., 1990; Петров Н. Октябрьские дни в действующей армии // Пролетарская революция. 1925. № 3. С. 201–221; Ён жа. Кастрычніцкі пераварот на Заходнім фронце // Бальшавік Беларусі. 1932. № 17/18. С. 28–51; Фомин В. Съезд депутатов армий и тыла Западного фронта в апреле 1917 г. // Пролетарская революция. 1927. № 4. С. 164–181; Хаткевич М. Гомельская большевистская организация в апреле 1917 г. // Известия Гомельского губкома РКП(б). 1921. № 12. С. 28–30; Он же. Гомельская большевистская организация в сентябре и октябре 1917 г. // Там же. № 15. С. 37–39.

[10] Вардин Ил. Российский пролетариат и мировая война. М., 1924; Каржин А. В. В годы империалистической войны: очерки рабочего дви-

жения в России. М., 1924; Менщицкий И. А. Революционное движение военных годов (1914–1917): Очерки и материалы. М., 1925; Сидоров К. Рабочее движение в России в годы империалистической войны (1914–1917) // Очерки по истории Октябрьской революции. М.; Л., 1927. Т. 1; Шестаков А. В. Очерки по сельскому хозяйству и крестьянскому движению в годы войны и перед Октябрем 1917 г. М., 1927; Крастынь Я. Революционная борьба крестьян в России в годы империалистической войны (1914–1916). М., 1932.

[11] Лелевич Г. Из истории крестьянского движения в Могилёвской губернии накануне Октябрьской революции // Пролетарская революция. 1922. № 11.

[12] Кернажыцкі К. І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мн., 1932.

[13] Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. Коўна, 1920; Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Киев, 1918; Ён жа. Беларусь: Политический очерк. Берлин, 1919; Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Мн., 2003; Езавітаў К. Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада. 25.XI.1917–25.XI.1924 // Крывіч (Коўна). 1924. № 1(7). С. 37–45; 1925. № 9(1). С. 80–93; Ён жа. Першы Усебеларускі кангрэс // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 25–29; Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцьця ў Менску ў 1917–18 гг. // Спадчына. 1997. № 5. С. 18–39; Краўцоў М. [Касцевіч М.]. Усебеларускі з'езд 1917 г. // Бел. звон. 1921. 9–30 верас.

[14] Стары Піліп [Бурбіс А.]. Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху // Вестник Народного комиссариата просвещения ССРБ. 1921. № 1. С. 4–9; № 2. Бел. аддзел. С. 4–10; Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921; Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 4-е выд. Мн., 1926; Ён жа. Гісторыя Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. 3-е выд. Мн., 1928; Жылуновіч З. Два бакі беларускага руху // Полымя. 1923. № 34. С. 69–74; Ён жа. Уступамі да Акцябра (Матэрыялы да гісторыі Савецкай Беларусі) // Тамсама. № 5–6 С. 141–149; № 7–8. С. 86–91; Ён жа. Люты – Кастрычнік у беларускім нацыянальным руху // Беларусь: Нарысы гісторыі, культуры і рэвалюцыйнага руху. Мн., 1924. С. 182–194.

[15] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мн., 1991. С. 174.

[16] Лубны-Герцык Л. Движение населения на территории СССР за время мировой войны и революции. М., 1926.

[17] Волков Е. З. Динамика народонаселения СССР за восемьдесят лет. М.; Л., 1930. С. 71.

[18] Лелевич Г. Октябрь в Ставке. Гомель, 1922.

[19] Лелевич Г. Стрекопытовщина: Страничка из истории контрреволюционных выступлений в годы гражданской войны. 2-е изд. М.; Пб., 1923.

[20] Heltman S. Robotnik polski w rewolucji pazdziernikowej na Białorusi. Mińsk, 1927.

[21] Зайончковский А. М. Первая мировая война. СПб., 2000.

[22] Евсеев Н. Свентянский прорыв (1915 г.). М., 1936; Подорожный Н. Е. Нарочская операция в марте 1916 г. на русском фронте мировой войны. М., 1938.

[23] Агурский С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917 гг.). Мн., 1928. С. 203.

[24] Майзель Ю., Шапавалаў М. Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б. Мн., 1929.

[25] Гаруновіч А. Супроць нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў розных колераў. Мн., 1930; Сянкевіч А. Беларускі нацыянал-дэмакратызм і барацьба беларускай нацдэмакратыі. Мн., 1931; Ён жа. Бальшавікі – арганізатары Кастрычніка ў Беларусі. Мн., 1934; Ён жа. Беларускія нацдэмы – супраць Кастрычніка // Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі. Зб. успамінаў і артыкулаў. Мн., 1934. С. 99–109.

[26] Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1934.

[27] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяння: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.

[28] Ярославский Е. Партия большевиков в период империалистической войны. М., 1945; Беркевич А. Б. Крестьянство и всеобщая мобилизация в июле 1914 г. // Исторические записки. 1947. Т. 23. С. 3–43; Романов Ф. А. Рабочее и профессиональное движение в годы первой мировой войны и второй русской революции (1914 – февраль 1917 г.). М., 1949; Сатюков П. А. Большевистская печать в период империалистической войны и второй революции в России. М., 1951.

[29] Каменская Н. В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Мн., 1946; Рудзіцкі Л., Саладкоў І. Партыя Леніна-Сталіна – стваральнік Беларускай савецкай дзяржавы // Бальшавік Беларусі. 1948. № 11.

[30] Вержховский Д. В., Ляхов Р. Ф. Первая мировая война 1914–1918: Военно-исторический очерк. М., 1964.

[31] История первой мировой войны 1914–1918 гг. М., 1975. Т. 1–2.

[32] Ростунов И. И. Русский фронт первой мировой войны. М., 1976.

[33] Анфимов А. М. Российская деревня в годы первой мировой войны (1914 – февраль 1917). М., 1962. С. 97–98, 104–106, 195.

[34] Сидоров А. Л. Экономическое положение России в годы первой мировой войны. Л., 1973. С. 8–13, 213–219.

[35] Китанина Т. М. Война, хлеб и революция (Продовольственный вопрос в России, 1914 – октябрь 1917 гг.). Л., 1985. С. 51–54.

[36] Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Док-ты и мат-лы. Мн., 1957. Т. 1–2.

[37] В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте: Воспоминания активных участников Октябрьской революции. Мн., 1957.

[38] Волобуев В. П. Пролетариат и буржуазия России в 1917 г. М., 1964; Российский пролетариат: облик, борьба, гегемония. М., 1970; Тютюкин С. В. Война, мир, революция. Идейная борьба в рабочем движении России 1914–1917 гг. М., 1972; Зотова О. И., Новиков В. В., Шорохова Е. В. Особенности психологии крестьянства (Прошлое и настоящее) М., 1983.

[39] Солодков И. И. Большевики Белоруссии в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции (март 1917 – февраль 1918 гг.). Мн., 1957; Зеленовский Ф. А. Большевики Белоруссии в борьбе за союз рабочего класса и беднейшего крестьянства в период подготовки Великой Октябрьской социалистической революции. Гомель, 1957; Мешков Н. М. Борьба большевиков Белоруссии за победу Октябрьской социалистической революции и установление власти Советов. Мн., 1959; Саладкоў Ц. Я. Бальшавікі Беларусі ў перыяд першай сусветнай вайны і другой рускай рэвалюцыі (1914 – сакавік 1917). Мн., 1957; Ён жа. Большевистская газета «Правда» в Белоруссии (1912–1917 гг.). Мн., 1967.

[40] Солошенко В. И. Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии (1903 – март 1917 гг.). Мн., 1981.

[41] Каменская Н. В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. Мн., 1954; Шкляр М. Е. Образование Белорусской ССР и Коммунистической партии Белоруссии // Вопросы истории. 1959. № 1. С. 22–43; Карнейчык Я. Беларуская нацыя: Гістарычны нарыс. Мн., 1969.

[42] Завалееў М. Я., Кручок Р. Р. Рабочы клас Беларусі ў барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мн., 1957; Міхайлаў А. М. Прафсаюзы Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Мн., 1957; Гневко В. Г. Профсоюзы Белоруссии в борьбе за власть Советов. Мн., 1964; Яна ж. Рабочий класс Белоруссии в борьбе за победу Октября (март 1917 – март 1918 гг.). Мн., 1973.

[43] Липинский Л. П., Лукьянов Е. П. Крестьянские движения в Белоруссии в период между двумя революциями (июль 1907 – февраль 1917 гг.). Мн., 1964; Липинский Л. Крестьянское движение в Белоруссии в 1914–1917 гг. Мн., 1975.

[44] Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917–1918 гг.). Мн., 1962.

[45] Победа советской власти в Белоруссии. Мн., 1967.

[46] Победа советской власти в Белоруссии. С. 326.

[47] Бабков А. М. Политика германского империализма в Белоруссии в годы Первой мировой войны. Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1983.

[48] Савицкий Э. М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914 – февраль 1917 гг.). Мн., 1981.

[49] Там жа. С. 4.

[50] Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики (На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 – декабрь 1918 г.). Мн., 1973; Ён жа. Рождение Белорусской Советской Республики (Провозглашение республики. Развертывание национально-государственного строительства. Ноябрь 1918 – февраль 1919 г.). Мн., 1979.

[51] Сташкевіч М. С. Непазбежнае банкруцтва (З гісторыі палітычнага краху нацыяналістычных партый у Беларусі. 1917–1925 гг.). Мн., 1974; Ён жа. На пути к истине (Из истории национально-освободительного

движения в Белоруссии). Мн., 1983; Он же. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии. 1917–1925 гг. Мн., 1985.

[52] Игнатенко И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986.

[53] Башко П. К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март – октябрь 1917 г.). Мн., 1987.

[54] Смольянинов М. М. Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. Мн., 1991.

[55] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 2: Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). Мн., 1972. С. 593.

[56] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.). Мн., 1973.

[57] История рабочего класса Белорусской ССР. Т. 1: Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. Мн., 1983; История рабочего класса Белорусской ССР. Т. 2: Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917–1937 гг.). Мн., 1985; Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 2. Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мн., 2002.

[58] Первая мировая война: Дискуссионные проблемы истории. М., 1994; Первая мировая война и участие в ней России. М., 1997; Первая мировая война: Пролог XX века. М., 1998; Россия и Первая мировая война (материалы международного коллоквиума). СПб., 1999; Первая мировая война: История и психология. СПб., 1999; Актуальные вопросы российской истории: Мат-лы XXIII Всероссийской заочной конференции. СПб., 2001; Последняя война императорской России. СПб., 2002.

[59] Нелипович С. Г. Репрессии против подданных «центральных держав»: Депортации в России в 1914–1918 гг. // Военно-исторический журнал. 1996. № 6. С. 32–42; Ён жа. Генерал от инфантерии Н. Н. Янушкевич: «Немецкую пакость уволить и без нежносцей…»: Департации в России 1914–1918 гг. // Там же. 1997. № 1. С. 42–53.

[60] Курцев А. Н. Беженство // Россия и Первая мировая война (материалы международного научного коллектива). СПб., 1999; Ён жа. Беженцы Первой мировой войны в России (1914–1917) // Вопросы истории. 1999. № 8. С. 98–113.

[61] Мікалаевіч А. Бежанцы // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3. С. 60–61; Ён жа. Бежанцы першай сусветнай вайны // Спадчына. 1994. № 3. С. 17–21.

[62] Бабков А. М. Беженцы в Белоруссии в годы первой мировой войны (1915–1916) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: Новыя канцэпцыі і падыходы. Ч. 2: Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 131–138; Ён жа. Бежанцы на Гомельшчыне ў гады Першай сусветнай вайны (1915–1916) // Гомельшчына: старонкі мінулага. Нарысы. Гомель, 1996. Вып. 2. С. 78–83; Ён жа. Беженцы на Витебщине в годы первой мировой войны // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность). Витебск, 2001. С. 349–352.

[63] Лапановіч С. Ф. Дзейнасць дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 гг.). Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2002.

[64] Утгоф В. С. Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914–1922 гг. Автореф. дис. … канд. ист. наук. СПб., 2003.

[65] Рудовіч С. С. Рух бежанцаў у гады Першай сусветнай вайны праз Беларусь: этнанацыянальныя аспекты // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Гродна, 2003. Ч. 2. С. 135–142.

[66] Карнялюк В. Р. Факты гісторыка-дэмакратычных змен у складзе насельніцтва Беларусі ў 1913–1918 гг. Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2001; Ён жа. Маргінальнасць бежанцаў-беларусаў Першай сусветнай вайны як фактар росту іх нацыянальнай самасвядомасці // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. Гродно, 2000. С. 312–321.

[67] Ён жа. Праблема гісторыка-дэмаграфічнай характарыстыкі бежанцаў з беларускіх зямель (1914–1918 гг.) // Веснік Гродзенскага дзярж. ун-та. Серыя 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія і сацыялогія. 2000. № 2. С. 24.

[68] Сташкевіч М. На зломе часу // Маладосць. 1989. № 8. С. 150–163.

[69] Игнатенко И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992. С. 110.

[70] Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе // Нёман. 1992. № 10. С. 129–155; № 11. С. 131–161.

[71] Петриков П. Т. Была ли БНР государством? // Славянский набат. 1994. 25 марта.

[72] Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мн., 2001.

[73] Круталевич В. А. На путях национального самоопределения БНР – БССР – РБ. Мн., 1995; Ён жа. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922). 2-е изд. Мн., 2003.

[74] Шавлинский Н. Б. Белорусское национальное движение в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.) Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1999.

[75] Павлова Т. Я. Внешнеполитическая деятельность БНР в 1918–1920. Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2001.

[76] Весялкоўскі Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс). Беласток; Лёндан, 1996.

[77] Там жа. С. 207.

[78] Там жа. С. 92.

Раздзел 4

РЫНАК БЕЛАРУСІ: АСВЯТЛЕННЕ ПРАБЛЕМЫ Ў ПРАЦАХ ЭКАНАМІСТАЎ І ГІСТОРЫКАЎ

4.1. Інстытуцыялізацыя праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі

Для Беларусі XX ст. было часам барацьбы за нацыянальную дзяржаўнасць. Пошукі адказу на пытанне: «Чаму ў пачатку XX ст. так і не была практычна рэалізавана ідэя набыцця нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці?» – з'яўляюцца адной з самых актуальных тэм беларускай гістарыяграфіі апошніх двух дзесяцігоддзяў. Асноўная ўвага звяртаецца на палітычныя і нацыянальна-культурныя аспекты гэтай праблемы. У ценю застаецца яе эканамічны складнік. Яшчэ менш даследаваны суадносіны ідэалогіі беларускага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння і рэальных задач эканомікі Беларусі, месца эканамічных пытанняў у асноўным рэчышчы беларускай нацыянальнай ідэі, гістарычная перспектыва поглядаў беларускіх ідэолагаў на эканамічныя падмуркі беларускай дзяржаўнасці.

Што ж уяўляла сабой беларуская народная гаспадарка ў XIX – пачатку XX ст.? Ці адпавядала рэчаіснасці сцвярджэнне савецкай гістарыяграфіі, што Беларусь была адсталай аграрнай ускраінай Расійскай імперыі, з рэдкімі выспамі прамысловасці. Зрэшты, тэзіс аб эканамічнай адсталасці Беларусі актыўна падтрымліваўся і праціўнікамі савецкай улады, але толькі як сведчанне яе «каланіяльнага» статуса. У гэтым абодва пункты гледжання па сутнасці змыкаюцца. Паспрабуем разамкнуць гэтае кола.

XIX – пачатак XX ст. адзначаны досыць значнымі трансфармацыямі ў сацыяльна-эканамічным жыцці Расійскай імперыі, якія закранулі яе тэхнічна-арганізацыйныя асновы. У гэтых адносінах першаснае значэнне мела нараджэнне фабрычна-заводскай вытворчасці, будаўніцтва чыгунак і акцыянаванне капіталу. Усё гэта мела важкія сацыяльныя наступствы: ішло фарміраванне, як пралетарыяту, так і буржуазіі, у тым ліку і яе эліты – прадпрымальнікаў. На старым малюнку традыцыйнага аграрнага грамадства ўсё больш выразна праступалі рысы новага – індустрыяльнага свету.

Беларусь не стаяла ў баку ад гэтага працэсу. Прычым трансфармацыя, што назіралася на агульнарасійскім узроўні, шчыльна перапляталася тут са складаным працэсам адаптацыі беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Да стварэння ўласнай структураванай эканамічнай прасторы Беларусь ішла стагоддзямі. Асабліва інтэнсіўна гэты працэс назіраўся ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У той час абазначыліся і некаторыя яго вынікі.

Да «Вялікіх рэформаў», што адбываліся ў Расійскай імперыі ў 1860–1870-х гг., Беларусь была аграрным грамадствам з элементамі гандлёвага капіталізму. Пазней, да самага пачатку Першай сусветнай вайны, яна зазнала мадэрнізацыю гэтага грамадства, якая, з рознай ступенню інтэнсіўнасці працякала ў эканамічнай, сацыяльнай, культурнай і палітычнай сферах. Пры гэтым на зломе XIX–XX стст. у Беларусі склаўся практычна ўвесь «будаўнічы набор» для станаўлення індустрыяльнага грамадства. Праўда, асобныя яго элементы толькі абазначылі сваю прысутнасць і існавалі хутчэй як патэнцыял, не вызначыўшы ў поўнай меры ні свае магчымасці, ні рэальную моц на будучыню. Перашкаджала адсутнасць беларускай дзяржаўнасці, стварэнне якой стала галоўнай нацыянальнай праблемай пачатку XX ст. Такім чынам, калі канец XVIII – 50-я гг. XIX ст. стваралі эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі[1], а другая палова XIX ст. забяспечыла эканамічную глебу для яе станаўлення, то ў пачатку XX ст. народная гаспадарка Беларусі была цалкам здольная выканаць ролю эканамічнага складніка нацыянальнай дзяржаўнасці[2].

У XIX – пачатку XX ст. эканамічныя поспехі былі непарыўна звязаныя з рынкавай эканомікай, якая, адначасова, стала адным з найбольш моцных фактараў кансалідацыі грамадства. Рынак не проста з'яднаў эканамічныя намаганні асобных індывідаў, ён, пры адсутнасці ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці, паступова займаў сваё месца ў шэрагу такіх традыцыйных індыкатараў і інтэгратараў соцыуму і нацыянальнага адзінства, як мова і культура.

Першая сусветная вайна і наступныя гістарычныя падзеі падвялі рысу асобнаму цыклу эканамічнага развіцця Беларусі. Цыклу, які магчыма назваць «першай індустрыялізацыяй». Менавіта тады быў створаны яе эканамічны падмурак, які значна трансфармаваўся ўжо потым, на працягу XX ст., у новых гістарычных умовах.

Што ёсць рынак? У чым заключаецца розніца паміж эканамістам, сацыёлагам і гісторыкам у разуменні рынку? Гэтыя пытанні непазбежна паўстаюць пры разглядзе рынку як гістарычнай катэгорыі. Для эканаміста, які зыходзіць з класічных палажэнняў

эканамічнай навукі, рынак – гэта «грамадства прадпрымальнікаў як цэласная існая сістэма, якая самаарганізуецца, выконвае функцыю грамадскага арганізатара грамадскай вытворчасці, і якая ажыццяўляе макрагаспадараннe»[3]. Глядзець на рэчы з пункту погляду эканаміста – гэта значыць сістэматызаваць добра вядомыя ўсім з'явы з дапамогай такіх паняццяў, як попыт, альтэрнатыўная вартасць, гранічны эфект і параўнальная выгада[4]. Сацыёлаг пакідае ў баку «нежывыя» кампаненты рынку і разглядае яго толькі як суму адносін паміж людзьмі. Для яго гэта: «узаемадзеянне дзвюх асноўных сфер грамадскага жыцця – эканамічнай і сацыяльнай і, адпаведна, узаемадзеянне дваякага роду працэсаў – эканамічных і сацыяльных. Асаблівасць гэтага аб'екта заключаецца ў тым, што малююцца не асобна ўзятыя тэндэнцыі, што назіраюцца ў сферы эканомікі і грамадства, і нават не сувязі паміж імі, а нешта больш складанае: механізмы, якія нараджаюць і рэгулююць гэтыя ўзаемасувязі»[5].

Для гісторыка прынцыпова важна і першае, і другое. Для яго рынак – гэта адна з праяў асноўных сусветна-гістарычных сувязей, у якія ўцягнуты не толькі людзі, але і прасторы, і рэсурсы (тут прынцыповае значэнне маюць змяненні ў галіне энергетыкі). У канчатковым выніку – уцягваецца час, які губляе ў ходзе станаўлення і развіцця рынкавай гаспадаркі сваё астранамічнае значэнне.

Рынак і маёмасць – у гэтых катэгорыях заключана ўся сацыяльна-эканамічная гісторыя чалавецтва. Рынак – гэта і пакупнік, і прадавец, і вытворца. Іншы раз яны могуць мяняцца месцамі: сёння я прадаю, а заўтра – купляю, калі-нікалі – сумяшчаю ролі: з'яўляюся адначасова і вытворцам, і прадаўцом. Гэта – адна з праяў дынамікі рынкавых адносін, і, па сутнасці, адлюстраванне ўсёй шматаблічнасці людскога жыцця. Аднак нягледзячы на тое, што рынкавыя сувязі, нават і ў іх пачатковай форме, як просты абмен, узніклі на пачатку гісторыі чалавецтва[6], па-сапраўднаму сусветнымі яны становяцца толькі ў XIX ст., калі відавочна выявілася іх роля як асноўнага паказчыка адзінства сусветнай гісторыі.

Катэгорыя «рынак» доўгі час не лічылася гістарычнай і не ўваходзіла ў кола гістарычных паняццяў. Эканамісты замянілі гэты тэрмін формулай «тавар–грошы–тавар», а сацыёлагі вывучалі «працяжнік» паміж гэтымі вызначэннямі. Такое становішча і сёння захоўваецца ў класічнай эканамічнай і сацыялагічнай навуках. І толькі з цягам часу, які вымяраўся ўзрастаннем значэння рынку ў сусветнай гісторыі, яму надалі статус гістарычнай катэгорыі. Прычым прыярытэт належыць тут не гісторыкам, а эканамістам.

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне эканомікі Фрыдрых Аўгуст фон Гаек злучыў гісторыю рынку і гісторыю людзей, а Ёзэф Шумпэтэр абгрунтаваў стваральную, а, такім чынам, гістарычную ролю ў эканоміцы прадпрымальнікаў. Высновы эканамістаў падтрымалі гісторыкі, у першую чаргу прадстаўнікі французскай гістарычнай школы «Аналаў», сярод якіх асабліва вылучаўся Фернан Брадэль[7].

Асобна ў гэтым шэрагу стаіць марксізм. Па-першае, яму быў нададзены статус вяршыні сацыяльна-эканамічнага пазнання, у выніку яго аргументацыя выводзілася за межы навуковай крытыкі. Па-другое, паставіўшы перад сабой задачу «не толькі патлумачыць свет, але і змяніць яго», марксізм атаясаміў сябе з палітычнай практыкай. А калі гісторыя даказала яе нежыццяздольнасць, гэта амаль аўтаматычна перавяло і марксізм, як пануючую ідэалогію, у ранг неперакананаўчых дактрын. Гэта не азначае, што марксізм не пакінуў адбітка ў гістарычнай навуцы. Яскравы таму прыклад – савецкая гістарыяграфія, практычна паўтарыўшая яго палітычны шлях. Але, зразумела, вывучэнне гісторыка-эканамічных рэалій эканомікі наогул і беларускай у прыватнасці, пачалося не з марксісцкіх поглядаў.

Першыя даследаванні па гісторыі эканомікі Беларусі з'явіліся ў пачатку XIX ст., на стыку эканамічных і гістарычных навук. Значны ўнёсак у вывучэнне гісторыі рынкавых адносін у Беларусі XIX – пачатку XX ст. зрабілі статыстыкі і эканамісты. У XIX ст. адбылося станаўленне статыстыкі, як навуковай дысцыпліны. І менавіта ў працах статыстыкаў, эканамістаў, а таксама тых, хто прыкладаў свае рэальныя намаганні для развіцця беларускай эканомікі, а не гісторыкаў, зроблена першая спроба навуковага асэнсавання эканамічнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. Гэтаму спрыяла арганізацыя з 1834 г. дзяржаўных статыстычных устаноў: спачатку – Статыстычнага аддзялення Міністэрства ўнутраных спраў, а потым, з 22 снежня 1852 г., – Статыстычнага камітэта МУС. Апрача публікацый МУС, статыстычныя матэрыялы эканамічнага характару друкаваліся таксама ў выданнях дзяржаўных устаноў, якія загадвалі фінансамі, шляхамі зносін і вайсковымі справамі.

Прадстаўнікі царскай адміністрацыі таксама неаднаразова ў аналітычнай форме выказвалі свае меркаванні пра «ўскраінную палітыку» і захады на ўмацаванне «рускай справы ў краі». Яны датычыліся не толькі палітычных, адміністрацыйных, рэлігійных, культурных пытанняў, але і (праўда ў значна меншай ступені) праблем эканамічных. Асноўная іх маса ўзнікла ў выніку дзейнасці бюракратычнага апарату Расійскай імперыі на беларускіх землях,

а таксама ў ходзе адміністрацыйнага кіравання імі з Пецярбурга і Вільні. У матэрыялах мясцовай адміністрацыі асаблівае значэнне маюць справаздачы губернатараў. З 1870 г. статыстычныя дадаткі да гэтых справаздач пачалі рабіць больш падрабязна і яны атрымалі назву «Обзоров губерний». З 1880-х гг. губернскія справаздачы і агляды пачалі друкавацца. На падставе статыстычных матэрыялаў мясцовая ўлада спрабавала зрабіць аналіз эканамічнага стану асобных губерняў і нават прапанаваць шляхі вырашэння праблем.

Беларускія матэрыялы сустракаюцца і ў публікацыях эканамістаў і статыстыкаў, прысвечаных агульнаімперскім пытанням і, тых, што датычылі праблем рэгіянальнага характару – эканоміцы так званага Паўночна-Заходняга краю, або эканоміцы басейнаў Заходняй Дзвіны, Дняпра і Нёмана. Важна падкрэсліць, што гістарычныя дакументы, якія датычаць становішча Беларусі ў складе Расійскай імперыі, амаль што абавязкова падкрэслівалі не толькі яе этнічныя, рэлігійныя і сацыяльна-культурныя адметнасці, на што звычайна і трывала звярталася ўвага даследчыкаў у XX ст., але і асаблівасці яе эканамічнага жыцця. Зазначым, што гэта пераканаўчае сведчанне таго, што беларускі рынак канчаткова склаўся як гістарычная з'ява.

Пры правядзенні дзяржаўнай расійскай імперскай палітыкі выкарыстоўваўся не толькі рэпрэсіўны апарат, але і інтэлектуальныя рэсурсы. Прынцыпова важным для разумення гісторыі беларускага рынку з'яўляецца аналіз эканамічных поглядаў тых, хто стаяў ля дзяржаўнага «стырна» эканомікі Расійскай імперыі. Такія працы вядомыя як з публікацый XIX – пачатку XX ст., так і з выданняў апошняга дзесяцігоддзя. Сярод іх і тыя, што ўводзяць у навуковы ўжытак архіўныя матэрыялы, раней не даступныя шырокаму колу сучаснікаў[8].

Размова пра ўзаемны ўплыў дзяржаўнай эканамічнай палітыкі і прыватнай эканамічнай ініцыятывы – гэта, па вялікім рахунку, размова пра фарміраванне эканамічных прыярытэтаў таго або іншага народу. Менавіта тут, у гэтай сферы, у выніку ўзаемадзейнічання прыватнага прадпрымальніцтва і дзяржаўнай улады нараджаецца мадэль нацыянальнай эканомікі.

У XIX, як дарэчы і ў XX стст., беларуская думка не змагла акрэсліць колькі-небудь зразумелай мадэлі эканамічнага развіцця для свайго народу і сваёй радзімы. Аднак гэта не азначала, што стан беларускай эканомікі не хваляваў розум сучаснікаў сто і больш гадоў таму. Праверка іх поглядаў на адпаведнасць тэорыі марк-

сізму-ленінізму зроблена ў манаграфіі В. Бусько «Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в.»[9].

Як вядома, класікі марксізму-ленінізму заўсёды звярталі ўвагу на пытанні эканамічнага развіцця і пакінулі пасля сябе абагульняльныя працы ў гэтай галіне. Але некрытычнае ўспрыняцце гэтых прац і адлюстраваных у іх поглядаў надоўга скавала творчую ініцыятыву айчынных гісторыкаў. Іх дасягненні часта зводзіліся да пошуку гістарычных фактаў-ілюстрацый да раней створаных схем, узведзеных у ранг афіцыйных гістарычных дактрын. І калі прыкладна да сярэдзіны 1930-х гг. у даследаваннях (працы М. Доўнар-Запольскага, А. Цвікевіча, А. Смоліча, Дз. Дудкова, К. Кернажыцкага) яшчэ магчыма знайсці сляды самастойнага асэнсавання гісторыка-эканамічных праблем, то пазней беларуская гістарыяграфія, знаходзячыся на перыферыі савецкай гістарычнай навукі, займалася адаптацыяй беларускай гісторыі да афіцыйнага курса гісторыі СССР.

Гэткае становішча аб'ектыўна зводзіла працу гісторыка да ролі рэгістратара гістарычных падзей, якія павінны адлюстроўваць афіцыйную схему. Працы беларускіх гісторыкаў маглі вызначацца багатым і каштоўным гістарычным матэрыялам (добрыя таму прыклады – манаграфіі М. Болбаса альбо В. Панюціча), але ў іх адсутнічала асэнсаванне самой хады гісторыі. Яны адлюстроўвалі гістарычныя вынікі, бясспрэчныя па сваёй сутнасці, а не складаныя гістарычныя працэсы. Апрача таго, нацыянальныя, дакладней рэспубліканскія гістарыяграфіі, развіваліся пры моцным прэсінгу прац гісторыкаў з агульнасаюзнага цэнтра. Агульнасаюзныя, агульнаімперскія гістарычныя тэндэнцыі абавязкова павінны былі прысутнічаць у гісторыі кожнага народа СССР, і калі гэта гісторыя ім не адпавядала, то менавіта яна была прайграўшым бокам. Зразумела, што весці размову пра нацыянальную гістарычную мадэль эканамічнага развіцця ў такіх умовах было немагчыма.

На гэтым фоне своеасаблівымі рэліктамі вольнага гістарычнага мыслення вызначаліся працы М. Улашчыка[10] і серыя артыкулаў В. Цімашэнкі[11].

Нягледзячы на ідэалагічныя абмежаванні, якія перашкаджалі шматбаковаму погляду на гістарычную рэчаіснасць, усё ж з'явіліся працы М. Болбаса і Н. Раманоўскага, якія разглядалі прамысловае развіццё Беларусі. Закрануты гэтыя аспекты таксама ў манаграфіях, прысвечаных гісторыі пралетарыяту Беларусі, як асобных даследчыкаў (З. Абезгауз, М. Біч), так і ў калектыўнай працы «История рабочего класса БССР. Т. 1» (Мн., 1984).

Нават колькаснае параўнанне гістарыяграфіі эканамічнай гісторыі Беларусі прыводзіць да высновы, што яна яўна саступае

гістарыяграфіі яе палітычнай гісторыі альбо гісторыі культурных працэсаў на беларускіх землях. Шэраг прынцыповых пытанняў эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. застаецца ў разрадзе дыскусійных, альбо наогул не вывучаных. Адсутнічаюць абагульняльныя працы па гісторыі ўнутранага і знешняга гандлю Беларусі, развіцці яе шляхоў зносін і транспарту, гісторыі прамысловага перавароту і навукова-тэхнічных пытаннях эканомікі[12]. Больш за тое, пытанні, што здавалася канчаткова вырашаныя беларускай савецкай гістарыяграфіяй, сёння ўжо не выглядаюць досыць пераканаўча даследаванымі і імкліва перайшлі ў лік важных і актуальных даследчыцкіх задач.

У спробах акрэсліць сацыяльна-эканамічную эвалюцыю Расіі з часоў Пятра I да канца XX ст., як адзіную, непарыўную і лагічную гістарычную плынь, частка расійскіх гісторыкаў звярнулася да тэорыі мадэрнізацыі[13]. Яна вызначаецца як усеабдымны працэс інавацыйных мерапрыемстваў пры пераходзе ад традыцыйнага да сучаснага грамадства. У сваю чаргу, ён можа быць прадстаўлены як сукупнасць падпрацэсаў: структурнай і функцыянальнай дыферэнцыяцыі грамадства, індустрыялізацыі, урбанізацыі, бюракратызацыі, прафесіяналізацыі, рацыяналізацыі, станаўлення сучасных матывацыйных механізмаў і г. д.[14].

Такі падыход, відавочна, вядзе да інтэнсіфікацыі гісторыка-эканамічных даследаванняў, аднак і ён, як раней марксізм, не можа даць адказы на ўсе пытанні. Справа ў тым, што тэорыя мадэрнізацыі нараджалася пры аналізе заходняй цывілізацыі, і таму далёка не ўсе яе тэарэтыка-метадалагічныя напрацоўкі падыходзяць да разгляду расійскіх гісторыка-эканамічных рэалій. На наш погляд, найбольш плённае выкарыстанне тэорыі мадэрнізацыі магчыма пры разглядзе змен у прамысловасці[15]. Аднак аграрная эвалюцыя расійскага, як і ўсяго ўсходнееўрапейскага, у тым ліку і беларускага рэгіёна, значна адрозніваецца ад заходнееўрапейскай і амерыканскай. І тут запазычаная тэорыя мадэрнізацыі яўна неспрацоўвае. Тым не менш, пасля спроб вызначыць расійскі вопыт мадэрнізацыі, трэба звярнуць увагу і на беларускі вопыт. Для сучаснай Беларусі, з яе эканомікай пераходнага тыпу, даследаванні па дадзенай праблематыцы могуць мець прынцыповае значэнне.

---

[1] Кіштымаў А. Эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі ў канцы XVIII – 50-х гадах XIX ст. // З глыбі вякоў. Мн., 1997. Вып. 2. С. 79–100.

[2] Кіштымаў А. Л. Эканамічныя падставы беларускай дзяржаўнасці на пачатку 20 ст. // Гіст. альманах. 2000. № 1 (3). С. 16–48.

[3] Осипов Ю. М. Опыт философии хозяйства. Хозяйство как феномен культуры и самоорганизующаяся система. М., 1990. С. 190

[4] Хейне П. Экономический образ мышления. М., 1991. С. 699.

[5] Соколова Г. Н. Экономическая социология. Мн., 1995. С. 36.

[6] Ф. Гаек падкрэсліваў, што гандаль – з'ява больш старажытная, чым земляробства, альбо любы іншы род рэгулярнай вытворчасці. Гл.: Хайек Ф. А. Пагубная самонадеянность. М., 1992. С. 70.

[7] Бродель Ф. Динамика капитализма. Смоленск, 1993.

[8] Судьбы России. Доклады и записки государственных деятелей императорам о проблемах экономического развития страны (вторая половина XIX века). СПб., 1999.

[9] Бусько В. Н. Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в.: Очерки / Под. ред. М. В. Научителя. Мн., 1990.

[10] Пра гэта падрабязней гл.: Киштымов А. Л. Исторические особенности экономического развития Беларуси XIX века в научных трудах Н. Н. Улащика // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага). Мн., 1997. С. 136–144.

[11] Тимошенко В. В. Роль банков в льноторговле дореволюционной Белоруссии (1900–1914 гг.) // Вопросы развития народного хозяйства Белоруссии и Прибалтики. Мн., 1963. С. 151–158; Яна ж. Была ли Белоруссия при царизме колонией в экономическом смысле? // История СССР. 1965. № 1. С. 38–50; Яна ж. Кредитная система Белоруссии в начале XX в. // Истор. записки. М., 1965. Т. 78. С. 63–84.

[12] Киштымов А. Л. Индустриализация Беларуси: историческая реальность и советская историография // Историк и время. 20–50-е годы XX века. М., 2000. С. 129–134.

[13] Российская модернизация XIX–XX веков: институциональные, социальные, экономические перемены: Сб. научных трудов. Уфа, 1997; Опыт российских модернизаций XVIII–XX века. М., 2000.

[14] Опыт российских модернизаций XVIII–XX века. М., 2000. С. 3.

[15] Гл.: Алексеев В. В., Сапоговская Л. В. Исторический опыт промышленной политики в России. Екатеринбург, 2000.

4.2. Асноўныя этапы развіцця і галіновая характарыстыка народнай гаспадаркі Беларусі

Вывучэнне эканамічнага мінулага Беларусі, як асобнай тэрыторыі, пачалося толькі ў савецкі час. Першай значнай работай абагульняльнага характару стала манаграфія М. Доўнар-Запольскага пра стан народнай гаспадаркі Беларусі ў 1861–1914 гг.[1]. У ёй навуковец зрабіў спробу абгрунтаваць тэзіс аб эканамічнай своеасаблівасці беларускіх губерняў і «гаспадарсьцьвеннай неза-

лежнасьці» Беларусі ў пачатку XX ст.[2]. Прынцыпова важным з'яўляецца выснова М. Доўнар-Запольскага аб другой палове XIX – пачатку XX ст., як аб часе індустрыялізацыі беларускіх зямель[3]. Аднак погляды вучонага сталі аб'ектам знішчальнай крытыкі ў 1926–1934 гг. і на доўгі час засталіся па-за ўвагай афіцыйнай савецкай гістарыяграфіі.

На думку М. Доўнар-Запольскага, народная гаспадарка – гэта гаспадарка народу, а народ – гэта беларускі селянін. Галоўную ўвагу ў сваіх творах аўтар звяртаў на эканамічныя намаганні беларускага селяніна. А іншыя, больш значныя для сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі Беларусі змены, засталіся па-за ўвагай даследчыка. Залішняе, на наш погляд, захапленне сярэднімі дадзенымі (хвароба, надалей прысутная і ў савецкай гістарыяграфіі), шмат з якіх не маюць сэнсавай нагрузкі і не ўплывалі на гістарычную рэальнасць. Напрыклад, сярэдні памер фабрычнага прадпрыемства, выпрацоўка на аднаго рабочага, сярэдні таваразварот гандлёвага прадпрыемства і г. д. Адзначым, што ў далейшым М. Доўнар-Запольскі і сам добра разумеў абмежаванасць «агульных сярэдніх» для навуковага аналізу[4].

М. Доўнар-Запольскі не звярнуў шмат увагі на ўзровень развіцця прамысловасці Беларусі, па-за межамі сваіх даследчыцкіх зацікаўленняў пакінуў і пытанні развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы і транспарту Беларусі. Але выключна высока ацаніў працоўныя намаганні беларускага селяніна. На думку навукоўца, менавіта селянін перамагаў у эканамічным спаборніцтве з беларускім абшарнікам.

Эканамічныя намаганні беларускага селяніна і змены ў аграрным сектары эканомікі Беларусі і надалей былі асноўным напрамкам нацыянальных даследаванняў. Няма асаблівага сэнсу спрачацца, што з'яўляецца больш важкім для разумення сацыяльна-эканамічных падзей у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. – эвалюцыя сельскай гаспадаркі або развіццё прамысловасці. Гэта былі два бакі аднаго медаля – набыцця рысаў і станаўлення ў Беларусі індустрыяльнага грамадства. Улічваючы, што да пачатку індустрыяльнага развіцця сельская гаспадарка была галоўным сектарам эканомікі, як з пункту погляду каштоўнасці і памераў вытворчасці, так і з пункту погляду колькасці занятай у ёй працоўнай сілы, і тое, што такое становішча захавалася і ў пачатку XX ст., прыярытэты айчынных гісторыкаў-эканамістаў не выглядаюць выпадковымі.

У перыядызацыі гісторыі сельскай гаспадаркі і беларускага сялянства ўсе даследчыкі прытрымліваліся марксісцкага, фарма-

цыйнага прынцыпу. Канец XVIII ст. – 1850-я гг. характарызаваліся як перыяд глыбокага і ўсебаковага крызісу феадальна-прыгонніцкага ладу і зараджэння ў эканоміцы (прамысловасці і сельскай гаспадарцы) Беларусі капіталістычных адносін[5]. Сялянская рэформа 1861 г. была агульна прызнана ў савецкай гістарыяграфіі як пачатак капіталістычнай фармацыі. Гэтым пытанням нададзена ўвага ў манаграфіях М. Улашчыка, М. Фрыдман[6]. Важнейшыя сацыяльна-эканамічныя аспекты станаўлення капіталістычнага ладу ў беларускай вёсцы, развіццё сельскагаспадарчага рынку, змены ў структуры землеўладання і землекарыстання, формы і роля феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў, сацыяльнае расслаенне сялянства, фарміраванне класаў аграрнай буржуазіі і сельскагаспадарчага пралетарыяту даследаваны ў кнігах Дз. Дудкова, А. Кажушкова, Л. Ліпінскага, В. Панюціча, Х. Бейлькіна[7].

У той жа час савецкія гісторыкі зыходзілі з пазаэканамічнай, класавай тэорыі, згодна з якой абшарніцкая гаспадарка заўсёды лічылася эканамічна адсталай і неэфектыўнай, а сялянская – пакутавала ад яе засілля і таму не мела перспектыў для развіцця. Да таго ж, працы даследчыкаў часцей за ўсё ахоплівалі толькі адзін бок са шматбаковага складніка аграрнага сектара эканомікі, што не давала магчымасці правесці яго аналіз з дапамогай комплекснага эканамічнага метаду.

Часцей за ўсё ўвага звярталася на стан землеўладання і землекарыстання. Класічнай працай па гэтай тэматыцы з'яўляецца манаграфія П. Казлоўскага[8]. Аўтар на працягу 150-гадовага гістарычнага перыяду дакладна і дэталёва вызначыў сацыяльную сутнасць землеўладання на беларускіх землях, уплыў дзяржаўнай палітыкі на пазямельныя адносіны. Прыкладна ў гэтым жа напрамку вялі свае пошукі і іншыя беларускія гісторыкі-аграрнікі[9].

На першы погляд тут няма аб чым спрачацца: зямля насамрэч вырашальнае звяно ў ланцугу аграрнай вытворчасці. Але ў гэтых працах не вялася размова пра эфектыўнасць эканамічнага выкарыстання тых або іншых форм зямельнай уласнасці, як і пра зямлю ў якасці рынкавай велічыні. Без такога гісторыка-эканамічнага аналізу зямельнае размеркаванне пазбаўляецца свайго эканамічнага сэнсу, і за ім застаецца толькі функцыя колькаснага, маёмаснага індыкатара розных эканамічных суб'ектаў. Зямля, як уласнасць, толькі тады зможа стаць важкім аргументам у пабудове агульнай карціны эканамічнага мінулага Беларусі, калі будзе зроблена даследаванне яе параўнальных коштаў у розныя перыяды, і на гэтым грунце зроблены адпаведныя высновы.

Згодна з даследаваннямі савецкіх гісторыкаў, сялянская гаспадарка з кожным дзесяцігоддзем немінуча ішла да заняпаду: «На адным полюсе знаходзілася невялікая купка разбагацелай сялянскай буржуазіі, кулакоў-міраедаў, а на другім – група сераднякоў, якая стаяла на мяжы згалення і клас згалелых беднякоў, якія папаўнялі армію сельскагаспадарчых рабочых-парабкаў»[10]. Больш за тое, нават і пасля рэформы 1861 г. «надзельнае сялянскае землеўладанне насіла прыгонны характар», як, дарэчы, той жа «прыгонны характар» мела ў пачатку XX ст. і ўсё землеўладанне ў краіне[11]. Таму не здзіўляе канчатковы прысуд, які вынесла беларускаму сялянству апошняя версія яго абагульняльнай гісторыі: «Пераважная большасць сялян была асуджана на дзесяцігоддзі пакутлівай кабалы, збяднення, галечы»[12]. Зыходзячы з ацэнкі савецкай гістарыяграфіі, іншай гістарычнай перспектывы, акрамя рэвалюцыі і будоўлі сацыялізму, у беларускага селяніна не было.

Але наколькі адпавядаюць гістарычным рэаліям гэтыя гістарыяграфічныя высновы? Адносна новай з'явай у айчыннай гістарыяграфіі стала ўвага, якую даследчыкі звярнулі на вывучэнне так званага «штодзённага жыцця». Відавочна, што такія даследаванні звяртаюцца да падзей гаспадарчага жыцця, да тых спраў, якія займалі ў нашых продкаў асноўны час. Акалічнасці гэтага жыцця на ўзроўні мікрагісторыі[13] пачалі фіксавацца яшчэ ў этнаграфічных апісаннях XIX ст.[14]. Сучасныя працы імкнуцца спалучыць ілюстрацыйныя нарысы з навуковым аналізам. Не выпадкова, што першыя даследаванні па мікрагісторыі Беларусі датычаць гістарычнага мінулага беларускага сялянства. Пасмяротнае выданне працы М. Улашчыка пра гісторыю яго роднай вёскі Віцкаўшчыны стала не толькі першай ластаўкай, але і адпаведным узорам для наступных «гісторый» мікрарэгіёнаў Беларусі[15]. Сярод іншых значных прац такога тыпу сваёй дасканаласцю і старанным архіўнымі пошукамі вызначаюцца мікрагісторыі Г. Брэгера[16], С. Токця[17], В. Насевіча[18].

Са старонак гэтых манаграфій, прысвечаных эканамічнаму жыццю беларускага селяніна, паўстае тое аблічча вёскі, якое не вельмі стасуецца з поглядамі савецкіх навукоўцаў-аграрнікаў, для якіх адмена прыгону мае «грабежніцкі характар»[19]. Так, паводле падлікаў В. Насевіча, у выніку рэформы 1861 г. надзелы былых прыгонных павялічыліся прыкладна на 50%, а прыбытак ад занятку земляробствам мог узрасці прыкладна ўдвая. Пры дбайным вядзенні гаспадаркі гэта давала магчымасць за 10 год набыць дадаткова 20 дзес. зямлі[20]. М. Улашчык прыводзіць прыклад, як ся-

лянская грамада ў 15 гаспадароў, у тым ліку 12 былых прыгонных, праз 20 год пасля адмены прыгону (у 1883 г.) набыла 500 дзес. зямлі і заснавала новае паселішча[21]. Беларускі селянін упарта змагаўся за лепшае жыццё і, нягледзячы на шмат у чым неспрыяльныя ўмовы, дасягнуў на гэтым шляху значных поспехаў. Пачатак XX ст. у гэтых працах выглядае не як час усеагульнага заняпаду сялянскай гаспадаркі, а як перыяд, калі яна выходзіць на гістарычную арэну самастойным эканамічным элементам. Такім чынам, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі зноў пачалі ўжывацца навуковыя падыходы да разгляду сялянскай гаспадаркі, як працоўнай адзінкі, характэрныя для шэрагу даследчыкаў 1920-х гг., у тым ліку і М. Доўнар-Запольскага[22].

Разам з тым, відавочная і слабасць мікрападыходаў да гісторыі. Самае дасканалае даследаванне рэгіёну (С. Токць), і нават тэрыторыі ў паўтара дзесяткі вёсак (В. Насевіч), наўрад ці дае падставы для пераканаўчых высноў пра агульныя працэсы, уласцівыя такой непадзельнай адзінцы, як нацыя, альбо пошукаў «еўрапейскіх перспектыў» у межах двух саўгасаў. Толькі супольная колькасць беларускіх мікрагісторый, аналіз старых і новых прац дазволяць значна скарэктаваць ранейшыя высновы гісторыкаў і вызначыць новыя напрамкі для абагульненняў.

Нягледзячы на трывалыя спробы разгляду аграрнага пытання ў Беларусі як часткі і адбітку ўсерасійскай класавай барацьбы, агульным у беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца сцвярджэнне аб тым, што становішча ў аграрным сектары эканомікі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. мела больш агульных рыс з сельскай гаспадаркай Польшчы і прыбалтыйскіх губерняў Расійскай імперыі, чым з вялікарускімі губернямі. Асноўным адрозненнем ад агульнарасійскай мадэлі тут стала захаванне і ўстойлівае развіццё буйных і сярэдніх абшарніцкіх гаспадарак.

На фоне значнай колькасці прац па даследаванні эканамічнага стану сялянскай гаспадаркі працы па вывучэнні «класавага антыподу сялян» (выраз К. Шабуні[23]) – дваран-абшарнікаў і абшарніцкай гаспадаркі – выглядаюць больш сціпла. Няма ніводнай абагульняльнай манаграфіі пры наяўнасці некалькіх артыкулаў[24] і адпаведных невялікіх раздзелаў у кнігах К. Шабуні, А. Кажушкова, Л. Ліпінскага і Х. Бейлькіна[25].

Паводле К. Шабуні, на пачатку XX ст. у Беларусі «па сваёй эканамічнай арганізацыі абшарніцкая гаспадарка ў цэлым з'яўлялася напаўпрыгоннай-напаўкапіталістычнай»[26]. Немагчымасць іншай высновы была прадвызначана выразам У. Леніна пра тое,

што «на вялізных участках зямлі, звыш 500 дзес., амаль немагчыма, або, прынамсі, надзвычайна складана ў большасці мясцовасцей Расіі вядзенне *буйной гаспадаркі*, апрацоўка ўсёй зямлі інвентаром уладальніка і вольнанаёмнай працай»[27]. Пры гэтым у айчыннай гістарыяграфіі погляды на гаспадарку абшарнікаў эвалюцыянавалі ад зробленнага ў першай палове 1960-х гг. памяркоўнага вызначэння Беларусі, як «тыповага раёну развіцця земляробчага капіталізму на прускі ўзор» (К. Шабуня[28]) і таго, што «на большай частцы абшарніцкай раллі было арганізавана капіталістычнае земляробства» (Э. Савіцкі[29]), да супрацьлеглага сцвярджэння В. Панюціча напрыканцы 1970-х гг. пра абшарніцкае землеўладанне, як «самы важны тормаз развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы»[30].

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. зыходнай базай для эвалюцыі эканомікі як і раней заставалася сельская гаспадарка. Менавіта там былі сканцэнтраваны асноўныя фінансавыя, сыравінныя і працоўныя рэсурсы. Ужо ў той перыяд асобныя беларускія маёнткі сталі месцам праяўлення эканамічнай ініцыятывы і імкнення гаспадарыць па-новаму[31]. На жаль, беларуская савецкая гістарыяграфія не вельмі ўважліва паставілася да фундаментальных прац М. Улашчыка, які першым вызначыў асноўныя рысы абшарніка новага тыпу, шляхціца-прадпрымальніка, яго ролю і месца ў новай сістэме капіталістычных адносін[32].

На прыкладзе мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, асабліва беларускага маёнтку, выразна адчуваецца, як «дух капіталізма», паводле трапнага выразу Макса Вебера[33], пранік і ў гэту, традыцыйную для эканомікі Беларусі, аграрную галіну.

Але ў першую чаргу прыход капіталістычных адносін у Беларусі, як і паўсюдна, быў звязаны са зменамі ў прамысловасці. Менавіта там, як і на транспарце, адбываўся тэхнічны і прамысловы пераварот, які вызначыў мяжу паміж старым, традыцыйным, аграрным грамадствам і новым, індустрыяльным[34]. Між тым даследчыкі беларускай эканамічнай гісторыі пераважна карыстаюцца 1861 г. як мяжой, якая лічыцца галоўным «Рубіконам» для ўсіх падзей у гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. У тым ліку і падзей у гісторыі яе прамысловасці.

Згодна з класічным вызначэннем, сутнасць прамысловага пераваротy ў першую чаргу складаў пераход ад мануфактуры да фабрыкі, гэта азначае – пераход ад ручной працы да машыннай, з'яўленне фабрычна-заводскай вытворчасці і пераўтварэнне прамысловасці ў кіроўную сілу эканомікі. Расійская даследчыца

А. Салаўёва, якая прысвяціла гэтаму пытанню спецыяльную працу, прыйшла да высновы, што ў Расійскай імперыі «гэты кардынальны гістарычны працэс храналагічна ахоплівaў перыяд 50–90-х гг. XIX ст.»[35]. Беларускія даследчыкі палічылі, што ў айчыннай эканоміцы гэты працэс пачаўся раней – у 1830–1840 гг.[36].

Прынцыповым з'яўляецца і адказ на пытанне: дзе, у якіх галінах народнай гаспадаркі гэты працэс пачаўся? М. Болбас, які, дарэчы, палічыў, што пачатак прамысловага пераваротy пачаўся напрыканцы 1850-х гг., сцвярджаў, што, у адрозненне ад Заходняй Еўропы і расійскіх губерняў, «тэхнічная рэвалюцыя» ў Беларусі пачалася не з баваўнянай, а з жалезаапрацоўчай прамысловасці. Сведчаннем гэтага, піша ён, з'яўляецца «не толькі ўкараненне паравых рухавікоў, але і замена крычнага спосабу выплаўкі жалеза (у невялікіх руднях) больш дасканалым – пудлінгавым (у адносна вялікіх домнах)[37]. З апошнім меркаваннем можна пагадзіцца. Але зазначым вельмі вольнае абыходжанне з класіфікацыяй галін эканомікі – залічэнне металургіі да металаапрацоўкі. А вось да першага сцвярджэння трэба дадаць, дзе і ў якіх галінах выкарыстоўваліся паравыя рухавікі. На самой справе лідэрамі тэхнічнага прагрэсу першай паловы XIX ст. у Беларусі былі асобныя прадпрыемствы тэкстыльнай і харчовай прамысловасці, а ў другой палове XIX – пачатку XX ст. – яе чыгункі і асобныя прадпрыемствы хімічнай, папяровай і лёгкай прамысловасці[38].

Амаль што невядомай і не вывучанай застаецца роля навукова-тэхнічных навацый у развіцці беларускага рынку. Абагульняльная праца пра развіццё навукі і тэхнікі Беларусі атрымалася вельмі стракатай і не звяртае ўвагі на эканамічны бок гэтага пытання[39]. Між тым, менавіта ў XIX ст. рабіла першыя крокі навукова-тэхнічная культура Беларусі і ствараліся першыя навукова-тэхнічныя асацыяцыі, шчыльна звязаныя з перабудовай у беларускай прамысловасці і на транспарце[40].

Найбольш грунтоўным стаўленнем да вывучэння прамысловага развіцця Беларусі вылучаюцца манаграфіі М. Болбаса. Разам з яго даведнікам «Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі»[41] яны шмат у чым сфарміравалі існуючыя агульныя погляды на эканамічную гісторыю Беларусі, замацаваныя ў навучальных дапаможніках, энцыклапедычных выданнях. Гэтаму спрыяла імкненне даследчыка паказаць развіццё беларускай прамысловасці не толькі ва ўсёй яе разнастайнасці, шматлікасці форм і галіновай шматбаковасці, але і спалучыць карціну яе развіцця з аналізам агульнай эканамічнай эвалюцыі Беларусі, паказам

уплыву на гэты працэс змен у сельскай гаспадарцы, транспарце, гандлі, грашова-крэдытнай сістэме. Шмат увагі навуковец звяртае і на сацыяльна-эканамічныя перадумовы і наступствы прамысловага развіцця, урбанізацыю, дэмаграфічныя працэсы. Такі падыход нельга не прызнаць цалкам зразумелым і абгрунтаваным. Але, разам з тым, з цягам часу некаторыя высновы аўтара, сабраныя і сістэматызаваныя ім шматлікія статыстычныя дадзеныя, шэраг метадалагічных падыходаў настойліва патрабуюць удакладнення, а іншы раз і перагляду.

Галоўнае тут – патрэба ў больш уважлівым стаўленні да спецыфікі і адметнасці эканамічнага жыцця Беларусі. Мы ўжо казалі пра вызначэнне М. Болбасам храналагічных меж і сутнасці прамысловага пераварота ў Беларусі. Няма, на наш погляд, і асаблівай патрэбы заўжды параўноўваць узровень развіцця прамысловасці і, наогул, эканомікі Беларусі з агульнаімперскім. У сілу шматбаковых прычын, ад геаграфічных да сацыяльна-эканамічных, беларуская эканоміка і прамысловасць аб'ектыўна не магла ім адпавядаць.

Развіццё беларускай прамысловасці не вельмі стасуецца і з «класічнай», англійскай, схемай індустрыялізацыі, якой прытрымліваліся класікі марксізму-ленінізму, і за якой ідзе аўтар. Імкненне ўціснуць шлях айчыннай прамысловасці ў рамкі «рамяство–мануфактура–фабрыка» не знаходзіць у працах М. Болбаса нават нешматлікіх гістарычных прыкладаў. Для эканомікі Англіі ў ходзе капіталістычнай індустрыялізацыі было характэрна ўзнікненне мануфактур з дробнатаварнай, рамеснай вытворчасцю, а потым пераўтварэнне класічных мануфактур у фабрыкі, што вынікала ў ходзе стыхійнага пошуку прадпрымальнікамі прынцыпова новых тэхнічных знаходак. Для эканомікі Беларусі, з яе «даганяючай» мадэллю развіцця, было характэрна ўзнікненне фабрычнай вытворчасці без прамежкавых форм, на «чыстым месцы», быццам бы па гатовай праграме, з выкарыстаннем ужо знойдзенай тэхнікі і тэхналогіі. Пры гэтым рамяство і мануфактура не знікалі, а працягвалі займаць сваю адпаведную эканамічную нішу.

Адзначаныя недахопы ў манаграфіях М. Болбаса, якія і зараз застаюцца лепшымі беларускімі даследаваннямі па гэтай тэматыцы, у той або іншай меры датычаць і іншых прац па гісторыі прамысловасці Беларусі.

Індустрыялізацыя і рынкавая эканоміка непазбежна цягнулі за сабой рост усіх відаў камунікацыі і інфармацыі. Менавіта на XIX – пачатак XX ст. у Беларусі прыпадаюць велізарныя праграа-

мы будаўніцтва новых шляхоў зносін: водных каналаў, чыгунак, шашы, узнікненне іншых відаў камунікацый, напрыклад, рэгулярнай пошты, тэлеграфа, тэлефона. Па ступені ўздзеяння на развіццё беларускай эканомікі першае месца належыць чыгункам. Старонкі гісторыі будаўніцтва і эксплуатацыі айчыннай чыгуначнай сеткі адлюстраваны ў даволі шматлікіх юбілейных выданнях. Падобна кожнаму выданню такога роду, яны вызначаюцца недасканалым валоданнем матэрыялам, адсутнасцю гістарычнага аналізу[42]. Як вынік – пра частку беларускіх чыгунак гэтыя выданні нават не ўзгадваюць, яны быццам бы згублены для гісторыі (Гродна–Сувалкі–Аліта–Араны, Брэст–Холм–Люблін, Полацк–Пскоў). Грунтоўная праца расійскай даследчыцы А. Салаўёвай[43] з'яўляецца лепшым здабыткам савецкай гістарыяграфіі па гэтай тэме і можа стаць узорам для айчынных спроб манаграфічнага абагульнення гісторыі беларускай чыгункі.

Як не дзіўна, беларуская гістарыяграфія не мае не толькі манаграфічнага даследавання, але нават і асобных артыкулаў па гісторыі водных шляхоў і воднага транспарту Беларусі. І гэта нягледзячы на тое, што канец XVIII – першая палова XIX ст. сталі для гэтага старэйшага сродку зносін часам сапраўднага росквіту. Асобныя сюжэты дадзенай тэмы закранаюцца ў манаграфіях маскоўскай даследчыцы Э. Істомінай[44], але гэта не можа цалкам адпавядаць сучасным патрэбам вывучэння эканамічнай гісторыі Беларусі. Больш пашанцавала гісторыі такога новага для злому XIX–XX стст. транспартнага сродку, як аўтамабіль[45].

Пачаткам навуковага вывучэння крэдытнай сістэмы Беларусі сталі раздзелы «Фінансы», «Крэдыт і банкі» калектыўнай манаграфіі «Экономика Белоруссии в эпоху империализма» (аўтар З. Гіаргідзэ)[46] і артыкулы В. Цімашэнкі[47]. За апошнія гады да іх далучыліся адпаведныя раздзелы падручнікаў Х. Бейлькіна[48], Ю. Грузіцкага[49] і некалькі навуковых публікацый[50]. Аднак пры вывучэнні крэдытна-фінансавых устаноў гісторыкі не на шмат адышлі ад апісальніцтва і простай канстатацыі фактаў. Відавочна, што гэтая складаная з'ява настойліва патрабуе спалучэння метадаў гістарычнага і эканамічнага аналізу. Нельга пагадзіцца і з тэзісам аб «зацягненым працэсе фармавання крэдытных устаноў камерцыйнага тыпу на тэрыторыі Беларусі»[51]. Як вядома, у беларускіх губернях недахоп камерцыйных банкаў паспяхова замянялі банкірскія дамы і канторы.

Яшчэ раней чым стаў прыкметным уплыў на развіццё гаспадарчага жыцця грашовых плыняў і фінансавых структур, ролю ін-

тэгратара эканамічных намаганняў выконваў гандаль. Яго гісторыі і гісторыі рынкавых адносін у Беларусі прысвечаны манаграфіі В. Шведа[52] і Х. Бейлькіна[53]. Абедзве працы змяшчаюць шмат цікавага, разнастайнага фактычнага матэрыялу. Але да ацэнкі яго рэпрэзентатыўнасці аўтары паставіліся не заўсёды крытычна. Нельга пагадзіцца і з некаторымі высновамі аўтараў. Наўрад ці скасаванне прыгону было «заканамерным вынікам» развіцця гандлю[54], а сельскагаспадарчы рынак, нібыта, меў дачыненне да стварэння «аб'ектыўных умоў для буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і яе перарастання ў сацыялістычную»[55].

Такім чынам, гістарыяграфічны аналіз сведчыць пра агульную недастатковасць вывучэння асноўных этапаў развіцця і галіновай характарыстыкі народнай гаспадаркі Беларусі канца XVIII – пач. XX ст. Да ліку амаль што нераспрацаваных пытанняў, вельмі важных з пункту погляду цывілізацыйных падыходаў, адносіцца пытанне аб пачатку і змесце прамысловага пераварота ў Беларусі. Менавіта ён вызначыў тую мяжу, якая аддзяляе старое, традыцыйнае, аграрнае грамадства ад новага – індустрыяльнага. Яго наступствы паступова трансфармавалі сацыяльна-эканамічнае аблічча беларускага грамадства. Вызначэнне гэтай мяжы дазволіць значна скарэктаваць ранейшую перыядызацыю эканамічнага развіцця Беларусі ў XIX – пачатку XX ст., якая ў асноўным падзяляецца на дапрыгонную, пасляпрыгонную і так званы імперыялістычны перыяд, што не адпавядае сучасным поглядам на шляхі развіцця сусветнай эканомікі.

У аграрным сектары эканомікі Беларусі намаганні сялянскіх і абшарніцкіх гаспадарак разглядаюцца часцей за ўсё паасобку. Гэта яўны адбітак шматгадовага панавання ідэалагічных, класавых падыходаў аўтараў. Між тым на аграрным рынку абодва тыпы сельскагаспадарчых вытворчых адзінак не толькі спаборнічалі, але і ўзаемадзейнічалі паміж сабой, паступова займаючы на ім асабістыя эканамічныя нішы. Дыскусійным застаецца і пытанне аб глыбіні пранікнення капіталістычных адносін у сельскую гаспадарку Беларусі.

Пры разглядзе прамысловасці Беларусі найбольш складаным месцам з'яўляюцца крытэрыі яе ацэнкі. Агульнаімперскія меркі не заўсёды стасуюцца з эканамічнымі рэаліямі Беларусі. Асаблівасці развіцця беларускай прамысловасці, адсутнасць у ёй некаторых галін сведчаць не пра яе адсталасць, а пра натуральныя эканамічныя працэсы, якія ў ёй працякалі і якія садзейнічалі росквіту эканамічна абгрунтаваных напрамкаў прамысловага развіцця.

Крэдытна-фінансавая сістэма Беларусі толькі ў апошнія гады стала аб'ектам сур'ёзнага навуковага вывучэння. Дадатковага вывучэння патрабуе і беларускі гандаль. Прысвечаныя яго гісторыі асобныя работы, на жаль, не вельмі стасуюцца паміж сабой, што не дазваляе зразумець агульную ролю гандлю ў эканамічным жыцці. Патрабуецца і больш выразна акрэсліць гандлёвыя ўзаемаадносіны Беларусі з іншымі рэгіёнамі імперыі і ролю знешніх гандлёвых зносін для развіцця айчыннай эканомікі.

Амаль што не закранаецца прынцыпова важнае пытанне аб гарадской камунальнай гаспадарцы, якая, па сутнасці, нарадзілася ў XIX ст. Адсутнічаюць абагульняльныя працы па гісторыі эканамічнай інфраструктуры, і ў першую чаргу транспарту Беларусі. Усё гэта пакуль што не дазваляе дакладна вызначыць прынцыповае пытанне пра ролю беларускай эканомікі ў фарміраванні агульнаімперскага рынку і ступень эканамічнай самастойнасці народнай гаспадаркі Беларусі.

---

[1] Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии в 1861–1914 гг. Мн., 1926.

[2] Доўнар-Запольскі М. В. Асновы дзяржаўнасьці Беларусі. Вільня, 1919.

[3] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 386–389.

[4] Довнар-Запольский М. В. Баланс народного хозяйства в районном масштабе // Экономическое строительство. 1926. № 11–12. С. 5.

[5] Кернажыцкі К. І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 1935; Ён жа. Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVIII да паловы XIX ст. Мн., 1931; Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966; Козловский П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. Мн., 1982.

[6] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965; Фридман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958.

[7] Дудкоў Д. А. Аб развіцьці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стагодзьдзя. Мн., 1932; Кожушков А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1963; Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971; Ён жа. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978; Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990; Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861–1914 гг. Мн., 1989; Ён жа. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси. Мн., 2001.

[8] Козловский П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. Мн., 1982.

[9] Кернажыцкі К. І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 1935; Фридман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966; Яна ж. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972; Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971; Ён жа. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978; Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990.

[10] Кожушков А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1963. С. 75–76.

[11] Шабуня К. И. Назв. твор. С. 21.

[12] Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мн., 2002. С. 523.

[13] Беларускія погляды на сутнасць мікрагісторыі гл.: Насевіч В. Мікрагісторыя: мінулае ў чалавечым вымярэнні // Бел. гіст. агляд. 1999. Т. 6. Сш. 1–2 (10–11). С. 133–151.

[14] Киштымов А. Л. Эволюция экономического мышления белорусского крестьянина: от отмены крепостного права до октября 1917 г. // Наш Радавод. Гродна, 1996. Кн. 7. С. 278–282.

[15] Улашчык М. Вёска Віцкаўшчына (1883–1917 гг.). Гісторыка-этнаграфічны нарыс // Полымя. 1988. № 7. С. 139–162; № 8. С. 139–163; № 9. С. 185–197; Ён жа. Была такая вёска. Гісторыка-этнаграфічны нарыс. Мн., 1989; Улащик Н. Н. Деревня Вицковщина. 1880–1917 гг. Историко-этнографический очерк. М., 2003.

[16] Брэгер Г. Хацюхова. Гісторыя невялікага паселішча. Мн., 2001.

[17] Токць С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох: змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (па матэрыялах Гарадзеншчыны 19 – першай трэці 20 ст.). Гродна, 2003.

[18] Носевич В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Мн., 2004.

[19] Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мн., 2002. С. 98.

[20] Носевич В. Л. Назв. твор. С. 220, 221.

[21] Улащик Н. Н. Деревня Вицковщина. 1880–1917 гг. Историко-этнографический очерк. М., 2003. С. 21–22.

[22] Киштымов А. Л. «Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг.» М. В. Довнар-Запольского: новое прочтение и запоздалая рецензия // Чацвёртыя Міжнародныя Доўнараўскія чытанні (г. Рэчыца, 18–19 верасня 2003 г.): У 2 ч. Ч. 1: М. В. Доўнар-Запольскі: жыццё і навуковая спадчына. Гомель, 2004. С. 196–197.

[23] Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Мн., 1962. С. 29.

[24] Напрыклад: Шабуня К. И. О развитии капитализма в помещичьем хозяйстве Белоруссии в конце XIX и начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1961 г. Рига, 1963. С. 435–447; Савицкий Э. М. Помещичье землевладение и землепользование в Белоруссии в начале XX века (1905–1917 гг.) // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1964 год. Кишинев, 1966. С. 723–730; Панютич В. П. Помещичье землевладение в Белоруссии во второй половине XIX в. // Проблемы аграрной истории (XIX – 30-е годы XX в.). Ч. 2. Мн., 1978. С. 66–77.

[25] Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Мн., 1962; Кожушков А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1963; Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971; Ён жа. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978; Бейлькин Х. Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси. Мн., 2001.

[26] Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Мн., 1962. С. 49.

[27] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 18. С. 18.

[28] Шабуня К. И. О развитии капитализма в помещичьем хозяйстве Белоруссии в конце XIX и начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1961 г. Рига, 1963. С. 446.

[29] Савицкий Э. М. Помещичье землевладение и землепользование в Белоруссии в начале XX века (1905–1917 гг.) // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1964 год. Кишинев, 1966. С. 730.

[30] Панютич В. П. Помещичье землевладение в Белоруссии во второй половине XIX в. // Проблемы аграрной истории (XIX – 30-е годы XX в.). Мн., 1978. Ч. 2. С. 77.

[31] Кіштымаў А. Л. Эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі ў канцы XVIII – 50-х гадах XIX ст. // З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.-культурал. зб. 2-е выд. Мн., 2002. Вып. 2. С. 79–100.

[32] Киштымов А. Л. Исторические особенности экономического развития Беларуси XIX в. в трудах Н. Н. Улащика // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага). Мн., 1997. С. 136–144.

[33] Вебер М. Избранные произведения. М., 1990. С. 88.

[34] Киштымов А. Л. К вопросу о промышленном перевороте и индустриализации Беларуси: понятия, хронологические рамки // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця. Матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў. Мінск, 10–11 красавіка 1997 г. Мн., 1999. С. 101–103.

[35] Соловьева А. М. Промышленная революция в России в XIX в. М., 1990. С. 268.

[36] История рабочего класса Белорусской ССР. Мн., 1984. Т. 1. С. 44.

[37] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.). Мн., 1966. С. 89–90.

[38] Киштымов А. Л. Уроки истории: экономика Беларуси XIX – начала XX в. // Известия Гомельского гос. ун-та. 2001. № 2 (5). Экономика. С. 132–140.

[39] Гл.: Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. Мн., 1996.

[40] Киштымов А. Л. Три биографии: к вопросу о генезисе научно-технической культуры в Белоруссии // Наш Радавод. Гродно, 1991. Кн. 3. Ч. 2. С. 337–346; Ён жа. Виленское отделение Русского технического общества – первая научно-техническая ассоциация на белорусской земле // Наука и инновации. 2004. № 2 (12). С. 59–63.

[41] Болбас М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988.

[42] Лыч Л. М., Созинов В. А. Белорусская магистраль накануне своего столетия. 1871–1971. Мн., 1970; Железнодорожная магистраль Белоруссии. К столетию со дня введения в строй. Мн., 1971; Этапы большого пути, 1871–1996: 125 лет Белорусской железной дороге. Мн., 1996; Железная дорога Беларуси. История и современность. Мн., 2001; Гапеев В. И., Легчеков Л. Ф. Из века в век. К 130-летию Минского отделения Белорусской железной дороги. Мн., 2001.

[43] Соловьева А. М. Железнодорожный транспорт России во второй половине XIX в. М., 1975.

[44] Истомина Э. Г. Водные пути России во второй половине XVIII – начале XIX века. М., 1982; Яна ж. Водный транспорт России в дореформенный период (Историко-географическое исследование). М., 1981.

[45] Киштымов А. Л., Козлов Л. Р. Автомобиль на Беларуси. 100 лет. Мн., 1996.

[46] Экономика Белоруссии в эпоху империализма. Мн., 1963. С. 275–350.

[47] Тимошенко В. В. Роль банков в льноторговле дореволюционной Белоруссии (1900–1914 гг.) // Вопросы развития народного хозяйства Белоруссии и Прибалтики. Мн., 1963. С. 151–158; Яна ж. Кредитная система Белоруссии в начале XX в. // Исторические записки. М., 1965. Т. 78. С. 63–84.

[48] Бейлькин Х. Ю. Кооперативное движение в Беларуси (эпоха капитализма). Гомель, 1998. С. 11–29.

[49] Грузицкий Ю. Л. История развития денежно-кредитной системы Беларуси. Мн., 2002.

[50] Грузицкий Ю. Л. Минский коммерческий банк (возникновение, развитие, ликвидация) // Белорусский банковский бюллетень. 2002. Вып. 47 (202); Грузицкий Ю., Полетаева Н. Частный банкирский промысел в дореволюционной Беларуси // Белорусский банковский бюллетень. 2003. Вып. 28 (231). С. 40–49.

[51] Грузицкий Ю., Полетаева Н. Назв. твор. С. 40.

[52] Швед В. В. Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы). Гродно, 1995.

[53] Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. Мн., 1989.

[54] Швед В. В. Назв. твор. С. 83.

[55] Бейлькин Х. Ю. Назв. твор. С. 238.

4.3. Рынак працы і сацыяльна-эканамічная арыентацыя народаў Беларусі

Сучасная заходняя гістарыяграфія надае выключна важнае значэнне вывучэнню дэмаграфічных аспектаў рынкавай эканомікі. Пачатак такога падыходу быў пакладзены ў працах гісторыкаў, якія належаць да школы «Аналаў». Яны імкнуліся паказаць, што «кожнае грамадства знаходзіцца ў стане сталага самаканструявання»[1]. Прадстаўнікі гэтай школы адзначалі, што метадалагічнай падставай для іх высноў былі тэорыі выбітных эканамістаў эпохі, у тым ліку і нашага земляка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне эканомікі Саймана Кузняца[2]. Адсутнасць на Захадзе метадалагічнага разрыву паміж эканамістамі і гісторыкамі садзейнічала таму, што фундаментальныя і абагульняльныя працы па гісторыі рынку абавязкова ўключаюць раздзелы, прысвечаныя гісторыі розных аспектаў эканамічнага і дэмаграфічнага развіцця.

Відавочна, што найбольш важнай і неад'емнай часткай рынку з'яўляецца рынак працоўнай сілы. Аднак ва ўмовах Расійскай імперыі даследчыкі фактычна ігнаравалі гэтае пытанне. Безумоўна, у іх працах магчыма сустрэць разважанні і назіранні аб працоўных навыках асобных катэгорый насельніцтва, зрэдку пададзеныя з улікам этнаграфічных і нацыянальных аспектаў[3]. Але буйных абагульняльных работ з аналізам працоўных рэсурсаў як усёй імперыі, так і беларускіх губерняў у прыватнасці фактычна не было створана.

На гэтым фоне марксісцкая традыцыя ў савецкай гістарыяграфіі выглядае сапраўдным прарывам. Савецкая гістарыяграфія па-свойму запоўніла дарэвалюцыйны прагал. Класавы падыход і прапаганда эканамічнага дэтэрмінізму паставілі на павестку дня ролю чалавека ў эканоміцы.

Як вядома, для марксісцкіх поглядаў на гісторыю ключавое значэнне мае пытанне пра фарміраванне пралетарыяту. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў класічнай работай на гэту тэму ў беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца манаграфія З. Абезгаўза «Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века» (Мн., 1971). На ёй ляжыць адбітак часу, але нельга не адзначыць, што аўтарам упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі быў сабраны і сістэматызаваны велізарны гістарычны матэрыял, які раней не выкарыстоўваўся даследчыкамі, і які дазволіў яму выказаць сваё меркаванне па асноўных аспектах праблемы: становішчы капіталізму ў прамысловасці Беларусі ў 60–90-я гады

XIX ст., крыніцах фарміравання беларускага пралетарыяту, яго складзе і ўмовах працы. На думку З. Абезгаўза, «фабрыкі і заводы да сярэдзіны 90-х гадоў сталі адыгрываць кіроўную ролю ў асноўных галінах прамысловай вытворчасці Беларусі»[4], а ў прамысловасці «склаліся значныя па колькасці пастаянныя кадры рабочых, сярод якіх меліся патомныя пралетарыі з вялікім вытворчым стажам»[5]. Тым не менш, далёка не заўсёды высновы аўтара, выказаныя як у першым томе «Истории Белоруссии» (Мн., 1961), так і ў вышэй згаданнай манаграфіі, выглядалі пераканаўча.

Перш за ўсё гэта датычыла падліку агульных лічбаў асобных катэгорый пралетарыяту Беларусі, яго удзельнай вагі сярод іншых груп насельніцтва і яго нацыянальнага складу. На гэта літаральна праз год пасля выхаду манаграфіі З. Абезгаўза з друку указаў М. Біч[6]. На яго думку, як Абезгаўз, так і А. Воранава (у кнізе «Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг.». Мн., 1960) абмежаваліся «агульнымі заявамі аб шматнацыянальным складзе мясцовага пралетарыяту, падмацаванымі ў рэдкіх выпадках большай ці меншай колькасцю ілюстрацый, якія паказваюць колькасныя суадносіны яўрэйскіх і неяўрэйскіх (беларускіх, рускіх, польскіх, украінскіх) рабочых на асобных прадпрыемствах Беларусі» і не вырашылі прынцыповае пытанне аб нацыянальным складзе прамысловага пралетарыяту[7]. Пры гэтым, не ведаючы нацыянальнага складу пралетарскага насельніцтва гарадоў і мястэчак, «нельга зразумець і высветліць характар і асаблівасці развіцця рэвалюцыйнага і асабліва сацыял-дэмакратычнага руху на Беларусі»[8]. У сваю чаргу М. Біч лічыў, што «выхад са, здавалася б, бязвыхаднага становішча адкрыў У. Ленін». І ленінскую методыку – выкарыстанне ў якасці асновы для разважанняў матрыцы вынікаў Усерасійскага перапісу 1897 г. гандлёва-прамысловага насельніцтва Пецярбурга – магчыма распаўсюдзіць, як на ўсю Расійскаю імперыю, так і на Беларусь[9].

Аднак прадпрынятую беларускім даследчыкам спробу нельга прызнаць слушнай. Занадта вялікай была розніца, як у дэмаграфічным, так і ў эканамічным становішчы, такіх розных велічынь і розных рэгіёнаў, як Пецярбург, уся Расійская імперыя і яе беларускія губерні.

Аб'ектыўна нельга пагадзіцца з найбуйнейшым айчынным даследчыкам рабочага класу Беларусі і тады, калі ён, услед за Леніным, з адпаведнай спасылкай на яго працу[10], сцвярджае: «У паняцце «прамысловы пралетарыят» мы ўключаем рабочых фабрычнай і рамеснай прамысловасці, гандлю, усіх відаў транспарту,

а таксама гарадскую хатнюю прыслугу і падзёншчыкаў, г. зн. усіх найманых рабочых, акрамя тых, якія працавалі ў сельскай гаспадарцы»[11]. Пасля такой заявы, калі побач з фабрычна-заводскімі рабочымі ў катэгорыі «прамысловы пралетарыят» апынуліся афіцыянты, прыказчыкі і пакаёўкі, не даводзіцца здзіўляцца таму рознагалоссю, якое і зараз існуе наконт базавай лічбы – агульнаму падліку колькасці беларускага рабочага класа. Напрыклад, згодна з падлікамі А. Воранавай, «у 1890 г. агульная колькасць фабрычна-заводскіх рабочых, улічаных статыстыкай, складала ўжо каля 12 тыс., а да канца 1900 г. амаль падвоілася, склаўшы звыш 24 тыс. чалавек»[12]. Калектыўная манаграфія «Экономика Белоруссии в эпоху империализма» дае наступныя лічбы: у 1900 г. у прамысловасці Беларусі занята 98 тыс. рабочых, у тым ліку ў фабрычна-заводскай прамысловасці 34,9 тыс., у цэнзавай прамысловасці 31 тыс.[13]. У З. Абезгаўза колькасць фабрычна-заводскіх і чыгуначных рабочых разам да канца XIX ст. складае каля 52 тыс. Усяго ў той час у прамысловасці і на чыгуначным транспарце налічвалася 142,8 тыс. чалавек, а ўсіх рабочых, якія працавалі па найме, было 433 тыс.[14]. Паводле падлікаў М. Біча прамысловы пралетарыят Беларусі напрыканцы XIX ст. складаў 289,7 тыс. чалавек[15]. У той жа час у Беларусі налічвалася каля 150 тыс. сельскагаспадарчых рабочых (парабкаў) і да 300 тыс. рабочых-адыходнікаў[16]. У манаграфіі М. Болбаса сцвярджаецца, што ў 1897 г. у Беларусі налічвалася 178,8 тыс. наёмных рабочых, занятых у прамысловасці (з чорнарабочымі і падзёншчыкамі), а без апошніх – 109,1 тыс.[17]. Але літаральна побач узгадана пра «амаль што 140-тысячную армію прамысловага пралетарыяту»[18]. А ў «Заключэнні» гаворка ідзе пра 255 тыс. чал. наёмнага пралетарыяту Беларусі, занятага ў яе прамысловасці да пачатку XX ст.[19]. «История рабочего класса Белорусской СССР» спыняецца на лічбе прыкладна 1,2 млн чал. пралетараў і паўпралетараў у канцы XIX ст., з якіх на долю «чыстых» пралетараў прыходзілася каля 400 тыс.[20]. З. Шыбека ў артыкуле «Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст.» налічыў 86 тыс. пралетараў-беларусаў[21], што значна адрозніваецца ад падлікаў М. Біча (49,7 тыс.)[22]. А. Каханоўскі дае наступную карціну: у пачатку XX ст. агульная колькасць пастаянных наёмных работнікаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі дасягала 460 тыс. чалавек, у тым ліку: у прамысловасці – 237 тыс. рабочых і на чыгунках 25 тыс. рабочых[23].

Апошнюю кропку павінна была б паставіць «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі». Але адпаведны артыкул – «Рабочы клас»

(аўтар за перыяд да 1917 г. М. Біч) – канчаткова заблытвае гэта быццам бы простае і ў той жа час асноўнае для савецкай гістарыяграфіі пытанне, без якога любыя высновы наконт «гегемона» класавай барацьбы, узроўня капіталістычнага развіцця Беларусі і яе «падрыхтаванасці» да сацыялістычнай рэвалюцыі губляюць сэнс. Згодна з энцыклапедычным артыкулам «агульная колькасць наёмных работнікаў у эканоміцы Беларусі да канца XIX ст. вырасла да 400 тыс. чал.», з іх у прамысловасці было занята 178,8 тыс. чал., на чыгуначным транспарце – 24,8 тыс. чал., на рачным і гужавым транспарце, у сродках сувязі, гандлі і іншых сферах найму – 67,5 тыс., у сельскай гаспадарцы – 130 тыс.[24]. Чаму менавіта такім чынам у артыкуле злучаны асобныя лічбы, раней вылучаныя рознымі аўтарамі, не паведамляецца.

Абавязковым сюжэтам савецкай гістарыяграфіі рабочага класа сталі разважанні наконт яго эксплуатацыі і цяжкага матэрыяльнага становішча. Для беларускай гістарыяграфіі класічнай працай на гэту тэму стала манаграфія У. Іванова. Апавяданне пра тое, што «беларускія пралетарыі ў сілу некаторых спецыфічных умоў ледзь трымаліся ў параўнанні з рабочымі прамыслова развітых раёнаў Расіі і Украіны»[25], аўтар завяршае некалькі анекдатычным падсумаваннем: «Такім чынам, жыццё рабочых дарэвалюцыйнай Беларусі канцэнтравала ў сабе лепшыя рысы беларускай нацыі»[26].

Класічным тэзісам марксісцкай гістарыяграфіі ёсць сцвярджэнне аб тым, што «імкнучыся павялічыць прыбытак, капіталісты ператваралі ў аб'ект эксплуатацыі жанчын і дзяцей, якім за роўную працу з мужчынамі плацілі менш»[27]. Але ніхто і ніколі з гісторыкаў так і не змог знайсці хаця б адзін прыклад, калі побач, на адным і тым жа прадпрыемстве, на адных і тых жа працоўных месцах, працавалі мужчына, жанчына і падлетак, і пры гэтым іх заробак на самой справе адрозніваўся.

Аб тым, якой методыкай карысталіся савецкія гісторыкі пры падыходзе да крыніц, сведчаць іх адносіны да прац аднаго з найбуйнейшых прадпрымальнікаў, шматгадовага дырэктара Добрушскай папяровай фабрыкі А. Стульгінскага, які ажыццявіў першым у Расійскай імперыі (і адным з першых у свеце) ўвядзенне з 1894 г. 8-гадзіннага працоўнага дня. З таго часу ён нястомна прапагандаваў гэты прагрэсіўны крок[28]. Абгрунтоўваючы неабходнасць такой меры, Стульгінскі падкрэсліваў, што яна дазваляла пазбавіцца ад цяжкіх і неспрыяльных умоў працы і падрабязна засяроджваў увагу на іх пераліку. Менавіта гэтая, так бы мовіць «негатыўная», частка прац Стульгінскага аднабока выкарыстоў-

валася айчыннымі гісторыкамі і складальнікамі зборнікаў гістарычных дакументаў і матэрыялаў, як доказ цяжкага становішча працоўных. У той жа час аб тым, што дзеля паляпшэння гэтага становішча быў уведзены 8-гадзінны працоўны дзень, звесткі свядома замоўчваліся.

У адрозненне ад пралетарыяў, падлік беларускіх сялян – дакладна вызначанай у саслоўнай ерархіі Расійскай імперыі катэгорыі – не выклікаў асаблівых праблем у беларускіх гісторыкаў. Між тым і гістарыяграфія беларускага сялянства не пазбаўлена шматлікіх недарэчнасцей і пралікаў. Сярод іх пытанні аб сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства, становішчы асобных катэгорый сялян, аналіз гістарычных перспектыў сялянскай гаспадаркі.

Праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай парэформеннай вёскі з'яўляюцца прадметам даследаванняў В. Панюціча[29]. У яго працах асвятляюцца пазямельная палітыка царскага ўрада, прадукцыйныя сілы сельскай гаспадаркі, разлажэнне сялянства, выкарыстанне наёмнай працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Вывучаецца дэмаграфія сялянскага насельніцтва, аграрная перанаселенасць, адыходніцтва, сацыяльная арганізацыя сялян, сямейныя падзелы. Шматгадовая праца па даследаванні гісторыі сельскай гаспадаркі Беларусі робіць В. Панюціча сапраўдным класікам сярод айчынных гісторыкаў-аграрнікаў. Разам з тым, аналіз яго поглядаў як мага лепш дазваляе прааналізаваць здабыткі і хібы ўсёй беларускай аграрнай гістарыяграфіі.

Кандыдацкая дысертацыя В. Панюціча і надрукаваная на яе аснове манаграфія з'яўляюцца першымі ў беларускай гістарыяграфіі працамі, цалкам прысвечанымі вывучэнню дынамікі працоўных рэсурсаў беларускага сялянства, праўда, толькі ў адным аспекце – развіцці адыходніцтва[30]. Тым не менш, у працы закранаецца велізарны пласт праблем, нярэдка выходзячых за рамкі пытання аб адыходніцтве: класавае размежаванне і згаленне сялянства, аграрная перанаселенасць, тыпалогія і раянаванне адыходніцтва, умовы найму, працы і быту. Ужо ў першай сваёй манаграфіі В. Панюціч сутыкнуўся з тым, што марксісцка-ленінская метадалогія не заўсёды дае магчымасць зрабіць навукова абгрунтаваныя высновы. Аўтар атрымаў невырашальную дылему. Як добрасумленны гісторык ён зафіксаваў нізкі ўзровень адыходніцтва ў Беларусі ў адрозненне ад цэнтральна-прамысловага і некаторых іншых раёнаў імперыі[31]. Хоць, быццам бы, усе наяўныя ўмовы для пашырэння адыходніцтва ў Беларусі былі. Пераканаўчага тлумачэння гэтаму аўтар так і не змог даць. Ён то называе паўночна-за-

ходнія і прыбалтыйскія губерні раёнамі масавага найму сельскагаспадарчых рабочых, то сцвярджае, што попыт на прышлых сельскагаспадарчых рабочых тут быў параўнальна невялікім[32].

Для прац В. Панюціча характэрна добрасумленнасць фактаграфічнага пошуку. У гэтым дачыненні ён найбольш выразны прадстаўнік беларускай савецкай гістарыяграфіі. Але гістарычныя факты – рэч упартая. У межах абранай канцэпцыі кожны гісторык вольны інтэрпрэтаваць іх па-свойму. Аднак, сабраныя разам, яны цалкам здольны абвергнуць самыя вытанчаныя гістарычныя канцэпцыі. Працы В. Панюціча ў гэтых адносінах не з'яўляюцца выключэннем. Так, ён неаднаразова падкрэсліваў, што і ў другой палове XIX ст. і на пачатку XX ст. працоўны заробак сельскагаспадарчых рабочых у Беларусі знаходзіўся на адным з апошніх месцаў у еўрапейскай частцы Расійскай імперыі[33]. Верагодна, у намінальным выражэнні гэта так. Калі ж паглядзець на працоўны заробак як на эканамічную катэгорыю, параўнаць рэгіянальныя ўзроўні коштаў, бюджэты наёмных работнікаў у залежнасці ад мясцовасці, то ўзнікае шэраг пытанняў. В. Панюціч прыводзіць шматлікія сведчанні пра тое, што ў сельскай гаспадарцы Беларусі шукалі і знаходзілі сабе прымяненне сельскагаспадарчыя рабочыя не толькі з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі – Прыбалтыкі, Польшчы, але і з Галіцыі, Чэхіі, Венгрыі і нават Прусіі. Як гэта растлумачыць? Няўжо іх прываблівалі нізкія заробкі, надзвычай неспрыяльныя жыллёва-бытавыя ўмовы, адсутнасць медыцынскай дапамогі, бяспраўнасць, «напаўпрыгонныя» ўмовы працы?

Да часу ўключэння ў склад Расійскай імперыі на беларускіх землях склалася даволі выразная «прапіска» этнасаў у адносінах да асобных галін эканомікі: селянін-беларус, паляк-абшарнік, яўрэй-гандляр або рамеснік. Гэтае назіранне, зразумела, не трэба перабольшваць і абсалютызаваць, але, як пэўная гістарычная мадэль, гэта мела месца. У XIX ст. да ліку дзейных у эканамічнай сферы асоб дадаліся постаці наёмнага рабочага, заводчыка і фабрыканта, банкіра, адміністратара дзяржаўнага прадпрыемства. Што датычыць этнічнай прыналежнасці суб'ектаў эканомікі, то, па-першае, яна была разбаўлена «рускім элементам», а, па-другое – стала больш стракатай. Строгая прывязка нацыянальнасцей да вызначаных відаў эканамічных намаганняў, якую ў некаторай ступені магчыма лічыць спадчынай феадалізму, аслабла. Асабліва выразна такая тэндэнцыя выявілася пры фарміраванні новага сацыяльнага слою прадпрымальнікаў. У гэтым адбілася нівеліруючае

ўздзеянне эканомікі. На наш погляд, вузлавымі праблемамі пры разглядзе этнічнага аблічча беларускай эканомікі і рынку Беларусі з'яўляецца пытанне аб так званым «рускім» і «польскім» землеўладанні, эканамічны партрэт селяніна-беларуса і роля яўрэяў у беларускай эканоміцы.

Увядзенне мяжы аселасці і існаванне адмысловага заканадаўства аб яўрэях – найбольш відавочнае сведчанне і адлюстраванне таго комплексу праблем, з якімі сутыкнулася расійская агульнаімперская ідэалогія і практыка ў Беларусі.

У сучаснай юдаістыцы праблемы гісторыі эканамічнага жыцця яўрэйскага народа не належаць да ліку прыярытэтных, і вельмі сціпла выглядаюць на фоне даследаванняў па гісторыі рэлігіі і культуры яўрэяў, іх прававога становішча, дзяржаўнай антыяўрэйскай рэпрэсіўнай палітыкі.

Але так было далёка не заўсёды. У канцы XVIII і XIX ст. менавіта пытанне эканамічнага жыцця яўрэяў часта служыла падмуркам для афіцыйнай пазіцыі і палітыкі самаўладства па «яўрэйскім пытанні». З часоў Кацярыны II гістарычныя матэрыялы літаральна стракацяць шматлікімі заявамі пра эканамічнае «засілле» яўрэяў, «ввергавших край в нищету»[34]. Тут трэба адзначыць два моманты. Па-першае, царская Расія ў дадзеным становішчы не была арыгінальнай і крочыла ўслед аналагічнай традыцыяй часоў Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. Калі зрабіць больш шырокае абагульненне, то гэта сусветная тэндэнцыя пошуку за яўрэямі эканамічных «грахоў». Па-другое, нават у другой палове XIX ст. антыяўрэйская аргументацыя засталася практычна нязменнай і вызначалася не менш выразнай палемічнай завостранасцю, чым напрыканцы XVIII ст.

Да сярэдзіны XIX ст. канчаткова аформілася гістарычная традыцыя адназначна негатыўнай ацэнкі ўнёску яўрэйскага народа ў развіццё эканомікі Расійскай імперыі. Пры гэтым пад самую пагромную крытыку падпадалі носьбіты эканамічнай ініцыятывы. Тыя, хто быў найбольш выдатнымі ў эканамічным жыцці, г. з. прадпрымальнікі.

Сярод яўрэйскіх даследчыкаў І. Аршанскі стаў першым, хто звярнуў сур ёзную ўвагу на аналіз стану эканамічнага жыцця яўрэйскага народа ў Расійскай імперыі. Яго асноўныя погляды ў гэтым пытанні выказаны ў артыкулах з характэрнымі назвамі: «Взгляд на экономический быт русских евреев», «Благоденствуют ли евреи в Западном крае?», «Евреи-крепостные», «Что такое еврейская торговля и промышленность?», «Еврейская торговля и внутренние

губернии», «Земледельческий труд у евреев», «Евреи и торговля питьями». І. Аршанскі цалкам слушна адзначыў: «Ні адзін бок яўрэйскай праблемы не абмяркоўваўся так часта, як пытанне пра значэнне і характар яўрэйскай прамысловай дзейнасці. Магчыма нават казаць, што ў гэтай тэме хаваецца ўся сутнасць яўрэйскага пытання…»[35].

Прапанаваная І. Аршанскім аргументацыя была развіта ў працах іншых яўрэйскіх даследчыкаў і публіцыстаў. Можна сказаць, што чым часцей у адрас яўрэяў гучалі абвінавачванні ў эканамічным «прэсінгу» ў адносінах да хрысціян, тым больш гучна чуліся заклікі даць «прастору» яўрэйскай эканамічнай ініцыятыве.

Аднак звернемся да гістарычных фактаў. Яны прымушаюць паставіць пад сумнеў канцэпцыю І. Аршанскага. Практычна цалкам у яўрэйскіх руках былі сканцэнтраваны такія галіны беларускай эканомікі, як тытунёвая прамысловасць, вытворчасць запалак, шпалер, значныя магутнасці ў сілікатна-будаўнічай прамысловасці (вытворчасць кафлі), друкарская справа, гарбарні, футравы промысел, вытворчасць мыла, гадзіннікавая і ювелірная справа. Яўрэйскі капітал шукаў і знаходзіў сабе прымяненне ў піваварнай і шкляной прамысловасці, сталярна-мэблевай і хімічнай вытворчасці, мукамольна-крупяной прамысловасці, сельскагаспадарчым машынабудаванні. Прадпрымальнікаў-яўрэяў магчыма было сустрэць на ўсіх «паверхах» беларускай эканомікі. Яны з'яўляліся ўладальнікамі не толькі шматлікіх дробных, але і сярэдніх і буйных прадпрыемстваў. Да ліку іх адносіліся самая вялікая па колькасці рабочых у дарэвалюцыйнай Беларусі тытунёвая фабрыка Шарашэўскага ў Гродне, другая па велічыні сярод прадпрыемстваў папяровай прамысловасці фабрыка ў Шклове, адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці АТ «Дняпроўская мануфактура» ў Дуброўне. Яўрэям належалі і ўнікальныя прадпрыемствы – манапалісты на агульнаімперскім рынку: алоўкавая фабрыка ў Гродне (адна з чатырох, што існавалі на той час у Расійскай імперыі). Паводле ацэнкі аўтарытэтнага даследчыка рабочага класа Беларусі М. Біча, да канца XX ст. яўрэйская буржуазія мела ва ўласнасці больш за палову (51%) беларускіх фабрык і заводаў[36].

Характэрна, што прадпрымаючы спробы зменшыць і нават адмаўляць ролю яўрэяў-прадпрымальнікаў у прамысловай вытворчасці, яўрэйскія аўтары не адважваліся на размову пра ролю яўрэяў у крэдытна-фінансавай сферы, прычым не толькі ў рамках «мяжы аселасці», але і па ўсёй Расійскай імперыі. Пра гэты бок эканамічнай дзейнасці яўрэяў яны палічылі за лепшае замаўчаць.

Хоць, здавалася б, немагчыма было не заўважыць такіх стваральнікаў фінансавых імперый, як Гінцбургі альбо Паляковы. Што датычыць прыватнага крэдыту ў беларускіх губернях, то гістарычныя факты пераканаўча сведчаць пра дамінаванне яўрэйскіх капіталаў у гэтай справе. Спробы «русіфікацыі» прыватнага крэдыту Беларусі не мелі поспеху[37].

Безумоўна, характэрнай рысай і асаблівасцю беларускага гандлю канца XVIII – пачатку XX ст. з'яўляецца яго «яўрэйскае аблічча». Згодна з перапісам 1897 г., у купецкім саслоўі пяці беларускіх губерняў яўрэі складалі 84,5%, рускія – 10,7% і толькі 1,7% былі беларусамі[38]. Такое становішча складвалася на працягу стагоддзяў, але найбольш выразна выявілася менавіта ў дадзены перыяд. Магчыма, гэта адна з самых яскравых праяў ужо адзначанай намі гістарычнай тэндэнцыі да сацыяльна-эканамічнай «спецыялізацыі» нацыянальнасцей, якія жылі на беларускіх землях.

Разам з тым, на наш погляд, трэба крытычна адносіцца да афіцыйнай, адназначна негатыўнай, ацэнкі яўрэйскага «засілля» ў эканамічным жыцці беларускіх губерняў і асабліва ў гандлёвай сферы. Зрэшты, нават у афіцыйных выданнях час ад часу чуліся цвярозыя галасы. Так, яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. афіцэр Генеральнага штабу І. Зяленскі адзначаў: «Паводле нашага меркавання, няма ніякіх падставаў сцвярджаць, што манаполія яўрэяў у гандлі і рамёствах ёсць зло, якое затрымлівае ў краіне развіццё гандлёвага прадпрымальніцтва. Прычыну гэтай манаполіі хутчэй трэба шукаць у нясхільнасці мясцовага насельніцтва да гандлю, у яго прыроджанай схільнасці да земляробчай прамысловасці, у рысах хрысціянскага і яўрэйскага насельніцтва, у эканамічных умовах краіны і, нарэшце, – у гістарычным ходзе падзей, пад уплывам якіх стварыліся сённяшнія саслоўі і класы насельніцтва»[39]. З гэтымі высновамі нельга не пагадзіцца. Нягледзячы на пэўныя выдаткі, звязаныя з непазбежным у гэтым выпадку этнічным перакосам у сацыяльна-эканамічнай структуры грамадства, у цэлым эканамічныя намаганні прадпрымальнікаў-яўрэяў станоўча ўплывалі на развіццё эканомікі Беларусі.

Да ліку тых рэдкіх публікацый, у якіх самі яўрэі гаварылі пра свае эканамічныя дасягненні, адносіцца грунтоўная і насычаная цікавым матэрыялам манаграфія Х. Карабкова «Экономическая роль евреев в русской лесоторговле и промышленности» (Пг., 1916). Ён адзначае, што Паўночна-заходні край, дзякуючы «выключна творчай ініцыятыве бяспраўных яўрэяў адыгрывае выдатную ролю ў агульнай расійскай лясной прамысловасці і гандлі»[40].

У 1930-я гг. тыя з даследчыкаў, што звярталіся да яўрэйскай тэматыкі, палічылі за лепшае рухацца па шляху, які пазначыў І. Аршанскі. Беларусь яны ацэньвалі як эканамічна адсталы край, з перавагай рамесна-саматужнай вытворчасці, дзе мясцовая гарадская прамысловая буржуазія (якраз, у пераважнай большасці – яўрэйская) была «асабліва слабой... і на канец XIX ст. у значна большай меры чым расійская буржуазія была адсунута на задні план, з аднаго боку іншаземным капіталам, з іншага – капіталам аграрным»[41].

У сучаснай гістарыяграфіі тэма «Яўрэі і эканоміка» так і не выйшла з забыцця. Справа дайшла да гістарыяграфічнага парадоксу: асобныя артыкулы альбо сюжэты пра эканамічную дзейнасць яўрэяў выглядаюць вельмі сіратліва і адзінока на фоне салідных прац і кандыдацкіх дысертацый пра яўрэйскую дабрачыннасць. Хоць, здавалася б, гаворачы пра дабрачыннасць альбо мецэнацтва, гісторыкі непазбежна павінны былі даследаваць і пытанне пра крыніцы фінансавання такой дзейнасці. Але нават у гістарычнай літаратуры пра яўрэяў Беларусі, знакамітыя прадпрымальнікі Паляковы, чый радавод звязаны з беларускай зямлёй, у адпаведных біяграфічных нарысах пазначаны як «грамадскія дзеячы» і нічога не гаворыцца пра іх эканамічную дзейнасць[42].

Асобная праблема гістарыяграфіі рынку – біяграфія капіталу праз біяграфію асобы. На працягу XIX ст. у Беларусі паступова склалася новая сацыяльная група – прадпрымальнікі. Іх з'яднала не саслоўнае паходжанне або маёмаснае становішча, а здольнасці весці справы на асновах і прынцыпах рынкавай эканомікі. Гэта быў новы тып арганізатараў капіталістычнай вытворчасці з глыбокім веданнем тэхнікі і тэхналогіі, гатовых несці адказнасць за свае рашэнні. Яны праводзілі энергічную сацыяльную палітыку на сваіх прадпрыемствах і бралі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці. Пры фарміраванні гэтай сацыяльнай катэгорыі выразна выявілася нівелюючая грамадская роля рынкавай эканомікі. Напрыклад, для ўваходжання ў групу прадпрымальнікаў не было перашкод саслоўнага альбо этнаканфесійнага характару. І гэта было адлюстраваннем агульнасусветнай тэндэнцыі – паўсюды палітычнай дэмакратыі папярэднічае дэмакратыя эканамічная, дэмакратыя рынку.

Прынцыповае значэнне для айчыннай гістарыяграфіі, на наш погляд, мае артыкул З. Шыбекі пра сацыяльнае размежаванне беларусаў напрыканцы XIX ст.[43]. Аўтар прапанаваў уласную методыку пабудовы сацыяльных мадэлей беларускага насельніцтва,

што дазволіла яму шмат у чым па-новаму адлюстраваць сацыяльны партрэт беларускага сельскагаспадарчага і гандлёва-прамысловага насельніцтва, сацыяльную структуру беларускага невытворчага насельніцтва і сацыяльны партрэт беларускага народу ў адпаведны гістарычны перыяд. Агульная выснова аўтара заключаецца ў тым, што «пралетарызацыя беларусаў ішла хутчэй за ўзбагачэнне... Праз пралетарызацыю беларускі народ прыстасоўваўся да патрэбаў буржуазіі і каштоўнасцяў суседніх нацыяў і тым самым адрываўся ад нацыянальнай глебы»[44].

Беларуская нацыянальная буржуазія ў другой палове XIX – пачатку XX ст. знаходзілася яшчэ ў стадыі станаўлення і ўяўляла сабой найбольш слабую праслойку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Сярод беларусаў не было колькі-небудзь значнага пласту буйной і сярэдняй прамысловай буржуазіі. Часцей за ўсё беларусы сустракаліся сярод уладальнікаў дробных прадпрыемстваў, размешчаных у сельскай мясцовасці – млыноў, ганчарных майстэрняў, цагельных заводаў.

Прадпрымальнікі з'яўляліся ключавой фігурай у поспехах беларускай эканомікі. З другой паловы XX ст. яны сталі аказваць уздзеянне на дзяржаўную эканамічную палітыку не толькі шляхам уласных эканамічных намаганняў, але і праз свае прадпрымальніцкія прадстаўнічыя арганізацыі. Найбольшым уплывам у Беларусі карысталіся таварыствы сельскіх гаспадароў (існавалі ва ўсіх беларускіх губернях і шэрагу ўездаў), з'езды прадпрымальнікаў (фабрыкантаў, судапрамыслоўцаў, лесагандляроў, банкіраў, коміваяжораў) і іх галіновыя арганізацыі (напрыклад, Таварыства вінакурных заводчыкаў Паўночна-заходняга краю). На пачатку XX ст. прадпрымальнікі занялі панавальнае месца ў беларускім істэблішменце.

Рамкі кожнай катэгорыі прадпрымальнікаў задаюцца той сферай эканомікі, для якой яны ў асноўным дастасоўвалі свае прадпрымальніцкія намаганні. Праца са шматлікімі друкаванымі і архіўнымі крыніцамі дазволіла б перайсці да дэталёвага вывучэння такіх прадпрымальніцкіх груп, як фінансісты, купцы і ўладальнікі развітых аграрных прадпрыемстваў. Асобна дэталёваму аналізу павінны быць аддадзены такія катэгорыі прадпрымальнікаў, як адміністрацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і фабрыканты-рэфарматары. Яшчэ адной тэмай можа стаць разгляд ролі ў беларускай эканоміцы замежных капіталаў і прадпрымальнікаў-іншаземцаў. Пакуль у гэтым напрамку робяцца першыя крокі[45].

Мае патрэбу ў сваім адлюстраванні і партрэт «калектыўнага капіталіста», гісторыя станаўлення і развіцця прадпрымальніцкай

дзейнасці ў форме акцыянерных і паявых кампаній, а таксама гандлёвых дамоў. Праблемы ўзнікнення ў Беларусі акцыянернага капіталу шмат разоў ужо ўзгадваліся ў шэрагу прац, але не ў якасці самастойнай тэмы, а як пацверджанне «ленінскага» тэзісу пра непазбежную манапалізацыю ўсёй капіталістычнай гаспадаркі. Аднак логіка, як самой гісторыі, так і даследчыцкай працы, вымагае вывучэння ўплыву гэтага фактара і на іншыя сферы эканомікі.

Было б памылковым зводзіць прадпрымальніцтва, як асобны род чалавечай дзейнасці, выключна да праблем гісторыі народнай гаспадаркі. Паводле свайго значэння і наступстваў яно выходзіць далёка за межы праблем чыста эканамічнага плану. Адпаведна, гэта дыктуе і новыя гарызонты гістарычнай працы і перспектывы яе развіцця. Нам уяўляецца неабходным працягнуць ужо пачатыя даследаванні менавіта ў аспекце вывучэння феномена прадпрымальніцтва і яго ўплыву на грамадства ў цэлым, паказаць самаарганізацыю прадпрымальнікаў, іх ролю ў палітыцы, культуры, адукацыі, станаўленні новага аблічча горада і вёскі.

---

[1] Бессмертный Ю. Л. «Анналы»: переломный этап? // Одиссей. Человек в Истории. 1991. М., 1991. С. 14.

[2] Бродель Ф. Динамика капитализма. Смоленск, 1993. С. 123–124.

[3] Пра гэта гл.: Киштымов А. Л. Эволюция экономического мышления белорусского крестьянина: от отмены крепостного права до октября 1917 г. // Наш Радавод. Гродна, 1996. Кн. 7.

[4] Абезгауз З. Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1971. С. 157.

[5] Там жа. С. 106.

[6] Біч М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук. 1972. № 4. С. 32.

[7] Там жа. С. 33.

[8] Там жа. С. 35.

[9] Там жа.

[10] Там жа. С. 502–505.

[11] Біч М. В. Назв. твор. С. 32.

[12] Воранава А. І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. Мн., 1960. С. 35.

[13] Экономика Белоруссии в эпоху империализма. Мн., 1963. С. 11, 17, 28.

[14] Абезгауз З. Е. Назв. твор. С. 158.

[15] Біч М. В. Назв. твор. С. 36.

[16] Там жа. С. 34.

[17] Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1900. Мн., 1978. С. 128.

[18] Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1900. Мн., 1978. С. 129.

[19] Там жа. С. 134.

[20] История рабочего класса Белорусской СССР. Мн., 1984. Т. 1. С. 72.

[21] Шыбека З. В. Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст. // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук. 1991. № 6. С. 69.

[22] Біч М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук. 1972. № 4. С. 36.

[23] Каханоўскі А. Г. Саслоўная і сацыяльна-прафесійная стратыфікацыя беларускага грамадства // Выбраныя навуковыя працы Беларус. дзярж. ун-та: У 7 т. Т. 2: Гісторыя. Філалогія. Журналістыка. Мн., 2001. С. 99.

[24] Рабочы клас // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 29.

[25] Иванов В. М. Очерк быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии. Мн., 1971. С. 79.

[26] Там жа. С. 158.

[27] Абезгауз З. Е. Назв. твор. С. 159.

[28] Гл.: Стульгинский А. И. Восьми- и девятичасовой труд на Добрушской писчебумажной фабрике князя Паскевича. СПб., 1895. – 14 с.; Ён жа. Восьми- и девятичасовой труд на Добрушской писчебумажной фабрике князя Паскевича // Приложение к журналу «Вестник Общества технологов». СПб., 1896. – 8 с.; Ён жа. О восьми- и девятичасовом рабочем дне и воскресном отдыхе рабочих на писчебумажных фабриках // Труды Всероссийского торгово-промышленного съезда в Нижнем Новгороде. Н. Новгород, 1896. Вып. 5. № 6; Ён жа. К десятилетию восьмичасового рабочего дня на Добрушской князя Паскевича писчебумажной фабрике // Писчебумажное дело. 1905. № 6. С. 235–241; № 7. С. 276–282; № 8. С. 316–319.

[29] Панютич В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861–1914 гг. Мн., 1969; Ён жа. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990; Ён жа. Наёмный труд в сельском хозяйстве Беларуси. 1861–1914 гг. Мн., 1996.

[30] Панютич В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861–1914 гг.). Мн., 1969.

[31] Там жа. С. 128.

[32] Там жа. С. 126, 127.

[33] Панютич В. П. Наёмный труд в сельском хозяйстве Беларуси. 1861–1914 гг. Мн., 1996. С. 73, 77, 109, 113, 118, 121–122.

[34] Гл.: Анищенко Е. К. Черта оседлости (Белорусская синагога в царствование Екатерины II). Мн., 1998.

[35] Оршанский И. Г. Евреи в России. Очерки и исследования. СПб., 1872. Вып. 1. С. 71.

[36] Нарысы гісторыі Беларусі ў 2-х частках. Мн., 1994. Ч. 1. С. 341.

[37] Киштымов А. Л. Роль евреев в банковском деле Беларуси: вторая половина XIX – начало XX вв. // История еврейского народа. Материалы Шестой Ежегодной Международной конференции по иудаике. М., 1999. Ч. 2. С. 111–126.

[38] Нарысы гісторыі Беларусі ў 2-х частках. Мн., 1994. Ч. 1. С. 341.

[39] Зеленский И. Минская губерния. СПб., 1864. С. 290.

[40] Коробков Х. Г. Экономическая роль евреев в русской лесоторговле и промышленности. Пг., 1916. С. 34.

[41] Чернявский И. Промышленный капитализм в Белоруссии и Литве и образование еврейского пролетариата // История пролетариата СССР. 1931. № 7. С. 86, 92.

[42] Иоффе Э. Г. Страницы истории евреев Белоруссии. Мн., 1996. С. 241.

[43] Шыбека З. В. Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст. // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх наук. 1991. № 6. С. 65–72.

[44] Там жа. С. 72.

[45] Киштымов А. Л. Немецкие капиталы и предприниматели в Беларуси // Социально-экономические приоритеты рыночных преобразований в Республике Беларусь: Материалы международной научно-практической конференции, 16–18 ноября 2000 года: В 2 ч. Гомель, 2000. Ч. 1. С. 100–104; Ён жа. Удзел замежных прадпрымальнікаў і фінансістаў у развіцці прамысловасці і траспарту Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. 1999. Мн., 1999. С. 57–63.

Раздзел 5

ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ І МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ ГРАМАДСКІХ РУХАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX ст.

У апошнія дзесяцігоддзі сярод характэрных тэндэнцый у айчыннай гістарыяграфіі вылучылася імкненне да пераасэнсавання месца гісторыі ў сістэме навук пра чалавека і грамадства, яе навуковага і сацыяльнага статуса. Гэтыя тэндэнцыі спалучаюцца з ростам цікавасці да сучасных сацыялагічных, філасофскіх, тэарэтыка-метадалагічных падыходаў і спробамі ажыццяўлення пэўнага культурна-гістарычнага сінтэзу. Аднак ва ўмовах суіснавання канкурэнтных набораў накіравальных перадумоў і дысцыплінарных матрыц, на ўзроўні гістарыяграфічнай практыкі такія спробы выклікаюць пэўныя метадалагічныя цяжкасці.

У такой сітуацыі важна прааналізаваць рэальную сукупнасць гістарычных прац, каб вылучыць перадумовы, якімі свядома або падсвядома карыстаюцца гісторыкі ў эмпірычным даследаванні і вызначыць, ці няма ў гэтых перадумовах унутраных супярэчнасцей, наяўнасць якіх абясцэньвае вынікі даследавання. Разам з тым важна зразумець, як канструюецца пэўны аб'ект гістарычнага даследавання, якія канкрэтныя навуковыя працэдуры вынікаюць з таго ці іншага тэарэтычнага падыхода. Толькі ў гэтым выпадку тэарэтычны падыход можа стаць не проста дэкларацыяй, а сапраўднай метадалагічнай асновай даследавання. У дадзеным раздзеле робіцца спроба ажыццявіць гэтыя працэдуры на канкрэтным прыкладзе гістарыяграфіі грамадскіх рухаў у Беларусі XIX ст. Пры гэтым галоўнай задачай становіцца не падрабязнае гістарыяграфічнае апісанне ўсяго корпуса прац, прысвечаных адзначанай вышэй тэме, пачынаючы з сярэдзіны XIX ст., а аналіз тэарэтычных падыходаў да вывучэння грамадскіх рухаў і перспектыў, іх выкарыстання ў гістарыяграфіі. У якасці вузлавых праблем у гэтай сувязі былі абраны вызначэнне грамадскага руху як аб'екта гістарычнага даследавання, класіфікацыя, перыядызацыя, аналіз прычын і эфектыўнасці грамадскіх рухаў.

5.1. Гістарыяграфічны і агульнатэарэтычны кантэксты вывучэння грамадскіх рухаў[1]

Вывучэнне грамадскіх рухаў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі пачалося ў канцы XIX – пачатку XX ст. Ліберальныя гісторыкі і гісторыкі сацыял-дэмакратычнага напрамку сабралі шмат фактычнага матэрыялу па імперыі ў цэлым, а таксама прапанавалі шэраг канцэпцый, якія на пэўны час вызначылі рамкі даследаванняў дадзенага феномена[2].

Вывучэнне грамадскіх рухаў уласна ў Беларусі пачалося пасля 1917 г. У 1920-х гг. было апублікавана шмат мемуарнай літаратуры, а ў 1924 г. выйшаў у свет зборнік «Беларусь», у якім былі змешчаны артыкулы аб розных плынях у грамадскім руху Беларусі канца XIX ст.[3]. У тым жа годзе ў часопісе «Полымя» быў надрукаваны артыкул У. Пічэты «Формы нацыянальнага і апазіцыйнага руху на Беларусі»[4], які з'явіўся першай спробай сістэматычнага выкладання гісторыі беларускіх грамадскіх рухаў. У выдадзеным у тым жа 1924 г. сістэматычным курсе па гісторыі Беларусі У. Ігнатоўскага ўвага засяроджвалася на гісторыі беларускага нацыянальна-палітычнага і культурнага рухаў, разглядалася дзейнасць такіх партый, як Бунд, БСГ, ППС. Аднак паступова пад уздзеяннем палітычнай кан'юнктуры тэматыка даследаванняў грамадскіх рухаў пачала звужацца. Даследчыкі засяродзіліся на праблемах рэвалюцыйнага (г. зн. сацыял-дэмакратычнага і народніцкага) руху і паўстання 1863–1864 гг. Ліберальны і кансерватыўны рухі асвятляліся вельмі вузка і супярэчліва. Так, у лібералізме беларускія гісторыкі савецкага часу бачылі, як правіла, разнавіднасць буржуазнай ідэалогіі і адносілі нараджэнне лібералізму ў Расійскай імперыі (і ў Беларусі ў тым ліку) да другой паловы XIX ст., г. зн. да часу хуткага развіцця капіталістычных адносін. Лічылася, што ён не пакінуў бачнага следу ў айчыннай гісторыі, паколькі аказаўся слабым, а яго палітычныя структуры былі аморфнымі і далёкімі ад жыцця. Праблема гісторыі кансерватыўнага руху наогул не фармулявалася, а кансерватызм атаясамліваўся з рэакцыйнымі палітычнымі мерамі, якія прадпрымала царская бюракратыя. Што датычыцца сацыялістычнага руху ў шырокім сэнсе, то замест даследавання яго рэальнай гісторыі навукоўцы вымушаны былі даваць рэтраспектыву дагматычнага марксісцкага ўяўлення аб гісторыі гэтага феномену. Аднак, дзякуючы багатаму фактычнаму матэрыялу, выкарыстанню аўтарамі архіўных кры-

ніц, узгаданыя вышэй працы не страцілі свайго значэння да сённяшняга часу[5].

У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. у айчыннай гістарыяграфіі выявілася тэндэнцыя да перагляду гэтых стэрэатыпаў. Намеціліся новыя тэндэнцыі ў вывучэнні кансерватызму як цэласнага грамадскага руху. Лібералізм ужо не разглядаўся як вузкакласавая буржуазная плынь[6]. У апошнія гады пашырылася тэматычнае поле вывучэння грамадскіх рухаў, у прыватнасці, даследчыкі звярнулі ўвагу на гісторыю легальных грамадскіх аб'яднанняў[7]. Фарміраванне сістэмы грамадскіх рухаў і сеткі дабравольных грамадскіх аб'яднанняў стала разглядацца як фактар фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі[8].

Аднак вельмі няшмат хто з беларускіх даследчыкаў спрабаваў развіваць агульнатэарэтычныя падыходы да вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў. Пасля дэвальвацыі каштоўнасцей гістарычнага матэрыялізму класічны гістарызм стаў для большасці айчынных гісторыкаў чымсьці накшталт разнавіднасці прафесійнай ідэалогіі. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі склалася сітуацыя падобная той, якую апісаў амерыканскі сацыёлаг Рэндал Колінз: з аднаго боку гісторыкі схільныя да непрыняцця агульнай тлумачальнай тэорыі, а з другога – пры тлумачэнні канкрэтных выпадкаў яны выкарыстоўваюць некаторыя ідэі аб тым, што уяўляюць сабой агульныя структуры і як функцыянуюць абагуленыя мадэлі сацыяльнай матывацыі і сацыяльных змен, нават не ўсведамляючы гэтага. «Аналіз гістарычнай рэальнасці, – заўважае ён, – наўрад ці магчымы ва ўмовах tabula rasa. Гісторыкі абапіраюцца на тэорыі – ведаюць яны аб гэтым, ці не. Вялікім гісторыка, працы якога прыцягваюць увагу шырокіх колаў, як правіла, робіць здольнасць ствараць тэорыі, паказваць агульную схему, схаваную пад грудай расказаных асобнасцей. Менш значныя, як правіла, тыя гісторыкі, якія аперыруюць наіўнымі, прынятымі як дадзенае канцэпцыямі ці старымі тэорыямі, якія ўвайшлі ў звычайны дыскурс»[9].

Такім чынам, гісторыкі заўсёды павінны працаваць як бы на двух узроўнях адначасова – на тэарэтычным узроўні абстрактных і універсальных прынцыпаў тлумачэння і на ўзроўні «гістарычных асобнасцей». У прыватнасці, неабходна мець на ўвазе, што катэгарыяльны апарат гістарычнай навукі складаецца з двух тыпаў тэрмінаў: гісторыка-эмпірычных абстракцый (канцэптаў) і аналітычных (дэдуктыўных) паняццяў. Гісторыка-эмпірычныя абстракцыі, ці канцэпты, – гэта сэнсавыя адзінкі, якія ў змястоўным плане з'яўляюцца пераходнымі паміж семантыкай моўных адзінак, з аднаго

боку, і зместам філасофскіх і навуковых катэгорый – з другога. Ад навуковых паняццяў канцэпты адрозніваюцца сваёй рэальнай дынамічнай сувяззю з жыццём і вопытам народа – з бытам, гісторыяй, сістэмай каштоўнасцей і г. д. Іншымі словамі, пры дапамозе гісторыка-эмпірычных абстракцый людзі адлюстроўваюць сацыяльнае асяроддзе ў ходзе штодзённай дзейнасці. Ад моўных значэнняў канцэпты адрозніваюцца большай складанасцю і сэнсавым багаццем, пры гэтым моўная семантыка часам становіцца базавай часткай канцэпта, яго апорным зместам[10]. Увядзенне ў навуковы ўжытак такога тыпу катэгорый абумоўлена імкненнем гісторыкаў пазбегнуць экстрапаляцыі сучасных даследчыку каштоўнасцей і ведаў у мінулае. Як адзначаў Э. Лаоне, «паняційная сетка» таго ці іншага гістарычнага перыяду можа не супадаць з нашымі сучаснымі паняццямі, у выніку чаго даследуемыя падзеі будуць разумецца няправільна, ці толькі часткова. Узнікае небяспека «страты ведаў», мадэрнізацыі мінулага, якая ўносіцца сучаснымі мысленнем і мовай[11].

Аднак гісторык, які даследуе мінулае, задае часам такія пытанні, якія ў мінулым не задаваліся і не маглі задавацца, і, як правіла, інтэрпрэтуе мінулую рэальнасць у рамках сучасных яму паняццяў, мадэляў і тэорый. Менавіта на гэтай аснове фармулююцца аналітычныя (дэдуктыўныя) паняцці.

У гістарычным даследаванні аднолькава неабходныя як гісторыка-эмпірычныя абстракцыі, так і аналітычныя паняцці. Пры гэтым вельмі важна не змешваць канцэпты, выкарыстанне якіх дае магчымасць найбольш адэкватна апісваць мінулую рэальнасць, і дэдуктыўныя паняцці, якія неабходны для тэарэтычнага аналіза даследуемай з'явы. Улік рэальнага, гістарычна зменлівага зместа канцэптаў, якія пападаюць у поле бачання даследчыка, неабходны для адэкватнага апісання і карэктнага аналіза мінулага. Менавіта канцэпты з'яўляюцца «фактуальнымі дадзенымі» для даследавання гісторыі грамадскіх рухаў і класіфіцыруюцца на аснове аналітычных катэгорый.

Апошнія ж вызначаюцца тэарэтычнымі ўяўленнямі аб прыродзе сацыяльнай рэальнасці і сацыяльна-гістарычных змен, выпрацаваных перш за ўсё філасофіяй і сацыялогіяй. Так, з сярэдзіны 20-х да канца 80-х гг. XX ст. у айчыннай гістарыяграфіі ішло засваенне «марксісцка-ленінскай тэорыі» як базавай структуры для інтэрпрэтацыі грамадскіх рухаў. У выніку ў гісторыкаў сфарміравалася пэўная падазронасць у адносінах да тэарэтызавання. Гісторыкі, якія знаходзіліся ў сітуацыі татальнага дзяржаўнага ціску на

навуку, шукалі такога разумення «навуковасці», якое б засцерагло ад небяспекі ідэалагічнага канфармізму. Фарміравалася імкненне да вузканавуковай гістарыяграфічнай мадэлі, да абасаблення ад «пазагістарычнай кан'юнктуры», пад якой, у рэшце рэшт, стала разумецца ўсякае тэарэтызаванне. Менавіта такі стан рэчаў крытыкаваў Анры Бэр, калі пісаў, што гісторыя страчвае прывабнасць, бо баіцца пераходзіць да абагульненняў, а акадэмічныя часопісы заахвочваюць вузкую спецыялізацыю, калі друкуюць даследаванні, цікавыя толькі для некалькіх прафесіяналаў[12].

Сутнаснай характарыстыкай новай нарматыўнасці ў гістарычнай навуцы сталі «ўсебаковы» і «праўдзівы аналіз», «мнагамернасць» гістарычнага развіцця і «разнастайнасць» гістарычнай рэчаіснасці. Але адыход ад «адназначнай прамалінейнасці» і «аднабаковай трактоўкі» прывёў да панавання дэкларацый, імператыўных меркаванняў[13]. Больш таго, катэгарыяльны апарат гістарычнай навукі, незалежна ад таго, асэнсоўвалі гэта гісторыкі ці не, вызначаўся па-ранейшаму марксісцкай парадыгмай[14].

Калі ж на рубяжы 80–90-х гг. савецкія, у тым ліку і беларускія, сацыёлагі, а разам з імі і гісторыкі, пачалі засвойваць новыя тэарэтычныя падыходы, стала відавочна, што не існуе адзінага агульнапрынятага спосаба інтэрпрэтацыі мінулай сацыяльнай рэальнасці, што розныя падыходы адпавядаюць розным мэтам даследавання. Таму ў гістарычнай навуцы таксама сталі распрацоўвацца праграмы, заснаваныя на розных даследчыцкіх традыцыях. Аднак пры гэтым, як правіла, рэдка рабіўся перагляд паняційнага апарата, і марксісцкія тэрміны пераходзілі ў працы, якія прэтэндавалі на новыя падыходы да інтэрпрэтацыі мінулага, у тым ліку і грамадскіх рухаў. Вось чаму ў наш час актуальным становіцца патрабаванне метадалагічнай несупярэчлівасці той ці іншай інтэрпрэтацыі гістарычнай рэчаіснасці. Даследчыку неабходна яснае ўяўленне аб тым, на які з падыходаў ён у кожным выпадку абапіраецца[15].

Як вядома, у якасці асноўных парадыгматычных падыходаў у наш час прынята вылучаць наступныя: пазітывізм, разумеючая сацыялогія, крытычная сацыяльная навука[16]. Пазітывізм – найбольш стары даследчыцкі падыход, які выкарыстоўваецца айчыннымі гісторыкамі найчасцей. У яго аснове ляжыць уяўленне аб тым, што існуе толькі адна логіка навукі, якой павінна адпавядаць любая даследчыцкая практыка[17]. Сацыяльная ж рэальнасць вызначаецца шэрагам заканамернасцей, якія не змяняюцца з часам і ў прынцыпе могуць быць раскрыты і растлумачаны. Тлумачэнні сацыяльнага жыцця лічацца ісціннымі, калі яны лагічна несупярэчлівыя і ўзгоднены з назіраемымі фактамі.

У аснове дактрыны разумеючай сацыялогіі ляжаць погляды М. Вебера, які лічыў, што прадметам вывучэння сацыёлага павінны быць сацыяльныя дзеянні. Сярод апошніх ён вылучаў сацыяльна асэнсаваныя і пазбаўленыя мэты. Адпаведна даследаванне ўяўляе сабой пэўны від чытання як раскрыцця імпліцытнага значэння. Калі пазітывізм лічыць, што ў вопыце нам дадзены адзін мір і адным і тым жа чынам, то ў разумеючай сацыялогіі дапускаецца, што розныя людзі надаюць аднаму і таму ж аб'екту розныя значэнні і па-рознаму яго інтэрпрэтуюць. Паводзіны чалавека з пункту гледжання разумеючай сацыялогіі ўпарадкаваныя, але не пры дапамозе аб'ектыўных законаў. Мадэлі паводзін ствараюцца на аснове ўзаемных сістэм значэнняў ці сацыяльных пагадненняў (канвенцый), якія людзі абагульняюць праз сацыяльныя ўзаемадзеянні. Для даследчыка няма сэнсу выводзіць сацыяльнае жыццё з абстрактных лагічных тэорый. Яго цікавяць перш за ўсё дзеянні і іх матывы. Калі пазітывісты лічаць, што сацыяльная тэорыя павінна быць падобнай да тэорый у навуках натуральных, то падыход разумеючай сацыялогіі ідэаграфічны і індуктыўны. Далей, калі ў пазітывізме відавочнасць – гэта тое, што назіраецца, што не залежыць ад тэорыі і каштоўнасцей, то ў разумеючай сацыялогіі відавочнасць сацыяльнага дзеяння нельга ізаляваць ад кантэкста значэнняў, якія яго вызначаюць і якія надаюць яму актары – дзеючыя асобы[18].

У якасці найбольш важных для гісторыкаў грамадскіх рухаў метадалагічных прынцыпаў разумеючай сацыялогіі можна вылучыць наступныя: вывучэнне казуальных сувязей пэўнай групы з'яў замест пошукаў пацверджанняў агульных заканамернасцей; тыпалогія сацыяльных з'яў на аснове іх мысліцельных вобразаў (ідэальных тыпаў); інтэрпрэтацыя класавай барацьбы як прыватны, а не ўніверсальны выпадак сацыяльнага канфлікта. Менавіта гэтыя агульныя прынцыпы, як адзначыў расійскі гісторык А. Медушэўскі, дазволілі па новаму падысці да ацэнкі гістарычнага працэса і да гісторыі грамадскіх рухаў[19]. Да гэтага трэба дадаць, што сучасныя тлумачэнні прычын і спецыфікі грамадскіх рухаў Беларусі ў кантэксце тэорый мадэрнізацыі і еўрапеізацыі Расійскай імперыі ў значнай ступені заснаваныя на вебераўскай канцэпцыі рацыянальнасці і рацыяналізацыі[20].

Крытычная сацыяльная навука разглядае сацыяльную тэорыю як крытычны працэс раскрыцця структур, якія вызначаюць сацыяльны парадак. Такое даследаванне стварае перадумовы для змены існуючага ладу, для разгортвання «механізма сацыяльных

адносінаў так, каб умацаваць пазіцыю людзей, асабліва тых, хто пазбаўлены рэальнай ўлады»[21]. Іншымі словамі, даследаванне само становіцца сродкам сацыяльных змен. Крытычная сацыяльная навука, якая цесна звязана з традыцыямі заходняга марксізму, псіхааналізу і постструктуралізму, цікавіцца, перш за ўсё, структурамі (эканамічнымі, культурнымі, псіхічнымі і інш.), якія праяўляюцца ў канфліктах, фарміруюць іх меркаванне і разуменне, а ў канчатковым выніку – абмяжоўваюць магчымасці людзей. Пры гэтым, у адрозненні ад традыцыйных марксісцкіх эканамічных дэтэрмінантаў, вылучаюцца адносіны падаўлення і канфлікту на ўзроўні асобы. Для гісторыка-грамадскіх рухаў такія падыходы даюць магчымасць адказаць на пытанні, чаму ў адных і тых жа ўмовах пэўныя асобы больш схільныя да калектыўных дзеянняў, да далучэння да грамадскіх рухаў, г. зн. вывучаць гісторыю грамадскіх рухаў на «мікраўзроўні».

Калі пазітывісты правяраюць тэорыю праз адпаведнасць гіпотэз рэчаіснасці, то тэорыі ў разумеючай сацыялогіі правяраюцца праз выяўленне сістэмы значэнняў і правіл паводзін, якія надаюць сэнс таму, што даследуецца. Крытычны ж падыход адрознівае добрую тэорыю ад дрэннай праз праксіс: тлумачэнні маюць сэнс, калі яны заахвочваюць людзей зразумець і змяніць іх сацыяльны мір.

Па-рознаму інтэрпрэтуюць прыхільнікі згаданых падыходаў і эмпірычную рэальнасць. Пазітывісцкі падыход заснаваны на тым, што існуюць неправяраемыя нейтральныя факты, з якімі павінен згаджацца кожны рацыянальны чалавек. Разумеючая сацыялогія разглядае сацыяльны мір, як складзены са створаных значэнняў, што лічацца фактуальнымі. Прыхільнікі ж крытычнага падыходу лічаць, што мір змяшчае некаторыя ўмовы, якія не залежаць ад ўспрымання, але пры гэтым факты тэарэтычна не нейтральныя. Кожны факт патрабуе інтэрпрэтацыі ў сістэме каштоўнасцей, тэорыі і значэння[22].

Істотную ролю ў гістарычных даследаваннях адыгрываюць і канцэпцыі сацыяльна-гістарычных змен, бо менавіта ў залежнасці ад таго, якія фактары лічацца вырашальнымі для сацыяльнай эвалюцыі, звычайна вылучаюцца асноўныя прычыны грамадскіх рухаў. Такія сінтэтычныя тэорыі часцей за ўсё падзяляюць на тры групы: сацыякультурныя, індустрыяльна-тэхналагічныя і сацыяльна-эканамічныя[23].

Сацыякультурныя тэорыі улічваюць, перш за ўсё, змены ў светапоглядзе, рэлігіі, сістэмах каштоўнасцей, менталітэце сацыяльных груп, грамадстваў і эпох. Такія змены лічацца найбольш фундаментальнымі і вызначаюць усе іншыя сацыяльныя змены, у тым ліку, змены сацыяльных структур і сацыяльных працэсаў. Сярод

гэтай групы тэорый асобую цікавасць выклікаюць тэорыі П. Сарокіна, А. Тойнбі, О. Шпэнглера[24].

Індустрыяльна-тэхналагічныя тэорыі інтэрпрэтуюць сацыяльныя змены як вытворныя ад характара і ўзроўню развіцця эканомікі. Змены ў тэхналогіі матэрыяльнай вытворчасці пры гэтым разглядаюцца ў якасці фундамента і крыніцы сацыяльных змен. Да гэтай групы адносяцца тэорыі «стадый эканамічнага росту» Э. Растоу, «адзінага індустрыяльнага грамадства» Р. Арона, постіндустрыяльнага грамадства Д. Бэлла, «заката ідэалагічнай эры» М. Ліпсета. Адпаведна гэтым канцэпцыям, у глабальным развіцці чалавецтва вызначаюцца тры тыпы грамадства: аграрнае, традыцыйнае (з перавагай здабываючай вытворчасці), індустрыяльнае (з перавагай апрацоўваючай прамысловасці) і постіндустрыяльнае (з перавагай сферы паслуг і «эканомікі ведаў»)[25].

Да ліку сацыяльна-эканамічных тэорый адносіцца перш за ўсё марксізм. З пункту гледжання тэарэтыкаў гэтага падыходу вырашальным фактарам сацыяльных змен з'яўляецца, у рэшце рэшт, эканамічнае развіцце, дакладней – дыялектыка ўзаемадзеяння прадукцыйных сіл і вытворчых адносін.

Паколькі гэтыя тэорыі, як правіла, не ўзгадняюцца або дрэнна ўзгадняюцца паміж сабой, для гісторыка вельмі важна вызначыць паслядоўнасць прымянення паняційнага апарата і даследчыцкіх практык той ці іншай тэорыі. Калі канцэпты дадзены эмпірычна і могуць класіфікавацца па розных аснаваннях, то дэдуктыўныя паняцці, якія выкарыстоўваюцца гісторыкамі грамадскіх рухаў, могуць прымяняцца толькі ў межах пэўных тэарэтычных падыходаў да апісання сацыяльнай рэальнасці і да аналізу сацыяльна-гістарычных змен. Разам з тым, гісторык павінен усведамляць, што існуюць розныя падыходы да стварэння тэорыіі, і далёка не ўсе стратэгіі аналітычнага тэарэтызавання магчыма выкарыстоўваць пры рэканструкцыі мінулай рэальнасці. Гісторыкі рэдка маюць магчымасць непасрэдна выкарыстоўваюць глабальныя метатэарэтычныя схемы, бо, па-першае, яны ўцягваюць гісторыка ў старыя і невырашальныя філасофскія спрэчкі; па-другое, метатэарэтычныя прынцыпы нялёгка выкарыстоўваць у аналітычным тэарэтызаванні і, нарэшце, такім схемам часта не хапае гнуткасці і «адчування часу»[26].

Разам з тым, можна пагадзіцца з амерыканскім даследчыкам Дж. Тэрнерам, што гісторыкі не павінны адмаўляцца ад аналітычнага тэарэтызавання наогул і выкарыстоўваць такія схемы абагульненняў і тлумачэнняў, як «сенсібілізіруючыя аналітычныя схемы», прапазіцыянальныя і мадэліруючыя схемы[27]. Сенсібілізіруючыя аналітычныя схемы – гэта тыпалогіі, заснаваныя на тым,

што сістэма паняццяў павінна быць толькі часовай і адчувальнай да бесперапынных змен. Са зменай соцыуму павінны мяняцца і аналітычныя схемы. У лепшым выпадку такія схемы здольныя даць карысны спосаб тлумачэння эмпірычных падзей у дадзены адрэзак часу[28]. Мэта стварэння прапазіцыйнай схемы – фіксаванне пэўнай формы адносін паміж свойствамі аб'ектаў сацыяльнага свету. Сярод вылучаных даследчыкам прапазіцыйных схем найбольшую цікавасць для гісторыка могуць мець пабудовы эмпірычных схем, якія амерыканскі сацыёлаг атаясамлівае з так званымі тэорыямі сярэдняга ўзроўню. Пры гэтым гісторыкі павінны ўлічваць і крытыку такіх падыходаў. Так, Дж. Тэрнер адзначае, што эмпірычныя схемы (тэорыі сярэдняга ўзроўню) пабудаваны не на законах, а на эмпірычных абагульненнях, якія патрабуюць для свайго тлумачэння больш абстрактнай фармулёўкі. Разам з тым эмпірычныя абагульненні, якія прымяняюцца да пэўнай вобласці дадзеных, будуць карыснымі як адзін са шляхоў праверкі абстрактных тэорый. Такія тэорыі «сярэдняга ўзроўню» упарадкоўваюць вынікі даследаванняў цэлых класаў эмпірычных гістарычных з'яў[29].

Яшчэ адным прывабным спосабам тэарэтызавання ў тлумачэнні гістарычных з'яў можна лічыць мадэліруючыя схемы. Як вядома, мадэль – гэта схематычнае прадстаўленне некаторых падзей, якое ўключае паняцці, размяшчэнне гэтых паняццяў у форме, што адлюстроўвае ўпарадкаванасць падзей, сімвалы, якія характарызуюць прыроду сувязей паміж паняццямі. І тут вельмі важна пазбегнуць рэіфікацыі мадэляў, г. зн. не забывацца пра тое, што мадэль не можа падмяніць рэальны аб'ект.

Найбольш распаўсюджанымі пры вывучэнні гісторыі, відавочна, з'яўляюцца эмпірычныя казуальныя мадэлі і эмпірычныя прапазіцыйныя схемы, на аснове якіх будуюцца так званыя тэорыі сярэдняга ўзроўню. Гэтыя тэорыі ахопліваюць абмежаваную групу ўзаемазвязаных з'яў, а не ўвесь сацыяльны парадак. У якасці прыкладу тэорый сярэдняга ўзроўню можна прывесці тэорыі «напружанасці і раўнавагі» (Карнхаузер, Смелзер)[30] і мабілізацыі рэсурсаў (Макадам, Макарці, Залд, Цілі)[31], метады аналізу А. Грамшы, накіраваныя на вызначэнне «культурнай» складаючай грамадскіх рухаў[32], тэорыю структуры палітычных магчымасцей (С. Тарроу, Д. Рухт, Б. Кландерманс)[33] і г. д. Вартасцю ўзгаданых тэорый, як і любых тэорый сярэдняга ўзроўню, з'яўляецца лёгкасць праверкі гіпотэз пры дапамозе эмпірычных даследаванняў, што дазваляе гісторыку выкарыстоўваць розныя канцэптуальныя схемы на аснове ўліку такіх параметраў, як эмпірычная прымянімасць, тлумачальны патэнцыял, сумяшчальнасць з іншымі тэорыямі[34].

Разам з тым нельга адмаўляцца і ад аналітычных тэорый і фармальных мадэляў. Як слушна адзначыў Дж. Тэрнер, «тэорыі сярэдняга ўзроўню, прычынныя мадэлі і эмпірычныя абагульненні, якія не накіроўваюцца абстрактнымі законамі і фармальнымі мадэлямі, ствараюцца ad hoc, без клопату аб тым, ці спрыяюць яны разуменню глыбіннай дынамікі грамадства»[35]. Так што, на наш погляд, эўрыстычны патэнцыял тэорый сярэдняга ўзроўню працуе толькі тады, калі яны выкарыстоўваюцца ў сукупнасці з пэўнымі аналітычнымі схемамі. Такі падыход атрымаў у сучаснай гістарычнай навуцы назву сацыяльна-структурнай ці навуковай сацыяльнай гісторыі. Аднак выкарыстанне структурных тэорый не адмаўляе неабходнасці рэканструкцыі вопыту, прынцыпаў і дзеянняў людзей мінулага часу, што адбываецца ў рамках гісторыі штодзённасці (гісторыі знізу, мікрагісторыі). Менавіта ў спалучэнні гэтых падыходаў і складаецца адна з асноўных сучасных метадалагічных праблем вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў.

Праблема метадалагічнага сінтэзу ў вывучэнні грамадскіх рухаў паўстае і на ўзроўні междысцыплінарных сувязей[36]. Як было адзначана ва ўводзінах да зборніка «Междисциплинарный синтез в истории и социальные теории: теория, историография и практика конкретных исследований», выдадзенага Інстытутам сусветнай гісторыі Расійскай акадэміі навук у 2004 г., у сучаснай гістарыяграфічнай сітуацыі такі сінтэз павінен стаць своеасаблівым каркасам, які здольны надаць пэўную ўстойлівасць будынку гістарычнай дысцыпліны. Размова ідзе не пра рэанімацыю ў новым абліччы некай агульнай тэорыі гістарычнага працэса, якая звяла б усю яго разнастайнасць да пэўнага адзінага фактара, а пра плюралістычны сінтэз, які дае толькі арыенціры для пазнання гісторыі. Гэтыя арыенціры арганізуюць яе цэласную прастору і, разам з тым, вызначаюць набор даследчыцкіх стратэгій для вывучэння таго ці іншага сацыяльнага феномена[37].

Каб стварыць аснову для выпрацоўкі такіх арыенціраў у галіне вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў у Беларусі XIX ст., карысна, паміж іншым, звярнуцца да такіх праблем, як разуменне самога паняцця «грамадскі рух», класіфікацыя, перыядызацыя, прычыны і эфектыўнасць грамадскіх рухаў.

---

[1] У беларускай даследчыцкай традыцыі тэрмін «сацыяльны рух» часам абазначае як «грамадскі рух», так і больш шырокія паняцці «сацыяльная змена», «сацыяльная дынаміка». У дадзенай працы, у адпаведнасці з сучаснай сацыялагічнай тэрміналогіяй, ужываюцца тэрміны «грамадскі рух», «сацыяльны рух», «сацыяльныя змены». Пры гэтым першыя два тэрміны

выкарыстоўваюцца як сінонімы (Гл., напр.: Social Movement and Social Change. Southern Illinois, 1976).

[2] Сватиков С. Общественное движение в России (1700–1895). Ростов н/Д, 1905; Общественное движение в России в начале XX века. СПб., 1909 і інш.

[3] Дыла Я. Сацыялістычны рух на Беларусі. Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя; Сосіс І. Асноўныя моманты ў гісторыі жыдоўскага рабочага руху; Пічэта У. Класавыя супярэчнасці ў Беларусі напярэдадні рэвалюцыі; Бонч-Асмалоўскі А. Ліберальна-апазіцыйны рух на Беларусі; Бурбис А. Беларуская сацыялістычная грамада ў першым перыядзе яе працы (1903–1907).

[4] Пічэта У. Формы нацыянальнага і апазіцыйнага руху на Беларусі // Полымя. 1924. № 2. С. 142–162.

[5]Агурский С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917). Мн., 1928; Віткоўскі Я. Паўстанне 1863 г. і расійскі рэвалюцыйны рух пачатку 60-х гадоў. Мн., 1939. Поташ М. Бальшавізм і дробнабуржуазныя партыі ў рэвалюцыі 1905 года. Мн., 1930; Солошенко В. Из истории распространения марксизма в Беларуси (1883–1904). Мн., 1963; Бич М. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии (1883–1903). Мн., 1973; Ён жа. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. Мн., 1983; Самбук С. Революционные народники Белоруссии (70-е – нач. 80-х гг. XIX века). Мн., 1972; Яна ж. Общественно-политическая мысль Белоруссии во 2 пол. XIX в. Мн., 1976; Лосинский Н. Революционно-демократическое движение в Белоруссии. 1870–1884. Мн., 1983; Смирнов А. Кастусь Калиновский. Мн., 1959; Ён жа. Восстание 1863 г. в Литве и Белорусии. Мн., 1963; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963; Ён жа. З думай пра Беларусь. Мн., 1966; Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии до 1917 года. Мн., 1973; Лушчыцкі І. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ў другой палове XIX ст. Мн., 1958.

[6] Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мн., 2001; Смалянчук А. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг. Гародня, 2000; Сакалова М. Пачатак ліберальнага руху на Беларусі // Штогоднік Ін-та гісторыі НАН Беларусі. Мн., 1999. С. 48–56; Сакалова М. Кансерватызм на Беларусі ў XIX ст. // Бел. гіст. часоп. 1997. № 1. С. 22–34; Шалькевич В. Общественно-политическая и философская мысль Беларуси в первой половине XIX века: Дис. в форме науч. докл. … д-ра ист. наук: 09.00.03 / Бел. гос. ун-т. Мн., 1993.

[7] Хартановіч М., Карзенка Г. Навуковыя ўстановы і таварыствы на тэрыторыі Беларусі у канцы XIX – пачатку XX ст. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 4. С. 40–42; Анішчанка Я. Царызм і легальныя культурна-асветніцкія арганізацыі на Беларусі ў пачатку XX стагоддзя // Навіны Бел. Акад. Навук. 1992. № 45–46. С. 25–29.

[8] Соколова М. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества. Мн., 2002.

[9] Коллинз Р. Социология: наука или антинаука // THESIS. 1993. Вып. 2. С. 85.

[10] Арутюнова Н. Введение // Логический анализ языка. Ментальные действия. М., 1993. С. 3; Мечковская Н. Между лингвистикой и философией познания // Russian Linguistics. 1996. Vol. 20. P. 287.

[11] Лооне Э. Современная философия истории. Таллинн, 1980. С. 97.

[12] Гл. аб гэтым у: Zeldin T. Social History and Total History // Journal of Social History. 1976. № 2. P. 237–245.

[13] Гл., напр.: Матэрыялы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Праблемы айчыннай гістарыяграфіі». Гародня, 19–21 студзеня 2001 // Гіст. альманах. 2001. Т. 4.

[14] Існуе шмат азначэнняў парадыгмы, але часцей за ўсё яна разумеецца, як тое, што ўключае базавыя перадумовы, важнейшыя пытанні, якія павінны вырашацца, даследчыцкія тэхнікі і прыклады таго, якім павінна быць навуковае даследаванне. Агульнавядома таксама, што парадыгматычныя змены ў навуцы носяць больш сацыяльны, чым навуковы характар і пачынаюцца з пашырэння спіска праблем, якія падлягаюць вырашэнню. Менавіта такім чынам пачынаецца змена фундаментальных паняццяў у навуцы. Пры гэтым дысцыплінарныя матрыцы (тэарэтычныя і метадалагічныя падыходы) не змяняюць адна адну, а накладваюцца, суіснуюць (Гл., напр.: Структура и развитие науки. М., 1978).

[15] Больш падрабязна аб гэтым: Сакалова М. Да пытання пра значэнне змены парадыгмаў для гістарычных даследванняў // Гіст. альманах. 2001. Т. 4. С.14–18.

[16] Ньюман Л. Значение методологии: три основных подхода // Социологические исследования. 1998. № 3. С. 123–124; Социология общественных движений: концептуальные модели. М.; СПб., 1993.

[17] Keat R., Urry J. Social Theory as Science. London, 1975. P. 25.

[18] Вебер М. Избранные произведения. М., 1990.

[19] Медушевский А. Макс Вебер и российский конституционализм // Отечественная история. 1993. № 2. С. 79–94.

[20] Вебер М. Исторический очерк освободительного движения в России. Киев, 1906; Ён жа. Протестантская этика и дух капитализма // Вебер М. Избранные произведения. С. 61–272.

[21] Ньюман Л. Значение методологии. С. 129.

[22] Smart B. Sociology, Phenomenology and Marxist Analysis: A Critical Discussion of Theory and Practice of Science of Society. Boston, 1976.

[23] Будон Р. Место беспорядка. Критика теорий социального изменения. М., 1998; Штомпка П. Социология социальных изменений. М., 1996; Гречко П. Концептуальные модели истории. М., 1995.

[24] Сорокин П. Человек, цивилизация, общество. М., 1992; Шпенглер О. Закат истории: В 2 т. М., 1993; Тойнби А. Постижение истории. М., 1991.

[25] Арон Р. Этапы развития социологической мысли. М., 1993; Суінджвуд Э. Сціслая гісторыя сацыялагічнай думкі. Мн., 1999.

[26] Тернер Дж. Аналитическое теоретизирование // ТЕЗИС. 1994. Вып. 4. С. 125.

[27] Там жа. С. 125–126.

[28] Blumer H. Symbolic Interactionism: Perspective and Method. New Jersey, 1969; Giddens A. The Constitution of Society. Berkeley, 1984.

[29] Тэрнер Дж. Аналитическое теоретизирование. С. 127–130.

[30] Kornhauser W. The Politics of Mass Society. Glencoe, 1959; Smelsек N. Theory of Collective Behavior. New York, 1962.

[31] McAdam D. The Political Process and the Development of Black Insurgency. Chicago, 1982; McCarthy J., Zald N. Resource Mobilization and Social Movement: A Partial Theory // American Journal of Sociology. 1977. № 6. Vol. 82. P. 1212–1241; Tilly Ch. From Mobilization to Revolution. Massachusetts, 1978.

[32] Грамши А. Тюремные тетради. М., 1991; Laclau E., Chantal M. Hegemony and Socialist Strategy: Toward a Radical Democratic Politics. New York, 1985.

[33] Klandermans B. The Formation and Mobilization of Consensus // From structure to action. Greenwich, 1988. P. 173–196; Tarrow S. Power in Movement. Cambridge, 1994.

[34] Merton R. Social Theory and Social Structure. Glencoe, 1968.

[35] Тэрнер Дж. Аналитическое теоретизирование. С. 130.

[36] Междисциплинарный синтез в истории и социальные теории: теория, историография и практика конкретных исследований. М., 2004; Методологический синтез: прошлое, настоящее, возможные перспективы. Томск, 2002; Назаретян А. Синергетика в гуманитарном знании: предварительные итоги // Общественные науки и современность. 1997. № 2. С. 91–98.

[37] Междисциплинарный синтез в истории и социальные теории: теория, историография и практика конкретных исследований. С. 2.

5.2. Грамадскі рух як аб'ект гістарычнага даследавання

Пры аналізе грамадскіх рухаў гістарычная навука назапашвае пэўную колькасць паняццяў і катэгорый, змест якіх павінен быць вызначаны агульнапрынятым спосабам. У айчыннай гістарыяграфіі гэтая працэдура ажыццяўляецца, галоўным чынам, праз пералік феноменаў, якія, па меркаванні розных аўтараў, маюць да іх дачыненне. Безумоўна, такім чынам забяспечваецца эмпірычная рэферэнтнасць паняццяў. Але ў кожным выпадку эмпірычныя веды апісваюць толькі пэўны аспект існавання аб'екта, даюць толькі адну прадметную праекцыю. Запас канкрэтна-гістарычных ведаў расце, але прырост надзейных ведаў аб узаемасувязі дэталяў за гэтым ростам не паспявае. Як адзначаў нямецкі сацыёлаг Н. Эліас, крыніцавая база, надзейнасць спасылак – гэта безумоўны доказ навуковасці і каштоўнасці гістарычнай працы. Аднак гістарычныя крыніцы – гэта фрагменты, якія даследчык інтэрпрэтуе ў адпаведнасці са сваімі мэтамі, каштоўнасцямі і ідэаламі[1]. Адсут-

насць жа тэарэтычна распрацаванай і верыфіцыруемай сістэмы каардынат запускае той заганны круг, аб якім гаварыў яшчэ Л. Ранке: «Гісторыю заўсёды перапісваюць нанова… Кожны час і яго асноўны накірунак прысвойваюць сабе і пераносяць на яе свае думкі. Адпаведна раздаюць хвалу і хулу. Усё гэта так і пляцецца далей, пакуль зусім не перастаюць разумець сам прадмет. Тады не дапаможа нічога, акрамя вяртання да першапачатковага паведамлення. Але ці сталі б мы наогул вывучаць гэтае паведамленне без імпульса ад сучаснасці?»[2].

Традыцыйна гісторыкі тлумачаць тую ці іншую з'яву (у дадзеным выпадку грамадскі рух) праз аднаўленне працэса яе фарміравання. Аднак для таго, каб пачаць даследаванне, неабходна зафіксаваць (стабілізаваць) гістарычны аб'ект[3]. Менавіта на гэтай стадыі гісторыкі свядома ці падсвядома звяртаюцца да згаданых у папярэднім раздзеле падыходаў і тэорый, якія забяспечваюць іх неабходным інструментарыем (дэфініцыйнымі схемамі, крытэрыямі класіфікацый, сістэмнымі ўпарадкаваннямі) для больш глыбокага аналізу розных аспектаў сацыяльных рухаў.

Трэба адзначыць, што само паняцце сацыяльнага руху, якое ўвайшло ў шырокі ўжытак толькі некалькі стагоддзяў назад, прайшло пэўную гістарычную эвалюцыю. Паняцце «сацыяльны» было ўпершыню выкарыстана ў канцы XVIII ст. Анры Сен-Сімонам для характарыстыкі рухаў сацыяльнага пратэсту, якія пачалі фарміравацца ў той час. Аднак слова «рух» у палітыцы пачало ўжывацца толькі ў першай палове XIX ст. Адзін з першых выпадкаў такога ўжывання адносіцца да 1830 г., калі прыхільнікі перамен у час ліпеньскай рэвалюцыі ў Францыі назвалі сябе «партыяй руху» ў адрозненні ад кансерватыўнай «партыі парадку». Прускі грамадскі дзеяч і тэарэтык Л. фон Штайн, які, дарэчы, аказаў значны ўплыў на працы К. Маркса, надаў тэрміну «сацыяльны рух» больш дакладны сэнс. У працы «Гісторыя сацыяльнага руху ў Францыі» (1850 г.) ён супрацьпаставіў паняцце «рух» паняццю «дзяржава». Па яго меркаванню, рух (як дынамічны элемент) заўсёды з'яўляецца антаганістычным статычным дзяржаўным інстытутам, які ўвасабляюць парадак. Хоць фон Штайн не даў дэфініцыі сацыяльнага руху, з яго прац відавочна, што паняцце грамадскіх рухаў ён аб'яднаў з ідэяй сацыяльных рэформ па ініцыятыве дзяржавы. К. Маркс аналізаваў грамадскія рухі з пункту гледжання класавай тэорыі. У далейшым у артадаксальным марксізме атрымала перавагу канцэпцыя рэвалюцыйнай партыі, якая кіруе рабочым рухам. Даследчыкі канцэнтравалі ўвагу на паступовым па-

шырэнні сацыялістычнага і камуністычнага рухаў як суб'ектаў сацыялістычнай рэвалюцыі. Іншым жа грамадскім рухам не надавалася самастойнага значэння. Яны разглядаліся альбо як ніжэйшая фаза рэвалюцыйнага працэса, альбо як перашкоды на шляху да рэвалюцыі. У рамках такой тэорыі цяжка аналізаваць тыя грамадскія рухі, што параджаюцца не глыбокімі структурнымі супярэчнасцямі, а іншымі прычынамі.

Класічныя марксісцкія падыходы да інтэрпрэтацыі сацыяльных рухаў яшчэ ў пачатку XX ст. падверг крытыцы нямецкі сацыёлаг Т. Гайгер. Ён адзначаў, што мысленне і ідэалогія не абавязкова звязаны з сацыяльным становішчам іх носьбітаў, а крыніцы сацыяльных напружанняў і канфліктаў нельга зводзіць выключна да класавай дыферэнцыяцыі[4]. Нягледзячы на гэтую крытыку, марксісцкі аналіз грамадскіх рухаў быў больш эфектыўны, чым, напрыклад, тлумачэнні тэарэтыкаў псіхалогіі мас і калектыўных паводзін праз «гіпотэзу заражэння» і такія катэгорыі як «душа мас».

З гісторыка-сацыялагічнага пункту гледжання грамадскія рухі вывучалі М. Вэбер, В. Зомбарт, ужо згаданы Т. Гайгер і Р. Міхельс. Макс Вэбер адным з першых правёў размежаванне паміж сацыяльнымі паводзінамі і масавым дзеяннем і даказаў, што сацыяльнае дзеянне не ідэнтычна аднолькавым паводзінам вялікіх груп людзей. «У тых выпадках, калі на паводзіны асобных людзей уплывае сам факт таго, што і іншыя ўдзельнікі сітуацыі паступаюць пэўным чынам, мы будзем гаварыць аб паводзінах, абумоўленых масавасцю», – пісаў ён[5]. Асновай жа сацыяльнага дзеяння з'яўляюцца такія паводзіны, калі «асобны індывід мяркуе, што ён можа разлічваць на сумесна прыняты праз абагульненае аб'яднанне характар дзеянняў іншага ці іншых, і што ў яго інтарэсах цалкам арыентавацца на гэтыя дзеянні»[6]. Такім чынам, сацыяльныя паводзіны ў М. Вэбера звязваюцца з грамадскім аб'яднаннем. На падставе гэтага ў якасці асноўных характарыстык масавых паводзін вылучаліся абумоўленасць дзеянняў выключна ўзроўнем звычайнай свядомасці, падвержанасць маніпуляванню, ідэалагічным клішэ і стэрэатыпам, а таксама індывідуальна-асабовая матывацыя. Арганізуючая аснова масавых паводзін – не агульныя прынцыпы і перакананні, а сацыяльныя сувязі. Сутыкненне ж рознабаковых інтарэсаў і намаганняў робіць масавыя паводзіны рознанакіраванымі, несінхроннымі і расплывістымі.

Такім чынам, ужо на пачатку XX ст. сацыяльныя рухі былі вызначаны як спецыфічная форма калектыўных паводзін, якая прынцыпова адрозніваецца ад масавых дзеянняў, класавых канф-

ліктаў, палітычнай барацьбы. Адначасова было пастаўлена пытанне аб узаемасувязі грамадскіх рухаў і сацыяльных змен.

Пазней грамадскія рухі былі выціснуты з поля зроку сацыёлагаў і гісторыкаў моцнымі палітычнымі партыямі, якія ўзначалілі рабочы, камуністычны, сацыялістычны і фашысцкі рухі. У выніку, хоць сацыяльныя рухі і сталі аб'ектам увагі сацыёлагаў і гісторыкаў яшчэ ў другой палове XIX – пачатку XX ст., іх даследаванне вылучылася ў асобную галіну не раней 60-х гг. XX ст. Менавіта ў гэты час была абгрунтавана магчымасць стварэння тэорыі грамадскіх рухаў як тэорыі сярэдняга ўзроўню і выпрацаваны парадыгматычны набор пытанняў і высноў для вывучэння грамадскіх рухаў[7]. Э. Гідэнс і А. Турэн[8] адзначылі межы паняцця грамадскага руху. А. Мялучы ўвёў у практыку вывучэння грамадскіх рухаў такія тэарэтычныя канцэпты, як субкультуры і сетка сувязей[9]. Новае вымярэнне вывучэнню грамадскіх рухаў было нададзена таксама працамі Ю. Хабермаса[10] і тэарэтыкамі «сімвалічнага інтэракцыянізма» Г. Блумерам, Г. Тардам[11] і інш.

Даследчыкі адзначылі, што сутнаснай рысай грамадскіх рухаў з'яўляецца іх супрацьстаянне фармальным бюракратычным арганізацыям, перш за ўсё – дзяржаўным. Па меркаванню Э. Гідэнса, сацыяльны рух можа быць вызначаны як калектыўная спроба ажыццявіць інтарэсы ці дабіцца агульнай мэты праз калектыўнае дзеянне па-за інстытуцыянальнымі рамкамі[12]. Пры гэтым важнай характарыстыкай сацыяльных рухаў выступае іх мэта, якая базуецца на пэўнай сістэме каштоўнасцей. Гэтая новая сістэма каштоўнасцей можа ўвайсці ў рэшце рэшт у заканадаўчую практыку дзяржавы, а сацыяльныя рухі ў такім выпадку ператвараюцца ў фармальныя арганізацыі: яны дасягнулі сваёй мэты[13]. Такім чынам, Э. Гідэнс вылучаў грамадскі рух перш за ўсе па крытэрыях супрацьстаяння бюракратычным арганізацыям, працэдурам прыняцця дзяржаўных рашэнняў, існавання ўласнай сістэмы каштоўнасцей і мэт.

А. Турэн таксама падкрэсліваў, што ў аснове грамадскага руху ляжыць культурна-арыентаванае дзеянне. Разам з тым, ён імкнуўся, з аднаго боку, увесці такое дзеянне ў больш шырокі кантэкст сацыяльнага канфлікта, а з другога – паказаць яго адрозненне ад сацыякультурных і сацыягістарычных рухаў. Грамадскі рух ён вызначаў як адначасова культурна-арыентаванае і сацыяльна-канфліктнае дзеянне пэўнай грамадскай супольнасці, якая вызначаецца пазіцыяй панавання ці залежнасці ў працэсе прысваення гістарычнасці, г. зн. тых культурных мадэляў інвестыцыі, ведаў і ма-

ралі, на якія ён сам арыентаваны[14]. У кантэксце класавага канфлікта, напрыклад, А. Турэн разглядаў грамадскі рух у цеснай сувязі з грамадскай свядомасцю класа. А паколькі, па яго меркаванню, не існуе класа «у сабе», класа без класавай свядомасці, грамадскі рух заўсёды, па меншай меры дыфузна, прысутнічае там, дзе ёсць канфлікт адносна сацыяльнага прысваення галоўных культурных рэсурсаў. Палітычная ж свядомасць («клас для сябе» у марксісцкай тэрміналогіі) забяспечвае пераход грамадскага руху да палітычнага дзеяння. Такім чынам, прыходзіць да высновы А. Турэн, дзеянне, накіраванае супраць сацыяльнага панавання, ніколі не зводзіцца да стратэгіі ў адносінах палітычнай улады[15].

Разам з тым французскі сацыёлаг паказаў, што, нягледзячы на цесную сувязь грамадскага руху з культурна-арыентаваным дзеяннем, яго нельга атаясамліваць як з уласна культурным (ці сацыякультурным), так і з сацыягістарычным рухамі. Культурныя рухі, адзначае А. Турэн, узнікаюць у навуковым ці артыстычным асяроддзі і ўяўляюць сабой апазіцыю як у адносінах да старой ці новай культурнай мадэлі, так і ўнутраны канфлікт паміж рознымі спосабамі сацыяльнага выкарыстання новай мадэлі. Культурныя (сацыякультурныя) рухі набываюць найвялікшае значэнне, калі палітычныя актары не з'ўляюцца яшчэ прадстаўнікамі новых патрабаванняў і грамадскіх рухаў, а змены культурнага поля выклікаюць глыбокія дэбаты аб навуцы, эканамічных інвестыцыях і правах.

Сацыягістарычныя рухі, у сваю чаргу, ляжаць «па-за рамкамі гістарычнасці», у вобласці пераходa ад аднаго грамадскага тыпу да другога (напрыклад, працэс індустрыялізацыі). У дадзеным выпадку канфлікт завязваецца вакол кіравання развіццём, а галоўнай дзеючай асобай з'ўляецца не пануючы клас (адносіны да спосаба вытворчасці), а кіруючая эліта, г. зн. група, якая кіруе развіццём і зменамі і вызначаецца перш за ўсё адносінамі да дзяржаўнага кіравання[16]. Такім чынам, праблема вывучэння грамадскага руху прымае аб'ёмны характар і патрабуе ўключэння яго ў кантэкст сацыякультурных і сацыягістарычных рухаў. Вось чаму літаратурныя, навуковыя і асветніцкія гурткі, якія ўзнікалі вакол розных навучальных устаноў у пачатку XIX ст., трэба лічыць неад'емнай часткай гісторыі грамадскіх рухаў у Беларусі[17]. Пры гэтым праблемы норм і ідэнтычнасці становяцца не менш важнымі, чым імкненні дабіцца палітычнай улады ці пераразмеркаваць матэрыяльныя даброты. Адсюль шэраг гісторыкаў прапаноўвае аналіз гісторыі сацыяльнага руху праз вывучэнне культурнай практыкі. Перад даследчыкам паўстае задача паказаць, як суб'ектыўныя

ўяўленні, думкі, здольнасці, інтэнцыі індывідаў рэалізуюцца ў прасторы магчымасцей, абмежаванай аб'ектыўнымі ўмовамі, створанымі папярэдняй культурнай практыкай.

Гэтае складанае супадчыненне аказваецца аналагічным паняццю «рэпрэзентацыя», якое дазваляе аналізаваць тры ўзроўні гістарычнай рэальнасці: калектыўныя ўяўленні, якія арганізуюць успрыяцце індывідамі сацыяльнага свету; уяўленні, навязаныя пануючымі групамі; замацаванне за самім прадстаўніком (канкрэтным ці абстрактным, індывідуальным ці калектыўным) зацверджанага ў канкурэнтнай барацьбе і прызнанага грамадствам сацыяльнага статуса і ўладных паўнамоцтваў. У такой мадэлі сацыяльнакласавыя канфлікты ператвараюцца ў барацьбу рэпрэзентацый. Аналітычны патэнцыял канцэпцыі пастаянна канкурыруючых рэпрэзентатыўных стратэгій адкрывае новыя перспектывы ў апісанні, тлумачэнні і інтэрпрэтацыі дынамікі сацыяльных працэсаў розных узроўняў. Адбываецца пераварот аналітычнай перспектывы, бо замест таго, каб прыняць прыналежнасць індывідаў да сацыяльных груп як нешта дадзенае і разглядаць суадносіны паміж суб'ектамі як апрыёрна ўсталяваныя, гісторык даследуе, якім менавіта чынам самі гэтыя ўзаемаадносіны параджаюць агульнасць інтарэсаў і саюзы, ці, інакш кажучы, ствараюць сацыяльныя групы.

У сувязі з гэтым у сацыёлагаў з'явілася цікавасць да сувязей рухаў і субкультур, да нефармальнай сеткі камунікацый, якая звязвае актывістаў, і да інтэрпрэтацый сацыяльнай рэальнасці, якая складаецца ў гэтых сетках. Так, А. Мялучы адзначаў, што любы грамадскі рух разам з відавочным вымярэннем калектыўных дзеянняў мае не менш значны латэнтны змест, у якім працякае штодзённая практыка і фарміруецца жыццёвы вопыт яго ўдзельнікаў. Па яго меркаванню, калектыўныя дзеянні ствараюць новыя прасторы-субсістэмы, якія з'яўляюцца прадуктам розных форм паводзін, не інтэграваных у грамадства. Такім чынам, калектыўнае дзеянне базуецца на некаторых «прасторах» рухаў, якія прымаюць форму сетак, складзеных з розных груп, дзе адбываецца фарміраванне культурных мадэляў, форм адносін і інтэрпрэтацый навакольнага свету. Гэтыя групы спарадычна актывізуюцца ў сувязі з той ці іншай праблемай. А іх аб'яднанні існуюць як сеткі абмену, у рамках якіх перамяшчаюцца індывідуумы і цыркуліруе інфармацыя. Так ствараецца фундамент сацыяльнага руху: «калектыўнае дзеянне забяспечваецца штодзенным узнаўленнем альтэрнатыўных значэнняў», а «патэнцыял для супраціўлення ... лакалізуецца на малекулярным вопыце індывідуальных груп, якія практыкуюць

гэтыя альтэрнатыўныя значэнні ў штодзённым жыцці»[18]. Такія сеткі з'яўляюцца больш працяглымі, чым самі рухі, фарміруюць канчатковую крыніцу мабілізацыі і дзейнічаюць у штодзённым жыцці.

Падыходы, прапанаваныя А. Мялучы, дазваляюць па новаму паглядзець на такі феномен, як масонства і на ролю, якое яно адыграла ў сацыяльным жыцці розных краін у XVIII–XIX стст. Трэба згадаць, што менавіта ў гэты час пачала фарміравацца «мараль» у сучасным сэнсе гэтага паняцця, г. зн. правілы паводзін, якія не з'яўляюцца ні тэалагічнымі, ні палітычнымі, ні эстэтычнымі, пачынаюць ствараць і займаць асобную культурную прастору[19]. Індывідуум, вызвалены ад традыцыйных саслоўна-карпаратыўных форм салідарнасці, становіцца маральным і аўтаномным суб'ектам. Пры гэтым змяняецца не толькі і не столькі яго статус, колькі прырода сацыяльных сувязей, асновай якой становіцца не прыналежнасць да двара, саслоўя і г. д., а пераканнні. Масонства стала той субкультурай, якая ператварала кагнітыўныя змены ў практыку сацыяльнага жыцця. Амерыканская даследчыца М. Джэйкабс адзначала, што масонства выконвала ролю маста паміж «высокім» і «нізкім» Асветніцтвам і садзейнічала пранікненню асветніцкіх ідэй і каштоўнасцей у масавую свядомасць і штодзённую сацыяльную практыку[20].

Акрамя таго, у перыяд мадэрнізацыі, калі адны інстытуцыянальныя формы сацыяльнага яднання былі разбураны, а другія яшчэ не сфарміраваліся, масонства дазваляла ажыццяўляць нефармальны абарот «сацыяльнага капітала» і кампенсавала нарматыўны вакуум[21]. І, нарэшце, сяброўства ў ложах працавала як пэўны адаптацыйны механізм: ложа была «духоўным оазісам» у гетэрагенным свеце; служыла інстытутам, які нёс этас капіталізму і ў той жа час дапамагаў прыстасавацца да яго, ствараючы «ценявыя формы салідарнасці». Вельмі трапна гэтую спецыфіку масонства ахарактарызаваў французскі гісторык Р. Алеві. Ён пісаў, што «туманная ідэалогія» масонства «мела, па меншай меры, да пэўнай ступені, уласную аўтаномію, якую за ёй не заўседы прызнаюць. Яна не была проста параджэннем дабравольнай асацыяцыі, а хутчэй яе асноўным прынцыпам, інтэлектуальным абгрунтаваннем, якое «браты», аднак, не пераставалі перапрацоўваць унутры сваіх ложаў. Іншымі словамі, яе значэнне дэтэрмінуецца не столькі зместам, сколькі сацыяльнай роллю – тым, якім чынам яе кожны раз нанова фармулявалі, перакройвалі і прыстасоўвалі для выкарыстання ў розных абставінах і розных мэтах»[22]. Масон-

ства функцыянавала як экран для праектавання розных страхаў і надзей, якія змяняліся з часам і адлюстроўвалі праблемы кожнага дадзенага перыяду[23]. Другімі словамі, у XVIII–XIX стст. ложы былі пляцоўкамі кшталтавання грамадскасці і грамадскага меркавання, анклавамі фарміравання грамадзянскай супольнасці, дзе ствараліся новыя формы самакіравання[24]. З канца XIX ст. у працэсе структурнай трансфармацыі публічнай сферы, развіцця дэмакратычных устаноў, фарміравання грамадскіх рухаў і арганізацыі палітычных партый ствараліся новыя сацыяльна-культурныя практыкі, якія ў большай ступені адпавядалі новай эпосе. Аднак масонства і да нашага часу захавала за сабой статус і ролю сеткі сувязей, якая спрыяе кшталтаванню грамадскасці.

Паняцце сеткі сувязей дае таксама магчымасць растлумачыць пераемнасць і змену сацыяльных рухаў, пазбавіцца ад палітычнага рэдукцыянізму. Сацыяльны рух пры гэтым разглядаецца як да-палітычны (умацаванне ў вопыце штодзённага жыцця) і мета-палітычны (палітычныя сілы не могуць забяспечыць яго рэпрэзентацыю)[25]. Такі падыход палягчае для гісторыка вызначэнне мяжы грамадскага і палітычнага рухаў, і, разам з тым, адкрывае новыя вобласці даследавання. У прыватнасці, гэта дае магчымасць паіншаму паглядзець на дзейнасць шматлікіх гурткоў і груп, якія існавалі ў Беларусі ў XIX ст. Для гісторыкаў заўсёды было важна вызначыць іх ідэйнае накіраванне – стракатасць і нявызначанасць поглядаў і меркаванняў членаў гурткоў часта параджалі супярэчлівыя ацэнкі і доўгія дыскусіі навукоўцаў. Калі ж аналізаваць іх як сферы, дзе нараджаюцца і практыкуюцца новыя «культурныя коды», новыя стылі жыцця, многія дыскусійныя пытанні могуць быць зняты, а гісторыя сацыяльных рухаў атрымае больш надзейны фундамент у «малекулярным вымярэнні». Акрамя таго, у рамках дадзенага падыходу акцэнт робіцца не на ізаляваныя грамадскія рухі той ці іншай ідэалагічнай накіраванасці, не на пратэст як такі, а на агульную сацыяльную аснову такіх рухаў. Як сцвярджаў А. Мялучы, калі такая сацыяльная база складаецца з груп, якія мабілізуюцца перыядычна ў сувязі з пэўнымі праблемамі, то выдзяленне спецыфічных рухаў – хутчэй вынік дзейнасці актывістаў, якія наўмысна звужаюць і рацыяналізуюць патрабаванні такіх груп. У сувязі з гэтым паўстае яшчэ адна даследчыцкая задача: прааналізаваць менавіта значэнні і практыкі згаданых утварэнняў, а не іх рацыяналізаваную інтэрпрэтацыю.

Інструментам такога аналізу для гісторыка могуць стаць тэорыя камунікатыўнага дзеяння Ю. Хабермаса і канцэпцыя «грамадскасці»

(публічнасці), сфармуляваная ў працах Г. Тарда, Ч. Кулі, У. Ліппмана і распрацаваная затым Г. Блумерам і Г. Ласуэлам. Пад публікай яны разумелі сукупнасць індывідаў, якія дастаткова ясна асэнсоўваюць свае інтарэсы, актыўна ўцягнуты ў працэс іх рэалізацыі, маюць сваё публічнае меркаванне. Гэта, у сваю чаргу, ставіць дзейнасць публікі ў сувязь з публічнай формай ажыццяўлення ўлады. Г. Блумер вызначаў грамадскасць як групу людзей, якія, сутыкаючыся з пэўнай праблемай, падзяляюцца ў меркаваннях адносна вырашэння гэтай праблемы і ўступаюць у дыскусіі. Такім чынам, грамадскасць – гэта элементарныя спантаныя калектыўныя групаванні, якія паўстаюць не ў выніку мэтанакіраванай дзейнасці, а як водгук на пэўную сітуацыю. Грамадскасць не існуе ў якасці ўстойлівай групы, а сам факт яе маніфестацыі сведчыць аб наяўнасці такой сітуацыі, якая можа быць вырашана не на аснове пэўнага культурнага правіла, а праз калектыўнае рашэнне, якое дасягаецца праз «рацыянальнае камунікатыўнае дзеянне» (тэрмін Ю. Хабермаса) ў працэсе дыскусій і фарміравання публічнай сферы[26].

Так, у XIX ст. удзел індывідаў у грамадскім жыцці (публічнай сферы дзейнасці) ў Расійскай імперыі і, у прыватнасці ў Беларусі, вызначаўся двума тэрмінамі: «грамадская самадзейнасць» і «грамадскасць» («общественность»). Асновай грамадскай самадзейнасці з'яўляліся калектывы, якія ствараліся грамадзянамі дзеля таго, каб вырашаць праблемы, звязаныя з жыццёвымі абставінамі рознага кшталту. Паняцце «грамадскасці» ўключала людзей, якія былі аб'яднаныя агульнай дзейнасцю, пазіцыяй, меркаваннем і належалі да пэўнай уяўленай супольнасці – чытаючай і дыскутуючай публікі – «паверх» шматлікіх саслоўных бар'ераў. Грамадскасць асацыявалася таксама з грамадскім меркаваннем, якое ў той час успрымалася як самастойная сіла і часта адкрыта супрацьпастаўлялася дзяржаўнаму, афіцыйнаму пункту погляду. Прыналежнасць да грамадскасці вызначалася не фармальна (членства), а праз меркаванне (дыскурсіўна) ці праз практычнае дзеянне. Гэты прыклад паказвае слушнасць тлумачэння гісторыі грамадскіх рухаў XIX ст. праз рэканструкцыю працэса фарміравання публічнай сферы. Апошнюю Ю. Хабермас вызначаў наступным чынам: «Публічная сфера – гэта форум, на які людзі (у якасці прыватных асоб, пазбаўленых статуса ў дзяржаўнай іерархіі) збіраюцца разам, фарміруючы такім чынам грамадскасць (a public). Пры гэтым яны гатовыя падпарадкоўвацца аўтарытэту грамадства ў абмен на прызнанне сябе з боку грамадскага меркавання»[27]. Ю. Хабермас разглядаў феномен «публічнай сферы»

ў прасторавым сэнсе пэўнага месца (таму і сам тэрмін «форум» не выпадковы і адсылае да свайго першапачатковага значэння), якое належыць ужо не «двару», а «гораду» і рэалізуецца ў форме разнастайных інстытутаў, такіх як клубы, салоны, цесныя гурткі наведвальнікаў кафейняў і тавернаў, масонскія ложы[28].

Па меркаванню Ю. Хабермаса, гэтыя інстытуты характарызаваліся некалькімі адметнымі рысамі. Па-першае, яны прадуцыравалі этас роўнасці, свядома не звяртаючы ўвагі на розны сацыяльны статус сваіх членаў. Па-другое, хоць гэтыя інстытуты не з'яўляліся эквівалентам грамадства як такога, тым не менш сацыяльныя дыскурсы, якія яны параджалі, самі прэтэндавалі на вызначэнне грамадскіх аўтарытэтаў. Па-трэцяе, тут абмяркоўваліся палітычныя і этычныя пытанні, якія раней былі «таямніцамі» двара і царквы. Яшчэ адной прыкметай публічнай сферы стала перыядычная прэса[29]. Гэты прынцыпова новы спосаб артыкуляцыі грамадскіх патрабаванняў і інтарэсаў атрымаў у Расійскай імперыі XIX ст. хуткае развіццё. Фарміраванне публічнай сферы стала тым асяроддзем, у якім выкрышталізоўваліся і развіваліся грамадскія рухі таго часу.

Разам з тым, трэба адзначыць, што сістэмна-структурны падыход не можа прымацца ў якасці прыярытэта ў гістарыяграфіі. У сучаснай гістарычнай навуцы ствараюцца пэўныя магчымасці спалучаць структурна-гістарычны аналіз і гісторыка-эмпірычны падыход у вывучэнні гісторыі грамадскіх рухаў, каб звязаць вопыт, успрыняцце, уяўленні індывідаў і груп са структурамі і працэсамі. Не меншае значэнне, чым вылучэнне структурных дэтэрмінантаў, мае і аналіз розных аспектаў штодзённай дзейнасці індывідаў і груп.

У гэтым кантэксце нельга не згадаць папярэджанне нямецкага гісторыка Р. Зідэра аб тым, што так званая «штодзённая гісторыя» зусім не азначае простага калекцыяніравання «штодзённых сюжэтаў», непасрэднай і канкрэтнай рэканструкцыі таго, што на самой справе рабілі селянін XVII ст. ці прыслужніца XX ст. Паняцце штодзённасці, падкрэслівае Р. Зідэр, выражае суму працэсаў, якія маюць месца ва ўсіх грамадскіх сферах і ва ўсіх сацыяльных класах – панаванне і падпарадкаванне, акумуляцыя і захаванне сацыяльных даброт, барацьба за ўплыў і ідэалогія ў сферах вытворчасці, узнаўлення працоўнай сілы і г. д. Пры гэтым важным момантам з'яўляецца аналіз іх узаемнай абумоўленасці. Менавіта ў выніку такога аналізу сферы «штодзённасці» ствараецца падвоенае бачанне сацыяльнай рэчаіснасці: з аднаго боку, як дэтэрмінацыя

жыццядзейнасці мужчын і жанчын тымі ўмовамі і абставінамі, у якіх яны жывуць, а з другога – як уплыў гістарычнай практыкі людзей на фарміраванне структур[30].

Такі падыход знайшоў адлюстраванне ў двух шырока вядомых і блізкіх па сваей сутнасці праграмах: гісторыі ментальнасцей Ж. Дзюбі і «гісторыі знізу» Э. Хобсбаўма (ці «лакальнай гісторыі»). Ж. Дзюбі лічыў наступныя працэдуры неабходнымі для гістарычнага даследавання: рэканструкцыя ідэйных сістэм, аналіз адносін паміж ідэалогіямі і жывой рэальнасцю сацыяльнай арганізацыі. «Для гэтага гісторык павінен як мага дакладней вызначыць адносіны адпаведнасці і рознасці, якія існуюць у кожнай кропцы дыяхроннай шкалы паміж трымя пераменнымі: з аднаго боку, паміж аб'ектыўнай сітуцыяй індывідаў і груп і тым яе вобразам, які яны стварылі…, а з другой – паміж гэтым вобразам і індывідуальнымі і калектыўнымі паводзінамі»[31].

Для гэтых падыходаў важным таксама з'яўляецца стварэнне інтэгральнай мадэлі, якая арыентуецца не на «вывядзенне сярэдняга» ці тыповага, а на максімальны ўлік усіх рэгіянальных варыяцый у іх спецыфічнай сувязі з нацыянальным цэлым. У аснове ж дадзеных мадэляў ляжыць вышэйзгаданая канцэпцыя сацыяльнай прасторы, якая ахоплівае розным чынам абмежаваныя і часткова перакрытыя адна другой сферы сацыяльных кантактаў. Асноўным метадалагічным паняццем у такой перспектыве становіцца паняцце «лакальнай супольнасці», якое засноўваецца не на тэрытарыяльных адзінках, а на апісанні і аналізе рэальна існаваўшых сацыяльных арганізмаў лакальнага ўзроўня.

Пры дапамозе сацыялогіі можна стварыць пэўную дысцыплінарную матрыцу для вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў, якая заснавана на ўліку пэўных узроўняў аналізу. Так, пры вывучэнні грамадскіх рухаў на мікраўзроўні неабходна адказаць на наступныя пытанні:

хто прымае мэты руху (мабілізацыйны патэнцыял);

хто актыўна падтрымлівае рух і чаму;

матывы ўдзельнікаў;

як людзі ўцягваюцца ў рух;

якія асноўныя бар'еры для пашырэння ўдзелу ў руху (на індывідуальным узроўні).

Відавочна, што адказы на гэтыя пытанні патрабуюць не толькі якаснага аналізу, але і апрацоўкі значных масіваў матэрыялаў. Магчымасць вырашэння гэтай праблемы забяспечваецца добра распрацаванымі ў айчыннай гістарыяграфіі працэдурамі кватытатыўнага аналізу[32].

Пры аналізе грамадскага руху на так званым «сярэднім узроўні» даследчык ставіць перад сабой задачу выявіць арганізацыйную спецыфіку руху:

якім патрэбам адпавядае рух;

якія мэты руху;

якую тактыку выкарыстоўвае рух;

як вызначаецца калектыўная ідэнтычнасць («мы» руху);

якая арганізацыйная структура руху (цэнтралізаваная/дэцэнтралізаваная, лакальная, рэгіянальная, дзяржаўная, нацыянальная), яе недахопы і перавагі;

як рэкрутуюцца новыя члены;

як атрымліваюцца рэсурсы (грошы, веды і г. д.);

як ажыццяўляецца сувязь паміж удзельнікамі руху;

якія патрабаванні рух прад'яўляе «знешняму свету»;

як будуюцца зносіны з іншымі рухамі.

На макраўзроўні рухі аналізуюцца з пункту гледжання знешніх у дачыненні да іх фактараў:

становішча на палітычным ландшафце;

роля ў рамках больш агульных палітычных працэсаў;

узаемадзеянне з дзяржаўнымі структурамі;

эліты, саюзнікі і праціўнікі ў рамках эліт;

іншыя ключавыя ігракі.

Цікавасць да падобных пытанняў, з нашага пункту гледжання, забяспечвае магчымасць пазбегнуць рэдукцыянісцкіх тэндэнцый класавага аналіза і стварыць умовы для больш аб'ектыўнай сістэматызацыі эмпірычнага матэрыялу. А ўяўленне аб узроўнях аналізу грамадскіх рухаў дазваляе ў шэрагу выпадкаў больш дакладна вызначыць прадмет канкрэтнага гістарычнага даследавання.

Узаемадзеянне індывіда з соцыумам можа быць раскрыта праз наступныя асноўныя працэдуры:

1) аналіз ардынарнай і неардынарнай сітуацыі, якая задае ўмовы і абмяжоўвае магчымыя напрамкі дзейнасці (ў тым ліку сам набор альтэрнатыўных мадэлей паводзін і іх адносную грамадскую каштоўнасць);

2) рэканструкцыя гісторыі самога індывіда – яго папярэдняга жыццёвага вопыта, які і вызначае індывідуальнае ўспрыняцце сацыякультурнай традыцыі, якая склалася на аснове атрыманага ў спадчыну гістарычнага вопыта, дамінуючага ў грамадскай свядомасці;

3) выяўленне псіхалагічнай перадраспаложанасці да таго ці іншага тыпу дзеянняў, ступені здравага сэнсу, практычнай інтуі-

цыі, эмацыянальнага настрою – усяго таго, чым абумоўлены асабісты выбар (адпаведна дамінуючай калектыўнай мадэлі ці ў адрозненне ад яе);

4) апісанне дзеянняў індывіда, уключаючы іх матывацыю, канкрэтны працэс прыняцця і рэалізацыі рашэння;

5) пазітыўныя ці негатыўныя наступствы рэалізаванага рашэння;

6) пераход ад адзінкавага да масавага з дэманстрацыяй наяўнасці аналагічных ці альтэрнатыўных рашэнняў, якія прайшлі праверку жыццёвай практыкай і замацаваны ў новым паводзінавым стэрэатыпе і інкарпарыраваных такім чынам ў калектыўны вопыт;

7) аналіз адбыўшыхся структурных змен.

Слушнасць такога спалучэння структурнага і мікрагістарычнага падыходаў для вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў прадэманстравалі працы расійскай даследчыцы І. Гардзеевай, прысвечаныя «інтэлігенцкім абшчынам» канца XIX ст.[33]. На аснове рэканструкцыі культурных сэнсаў агульнага «этычнага кантэкста» таго часу, яна ўдакладніла пануючыя погляды на ступень рацыяналізацыі і унікальнасці працэсаў, характэрных для Расійскай імперыі XIX ст. І. Гардзеева адзначыла, што працэсы мадэрнізацыі, бюракратызацыя, секулярызацыя, фарміраванне «кагнітыўнага стылю абстракцыі» аказалі дваякі ўплыў на грамадства. З аднаго боку, многія страцілі пачуццё стабільнасці існавання, культурнай нормы, устойлівасці сацыяльнага і палітычнага парадку, ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі і грамадскімі ўстановамі стаў выяўляцца эфект адчужэння. А з другога – пачуццё парушанасці традыцыйнага парадку правакавала ідэю магчымасці накіраваць развіццё грамадства, што стала асновай для розных сацыяльных эксперыментаў. Аналіз жа «персаналій» удзельнікаў камунітарнага руху дазволіў аўтару зрабіць вывад, што іх аб'ядноўвала не столькі агульнасць сацыяльнага становішча, колькі падобнасць «біяграфічных сітуацый». У выніку вывучэння ўзаемаўспрыняцця і адносін удзельнікаў камунітарнага руху і рэвалюцыянераў расійская даследчыца зрабіла выснову аб тым, што іх фармальна антаганістычныя ідэалагічныя пазіцыі не праяўляліся як кафліктныя: яны існавалі нібы ў паралельных каштоўнасных мірах, камунікацыя паміж якімі была немагчымай.

Такім чынам, на аснове розных падыходаў у навуцы сфарміраваўся сінтэтычны погляд на сацыяльныя рухі, як на дынамічныя феномены. На розных ступенях развіцця і ў розных кантэк-

стах яны могуць прымаць разнастайныя формы, для тлумачэння якіх цяжка прапанаваць універсальную тэорыю. Агульныя рамкі для вызначэння грамадскага руху як аб'екта гістарычнага даследавання вызначаюцца разуменнем руху як да-палітычнага (умацаванага ў вопыце штодзённага жыцця) і мета-палітычнага (палітычныя сілы не забяспечваюць суцэльную рэпрэзентацыю грамадскіх рухаў) феномена. Падыходы, заснаваныя на разуменні грамадскага руху як шматслойнага і шматмернага феномена дазваляюць у залежнасці ад даследчыцкіх задач больш дакладна вызначаць канкрэтны прадмет гістарычнага аналізу. Пры гэтым трэба прасочваць адпаведнасць метадаў сістэматызацыі і абагульнення гістарычнага матэрыялу абраным тэарэтыка-метадалагічным падыходам да вызначэння паняцця «грамадскі рух», што дысцыплінуе практыку гісторыка, дазваляе больш дакладна вызначыць вобласць даследаванняў і адчыняе шэраг новых праблемных сфер.

---

[1] Элиас Н. Введение: социология и история // Элиас Н. Придворное общество. М., 2002. С. 48.

[2] Ranke L. Tagebuchlblätter, 1831–1849 // Das politische Gespräch und andre Schriften zur Wissenshaftslehre. Halle, 1925. S. 52.

[3] Ankersmit F. The Reality Effect in the Writing of History: The Dynamics of Historiographical Topology // Mededelinger van de Afdeling Letterkunde. Amsterdam, 1989. Deel 52. № 1. P. 22.

[4] Marshall G. Dictionary of Sociolgy. Oxford, 1998. P. 248.

[5] Вебер М. О некоторых категориях понимающей социологии // Избранные произведения. М., 1990. С. 524.

[6] Там жа. С. 522.

[7] McCarhty J., Zald M. Resource Mobilization and Social Movements; Здравомыслова Е. Парадигмы западной социологии общественных движений. СПб., 1993.

[8] Giddens A. Modernity and Self-Identity: Self and Society in the Late Modern Age. Stanford, 1991; Турен А. Возвращение человека действующего. М., 1998.

[9] Melucci A. Nomads of the Present. Philadelphia, 1980.

[10] Habermas J. The Theory of Communicative Action. Boston, 1984. Vol. 1: Reason and Rationalization of Society; Boston, 1987. Vol. 2: Lifeworld and System: A Critique of Functionalist Reason.

[11] Тард Г. Мнение и толпа // Психология толп. М., 1998. С. 255–408; Ён жа. Социальная логика. СПб., 1996.

[12] Гидденс Э. Социология. М., 1999. С. 584.

[13] Щепаньский Я. Элементарные понятия социологии. М., 1969. С. 214; Гидденс Э. Социология. С. 584.

[14] Турен А. Возвращение человека действующего М., 1998. С. 89.

[15] Там жа. С. 90.

[16] Там жа. С. 90–92.

[17] Соколова М. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества. С. 19–40.

[18] Melucci A. Nomads of the Present. P. 70–71.

[19] Макинтайр А. После добродетели: Исследования теории морали. М., 2000. С. 57.

[20] Jacobs M Living the Enlightenment – Freemasonry and Politics in Eighteenth Century Europe. New York, 1992. P. 214, 222.

[21] Аб сацыяльным капітале гл.: Coleman J. Foundations of Social Theory. Cambridge, 1990; Бурдье П. Социология политики. М., 1993.

[22] Halevi R. Les Loges Masoniques dans la France d'Ancien Regime: aux origins de la sociabilite democratique. Paris, 1984. P. 145.

[23] Smith D. Working the Rough Stone: Freemasonry and Society in the Eighteenth Century Russia. Northern Illinois, 1999. P. 170–171.

[24] Harland-Jacobs J. The Essential Link Freemasonry and British Imperialism, 1751–1918. Duke University, 2000; Davis M. 19th Century Rhetoric of American Brotherhood. Washington, 2000; Kappiel F. Mystic Ties of Brotherhood: Freemasonry, Royalty and Ritual in Hawaii, 1843–1891. Hawaii, 1998.

[25] Там жа. P. 72.

[26] Blumer H. Collective behaviour. Ch. XIX–XXII // New Outline of the Principls of Sociology. N. Y., 1951. P. 167–221; Habermas J. The Structural Transformation of Public Sphere. 1989.

[27] Habermas J. The Structural Transformation of the Public Sphere. P. 25.

[28] Аб масонскіх ложах у Беларусі гл.: Вольныя муляры ў Беларускай гісторыі. Канец XVIII – пачатак XX ст. / Склад. А. Смалянчук. Вільня, 2005.

[29] Habermas J. The Structural Transformation of the Public Sphere. P. 36–44.

[30] Зидер Р. Что такое социальная история? Разрывы и преемственность в освоении «социального» // ТЕЗИС. 1993. Вып. 1. С. 174–176.

[31] Цыт. па: Репина Л. Новое в историографии XX ст. М., 2001. С. 1.

[32] Сидорцов В. Исследование и обучение истории: методология и методы // Теоретико-методологические проблемы исторического познания. Мн., 2000. Т. 2. С. 3–5.

[33] Гордеева И. Коммунитарное движение в России в последней четверти XX века: Автореф. дис. … канд. ист. наук. М., 2000; Изучение социальной истории России второй половины XIX – начала XX в.: «микроисторический» подход // Образы историографии. М., 2000. С. 109–132; Историческое призвание русского помещика: Попытка постановки вопроса в пореформенной России // Россия в новое время: историческая традиция и проблемы самоидентификации: Материалы межвузовской конференции. М., 1996. С. 108–109 і інш.

5.3. Класіфікацыя грамадскіх рухаў

Паняцце «грамадскі рух» па-рознаму трактавалася ў шматлікіх тэорыях. Яго змест з цягам часу набываў розныя адценні і акцэнты. Каб «прыстасаваць» зменлівы тэрмін «грамадскі рух» да мэт гістарычнага аналіза, неабходна, перш за ўсё, удакладніць яго змест, выявіць яго ўнутраную структуру. Гэтае ўдакладненне можа быць рэалізавана, перш за ўсё, праз упарадкаванне сукупнасцей відавых паняццяў метадамі класіфікацыі і тыпалогіі. Ажыццяўленне класіфікацыі (усталяванне адносін паміж шматлікімі і вельмі разнастайнымі грамадскімі рухамі, якія існавалі ў мінулым і існуюць зараз) – адна з важных метадалагічных праблем гісторыі грамадскіх рухаў. Групіроўка рухаў, сходных па тых ці іншых прыкметах, і аддзяленне класіфікацыйных не толькі ўпарадкоўвае і замацоўвае ўжо здабытыя навуковыя матэрыялы, але і з'яўляецца адным са шляхоў далейшага пазнання сутнасці гэтых рухаў. Разам з тым неабходна выпрацаваць наменклатуру, у тэрмінах якой можна было б адэкватна апісваць масу эмпірычных феноменаў і праводзіць параўнальны аналіз рухаў, г. зн. – выпрацаваць тыпалогію рухаў.

У працэсе вывучэння гісторыі грамадскіх рухаў так ці інакш выдзяляюцца іх агульныя і размеркавальныя прыкметы і сувязі. Гісторык, свядома ці не, прыходзіць да этапа класіфікацыі (сістэматызацыі і групіроўкі феноменаў). Аднак, паколькі грамадскія працэсы адрозніваюцца вялікай складанасцю, не дзіўна, што ў гуманітарных навуках распрацоўка класіфікацыйных схем разгарнулася пазней, чым у натуральных, ахапіла толькі частку гуманітарных аб'ектаў і да гэтага часу не завершана. З другога боку, пры класіфікацыі грамадскіх рухаў пераважаў гісторыка-стадыяльны падыход, накіраваны на выяўленне асноўных этапаў развіцця рухаў. Аднак дыяхронны падыход не дае магчымасці ранжыраваць некаторыя сутнасныя прыкметы рухаў, якія проста знікаюць пры такой класіфікацыі.

У сучаснай гуманітарнай навуцы склаліся два асноўных падыходы да сістэматызацыі фактычных дадзеных: канцэптуальны і класіфікацыйны. Пры першым падыходзе робіцца спроба пабудовы канцэптуальнай сістэмы катэгорый, у якой пазіцыя кожнай не фіксаваная, а вызначаецца адпаведнай тэорыяй. Пры другім будуецца структурная сістэма паняццяў, у якой кожнае паняцце займае пэўнае месца. Пры гэтым класіфікацыйныя схемы могуць служыць сродкам верыфікацыі канцэптуальных пабудоў.

Наменклатура класіфікацыйных схем засноўваецца на сацыяльных паняццях базавага ўзроўню, якія выяўляюцца на аснове двух

логік: арыстоцелеўскі прынцып неабходных і дастатковых ўмоў для членства ў катэгорыі; «натуральная катэгарызацыя» на аснове прынцыпа сямейнага падабенства.

У першым выпадку класіфікацыя, як працэдура, з'яўляецца прыватным выпадкам лагічнай аперацыі дзялення аб'ёму паняццяў. Яна заключаецца ў дзяленні родавага паняцця некаторай сукупнасці прадметаў на віды, класы і тыпы на аснове іх агульных адзнак з утварэннем пэўнай сістэмы дадзенай сукупнасці класаў. Агульныя адзнакі, у адпаведнасці з якімі адбываецца дзяленне, называюцца асновай дзялення. У тэорыі класіфікацыі адной з важнейшых характарыстык адзнак з'яўляецца яснасць – разуменне адзнак і яе інтэрпрэтацыя. Калі сэнс вызначаны дакладна і адназначна, прыкмету называюць змястоўна яснай, ці проста яснай і дакладнай. Пры класіфікацыі павінны выконвацца наступныя правілы:

дзяленне павінна быць суразмерным (аб'ём дзялімага паняцця павінен быць роўны суме аб'ёмаў дзялення);

на кожным этапе дзялення павінна выкарыстоўвацца адна і тая ж аснова (некая сукупнасць істотных прыкмет);

члены дзялення павінны выключаць адзін аднаго (не павінны перасякацца, быць часткай іншага).

Такім чынам, класіфікацыя патрабуе лагічнай яснасці, строгай дакладнасці і семантычнай адназначнасці прыкмет. Без гэтага яна ператвараецца ў свядомую, ці не свядомую, фальсіфікацыю.

Самай простай разнавіднасцю класіфікацыі з'яўляецца дыхатамія, калі аб'ём паняцця падзяляюць на дзве ўзаемавыключныя часткі, якія ў суме вычэрпваюць аб'ём дзялімага паняцця. Але калі не захоўваецца правіла дзялення аб'ёму паняцця, заманлівая ідэя дыхатаміі прыводзіць да памылак у ідэнтыфікацыі тыпаў[1].

У адпаведнасці з другім прынцыпам, вакол «добрых прыкладаў» ці «прататыпаў» ядра катэгорыі аб'ядноўваецца маса перыферыйных членаў. Пры гэтым няма ніводнай уласцівасці, якую падзяляюць усе члены катэгорыіі і толькі яны, бо класіфікацыі абапіраюцца не столькі на аналіз уласцівасцей, колькі на агульнае ўяўленне аб аб'екце, на яго вобраз. Базавым узроўнем у дадзеным выпадку лічыцца такі, паняцці якога маюць максімальны аб'ём, сумяшчальны з эканамічным кадыраваннем і рэпрэзентацыяй інфармацыі. Такімі эканамічнымі формамі з'яўляюцца ментальныя (візуальныя) вобразы, якія мелі значныя перавагі ў параўнанні з грувасткімі апісаннямі прыкмет[2].

Трэба адзначыць, што менавіта ў адпаведнасці з апошнім прынцыпам пабудавана большасць класіфікацый грамадскіх ру-

хаў у гістарычных працах: «ядром» натуральнай катэгарызацыі становяцца часцей за ўсё гісторыка-эмпірычныя абстракцыі (канцэпты)[3]. Аднак, калі канцэпты выкарыстоўваюцца ў класіфікацыях замест аналітычных катэгорый, адбываецца памнажэнне класіфікацыйных катэгорый, ускладняецца выдзяленне базавых паняццяў. У выніку класіфікацыйныя і тыпалагічныя схемы пазбаўляюцца аналітычнай каштоўнасці, бо ператвараюцца ў просты пералік феноменаў, якія маюць тое ці іншае дачыненне да грамадскага руху і імёнаў найбольш актыўных яго ўдзельнікаў. На самой жа справе менавіта канцэпты з'яўляюцца фактуальнымі дадзенымі для даследавання гісторыі грамадскіх рухаў. Менавіта яны класіфіцыруюцца на аснове аналітычных катэгорый, якія становяцца базавымі родавымі паняццямі.

Характэрным у гэтым кантэксце з'яўляецца варыянт класіфікацыі рухаў, прапанаваны У. Леніным у працы «Ад якой спадчыны мы адмаўляемся». «Адна справа – гэта змешваць разам розныя погляды; іншая справа – абагульняць і падводзіць пад адну катэгорыю пісьменнікаў, якія, нягледзячы на розніцу па многіх пытаннях, салідарны па тых асноўных і галоўных пунктах, супраць якіх паўсталі «вучні». Для «вучня» важна зусім не тое, каб паказаць, напрыклад, непрыдатнасць поглядаў, што адрозніваюць якога-небудзь сп. Юзава ад іншых народнікаў, для яго важна абвергнуць погляды, агульныя і для сп. Юзава і для сп. Міхайлоўскага і для ўсіх народнікаў наогул, г. зн. іх адносіны да капіталістычнай эвалюцыі Расіі, іх абмеркаванне пытанняў эканамічных і публіцыстычных з пункту гледжання дробнага вытворцы, іх неразуменне сацыяльнага (гістарычнага) матэрыялізму. Гэтыя рысы складаюць агульны набытак цэлай плыні грамадскай думкі, якая адыграла вялікую гістарычную ролю. У гэтай шырокай плыні ёсць правыя і левыя флангі, ёсць людзі, якія апускаліся да нацыяналізму і антысемітызму, і ёсць людзі, непавінныя ў гэтым; ёсць людзі, якія са знявагай адносіліся да многіх запаветаў «спадчыны», і есць людзі, якія імкнуліся захоўваць гэтыя запаветы… Але паколькі мы выступаем супраць асноўных поглядаў, агульных для ўсіх гэтых адценняў, то навошта ж нам гаварыць аб прыватных адрозненнях агульнай плыні?… Агульнасць поглядаў на рускі капіталізм, на сялянскую «абшчыну», на ўсемагутнасць так званага «грамадства» ў пісьменнікаў, не ва ўсім салідарных, адзначалася не раз у нашай літаратуры»[4]. Тут у якасці «ядра візуалізацыі» выступае ўяўленне аб «добрым прыкладзе» народніцтва, якое сфарміравалася расійскімі сацыял-дэмакратамі для палеміч-

ных мэт. Менавіта на аснове такога ментальнага вобраза аб'екта і адбывалася вызначэнне розных напрамкаў грамадскіх рухаў.

Другі прыклад такой візуалізацыі знаходзім у мемуарах С. Міцкевіча, дзе ён апісвае склад удзельнікаў IX Пірагоўскага з'езда (1904 г.): «Ліберaламі проста іх … было б недакладна назваць: яны – разначынцы, з'яўляліся ідэолагамі не буржуазіі ў вузкім сэнсе гэтага слова, а «народа», г. зн. працоўных і дробнабуржуазных элементаў. Але проста дэмакратамі было б таксама няправільна іх назваць, бо ў гэта паняцце ўваходзіць элемент рэвалюцыйнасці, чаго ў іх не было»[5]. Відавочна, што пры такой «натуральнай» класіфікацыі парушаецца патрабаванне адзінства асновы класіфікацыі. Гэта прыводзіць да пэўнай блытаніны: атрымліваецца, што разначынцы не могуць быць ліберaламі, а дэмакраты не могуць быць рэфарматарамі.

Практыка візуалізацыі семантычных катэгорый, характэрная для ленінскіх прац, была засвоена гісторыкамі савецкага часу. Так, А. Сцяпанскі вылучаў у грамадскім руху «культурнікаў» і «ліберaлаў», спасылаючыся на працы У. Леніна. Пры гэтым пад словам «культурнікі» разумеліся прыхільнікі «легальнага прагрэса без палітычнай барацьбы»[6], што на самой справе з'яўляецца адным з вызначэнняў грамадскага ліберальнага руху.

Такім чынам, натуральная катэгарызацыя, уласцівая большасці гістарычных даследаванняў грамадскага руху, часам прыводзіць да істотных памылак і скажэння мінулай рэчаіснасці. Патэнцыял жа «арыстоцелеўскіх» прынцыпаў класіфікацыі, на нашу думку, яшчэ застаецца невыкарыстаным гісторыкамі. Нагадаем, што зыходным пунктам такой класіфікацыі з'яўляецца вызначэнне зместу родавага паняцця, у дадзеным выпадку – паняцця «грамадскі рух».

Як ужо адзначалася ў папярэднім раздзеле, упершыню тэрмін «грамадскі рух» быў уведзены А. Сен-Сімонам для характарыстыкі рухаў сацыяльнага пратэсту. У гэтым сэнсе паняцце «грамадскі» ці «сацыяльны рух» выкарыстоўвалася ў вялікай колькасці прац як у XIX, так і ў XX ст. Так, В. Зомбарт у 1896 г. адзначаў: «Пад сацыяльным рухам мы разумеем сукупнасць імкненняў пэўнага сацыяльнага класа, накіраваных на прынцыповыя змены існуючага сацыяльнага ладу так, каб ён адпавядаў інтарэсам гэтага класа»[7]. Сучасны яму сацыяльны рух даследчык разумеў выключна як сацыялістычны рух пралетарыяту[8].

Наогул, рэдукцыянісцкі падыход да разумення грамадскага руху быў характэрны для многіх гісторыкаў. Так, Л. Барыве (1909 г.)[9] разглядаў толькі вызваленчы рух, С. Сваціка ў атаясамліваў палі-

тычны і грамадскі рухі[10]. Ю. Мартаў разумеў грамадскі рух як рух за рэформу грамадскіх адносін[11]. А. Пыпін разумеў грамадскі рух як эвалюцыю грамадскай думкі[12]. Р. Дыстэрло лічыў, што грамадская дзейнасць праяўлялася ў 1860-я гг. не ў дзейнасці рэвалюцыянераў, а ў «пераўтваральнай актыўнасці» ўдзельнікаў рэформы[13]. Шэраг буйных дарэвалюцыйных гісторыкаў разглядалі грамадскі рух выключна як барацьбу розных слаёў грамадства за канстытуцыю[14]. Пры гэтым у паняцце «барацьба розных слаёў грамадства» ўключалася і дзейнасць дзяржаўных органаў[15]. У працы «Грамадскі рух у Расіі» (1909 г.), якая была напісана пад рэдакцыяй Ю. Мартава, У. Маслава і А. Патрэсава, грамадскі рух разумеўся як «актыўнасць грамадскіх класаў і груп»[16].

З сярэдзіны 20-х да канца 80-х гг. XX ст. у айчыннай гістарыяграфіі ішло засваенне «марксісцка-ленінскай тэорыі», як базавай структуры для інтэрпрэтацыі грамадскіх рухаў. Бясспрэчна, што марксісцкі аналіз дазваляе тлумачыць глубінныя структуры, якія параджаюць грамадскія рухі. Але ў марксісцкай парадыгме грамадскае жыццё аналізуецца на аснове класавага падыхода, у рамках якога не застаецца месца для грамадскага руху. Марксізм-ленінізм выдзяляе тры асноўныя віды класавай барацьбы: эканамічная барацьба за непасрэднае паляпшэнне жыццёвых умоў працоўных; палітычная – за пашырэнне правоў і свабод працоўных, удзел у дзяржаўных справах; тэарэтычная (ідэалагічная) барацьба за развіццё рэвалюцыйнага вучэння, вызваленне працоўных ад класава чужых поглядаў і замацаванне ў іх асяроддзі сацыялістычнага светапогляду[17]. Пры гэтым лічыцца, што ўсялякая сапраўдная класавая барацьба ёсць барацьба палітычная[18].

Цікава ў гэтым сэнсе параўнаць дзве кнігі, якія выйшлі адносна адначасова. Гэта невялічкая брашура «Палітычныя і грамадскія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасці» (1931 г.) і кнігу С. Агурскага «Нарысы гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі» (1928 г.)[19]. С. Агурскі разглядае толькі рэвалюцыйны грамадскі рух у рамках традыцыйнай марксісцкай парадыгмы класавай барацьбы і партыйнага будаўніцтва: нацыянальна-рэвалюцыйны рух (польскія паўстанні), народнікі і сацыяльна-рэвалюцыйны рух («Пралетарыят»), сацыял-дэмакратыя, сялянскі рух, барацьба бальшавікоў супраць іншых напрамкаў. У адрозненне ад працы С. Агурскага ў брашуры «Палітычныя і грамадскія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасці», падпісанай абрэвіятурай ВАГ, праводзіцца розніца паміж палітычным і сацыяльным рухам. Аўтар сцвярджае, што палітычны рух мае дачыненне перш за ўсё да спосаба кіравання дзяржавай, не

звяртаючы ўвагі на тое, як будзе ўпарадкавана грамадства; сацыяльныя ж рухі вядуць да перабудовы грамадскага ладу.

У савецкай гістарыяграфіі пад паняцце грамадскі рух падводзілася і дзейнасць палітычных партый, і класавая барацьба. У некаторых працах грамадскі рух нават вызначаўся як «сістэма палітычных партый, якія з'яўляліся вышэйшай арганізацыйнай формай класавых рухаў, што адлюстроўвалі найбольш істотныя эканамічныя, палітычныя і культурныя імкненні» асноўных слаёў грамадства[20]. У той жа час уводзілася паняцце «вызваленчага руху», пад якім разумеўся ўсякі рух, накіраваны на вызваленне народа ад прыгону, самадзяржаўя, нацыянальнага гнёту і г. д. Асноўнымі сегментамі ў рамках марксісцкага класавага аналізу былі вызваленчы рух і яго сутнасная складаючая частка – рэвалюцыйны рух[21]. Пры гэтым У. Ленін разглядаў гісторыю рэвалюцыйнага руху як матэрыял, якім трэба авалодаць, каб выпрацаваць мэтазгодную арганізацыю і тактыку партыі[22]. Паступова ў савецкай гістарыяграфіі склалася ўяўленне аб грамадскім руху як агульнай назве для вызваленчага руху і грамадскай думкі[23].

З канца 80-х гг. у савецкай і постсавецкай сацыялогіі сталі складвацца новыя падыходы да вывучэння грамадскіх рухаў, ішло засваенне немарксісцкіх тэорый калектыўных паводзін. Гэта ў пэўнай ступені аказала ўплыў і на гістарычныя працы. Але і пасля гэтага рэдка праводзіўся перагляд паняційнага апарату. Марксісцкія тэрміны працягвалі пераходзіць у працы, якія прэтэндавалі на новыя падыходы ў інтэрпрэтацыі грамадскіх рухаў. Так, у кнізе У. Вернігорава «Палітычныя партыі і грамадскія рухі ў Расіі і Беларусі: другая палова XIX – першая трэць XX ст.» грамадскі рух вызначаецца як добраахвотнае аб'яднанне грамадзян на аснове агульнасці інтарэсаў для іх свабоднага і свядомага волевыяўлення[24]. Аднак гэта пашыранае вызначэнне грамадскага руху не адбілася на адборы гістарычнага матэрыялу. Грамадскі рух разглядаецца не як асобны феномен, а толькі як ступень да фарміравання палітычных партый і не мае самастойнага значэння.

Нявызначанасць родавага паняцця «грамадскі дух», панаванне рознага кшталту рэдукцыянісцкіх схем, сугуба эмпірычныя падыходы да гісторыі грамадскіх рухаў не маглі не адбіцца і на класіфікацыйных схемах і тыпалогіях грамадскіх рухаў. Пераважная большасць класіфікацыйных схем уяўляла сабой памылковыя дыхатаміі. Так, як ужо адзначалася вышэй, В. Зомбарт разумеў сацыяльны рух выключна як сацыялістычны рух пралетарыяту[25]. У папярэднім сацыялізме ён вылучаў такія плыні як хрысціянскі

і філантрапічны сацыялізм (А. Ламенэ, П. Леру, Ч. Кінгслі) і прагрэсіўны ўтапічны сацыялізм (А. Сен-Сімон, А. Фур'е, Р. Оуэн). Апошнія хоць і мелі «пралетарыстычны» пункт гледжання былі ўтапістамі, бо не разумелі рэальных сіл сацыяльнага жыцця – класавай барацьбы пралетарыяту[26]. В. Зомбарт вызначаў тры тыпы сацыяльнага (пралетарскага) руху: англійскі (эканамічная барацьба), французскі (змовы і вулічная барацьба) і нямецкі (парламенцка-палітычны)[27]. Класіфікацыя гэтых рухаў, лічыў ён, можа адбывацца па наступных лініях: эканамічная і палітычная барацьба, рэформы ці рэвалюцыя, сацыялізм – дэмакратыя. Суадносіны сацыялізм – дэмакратыя прымалі, па меркаванню В. Зомбарта, форму пытання, ці павінна рабочая партыя клапаціцца толькі аб мэтах пралетарыяту, ці аб тых масах, якія яшчэ не ператварыліся ў пралетарыяў, у тым ліку і аб дробнай буржуазіі[28].

Дыхатамічны падыход у класіфікацыі грамадскіх рухаў быў характэрны і для большасці дарэвалюцыйных гісторыкаў. Так, А. Скабічэўскі падзяляў грамадскі рух 60-х гг. XIX ст. на два перыяды: да рэформы характар руху быў «выключна палітычны ці сацыяльна-палітычны», а пасля яе – «індывідуальна-маральны і філасофскі»[29]. Пасля рэформы, якая адбылася дзякуючы дзейнасці актывістаў 1840-х гг., усё грамадства падзялялася на партыі не толькі па палітычных, а, галоўным чынам, па філасофскіх і маральных праблемах. Дзеячаў 60-х гг. Скабічэўскі характарызаваў як рэалістаў-уцілітарыстаў, якія лічылі, што асоба павінна вызваляцца ад прыгнёту «дрэнных грамадскіх умоў» праз маральнае ўдасканаленне[30]. У. Варанцоў лічыў, што ў грамадскім руху XIX ст. у рэшце рэшт выявіліся два напрамкі: «усходніцкі» і народніцкі. Усходніцкі напрамак – гэта напрамак палітычны і буржуазны, народніцкі – сацыяльны, народны, сацыялістычны. У 70-х гг. народніцкі напрамак стаў ператварацца з сацыяльна-асветніцкага ў палітычны[31]. У. Чашыхін-Вятрынскі лічыў, што грамадскі рух 30–40-х гг. вызначаўся тэорыяй «афіцыйнай народнасці», а ў 60-х гг. – апазіцыяй застарэлым бюракратычным метадам правядзення рэформы. Грамадскі рух на розных этапах адрозніваўся розным суаднясеннем палітычных і сацыяльных задач. Галоўнымі і найбольш глыбокімі плынямі грамадскай думкі ў XIX ст. ён лічыў усходніцтва і славянафільства. Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух Чэшыхін-Вятрынскі лічыў радыкальным адгалінаваннем усходніцтва з сацыялістычнай афарбоўкай[32]. Б. Глінскі ў кнізе «Революционный период русской истории (1861–1881 гг.)»[33] выдзяліў у грамадскім руху наступныя групоўкі: «палітычныя лібералы»

і «сацыялістычная школа» М. Чарнышэўскага. Найбольш буйным прадстаўніком агульналіберальнай платформы Б. Глінскі лічыў А. Герцэна. Пасля правядзення рэформы ў расійскім апазіцыйным руху высветліліся два новых напрамкі: рэфарматарскі і рэвалюцыйны.

А. Кізеветэр пісаў, што барацьба ўсходніцтва са славянафільствам, якая адбывалася ў 40-х гг., змянілася ў ходзе рэформы дыферэнцыяцыяй грамадскіх сіл і барацьбой легальнага канстытуцыяналізму, дэмакратычнага радыкалізму і сацыялістычнага народніцтва («Русский вестник», «Русское слово», «Современник»)[34]. Але ж у грамадскім руху пасля «вялікіх рэформ» ён зноў-такі бачыў дыхатамію: рэвалюцыйная і ліберальная плыні. Пачатак традыцыі вызваленчага руху А. Кізеветэр вёў ад праектаў М. Навасільцава і М. Сперанскага. А сутнасць ліберальнага руху бачыў у прыцягненні шырокага грамадства да барацьбы за свае правы ў існуючых легальных установах[35].

У. Багучарскі класіфікаваў вызваленчы рух у залежнасці ад адносін да палітычнай барацьбы і вылучаў у вызваленчым руху 70–80-х гг. лібералаў і разначынцаў. Прыхільнікі лібералаў высоўвалі сацыяльна-палітычныя задачы і тым самым вызначылі наперад канстытуцыйныя праекты дзяржаўных пераўтварэнняў. «Сацыяльныя рэвалюцыянеры» з'яўляліся нашчадкамі разначынцаў 60-х гг., але адрозніваліся «утапізмам ідэй»[36]. Такая тыпалогія выклікала рэзкую крытыку рускіх марксістаў, якія не згаджаліся з тым, што сацыял-дэмакраты (бальшавікі), бернштэйнеанцы, «апартуністы» разглядаліся ў рамках адной плыні – сацыял-дэмакратычнай[37].

М. Катлярэўскі і М. Южакоў прапанавалі больш складаныя класіфікацыі. У працы гісторыка М. Катлярэўскага вызначаны наступныя грамадска-палітычныя напрамкі: афіцыйна-ўрадавы, славянафільскі, канстытуцыйны, палітычны (які ідзе ад дзекабрыстаў), ліберальны (Герцэн) і радыкальны. Носьбітам радыкальных поглядаў Катлярэўскі лічыў пазакласавую, пазасаслоўную інтэлігенцыю. Радыкалізм, па яго меркаванню, гэта перш за ўсё ідэйны рух, асноўнымі задачамі якога былі самаадукацыя і разняволенне асобы. Радыкалы не мелі пэўнай палітычнай тэорыі, але ў палітыцы часта выступалі як ворагі самадзяржаўя[38]. М. Южакоў лічыў, што грамадскія дыскусіі 40-х гг. (западнікі і славянафілы) мелі выключна асветніцкую ролю. У 60-х гадах намеціліся тры напрамкі: эканамічны (М. Чарнышэўскі, А. Дабралюбаў), рэалістычны (А. Пісараў) і этыка-сацыялагічны (народнікі)[39].

Працы В. Пляханава паклалі пачатак «прыватызацыі» гісторыі грамадскага руху марксістамі. Каб паказаць пераемнасць рэвалюцыйных традыцый, В. Пляханаў пачаў папулярызаваць погляды М. Чарнышэўскага як сацыяліста-радыкала і сацыяліста-ўтапіста (у адрозненне ад навуковых сацыялістаў – рускіх сацыял-дэмакратаў)[40]. Пры гэтым ацэнка дзейнасці Чарнышэўскага давалася ў залежнасці ад адносін да тэорыі К. Маркса і Ф. Энгельса[41]. Такім чынам, працы В. Пляханава прыўнеслі новы падзел у класіфікацыю грамадскіх рухаў Расійскай імперыі – утапічны сацыялізм і навуковы сацыялізм (марксізм).

У канцы XIX – пачатку XX ст. выйшлі працы У. Леніна «Што такое сябры народа і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў» (1894), «Ад якой спадчыны мы адмаўляемся?» (1897), «Папятны напрамак у рускай сацыял-дэмакратыі» (1899), «Пачатак дэманстрацый» (1901), «Што рабіць» (1902), якія на доўгі час вызначылі метадалагічныя падыходы да аналізу грамадскіх рухаў у Расійскай імперыі, у тым ліку ў Беларусі. Адзнака грамадскіх рухаў і плыней давалася тут у адпаведнасці з тым, наколькі яны адлюстроўвалі інтарэсы класаў як носьбітаў аб'ектыўнага гістарычнага працэсу. Уяўная аб'ектыўнасць такога падыходу знікае, калі прыгадаць, што апошні трактаваўся выключна ў рамках артадаксальнага марксізму. Менавіта ў гэты час адбываецца пераўтварэнне тэрміна «народніцтва» з гісторыка-эмпірычнай абстракцыі ў аналітычную катэгорыю. У. Ленін разглядае народніцтва не як гістарычны феномен, а як грамадскі рух, які прадстаўляе інтарэсы дробнага вытворніка[42] і ідэалогія якога паступова пераўтварылася з ідэалогіі сялянства ў ідэалогію дробнай буржуазіі[43].

У працах У. Леніна, напісаных у 1911–1912 гг., як і ў кнігах большасці дарэвалюцыйных гісторыкаў, вызначаны дзве тэндэнцыі – рэвалюцыйная і ліберальная[44]. Разам з тым сярод лібералаў У. Ленін называе і «ліберальных народнікаў», погляды якіх характарызуюцца ўтапізмам і рэакцыйнасцю ідэй аб сацыялізме і ўказвае на неабходнасць «разрыва з мяшчанскімі сацыялістычнымі ідэямі, з ідэямі старога рускага сялянскага сацыялізму наогул»[45]. Аднак у пазнейшых працах У. Ленін супрацьпастаўляе ўжо іншыя тэндэнцыі – «дэмакратычная і сацыялістычная аддзяліліся ад ліберальнай і размежаваліся адна з адной»[46] – якія прадстаўлялі сабой формы пралетарскага і буржуазнага дэмакратызму і выражалі інтарэсы адпаведна пралетарыяту і сялянства.

Такім чынам склалася артадаксальная ленінская трактоўка грамадскага руху, з якога былі выключаны амаль усе легальныя формы грамадскай дзейнасці. З эпохі 60-х гг. XIX ст. зарадзілася

буржуазная дэмакратыя ў дзвюх яе гістарычных формах: сялянскай (як выражэнне інтарэсаў народных мас) і ліберальнай (як выражэнне інтарэсаў буржуазіі). Сялянская буржуазная дэмакратыя, якая знайшла ў расійскіх умовах поўнае ўвасабленне ў народніцтве прайшла пэўную эвалюцыю ў рамках дапралетарскага перыяду (пачатак народніцтва – 60-я гг., рэвалюцыйнае народніцтва – 70–80-я гг., ліберальнае народніцтва – 90-я гг.). Гэта было абумоўлена сацыяльна-эканамічным развіццём, зменай сацыяльна-класавых сіл і задачамі аб'ектыўнага гістарычнага развіцця. Разам з сялянскай буржуазнай дэмакратыяй, з пачаткамі народніцтва (якія не з'яўляліся ў шасцідзясятнікаў вызначальнымі) існаваў і буржуазны дэмакратызм лібералаў, які па сваёй сутнасці пярэчыў народніцтву. Ленін абараняў манчэсцерства як прагрэсіўны антыфеадальны рух буржуазнага лібералізму, вольнага ад народніцкіх поглядаў, пераемнікам якога з'яўляўся лібералізм XX ст.[47].

Пры гэтым захоўваліся традыцыі памылковых дыхатамій, а класавая сутнасць любой партыі і руху вызначалася не толькі і не столькі іх праграмамі, сколькі тым, інтарэсы якога класа яна «аб'ектыўна» выражала. Паколькі лічылася, што крыніцу класавай барацьбы складала супрацьлегласць класавых інтарэсаў, якая даходзіла да антаганізмаў, то перш за ўсё патрэбна было выкрыць гэтыя інтарэсы і зразумець іх характар. Аналіз на аснове «класавых інтарэсаў» пераўтварыўся у «герменэўтыку падазронасці»[48].

Класавы падыход нават прыхільнікам марксізму вельмі рэдка даваў магчымасць адэкватна класіфіцыраваць грамадскія рухі. Так, М. Русанаў крытыкаваў А. Скабічэўскага, калі апошні тлумачыў розніцу поглядаў А. Герцэна і М. Чарнышэўскага розніцай «барскай» натуры аднаго і разначынскай натуры другога[49]. Ён вызначаў супрацоўнікаў «Колокола» і «Современника» як два тыпы грамадскіх «прагрэсісцкіх» партый, якія адрозніваліся з пункту гледжання тактыкі. Чарнышэўскага і Дабралюбава ён лічыў прыхільнікамі радыкальнай палітычнай партыі, Герцэн жа, на яго думку, у рэшце рэшт стаў выразіцелем ліберальных ідэй[50]. Народніцтва Русанаў вызначаў як радыкальна палітычны напрамак, прыхільнікі якога прызнавалі здольнасць народных мас упарадкаваць сваё жыцце самастойна[51]. А. Патрэсаў, П. Маслаў і Ю. Мартаў у сваіх працах адзначалі, што такія падыходы сціралі розніцу паміж пэўнымі плынямі вызваленчага руху[52].

Больш складаную класіфікацыю грамадскіх рухаў прапанаваў Ю. Мартаў у кнізе «Общественные и умственные течения в России. 1870–1905». Ён вызначаў грамадскі рух 70-х гг. як шырокі рух за падтрымку рэформ, у якім існавалі два «крыла»: правае («куль-

турная частка дваранства») і левае (разначынная інтэлігенцыя і дэмакратычнае студэнцтва). Разам з тым выявіліся і такія рухі як эканамічны лібералізм і сялянскі рух. Апошні выражаўся ў імкненні да «чорнага перадзелу» і ў сектанцтве[53]. Асноўнымі ідэйнымі напрамкамі, якія вызначалі «гісторыю грамадскіх і разумовых плыней», Мартаў лічыў індывідуалістычны радыкалізм і сацыял-рэфармізм. Вялікі ўплыў на грамадскі рух Расійскай імперыі, перш за ўсё народніцкі, зрабілі «перадавыя напрамкі грамадскага руху ў Еўропе»: сацыялізм і анархізм. Пазней у грамадскім руху, па Мартаву, вылучыліся лібералізм, нацыяналізм (антысемітызм, палонафобія, рускі нацыяналізм), кансерватызм і марксізм[54].

Калі Мартаў пераходзіць да аналізу перыяда 1884–1905 гг., то адзначае заняпад народніцкага радыкальнага дэмакратызму і выхад на першы план ідэалогіі «малых спраў», удасканалення асобы, апалітызму, таўстоўства і сектанцтва. Разам з тым, ён звяртае ўвагу на дэмакратызацыю ліберальнага руху, які называе «мяшчанскім лібералізмам». «Гараджанін – культурны мяшчанін», па меркаванню Ю. Мартава, быў бяссільны «паставіць на парадак дня якія-небудзь агульныя задачы, вырашэнне якіх змяніла б агульныя ўмовы яго існавання». Такі гараджанін «быў апалітычным, супрацьпастаўляў ідэалізму палітычнай барацьбы цвярозы рэалізм «малых спраў», але у той жа час адчуваў пад нагамі глебу сваёй культуры і буржуазнай гарадской гаспадаркі, на якой складаецца апошняя, і таму «рэабілітаваў» ... тую рэчаіснасць, якая пакідала на бліжэйшы перыяд адносную свабоду займацца малымі справамі»[55]. На гэтай аснове фарміруецца ліберальна-дэмакратычны рух. Разам з тым Ю. Мартаў вылучае сацыял-дэмакратызм, дваранскі кансерватызм, народніцкі радыкалізм (сацыяльна-рэвалюцыйны рух)[56].

Калі прааналізаваць прапанаваныя Ю. Мартавым «дзяленні», становіцца відавочным, што ў аснове яго тыпалогіі палягаюць дзве прыкметы: ідэалогія і сацыяльны склад удзельнікаў. Вось як яе можна прадставіць у табліцы.

	Шырокія слаі народа (дэмакратыя)	Дваране	Пралетарыі
Кансерватызм		Дваранскі кансерватызм	
Лібералізм	Ліберальны дэмакратызм		
Сацыялізм			Сацыял-дэмакратыя

Прыведзеная табліца робіць відавочнымі пэўныя недакладнасці такой тыпалогіі. Па-першае, тут няма месца для сацыяльнарэвалюцыйнага руху. Па-другое, яна не мае завершанага характара. Дастаткова ў гэтым дачыненні згадаць кансерватыўныя настроі сялянства.

Аднак, нягледзячы на пэўныя супярэчнасці ў трактоўцы гістарычных з'яў, у канцэптуалізацыі грамадскіх рухаў у 1930-х гг. марксізм пераўтварыўся ў прымусова-абавязковую схему і канон. У такіх умовах у гісторыкаў заставаліся па сутнасці дзве галоўныя магчымасці: прымяняць свае веды для ўдакладнення заданых прынцыпаў у выбранай сферы ці «пакідаць марксізм для агульных уводзін і рытуальных фраз, каб далей займацца сваёй справай у духу старога добрага пазітывізму, звяртаючыся для страхоўкі да патрэбных агаворак і тэрміналогіі»[57]. У працах па гісторыі грамадскіх рухаў замацаваліся два падыходы да разумення паняцця грамадскага руху: артадаксальны марксісцкі класавы аналіз і апісанне рухаў на падставае гісторыка-эмпірычных абстракцый.

У зборніках і манаграфіях аб грамадскім руху ў Расійскай імперыі і ў Беларусі змяшчаліся артыкулы па такіх тэмах, як дзейнасць дзекабрыстаў, погляды Чаадаева і Герцэна, фарміраванне грамадска-палітычных поглядаў і публіцыстыкі вядомых асоб, гісторыя цэнтральных і мясцовых арганізацый «Народнай волі», РСДРП і г. д. Пры гэтым рэдка выяўлялася сапраўднае адзінства мэт сярод розных гурткоў і індывідаў, а гісторыя набывала характар эпізадычных апавяданняў. Даследчыкі часта канцэнтравалі ўвагу на дзейнасці і працах асобных дзеячаў, напрыклад, ліберальнага руху, а не ўсяго пакалення[58]. А для таго, каб паказаць пераемнасць сацыял-дэмакратаў і папярэдняга вызваленчага руху, погляды актывістаў апошняга мадэрнізаваліся. Так, І. Пакроўскі разглядаў групіроўкі 60–70-х гг. па аналогіі з палітычнымі партыямі XX ст., а М. Чарнышэўскага лічыў папярэднікам меншавікоў[59]. У цэлым недаацэньвалася роля груп абмеркавання – літаратурных гурткоў, салонаў і таварыстваў. Гісторыкі займаліся вузкімі аспектамі грамадскага руху, перш за ўсе яго рэвалюцыйнай плыні. У выніку грамадскі рух паўставаў як спарадычныя дзеянні нелегальных груп, якія часта канфліктавалі адна з адной[60]. Створаная ў 1961 г. у Маскве спецыяльная «група па гісторыі грамадскага руху ў парэформенай Расіі» ў якасці сваіх задач вылучыла асобныя праблемы, а не сінтэтычны аналіз руху ў цэлым. Планавалася вывучаць рэвалюцыйна-дэмакратычны рух, рабочы

рух, інтэрнацыянальныя сувязі рэвалюцыянераў, другую рэвалюцыйную сітуацыю, дэмакратычную журналістыку. На пасяджэннях групы ні разу не абмяркоўваліся пытанні аб сутнасці грамадскіх рухаў, іх адрозненні ад палітычных і варыянты тыпалогіі рухаў[61].

Адзіная спроба ўтварэння больш ці менш дакладнай класіфікацыі грамадскіх рухаў была зроблена ў рамках дыскусіі аб перыядызацыі разначынскага этапа грамадскага руху. Было дадзена вызначэнне «вызваленчага руху» і «рэвалюцыйнай дэмакратыі». Рэвалюцыйная дэмакратыя вызначалася як партыя, рух і ідэалогія, якая адлюстроўвала інтарэсы сялянства на розных этапах вызваленчай барацьбы[62].

Але і ў той час спробы класіфікацыі грамадскіх рухаў у рамках класавага аналізу параджалі шмат супярэчнасцей і дыскусій. Так, Б. Літвак адзначаў недакладнасць тэрміна «сялянскі рух», бо сялянства распадалася на розныя катэгорыі, кожная з якіх мела свае «балявыя кропкі», якія не заўсёды супадалі. Існаванне шматлікіх саслоўных і падатных падзелаў, стракатасць жыццёвых абставін перашкаджалі стварэнню аб'ектыўнай асновы для сумеснай барацьбы гэтых розных катэгорый сялянства. Рух за цвярозасць быў першым і адзіным прыкладам агульнасялянскага руху ў дарэформенай Расіі. Заканамернасцю ж былі асобныя «сепаратныя», хоць часам і буйныя сялянскія хваляванні. Пры гэтым у кожнай з катэгорый сялянскага насельніцтва былі больш мелкія групы: нацыянальныя, тэрытарыяльныя і іншыя[63].

Аднак большасць даследчыкаў лічыла за лепшае засяродзіцца на трактоўцы і тлумачэннях асобных выказванняў У. Леніна. Пры гэтым блытаніну звычайна выклікала прымяненне гісторыкамі высунутых У. Леніным катэгорый «асветнікі» і «рэвалюцыйныя дэмакраты». Лічылася, што рэвалюцыйная дэмакратыя была папярэдніцай сацыял-дэмакратыі, бо выбрала шлях народнай рэвалюцыі як адзіную магчымасць для змены існуючага ладу. Пад асветніцтвам жа У. Ленін разумеў буржуазны дэмакратызм наогул, г. зн. дэмакратызм, па-за рамкамі яго канкрэтных, напрыклад, рэвалюцыйных форм[64]. Такім чынам рэвалюцыянерамі-дэмакратамі лічыліся ідэолагі сялянскай рэвалюцыі. А «асветнікаў» аб'ядноўвала «гарачая варожасць да прыгоннага права», абарона асветы, самакіравання, еўрапейскіх форм жыцця і адстойванне інтарэсаў народных мас»[65].

Відавочна, што гэтыя катэгорыі вылучаліся па розных асновах. Першая – адносна метаду ажыццяўлення дактрыны, а другая – адносна сутнасці дактрыны[66]. Пазіцыя даследчыкаў, якія прапа-

ноўвалі зыходзіць пры класіфікацыі са спецыфічных рыс ідэалогіі рухаў, падвяргаліся крытыцы.

Гэтая тыпалогія захоўвалася ў гістарыяграфіі нават у 90-я гг. XX ст. Так, у кнізе Р. Арсаланава і У. Джангірана, якая выйшла ў свет у 1991 г., зноў рэвалюцыйна-дэмакратычны рух супрацьпастаўляўся ліберальнаму. У прыватнасці адзначалася, што «дзеячы ліберальнага лагера прапаноўвалі паступовыя рэформы, ідэолагі рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера выступілі з праграмамі сацыяльнай рэвалюцыі… і стварэння грамадства сацыяльнай справядлівасці»[67].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што змены агульнай гістарыяграфічнай сітуацыі, засваенне новых тэарэтычных падыходаў да вывучэння грамадскіх рухаў амаль не змянілі сітуацыю ў айчыннай гістарыяграфіі. У пераважнай большасці прац па гісторыі грамадскіх рухаў да гэтага часу параметры класіфікацый не выдзелены з паняційных і катэгарыяльных комплексаў. «Безразмерны» набор расплывістых па сэнсе азначэнняў прыводзіць да рыхласці і неадназначнасці класіфікацый, памылак тыпалогій нават добра вывучаных феноменаў.

Разам з тым, у сітуацыі, калі нельга прытрымлівацца адзінага нарматыўнага вызначэння паняцця «грамадскі рух», выпрацоўка карэктных класіфікацыйных схем у адпаведнасці з пэўнымі тэарэтычнымі падыходамі становіцца прыярытэтным напрамкам метадалагічных распрацовак. Гэта дазволіць «прыстасаваць» зменлівы феномен грамадскага руху для мэт гістарычнага аналізу, г. зн. створыць умовы як для вызначэння гістарычнай пераемнасці розных форм руху, так і для гістарычна-параўнальнага аналізу.

---

[1] Переверзев В. Логистика. М., 1995. С. 27–31.

[2] Копосов Н. Основные исторические понятия и термины базового уровня: к семантике социальных категорий // Журнал социологии и социальной антропологии. 1998. Т. 1. Вып. 4.

[3] Гл. аб гэтым у раздзеле «Гістарыяграфічны і агульнатэарэтычны кантэкст» дадзенага даследавання.

[4] Ленин В. От какого наследства мы отказываемся // Избранные произведения. Москва, 1973. Т. 1. С. 75.

[5] Мицкевич С. Революционная Москва. М., 1940. С. 188–189.

[6] Степанский А. Либеральная интеллигенция в общественном движении // Исторические записки. М., 1983. Т. 109. С. 65.

[7] Зомбарт В. Социализм и социальное движение. СПб., 1909. С. 10–11.

[8] Там жа. С. 13.

[9] Барриве Л. Освободительное движение в царствование Александра II. М., 1909.

[10] Сватиков С. Общественные движения в России (1700–1895). Ростов н/Д, 1905.

[11] Мартов Ю. Общественные и умственные течения в России. Л., 1924.

[12] Пыпин А. Общественное движение в России при Александре I. СПб., 1871.

[13] Дистерло Р. И. Успенский // Неделя. 1887. № 38, 39, 41, 42, 47, 50, 52; 1881. № 15; Яго ж. М. Е. Салтыков // Неделя. 1890. № 1, 2, 4, 7, 8.

[14] Корнилов А. Общественное движение при Александре II (1855–1881): Исторические очерки. М., 1909.

[15] Глинский Б. Революционный период русской истории (1861–1881): Исторические очерки. СПб., 1913; Кизеветтер А. Русское общество и реформы 1861 г. // Великая реформа 19 февраля 1861–1911. М., 1911. Т. 4.

[16] Общественное движение в России. СПб., 1913. Ч. 1, 2.

[17] Маркс К. и Энгельс Ф. Соч.: В 50 т. 2-е изд. М., 1954–1981. Т. 18. С. 499; Ленин В. Полн. собр. соч.: В 55 т. М., 1958–1965. Т. 6. С. 25; Т. 47. С. 89.

[18] Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. Т. 4. С. 433; Т. 16. С. 154; Т. 32. С. 322; Ленин В. Т. 4. С. 184–186, 318.

[19] ВАГ Палітычныя і грамадскія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасці. Вільня, 1931; Агурский С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии. Мн., 1928.

[20] Общественное движение на польских землях: основные идейные течения и политические партии в 1864–1914 годах. М., 1988. С. 187.

[21] Вандалковская М. История изучения русского революционного движения середины XIX в. 1890–1917. М.: Наука, 1982. С. 3.

[22] Там жа.

[23] В. И. Ленин и история классов и политических партий в России. М., 1970. С. 106, 108.

[24] Вернигоров В. Политические партии и общественные движения в России и Беларуси: вторая половина XIX – первая треть XX века. Мн., 2001. С. 3.

[25] Зомбарт В. Социализм и социальное движение. С. 13.

[26] Там жа. С. 26, 29, 34–35.

[27] Там жа. С. 55–69.

[28] Там жа. С. 92, 140.

[29] Скабичевский А. История новейшей русской литературы, 1848–1890. СПб., 1891. С. 86.

[30] Там жа. С. 17.

[31] Воронцов В. Наши направления. СПб., 1893; Яго ж. От семидесятых годов к девятисотым. СПб., 1907.

[32] Чешихин-Ветринский В. А. Герцен. СПб., 1908; Вандалковская М. В. Е. Чешихин-Ветринский – историк русской общественной мысли и освободительного движения // История и историки: историографический ежегодник. 1974. М., 1975.

[33] Глинский Б. Революционный период русской истории (1861–1881): Исторические очерки. СПб., 1913.

[34] Кизеветтер А. Русское общество и реформы 1861 г. // Великая реформа 19 февраля 1861–1911. М., 1911. Т. 4. С. 126.

[35] Кизеветтер А. Политическая деятельность С. А. Муромцева до Государственной думы // Сергей Андреевич Муромцев. СПб., 1911. С. 96–100; Яго ж. Исторические отклики. М., 1916. С. 253–266.

[36] Богучарский В. Активное народничество семидесятых годов. М., 1912. С. 6–62; Яго ж. Из истории политической борьбы в 70-х и 80-х годах XIX в. М., 1912. С. 432–472.

[37] Плеханов Г. Соч. М.; Л., 1927. Т. 24. С. 153; Ленин В. ПСС. Т. 14. С. 225, 229; Т. 26. С. 170, 324.

[38] Котляревский Н. Канун Освобождения, 1855–1866: Из жизни идей и настроений в радикальных кругах того времени. Пг., 1916. С. 40, 62, 72–73, 75–76.

[39] Южаков С. Из современной хроники // Русское богатство. 1895. № 2. С. 165–169.

[40] Плеханов Г. Наши разногласия // Избр. филос. произв. М., 1956. Т. 1. С. 139–155; Плеханов Г. Н. Г. Чернышевский // Избр. филос. произв. М., 1958. Т. 4. С. 47–69.

[41] Ленин В. Попятное движение в русской социал-демократии // ПСС. Т. 4. С. 259.

[42] Ленин В. Экономическое содержание народничества // ПСС. Т. 1. С. 422.

[43] Ковальченко И. В. И. Ленин о формировании классов и идейно-политической борьбе в пореформенной России // Ленин и история классов и политических партий в России. М., 1970. С. 42–113.

[44] Ленин В. Попятное движение в русской социал-демократии // ПСС. М., 1971. Т. 4. С. 259.

[45] Ленин В. Что такое «друзья народа» // ПСС. Т. 1. С. 297, 298.

[46] Ленин В. «Крестьянская реформа» // ПСС. Т. 20. С. 177.

[47] Вандалковская М., Колесниченко Д. Дискуссия о внутренней периодизации разночинского этапа русского революционного движения // История СССР. 1966. № 4. С. 45.

[48] Сродкам пазбегнуць такой падазронасці можа быць канцэпцыя статусных груп у рамках эканамічнага класа. Эканамічныя класы ясна не акрэслены і не адлюстроўваюць высокай ступені агульнасці інтарэсаў. Кожны клас складаецца са шматлікіх статусных груп, таму можна гаварыць аб стратыфікацыі статусных груп унутры класа. Гэтыя групы іерархічна размешчаны ў адпаведнасці з адноснымі рынкавымі перавагамі. Калі Вэбер ліквідаваў з паняцця «клас» сацыяльныя адносіны, якія Маркс уключаў у сваё азначэнне, ён адкрыў дзверы для сацыялогіі, канцэптуальна заснаванай на размежаванні інтарэсаў.

[49] Подарский В. (Н. С. Русанов). Наша текущая жизнь // Русское богатство. 1901. № 12. С. 193–209.

[50] Там жа. С. 205, 209.

[51] Там жа. С. 193–209.

[52] Потресов А. Этюды о русской интеллигенции. СПб., 1906; Стеклов Ю. Историческое подготовление русской социал-демократии: (Страничка из истории русской социалистической мысли). СПб., 1906; Мартов Ю. Записки социал-демократа. М., 1924.

[53] Мартов Ю. Общественные и умственные течения в России. 1870–1906. Л.; М., 1924. С. 5–10.

[54] Там жа. С. 17–41.

[55] Там жа. С. 67–68.

[56] Там жа. С. 72–119.

[57] Там жа. С. 69, 71.

[58] Общественные движения в пореформенной России. М., 1965; Общественное движение в России. М., 1986; Общественно-политические движения в России к. XVIII–XIX в. М., 1975; Бич М. Рабочее движение в Беларуси в 1861–1904. Мн., 1973; Лосинский Н. Революционно-народническое движение в Белоруссии. Мн., 1983; Самбук С. Революционные народники Белоруссии 70-х – нач. 80-х годов XIX в. Мн., 1972 и др.

[59] См.: Нечкина М. Н. Чернышевский в борьбе за сплочение сил русского демократического движения в годы революционной ситуации // Вопросы истории. 1959. № 7. С. 12–26.

[60] Падрабязны аналіз літаратуры па гісторыі грамаскіх рухаў гл.: Mazour A. The Writting of History in the Soviet Union. Calif., 1971.

[61] Общественное движение в пореформенной России. С. 366–369.

[62] Ионова Г. Смирнов А. Революционные демократы и народники // История СССР. 1961. № 5. С. 112, 160.

[63] Литвак Б. О периодизации крестьянского движения в России // Вопросы истории. 1986. № 3. С. 64–65.

[64] Захарина В. Революционные народники 70-х годов – идеологи крестьянской демократии // История СССР. 1963. № 5. С. 71–82.

[65] Ленин В. ПСС. Т. 2. С. 472.

[66] Широкова В. Ещё раз о революционных демократах и народниках // История СССР. 1962. № 3. С. 75–76.

[67] Арсланов Р., Джангирян В. Освободительное движение в России во второй половине XIX века. М., 1991.

5.4. Перыядызацыя гісторыі грамадскіх рухаў

Перыядызацыя як структурызацыя гісторыі ў часе з'яўляецца адным з традыцыйных метадаў гістарычнага даследавання. Цяжка знайсці працу, у якой бы гісторык не вызначаў храналагічныя рамкі і этапы той ці іншай гістарычнай з'явы, не ўводзіў бы яе ў кантэкст пэўных «гістарычных перыядаў». Не з'яўляецца выключэннем і гісторыя грамадскіх рухаў. Аднак, нягледзячы на пастаянную ўвагу гісторыкаў да вызначэння этапаў развіцця таго ці іншага руху, у абагульненым выглядзе праблема перыядызацыі грамадскіх

рухаў не стала яшчэ прадметам даследавання ў айчыннай гістарыяграфіі. Між тым, у сучаснай сітуацыі, калі адбываецца пашырэнне базы крыніц, калі ў навуковы ўжытак уводзяцца новыя факты і распрацоўваюцца іх новыя інтэрпрэтацыі, задача асэнсавання тэарэтычных падстаў перыядызацыі грамадскіх рухаў падаецца вельмі актуальнай. Спроба такога аналізу і прапануецца ў дадзеным раздзеле.

Як вядома, перыядызацыя ажыццяўляецца на двух узроўнях – індывідуальным і інстытуцыянальным. Індывідуальна кожны гісторык выбірае храналагічныя рамкі ў залежнасці ад аб'екта даследавання (народніцтва, ліберальны рух і г. д.), каб адзначыць цэласнасць з'явы і сканцэнтраваць увагу на яе асобных аспектах. Пры гэтым пачатковы і канчатковы рубяжы павінны сумяшчацца з больш значнымі перыядамі, якія вылучаюцца ў так званых інстытуцыянальных перыядызацыях. Апошнія базіруюцца на сістэме тэарэтычных прыярытэтаў і, у сваю чаргу, уплываюць на фарміраванне аб'ектаў гістарычнага даследавання.

Да гэтага часу найбольш пашыранымі ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі можна лічыць падыходы да перыядызацыі грамадскіх рухаў, заснаваныя на тэорыях структуры палітычных магчымасцей і класавага канфлікту. У гістарыяграфіі савецкага часу пануючае становішча атрымала перыядызацыя, заснаваная на ленінскай канцэпцыі гістарычнага працэсу і класавага канфлікту (рэвалюцыйнай барацьбы)[1]. У рамках гэтай канцэпцыі У. Ленін прапанаваў перыядызацыі гісторыі вызваленчага руху ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.[2], гісторыі пашырэння марксізму ў свеце[3] і гісторыі расійскай сацыял-дэмакратыі[4].

У якасці асноўнага крытэрыя для перыядызацыі вызваленчага руху У. Ленін называў класавы склад яго ўдзельнікаў. Аднак на самой справе асноўнымі рубяжамі знакамітай перыядызацыі сталі даты, вырашальныя для розных працэсаў. Так, 1825 г., як паказаў яшчэ ў 1925 г. Я. Тарле, быў вехай на шляху еўрапеізацыі Расіі, а «паўстанне дзекабрыстаў працягвала сабой (і завяршала) серыю ваенных пераваротаў і спроб, што пачалася ў 1820 г. у Іспаніі»[5]. 1861 г., які У. Ленін абраў у якасці пачатку «разначынскага перыяду», таксама мае дачыненне ў большай ступені да працэсу мадэрнізацыі краіны. 1895 г. можа лічыцца якасным рубяжом толькі ў рамках больш вузкага працэсу – развіцця рабочага руху. Нават само вызначэнне класавай асновы такой перыядызацыі ўяўляе сабой блытаніну. «Разначынцы – адукаваныя прадстаўнікі ліберальнай і дэмакратычнай буржуазіі, якія належалі не да дваранства,

а да чыноўніцтва, мяшчанства, купецтва, сялянства», – так характарызаваў У. Ленін асноўных дзеячаў «разначынскага этапа вызваленчай барацьбы», г. зн. перыяду 1861–1895 гг.[6]. Відавочна, што такое вызначэнне паняцця «разначынец» не мае нічога агульнага з гістарычнай рэальнасцю. Як паказала В. Лейкіна-Свіраская, яшчэ ў XVII ст. пад разначынцамі разумелі, галоўным чынам, гарадскіх жыхароў, якія апынуліся па родзе заняткаў і па сацыяльным статусе па-за рамкамі асноўных саслоўных груп, а таксама дактароў, мастакоў, навукоўцаў, выхадцаў з дамоў для незаконнанароджаных дзяцей, іншымі словамі – усіх тых, хто не належаў да дваранства і духавенства, і разам з тым не плаціў падушны падатак. У сярэдзіне XIX ст. разначынцамі пачалі называць дзяцей купцоў, мяшчан, святароў, збяднеўшых дваран і сялян, якія атрымалі вышэйшую адукацыю[7]. Больш таго, гістарычны аналіз феномена разначынства паказвае, што працэс інтэнсіўнай кансалідацыі гэтай сацыяльнай групы пачаўся яшчэ з 40-х гг. XIX ст. і быў, перш за ўсё, вынікам развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі, якое прыняло планамерны характар у першай палове XIX ст.[8]. А вырашальнымі перыядамі ў гэтым працэсе былі: 1855 г., калі было прынята рашэнне аб скасаванні колькасці паступаючых студэнтаў і аб змякчэнні ўмоў для вызвалення ад платы за навучанне, і другая палова 60-х гг. XIX ст., калі паняцце «разначынец» стала выціскацца словам «інтэлігент»[9].

Да гэтага трэба дадаць узаемную несупастаўляльнасць перыядызацый, прапанаваных У. Леніным. Напрыклад, час «распаўсюджання марксізму» ў Расійскай імперыі ён упісваў у чатыры перыядызацыйныя схемы. У адпаведнасці з перыядызацыяй распаўсюджання марксізму ў свеце, час «вантробнага развіцця» марксізму адносіцца да 1872–1904 гг.[10]. У адпаведнасці з перыядызацыяй развіцця вызваленчага руху ў імперыі распаўсюджанне марксізму прыпадае на разначынскі (буржуазна-дэмакратычны) перыяд, гэта значыць на 1861–1895 гг.[11]. У рамках перыядызацыі гісторыі расійскай сацыял-дэмакратыі распаўсюджанне марксізму У. Ленін адносіць да 1884–1894 гг.[12]. І, нарэшце, пры перыядызацыі гісторыі камуністычнай партыі распаўсюджанне марксізму адбываецца ў 70-х гг. XIX ст. – 1903 г.[13].

Усе гэтыя супярэчлівасці спарадзілі ў свой час шэраг дыскусій, але айчынным даследчыкам, як і савецкім гісторыкам наогул, так і не ўдалося прыстасаваць гэтую перыядызацыю да рэалій гістарычнага працэсу[14]. У выніку, часта замест перыядызацыі грамадскага (вызваленчага, рэвалюцыйнага, студэнцкага, народ-

ніцкага і г. д.) руху ў гістарычных працах ужываўся просты храналагічны падзел па дзесяцігоддзях[15]. А адсутнасць агульнай канцэпцыі грамадскіх рухаў, вылучэння асноўных фактараў іх развіцця і крытэрыяў перыядызацыі прыводзіла да таго, што гісторыкі абмяжоўваліся ўнутранымі перыядызацыямі розных плыней грамадскіх рухаў. Прычым нават такія перыядызацыі складаліся на падставе розных крытэрыяў. Так, расійскі гісторык У. Лаверычаў асноўнымі фактарамі развіцця і крытэрыямі перыядызацыі ліберальнага руху ў Расійскай імперыі лічыў разгортванне рабочага руху і класавай барацьбы пралетарыяту[16]. Н. Пірумава ў якасці асноўнага крытэрыя перыядызацыі вылучала адносіны лібералаў з уладамі[17].

Што датычыцца гісторыі народніцкага і сацыял-дэмакратычнага руху, то ў першым выпадку ў якасці асновы перыядызацыі гісторыі даследчыкі выкарыстоўвалі, галоўным чынам, такі крытэрый, як змена метадаў ажыццяўлення дактрыны, а ў другім – арганізацыйнае афармленне руху. У выніку ў гісторыі народніцтва вылучаліся наступныя перыяды: 1) 50–60-я гг. XIX ст. – рэвалюцыйная дэмакратыя[18]; 2) 70–80-я гг. XIX ст. – рэвалюцыйнае народніцтва; 3) 80–90-я гг. XIX ст. – ліберальнае народніцтва і заняпад руху[19]. Менавіта на трэцім этапе развіцця народніцтва на змену яму прыходзіць сацыял-дэмакратычны рух, у якім вылучаюцца перыяды: 1) стварэнне групы «Вызваленне працы» – 1882–1883; 2) дзейнасць групы «Вызваленне працы», актыўны працэс якаснай змены сістэмы поглядаў асобных удзельнікаў народніцкіх гурткоў; 3) 1887–1894 – узнікненне, развіццё і аб'яднанне аўтэнтычных унутрырасійскіх сацыял-дэмакратычных гурткоў у групы і саюзы; 4) крышталізацыя поглядаў, стварэнне РСДРП – 1894–1898, пасля чаго сацыял-дэмакратычны рух палітызуецца[20].

Нявырашальнасць шэрагу даследчыцкіх праблем у рамках ленінскай канцэпцыі вызваленчай барацьбы вымушала савецкіх гісторыкаў шукаць шляхі для пашырэння праблемнага поля навукі, перш за ўсё за кошт увядзення ў шырокі ўжытак такіх канцэптаў, як «грамадскі ўздым» і «рэвалюцыйная сітуацыя». Як вядома, паняцце рэвалюцыйнай сітуацыі сфармуліраваў У. Ленін. У артыкуле «Крах II Інтэрнацыянала» ён вызначыў складаючыя рэвалюцыйнай сітуацыі – крызіс «вярхоў», крызіс «нізоў» і экстраардынарная актыўнасць мас. Была прапанавана і прыкладная храналогія рэвалюцыйных сітуцый у Расійскай імперыі: 1859–1861, 1879–1880, 1905[21].

Упершыню ў якасці даследчыцкай праблемы першая рэвалюцыйная сітуацыя была вызначана ў другім томе падручніка па гіс-

торыі СССР для вышэйшых навучальных устаноў пад рэдакцыяй М. Нечкінай (1940). Другая – у другім выданні таго ж падручніка (1949). У канцы 50-х гг. у Савецкім Саюзе былі створаны праблемныя групы па даследаванні рэвалюцыйных сітуацый пад кіраўніцтвам М. Нечкінай і Б. Ітэнберга, якія падрыхтавалі шэраг выданняў[22]. Аднак імкненне савецкіх гісторыкаў застацца ў рамках ленінскага вузкакласавага падыходу ў аналізе рэвалюцыйных сітуацый прывяло да высноў аб штучнасці «ленінскай схемы рэвалюцыйных сітуацый» і непрымальнасці яе для аналізу грамадскіх і рэвалюцыйных рухаў[23]. Цікава пры гэтым адзначыць, што паняцце рэвалюцыйнай сітуацыі, якое было выпрацавана ў выніку інтэнсіўных дыскусій, вельмі арганічна ўпісваецца ў тэорыі сацыяльнага напружання, і распрацоўка гэтага канцэпта можа прывесці (і мы спадзяемся яшчэ прывядзе) да новых карысных, канстэктуальна і тэарэтычна абаснаваных перыядызацый грамадскага руху[24].

Падыход да перыядызацыі грамадскіх рухаў, заснаваны на тэорыі структуры палітычных магчымасцей, склаўся, як і ленінскія перыядызацыі, яшчэ ў канцы XIX ст. і застаецца найбольш папулярным у сучаснай заходняй гістарыяграфіі грамадскіх рухаў Расійскай імперыі XIX ст. Вызначальнымі для такой перыядызацыі лічацца: рубеж 20/30-х гг. – рэакцыйныя абмежаванні у сувязі з еўрапейскімі рэвалюцыямі і паўстаннем дзекабрыстаў; 1848 г. – рэпрэсіўныя меры ў сувязі з еўрапейскай «вясной народаў»; 1855 г. – пачатак падрыхтоўкі рэформ, адмена абмежаванняў; 1866 г. – замах В. Каракозава; 1881 г. – замах «першамартаўцаў»; 1905 г. – маніфест 17 кастрычніка[25]. У рамках тэорыі палітычных магчымасцей абгрунтаваная перыядызацыя грамадскага руху на аснове такога крытэрыя, як змена прававых умоў была прапанавана У. Леантовічам: 1) 1792–1855 гг.: канстытуцыйныя тэндэнцыі, звод законаў, умацаванне прынцыпу прыватнай уласнасці; 2) 1856–1914 гг.: развіццё грамадзянскіх і палітычных свабод[26]. Такія перыядызацыі даюць магчымасць больш шырокага падыхода да гісторыі грамадскіх рухаў. Удакладненнем гэтага падыходу можа лічыцца канцэпцыя «канстытуцыйных цыклаў», заснаваная на канфлікце права як нарматыўнай сістэмы і яго сацыяльнай эфектыўнасці[27].

У сярэдзіне 80-х гг. пад уздзеяннем працэсаў «перабудовы» ў сацыяльна-палітычным жыцці пачаўся перагляд магчымасцей марксісцка-ленінскай метадалогіі гістарычнага пазнання. Гэта выявілася, у прыватнасці, у актыўным засваенні вопыту замежнай і дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі грамадскіх рухаў.

Як адзначалася ў папярэдніх параграфах, нягледзячы на парадыгматычныя змены ў гістарыяграфіі, у адносінах да гісторыі грамадскіх рухаў айчынныя даследчыкі рэдка праводзілі перагляд паняційнага апарату і аналіз тэарэтычных падыходаў. Расійскія гісторыкі ў гэтых адносінах праяўлялі і праяўляюць большую актыўнасць. Хаця праблема неабходнасці новага вызначэння этапаў развіцця грамадскіх рухаў імі таксама не ставілася, вострай крытыцы падвяргалася ленінская перыядызацыя распаўсюджання марксізму. Даследчыкі адзначалі, што такая перыядызацыя тычылася распаўсюджання марксізму, галоўным чынам, у нелегальных гуртках.

Калі ж мець на ўвазе рост папулярнасці марксісцкіх ідэй у больш шырокіх колах, то, як сцвярджае І. Сіземская, больш слушнай уяўляецца іншая перыядызацыя. Яна адзначае, што папулярнасць марксісцкіх ідэй як састаўляючая еўрапеізацыі інтэлігенцыі (а ў больш шырокім кантэксце – мадэрнізацыі Расійскай імперыі) пачалася з 60-х гг. XIX ст. Ужо ў 1861 г. у часопісе «Современник» быў надрукаваны артыкул У. Шалгунова, дзе выкладаўся змест працы Ф. Энгельса «Становішча рабочага класа ў Англіі»; у 1865 г. (у пераказе П. Ткачова) – уводзіны «Да крытыкі палітычнай эканоміі Маркса». У 1869 г. быў выдадзены рускі пераклад «Маніфеста Камуністычнай партыі» і г. д. Прафесары-эканамісты расійскіх універсітэтаў ужо з пачатку 70-х гг. знаёмілі студэнтаў з найноўшымі эканамічнымі тэорыямі. Так, дзякуючы актыўнай прапагандзе марксісцкіх эканамічных ідэй прафесарам кіеўскага універсітэта М. Зіберам стаў вядомы «Анты-Дзюрынг». У 1871 г. М. Зібер надрукаваў працу «Тэорыя каштоўнасці і капіталу Д. Рыкарда» і шэраг артыкулаў у часопісе «Знание» пад агульнай назвай «Эканамічная тэорыя К. Маркса». У 1885 г. гэтыя артыкулы былі перавыдадзеныя пад агульнай назвай «Давід Рыкарда і Карл Маркс у іх грамадска-эканамічных даследаваннях»[28].

Новы перыяд, адметнай рысай якога з'яўляецца выхад дыскусій аб марксізме па-за межы акадэмічных гурткоў, пачынаецца, па меркаванню І. Сіземскай, з 90-х гг. XIX ст. А. Кізеветэр успамінаў: «З часоў знакамітых спрэчак паміж захаднікамі і славянафіламі рускае грамадства не перажывала такога вострага параксізму ідэалагічнай барацьбы. Але, калі палеміка паміж захаднікамі і славянафіламі вялася ў свой час у чатырох сценах некаторых салонаў, сярод выбраных гурткоў перадавах мысліцелей, то спрэчкі паміж марксістамі і народнікамі ў 90-я гг. захапілі самыя шырокія колы...»[29]. Менавіта ў гэты час выйшлі ў свет знакамітыя

кнігі П. Струве і М. Туган-Бараноўскага, пераклад кнігі Ф. Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы».

Трэці перыяд «еўрапеізацыі інтэлігенцыі», па меркаванню І. Сіземскай, пачаўся прыблізна з 1900 г., калі ад марксізму адышлі такія тэарэтыкі, як Б. Струве, М. Бярдзяеў, С. Булгакаў[30].

Значнасць уплыву нелегальнай дзейнасці будучых бальшавікоў на грамадскі рух паставіла пад сумненне і А. Грыгор'ева, якая даказала некарэктнасць тэзіса аб тым, што група «Вызваленне працы» забяспечыла «прарыў» марксізму ў Расійскую імперыю[31]. Гэта тым больш слушна для гісторыі Беларусі, дзе, нават у нелегальных колах, марксісцкія ідэі пачалі пашырацца дзякуючы польскім сацыялістам[32].

Асноўным крытэрыем перыядызацыі ліберальнага руху для большасці сучасных айчынных і замежных даследчыкаў з'яўляюцца ўзаемаадносіны з уладамі[33]. Гэты крытэрый – палітычныя магчымасці ў залежнасці ад рэфарматарскіх намераў улады – пакладзены ў аснову перыядызацыі ліберальнага руху, прапанаванай расійскім гісторыкам А. Гогалеўскім, які вылучыў наступныя перыяды: 1) першая палова XIX ст. – незадаволенасць ліберальнага грамадства рэфармісцкай дзейнасцю ўлад; пераход апазіцыі да актыўных дзеянняў (маецца на ўвазе паўстанне 1825 г.); 2) 1860–1880-я г. XIX ст. – лібералізм перыяду пераўтварэнняў; 3) канец XIX – пачатак XX ст. – дэмакратычны лібералізм; 4) лібералізм пасля 1905 г.[34].

У 1986 г. Б. Літвак прапанаваў перыядызацыю сялянскіх рухаў, заснаваную на ўнутраных заканамернасцях развіцця. У аснову ён паклаў такі якасны крытэрый, як развіццё сялянскай свядомасці. Пры гэтым атрымлівалася, што аб сялянскім руху як цэласнай з'яве можна гаварыць толькі пасля адмены прыгону. Межамі сваёй перыядызаці Б. Літвак абірае 1772 і 1904 гг. (ад паўстання Я. Пугачова да рэвалюці 1905 г.). У дарэформены час, як вядома, сялянства распадалася на шэраг катэгорый. Стракатасць жыццёвых абставін, мноства ступеней несвабоды, разнастайнасць мясцовых акалічнасцей былі прычынамі таго, што асобныя сялянскія хваляванні не зліваліся ў грамадскі рух. Першым сялянскім рухам, які аб'яднаў розныя катэгорыі сялян і адзначыў канец папярэднягя этапа стаў рух цвярозасці (1857 г.)[35]. У якасці наступнага значнага рубяжа Б. Літвак вызначыў адмену прыгону ў 1861 г. Менавіта пасля гэтага «сялянства павінна было пераадолець ілюзію аб волі, як аб вырашальнай умове свабоднага гаспадарання», а ўсеагульнасць лозунга «чорнага перадзелу» стала асновай згуртавання

ўсяго сялянства[36]. У час другой рэвалюцыйнай сітуацыі (1881 г.) вылучыўся новы зрух у сялянскай свядомасці – сяляне звярнуліся да асэнсавання «непарадку ў дзяржаве»[37].

Заснаваная на крытэрыі «свядомасці» перыядызацыя выглядае наступным чынам: 1) 1772 г. – сярэдзіна XIX ст., ізаляваныя сялянскія выступленні; 2) 1861–1881 гг., згуртаванне сялянства на падставе змен у юрыдычным становішчы; 3) 1881–1902 гг., кансалідацыя сялянства пад уплывам пашырэння каналаў камунікацыі і разгортвання рэвалюцыйнага руху, што «парушыла звычайную палітычную апатыю сялянства, падштурхнула яго на асэнсаванне з'яў і фактаў»[38].

Пры ўсім сваім наватарстве перыядызацыя Б. Літвака засяроджваецца на ўнутранай характарыстыцы руху. А ў тым выпадку, калі трэба суаднесці такую перыядызацыю з больш агульнымі працэсамі, прапануецца храналагічнае ўпарадкаванне па дзесяцігоддзях, што пазбаўляе неабходнасці пераглядаць метадалагічныя асновы даследаванняў. Менавіта такі падыход з'яўляецца найбольш характэрным для сучасных айчынных перыядызацый грамадскіх рухаў. Працягваецца і тыражыраванне стэрэатыпаў ленінскай перыядызацыі «вызваленчага руху». Тыповай, на наш погляд, падаецца пазіцыя расійскага гісторыка У. Ісакава. Ён характарызуе эпоху 1860–1880-х гг. як «перыяд, які ў савецкай гістарыяграфіі вызначаўся дапралетарскім»[39].

Адзін з варыянтаў вырашэння такой сітуацыі – спалучэнне ўнутранай перыядызацыі пэўнага руху на аснове «жыццёвага цыкла грамадскага руху» з перыядызацыямі, створанымі ў рамках пэўных тэорый (напрыклад, канцэпцый «публічнай сферы» ці тэорый мадэрнізацыі).

У якасці зыходнага пастулата для ўнутранай перыядызацыі любога грамадскага руху можа стаць наступнае сцвярджэнне: нягледзячы на тое, што ў гісторыі няма сацыяльных рухаў, якія супадалі б па ўсіх характарыстыках, яны праходзяць такія стадыі, як сацыяльны неспакой, узбуджэнне, фармалізацыя і інстытуцыяналізацыя. Калі ўзнікае пачуццё сацыяльнай несправядлівасці, калі людзі трапляюць у сітуацыі, якія яны не могуць растлумачыць у тэрмінах традыцыі, яны пачынаюць адчуваць сацыяльны неспакой. Калі такі неспакой факусіруецца на пэўных умовах, а прычыны няшчасцяў індэнтыфіцыруюцца з рэальнымі сацыяльнымі аб'ектамі, узнікае імкненне да актыўных дзеянняў, наступае стадыя ўзбуджэння. Прыхільнікі рухаў збіраюцца для абмеркавання існуючага палажэння і планаў дзеянняў, з'яўляюцца агітатары рухаў.

Далейшае развіццё руху ў вялікай ступені залежыць ад папулярнасці лідэраў, поспеху дзейнасці агітатараў і эфектыўнасці дзеянняў сацыяльных інстытутаў. Менавіта на гэтай стадыі фарміруецца ядро, група лідэраў. Шмат грамадскіх рухаў праходзіць свой жыццёвы цыкл, не афармляючыся ў арганізацыі. Але тыя з сацыяльных рухаў, якія рэальна імкнуцца дабіцца значных змен, павінны быць арганізаваны. На стадыі фармалізацыі ствараецца ідэалогія, якая становіцца своеасаблівым мастом паміж незадаволенасцю і дзеяннем. Яна надае абагульненае значэнне канкрэтнай сацыяльнай праблеме, ідэнтыфіцыруе тых, хто адказны за ўзнікненне гэтай праблемы. Ідэалогія будуецца такім чынам, каб напамінаць людзям аб іх незадаволенасці, вызначаць прычыны гэтай незадаволенасці, усталёўваць стратэгію і тактыку руху дзеля аптымальнага дасягнення мэт і маральнага апраўдання дзеянняў. Стадыя фармалізацыі часта займае вельмі кароткі перыяд часу і даволі хутка змяняецца інстытуцыяналізацыяй. Стадыя інстытуцыяналізацыі назіраецца практычна ва ўсіх рухах, якія існуюць даволі доўга. Пры гэтым рух крышталізуецца ў пэўных культурных узорах, уключаючы традыцыі падтрымкі і абароны інтарэсаў яго членаў. На гэтай стадыі эфектыўныя бюракраты замяняюць агітатараў і лідэраў. Члены руху адчуваюць, што падтрымліваюць арганізацыю з устойлівай ідэалогіяй, у якой займаюць пэўныя пазіцыі і выконваюць адпаведныя сацыяльныя ролі. У прынцыпе, стадыя інстытуцыяналізацыі можа працягвацца вельмі доўга. Большасць сацыёлагаў лічыць, што сацыяльны рух нават заканчваецца стадыяй інстытуцыяналізацыі. Але на самой справе для многіх рухаў гэта яшчэ не канчатковы варыянт. Разам з тым трэба памятаць, што сацыяльны рух можа скончыцца на любой стадыі свайго развіцця. Пад уплывам знешніх сіл ці пасля дасягнення сваіх мэт многія сацыяльныя рухі распадаюцца альбо ператвараюцца ў дзяржаўныя інстытуты і арганізацыі. У выніку распаду грамадскі рух можа падзяліцца на шэраг аўтаномных рухаў, якія канфліктуюць і канкуруюць паміж сабой, што значна аслабляе іх уздзеянне на сацыяльныя інстытуты. Тыя ж рухі, якія ператвараюцца ў сацыяльныя інстытуты, наадварот, замацоўваюць свой уплыў у грамадстве, становяцца яго неад'емнай часткай. На жаль, існуючыя ўнутраныя перыядызацыі рухаў часцей за ўсё уключаюць толькі перыяды фарміравання, пашырэння і заняпаду руху. Такі падыход бярэ пад улік толькі колькасныя, экстэнсіўныя параметры развіцця руху. Сутнасныя ж характарыстыкі руху разглядаюцца асобна, як «эвалюцыя ідэалогіі». Такім чынам адзіны феномен распадаецца

на слаба звязаныя элементы, якія нават вывучаюцца гісторыкамі рознай спецыялізацыі.

Вядома, што ўнутраныя перыядызацыі грамадскіх рухаў павінны нейкім чынам суадносіцца паміж сабой у пэўных часавых прасторах. Гэта можа быць дасягнута, як ужо адзначалася вышэй, у рамках абагульняючых канцэпцый. У якасці прыклада можна прапанаваць канцэпцыі «публічнай сферы» ці «грамадзянскай супольнасці»[40]. Так, з пункту гледжання фарміравання грамадзянскай супольнасці ў развіцці грамадскага руху ў Беларусі можна вылучыць наступныя перыяды.

Канец XVIII – першая трэць XIX ст., калі працэс самаарганізацыі грамадзянскіх сіл ішоў пераважна ў асяроддзі дваранства. Грамадская самадзейнасць развівалася там, дзе яна заахвочвалася дзяржавай – у сферы дабрачыннасці і навуковай дзейнасці. Дзейнасць розных дабрачынных, навуковых і літаратурных таварыстваў паклала пачатак практыцы публічнасці, якая дала прыклады першых выхадаў па-за рамкі саслоўнай і рэлігійнай замкнутасці. У канцы 20-х гг. XIX ст. большасць таварыстваў спыніла сваю дзейнасць у выніку паліцэйскіх праследаванняў, а тыя, што засталіся, апынуліся ў прамым падпарадкаванні ў царскай адміністрацыі. У гэтых умовах месца публічных таварыстваў займаюць канспіратыўныя гурткі, рацыяналістычны светапогляд эвалюцыяніруе ў бок патрыятычнага ліберальнага і фарміруюцца элементы кансерватыўнага грамадскага меркавання як рамантычнай рэакцыі супраць рацыяналізму эпохі Асветы.

Другая трэць XIX ст. Палітыка рэпрэсій і абмежавальных законаў, якая стала вынікам паўстання 1830–1831 гг., вельмі насцярожаныя адносіны ўлад да любых грамадскіх аб'яднанняў наогул прывялі да ўмацавання апазіцыйных настрояў і стварэння новых нелегальных гурткоў. Нягледзячы на гэта, для другой трэці XIX ст. характэрна далейшае развіццё сферы публічнасці («грамадскага меркавання»). У выніку асэнсавання падзей паўстання 1830–1831 гг. і «вясны народаў» (асабліва падзей у Галіцыі ў 1846 г.) адбываецца размежаванне кансерватыўна і ліберальна настроеных публіцыстаў. У ліберальным асяроддзі афармляюцца радыкальны і памяркоўны напрамкі. Кансерватыўнае грамадскае меркаванне падзяляецца на «эвалюцыяністаў» і «непрымірымых» традыцыяналістаў. З сярэдзіны 1850-х гг., у сувязі з пачаткам правядзення палітыкі рэформ у Расійскай імперыі, легальная грамадская дзейнасць актывізуецца, фарміруюцца цэнтры аб'яднання прыхільнікаў розных напрамкаў грамадскага меркавання (арганізацыя грамадзян, камітэт руху), пачынаецца працэс кансалідацыі грамадскіх рухаў.

Апошняя трэць XIX – пач. XX ст. Фарміруецца сетка легальных грамадскіх аб'яднанняў, пашыраецца іх сацыяльная база. Размах грамадскага руху выклікаў занепакоенасць дзяржаўна-паліцэйскіх структур, якія імкнуліся абмежаваць самастойнасць грамадскіх дзеячаў. Найбольш рашучыя вымушаны былі пайсці ў падполле, каб працягваць сваю дзейнасць, накіраваную на ажыццяўленне палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў; радыкальныя настроі эвалюцыяніруюць у бок сацыялізму. Развіццё сацыялістычнага руху прывяло да ўзнікнення абсалютна новага тыпу арганізацый – палітычных партый з жорсткай цэнтралізацыяй і шэрагам дапаможных структур. Адбываецца кансалідацыя і арганізацыйнае афармленне ліберальнага руху. Побач з развіццём іншых грамадскіх рухаў і фарміраваннем сеткі грамадскіх аб'яднанняў, пашыраецца кансерватыўны рух як форма сацыяльнай актыўнасці індывідаў.

Другім падыходам, у рамках якога магчыма несупярэчліва ажыццявіць сінтэз унутраных перыядызацый рухаў, можна лічыць, напрыклад, тэорыю мадэрнізацыі[41]. Так, у адпаведнасці з прапанаванай А. Латышонкам канцэпцыяй, перыядызацыя грамадскага руху ствараецца на аснове такога крытэрыя, як паступовае ўцягванне розных пластоў насельніцтва ў працэсы мадэрнізацыі, і ўключае наступныя этапы: сяр. XVIII – 30-я гг. XIX ст. – мадэрнізацыя феадальных, дзяржаўных, грамадскіх (верхняя праслойка) структур; рубеж 30–40-х гг. – канец 70-х гг. XIX ст. – мадэрнізацыя структур усяго грамадства; пачатак 80-х гг. XIX ст. – рубеж 20–30-х гг. XX ст. – народ як суб'ект дзеяння[42].

Падыходы, заснаваныя на тэорыі мадэрнізацыі[43], дазваляюць уключыць з'явы, якія раней лічыліся характэрнымі толькі для Расійскай імперыі, у кантэкст сусветнай гісторыі. Напрыклад, народніцтва, па меркаванню расійскага даследчыка А. Хораса, упісваецца ў тыпалагічныя шэрагі грамадскіх рухаў у краінах с запозненай мадэрнізацыяй[44]. «Выбухная маргіналізацыя» прыводзіць да пашырэння папулізму, адной з разнавіднасцей якога з'яўляецца народніцтва. Вось чаму, лічыць А. Хорас, народнікаў трэба даследаваць не выключна як папярэднікаў расійскай сацыял-дэмакратыі, а ўключыць у перыядызацыю папулісцкіх рухаў XIX ст. Такі падыход з'яўляецца вельмі слушным і для вывучэння народніцкага руху на тэрыторыі Беларусі, якая, хоць і ўваходзіла ў XIX ст. у склад Расійскай імперыі, знаходзілася пад значным уплывам польскага грамадскага руху.

Згаданыя вышэй навацыі, безумоўна, спрыяюць «нарашчэнню» гістарычных ведаў і вызначэнню новых праблемных палей.

Далейшым крокам наперад магло б стаць, на нашу думку, усведамленне гісторыкамі таго, што перыядызацыя наогул – не проста сродак упарадкавання эмпірычнага матэрыялу, а эўрыстычны метад гістарычнага даследавання, які дапамагае ўсталяваць сувязі паміж фактуальным і канцэптуальным. У адрозненні ад храналогіі, якая звязвае паслядоўнасць падзей і перыядаў у непарыўны паток, перыядызацыя класіфіцыруе дзеянні і падзеі па розных стадыях у адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі. Калі храналогія прапануе простае наратыўнае тлумачэнне праз ідэнтэфікацыю паслядоўнасці падзей, то перыядызацыя выходзіць за рамкі простай паслядоўнасці, каб усталяваць сувязі паміж несінхроннымі працэсамі. Такім чынам, перыядызацыя ажыццяўляецца як бы на некалькіх шкалах часу[45]. Яе сутнасць ёсць не простае ўпарадкаванне падзей у часе, а распрацоўка прынцыпаў узаемнага суаднясення тых ці іншых з'яў.

Любы канкрэтна-гістарычны грамадскі рух, па-першае, існуе ў больш агульных рамках узнікнення і развіцця грамадскага руху як пэўнага «ідэальнага тыпу». Па-другое, перыядызацыя грамадскага руху залежыць ад таго, на якім этапе гістарычнага развіцця грамадства ён разглядаецца (напрыклад, «доўгае XIX ст.»). Нарэшце, з улікам папярэдняга складаецца ўнутраная перыядызацыя грамадскага руху[46]. Такі працэс выпрацоўкі перыядызацыі набліжае нас да вырашэння прынцыповай супярэчнасці паміж неабходнасцю асэнсоўваць пэўныя адрэзкі часу як завершаны працэс і разуменнем непарыўнасці гістарычнага развіцця.

Перыядызацыя з'яўляецца і своеасаблівым метадам верыфікацыі тэорый. Напрыклад, калі эмпірычныя дадзеныя магчыма несупярэчліва ўпарадкаваць ў адпаведнасці з канцэпцыяй грамадзянскай супольнасці ці тэорыяй мадэрнізацыі, гэта даказвае слушнасць выкарыстання такіх тэарэтычных падыходаў для вывучэння гісторыі Беларусі. Цікавай задачай у гэтым дачыненні можа стаць верыфікацыя фармацыйнай і цывілізацыйнай макрагістарычных парадыгм праз спробы стварыць у іх рамках перыядызацыі гісторыі грамадскіх рухаў.

Пакуль жа ў якасці падыхода да вырашэння гэтай задачы можна прапанаваць асноўныя метадалагічныя прынцыпы перыядызацыі ў межах існуючага акадэмічнага дыскурса: субстанцыянальнасць; прасторавая сумяшчальнасць (улік партыкулярызму культурных і геаграфічных рэгіёнаў – агульны кантэкст); парадыгматычная сумяшчальнасць (перыядызацыя павінна быць сумяшчальнай з ключавымі катэгорыямі найбольш прадуктыўных

і абагульняючых макрагістарычных парадыгм)[47]. Менавіта на аснове пералічаных прынцыпаў вызначаецца метаперыядызацыя грамадскіх рухаў. У прыватнасці, большасць сучасных гісторыкаў і сацыёлагаў, якія займаліся гэтай праблемай, адзначаюць што грамадскія рухі пачалі фарміравацца ў XVIII ст. (у больш жа ранейшыя часы і ў нееўрапейскіх грамадствах можна вылучаць толькі функцыянальна аналагічныя формы калектыўных паводзін). Менавіта ў гэты час фарміраваліся асноўныя перадумовы грамадскіх рухаў: публічная сфера (гурткі, газеты) і палітычныя магчымасці (канстытуцыйна-прававыя). Другі якасна новы этап – гэта пачатак XX ст., калі адбываецца фарміраванне «масавага чалавека»[48]. І трэці этап – з 60-х гг. XX ст. да нашага часу – фарміраванне і развіццё новых, так званых «арыентаваных на постматэрыяльныя каштоўнасці» грамадскіх рухаў[49]. Такая метаперыядызацыя задае субстанцыянальныя і прасторавыя рамкі для вызначэння падперыядаў.

Прынцып парадыгматычнай сумяшчальнасці вяртае нас да «вялікіх наратываў» сацыяльна-эканамічных фармацый і цывілізацый. Няцяжка заўважыць, што амаль усе вышэй узгаданыя перыядызацыі пабудаваны ў рамках першага падыходу. Часткова кампрамісны варыянт – гэта перыядызацыя грамадскіх рухаў у адпаведнасці з працэсам фарміравання публічнай сферы з акцэнтам на развіцці культурных практык.

Найменш жа распрацаваным у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі застаецца цывілізацыйны падыход, які мае на ўвазе аналіз супярэчнасцей паміж культурнымі каштоўнасцямі і сацыяльнымі адносінамі, патрабуючы перамяшчэння фокуса даследавання на «неафіцыйныя сферы жыцця» [50]. У якасці адпраўнога пункта таго ці іншага грамадскага руху абіраецца ўзнікненне новых каштоўнасцей, а ў якасці асноўных падзелаў – вылучэнне відавочнага і латэнтнага (штодзённая практыка, жыццёвы вопыт) узроўняў, фарміраванне альтэрнатыўных сродкаў сацыяльнай перцэпцыі, субкультур, новых стыляў жыцця, сацыяльных сетак, рэалізацыя калектыўных дзеянняў і г. д.[51]. Тэматыка «культурнага разрыва» і значэння «новай культурнай парадыгмы», якая склалася ў сярэдзіне XIX ст. у Расійскай імперыі, для развіцця грамадскіх рухаў ужо зацвердзілася ў замежнай гістарычнай практыцы[52]. Засваенне і далейшае развіццё ў гэтым напрамку залежыць ад легітымацыі ў айчыннай гістарыяграфіі новай мадэлі гістарычнага працэсу, калі культура страчвае сваё «надбудоўнае» становішча і набывае значэнне адной з асноўных дэтэрмінант сацыяльнага жыцця.

Прыемна адзначыць, што такія распрацоўкі існуюць як у замежнай[53], так і ў айчыннай гістарыяграфіі[54].

Прапанаваныя вышэй падыходы дазваляюць аддзяліць так званыя «маральны» і «структурны» наратывы пры ажыццяўленні працэдуры перыядызацыі грамадскіх рухаў. Першы панаваў у савецкай гістарычнай навуцы і, з пэўнай зменай акцэнтаў на нацыянальныя рухі і нацыянальную незалежнасць, захоўваецца ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. У спрошчаным выглядзе асноўныя складаючыя маральнага наратыву можна звесці да ўяўлення аб «гістарычнай справядлівасці» і засяроджанасці на апрыёрна прынятым «асобным шляху развіцця» краіны наогул і асобных феноменаў (у тым ліку і грамадскіх рухаў) у прыватнасці. Напрыклад, спробы прымянення структурнага наратыву перыядызацыі ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі часта спалучаюцца з маральным наратывам «нацыянальнага самасцвярджэння беларусаў»[55]. Нам жа здаецца, што шлях да карэктнай перыядызацыі ў выкарыстанні працэдур класічнай гістарычнай кампаратывістыкі, якая вывучае ў роўнай меры падабенства і розніцу і ў звяртанні да «структурнага» наратыву, які засяроджваецца на аналізе і асэнсаванні імпліцытных тэарэтычных асноў перыядызацыйных схем.

Менавіта пераход да структурнага наратыву і распрацоўка метадалагічных аспектаў перыядызацыі гістарычных працэсаў могуць стаць новым стымулам у стварэнні і верыфікацыі эмпірычна і тэарэтычна вывераных інстытуцыянальных перыядызацый гісторый грамадскіх рухаў Беларусі, на базе якіх характар працяглых гістарычных працэсаў робіцца больш заметным, а дзяленне на «перыяды» менш ацэначным.

---

[1] Гл. напр., В. И. Ленин и историческая наука. М., 1968; Городецкий Е. Ленин – основоположник советской исторической науки. М., 1975.

[2] Ленин В. Из прошлого рабочей печати в России // ПСС. Т. 25. С. 93, 947.

[3] Ленин В. Исторические судьбы учения К. Маркса // ПСС. Т. 23. С. 1–13.

[4] Ленин В. Что делать // ПСС. Т. 6. С. 180.

[5] Тарле Е. Военная революция на западе Европы и декабристы // Соч. М., 1958. Т. 5. С. 9.

[6] Ленин В. Из прошлого рабочей печати в России // ПСС. Т. 25. С. 93.

[7] Лейкина-Свирская В. Интеллигенция в России во второй половине XIX века. М., 1971. С. 23–30.

[8] Карпачев М. Разночинная интеллигенция как феномен политической культуры пореформенного времени // Освободительное движение в России.

Саратов, 2001. С. 19; Brower D. Training the Nihilists: Education and Radicalism in Tsarist Russia. N. Y., 1975. P. 44.

[9] Эймонтова Р. Русские университеты на грани двух эпох: от России крепостной к России капиталистической. М., 1985. С. 240.

[10] Ленин В. Исторические судьбы учения К. Маркса // ПСС. Т. 23. С. 1–13.

[11] Ленин В. Из прошлого рабочей печати в России // ПСС. Т. 25. С. 93, 94.

[12] Ленин В. Что делать? // ПСС. Т. 6. С. 180.

[13] Ленин В. Заключительное слово по докладу о продовольственном налоге // ПСС. Т. 43. С. 331.

[14] Гл., напр.: Вандалковская М., Колесниченко Д. Дискуссия о внутренней периодизации разночинского этапа русского революционного движения. С. 111–132; Дискуссия по проблемам народничества // Вопросы истории. 1960. № 2. С. 2–65.

[15] Мохнач Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30–40-е годы XIX в. Мн., 1971.

[16] Лаверычев В. Общая тенденция развития буржуазно-либерального движения в России // История СССР. 1976. № 3. С. 46–66.

[17] Пирумова Н. Земское либеральное движение. Социальные корни и эволюция до начала XX в. М., 1977.

[18] Итенберг Б. Движение революционного народничества. М., 1981; Самбук С. Революционные народники Белоруссии. 70-е гг. XIX в. Мн., 1972 и др.

[19] Б. Казьмін нават лічыў, што народніцтва аформілася ў 40–60-х гадах XIX ст. (гл.: Козьмин Б. Народничество на буржуазно-демократическом этапе освободительного движения в России // Исторические записки. М., 1961. Т. 65. С. 210).

[20] Бич М. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг. Мн., 1973; Меркис В. Развитие промышленности и формирование пролетариата Литвы в XIX в. Вильнюс, 1969; Лященко Л. Революционные народники. М., 1989; Балуев Б. Либеральное народничество на рубеже XIX–XX вв. М., 1995.

[21] Ленин В. Крах II Интернационала // ПСС. Т. 26. С. 218–219, 379.

[22] Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг. М., 1960–1979. (8 сб. ст.); Общественное движение в пореформенной России: Сб. статей. М., 1965; Сладкевич Н. Очерки истории общественной мысли России в конце 50-х – начале 60-х годов XIX в. (Борьба общественных течений в годы первой революционной ситуации). Л., 1962; Хейфец М. Вторая революционная ситуация в России (конец 70-х – начало 80-х гг. XIX в.). Кризис правительственной политики. М., 1963; Зайончковский П. Кризис самодержавия на рубеже 1870–1880-х годов. М., 1964; Революционная ситуация в России в середине XIX в. М., 1978; Россия в революционной ситуации на рубеже 1870–1880-х годов. М., 1983.

[23] Освободительное движение в России: современный взгляд или приверженность традиции?: «Круглый стол» // Отечественная история. 1999. № 13. С. 13.

[24] Гл. аб гэтым падрабязней: Троицкий Н. Революционные ситуации в России как историографический феномен (к постановке вопроса) // Освободительное движение в России. Саратов, 2002. Сб. 20. С. 58–65.

[25] Барриве Л. Общественное движение в царствование Александра II; Глинский Б. Революционный период русской истории (1861–1881); Пайпс Р. Россия при старом режиме. М., 1993; Яго ж. Русский консерватизм во второй половине XIX в. М., 1993; Naimark N. Terrorism and the Fall of Imperial Russia // Terrorism and Political Violence. 1992. Vol. 2. №. 2. P. 68–75.

[26] Леонтович В. История либерализма в России. 1762–1914. М., 1995 (першае выданне – 1957 г.).

[27] Медушевский А. Демократия и авторитаризм. Российский конституционализм в сравнительной перспективе. М., 1998; Яго ж. Конституционные проекты в России XVIII – начала XX вв. М., 2000.

[28] Сиземская И. Модель капитализации России. М., 2001.

[29] Кизеветтер А. На рубеже двух столетий. Прага, 1929. С. 211–212.

[30] Струве П. Критические заметки об экономическом развитии России. СПб., 1894; Туган-Барановский М. Промышленные кризисы в современной Англии. СПб., 1894. У 1894 годзе выйшла і кніга У. Леніна «Что такое друзья народа и как они воюют против социал-демократов», якая засталася малавядомай, бо была выдадзена маленькім тыражом на гектографе.

[31] Григорьева Е. У истоков теории и практики российских марксистов // Вопросы истории. 2004. № 7. С. 77–94.

[32] Baumgarten L. Dzieje Wielkiego Proletariatu. Warszawa, 1966.

[33] Секиринский С. Шелохаев В. Либерализм в России. Очерки истории середины XIX – начала XX века. М., 1995

[34] Гоголевский А. Очерки истории русского либерализма. СПб., 1996.

[35] Литвак Б. О периодизации крестьянского движения в России // Вопросы истории. 1986. № 3. С. 65.

[36] Там жа. С. 70.

[37] Там жа. С. 72.

[38] Там жа. С. 77.

[39] Исаков В. Радикальные социалисты в России (1860 – первая половина 1880-х годов) // Вопросы истории. 2004. № 10. С. 94.

[40] Туманова А. Самодержавие и общественные организации в России. 1905–1917. М., 2002; Соколова М. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – нач. XX в.; Clark P. British Clubs and Societies 1580–1800: The Origins of an Associational World. Oxford, 2000; Jeffrey A. Service Clubs in American Society. Illinois, 1993. Волков В. Общественность: забытая практика // Pro et Contra. 1997. № 4. С. 82–85.

[41] Латышонак А. Да перыядызацыі гісторыі Беларусі ў эпоху мадэрнізацыі // Гіст. альманах. 2001. Т. 4. С. 109–126.

[42] Там жа.

[43] Сціслае і дакладнае выкладанне сутнасці тэорыі мадэрнізацыі гл.: Ван дер Лоо Х., Райс В. Модернизация как концепт // Ab Imperio. 2002. № 1. С. 33–64.

[44] Хорос В. Русская история в сравнительном освещении. М., 1996; Берлин И. Русское Народничество // Берлин И. История свободы. Россия. М., 2001. С. 300–335; Wortman R. The Crisis of Russian Populism. Cambridge, 1967.

[45] Jessop B. The Political Struggle and the Politics of Representation: Periodizing Class Struggle and the State in the Eighteenth Brumaire. Department of Sociology. Lancaster University. Lancaster [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.comp.lancs.ac.uc/sociology/papers/Jessop-Political-Scene.pdf.

[46] Цікава адзначыць, што адным з паспяховых вопытаў такой, на першы погляд, складанай перыядызацыйнай схемы, стала праца К. Маркса «Васемнаццатае брумера Луі Банапарта» (Маркс К. Восемнадцатое брюмера Луи Бонапарта // Маркс К., Энгельс Ф. Избранные произведения. М., 1948. Т. 1. С. 208–302).

[47] From Periodizing to Structurizing World History: Unfolding the Method A. Green, «Periodizing World History» // History and Theory. 1995. № 2. P. 99–111.

[48] Секачева Е. Проблемы массовой культуры и массового человека в конце XIX – начале XX века // Новый исторический вестник. 2002. № 2.

[49] Melucci A. Ten Hypothesis for Analysis of New Social Movements // Contemporary Italian Sociology. Cambridge, 1981. P. 125–183.

[50] Melucci A. Getting Involved: Identity and Mobilization in Social Movements // Intellectual Social Movements Research. 1998. № 2. P. 329–348.

[51] Eyerman R., Jamisson A. Social Movements: A Cognitive Approach. Pennsylvania, 1991; Gusfield J. Social Movements and Social Change // Research in Social Movements, Conflicts and Change. 1982. P. 286–316; Lofland L. A World of Strangers: Order and Action in Urban Public Space. New York, 1973.

[52] Живов В. Маргинальная культура в России и рождение интеллигенции // Новое литературное обозрение. 1999. № 37. С. 28–65; Gleason A. Young Russia. The Genesis of Russian Radicals in the 1860-s. N. Y., 1980; Паперно И. Семиотика поведения: Николай Чернышевский – человек эпохи реализма. М., 1996; Chalasinski J. Młode pokolenie chłopów. Procesy i zagadnienia kształtowania się warstwy chłopskiej w Polsce. Warszawa, 1938. T. I–IV; Barszewska-Krupa A. Generacja powstańcza 1830–1831. O przemianach w świadomości Polaków XIX w. Łódź, 1985.

[53] Ахиезер А. Россия: критика исторического опыта. М., 1991. Т. 1–3; Ён жа. Социально-культурные проблемы развития Росии: Философский аспект. М., 1992.

[54] Куль-Сяльверстава С. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур. Фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова 18 ст. – 1820-я гады). Мн., 2000.

[55] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1752–2002. Мн., 2003. У прыв., гл. IV. Перыяд паскоранай мадэрнізацыі імперыі і нацыянальнага самасцвярджэння беларусаў. 1905–1914.

5.5. Аналіз прычын і ацэнка эфектыўнасці грамадскіх рухаў

На першы погляд, пытанні прычын і эфектыўнасці грамадскіх рухаў не выклікаюць значных метадалагічных цяжкасцей. Так, з пункту гледжання класічнага гістарызму дастаткова выявіць ланцуг падзей, якія прывялі да ўзнікнення таго ці іншага руху, і адзначыць, наколькі адпавядалі дасягнутыя вынікі мэтам удзельнікаў руху.

У айчыннай гістарыяграфіі гэтыя традыцыйныя падыходы дапаўняліся выяўленнем структурных фактараў, якія ўплывалі на ход падзей, перш за ўсё – эвалюцыі эканамічных структур. Метадалагічныя традыцыі айчыннай гістарыяграфіі засноўваліся на тэарэтычных распрацоўках К. Маркса, У. Леніна і, у меншай ступені, А. Грамшы. Кожны з трох тэарэтыкаў падкрэсліваў розныя асновы для калектыўнага дзеяння. К. Маркс пісаў аб фундаментальных супярэчнасцях капіталістычнага грамадства, якія ствараюць мабілізацыйны патэнцыял для грамадскага руху (дакладней, класавай барацьбы). У. Ленін адзначаў важнасць арганізацый, якія павінны надаць структуру руху і прадухіліць панаванне вузкіх карпартытыўных мэт. А. Грамшы падкрэсліваў значэнне культурных асноў для фарміравання мабілізацыйнага кансэнсуса. Менавіта ў гэтым рэчышчы і адбывалася вывучэнне прычын узнікнення грамадскіх рухаў у айчыннай гістарыяграфіі, што стварала падмурак для выяўлення працэсаў, якія хоць і заставаліся «нябачнымі» для сучаснікаў, у значнай ступені абумоўлівалі прычыны і вынікі канкрэтных рухаў.

Пры аналізе даследаванняў грамадскіх рухаў выяўляецца абагуленая схема, па якой гісторыкі звычайна вылучаюць прычыны як грамадскіх рухаў, так і рэвалюцый. Гэта, перш за ўсё, памнажэнне канфліктаў у рамках эліты, калі ў выніку эканамічнай эвалюцыі адны групы з усе большай цяжкасцю захоўваюць свой статус, а другія – атрымліваюць магчымасць заняць месца ў эліце і імкнуцца гэтую магчымасць рэалізаваць. Разам з гэтым вылучаюцца міграцыя ў гарады, запаўненне рынкаў працоўнай сілы, зніжэнне рэальных заробкаў і павелічэнне долі маладога насельніцтва, што прыводзіць да росту народных хваляванняў і тым самым умацоўвае мабілізацыйны патэнцыял рухаў. Рост папулярнасці ідэй удасканалення і змянення сацыяльнага парадку таксама лічыцца адным з важных фактараў, якія спрыяюць узнікненню грамадскага руху[1].

Агульнасць прычын узнікнення грамадскіх рухаў і сацыяльных рэвалюцый тлумачыцца тым, што як першыя, так і другія абумоўлены ўнутранымі супярэчнасцямі паміж традыцыйна манархічнай паўарыстакратычнай легітымнасцю і новымі эканамічнымі, культурнымі і ідэалагічнымі плынямі, якія аспрэчвалі гэтую легітымнасць, а таксама паміж групамі-носьбітамі гэтых каштоўнасцей і больш традыцыйнымі групамі.

Адны прычыны з'яўляюцца больш «важкімі» для грамадскіх рухаў, а другія – для рэвалюцый. У гэтым кантэксце становіцца неабходным, па-першае, вывучэнне механізма спалучэння, узаемнай важкасці і рэальнага суаднясення гэтых фактараў; а па-другое, комплексны улік як структурных, надындывідуальных прычын, так і індывідуальнай матывацыі ўдзельнікаў руху.

У айчыннай гістарыяграфіі важкасць прычын, якія ўплываюць на фарміраванне грамадскіх рухаў, звычайна вылучаецца на аснове разлічэння доўгатэрміновых працэсаў (перадумоў, фундаментальных прычын) і «каталізатараў», «пускавых механізмаў». Аднак, як даказаў Р. Арон, розніцу паміж перадумовай і непасрэднай прычынай, паміж тым, што падрыхтоўвае і што завяршае, паміж тым, што робіць магчымым і тым, што робіць неабходным, можна выявіць толькі метафізічна. Паказаць гэтую розніцу часта практычна немагчыма. «У пазітыўным плане, – піша ён, – неабходнай задачай з'яўляецца адбор і вымярэнне ўплыву розных прычын і ў меншай ступені – вызначэнне тыпаў ці вылучэнне так званай адзінай сапраўднай прычыны»[2].

Што датычыцца ўзроўняў дэтэрмінацыі сацыяльных рухаў, то фармальна беларускія гісторыкі ўлічвалі і структурныя, і сацыяпсіхалагічныя прычыны грамадскіх рухаў. Сярод фактараў структурнага характару агульнапрынятым стала вызначэнне адносін паміж дзяржавай і асноўнымі сацыяльнымі стратамі/класамі, а таксама комплекс эканамічных фактараў. Пры гэтым у савецкай гістарыяграфіі эканамічныя перадумовы былі ўзведзены ў ранг першапрычын грамадскіх рухаў. Культурна-ідэалагічныя фактары даследчыкі часта разглядалі толькі як эпіфеномены глыбінных сацыяльных і эканамічных працэсаў. Гэты напрамак часта спалучаўся з сацыяпсіхалагічным тлумачэннем прычын узнікнення грамадскіх рухаў: першаснае значэнне надавалася настроям расчаравання і незадавальнення ў грамадстве[3].

Пытанне ж аб індывідуальнай матывацыі ўдзельнікаў руху заставалася без адказу ці, у лепшым выпадку, адказ даваўся ў рамках тэорыі рацыянальнага выбару і класавага канфлікту. Прыхіль-

нікі дадзенага падыходу ў сваіх інтэрпрэтацыях рухаў перабольшваюць ролю сацыяльных канфліктаў, спрошчваюць аб'ект даследавання за кошт выкарыстання мадэлі «эканамічнага чалавека» і недаацэньваюць абмежаванасць кагнітыўных магчымасцей чалавека.

Такі падыход слушна крытыкаваўся сацыёлагамі Дж. Макарці і М. Залдам, якія паказалі, што ён працуе не столькі для грамадскіх рухаў, колькі для груп інтарэсаў і прымянімы, па большай частцы, для эканамічных асацыяцый. Для таго ж, каб адказаць на пытанне аб тым, чаму індывіды выбіраюць калектыўнае дзеянне, неабходна ўлічваць псіхалагічныя, культурна-этычныя, нацыянальныя асаблівасці, існуючыя нормы і згоды, звычаі і правілы, якія рэгламентуюць паводзіны індывідаў.

Гісторыкі часта не звяртаюць увагі на той факт, што на аснове абагульнення разнастайнага, у тым ліку гістарычнага, матэрыялу ў сацыялогіі былі вызначаны асноўныя перадумовы ўзнікнення сацыяльных рухаў: сацыяльная незадаволенасць; структурная блакада (бар'еры ў сацыяльнай структуры, якія садзейнічаюць узнікненню сацыяльнай незадаволенасці); кантакты і ўзаемадзеянні паміж незадаволенымі; упэўненасць у тым, што агульныя калектыўныя дзеянні могуць палепшыць умовы існавання; наяўнасць ідэалогіі, якая апраўдвае калектыўныя дзеянні ў сацыяльных рухах, існаванне пэўных палітычных магчымасцей[4]. У лік перадумоў узнікнення грамадскіх рухаў некаторыя даследчыкі ўключаюць і так званыя «культурныя плыні» (ці сацыякультурныя рухі па тэрміналогіі А. Турэна). Пры гэтым культурная плынь вызначаецца як працэс, у якім невялікія дэфармацыі паволі змяняюць характар і формы стылю і спосабаў жыццядзейнасці людзей[5].

На нашу думку, пераасэнсаванне прычын сацыяльных рухаў XIX ст. на аснове ўдакладнення такіх тэрмінаў, як «сацыяльная незадаволенасць», «дэзарганізацыя грамадства» і «палітычная магчымасць» магло б паспрыяць большай тэарэтычнай цэльнасці гістарычных даследаванняў.

Так, менавіта дэзарганізацыйныя тэндэнцыі, калі грамадства знаходзіцца ў стане змены і страчваюцца традыцыйныя ўстойлівыя нормы сацыяльнага быцця, адносяцца да структурных прычын, якія абумоўліваюць узнікненне грамадскіх рухаў. Гэтыя тэндэнцыі былі характэрнымі для сітуацыі ў Расійскай імперыі XIX ст., у перыяд мадэрнізацыі, г. зн. пераходу ад традыцыйнага аграрнага грамадства да сучаснага індустрыяльнага. Працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, дэмаграфічнага росту, эрозіі традыцый, сацыяльнай мабільнасці, бюракратызацыі, пашырэння пісьменнасці прыводзілі

да таго, што правілы і нормы, якія дзейнічалі раней, ужо не лічыліся карыснымі і надзейнымі[6]. Індывіды аказваліся ў стане анаміі і адчужэння. Апошняе, як дэфарміраваная інтэграцыя чалавека ў дэзарганізаванае грамадства, уключала (і звычайна уключае) такія элементы, як бездапаможнасць, адсутнасць нарматыўных арыенціраў, сацыяльная ізаляцыя. Па меркаванню амерыканскага гісторыка Д. Броуэра, «адчужэнне» студэнцкай моладзі ад традыцыйных інстытутаў, каштоўнасны канфлікт «бацькоў і дзяцей» вызначылі самабытнасць расійскай рэвалюцыйнай думкі ў другой палове XIX ст.[7]. У такім жа стане адчужанасці часта аказваліся і сяляне, якія ў выніку аграрнага перанасялення і працэсаў сацыяльна-эканамічнай дыферэнцыяцыі вымушаны былі мігрыраваць на ўскраіны імперыі і ў гарады[8]. Паняцце анаміі ў большай ступені звязана з адносінамі індывіда і ўлады і ўключае 1) адчуванне таго, што тыя, хто кіруюць дзяржавай раўнадушны да імкненняў і пачуццяў людзей; 2) усведамленне, што чалавек не можа дасягнуць асноўных мэт у грамадстве, якое бачыцца як непрадказальнае; 3) агульнае адчуванне дарэмнасці ўласных намаганняў; 4) упэўненасць у тым, што нельга разлічваць на сацыяльную і псіхалагічную падтрымку з боку дзяржаўных інстытутаў[9]. Р. Мертан адзначыў, што менавіта анамія, а не беднасць выклікае сацыяльную актыўнасць індывідаў. Гэта дае слушнае тлумачэнне таго, што традыцыйныя грамадствы часцей за ўсё з'яўляюцца найбольш стабільнымі да тых часоў, пакуль не пачынаюцца змены. Як толькі нормы і каштоўнасці падвяргаюцца перагляду, павялічваецца ўзровень сацыяльнай актыўнасці. А рэвалюцыі і паўстанні становяцца найбольш верагоднымі тады, калі наступае перапынак у перыядзе паляпшэння ўмоў жыцця і ствараецца разрыў паміж павелічэннем патрэб і памяншэннем магчымасцей для іх рэалізацыі[10].

Сітуацыю анаміі ў Расійскай імперыі на рубяжы XIX–XX ст. паглыблялі малаэфектыўныя спробы ўлад ажыццявіць мадэрнізацыйныя рэформы, якія падштурхоўвалі краіну на шлях «рэцыдывіруючай мадэрнізацыі». Гэта прыводзіла да росту «сацыяльнага кошту» мадэрнізацыі: у асноўнай часткі насельніцтва ўзнікаў страх перад рэформамі, недавер да тых, хто іх распрацоўваў і ажыццяўляў[11]. Напрыклад, некаторыя сяляне ўспрымалі адмену прыгоннага права негатыўна, як знікненне асноўных сацыяльных гарантый і дэзінтэграцыю культурнага асяроддзя. А так званыя «пралетарскія масы» другой паловы XIX – пачатку XX ст. практычна ўяўлялі сабой сукупнасць людзей, вырваных з устойлівага групавога жыцця. Вось чаму характэрным для іх быў стан неспакою, які

выяўляўся ў форме неакрэсленых надзей, перамены густаў і інтарэсаў. Усё гэта стварала ўмовы для іх далучэння да грамадскіх рухаў пад уплывам рознага кшталту прапагандыстаў і харызматычных лідэраў. Мадэрнізацыя, абумоўленая імператывамі эканамічнага росту і павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага адміністравання, урывалася такім чынам у камунікатыўную структуру гістарычных «жыццёвых міроў»[12]. Усё гэта выклікала так званую «сацыяльную незадаволенасць» – агульную незадаволенасць умовамі жыцця і сістэмай сацыяльных адносін у грамадстве.

Вылучаюцца тры асноўныя кампаненты сацыяльнай незадаволенасці: адносная незадаволенасць, адчуванне несправядлівасці, статусная нявызначанасць. Адносная незадаволенасць, па меркаванню англійскага сацыяльнага псіхолага С. Стауфера, узнікае, калі існуе пэўны разрыў паміж тым, што людзі маюць і тым, што яны маглі б мець[13]. Сацыяльная несправядлівасць – гэта таксама не аб'ектыўны сацыяльны фактар, а хутчэй уласнае ўяўленне аб індывідуальнай сітуацыі. Пры гэтым сацыяльная несправядлівасць ні ў якім разе не павінна атаясамлівацца з адсутнасцю роўнасці. Наадварот, усталяванне роўнасці паміж сацыяльнымі слаямі можа адчувацца як сацыяльная несправядлівасць і служыць асновай для ўзнікнення, напрыклад, кансерватыўных ці нацыяналістычных рухаў. Статусная ж нявызначанасць – гэта сітуацыя, калі індывідуум мае некалькі статусаў рознага рангу. Пры гэтым сацыяльная актыўнасць вызначаецца не статусам як такавым, а пагрозай яго змены ці страты, што, у сваю чаргу, абвастрае пачуццё сацыяльнай несправядлівасці.

Гісторыкі, якія займаюцца вывучэннем сацыяльнай ідэнтыфікацыі ў Расійскай імперыі другой паловы XIX – пачатку XX ст., адзначаюць блытаніну ў вызначэнні розных сацыяльных катэгорый[14]. Так, Д. Брукс паказвае з'яўленне новага сацыяльнага тыпу, для якога атаясамленне з пэўным класам і саслоўем з'яўлялася толькі перашкодай у кар'ерным руху[15]. Нявызначанасць сацыяльнага статусу суб'ектаў тлумачылася несупадзеннем паміж: 1) уяўленнямі суб'ектаў аб сабе і сваім месцы ў грамадстве; 2) разуменнем і тлумачэннем статусу суб'екта іншымі (фармальныя, юрыдычныя, аналітычныя, звычайныя ўяўленні і паняцці); 3) роллю, якую выконваў суб'ект у пэўных абставінах[16].

Даследаванні сацыяльных рухаў паказалі, што наяўнасць гэтых трох фактараў з'яўляецца вызначальнай для далучэння індывідаў да грамадскага руху. Гэта дазваляе растлумачыць сітуацыі, падобныя апісанай начальнікам Балтыйскага завода ў Санкт-Пе-

цярбурзе ў снежні 1901 г.: «Самы ж беспакойны... склад масцеравых на заводзе з мяшчан і рамеснікаў, а затым – з дзяцей беззямельных сялян, якія выраслі ў горадзе; па большай частцы пісьменны і па свойму начытаны, ён да таго ж найбольш развіты... ён заўсёды масцеравы, а не рабочы, мае добры заробак, якога яму рэдка дастаткова па шырока развітым гарадскім патрэбам... Сярод гэтай моладзі... развіваецца найбольш актыўны элемент рабочага руху»[17]. Іншымі словамі, актывістамі сацыяльных рухаў станавіліся не тыя, хто знаходзіўся ў горшым становішчы, а адносна прывілеяваныя слаі са статуснай нявызначанасцю, якія былі ўцягнуты ў працэсы геаграфічнай і сацыяльнай мабільнасці. Такая мабільнасць стала адной з прычын сацыяльнай актывізацыі сялян.

З другога боку, актывізацыі пратэстных грамадскіх рухаў спрыялі пэўныя бар'еры ў сацыяльнай мабільнасці (структурная блакада). Расійская даследчыца Ш. Зайнетдзінава адзначае, што капіталістычная мадэрнізацыя, з аднаго боку, спрыяла развіццю і станаўленню груп, якія «ўвасабляюць сабой грамадскі прагрэс» (інтэлігенцыі, прадпрымальнікаў, рабочых), і фарміраванню бюракратыі – працаўнікоў органаў кіравання і ўлады. Аднак гэтыя тэндэнцыі спалучаліся з захаваннем саслоўнага дзялення, якое было тормазам для сацыяльнай мабільнасці і ўзмацняла супярэчнасці паміж традыцыяналісцкімі і мадэрнізацыйнымі групамі[18]. Напрыклад, па заканчэнні універсітэта студэнты атрымлівалі пэўнае месца ў службовай іерархіі. Дыплом першай ступені забяспечваў яго ўладальніку чын X класа, а дыплом другой ступені – чын XII класа «Табели о рангах», саслоўны ж статус пры гэтым не змяняўся[19].

У папярэдніх раздзелах адзначалася, што сацыяльная незадаволенасць з'яўляецца адным з першых этапаў «жыццёвага цыкла» сацыяльных рухаў. Аднак грамадскія рухі, у адрозненне ад масавых паводзін (сялянскія хваляванні, фабрычныя забастоўкі, дэманстрацыі студэнтаў), рэдка ўзнікаюць як прамы адказ на ўзровень незадавальнення. Больш таго, прычынай іх узнікнення з'яўляюцца не столькі пэўныя супярэчнасці, колькі фарміраванне публічнай сферы[20] і ўзнікненне новых палітычных магчымасцей. У якасці апошніх амерыканскі сацыёлаг С. Тароў адзначаў: 1) адкрыццё магчымасцей увайсці ва ўладныя структуры; 2) змены ў кіруючых блоках; 3) даступнасць уплывовых саюзнікаў; 4) супярэчнасці ў рамках эліты. Іншымі словамі, на яго думку, грамадскія рухі ўзнікаюць тады, калі праз пашырэнне палітычных магчымасцей становяцца відавочнымі магчымыя саюзнікі – з аднаго боку, і сла-

басць апанентаў – з другога[21]. Так, асноўнымі фактарамі, якія спрыялі развіццю ліберальнага руху ў Беларусі другой паловы XIX ст. стала не «абвастрэнне супярэчнасцей капіталізму», а змены ў заканадаўстве аб грамадскіх аб'яднаннях, адмена ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі і Літвы, падтрымка легальнай грамадскай дзейнасці шэрагам арыстакратаў і высокапастаўленых чыноўнікаў[22].

Згаданыя вышэй фактары ўяўляюць сабой пераходную прыступку паміж глабальнымі зменамі эканамічнай, дэмаграфічнай, культурнай, сацыяльнай структур і непасрэднымі «перадумовамі» канкрэтных гістарычных рухаў. Тым самым паміж пастулатамі дэтэрмінізму і «выпадковасцю» індывідуальных гістарычных падзей уводзіцца тлумачэнне сувязі фактараў, якое дазваляе больш дакладна рэканструяваць умовы фарміравання грамадскіх рухаў.

Вылучэнне прычынных сувязей з'яўляецца адным з асноўных спосабаў інтэрпрэтацыі як гісторыі ў цэлым, так і гісторыі грамадскіх рухаў у прыватнасці. Таму нельга знайсці працу па гісторыі грамадскіх рухаў, у якой у той ці іншай ступені не вызначаліся б прычыны і фактары, якія спарадзілі гэтыя рухі. Зусім іншая сітуацыя склалася ў айчыннай гістарыяграфіі адносна выяўлення эфектыўнасці грамадскіх рухаў.

Грамадскія рухі ацэньваюцца, галоўным чынам, адносна таго, дасягнулі яны сваёй мэты, ці не. Пры гэтым усталявалася пазіцыя метадалагічнага ўніверсалізму і нарматывізму, калі ідэальны тып структуры, стратэгіі, паводзін «прызначаецца» адносна ажыццяўлення рэвалюцыі ці сацыяльнага пераварота, якія сталі ўвасабленнем сацыяльных змен. Іншымі словамі, грамадскія рухі разглядаюцца толькі як пераходная ступенька да палітычных партый, мэта якіх – ажыццяўленне рэвалюцыі[23]. А паколькі эфектыўнасць атаясамліваецца з мэтадасягненнем, праблема вызначэння эфектыўнасці сацыяльных рухаў лічыцца вырашанай.

На самой жа справе вырашэнне гэтай праблемы прадстаўляе сабой значныя метадалагічныя цяжкасці, бо аналіз ступені дасягнення мэт і вызначэння эфектыўнасці сацыяльных рухаў прадстаўляе сабой складаны працэс выяўлення рацыянальных і рацыяналізаваных мэт на індывідуальным і групавым узроўнях, а таксама рэканструкцыю першапачатковых мэт, фіксацыю іх адрозненняў ад тлумачэння сацыяльных змен *a posteriori*, як вынікаў таго ці іншага сацыяльнага руху.

Важнае значэнне ў гэтым дачыненні мае паняцце рацыянальнасці як найбольш эфектыўнага суаднясення мэт рухаў і сродкаў

іх дасягнення. Ды і большасць традыцыйных гістарычных прац, на самой справе, апрыёрна базуецца на прыняцці канцэпцый рацыянальнага выбару і рацыянальнасці М. Вэбера. Апошні вылучаў чатыры ідэальных тыпы сацыяльных дзеянняў: мэтарацыянальнае, каштоўнасна-рацыянальнае, традыцыйнае, афектыўнае. Кожнае з іх адрозніваецца мэтамі, сродкамі, тыпам паводзін (гл. табл.)[24].

Тып дзеяння	Мэта	Сродкі	Агульная характарыстыка
Мэтарацыянальнае	Усведамляецца ясна, прадугледжваюцца наступствы	Мэтазгодныя	Рацыянальнае дзеянне, якое прадугледжвае рацыянальны разлік на рэакцыю акружэння
Каштоўнасна-рацыянальнае	Дзеянне як самастойная каштоўнасць	Адэкватныя мэце	Рацыянальнасць можа абмяжоўвацца іррацыянальнасцю пэўнай каштоўнасці
Традыцыйнае	Мінімальнае асэнсаванне мэты	Звыклыя	Аўтаматычныя рэакцыі на звыклыя стымулы
Афектыўнае	Не асэнсоўваецца	Падручныя	Імкненне да неадкладнага зняцця напружання

Відавочна, што ў адпаведнасці з дадзенай класіфікацыяй грамадскія рухі на інстытуцыянальным узроўні з'яўляюцца мэтарацыянальнай і/ці каштоўнасна-рацыянальнай дзейнасцю. Асноўнае ж адрозненне каштоўнасна-рацыянальнага дзеяння ад мэтарацыянальнага заключаецца ў тым, што яно заўсёды падпарадкоўваецца пэўным патрабаванням, у якіх суб'ект бачыць свой «абавязак», нават калі наступствы дзеяння могуць быць негатыўныя. Відавочна, што ў рамках каштоўнаснай рацыянальнасці мэтадасягненне не можа лічыцца крытэрыем эфектыўнасці грамадскага руху. Больш таго, тлумачэнне эфектыўнасці грамадскіх рухаў у рамках вебэраўскай канцэпцыі мэтарацыянальнасці заключае ў сабе пэўную супярэчнасць. Рацыяналізацыя, па Вэберу, уключае ў сябе, сярод іншага, у палітыцы – заняпад традыцыйных норм узаконення і замяшчэнне харызматычнага лідэрства рэгулярнай партыйнай працай, а ў грамадстве ў цэлым – пашырэнне бюракратычных

метадаў кіравання, дзяржаўнага кантролю і адміністравання. Так што ўмацаванне мэтарацыянальнасці і рацыяналізацыя калектыўных паводзін, па сутнасці, азначаюць знікненне грамадскага руху: чым у большай ступені мэтарацыянальным з'яўляецца рух, тым у большай ступені ён павінен набліжацца да палітычнай партыі. У рамках дадзенай логікі ствараецца парадаксальная сітуацыя – чым больш эфектыўны рух, тым менш шансаў у яго на «выжыванне» і захаванне саматоеснасці. Як слушна адзначаў Г. Лауэр, «тое, што на паверхні можа выглядаць як поспех руху, на самой справе можа ўключаць уплыў, які прыводзіць да фундаментальнай змены пачатковага характару і мэт руху»[25].

Вырашэнне парадокса, на нашу думку, заключаецца ў тым, каб уключыць «выжыванне» рухаў (як захаванне саматоеснасці) у лік крытэрыяў вызначэння іх эфектыўнасці. Гэта, па-першае, дазволіць пераадолець стэрэатыпы ленінскай ацэнкі грамадскіх рухаў на аснове таго, наколькі блізка яны падышлі да разумення і падтрымкі мэт сацыял-дэмакратаў і рэканструяваць рэальную карціну грамадскага жыцця XIX ст. Па-другое, увядзенне дадзенага крытэрыя дазволіць больш адэкватна ацэньваць эфектыўнасць так званых «агульных грамадскіх рухаў» (рабочага, жаночага, моладзевага і інш.), якія, па характарыстыцы Г. Блумера, набываюць форму «намацавання» (groping) і шэрагу нескаардынаваных дзеянняў у пэўным напрамку[26]. Так, жаночы рух канца XIX – пачатку XX ст. накіроўваў свае намаганні на самыя розныя вобласці (дом, шлюб, адукацыя, прамысловасць і г. д.) і ў кожнай сферы ўвасабляў пошук такіх пераўтварэнняў, якія б адпавядалі новай канцэпцыі статуса жанчыны. У такім выпадку поспех руху вымяраецца не толькі мэтадасягненнем, а і тым, наколькі доўга ён існуе і ў якой ступені захоўвае сваю саматоеснасць і не падпарадкоўваецца цалкам мэтам іншых рухаў (сацыялістычнага, ліберальнага, нацыянальнага і г. д.).

Цікавыя падыходы да вызначэння эфектыўнасці грамадскіх рухаў вызначаюцца ў рамках тэорыі камунікатыўнага дзеяння Ю. Хабермаса. Нямецкі сацыёлаг вылучыў чатыры тыпы дзеяння: стратэгічнае, нарматыўнае, драматургічнае і камунікатыўнае. Стратэгічнае дзеянне суадносіцца з мэтарацыянальным, яго эфектыўнасць вызначаецца як суаднясенне выніка і затрат. Нарматыўнае дзеянне засноўваецца на следаванні сацыякультурным нормам у якасці ўмовы дасягнення мэты. Такім чынам, мера эфектыўнасці тут – суадносіны выніка і стабільнасці норм. Мэтай суб'екта ў драматургічным дзеянні з'яўляецца стварэнне публічнага воб-

раза. Эфектыўнасць такога дзеяння вызначаецца адпаведнасцю паміж дзеяннем і намерам, «шчырасцю». Мэтай камунікатыўнага дзеяння з'яўляецца каардынацыя намаганняў дзеячаў, а эфектыўнасць вызначаецца ўзроўнем мабілізацыі рэсурсаў.

Бясспрэчна, што крытэрыі эфектыўнасці грамадскіх рухаў павінны вызначацца не толькі на інстытуцыянальным (групавым), але і на індывідуальным узроўнях. Мэтадасягненне ў дадзеным кантэксце набывае новыя вымярэнні. Па-першае, адно і тое ж дзеянне можа ўключаць элементы рацыянальнасці і іррацыянальнасці, паколькі суб'ект ніколі не звязвае сваё дзеянне з адзінай мэтай. Па-другое, мэтарацыянальнасць аказваецца тлумачэннем ужо зробленага ў кантэксце прынятага ў сацыяльнай групе разумення рацыянальнасці. Адным з «вымяральных» крытэрыяў эфектыўнасці руху ў такім выпадку можа стаць яго здольнасць забяспечваць мінімальны ўзровень задавальнення для ўдзельнікаў.

Разам з мэтадасягненнем, здольнасцю выжываць і забяспечваць задавальненне ўдзельнікаў руху пры вызначэнні эфектыўнасці грамадскіх рухаў неабходна ўлічваць і такія канцэпты, як наступствы і ўплыў рухаў. Бо, як паказаў Р. Мертан, эфектыўнасць любой сацыяльнай дзейнасці можна вызначыць толькі па наступствах, а не па намерах, г. зн. у перспектыве. Справа ў тым, што наступстваў, якія не заўсёды можна прадказаць, часта больш, чым намераў, і вызначаць іх неабходна на розных узроўнях: індывідуальным, статусна-ролявым, арганізацыйным, інстытуцыянальным, сацыятальным. Рознаўзроўневыя наступствы рухаў і змены, якія яны стымулююць у дзяржаўнай палітыцы, грамадскім меркаванні, сродках інфармацыі, культуры і каштоўнаснай сістэме, звычайна абагульняюцца ў такім паняцці, як «уплыў грамадскага руху».

Некаторыя даследчыкі лічаць, што грамадскія рухі не здольны аказваць уплыў на палітыку ўрада. З гэтым тэзісам можна часткова пагадзіцца, бо такі ўплыў ніколі не бывае непасрэдным. Грамадскія рухі ўплываюць на палітыку праз грамадскае меркаванне (мабілізацыя кансэнсуса)[27] і праз набыццё палітычных саюзнікаў. У выніку актывісты рухаў прымаюцца ўладай у якасці «легітымных прадстаўнікоў калектыўных інтарэсаў», нават атрымліваюць пэўныя правы (прывілеі)[28]. Можна вызначыць тры спосабы ўплыву грамадскіх рухаў на палітыку: 1) змена палітычных пераваг праз прыцягненне ўвагі публічнага меркавання да сваіх мэт; 2) рост увагі ўсяго грамадства да праблем, артыкуляваных удзельнікамі руху; 3) змена ва ўспрыняцці заканадаўцаў[29].

Агульную схему ўплыву грамадскіх рухаў на палітыку можна прадставіць наступным чынам: грамадскія рухі мабілізуюць удзельнікаў, мэты рухаў прымаюцца (усведамляюцца) грамадскім меркаваннем і/ці палітычнымі саюзнікамі, ціск з боку апошніх на ўрад прыводзіць да палітычных змен. Трэба адзначыць пры гэтым, што калі палітычныя саюзнікі рухаў набываюць сілу, яны не абавязкова праводзяць палітыку, якая адлюстроўвае мэты асноўнай масы ўдзельнікаў руху. Сучасны французскі тэарэтык Г. Дэбор адзначае, што аўтарытарны ідэалагічны радыкалізм бальшавікоў паклаў канец дэмакратычным ілюзіям рабочага руху. «Знешняе кіраванне пралетарыятам, якое праводзілася дысцыплінаванай падпольнай партыяй, падпарадкаванай інтэлектуалам, якія сталі «прафесійнымі рэвалюцыянерамі», зрабіла з яе прафесійную групу, якая не пажадала заключыць саюз ні з адной з правячых прафесійных груп капіталістычнага грамадства... І таму яна становіцца групай прафесіяналаў па абсалютным кіраўніцтве грамадствам», – пісаў ён[30].

Да гэтага трэба дадаць, што, як паказалі сучасныя сацыялагічныя даследаванні, эліты рэагуюць не на патрабаванні пэўнай групы ці руху, а на ступень неспакою і на патрабаванні, высунутыя элітамі ці «дыктатарамі меркаванняў», якія зноў-такі могуць не адпавядаць чаканням тых, чые інтарэсы яны, як кажуць, выражаюць[31]. Ды і мэтай сацыяльных рухаў з'яўляецца не толькі дасягненне змен у грамадстве, а адлюстраванне інтарэсаў і поглядаў на грамадства, уласцівых удзельнікам руху.

Не менш важным, але часта не заўважаным айчыннымі даследчыкамі з'яўляецца ўплыў грамадскіх рухаў у культурнай сферы. Сувязь паміж культурнымі зменамі і грамадскімі рухамі стала асноўнай тэмай кнігі вядомага сацыёлага Томаса Рыкона «Культурныя зрухі: ідэі, актывізм і змяняючыяся каштоўнасці»[32]. Рыкон адзначае, што культурныя змены выяўляюцца праз дыскусіі наконт разумення і тлумачэння пэўных падзей, мадыфікацыі мовы і спосабаў карыстання мовай, змены штодзённых паводзін. Менавіта такія змены пад уплывам грамадскіх рухаў назіраліся ў Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Шэф жандармаў П. Святаполк-Мірскі ў 1901 г. пісаў: «У апошнія тры-чатыры гады з дабрадушнага рускага парня (у Пецярбурзе) выпрацаваўся своеасаблівы тып паўпісьменнага інтэлігента, які лічыў сваім доўгам адмаўляць рэлігію..., зневажаць заканадаўствам, не падпарадкоўвацца ўладам і глуміцца над імі»[33].

Культурная змена, па Рыкону, лічыцца завершанай, калі каштоўнасць ужо не з'яўляецца дыскусійнай і ўключаецца ў сістэму

норм. У гэтым кантэксце відавочнай становіцца недаацэнка народніцкага руху, адным з наступстваў якога было фарміраванне псіхалогіі і тыпаў людзей, якія абумовілі далейшае развіццё пратэстных рухаў і рэвалюцыю 1917 г.

Рыкон адзначыў тры тыпы змены каштоўнасцей: замена існуючых каштоўнасцей новымі поглядамі на пэўную праблему; стварэнне новых ідэй наконт сітуацый, якія раней не былі заўважаныя; сувязь каштоўнасцей – канцэптуальныя сувязі паміж феноменамі, якія раней лічыліся незвязанымі ці звязанымі па-іншаму. Прычым найбольш канфліктнымі, па яго меркаванню, з'яўляюцца змены першага тыпу. Ступень уплыву грамадскага руху ў сферы каштоўнасцей залежыць ад здольнасці парадзіць групавую ідэнтычнасць і салідарнасць. Менавіта такія новыя формы ідэнтычнасці і групавой салідарнасці вызначае амерыканскі даследчык А. Філд, калі прыводзіць прыклад пецярбургскага металіста У. Сакалова, які жыў яшчэ па-сялянскі ў хатніх абставінах, а ў іншых выпадках вёў сябе як рабочы-інтэлігент і ганарыўся сваёй «свядомасцю». Тое ж можна сказаць і аб маскоўскіх аптэкарскіх памочніках, якія ў час пад'ёму «рэвалюцыйнага энтузіазму», нягледзячы на свае даволі высокія кваліфікацыю і адукаванасць, «сталі думаць аб сабе як аб рабочых». У свядомасці металістаў Пецярбурга ў перыяд адступлення рэвалюцыі даследчык адзначае новую тэндэнцыю: яны ўяўлялі свайго працаўніка не як гаспадара ці адміністрацыю асобнай фабрыкі, а «салідарна» – як буржуазію наогул[34]. Характэрнай рысай свядомасці рабочых на рубяжы XIX–XX стст. стала таксама фарміраванне і праяўленне пачуцця ўласнай годнасці. Аб гэтым сведчыла рэзкае павелічэнне ліку скаргаў на «дрэннае абыходжанне» з імі з боку прадстаўнікоў адміністрацыі і майстроў, пры тым, што агульнае становішча рабочых палепшылася[35].

Грамадскія рухі становяцца крыніцай шматлікіх сацыяльных інавацый у развіцці навукі, тэхналогіі, новых шляхоў вырабу і пашырэння ведаў. Уводзячы новыя тэмы ў грамадскія дыскусіі, грамадскія рухі ствараюць базу для рэарганізацыі сацыяльных інстытутаў і вытворчасці ведаў. Яркім прыкладам у гэтым сэнсе можна лічыць дзейнасць шматлікіх гурткоў, заснаваных студэнтамі і выкладчыкамі Віленскага універсітэта ў першай трэці XIX ст. і дзейнасць грамадскіх таварыстваў другой паловы XIX – пач. XX ст.[36].

Вось чаму для вызначэння агульнага ўплыву грамадскага руху (ці комплексу рухаў) мэтазгодна вылучыць спецыфічныя сацыяльныя змены, у дачыненні да якіх гэты ўплыў будзе вызначацца. У прыватнасці, адказу патрабуюць пытанні аб тым

1) што канкрэтна змяняецца і ў якой сферы (палітыка, культура, заканадаўства і г. д.);

2) кароткатэрміновыя ці доўгатэрміновыя змены маюцца на ўвазе;

3) якія форма і хуткасць змены;

4) на якім/якіх узроўнях адбываецца (індывідуальны (перакананні і пачуцці), сацыятальны (статусы-ролі); сацыяльныя інстытуты; экстраінстытуцыянальны ўзровень).

Толькі пасля гэтага можна перайсці да выяўлення ўплыву розных сацыяльных рухаў на кожным узроўні. А затым і ўласна да ацэнкі эфектыўнасці руху, г. зн. адказаць на пытанне, як суадносяцца змены, да якіх імкнуўся рух (мэты) і рэальныя змены, да якіх прывеў рух (з улікам складанай структуры наступстваў) і якімі сродкамі гэта было дасягнута.

Адной з прыярытэтных задач у сучаснай гістарыяграфічнай сітуацыі становіцца ажыццяўленне гісторыка-метадалагічнага сінтэзу, які можа даць арыенціры для вывучэння, у прыватнасці, гісторыі грамадскіх рухаў і вызначыць набор даследчыцкіх стратэгій у дачыненні да пэўнай даследчыцкай сферы. У рамках розных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў сфарміраваўся сінтэтычны погляд на сацыяльныя рухі, як на дынамічныя феномены. На розных ступенях развіцця і ў розных кантэкстах яны могуць прымаць разнастайныя формы, для тлумачэння якіх нельга прапанаваць універсальную тэорыю.

Змены агульнай гістарыяграфічнай сітуацыі, засваенне новых тэарэтычных падыходаў да вывучэння грамадскіх рухаў амаль не змянілі сітуацыю ў айчыннай гістарыяграфіі з яе пераважнай цікавасцю да гісторыі палітычных рухаў і партый. У большасці прац па гісторыі грамадскіх рухаў да гэтага часу параметры класіфікацый нават не выдзелены з паняційных і катэгарыяльных комплексаў. «Безразмерны» набор расплывістых па сэнсе азначэнняў прыводзіць да рыхласці і неадназначнасці класіфікацый, памылак тыпалогій нават добра вывучаных феноменаў. Безумоўна, розны гістарычны кантэкст абмяжоўвае магчымасці выкарыстання адзінага нарматыўнага вызначэння паняцця «грамадскі рух». Таму выпрацоўка карэктных класіфікацыйных схем у адпаведнасці з пэўнымі тэарэтычнымі падыходамі становіцца важным напрамкам метадалагічных распрацовак.

Актуальным у сучасным кантэксце становіцца і стварэнне адпаведных перыядызацый грамадскіх рухаў на аснове выкарыстання працэдур класічнай гістарычнай кампаратывістыкі, якая выву-

чае ў роўнай меры падабенства і розніцу, і ў звяртанні да «структурнага» наратыву, які засяроджваецца на аналізе і асэнсаванні імпліцытных тэарэтычных асноў перыядызацыйных схем. Менавіта пераход да структурнага наратыву і распрацоўка метадалагічных аспектаў перыядызацыі гістарычных працэсаў могуць стаць новым стымулам у стварэнні і верыфікацыі эмпірычна і тэарэтычна вывераных інстытуцыянальных перыядызацый гісторыі грамадскіх рухаў Беларусі, на базе якіх характар працяглых гістарычных працэсаў робіцца больш заметным, а дзяленне на «перыяды» менш ацэначным.

Увагі патрабуе і пераацэнка крытэрыяў вызначэння прычын і ацэнкі эфектыўнасці грамадскіх рухаў. Так, пераасэнсаванне прычын сацыяльных рухаў XIX ст. на аснове ўдакладнення такіх тэрмінаў, як «сацыяльная незадаволенасць», «дэзарганізацыя грамадства» і «палітычная магчымасць» магло б паспрыяць большай тэарэтычнай цэльнасці гістарычных даследаванняў. Неабходным элементам пры даследаванні прычын фарміравання і актывізацыі грамадскіх рухаў павінна стаць удакладненне сувязей (пераходных ступенек) паміж глабальнымі эканамічнымі, дэмаграфічнымі, культурнымі і сацыяльнымі зменамі і непасрэднымі «перадумовамі» канкрэтных гістарычных рухаў.

У адносінах да вызначэння эфектыўнасці грамадскага руху, гісторыкам варта было б звяртаць увагу не толькі на аб'ектыўныя вынікі, але і на ступень рацыянальнасці спосабу дасягнення мэт руху, на здольнасць руху захоўваць саматоеснасць у зменлівым асяроддзі. Пажадана таксама ўлічваць і шматлікія незапланаваныя вынікі на розных узроўнях і ў розных сферах сацыяльнага быцця.

Такім чынам, удакладненне сутнасці феномена грамадскага руху як аб'екта гістарычнага даследавання, выпрацоўка карэктных крытэрыяў для класіфікацыі, перыядызацыі, вызначэння прычын і ацэнкі эфектыўнасці грамадскіх рухаў ствараюць аснову для «прыстасавання» зменлівага феномена грамадскага руху для мэт гістарычнага аналізу і для вызначэння гістарычнай пераемнасці розных форм руху.

Разуменне грамадскага руху як шматслойнага і шматмернага феномена дазваляе у залежнасці ад даследчыцкіх задач больш дакладна вызначаць канкрэтны прадмет гістарычнага аналізу. Пры гэтым інструменты для сістэматызацыі і абагульнення гістарычнага матэрыялу павінны карэктна суадносіцца з абранымі тэа-

рэтыка-метадалагічнымі падыходамі да вызначэння паняцця «грамадскі рух». Усё гэта будзе спрыяць дысцыплінаванню практыкі гісторыка, больш дакладнаму акрэсленню абласцей канкрэтных гістарычных даследаванняў і, тым самым, выяўленню новых праблемных сфер.

---

[1] Падрабязна аб гэтым гл.: Eisennstadt S. Frameworks for Great Revolutions: Culture, Social Structure, History and Human Agency // International Social Science Journal. 1992. № 8. P. 386–401.

[2] Арон Р. Избранное: введение в философию истории. М.; СПб., 2000. С. 396.

[3] Гл., напр.: Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1; Бич М. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг.; Мохнач Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30–40 годы XIX в. Мн., 1976 і інш.

[4] Evans S., Boyte H. Free Spaces: The Sources of Democratic Change in America. N. Y., 1986; Piven F., Cloward R. Poor People's Movements: Why They Succeed, How They Fail. N. Y., 1979; Rude G. Ideology and Popular Protest. [N. Y.] 1980.

[5] Herckovitz M. Man and his Work. N. Y., 1985. P. 81.

[6] Алексеев В. и др. Региональное развитие в контексте модернизации. Екатеринбург; Лувен, 1997. С. 93–94.

[7] Brower D. Training nihilists. Education and radicalism in Tsarist Russia. N. Y., 1978.

[8] Опыт российских модернизаций XVIII–XX вв. М., 2000. С. 119–120; Бородкин Л., Леонард К. Факторы динамики миграции из деревни в город в России в конце XIX – начале XX вв.: роль заработной платы // Российская модернизация XIX–XX вв.: институциональные, социальные, экономические перемены. Уфа, 1997. С. 11–26.

[9] Merton R. Social Theory and Social Structure. P. 672–682.

[10] Ritzer G. Modern Sociological Theory. Boston, 2000. P. 146.

[11] Наумова Н. Рецидивирующая модернизация в России: беда, вина или ресурс человечества? М., 1999. С. 30–31.

[12] Жыццёвы мір уяўляе сабой адзінства трох кампанентаў: культуры (запаса ведаў), грамадства (легітымных парадкаў, на аснове якіх людзі вызначаюць сваю прыналежнасць да салідарных груп) і структур асобы (кампетэнцый, якія дазваляюць асобнаму чалавеку выступаць суб'ектам дзеяння і захоўваць пры гэтым сваю ідэнтычнасць). Гл. аб гэтым: Фурс В. Философия незавершенного модерна Ю. Хабермаса. Мн., 2000.

[13] Stauffer S. Communism, Conformity and Civil Problems. Wash., 1970. P. 270.

[14] Freeze G. The Soslovie (Estate) Paradigm and Russia's Social History // American Historical Review. 1986. № 1. P. 11–36; Confino M. Issues and Nonissues in Russian Social History and Historiography // Kennan Institute for Advanced Russian Studies. Washington, 1983. P. 165.

[15] Brooks J. Competing Modes of Popular Discourse: Individualism and Class Consciousness in the Russian Print Media, 1880–1928 // Culture et Revolution. Paris, 1989. P. 76.

[16] Филд Д. Социальные представления в дореволюционной России // Реформы или революция. Россия 1861–1917. СПб., 1992. С. 69.

[17] Архив истории труда в России. Пг., 1981. Кн. 1. С. 81.

[18] Зайнетдинова Ш. Социальная структура в процессах модернизации российского общества (рубеж XIX–XX вв. – 1930-х гг.). Уфа, 2000. С. 59–88.

[19] Щетинина Г. Студенчество и революционное движение в России. Последняя четверть XIX века. М., 1987. С. 20–21.

[20] Аб публічнай сферы гл. параграф 5.2 дадзенай працы.

[21] Tarrow S. Power in Movement. Cambridge, 1994. P. 10–27.

[22] Соколова М. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века. С. 41–97.

[23] Сувалова Е. История общественных движений и политических партий. Мн., 2004; Коклюхин В. История общественных движений и политических партий. Брест, 2004.

[24] Вебер М. Избранные произведения. М., 1990. С. 628–630.

[25] Social Movements and Social Change. N. Y., 1975. P. 123–263.

[26] Blumer H. Collective Behavior. Chapters XIX–XXII / New Outline of the Principles of Sociology. N. Y., 1951. P. 195.

[27] Klandermans B. The Formation and Mobilization of Consensus // From structure to action. Greenwich, 1988. P. 173–196.

[28] Guigni M. Passy F. Social Movements and Policy Change: Direct, Mediated, or Joint Effect. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.nd.edu/~dmyers/cbsm/vol1/geneva98.pdf; Banaszak L. Why Movements Succeed or Fail. Princeton, 1996.

[29] Burstein P. Social Movements and Public Policy // How Social Movements Matter. Mineappolis, 1999; Porta D. Social Movements and the State: Thoughts on the Policing of Protest // Comparative Perspectives on Social Movements. Cambridge, 1996.

[30] Дебор Г. Общество спектакля. М., 2000. С. 61.

[31] Tarrow J. Power in Movement. P. 25.

[32] Richon Th. Culture Moves: Ideas, Activism and Changing Values. Princeton, 1998.

[33] Всеподданнейший доклад товарища министра внутренних дел П. Д. Святополк-Мирского. 1901 г. // Красный архив. 1936. № 3. С. 62.

[34] Филд Д. Социальные представления в дореволюционной России // Реформы или революция. Россия. 1861–1917. СПб., 1992. С. 75–76.

[35] Кирьянов Ю. Пролетариат – гегемон освободительного движения в России в 1901–1904 гг. // Вопросы гегемонии пролетариата в освободительном движении России периода капитализма. М., 1982. С. 4.

[36] Соколова М. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века. С. 19–49, 69–82.

Раздзел 6

КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ ЯК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

6.1. Палітыка царскага ўрада ў галіне культуры

За два мінулыя стагоддзі склалася даволі вялікая гістарыяграфія, прысвечаная вывучэнню культуры Беларусі. Пры гэтым значная частка даследаванняў розных галін культуры (мастацтва, літаратуры, народнай культуры і г. д.) або не закранае ўзаемаадносіны паміж культурай і палітыкай, або абмяжоўваецца пералікам адпаведных тэме урадавых указаў без тэарэтычнага асэнсавання. У шэрагу прац па гісторыі культуры, на ледзь азначаным гістарычным фоне, пададзены фактычны матэрыял[1]. Таму можна пагадзіцца з даследчыцай гісторыі культуры С. Куль-Сяльверставай, што сучасны стан гісторыка-культурных даследаванняў, у сваёй большасці, уяўляе сабой стракатую мазаіку, у якой асобныя «палі» запоўнены дастаткова густа, іншыя толькі пазначаны, трэція ніяк не ўпісаны ў агульную карціну. На яе думку, гістарычная навука, пакідаючы вывучэнне культуры мастацтвазнаўцам, літаратуразнаўцам, тэатразнаўцам і інш., так і не выпрацавала спецыяльнай метадалогіі даследавання гісторыка-культурнай праблематыкі[2].

Даследчык рускай дваранскай культуры XVIII – пачатку XIX ст. Ю. Лотман адзначаў, што «па сваёй прыродзе культура, як і мова, – з'ява грамадская, гэта значыць сацыяльная»[3]. Ён зрабіў цікавыя высновы аб ступені ўзаемадзеяння культуры і палітыкі. Аўтар адзначыў, што «прыгоннае права мела для гісторыі рускай культуры ў цэлым некаторыя станоўчыя бакі, менавіта на ім грунтавалася, няхай скажоная ў сваёй аснове, але усё ж вызначаная незалежнасць дваран ад улады – тое, без чаго культура немагчыма»[4]. Польскі гісторык Я. Тазбір пад культурай вышэйшага саслоўя разумеў стыль жыцця і светапогляд шляхты. Ён лічыў, што стыль жыцця знаходзіў сваё адлюстраванне ў звычаях, арыстакратычных густах, а вось светапогляд – у этнічных поглядах і грамадска-палітычных ідэалах, якія былі звязаны з палітычнай культурай[5].

На працягу дзвюх стагоддзяў даследавання гісторыі культуры Беларусі самым спрэчным пытаннем, цесна ўзаемазвязаным з культурнай палітыкай царскага ўрада, было пытанне аб паланізацыі і русіфікацыі яе тэрыторыі. Яно паўстала яшчэ ў XIX – пачатку XX ст., калі былі зроблены спробы асэнсавання становішча і тэндэнцый развіцця сістэмы адукацыі, і з'явіўся шэраг прац, прысвечаных дзейнасці навучальных акруг[6]. Іх аўтары звязвалі гэтае пытанне з навучаннем у школах, вучылішчах, вышэйшых навучальных установах Віленскай навучальнай акругі пачатку XIX ст. на польскай, а не на рускай мове. Галоўныя абвінавачанні ў правядзенні такой палітыкі, якая садзейнічала, на думку аўтараў, паланізацыі ў галіне адукацыі, былі ўскладзены на Аляксандра I, куратара Віленскай навучальнай акругі князя А. Чартарыйскага і Віленскі універсітэт.

А. Бялецкі адзначаў, што руская мова ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. вывучалася ў вучылішчах, як і іншыя новыя замежныя мовы, толькі ў пазакласны час[7]. Гэта ж адзначыў і Райкоўскі, які пісаў, што руская мова ў Віленскай навучальнай акрузе была ў такім загане, што многія выхаванцелі лічылі справай патрыятызму даказваць няведанне сваёй дзяржаўнай мовы, якую ў вучылішчах выкладалі нараўне з замежнымі мовамі. Аўтар лічыў, што пад кіраўніцтвам князя А. Чартарыйскага ў гэтай акрузе пачала змяньвацца «фізіяномія краю», паколькі школа і польская мова «абдумана ўтвораныя», сістэматычна развівалі польскую народнасць не на карысць народнасці рускай. І таму, на думку аўтара, праз некалькі гадоў інтэлігентныя слаі заходніх губерняў зрабіліся больш польскімі, чым у часы Рэчы Паспалітай. А Віленскі універсітэт прывёў заходні край да аб'яднання ў духу польскай народнасці[8].

М. Каяловіч у сваёй гістарыяграфічнай працы[9] пісаў, што набліжаны да Аляксандра I «вераломны паляк Чартарыйскі» з шайкай іншых «вераломных палякаў», такіх як Т. Чацкі і І. Лялевель, рыхтавалі па заходнееўрапейскім узоры канстытуцыю на сваёй радзіме – Польшчы. А паколькі пад Польшчай яны разумелі ўсю Заходнюю Расію, то на гэтай тэрыторыі яны раскінулі «самую згубную ў рускім сэнсе сістэму польскай адукацыі, якая сапсавала цэлыя пакаленні»[10]. На думку аўтара, пры разгляданні 3 тома «Живописной России», які быў падрыхтаваны Адамам Кіркорам, які да такой ступені жадаў разарваць усялякія сувязі Заходняй Расіі з Усходняй, што «у адным месцы нават абураецца езуітамі, навошта яны ўвялі ўнію, а не прама накіроўвалі беларускі народ

у лацінства, таму што калі б увялі прама лацінства, то народ беларускі быў бы ужо цяпер польскім»[11].

Гэтыя думкі знайшлі сваіх прыхільнікаў у 20-я гг. XX ст., калі беларускія гісторыкі падтрымалі такога рода абвінавачанні ў паланізацыі Беларусі. Так, А. Цвікевіч пісаў, што менавіта пры Аляксандры I пачаўся працэс узмоцненай паланізацыі. I галоўную ролю ў гэтым адыграў Віленскі універсітэт на чале з куратарам А. Чартарыйскім[12]. Такой жа думкі прытрымліваліся М. Доўнар-Запольскі і У. Ігнатоўскі[13]. М. Доўнар-Запольскі лічыў, што такая арыгінальная з'ява, як паланізацыя Беларусі і Літвы мела вельмі нядаўняе паходжанне і з'яўлялася вынікам не толькі імкненняў беларусаў і літоўцаў да польскай мовы, нораваў і звычаяў, але і няўдалай палітыкай рускага ўрада, які не ведаючы мясцовых умоў, сваімі мерамі яе падтрымліваў. Галоўную ролю ў гэтым, на яго думку, адыграў Віленскі універсітэт[14].

У сувязі з ростам цікавасці да нацыянальнай гісторыі ў 1990-х гг. гэтыя ж абвінавачанні з'явіліся ў шэрагу артыкулаў і даследаванняў. Іх аўтары (С. Таляронак, А. Гурэцкі, З. Шыбека[15]), у асноўным, абапіраліся на дарэвалюцыйныя працы і працы беларускіх гісторыкаў 20-х гг. XX ст. Як і ў мінулыя часы, яны лічылі, што палітыка кіравання Віленскай навучальнай акругай садзейнічала далейшай паланізацыі Беларусі.

Нават тэарэтычна вельмі цяжка сабе ўявіць, што расійскі імператар Аляксандр I, які праводзіў дастаткова ліберальную палітыку ў дачыненні да далучаных тэрыторый Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, стаў бы займацца іх паланізацыяй, а не русіфікацыяй. Нельга было ў часы яго праўлення спаланізаваць тое, што ўжо даўно было паланізавана. На думку польскага гісторыка Я. Тазбіра, на працягу стагоддзяў у Рэчы Паспалітай агульнасць прывілеяў для большасці літоўска-рускай і ўкраінскай шляхты прыводзіла да агульнасці мовы і звычаяў. Акрамя таго іх збліжаў з палякамі ўдзел у агульных палітычных падзеях і дзяржаўных установах. Літоўская шляхта, як піша аўтар, звычайна не карысталася сваёй роднай мовай, а дастаткова часта пераходзіла ад рускай (старабеларускай) да польскай. Аналагічныя працэсы праходзілі і ў сферы рэлігіі, калі праваслаўная шляхта (руская (беларуская), ці літоўская) у часы Рэфармацыі спавядала кальвінізм, або арыянства, а затым пераходзіла ў каталіцтва[16].

Зыходзячы з гэтага, можна лічыць, што яшчэ да ўваходжання тэрыторыі ВКЛ і Правабярэжнай Украіны ў склад Расійскай імперыі беларуская, украінская і літоўская шляхта падвергалася пала-

нізацыі праз мову, рэлігію і культуру. Да пачатку XIX ст. царскі ўрад не меў магчымасцей для замены польскай сістэмы адукацыі на расійскую, паколькі і ў цэнтральных рэгіёнах імперыі не хапала настаўнікаў, выкладчыкаў, прафесароў, адукаванага праваслаўнага духавенства і, нават, адукаваных чыноўнікаў. Можна пагадзіцца і з думкай Л. Лыча, што Кацярына II, Павел I і Аляксандр I не перашкаджалі панаванню польскага элемента на беларускай зямлі, паколькі лічылі, што ён меў на гэта законныя правы. Але ў адрозненні ад мінулых часоў польская культура тут ужо не мела надзейнай падтрымкі адміністрацыйных органаў[17].

На думку В. Шведа, як польская, так і расійская сістэмы адукацыі, якія выкарыстоўвалі для паланізацыі і русіфікацыі такія сродкі, як мову выкладання, выкладчыцкія кадры, жаночую адукацыю і г. д., ігнаравалі інтарэсы карэннага насельніцтва, выключаючы беларускую мову з навучальна-выхаваўчага працэсу[18]. Ён вылучыў прычыны, якія, на яго думку, стрымлівалі нацыянальнае развіццё беларусаў у 1794–1863 гг.: скасаванне бацькоўскай веры – уніяцтва і насаджэнне адзінай веры – праваслаўнай; русіфікацыя і паланізацыя насельніцтва Беларусі; расійская і польская сістэмы адукацыі; адсутнасць рэзка адметных рыс беларускай культуры, насаджэнне культуры і мовы вялікарускага этнасу[19].

Што тычыцца выкарыстання беларускай мовы, то на думку А. Самусіка, сістэма адукацыі ў Віленскай навучальнай акрузе была разлічана, у асноўным, на шляхту каталіцкага веравызнання (да 80% навучэнцаў)[20]. А менавіта ў гэты перыяд шляхта і лічыла сябе не беларусамі, а палякамі. Значыцца, выкарыстанне польскай мовы ў Віленскай навучальнай акрузе супадала з нацыянальным вызначэннем навучэнцаў. Што ж тычыцца выкарыстання нацыянальных моў, то агульная ўрадавая тэндэнцыя выкарыстання мовы ў шматнацыянальнай дзяржаве была адзначана Л. Ціхаміравым, які пісаў, што ў «рознаплемянных дзяржавах неабходна ўсталяванне адной дзяржаўнай мовы, якой можа быць, зразумела, толькі мова галоўнага племені»[21]. Але, дадае ён, для гэтага не абавязкова падаўляць мясцовыя мовы, паколькі яны карысны для дзяржаўнай мовы, бо надаюць ёй большае багацце і гнуткасць. І робяць яе «больш моцнай зброяй культуры, агульнай для ўсёй дзяржавы»[22]. Далей аўтар заўважае, што ў Расійскай імперыі прымалі рэпрэсіўныя меры супраць рускіх дыялектаў. А «такая палітыка – ёсць палітыка бясплоднай унутранай барацьбы, а не ўнутранага згуртавання»[23].

На думку швейцарскага даследчыка А. Каппелера, мова з'яўляецца важным фактарам ідэнтычнасці. Усе пісьмовыя мовы былі

прызнаны ў Расіі (польская, яўрэйская і інш.). Што ж тычыцца ў асноўным непісьменных моў іншых этнасаў, то расійскі ўрад не заўважаў іх[24]. Відаць, гэта адпавядала рэчаіснасці, бо старабеларуская пісьмовая мова была ўжо страчана да канца XVIII ст. і таму царскі ўрад не звяртаў ніякай увагі на культуру мясцовага насельніцтва і на вусную беларускую мову. Спробы некаторых літаратараў выкарыстаць яе ў сваіх творах, але не кірыліцай, а лацінкай, у асноўным цярпелі крах, бо ўлады блыталі яе з польскай.

Закрануў пытанне выкарыстання мясцовых моў і літоўскі гісторык Д. Сталюнас[25]. Ён адзначыў, што на заходніх ускраінах Расійскай імперыі склалася асаблівае становішча, калі імперская палітыка калыхалася паміж русіфікатарскім імкненнем да аб'яўлення беларусаў і ўкраінцаў часткай трыадзінай рускай нацыі і неабходнасцю забяспечыць хаця б мінімальныя магчымасці для развіцця мясцовых моў для таго, каб пабудаваць механізм супрацьдзеяння, які спаборнічаў бы з рускім, польскаму нацыянальнаму праекту. Улічваючы ступень нацыянальнай індыферэнтнасці сялянства, на думку аўтара, можна лічыць, што ў заходнім памежжы імперыі праходзіла складаная барацьба за аднаўленне этналінгвістычных меж, якія, у сваю чаргу, павінны былі вызначыць прыналежнасць тэрыторый і насельніцтва да таго або іншага нацыянальнага праекта[26]. Аўтар канстатуе, што калі да сярэдзіны XIX ст. функцыянаванне беларускай мовы ў сялянскім асяроддзі не хвалявала імперскія ўлады, то з пачаткам «великих реформ» становішча змянілася, бо інстытуцыялізацыя «белорусского наречия» (у школе, касцёле і г. д.) магла парушыць канцэпцыю трыадзінай рускай нацыі[27].

У перыяд 1832–1864 гг., як мяркуе польскі гісторык Л. Заштаўт[28], царскія ўлады толькі часткова справіліся з праблемамі польскай культурнай дамінанты ў заходніх губернях. Больш паспяховымі былі здабыткі ў галіне распаўсюджвання расійскай культуры, таму што царскія ўлады скасавалі важную частку інфраструктуры каталіцкага касцёла – сетку парафіяльных школ, манастыроў і іх школы, далучыўшы даўнія фундушы на адукацыю ў казну дзяржавы[29].

Такой думкі прытрымліваецца і А. Каппелер, які лічыў, што культура і сістэма адукацыі ў былых землях Рэчы Паспалітай засталіся і пад расійскім панаваннем у рамках польскага ўплыву, які садзейнічаў паланізацыі літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў, бо тут была захавана былая сістэма школьнай адукацыі, якая абапіралася на даўнія традыцыі[30]. У манаграфіі фінскага даследчыка І. Рэмі, якая прысвечана праблеме нацыянальнай ідэнтыфікацыі і вышэй-

шай адукацыі палякаў, таксама разглядаюцца пытанні адукацыйнай палітыкі расійскага ўрада ў рэгіёнах, якія былі далучаны да Польшчы. На думку аўтара, урад атрымаў у спадчыну шырокую сетку школ у Віленскай навучальнай акрузе ад польскай адміністрацыі[31]. І. Рэмі прывёў звесткі аб колькасці студэнтаў з Царства Польскага і заходніх губерняў ва універсітэтах Расійскай імперыі пасля закрыцця Віленскага універсітэта. Ён лічыў, што іх колькасць пастаянна павялічвалася. Па прыведзеных ім звестках, у 1836 г. ва універсітэтах Кіева, Масквы і Пецярбурга было 213 студэнтаў з гэтых тэрыторый, у 1856–1857 гг. – 1065, а ў 1861 г. – 1541. Аўтар лічыў, што нават пасля пачатку русіфікацыі школ у 30-я гг. XIX ст., высокі працэнт польскіх студэнтаў ва універсітэтах не здзіўляў, паколькі самая вялікая колькасць палякаў была з заходніх губерняў, бо там, у адрозненне ад Царства Польскага, урад не абмяжоўваў сярэднюю адукацыю[32].

Па звестках французскага даследчыка Д. Бавуа ў Віленскім універсітэце ў 1830 г. было да 1300 чал. студэнтаў[33]. І па іх колькасці ён займаў першае месца ў імперыі[34]. Гэта ж пацвярджае і польскі даследчык Р. Радзік[35]. Але, калі параўнаць колькасць студэнтаў аднаго Віленскага універсітэта да 1832 г. і колькасць студэнтаў з Царства Польскага і заходніх губерняў у 5 універсітэтах імперыі, то відавочна, што пасля 1832 г. яна рэзка зменшылася і толькі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. перавысіла былы узровень. І не здарма Д. Бовуа лічыў, што закрыццё Віленскага універсітэта ў 1832 г. можна трактаваць як адно з самых вялікіх злачынстваў супраць культуры[36].

Некаторыя аспекты ўрадавай палітыкі разгледжаны беларускай гістарыяграфіяй у шэрагу калектыўных прац[37] і кандыдацкіх дысертацый[38] па гісторыі адукацыі Беларусі. У савецкі час лічылася, што ўз'яднанне з Расіяй адпавядала інтарэсам беларускага народа, які імкнуўся да злучэння з родным яму па паходжанні, мове, культуры і гістарычным мінулым вялікім рускім народам (В. Пасэ[39]). Аб гэтым пісаў і А. Мальдзіс, але ён ўжо адзначаў, што афіцыйныя ўлады сустрэлі ў штыкі імкненні беларусаў да нацыянальнага самавызначэння і не пазбавілі беларускі народ ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. На яго думку, царскія ўлады свядома тармазілі развіццё беларускай нацыянальнай культуры, але не маглі яго затрымаць[40].

Працэс русіфікацыі закрануў і тэатр. Як лічыць даследчык тэатра Ю. Пашкін[41] у папулярызацыі рускай мовы ў тэатрах Беларусі сыграла ролю не русіфікатарская палітыка ўрадавай адміністр-

рацыі, а маральны аўтарытэт рускай прагрэсіўнай літаратуры, перадавой грамадска-палітычнай думкі, а таксама ўжо не рэдкія ў Беларусі гастрольныя выступленні рускіх акцёраў і тэатральных калектываў[42].

Мала чым адрозніваюцца і думкі некаторых сучасных гісторыкаў. Так, у главе «Культура Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.» у «Гісторыі Беларусі» яе аўтары Е. Новік і В. Парфенкоў пішуць, што ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі садзейнічала нацыянальнай кансалідацыі беларускага народа, таму што ішоў працэс узаемаабагачэння культур, знаёмства беларускай культуры з лепшымі ўзорамі рускай і сусветнай культур[43].

Даследчык гісторыі культуры С. Кузняева[44] вызначыла русіфікатарскую палітыку ў Беларусі, як асцярожную пры Кацярыне II, ліберальную пры Аляксандры I, жорсткую і рашучую – пры Мікалаі I. Менавіта ўжо ў першай палове XIX ст., лічыць аўтар, руская афіцыйная грамадская і навуковая думка пачала фарміраваць тэорыю «западноруссизма». Згодна з якой даказваліся правы Расійскай імперыі на валоданне беларускімі землямі і якая адмаўляла беларусам у праве мець сваю гісторыю, культуру і мову (якую вызначалі, як дыялект рускай мовы). І як адзначала аўтар, і паланізацыя, і русіфікацыя збяднілі ўласны духоўны і разумовы патэнцыял беларускага этнасу, абяскровілі яго, затрымалі выспяванне нацыянальнай самасвядомасці[45]. Царызм, на думку С. Кузняевай, насаджаў у Беларусі адміністрацыйны і паліцэйскі нагляд за культурнымі ўстановамі: бібліятэкамі, школамі, друкарнямі, тэатрамі. Праведзеная ў 1845–1847 гг. у Беларусі і Літве тэатральная рэформа па-сутнасці скасавала вандроўныя трупы і ўскладніла гастрольную дзейнасць тэатральных калектываў, бо абмяжоўвала іх свабоду ў выбары рэпертуару[46].

Адным з аспектаў узаемаадносін культуры і ўрада была цэнзурная палітыка. І не толькі ў галіне тэатральнай дзейнасці, але і кнігадрукавання. О. Натовіч прысвяціў свой гістарычны нарыс[47] заканадаўчай палітыцы царскага ўрада ў галіне цэнзуры. У ім адсутнічаюць якія-небудзь высновы, а ў храналагічнай паслядоўнасці разгледжаны ўрадавыя ўказы аб цэнзуры, што прымаліся з дапятроўскіх часоў і да другой паловы XIX в. С. Куль-Сяльвестрава[48] ў сваіх артыкулах і манаграфіі звярнула ўвагу на тое, што ў Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. не існавала спецыяльных органаў, якія б займаліся справамі культурнага жыцця наогул і палітычнага нагляду за ім у прыватнасці. У час далучэння да Расійскай імперыі спецыяльных указаў, якія б тычыліся культурнага жыцця

тэрыторыі, таксама не было. Аб гэтым, піша аўтар, ускосна сведчыць тое, што пад наглядам каталіцкай царквы засталася значная колькасць навучальных устаноў[49]. Таму яна лічыць, што ў пачатку XIX ст. асноўная ўвага ўрада была накіравана на стварэнне цэнзурнай сістэмы нагляду за адукацыяй. Толькі пасля 1810 г. з'явіліся першыя праявы ўзмацнення нагляду за культурным жыццём, а з сярэдзіны 1820-х гг. пачынае фарміравацца асобная сістэма нагляду за Літвой і Беларуссю. Пачатак гэтаму быў пакладзены расправай над філаматамі, філарэтамі і іншымі тайнымі таварыствамі. Пры Мікалаі I статут 1826 г. павінен быў дыктаваць напрамак думак і паводзін. Асабліва радыкальныя змены адбыліся ў наглядзе за тэатральнай справай, калі 13 студзеня 1832 г. у рукі III аддзялення была перададзена цэнзура тэатральных паказаў у заходніх губернях. Толькі 50-я гг. прынеслі, на думку С. Куль-Сяльвестравай, некаторае паслабленне цэнзурнага прыгнёту[50].

Дзейнасць Віленскага універсітэта, як цэнзара ў Віленскай навучальнай акрузе, разгледзеў Д. Бовуа[51]. Універсітэт кантраляваў усю інтэлектуальную прадукцыю ў сваёй акрузе, аднак, як лічыць аўтар, быў толькі адным са звёнаў у ланцугу рэпрэсій[52]. Так, камісія цэнзуры ў 1829 г. разгледзела 569 кніг на польскай мове, 4 – на рускай, 21 – на латыні, 18 – на яўрэйскай, 4 – на французскай, 6 – на нямецкай, 2 – на літоўскай, 5 – на латышскай. Адхіліла – 1, вярнула на дапрацоўку – 36[53].

У перыяд 1772–1860 гг. узаемасувязь паміж культурай і палітыкай найбольш праяўлялася ў сферы адукацыі, цэнзуры кніг і тэатральнай дзейнасці. Да нашага часу спрэчным засталося пытанне аб паланізацыі і русіфікацыі культуры Беларусі гэтага перыяду. Польскія і расійскія даследчыкі культуры працягваюць разглядаць царскую палітыку ў адносінах да культуры Беларусі кожны са свайго боку (польская – руская), а сучасныя беларускія даследчыкі спрабуюць выявіць уплывы гэтых культур і палітыкі ўрада на фарміраванне беларускай культуры. Але, думаецца, яна ў той час практычна не залежала ад улад, бо зберагалася непісьменным беларускім народам і перадавалася, у асноўным, у вуснай форме ад пакалення да пакалення.

---

[1] Miller A. Teatr i muzyka na Litwie 1745–1865. Wilno, 1936; Materjały do dziej literatury i oświaty na Litwie i Rusi. Wilno, 1935. T. 1; Bystron J. S. Dzieje obyczajów w dawniej Polsce. Wiek XVI–XVIII. W-wa, 1976; Гісторыя беларускага мастацтва. Мн., 1989. Т. 3; Гісторыя беларускага

тэатра. Мн., 1983. Т.1; Чантурия Б. А. История архитектуры Белоруссии. Мн., 1985. Т. 1; Кулагин А. Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии. Мн., 1989; Барышев Г. И. Театральная культура Белоруссии. XVIII в. Мн., 1992; Мальдзіс А. Традыцыі польскага асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX ст. Мн., 1972 і інш.

[2] Куль-Сяльвестрава С. Актуальныя праблемы вывучэння культуры Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001.

[3] Лотман Ю. М. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX века). СПб., 1994. С. 28.

[4] Там жа. С. 28.

[5] Tazbir J. Kultura szlacheckie w Polsce. Rozkwit – upadek – relikty. W-wa, 1983. C. 5.

[6] Воронов С. С. Историко-статистическое обозрение учебных заведений Санкт-Петербургского округа с 1776 по 1828 год включительно. СПб., 1849; Белецкий А. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования 1803–1832. Вильна, 1906; Крачковский Ю. Ф. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа. Вильно, 1903; Евсеев К. Судьбы народного просвещения в Северо-Западной Руси. Витебск, 1908; Киприанович Г. Я. К истории женского образования в Западной России. Вильно, 1910; Корнилов И. П. Русское дело в Северо-Западном крае. Вильно, 1908; Еленев Ф. Польская цивилизация и ее влияние на Западную Русь. СПб., 1863; Лаппо И. И. Западная Россия и ее воссоединение с Польшей в их историческом прошлом. Прага, 1924 и др.

[7] Белецкий А. В. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования 1803–1832. Вильна, 1906. С. 43, 46.

[8] Райковский. Правительственные уступки полонизации в учебных заведениях Северо-Западного края. С. 340–341.

[9] Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. СПб., 1884.

[10] Там жа. С. 175.

[11] Там жа. С. 452.

[12] Цьвікевіч А. «Западнорусизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Мн., 1993 (упершыню выдадзена ў 1929 г.). С. 12–13.

[13] Довнар-Запольский М. В. История Белоруссии. Мн., 2003 (падрыхтавана ў 1921 г.); Ігнатоўскі У. З гісторыі асветы на Беларусі ў пачатку 19 сталецьця // Полымя. 1923. № 7–8.

[14] Довнар-Запольский М. В. История Белоруссии. Мн., 2003. С. 387.

[15] Талеренок С. В. Разработка планов полонизации белорусского населения в Виленском учебном округе. 1803–1804 гг. // Наш радавод. Гродно, 1991. Кн. 3. С. 576–580; Гурецкий А. А. Влияние политики российского самодержавия на народное образование в Белоруссии в 1803–1825 гг. Мн., 1997; Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795–2002. Мн., 2003.

[16] Tazbir J. Kultura szlacheckie w Polsce. Rozkwit – upadek – relikty. W-wa, 1983. S. 92.

[17] Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1997. С. 144.

[18] Швед В. Роля адукацыі ў русіфікацыі і паланізацыі моладзі зямель Беларусі ў 1772–1863 гг. // Шлях да ўзаемнасці. Гродна, 2001. С. 297.

[19] Швед В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). Гродна, 2001. С. 345–346.

[20] Самусік А. Ф. Развіццё сістэмы асветы на беларускіх землях у семідзесятых гадах XVIII – трыццатых гадах XIX стагоддзяў: Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 1998. С. 15.

[21] Тихомиров Л. А. Монархическая государственность. СПб., 1992. С. 648.

[22] Там же. С. 649–650.

[23] Там же. С. 649.

[24] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. М., 1997. С. 113.

[25] Сталюнас Д. Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период Великих реформ // Ab imperio. 2003. № 1.

[26] Там же. С. 261.

[27] Там же. С. 290–292.

[28] Zasztowt L. Kresy. 1832–1864. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej rzeczypospolitej. W-wa, 1997.

[29] Там жа. С. 365.

[30] Каппелер А. Россия – многонациональная империя. М., 1997. С. 109.

[31] Remy J. Higher education and national identity. Polish Student Activism in Russia. Helsinki, 2000.

[32] Там же. С. 358.

[33] Beavois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich. 1803–1832. T. 1–2. Rzym; Lublin, 1991. T. 1. S. 273.

[34] Там жа. S. 273, 275.

[35] Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodowa. Lublin, 2000. S. 96.

[36] Beavois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich. 1803–1832. T. 2. S. 441, 442.

[37] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Асвета і педагагічная думка ў Беларусі ад старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1983.

[38] Поссе В. С. Просвещение в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в.: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1963; Гурецкий А. А. Политика царизма в области образования в Белоруссии в конце XVIII – первой четверти XIX в. (1772–1825 гг.): Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 1998; Самусік А. Ф. Развіццё сістэмы асветы на беларускіх землях у семідзесятых гадах XVIII – трыццатых гадах XIX стагоддзяў: Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 1998.

[39] Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 1. С. 454–456.

[40] История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 314, 315.

[41] Пашкин Ю. А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX века. Мн., 1980.
[42] Там жа. С. 19.
[43] Гісторыя Беларусі. Мн., 1998. Ч. 1. С. 290.
[44] Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1.
[45] Там жа. С. 58.
[46] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 58.
[47] Нотович О. Исторический очерк нашего законодательства о печати. СПб., 1873.
[48] Сяльвестрава С. Фармаванне сістэмы нагляду за культурай Беларусі у канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Беларусіка. Мн., 1994; Куль-Сяльвестрава С. Расейская цэнзура ў Беларусі. 1795–1830 гг. // Гістарычны альманах. Гародня, 2002. Т. 6; Куль-Сяльвестрава С. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур. Мн., 2000.
[49] Сяльвестрава С. Фармаванне сістэмы нагляду за культурай Беларусі у канцы XVIII – першай палове XIX ст. С. 40–42.
[50] Там жа. С. 46–48.
[51] Beavois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich. 1803–1832. Rzym; Lublin, 1991. T. 1–2.
[52] Там жа. Т. 2. С. 441, 442.
[53] Там жа. С. 176.

6.2. Беларуская культура ў славянскай гістарыяграфіі XIX – пачатку XX ст.: метадалагічныя падыходы да вывучэння праблемы

Культура нацыі – мерка цывілізаванасці народа і адначасова своеасаблівая генетычная сувязь пакаленняў. Яна ўяўляе складаную шматгаліновую сістэму, якая ахоплівае ўвесь духоўны свет народа, яго свядомасць, сукупнасць перакананняў і поглядаў. Па словах вядомага чэшскага гісторыка З. Неедлы, культура, з аднаго боку, адлюстроўвае нацыю, яе характар, гісторыю, імкненні, а з другога – сама ўздзейнічае на нацыю, фарміруе яе, вучыць разумець самое сябе[1].

Пры адсутнасці ў беларусаў на працягу стагоддзяў сваёй дзяржаўнасці, самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця культура выступала як важнейшы аб'яднальны фактар. Яна садзейнічала і забяспечвала захаванне этнічнай самабытнасці, вяла да абуджэння і выспявання нацыянальнай самасвядомасці.

Вывучэнне айчыннай культурнай спадчыны пачалося толькі ў савецкі час. У XX ст. з'явіліся сотні артыкулаў, дзесяткі кніг, прысвечаных развіццю розных галін беларускай культуры. Своеасаблівым вынікам усіх гэтых публікацый сталі шматтомныя

фундаментальныя працы па гісторыі літаратуры, тэатра, выяўленчага мастацтва, архітэктуры, музыкі[2]. Гэтыя творы даюць уяўленне пра станаўленне і развіццё асобных галін нацыянальнай культуры. На жаль, дагэтуль адсутнічаюць даследаванні, прысвечаныя шляхам развіцця беларускай культуры ў розныя гістарычныя перыяды. Між тым вывучэнне духоўнай і матэрыяльнай спадчыны нашага народа, вызначэнне яе вытокаў, асаблівасцей, узаемасувязей з сусветнай культурай – актуальная задача з агляду на патрэбы сённяшняга дня.

Вывучэнне культуры славянскіх народаў у акрэслены перыяд, у час пераходу ад феадальных да буржуазных адносін, мае важнае значэнне. Гэта важна для разумення ўласна гістарычнага працэсу, у якім культура з'яўляецца яго часткай і сама актыўна ўдзельнічае ў развіцці грамадскай і нацыянальнай свядомасці. Гэта важна і для разумення ўнутраных заканамернасцей развіцця самой культуры з яе спецыфічнымі асаблівасцямі – у дадзеным выпадку на этапе пераходу ад культуры народнасці да культуры больш шырокай этнасацыяльнай супольнасці – культуры нацыянальнай, культуры новага часу.

Вырашэнне гэтых пытанняў можа быць ажыццёўлена рознымі шляхамі і праз розныя жанры навуковых даследаванняў. Але, відаць, найбольш плённым з'яўляецца той шлях, пры якім культура разглядаецца не ў адной з яе сфер (мова, літаратура, музыка, дойлідства і г. д.), а як адзіная сістэма складаных узаемадачыненняў розных сфер культуры і розных яе праяўленняў – сацыяльна-палітычнага характару, нацыянальнага і эстэтычнага.

З прычыны агульнасці этнічнага паходжання, блізкасці моў, падабенства гістарычных лёсаў славянскія народы маюць шмат агульнага ў сваім развіцці. Гэта ставіць перад даследчыкамі задачу разгляду як агульных заканамернасцей, так і спецыфічных асаблівасцей гісторыка-культурнага працэсу як комплекснай праблемы ў эпоху фарміравання славянскіх нацый.

Для большасці славянскіх народаў своеасаблівым рубяжом у станаўленні культуры новага часу стала XVIII ст., а для беларусаў – XIX ст. Параўноўваючы гісторыю асобных славянскіх культур, можна прыйсці да высновы, што ў перыяд фарміравання нацый яны прайшлі два асноўных этапы. На першым з іх пераважалі ідэі Асветніцтва (XVIII ст). Другі этап (XIX ст.) быў звязаны з фарміраваннем канцэпцыі нацыянальнай культуры. На кожным з гэтых этапаў жыцця славянскіх народаў вылучаліся свае мэты і задачы, якім адпавядалі канкрэтныя формы культурнай дзейнасці.

Фарміраванне ці станаўленне нацыянальнай культуры – працэс працяглы, складаны і супярэчлівы. Ён спецыфічна працякае ў кожнага народа (г. зн. пры агульнай заканамернасці мае мясцовыя нацыянальныя асаблівасці). Калі мы гаворым пра асаблівасці, то маем на ўвазе, што ў кожнага народа на першы план выступаюць (асабліва на першым этапе) розныя культураўтваральныя фактары, якія адыгрываюць вялікую ролю ў фарміраванні супольнасці людзей у народна-псіхалагічных адносінах, супольнасці ў нацыянальнай самасвядомасці, ва ўтварэнні паняцця патрыятызму як з'явы нацыянальнай.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. славянскія народы стаялі на розных ступенях дзяржаўнага, нацыянальнага і культурнага развіцця. Акрамя Расіі, магутнай славянскай дзяржавы, і Польшчы, якая хоць і страціла сваю дзяржаўнасць, але, як сцвярджаў Ф. Энгельс, была гатова «перанесці сцяг французскай рэвалюцыі на берагі Віслы», і валодала традыцыяй дзяржаўнага і культурнага жыцця, астатнія славянскія народы, у тым ліку беларускі, адчувалі цяжкі нацыянальны прыгнёт. Некаторыя нават не дакладна вызначаліся на геаграфічных картах Еўропы, а функцыі іх культуры былі абмежаваны «хатнім ужыткам».

У XIX ст. адбываюцца вялікія змены ва ўсіх сферах жыцця. Прыведзеныя ў рух новымі буржуазнымі адносінамі актывізуюцца і «недзяржаўныя» славянскія народы. Сваю культуру яны павінны былі ствараць паскорана, ствараць на мясцовым матэрыяле, а таксама арыентуючыся на вопыт больш развітых культур роднасных народаў. Нацыянальным матэрыялам аказалася вытрымаўшая выпрабаванне часам народная культура – вусная народная творчасць, што адыгрывала вялікую ролю ў лёсах нацыянальных культур славянскіх народаў, у тым ліку і беларускага.

У першай палове XIX ст. пачаўся працэс глыбінных зрухаў у развіцці беларускага этнасу: цэнтраімклівыя тэндэнцыі ў адносінах да ўсяго беларускага, хаця і марудна, непаслядоўна, аднак ішлі на змену цэнтрабежным. Няпросты для інтэлектуалаў Беларусі шлях да нацыянальнай культуры пачынаўся з усведамлення імі сваёй неабыякавасці, шчырай прыхільнасці да родных мясцін, жадання працаваць на карысць Бацькаўшчыны. У той час, калі Варшава страчвала моц дзяржаўнага ўплыву на Беларусь пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, а Пецярбург такую моц у адносінах да яе яшчэ толькі набіраў у асяроддзі беларускай шляхты ўмацоўваліся настроі і пачуцці патрыятызму, які можна назваць «мясцовым»[3].

Важнай праявай такога патрыятызму было захапленне фальклорам і мовай простага народа, імкненне да сур'ёзнага іх вывучэння. Сучасная навука разглядае зварот да фальклорнай спадчыны як важны крок на шляху сцвярджэння нацыянальнай свядомасці, усведамлення свайго гістарычнага аблічча, месца ў свеце.

Першыя беларускія пісьменнікі, этнографы і фалькларысты – яны ж і першыя нацыянальныя інтэлігенты – Я. Баршчэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Кіркор, В. Рэўт, У. Сыракомля, Я. Чачот, П. Шпілеўскі і інш. падыходзілі да вуснай народнай творчасці як да арыгінальнай культурнай з'явы. Прызнанне народа моцнай культурнай сілай спрыяла своеасабліваму рэвалюцыйнаму пераварот ў свядомасці часткі мясцовай шляхты, якая стала адчуваць сябе часткай беларускага народа. Першыя сімптомы нацыянальнага адраджэння праявіліся ў першай чвэрці XIX ст. і былі, у асноўным, звязаны з дзейнасцю тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў у Віленскім універсітэце і распаўсюджваннем сярод беларускіх інтэлігентаў уплываў рамантызму.

Нацыянальная культура, што нараджалася, не магла спыніцца на ўзроўні фальклорнай культуры. Узнікае патрэба ў звароце да вопыту іншых еўрапейскіх народаў, тым больш, што самі яны былі зацікаўлены ў культурным абмене. Сувязі гэтыя развіваліся як па вертыкалі – зварот да ўласных і іншанацыянальных традыцый далёкага і бліжэйшага мінулага, так і па гарызанталі – уваходжанне ў актыўныя кантакты ў розных галінах культуры ў залежнасці ад таго, які з яе відаў выконваў своеасаблівую ролю дэтанатара ва ўспрымаючай нацыянальнай культуры. Часцей за ўсё гэтыя функцыі брала на сябе літаратура. Паколькі яна валодала найбольшымі магчымасцямі масавага ўплыву шляхам распаўсюджання палітычных, ідэалагічных, эстэтычных і этычных канцэпцый.

Спецыфіка сувязей роднасных культур вызначыла разнастайнасць форм і спосабаў засваення іншанацыянальнага багацця, пачынаючы ад пераймання («Енеїда» ўкраінскага аўтара І. Катляроўскага – ананімная беларуская паэма «Энеіда навыварат»), стылізацый і заканчваючы непасрэдным удзелам у «чужым» культурным працэсе. Гэтай жа спецыфікай тлумачыцца і своеасаблівасць іх паэтычнага праяўлення (збіранне і выданне помнікаў народнай творчасці, стварэнне на фальклорнай аснове арыгінальных мастацкіх твораў і, паралельна перакладных, станаўленне гутарковай мовы ў якасці літаратурнай, узмацненне ролі тэатра, нацыянальнай музыкі і выяўленчага мастацтва). Усё гэта было ўласціва і для беларускай культуры першай паловы XIX ст.

Гаворачы пра разнастайныя беларуска-рускія культурныя сувязі XIX ст., трэба адзначыць, што найбольш рэальна яны выявіліся ў галіне літаратуры. І гэта зразумела. Як найбольш дынамічны элемент культуры, літаратура заняла вядучае месца ў культурным жыцці двух славянскіх народаў, моцна паўплывала на развіццё іншых сфер духоўнай культуры. Разам з тым, XIX ст. – важны перыяд і ў развіцці беларуска-рускіх музычных сувязей. Беларускі музычны фальклор, адзначалася ў літаратуры, выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці вядомыя кампазітары XIX ст. – М. Глінка, М. Рымскі-Корсакаў, М. Мусаргскі. Цікавымі ўяўляюцца беларуска-рускія сувязі і ў галіне выяўленчага мастацтва[4].

Ужо ў першай палове XIX ст. не без уплыву польскага рамантызму, а магчыма, і рускага славянафільства ў беларускай літаратуры ўпершыню прагучала думка пра «славянскую ўзаемнасць». Паэт А. Рыпінскі эпіграфамі для раздзелаў свайго даследавання «Беларусь» выкарыстаў радкі з песень розных славянскіх народаў. В. Дуніну-Марцінкевічу належыць паэма «Славяне ў XIX стагоддзі», у якой выказана салідарнасць з вызваленчай барацьбой балгарскага і сербскага народаў супраць турэцкага панавання. З чэшскімі «будзіцелямі» вёў перапіску В. Каратынскі. Знакаміты даследчык беларускай мінуўшчыны З. Даленга-Хадакоўскі яшчэ ў пачатку XIX ст. даў моцны штуршок да дзейнасці мясцовых збіральнікаў даўніны і фальклору, да ўсведамлення славянскага радаводу, заклікаўшы: «Калі меней будзем чакаць ад вешчых пісьменнікаў замежных, меней на іх спадзявацца, а распачнем між сабою, на ўласнай тэрыторыі, у гняздзе бацькоў нашых шукаць пра ўсё звесткі, знойдзем напэўна болей, чым дагэтуль дзе б ні было напісана»[5]. У XIX ст. ідэя славянскага адзінства пранізвала творчасць такіх даследчыкаў у галіне беларусазнаўства, як М. Баброўскага, І. Даніловіча, У. Дабравольскага, М. Нікіфароўскага, А. Сапунова, М. Янчука і інш.

Нельга не згадаць і Я. Чачота. Разважаючы пра «славяна-крэвіцкую» мову «з-над Нёмана і Дзвіны», ён звяртаў увагу «на іншыя дыялекты славянскага паходжання», «краінскі, краацкі і далмацкі»[6]. З той самай нагоды у сакраментальным звароце наконт «мовы нашай роднай» Ф. Багушэвічам згадваліся «…Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабрацімцы нашыя»[7]. А. Ходзька ў сваім зборніку «Паэзія» (1829) разам з баладамі на матывы беларускага і літоўскага фальклору друкаваў пераклады «марлацкіх», г. зн. паўднёваславянскіх песень[8]. І было гэта яшчэ да з'яўлення знакамітых «Песень заходніх славян» А. Пушкіна.

Новы этап у гісторыі беларуска-славянскага культурнага ўзаемадзеяння – другая палова XIX ст. У параўнанні з папярэднім перыядам гэтыя сувязі набылі больш творчы характар. Знешняе пераймальніцтва ўступіла месца глыбіннаму, арганічнаму засваенню вопыта суседніх культур, і, у першую чаргу, літаратур. Гэты вопыт – традыцыі М. Някрасава, Т. Шаўчэнкі, А. Міцкевіча, М. Канапніцкай дазволілі беларускім пісьменнікам канца XIX ст. узнавіць праўдзівую карціну жыцця беларускага сялянства. Выдаючы ў 1891 г. свой першы зборнік «Дудка беларуская», Ф. Багушэвіч натхняўся прыкладам будзіцелей іншых славянскіх народаў. Ён заклікаў ствараць сваю літаратуру, сваю «музыку» на роднай мове. У гэтым высакародным імкненні паэт абапіраўся на падтрымку прадстаўнікоў суседніх славянскіх культур – Э. Ажэшкі і Я. Карловіча. Менавіта з іх дапамогай у Кракаве ўбачылі свет першыя кніжкі беларускага Дудара.

Цікавая ў гэтым плане спадчына М. Багдановіча, які на працягу ўсяго жыцця паслядоўна спалучаў нацыянальнае самаўсведамленне з агульнаславянскім. Перакладаючы з беларускай і ўкраінскай моў на рускую, а таксама наадварот, М. Багдановіч стымуляваў развіццё кожнай з роднасных літаратур. Што ж датычыцца непасрэдна стаўлення М. Багдановіча да ідэі адзінства славян, нагадаем такое меркаванне: «Адно несумненна: славянскія землі, якія ўваходзяць у склад (…) нямецкіх дзяржаў, павінны быць у любым выпадку вылучаны з іхніх межаў. Гэта ёсць запаветная надзея цэлага шэрагу славянскіх народаў. Гэта пільна патрэбна самой Расіі. Гэтага ж вымагае ад нас і пачуццё славянскай блізкасці»[9].

Вопыт больш развітых славянскіх культур, у першую чаргу рускай, свядома і да пэўнай ступені мэтанакіравана выкарыстоўваўся дзеячамі культур астатніх славянскіх народаў, у т. л. і беларускага, для паскарэння развіцця і духоўнага ўзбагачэння нацый. Разам з тым для ўсіх славянскіх культур быў уласцівы творчы, крытычны падыход да дасягненняў сусветнай культуры. Па словах М. Багдановіча, беларуская культура была самастойнай, унікальнай нацыянальнай з'явай, «прадуктам дзейнасці самога народа»[10].

У пачатку XX ст. у беларускай культуры адбываюцца велізарныя перамены, выкліканыя рэвалюцыйнымі падзеямі 1905–1907 гг. «Калі ў памятны 1905 год зрабілася завіруха, калі ў Расіі ў кожнага чалавека будзіцца душа да новага жыцця, да новага шчасця, – то і ў беларуса стала будзіцца пачуццё свайго «я», стала лунаць доўга дрэмлючая думка, што і мы людзі» – пісаў Я. Купала[11]. 1905 год стаўся, па вызначэнні М. Багдановіча, пераломнай

вехай у гісторыі беларускага Адраджэння[12]. Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці знайшлі сваё яскравае адлюстраванне ва ўсіх галінах нацыянальнай культуры таго часу, абумовілі з'яўленне новых ідэй, тэм, вобразаў. Літаратура і мастацтва Беларусі выходзяць за вузкія этнаграфічныя межы, становяцца поруч з літаратурай і мастацтвам іншых народаў.

Бурныя падзеі пачатку XX ст. сканцэнтравалі ўвагу дзеячаў айчыннай культуры на народзе, яго жыцці і барацьбе, прымусілі задумацца аб яго ролі ў гісторыі, узмацнілі цікавасць да народнай творчасці. Менавіта з гэтага часу беларуская ідэя, як філасофія беларуса, яго светапогляд і светаадчуванне, пачала яскрава праяўляцца ў творах нацыянальнай культуры. Вядучую ролю ў культурна-нацыянальным руху пачатку XX ст. адыгрывала маладая беларуская інтэлігенцыя. Аб'яднаўшы выхадцаў з розных (пераважна непрывілеяваных) слаёў грамадства, цесна звязаная з дэмакратычнымі коламі, яна здолела стаць выразнікам ідэйна-эстэтычных тэндэнцый, што адлюстроўвалі ўяўленні беларускага народа, актыўна фарміравала яго нацыянальна-патрыятычную і мастацка-эстэтычную свядомасць.

Інтэлігенцыя невыпадкова адыгрывала галоўную ролю ў духоўным жыцці народа, абуджэнні і паглыбленні яго нацыянальнай свядомасці. На думку вядомага публіцыста пачатку XX ст. М. Славінскага, інтэлігенцыя стаіць на варце ўсіх элементаў нацыянальнай свядомасці свайго народу. Яе культурным развіццём вызначаецца ступень культуры дадзенага народа. Такім чынам, у руках інтэлігенцыі знаходзяцца ключы ад нацыянальнага лёсу таго народа, прадстаўніком якога яна з'яўляецца[13].

Гаворачы пра непарыўную сувязь культуры і інтэлігенцыі трэба адзначыць наступнае. Спецыфіку культурных з'яў вызначалі палітычныя і гістарычныя ўмовы ў нашым краі. Беларусы не мелі дзяржаўнай самастойнасці, а ў духоўных адносінах былі падпарадкаваныя праваслаўнай царкве і рымска-каталіцкага касцёлу. Яны не мелі ўстаноў, якія б цэнтралізавана накіроўвалі і матэрыяльна забяспечвалі развіццё культуры. Установы ўзніклі пазней, у выніку самаарганізацыі беларускага грамадства і добраахвотнай дапамогі ўсіх слаёў насельніцтва. У гэтым істотнае адрозненне культурнага жыцця Беларусі ад суседніх еўрапейскіх краін.

Роля маладой беларускай інтэлігенцыі як авангарда ў стварэнні новай сістэмы духоўных каштоўнасцей і эстэтычных катэгорый, у змяненні характара і форм мастацкай дзейнасці, ва ўсведамленні ролі творцы асабліва яскрава праявілася ў мастацкай лі-

таратуры. І невыпадкова. Літаратура, як найбольш дынамічны элемент дэмакратычнай культуры, заняла вядучае месца ў культуры беларускага народа пачатку ХХ ст., аказала ўплыў на развіццё іншых галін духоўнага жыцця. Менавіта ў гэты бурны час бліскуча праявіўся талент маладых пісьменнікаў – Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі (А. Пашкевіч), М. Багдановіча, А. Гаруна, Ц. Гартнага, З. Бядулі, С. Палуяна, К. Буйло, Я. Журбы і інш.

Паэзія, проза, драматургія – тры найважнейшыя галіны літаратурна-мастацкай творчасці, тры яе складовыя дасягнулі значнага развіцця ў пачатку ХХ ст. Асабліва плённа ў колькасных і якасных вымярэннях развівалася паэзія. І гэта не было выпадковай з'явай. Паэзія, як найбольш чулы да істотных грамадскіх зрухаў від мастацкай творчасці, досыць тонка адчувала пульс новай эпохі, аператыўна адклікалася на актуальныя запатрабаванні жыцця.

Адзін з аўтарытэтных гісторыкаў культуры А. Лосеў вылучыў галоўныя адраджэнскія ідэі: патрыятызм, гуманізм, культ цудоўнага. Прычым першая з іх – крыталізацыя нацыянальнай свядомасці, замацаванне яе ў формах дзяржаўнасці, нараджэнне новых жывых нацыянальных культур з лацінскай схаластычнай аднолькавасці – стала падставай, умовай для ўзвышэння чалавека ў яго гармоніі са светам, у яго вострым адчуванні радасці і прыгажосці жыцця, прыроды, быцця[14].

У той час як еўрапейскае Адраджэнне прайшло ўвесь цыкл – ад адраджэння народа, стварэння дзяржавы, мовы, культуры да адраджэнскага ідэала чалавека, то беларускае, з прычыны пэўных гістарычных абставін, нібыта спынілася. Умова стала мэтай. Адраджэнне пачало ўспрымацца як нацыянальнае адраджэнне, а патрыятычная ідэя заняла адно з вядучых месцаў у літаратуры, пачынаючы ад «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага і да паэтычных твораў «нашаніўцаў».

Гэтую рысу нацыянальнай літаратуры пачатку ХХ ст. адзначалі сучаснікі. «Ад беларускай паэзіі павявала такой шчырасцю, любоўю да роднага краю, якая захапляла і чытача», – пісаў на старонках часопіса «Вестник Европы» рускі філолаг-славіст А. Пагодзін[15]. М. Гарэцкі лічыў, што «першай прыкметай нашаніўскай пары ў літаратуры ёсць пераважнасць нацыянальных элементаў і нацыянальных матываў, лозунгаў над усім»[16].

Аб'яднаўшы свае сілы, абапіраючыся на зробленае папярэднікамі, пісьменнікі Беларусі нястомна і настойліва кансалідавалі нацыю: фарміравалі яе самабытны духоўны воблік, пашыралі свядомасць, гранілі беларускую літаратурную мову, стваралі мас-

тацкія творы сусветнага ўзроўню, вызначалі духоўныя арыенціры. Асабліва плённа працаваў у гэтым кірунку Я. Купала, якога сучаснікі называлі «цяперашнім асілкам адраджэння», што «выйшаў на літаратурную ніву з поглядамі масавага беларуса-селяніна»[17]. Назвы твораў, іх сюжэты сведчылі аб ярка патрыятычнай накіраванасці літаратурнай і публіцыстычнай дзейнасці пісьменніка, яго цікавасці да слаўнай гісторыі народа – «Курган», «З мінуўшых дзён», «Магіла льва», «Бандароўна».

Адзначаючы цікавасць беларускіх пісьменнікаў да гісторыі народа, трэба сказаць, што яна не была выпадковай. Для нацыянальна-вызваленчых рухаў усіх народаў увогуле характэрна ўвага да мінулага. Палітычнае і духоўнае абуджэнне народа звязвалася з абуджэннем народнай памяці. Адкрыццё беларусамі сябе і навакольнага свету адначасна было адкрыццём гісторыі. Таму побач з вобразам маладой Беларусі ў літаратуры ставіўся і яе старажытны вобраз.

У пачатку XX ст. беларуская культура ў цэлым дасягнула значных поспехаў. Мастацтва Беларусі пачынае выходзіць за вузкія этнаграфічныя межы, становіцца поруч з мастацтвам іншых народаў. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху, і не толькі ў Беларусі, але і ў суседніх славянскіх краінах абудзіў імкненне народа да ведаў, адукацыі. Пасля 1905 г. рэзка павялічваецца попыт на беларускую друкаваную кнігу, адкрываюцца бібліятэкі, кніжныя выдавецтвы. Менавіта ў гэты час выдаецца нямала твораў айчынных аўтараў – факт да таго беспрэцэдэнтны. Назіраецца сапраўдны ўсплеск перакладчыцкай дзейнасці. Многія таленавітыя мастакі слова лічылі сваім грамадскім абавязкам абагаціць родную літаратуру перакладам твораў з іншых літаратур свету. На беларускай мове з'яўляюцца творы рускіх, украінскіх, польскіх, нямецкіх аўтараў. Большасць з іх была надрукавана на старонках «Нашай нівы». Сярод перакладчыкаў з рускай, украінскай і польскай моў былі М. Багдановіч, Я. Купала і іншыя.

Перакладчыцкая дзейнасць пісьменнікаў Беларусі, іх літаратуразнаўчыя артыкулы, прысвечаныя выдатным прадстаўнікам славянскіх літаратур – М. Гогалю, Л. Талстому, Т. Шаўчэнку, В. Стэфаніку, М. Канапніцкай, Э. Ажэшка – былі не толькі адным са сродкаў уздыму ідэйна-эстэтычнага ўзроўня нацыянальнай літаратуры, але і прапагандай яе дасягненняў сярод іншых народаў. Назіраецца і адваротны працэс. Творы беларускіх пісьменнікаў пачынаюць перакладацца на мовы суседніх славянскіх народаў.

Хуткае развіццё мастацкага слова выклікала да жыцця літаратурную крытыку, а таксама публіцыстыку.

У публіцыстыцы А. Навіны, В. Ластоўскага, С. Палуяна, Л. Гмырака, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча была закладзеная тэорыя, філасофія і эстэтыка нацыянальнага адраджэння з яго агульначалавечым гуманізмам і нацыянальнай годнасцю, без найменшых прыкмет нацыянальнай нецярпімасці. М. Багдановіч у артыкуле «Белорусское возрождение» ўпершыню прама і непасрэдна звязаў нацыянальныя працэсы, што пачаліся ў XVI ст., з агульнаеўрапейскім Рэнесансам, калі на кантыненце пачалі фарміравацца дзяржавы, вылучацца нацыянальныя культуры, калі «пісьменнікі (на чале з Дантэ) звярнуліся да народных еўрапейскіх моў – італьянскай, французскай, нямецкай, англійскай, іспанскай». Беларускі паэт даказваў, што фарміраванне старабеларускай культуры і народнасці адбывалася ў рамках еўрапейскага Адраджэння[18]. На гэтую выснову звярталі сваю ўвагу і больш познія даследчыкі. Тым не менш, доўгі час гэтая думка ігнаравалася, а беларуская нацыянальная культура разглядалася як галіна рускай або польскай культуры.

Даволі глыбокую і цэласную канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, у аснову якой было пакладзена паняцце нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, стварыў С. Палуян. Гэтая канцэпцыя выкладзена ў серыі «нашаніўскіх» артыкулаў «З нашага жыцця», а таксама ў тэматычных артыкулах: «Беларуская літаратура ў 1909 г.», «Пра нацыянальную школу на Беларусі». Стрыжнем канцэпцыі з'яўлялася вызначэнне месца і ролі мовы ў грамадскім жыцці, у самім існаванні нацыі.

Моўнае пытанне (не толькі ў сэнсе абароны і адстойвання моўных правоў, але і стварэння агульнанацыянальнай літаратурнай мовы) было кардынальным пытаннем усяго беларускага Адраджэння пачатку XX ст. На думку С. Палуяна, галоўная задача, якую трэба было тэрмінова вырашыць – наданне роднай мове статуса дзяржаўнай. «Калі мы паставілі сабе мэту адрадзіць наш народ на нацыянальнай глебе, то нам у першую чаргу трэба адрадзіць мову, – адзначаў С. Палуян. – Толькі адрадзіўшы мову мы зможам паставіць на цвёрды грунт наш рух. Бо нацыянальны рух, як вялікая жыццёвая гістарычная сіла можа жыць толькі тады, калі пад яго будзе падведзен такі фундамент, як гібка апрацаваная мова, ды й літаратура і навука ў гэтай мове […] Заваяваць ёй месца ў грамадстве – вось наша першая неадкладная задача»[19].

Творчасць беларускіх аўтараў разбурала стэрэатып успрымання нацыянальнай культуры як культуры, што паходзіла ад рускай, культуры залежнай і другаснай. Акрамя таго, эмацыяналь-

ны стыль многіх вершаў, публіцыстычных артыкулаў быў накіраваны на ўзмацненне ва ўспрыманні чытачоў драматычнага стану беларускай культуры, якая на працягу стагоддзяў не мела нармальных умоў для развіцця і грамадскага функцыянавання.

Фарміраванне новага нацыянальна-асветніцкага варыянта беларускай культуры адбывалася на аснове размежавання двух галоўных проціборчых дактрын. Першая зыходзіла з самабытнасці беларускай культуры, яе традыцый і спецыфічных асаблівасцей фарміравання і развіцця. Другая ўспрымала беларускую культуру як складовую імперскай расійскай культуры. Без абгрунтавання і сцвярджэння першай дактрыны, створанай на канцэптуальным даследаванні ўсяго комплексу культурнага быцця беларусаў і гісторыі фарміравання этнасу цяжка было ўздымаць пытанне пра дзяржаўнасць Беларусі. Патрэбны былі важкія аргументы для сістэматычнага абгрунтавання самабытнасці беларускай нацыі ў поўным комплексе яе гістарычнага быцця – этнічным, культурным, грамадска-палітычным.

Ідэя дзяржаўнасці Беларусі, як гаранта вольнага развіцця народа, яго культуры стымулявала імкненне вядучых культурных дзеячаў (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, браты А. і І. Луцкевічы, Я. Лёсік, А. Гарун, В. Ластоўскі і інш.) увесці беларускую культуру ў сістэму не толькі агульнаславянскай, але і еўрапейскай, актывізаваць працэс інтэграцыі нацыянальных традыцый і еўрапейскіх культурных навацый. Але для гэтага трэба было мець менавіта дзяржаўны механізм як для абароны, захавання і развіцця нацыянальнай культуры, так і для экстрапаляцыі культурных здабыткаў беларускага народа ў сусветную культурную сістэму. Праўда, пра сваю самастойную дзяржаву гаворка ў пачатку XX ст. яшчэ не ішла.

Але ідэя незалежнасці Беларусі лунала ў асяроддзі патрыятычна настроенай інтэлігенцыі, прарывалася ў паэзію і публіцыстыку: «Беларусы ўжо даўно зразумелі, што толькі незалежнасць можа адрадзіць беларускі народ, толькі праз незалежнасць Беларусь можа ўцалець ад раздзелу і асіміляцыі сваімі суседзямі»[20]. Усё зробленае беларускімі пісьменнікамі і іх аднадумцамі клалася ў падмурак пад будынак будучай Беларускай дзяржавы. У сувязі з гэтым даследчыкі сцвярджалі, што за некалькі год ім удалося зрабіць тое, што ў палякаў і расійцаў было зроблена за стагоддзі.

Значнае месца ў публіцыстыцы таго часу займала пытанне аб нацыянальнай сістэме адукацыі. У 1909 г. на старонках часопіса «Українська хата» з'явіўся артыкул С. Палуяна «Пра нацыяналь-

ную школу ў Беларусі». Аўтар лічыў, што ў такой школе выкладанне павінна весціся на роднай мове; школа павінна садзейнічаць развіццю нацыянальнай свядомасці вучняў, пашырэнню «ідэі народнага вызвалення». «Толькі адна гэта нацыяналізацыя школы можа рассекчы гордзіеў вузел беларускай блытаніны, яна адна можа вывесці беларускі народ з таго тупіка, у які завялі яго нашы ўласныя слаі сваёй антынароднай палітыкаю і паставіць яго на шлях агульначалавечага развіцця»[21].

Дарэчы, такія ж праблемы ўзнікалі не толькі перад беларусамі, але і перад іншымі славянскімі народамі, якія трапілі ў склад шматнацыянальных імперый і былі вымушаныя клапаціцца пра кансалідацыю нацыі, развіваць нацыянальны рух на шляхах дасягнення нацыянальнай незалежнасці. У гэтым працэсе асвета выконвала своеасаблівую функцыю нацыянальнай самаабароны і выступала гарантам фарміравання нацыі і стварэння нацыянальнай дзяржавы.

Абарончая функцыя асветы для бездзяржаўнай беларускай нацыі выяўлялася на двух узроўнях: па-першае, захаваць гістарычную памяць і, па-другое, выхаваць новую інтэлігенцыю, на плячах якой ляжала б задача перадаваць нацыянальную культуру наступным пакаленням. Гэта вельмі добра разумелі публіцысты. «Пакуль не народзіцца моцная свая беларуская народная інтэлігенцыя, – пісаў у 1911 г. Антон Навіна (А. Луцкевіч) – пакуль яна не здабудзе сабе належнага месца ў жыцці краю, як свядомая і салідарная група, беларускі нацыянальны рух не можа развінуцца так шырока і ўсесторонне». На думку публіцыста, толькі інтэлігенцыя «можа як належыць развіваць нацыянальную душу беларусаў, перахоўваючы ў чыстаце асаблівасці свайго нацыянальнага «я»[22].

Шчыра рупіўся, каб «узгадваць так патрэбную нам цяпер інтэлігенцыю», Сяргей Палуян. Прычым, на яго думку, гэта будуць «не багатыры, але затое людзі, багатыя маладымі сіламі і веру ў сваё дзела». Характэрна, што публіцыст вызначыў рубеж, з якога пачала ўзнікаць беларуская інтэлігенцыя: 1906 г. «Гэты год як бы паваротны ў нашым жыцці, – адзначаў ён. – Калі раней кожны год прыносіў нам адну толькі страту, калі нашая інтэлігенцыя, адрокшыся ад усяго народнага, старалася забіць народнае пачуццё ў нашых народных масах, калі з кожным годам расла лічба абрусеўшых і спольшчыных беларусаў, то цяпер справа саўсім іншы мае выгляд. Свядомая сваёй нацыянальнасці частка беларускай інтэлігенцыі робіць па сумленню сваю работу, нягледзячы на цяжкія варункі жыцця, на вялікія перашкоды»[23].

Беларускія інтэлігенты разглядалі народную культуру як носьбіта этнічнай, у т. л. моўнай, своеасаблівасці народа. Ва ўмовах Беларусі да рэвалюцыі 1905–1907 г. яна з'яўлялася важнейшай, калі не адзінай сферай самастойнага жыцця. Менавіта праз фальклор, у якім ішлі жывыя творчыя працэсы, беларусы выявілі сваю прысутнасць у еўрапейскай культуры. А народная гаворка з'явілася асноўнай крыніцай фарміравання літаратурнай мовы. На фальклорнай аснове ствараліся найбольш значныя творы ў айчыннай літаратуры і мастацтве.

Важкі ўклад у вывучэнне народнай спадчыны ўнеслі Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Нікіфароўскі, М. Доўнар-Запольскі і іншыя. Яны разглядалі фальклорны матэрыял як крыніцу ведаў пра мінулае Бацькаўшчыны і як моўную крыніцу. Этнаграфічныя зборнікі, укладзеныя беларускімі даследчыкамі, дапамагалі вярнуць народу забытыя імёны сваіх славутых продкаў, знаёмілі з гераічнымі старонкамі жыцця старажытнай Беларусі. Вялікая ўвага была звернута на гісторыю Бацькаўшчыны. Плённа працавалі ў гэтым напрамку М. Багдановіч, А. Навіна, В. Ластоўскі, С. Палуян. «Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа, – адзначаў В. Ластоўскі, – і нам каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багатая…»[24].

Выдатную ролю ў грамадскім і культурным жыцці Беларусі адыграла газета «Наша ніва» – своеасаблівая энцыклапедыя эпохі нацыянальнага станаўлення і культурна-асветнага руху. За кароткі тэрмін газета зрабіла сапраўдны цуд, вылучыўшы дзесяткі таленавітых маладых аўтараў пераважна з сялянскага асяроддзя. Нельга знайсці ніводнага нумара газеты, дзе б не было апавяданняў, вершаў, крытычных артыкулаў, лістоў Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, М. Гарэцкага, М. Багдановіча і многіх іншых. Яна з'яўлялася арганізуючым цэнтрам беларускай літаратуры. Творчасць большасці пісьменнікаў-нашаніўцаў насіла ярка акрэслены дэмакратычны характар. Яны імкнуліся ствараць літаратуру, якая б выказвала думкі і пачуцці народа, яго мары, веру ў лепшую будучыню. За першыя тры гады на старонках «Нашай нівы» было надрукавана 246 вершаў 51 паэта, 96 апавяданняў 36 пісьменнікаў.

Трымаючы ў полі зроку перш за ўсё мову і літаратуру, «Наша ніва» клапацілася пра іншыя віды мастацтва. Дзякуючы яе намаганням, былі закладзены асновы беларускага музея, наладзіўся нацыянальны прафесійны тэатр, зроблены першыя крокі для распрацоўкі беларускай музыкі, танца, архітэктуры і арнамента. На

старонках газеты ішоў працэс фарміравання мастацтвазнаўчай думкі, фальклярыстыкі, тэатральнай крытыкі. Народнасць, нацыянальная самабытнасць, этнаграфізм, адкрытасць для ўспрымання здабыткаў культуры суседніх славянскіх культур – вось асноўныя рысы матэрыялаў «Нашай нівы» на тэмы культуры.

Літаратура аказала прыкметны ўплыў на развіццё нацыянальнага тэатра, які па сваім характары і змесце ствараўся як глыбока народны. Яго з'яўленне было заканамерным ва ўмовах развіцця вызваленчага руху, фарміравання нацыі. Побач з друкаваным словам ён стаў магутным сродкам выхавання нацыянальнай самасвядомасці. Вялікая роля ў гэтым працэсе належала заснавальніку прафесійнага тэатра Ігнату Буйніцкаму. Ён цудоўна разумеў усе аспекты ўздзеяння свайго мастацтва на гледачоў, у тым ліку і такія, як абуджэнне нацыянальнай годнасці і павагі да роднай мовы і культуры. У гэтым вельмі паказальны рэпертуар створанага ім калектыву. Побач з п'есамі беларускіх, рускіх і ўкраінскіх аўтараў у ім былі шырока прадстаўлены народныя песні і танцы. Дэмакратычнасць і даступнасць такога рэпертуару цяжка пераацаніць.

Выдатны кампазітар М. Рымскі-Корсакаў лічыў, што нацыянальнасць з'яўляецца абавязковай прыкметай сапраўднага мастацтва. «Музыкі па-за нацыянальнасці не існуе, – пісаў ён, – і па сутнасці ўсялякая музыка, якую прынята лічыць агульначалавечай, усё ж нацыянальная»[25]. Аснову ж нацыянальнасці славуты кампазітар справядліва бачыў у народным пачатку. Нацыянальны песенны фальклор з'яўляўся той жывой асновай, якая абумовіла сапраўдную народнасць творчасці, напрыклад, такога кампазітара, як Л. Рагоўскі. Абапіраючыся на народную песню, ён даў найбольш дакладнае і моцнае выяўленне псіхікі і пачуццяў беларускага народа, яго прыгажосці ў музыцы. Усё гэта праявілася ў яго «Беларускай сюіце для сімфанічнага аркестра» і ў кантаце «А хто там ідзе?» на верш Я. Купалы.

У выяўленчым мастацтве побач з такімі прызнанымі майстрамі жывапісу, як У. Бялыніцкі-Біруля, пачыналі свой творчы шлях маладыя мастакі К. Каганец і Я. Драздовіч. Менавіта ў іх творчасці беларускія матывы праявіліся асабліва яскрава. Графічныя творы К. Каганца і Я. Драздовіча прасякнуты роздумам аб будучым беларусаў, аб іх імкненні да свабоды. Яны прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, ілюстравалі творы беларускіх пісьменнікаў. Творчасць гэтых мастакоў адпавядала мэтам развіцця беларускай культуры пачатку XX ст.

Гаворачы пра дзеячаў нацыянальнай культуры, варта адзначыць цікавую асаблівасць – з'яўленне постацей універсальнага плана. Напрыклад, М. Багдановіч – паэт, крытык, перакладчык; Я. Драздовіч – мастак, астраном, археолаг; К. Каганец – пісьменнік і мастак. Гэтая шматграннасць вынікала перш за ўсё з шырыні практычных задач, што стаялі перад беларускай культурай, з неабходнасці ўздыму яе ўзроўню, развіцця розных яе галін.

Найбольш буйныя прадстаўнікі культуры таго часу не толькі ўносілі канкрэтны ўклад у яе развіццё, але самі станавіліся ўвасабленнем самасвядомасці народа, сімвалам яго барацьбы. Такую ж ролю сімвалаў адыгрывалі творы мастацтва і літаратуры. Напрыклад, пра верш Я. Купалы «А хто там ідзе?» сучаснікі пісалі, што ён «можа быць, на некаторы час стане народным гімнам беларусаў».

У адным з вершаў Ф. Багушэвіч звярнуўся да інтэлігенцыі з заклікам падаць «белую руку» мазолістай руцэ мужыка і вывесці яго на шырокі светлы шлях. І маладыя дзеячы культуры адгукнуліся на заклік дудара добрымі і шчырымі справамі. Дзейнасць беларускай інтэлігенцыі была прасякнута высокім патрыятызмам, садзейнічала нацыянальнаму і палітычнаму абуджэнню беларускага народа, яго згуртаванню, аказала прыкметны ўплыў на духоўнае аблічча нацыі. Дзеячы нацыянальнай культуры выконвалі ролю своеасаблівага генератара і трансфарматара новых ідэй, форм і метадаў культурнай дзейнасці. Іх творчасць пераканаўча сведчыла, што ў масавай свядомасці, па словах М. Багдановіча, усё глыбей укаранялася ідэя аб тым, што «беларускі народ не *tabula rasa*, а самастойная нацыянальная велічыня, беларускі ж рух – жывая культурна-грамадская сіла»[26].

---

[1] Неедлы Зд. Статьи об искусстве. Л.; М., 1960. С. 497.

[2] Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Мн., 1987–1994; Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст. 2-е выд. Мн., 1998; Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У 4 т. Мн., 1999–2003; Каваленка В. А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Мн., 1975; Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1–3. Мн., 1983–1987; Музыкальный театр Белорусси: Дооктябрьский период. Мн., 1990; Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX–XX вв.). Мн., 1997.

[3] Багдановіч М. Выбр. тв. Мн.: Беларускі кнігазбор, 1996. С. 288.

[4] Мелишкевич В. У. Русско-белорусские культурные связи во второй половине XIX в. Мн., 1984; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1; Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Мн., 1991. Т. 3.

[5] Dolęga-Chodakowski Z. O Slawianszczyznie przed chrzescijanstwem oras innie pisma i listy. W-wa, 1967. S. 22.

[6] Ліс А. Беларуская ідэя адраджэння славян // Полымя. 1993. № 4. С. 213.
[7] Багушэвіч Ф. Творы. Мн., 1991. С. 16–17.
[8] Чарота І. А. Славянскасць як складнік самасвядомасці беларуса. Мн., 2001. С. 179.
[9] Багдановіч М. Зб. тв. Мн., 1995. Т. 3. С. 66.
[10] Багдановіч М. Выбр. тв. Мн.: Беларускі кнігазбор, 1996. С. 371.
[11] Наша ніва. 1913. № 30.
[12] Багдановіч М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 2. С. 231.
[13] Славинский М. А. Русская интеллигенция и национальный вопрос // Вехи. М., 1991. С. 47–48.
[14] Лосев А. Ф. Эстетика Возрождения. М., 1982. С. 47–87.
[15] Погодин А. Белорусские поэты // Вестник Европы. 1911. № 1. С. 328.
[16] Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1921. С. 133.
[17] Там жа. С. 166.
[18] Багдановіч М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 2. С. 213–217.
[19] Наша ніва. 1909. № 35–36.
[20] Беларусь. 1920. № 110
[21] Палуян С. Лісты ў будучыню. Мн., 1986. С. 42.
[22] Навіна А. На дарозе да новага жыцця // Маладая Беларусь. СПб., 1912. С. 34.
[23] Наша ніва. 1909. № 46.
[24] Власт (Ластоўскі В.). Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. Прадмова.
[25] Римский-Корсаков Н. А. Летопись моей музыкальной жизни // Полн. собр. соч. М., 1955. Т. 1: Литературные произведения и переписка. С. 217.
[26] Багдановіч М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 2. С. 103.

6.3. Беларуская культура ў люстэрку рускага і ўкраінскага друку XIX – пачатку XX ст.

Яркі ўсплеск у развіцці беларускай культуры ў пачатку XX ст. звярнуў на сябе ўвагу з боку дзеячаў культуры суседніх славянскіх народаў, і ў першую чаргу, рускіх і ўкраінскіх. І гэта зразумела.

Гісторыя беларуска-руска-ўкраінскіх узаемасувязей налічвае амаль тысячагоддзе разнастайных узаемакантактаў. Варта адзначыць, што гісторыі гэтых сувязей прысвечана вялікая літаратура. Своеасаблівым абагульненнем якой сталі апошнія працы беларускіх даследчыкаў – філолагаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў. Гэта па сутнасці першыя кнігі, у якіх па-навуковаму глыбока даследуюцца найбольш яркія фрагменты развіцця беларуска-руска-ўкраінскіх сувязей, у першую чаргу літаратурных. Абапіраючыся на вялікую крыніцазнаўчую базу, навуковыя працы папярэднікаў, аўтары з глыбокай прынцыповасцю распрацавалі тыя грані праб-

лемы, якія датычаць непасрэдна іх матэрыялаў, у параўнальна-тыпалагічным ракурсе. Мы засяродзім увагу толькі на адным з бакоў гэтых узаемасувязей – літаратурным. Менавіта літаратура стала той першай галіной айчыннай культуры, на якую звярнулі ўвагу сучаснікі па-за межамі Беларусі.

Шырока вядомыя факты добразычлівага стаўлення рускіх пісьменнікаў да беларусаў. Гісторыяй беларускага народа цікавіўся А. Пушкін, блізка да сэрца прымаючы «тихие сетования народа, издревле родного, но отчужденного от России жребиями войны»[1]. Адным з першых у рускай літаратуры звярнуў увагу на беларускага селяніна М. Някрасаў, які стварыў яго запамінальныя вобразы ў сваіх выдатных творах «Железная дорога» і «Кому на Руси жить хорошо». А. Дабралюбаў у адным з артыкулаў прадказваў сацыяльнае і культурнае адраджэнне беларускага народа, які вуснамі сваіх пісьменнікаў раскажа свету пра свой боль і гора: «Адносна беларускага селяніна справа даўно вырашаная: забіты канчаткова, так што нават страціў магчымасць скарыстання чалавечымі здольнасцямі. Не ведаем, у якой ступені няправільная гэтая думка, таму што не вывучалі спецыяльна беларускага краю; але паверыць ёй, зразумела, не можам. Цэлы край так вось узялі ды й забілі – як бы не так… Ва ўсякім разе пытанне пра характарыстыку беларусаў хутка павінна быць растлумачана працамі мясцовых пісьменнікаў»[2].

П. Бяссонаў, этнограф, публіцыст, літаратуразнаўца, спачуваючы народу «дзіўнага беларускага краю», заклікаў рускую грамадскасць уважліва ставіцца да яго самабытнай культуры, як састаўной часткі культуры ўсходніх славян.

Адзначаючы пэўную цікавасць дзеячаў рускай культуры, а таксама грамадскіх дзеячаў да Заходняга краю, трэба прызнаць, што яна ў значнай ступені была абумоўлена пэўнымі падзеямі, што мелі месца ў канцы XVIII–XIX ст. – далучэннем Беларусі да Расіі, вайной 1812 г., паўстаннямі 1830–1831 і 1863–1864 гг. На наш погляд, гэта цікавасць з боку расійскіх аўтараў да Беларусі і яе народа ў першай палове XIX ст. насіла ўсё ж выпадковы характар.

Гэта можа падацца дзіўным, але цікавасць у Расіі да Беларусі абудзілі… беларусы, якія па волі лёсу апынуліся ў Пецярбургу, Маскве, іншых культурных цэнтрах і якія скарысталі мясцовы друк як трыбуну для папулярызацыі ведаў пра сваю бацькаўшчыну. Сімвалічна, што менавіта на старонках пецярбургскага часопіса «Маяк» у 1845 г. убачыў свет шэдэўр маладой беларускай літаратуры – паэма «Энеіда навыварат».

Варта звярнуць увагу на гэтую традыцыю – праз рускі перыядычны друк на канкрэтных прыкладах з народнай творчасці фар-

міраваць грамадскую думку аб нацыянальным абліччы беларусаў. Сярод рускіх часопісаў, што распаўсюджваліся і на тэрыторыі Беларусі, былі «Северная пчела», «Денница», «Москвитянин», «Маяк», «Отечественные записки», «Журнал Министерства народного просвещения» і іншыя. На працягу XIX ст. на іх старонках з'яўляліся матэрыялы па гісторыі і этнаграфіі, напісаныя, галоўным чынам, ураджэнцамі Беларусі. Напрыклад, «Журнал Министерства народного просвещения», «Этнографическое обозрение» друкавалі артыкулы М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага, П. Шпілеўскага. Некаторыя з матэрыялаў прымушалі ўдумлівага чытача задумацца, звярнуць увагу на лёс беларускага народа і яго культуру. Так, у 1843 г. пецярбургскі часопіс «Маяк» змясціў на сваіх старонках артыкул «Два слова пра мову і пісьменнасць Белай Русі», аўтарам якога лічыцца выкладчык Полацкага духоўнага вучылішча І. Цытовіч. Апошні з навуковай дасведчанасцю і пачуццём нацыянальнай годнасці разважаў пра арыгінальнасць беларускай мовы, на якой «значная частка народа… доўга яшчэ гаварыць будзе», звяртаў увагу на яе мастацкія вартасці, заклікае садзейнічаць яе пранікненню «ў самыя крайнія класы бедных беларусцаў, хоць уласна для іх у нас нічога не пішацца»[3]. У заўвазе да гэтага артыкула рэдакцыя часопіса адзначала: «Усе адукаваныя рускія даўно ўжо зразумелі наеабходнасць вывучэння беларускай мінуўшчыны і пісьменнасці, але дагэтуль яно заставалася краем некранутым, тады як ён не менш за іншыя багаты. Фальшывы сорам за сваю радзіму – куды, маўляў, ёй лезці за іншымі. Дай жа, каб з лёгкай рукі П. Цытовіча гэты артыкул паслужыў добрым пачынам будучых поспехаў паэзіі, гісторыі і пісьменства Белай Русі…»[4].

Яркім прадстаўніком такіх «рускіх беларусаў» быў П. Шпілеўскі. Сын свяшчэнніка з Бабруйшчыны, выхаванец сталічнай духоўнай акадэміі, ён пэўны час працаваў у Галоўным педагагічным інстытуце, дзе і пазнаёміўся з прадстаўнікамі пецярбургскай дэмакратычнай інтэлігенцыі.

Шчыры патрыёт Беларусі, улюбёны ў мясцовы фальклор, нястомны яго збіральнік П. Шпілеўскі быў цесна звязаны з літаратурным жыццём паўночнай расійскай сталіцы і выступаў на старонках газет і часопісаў і як «адкрывальнік» Беларусі, і як тыповы пецярбургскі журналіст, тэатральны крытык, рэпарцёр, аўтар літаратурных твораў. Напісаныя ім матэрыялы часта з'яўляліся ў такіх выданнях, як «Русский мир», «Сын Отечества», «Искусство», «Музыкальный и театральный вестник», «Иллюстрация», «Современник», «Пантеон». На старонках двух апошніх убачылі свет

самыя значныя працы П. Шпілеўскага: «Падарожжа па Палессі і Беларускаму краю» і «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках».

Бадай, упершыню ў рускім друку з'явіліся матэрыялы, што давалі панараму беларускага жыцця ў яе рознакаляровасці. Як трапна заўважылі даследчыкі, у гэтых матэрыялах «запахла Беларуссю»[5]. Дзякуючы гэтым і іншым працам П. Шпілеўскага вобраз Беларусі з сярэдзіны XIX ст. становіцца, хай і невялікай, часткай не толькі «народнай тэмы» рускай літаратуры, але і рускай грамадскай свядомасці.

Сёння, як і сто пяцьдзесят гадоў назад можна сутыкнуцца з рознымі ацэнкамі светапогляду П. Шпілеўскага. З аднаго боку, на яго нападалі рускія кансерватары, з другога – рэзка і справядліва крытыкавалі прадстаўнікі дэмакратычных колаў (палеміка вакол «Заходнерускіх нарысаў»). Нельга адмаўляць аднаго – П. Шпілеўскі быў адным з тых першых аўтараў, які «адкрыў» Беларусь расійскай грамадскасці. Яго творы, прысвечаныя сваёй бацькаўшчыне, сцвярджалі самабытнасць беларускага народа, садзейнічалі фарміраванню нацыянальнай культуры[6].

У кагорце беларускіх аўтараў, якія зрабілі важкі ўклад у азнаямленне рускай грамадскасці з Беларуссю і яе культурай, пачэснае месца належыць У. Сыракомле (Кандратовічу) – паэту, перакладчыку, крытыку, краязнаўцу. Уся яго творчасць была цесна звязана з гісторыяй роднай зямлі, з вераваннямі, звычаямі і вуснай паэзіяй народа. Сувязь яго твораў з фальклорам выяўлялася ў перакладах і апрацоўкай народных песень. Ужо першы верш У. Сыракомлі звярнуў на сябе ўвагу ў Расіі. Вядомы паэт Л. Трэфалеў пераклаў яго на рускую мову. Гэты верш лёг у аснову надзвычай папулярнай і сёння рускай народнай песні «Ямщик».

У апошняй чвэрці XIX ст. на старонках расійскіх навуковых часопісаў сталі ўсё часцей з'яўляцца артыкулы беларускіх даследчыкаў, прыхільнікаў эвалюцыйнага кірунку ў этналогіі – М. Доўнар-Запольскага, У. Дабравольскага, Я. Карскага, Е. Раманава, А. Сержпутоўскага. Разам з духоўнай і матэрыяльнай культурай яны вывучалі сацыяльную культуру беларусаў, паказвалі яе развіццё ад простых форм да больш складаных. Пры гэтым многія з іх усебакова абгрунтавалі погляд на беларускі народ, як асобную і самастойную этнічную супольнасць.

І хаця ў матэрыялах рускага друку, асабліва ў пачатку і сярэдзіне XIX ст., Беларусь успрымалася толькі як пэўная этнаграфічная зона вялікай імперыі, а яе культура, як варыянт рускай, нельга недаацэньваць самога звароту рускай грамадскасці да За-

ходняга краю, яго асаблівасцей. Усе гэтыя матэрыялы падрыхтавалі глебу для новага ўспрымання Беларусі ў пачатку XX ст.

Як ужо адзначалася, менавіта тады, на пачатку XX ст., беларуская культура выходзіць за вузкія этнаграфічныя межы і становіцца поруч з культурамі іншых еўрапейскіх народаў. На культурным небасхіле яскрава заззялі зоркі Я. Купалы, Я. Коласа, Э. Пашкевіч (Цёткі), М. Багдановіча, І. Буйніцкага і іншых.

Першымі звярнулі ўвагу на Я. Купалу тыя з рускіх аўтараў, якія не былі абыякавымі да лёсу народаў нацыянальных ускраін і добразычліва ставіліся да развіцця іх культур. Адным з іх быў пісьменнік М. Горкі. З яго імем звязана адкрыццё ў Расіі таленту Я. Купалы. Знаёмства рускага пісьменніка з вершам Я. Купалы адбылося ў 1910 г. Знаходзячыся на Капры, ён сустрэўся там з беларускім настаўнікам А. Посахам. Апошні прачытаў М. Горкаму вершы «А хто там ідзе?» і «Мужык». Па ўспамінах А. Посаха, пісьменнік быў у захапленні ад прастаты паэзіі Я. Купалы, ад незвычайнай павагі да простага чалавека[7]. Пасля вяртання ў Расію, Посах паслаў М. Горкаму купалаўскі паэтычны зборнік «Жалейка». З таго часу М. Горкі стаў цікавіцца творчасцю беларускіх аўтараў і беларускім друкам. У верасні 1910 г. ён звярнуўся ў рэдакцыю «Нашай нівы» з просьбай прыслаць яму песню «А хто там ідзе?» з нотамі. У лістападзе таго ж года ў лісце да свайго ўкраінскага калегі Ю. Кацюбінскага М. Горкі адзначаў: «У Беларусі ёсць два паэты – Якуб Колас і Янка Купала – вельмі цікавыя хлопцы! Так прымітыўна-проста пішуць, так пяшчотна, сумна, шчыра. Нашым бы крыху такіх якасцяў!»

Сярод першых актыўных прапагандыстаў паэзіі Я. Купалы быў А. Карынфскі. Яго пяру належаць пераклады 16 вершаў паэта. Яны друкаваліся ў 1913–1916 гг. на старонках часопісаў «Весь мир», «Трезвая жизнь», «Педагогический листок». Апошні друкаваў матэрыялы для выхаваценяў і народных настаўнікаў. А. Карынфскі імкнуўся прадставіць паэзію песняра на рускай мове, захоўваючы сэнс і мастацкія асаблівасці арыгінала.

Прафесар А. Пагодзін, выказваючыся ў падтрымку беларускага літаратурнага і грамадскага руху, змясціў на старонках часопіса «Вестник Европы» артыкул «Беларускія паэты», які пазней быў перадрукаваны «Нашай нівай». Алегарычны вобраз вучонага, які параўноўваў творчыя сілы народа з засохлымі зярняткамі, што праз стагоддзі нябыту захавалі сваю моц і далі ўсходы, як толькі трапілі ў спрыяльныя ўмовы, паслужыў зыходным матывам для верша М. Багдановіча «Санет», прысвечанага А. Пагодзіну. Звяр-

таючыся са старонак «Нашай нівы» да беларускай моладзі, А. Пагодзін заклікаў яе працаваць на ніве нацыянальнага адраджэння, нягледзячы ні на якія перашкоды, бо павінна перамагчы перадавое, «іначай жыццё супярэчыла б самому сабе і зніштожылася»[8].

Сведчаннем прызнання беларускага мастацкага слова, таго, што яно пачало ўваходзіць у рускія навуковыя выданні і энцыклапедыі, з'яўляецца такі прыклад. Прызнаны гісторык і даследчык літаратуры С. Вянгераў, працуючы над адным з тамоў гісторыі літаратуры, у 1913 г. звярнуўся да Я. Коласа з просьбай напісаць аўтабіяграфію для гэтага выдання[9]. А прэстыжны энцыклапедычны даведнік Бракгаўза і Эфрона змясціў на сваіх старонках артыкул «Белорусское движение».

Уздым беларускага вызваленчага руху ў пачатку XX ст., актывізацыя грамадска-палітычнага і культурнага жыцця пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг., дасягненні рускага і ўкраінскага тэатраў паспрыялі цікавасці беларусаў да сцэнічнага мастацтва. На хвалі гэтай цікавасці і ўзнік мастацкі калектыў пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага, які ўвайшоў у гісторыю нацыянальнай культуры як першы прафесійны тэатр. Майстэрству яго артыстаў апладзіравалі гледачы не толькі беларускіх гарадоў і вёсак, але і Варшавы, Пецярбурга.

У расійскай сталіцы калектыў І. Буйніцкага выступаў двойчы: у лютым 1911 г. і снежні 1912 г. Абодва выступленні прайшлі з трыумфам. Цікавым падаецца рэакцыя пецярбуржцаў на гастролі беларускага тэатра. «Як выйшаў Буйніцкі са сваімі танцорамі і сялянамі-беларусамі – дударом, цымбалістам і скрыпачом, – па-простаму паварочваючыся, дык гэтага адразу прынялі ўсе захапленнем, – усе, хто там быў ударылі ў ладонькі. А калі Буйніцкі з дачкой пайшоў «Лявоніху», а за ім чарада хлопцаў з дзяўчатамі, як пачалі прытупваць, падскокваць, дык уся публіка – тысяч восем народу – як ударыла ў ладонькі, як закрычала «брава, брава, беларусы»… Найбольш публіка біла «брава» беларусам за іх народную натуральную прастату. Буйніцкаму паднеслі лаўровы вянок з чырвонай стужкай і каштоўны падарунак». Карэспандэнт «Нашай нівы» на заканчэнне свайго рэпартажу 4 студзеня 1913 г. адзначаў: «Ніколі і нідзе не бачыў, каб гэтак што спадабалася пецярбуржцам, як беларускія танцы… Потым публіка распытвалася ў Буйніцкага – скуль і якія гэта беларусы з'явіліся? Бо раней іх не чуваць было».

Беларуска-ўкраінскія культурныя кантакты ў адрозненне ад руска-ўкраінскіх ці беларуска-польскіх сувязей другой паловы XIX ст. яшчэ не праходзілі як працэс, г. зн. як сукупнасць паслядоўных дзеянняў, накіраваных на дасягненне пэўнага выніку.

Поўная адсутнасць нацыянальнага перыядычнага друку ў Беларусі і Украіне (акрамя яе заходняй часткі, што ўваходзіла ў склад Аўстра-Венгрыі) не дазваляла знаёміць чытачоў з культурнымі здабыткамі суседзяў у розных галінах. Што да літаратуры, то ўплывы адной на другую былі вельмі нязначнымі. Як прыклад можна ўспомніць хіба што беларускую «Энеіду навыварат», створаную пад уплывам розных пераапрацовак «Энеіды» рымскага аўтара Вергілія, і ў першую чаргу «Енеїды» ўкраінскага пісьменніка І. Катлярэўскага. А таксама некаторыя творы Ф. Багушэвіча, якія, відаць, узніклі ў выніку знаёмства беларускага паэта з творчасцю Т. Шаўчэнкі.

Даволі плённым для знаёмства Т. Шаўчэнкі з беларускай культурай і асобнымі яе прадстаўнікамі аказаўся час знаходжання ў расійскай сталіцы. Тут знаходзілася нямала беларускіх палітычных і культурных дзеячаў. З некаторымі з іх Т. Шаўчэнка пазнаёміўся даволі блізка. Да іх ліку належалі пісьменнік Я. Баршчэўскі, Р. Падбярэзскі – пазней вядомы літаратар і выдавец, беларускі пісьменнік канца XIX – пачатку XX ст. Р. Зямкевіч, які асвятліў на падставе не дайшоўшых да нас дакументаў, гэту старонку біяграфіі Кабзара, адзначае, што з Р. Падбярэзскім і іншымі прадстаўнікамі беларускай культуры, Т. Шаўчэнка сустракаўся даволі часта. Р. Падбярэзскі, які ведаў шмат народных беларускіх песень, выконваў іх на роднай мове, а таксама чытаў украінскаму паэту беларускія творы Я. Баршчэўскага, «Энеіду навыварат». Апошнюю Т. Шаўчэнка ацаніў даволі высока, разглядаючы яе як арыгінальны твор беларускай культуры, у якім, параўнальна з іншымі літаратурнымі творамі таго часу, найбольш змяшчаецца «чыста беларускага элемента»[10].

Украінскі паэт не толькі ведаў і любіў беларускія народныя песні, але і выкарыстоўваў у мастацкай пераапрацоўцы ў сваіх творах некаторыя з іх[11].

Прыведзеныя адзінкавыя факты літаратурных кантактаў паміж беларусамі і ўкраінцамі паказваюць наколькі адчувальным было культурнае размежаванне двух народаў у XIX ст. Менавіта таму найбольш актыўнай задачай беларуска-ўкраінскіх кантактаў гэтага часу была ліквідацыя духоўнага бар'ера, што аддзяляў адзін народ ад другога.

А вось узаемаазнаямленне ў галіне гуманітарных навук – гісторыі, этнаграфіі, фальклярыстыкі і мовазнаўства – выявілася больш яскрава. Узаемная ўвага да быту, народнай культуры асабліва праявілася ў апошняй трэці XIX ст. Этнаграфічныя матэрыялы пра Беларусь

асабліва часта з'яўляліся ў перыядычных выданнях, што друкаваліся ў Заходняй Украіне. І гэта невыпадкова. Заходняя Украіна або Галічына ў другой палове XIX – пачатку XX ст. уваходзіла ў склад іншай дзяржавы – Аўстра-Венгерскай імперыі, дзе ўмовы для развіцця ўкраінскай культуры, мовы, украінамоўнага друку былі больш спрыяльнымі, у адрозненне ад Усходняй Украіны.

У многім дзякуючы заходнеўкраінскім газетам і часопісам грамадскасць Украіны пачала, хаця і паволі, знаёміцца з беларусамі – іх гісторыяй, звычаямі, традыцыямі, культурай. Першымі даследчыкамі, што дакрануліся да гэтай вельмі цікавай праблемы, былі Т. Кабржыцкая і В. Рагойша. У сваёй кнізе «Карані дружбы» яны зрабілі, на нашу думку, грунтоўны аналіз эвалюцыі поглядаў ва ўкраінскім перыядычным друку на беларускі народ і яго культуру ў апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст.[12]. Ужо назвы «беларускіх» матэрыялаў, што з'яўляліся на старонках львоўскіх газет і часопісаў, падкрэслівалі іх этнаграфічны характар[13].

Для навукова-культурнага ўзаемаазнаямлення двух народаў асаблівую каштоўнасць мелі тыя публікацыі, у якіх украінскія і беларускія матэрыялы стаялі поруч. Яшчэ А. Рыпінскі ў сваім даследаванні «Беларусь», што ўбачыла свет у Парыжы ў 1840 г., родныя песні параўноўваў з украінскімі, узнаўляючы іх па памяці, або беручы з кнігі «Pieśni polskie i ruskie ludu galickiego», выданай у Львове ў 1833 г.

Увогуле беларускія і ўкраінскія песні стаялі побач у многіх іншых выданнях[14]. Гэта заўвага тычыцца матэрыялаў па гісторыі і этнаграфіі. Акрамя асобных выданняў, такія матэрыялы, што аб'ядноўвалі ўкраінскую і беларускую тэматыку публікаваліся на старонках вядомых часопісаў: расійскіх – «Отечественные записки», «Вестник знания», «Русское богатство», польскіх – «Wisła», «Athenaeum», «Zbior wiadomości do antropologii krajowej». Вышэйназваныя выданні распаўсюджваліся як на тэрыторыі Беларусі, так і Украіны[15].

Неаднойчы матэрыялы пра Беларусь з'яўляліся на старонках часопіса «Киевская старина» (1882–1906). У прыватнасці, у ім былі надрукаваны даследаванні, аглядныя артыкулы, прысвечаныя беларускаму фальклору, рэцэнзіі на работы П. Шэйна, Е. Раманава, М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча, Я. Карскага.

Пасля жорсткага падаўлення рэвалюцыі 1905–1907 гг. многія прадстаўнікі ліберальнай буржуазіі сталі на шлях здрадніцтва. Маскіруючыся раней пад «сяброў народа», падзяляючы на словах яго сацыяльныя і нацыянальна-вызваленчыя імкненні, цяпер яны пачалі адкрыта прапагандаваць варожыя народам Расіі погляды.

Так, на старонках рэакцыйнага друку разгортваецца сапраўды паход супраць беларускай мовы. З адмовай права беларусаў на развіццё нацыянальнай літаратуры выступілі не толькі мясцовыя выданні, такія як «Минское слово», «Виленский вестник», але і пецярбургскія, у прыватнасці «Новая Русь». А «Московские ведомости» ў № 108 за 1912 г. змясцілі напісаны з чарнасоценных пазіцый артыкул Л. Волкава «Украінства і беларускі сепаратызм». Падзяляўшы падобныя погляды газета «Киевлянин», якая распачала псеўданавуковую палеміку з «Киевской стариной», яшчэ ў 1900 г. даказвала, што ў выпрацоўцы сваёй нацыянальнай мовы, літаратуры і культуры быццам бы «няма ніякай патрэбы ні для большай часткі маларосаў, ні для ўсіх беларусаў»[16]. Такі погляд падзялялі і галіцкія масквафілы, што яскрава пацвярджае выдадзеная ў Львове ў 1908 г. кніга Н. Антаневіча «Гісторыя Белай Русі і беларусы».

І ўсё ж галоўную ролю ва ўкраінска-беларускім ўзаемаазнаямленні ў пачатку XX ст. пачынае адыгрываць украінскамоўны і беларускамоўны друк. Яго нараджэнне – адзін з важных вынікаў рэвалюцыі 1905–1907 гг. Ён быў розных кірункаў, але гэта было люстра тагачаснага жыцця двух народаў, святло ад якога адбівалася далёка за межы Украіны і Беларусі. Праўда, у той час як у Беларусі выдавалася на роднай мове толькі адно перыядычнае выданне – «Наша ніва», то ва Украіне – значна больш. Пасля 1905 г. да выданняў, што друкаваліся ў Львове, дадаліся газеты і часопісы, якія выходзілі ў Кіеве – «Рада», «Українська хата», «Неділя», «Дніпрові хвилі» і іншыя. Вышэйназваныя выданні аператыўна і сістэматычна рэагавалі на грамадскія і літаратурныя з'явы, паведамлялі аб новых творах беларускай літаратуры, змяшчалі на сваіх старонках агляды і рэцэнзіі, а таксама пераклады мастацкіх твораў

Паміж асобнымі беларускімі і ўкраінскімі выданнямі амаль адразу ўсталяваліся цесныя кантакты. Можна сцвярджаць, што з часу з'яўлення нацыянальнага друку ён становіцца важнейшай крыніцай звестак пра беларускі народ, яго культуру. Менавіта ўкраінскі друк пачынае адыгрываць галоўную ролю па наладжванні пастаянных і трывалых украінска-беларускіх сувязей.

Як толькі пачалі выходзіць першыя нумары «Нашай долі» і «Нашай нівы», яны адразу трапілі ў поле зроку ўкраінскіх выданняў. У некаторых з іх з'явіліся рэкламныя аб'явы: «Усе каму дорага і блізка справа жыцця і адраджэння Беларусі і беларусаў выпісвайце, чытайце і шырце беларускую газету «Наша ніва». І сябры газеты, шчырыя прыхільнікі Беларусі выпісвалі яе. Адзначым, што беларускую газету ва Украіне выпісвалі ў Кіеве, Харкаве,

Екацярынаславе (Днепрапятроўску), Адэсе, Львове, Канатопе, а таксама ў Палтаўскай, Валынскай, Чарнігаўскай губернях.

Своеасаблівым рэтранслятарам «Нашай нівы» ва Украіне сталі ўкраінскія выданні, і ў першую чаргу, кіеўская газета «Рада». На падставе нашаніўскіх матэрыялаў яна друкавала паведамленні пра ўсе больш менш значныя падзеі ў культурным жыцці беларускага народа, надаючы асаблівую ўвагу культурна-асветніцкім захадам маладой беларускай інтэлігенцыі. Так, яна паведамляла пра заснаванне ў Вільні школьнага таварыства «Беларуская Маці», «што мае на мэце асноўваць беларускія школы». А таксама выдавецкай суполкі «Наша хата», «якая будзе друкаваць кніжкі патрэбныя для беларускай пачатковай навукі». Гэта кіеўская газета паведаміла ўкраінскім чытачам пра выхад у свет першых беларускіх часопісаў: у Пецярбургу – «Белорусский учитель» і «Маладая Беларусь», у Вільні – «Саха», у Мінску – «Лучынка». На тэму з'яўлення беларускіх перыядычных выданняў яна надрукавала некалькі артыкулаў. У адным з іх – «Асветніцкія захады беларусаў», яе аўтар Е. Вічэнка адзначаў: «Беларусы ступілі на пэўны шлях, што выведзе іх у вольны, шырокі свет паміж культурнымі народамі, і украінцы, якія робяць тую самую справу сярод свайго народу, могуць толькі прывітаць асветніцкія захады беларускай інтэлігенцыі і пажадаць ёй поспеху. У добры час!». У раздзеле «Тэатр і музыка» ўкраінская газета распавядала пра «беларускія вячоркі», дзейнасць першага беларускага прафесійнага тэатра І. Буйніцкага і пастаноўку на яго сцэне п'ес украінскага аўтара І. Крапіўніцкага[17].

Пастаянная ўвага да гісторыі і культуры Беларусі была характэрна для выданняў як Усходняй, Цэнтральнай Украіны, так і Заходняй – Галічыны. Беларускія матэрыялы з'яўляліся на старонках «Рады», «Руслана», «Українськоï хати», «Літературно-наукового вісника», «Дніпрових хвиль».

Беларускі і ўкраінскі друк, што нарадзіўся ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. адыграў пэўную ролю ў абуджэнні і паглыбленні нацыянальнай свядомасці беларусаў і ўкраінцаў, што ішло ў рэчышчы агульнадэмакратычнага руху, які ахапіў усе народы імперыі. Аднак у тых з'явах культурнага жыцця, грамадска-палітычнай дзейнасці, што былі выразнікамі гэтага нацыянальнага ўздыму вызначаліся розныя плыні. Пафас заклікаў, з якімі інтэлігенцыя звярталася да народа залежаў ад таго, наколькі аўтары былі дзейсна звязаны з працоўнымі масамі, выказвалі іх імкненні, выяўлялі іх жыццёвыя інтарэсы.

Важную ролю ў разгортванні і ўмацаванні цікавасці ўкраінцаў да беларусаў адыграў вядомы вучоны, прафесар Львоўскага

універсітэта І. Свянціцкі. Цікавасць да культуры беларускага народа абудзілася ў будучага вучонага яшчэ ў часе навучання ў Пецярбургскім археалагічным інстытуце. Гэты інтарэс узмацніўся пасля знаёмства з Цёткай, якая знаходзілася ў Львове ў эміграцыі. Яна дапамагала маладым вучоным, што групаваліся вакол гэтай навучальнай установы, пазнаёміцца з беларускай культурай, і ў прыватнасці з літаратурай, фальклорам. У адной са сваіх прац І. Свянціцкі пісаў пра той час: «Успамянуць тут належыць Цётку (Пашкевіч-Кейрыс), якая пражыла ў нас у Львове некалькі год і пастаянна ўносіла настрой і кірунак думкі». Далей ён заўважаў, што беларуская паэтка выступала «ўсюды, як адважная рэвалюцыянерка, супраць усялякага выгнячэння і ўсялякай няпраўды»[18]. У 1906 г. І. Свянціцкі надрукаваў шэраг артыкулаў у львоўскіх газетах пад назвай «Листи галичаніна», у якіх праводзіў паралелі паміж культурным жыццём Беларусі і Заходняй Украіны. У 1907 г. І. Свянціцкі сустрэўся з Я. Купалам, і апошні перадаў яму свае вершы «Што ты спіш?» і «Там». Украінскі вучоны ў хуткім часе апублікаваў гэтыя вершы, пазнаёміўшы такім чынам украінскага чытача з маладым беларускім паэтам. У 1908 г. у Львове ўбачыла свет кніга І. Свянціцкага «Відроженне білоруського письменства». Гэта была першая даволі грунтоўная крытычная работа аб беларускай літаратуры, выдадзеная ва Украіне. Праца ўкраінскага даследчыка атрымала станоўчую ацэнку ў асяроддзі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі.

Такім чынам, на рубяжы XIX–XX стст. беларускую культуру сталі часцей заўважаць у еўрапейскай культуры. У той час пра культурныя здабыткі беларусаў украінцы часцей за ўсё дазнаваліся праз рускае і польскае друкаванае слова. Гэтае культурнае пасрэдніцтва, вядомае яшчэ з сярэдзіны XIX ст., прыкметна пашыраецца да пачатку XX ст. «Беларуская тэма» становіцца арэнай бітвы прагрэсіўных і рэакцыйных сіл у рускай і польскай грамадскай думках. З нараджэннем у выніку рэвалюцыі 1905–1907 гг. украінскага нацыянальнага друку менавіта ён становіцца найглыбейшай крыніцай звестак пра беларускі народ, яго культуру. Важную ролю адыграла ў справах узаемаазнаямлення і дзейнасць украінскіх даследчыкаў: І. Франко, І. Свянціцкі, І. Крып'якевіч унеслі значны ўклад у развіццё як украінскай, так і беларускай навукі і культуры, сцвердзіўшы яшчэ раз жыццядзейнасць і плённасць двух народаў.

---

[1] Пушкин А. С. Собр. соч.: В 10 т. М., 1976. Т. 6. С. 84.

[2] Добролюбов Н. А. Литературная критика: В 2 т. Л., 1984. Т. 2. С. 268.

[3] Маяк. 1843. Т. IX.

[4] Маяк. 1843. Т. IX. Кн. XVIII. С. 33–38.

[5] Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Мн., 1993. Кн. 1. С. 387.

[6] Кузняева С. А. Русская дореволюционная печать и советское литературоведение о Павле Шпилевском // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиографии. Мн., 1981.

[7] Посах А. Мае сустрэчы з народным паэтам // Янка Купала: Зб. матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці народнага паэта Янкі Купалы. Мн., 1952. С. 58.

[8] Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Мн., 1994. Кн. 2. С. 10.

[9] Колас Я. Зб. тв.: У 12 т. Мн., 1964. Т. 12. С. 19.

[10] Зямкевіч Р. Тарас Шаўчэнка і беларусы // Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн., 1964. С. 31.

[11] Там жа.

[12] Кабржыцкая Т. В., Рагойша В. П. Карані дружбы: Бел.-укр. літ. узаемасувязі пачатку XX ст. Мн., 1976.

[13] Бела-Вежа // Зоря Галіцька. 1856. № 50; Стадольскі Э. Этнаграфія славяншчыны. Беларусіны // Школьна часопись. 1887. № 13–16; Драгоманов М. Наукові метод в етнографіі // Товариш. 1888. № 1; Свято великодня у білорусів і литовців // Галіцька Русь. 1891. № 24–25; Хванько А., Крымські. Те се про білорусофільство в Росіі // Народ. 1892. № 5–6; Староженко А. Побачене у Несьвізькому замку // Слово. 1866. № 55.

[14] Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае. Вильно, 1860; Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-русском крае. СПб., 1872–1879. Т. I–VII; Сборник малорусских и белорусских песен (Гомельского уезда), записанных для голоса с аккомпонементом фортепиано. СПб., 1880.

[15] Фон Компенгаузен. Замечания о Молдавии, Бессарабии. Крыме, Белоруссии и Украине // Журнал новейших путешествий. 1810. № 1–2; Головацкий Я. Львов и Могилев // Слово. 1879. № 125; Рождественские обряды и обычаи в Таврической губернии (у малоросов, белорусов и греков) // Московские ведомости. 1890. № 356; Ящуржинский Х. Обрядности, касающиеся жатвы хлеба (преимущественно в Малороссии и Белоруссии) // Известия XI Археологического съезда в Киеве. 1899. № 9.

[16] Киевлянин. 1900. № 293–295 і інш.

[17] Гл.: Кабржыцкая Т. В., Рагойша В. П. Карані дружбы. Мн., 1976.

[18] Свенціцький І. Росквіт культурно-национального жицця Східної Білорусі. Львів, 1928. С. 21.

Раздзел 7

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ КАНФЕСІЙНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

7.1. Канфесійная палітыка на беларускіх землях пасля далучэння да Расійскай імперыі

Да прац, дзе ўпершыню была зроблена спроба прааналізаваць і вылучыць асноўны напрамак канфесійнай палітыкі ў Расійскай імперыі, можна аднесці толькі даследаванне Л. Ціхамірава. На яго думку, у веравызнаўчай палітыцы манархічная вярхоўная ўлада можа трымацца толькі на нацыянальнай рэлігіі, якой для Расійскай імперыі было праваслаўе. Аўтар лічыў, што «адзінай правільнай веравызнаўчай палітыкай манархіі можна прызнаць тую, пры якой манарх устанаўлівае рэлігійную свабоду сваіх іншаверных падданых не інакш, як у пастаяннай згодзе па гэтаму прадмету са сваёй царквой»[1]. Праз дзейнасць Расійскага Біблейскага таварыства спецыфіку рэлігійнай палітыкі Аляксандра I закрануў і А. Пыпін[2].

Асноўным напрамкам канфесійнай палітыкі царскага ўрада на далучанай тэрыторыі Беларусі і Літвы было ўсталяванне пануючага становішча праваслаўнай царквы. І даследчыкі, галоўным чынам, аддавалі перавагу менавіта яе гісторыі. Але і сярод прац па гісторыі праваслаўнай царквы канца XVIII – першай паловы XIX ст. няма такіх, якія б вывучалі стан праваслаўя і меры ўрада Расійскай імперыі па ўсталяванні яго пануючага становішча ў беларуска-літоўскіх губернях. Даследавалася толькі гісторыя асобных епархій. Сярод іх вылучаюцца працы С. Рункевіча і Н. Ізвекава[3]. Яны як бы храналагічна і тэрытарыяльна (створаная ў 1839 г. Літоўская праваслаўная епархія атрымала тэрыторыю, якая да гэтага часу ўваходзіла ў склад Мінскай праваслаўнай епархіі) працягвалі і дапаўнялі адна другую. Гісторыю Полацкай праваслаўнай епархіі з 1833 па 1839 гг. закрануў даследчык уніяцкай царквы Г. Шавельскі[4]. Што ж тычыцца Магілёўскай (Беларускай) і далейшай гісторыі Полацкай праваслаўнай епархій, то яны вывучаліся не так грунтоўна. Невялікія па памерах працы А. Сапунова, П. Гаручкі, а таксама працы, якія былі прысвечаны апісанню гэтых епархій, не даюць поўнага ўяўлення аб іх гісторыі[5].

У гэтых манаграфіях і артыкулах аўтары, на базе грунтоўна даследаваных гістарычных крыніц, разгледзелі стан праваслаўнай царквы ў беларуска-літоўскіх губернях як да 1839 г., так і пасля далучэння уніятаў да праваслаў'я. Але пры ўсіх іх імкненнях да аб'ектыўнасці, яны не выходзілі за рамкі афіцыйнага праваслаўнага пункту гледжання. Згодна з ім лічылася, што большасць насельніцтва Беларусі – рускія па нацыянальнасці і праваслаўныя па веравызнанні. Пры гэтым падкрэслівалася, што барацьба на гэтай тэрыторыі на працягу стагоддзяў паміж праваслаўем і каталіцтвам «была не толькі спаборніцтвам паміж двума веравызнаннямі, яна не менш тычылася двух народнасцей – рускай і польскай», а далучэнне уніяцтва да праваслаўя ў 1839 г. «было ударам не толькі для каталіцкай царквы, але і для нацыі польскай»[6]. Некаторы матэрыял аб межах, структуры, колькасці прыходаў, духавенства, манастыроў праваслаўных епархій у Беларусі і Літве сустракаюцца і ў працах гісторыкаў, якія прысвечаны стану праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі[7].

Даследчыкі гісторыі праваслаўнай царквы не аддзялялі ад яе стараверства. У некаторай ступені закранаў узаемаадносіны паміж праваслаўем і стараверствам у Літоўскай праваслаўнай епархіі Н. Ізвекаў[8]. Ён адзначыў, што Літоўскі праваслаўны мітрапаліт Іосіф Сямашка прытрымліваўся думкі, якая не супадала з урадавай палітыкай у адносінах да стараверaў. Мітрапаліт лічыў, што лепей захаваць з рускімі стараверамі сяброўскія адносіны і лічыць іх саюзнікамі ў супрацьстаянні з каталікамі-палякамі[9]. Старавераам прысвечана і невялікая праца П. Гаручкі[10].

У адрозненні ад іншых канфесій дарэвалюцыйная гістарыяграфія па гісторыі уніяцкай царквы была даволі вялікай[11]. Акрамя таго, асобныя аспекты гэтай праблемы разглядаліся і ў многіх вышэйназваных працах. Бо гісторыя праваслаўя, каталіцтва і уніяцтва ў Беларусі была цесна пераплецена паміж сабой. Працы, падрыхтаваныя праваслаўнымі даследчыкамі, аб'ядноўвала агульная ідэя – уніяцкае насельніцтва зберагло любоў і адданасць веры сваіх продкаў і таму яно імкнулася вярнуцца да праваслаўя. Адсюль і тэрмін, характэрны для дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі ў адносінах да уніяцкай царквы – «уз'яднанне». У гістарыяграфіі даволі грунтоўна разгледжаны меры, якія прымаліся царскім урадам па падрыхтоўцы царквы да гэтага «ўз'яднання». Але ўсё ж адзінай працай, якая паказала мэтанакіраванасць і паслядоўнасць намераў урада Мікалая I, на скасаванне уніяцкай царквы, было даследаванне М. Марошкіна[12]. Менавіта ён знайшоў і надрукаваў праект па яе скасаванні і далучэнні да праваслаўнай.

Нягледзячы на даволі вялікую колькасць прац, у дасавецкай гістарыяграфіі адсутнічаюць адказы на шэраг важных пытанняў. Напрыклад, у якой ступені уніяцкае насельніцтва было аддана сваёй веры? Якія абставіны далі магчымасць царскаму ўраду так лёгка правесці скасаванне уніі ў 1839 г.? Толькі ў некаторай ступені гэтыя пытанні закранулі Г. Шавельскі і Н. Глубакоўскі. Даследчыкі адзначалі рэлігійную індыферэнтнасць не толькі уніяцкіх вернікаў, але і духавенства. Разам з тым, яны сцвярджалі, што працэс свядомага «вяртання» ў праваслаўе быў даволі доўгім. Так, Н. Глубакоўскі сцвярджаў, што рэшткі уніяцкай самасвядомасці існавалі ў заходніх губернях да пачатку XX ст.[13].

Элементы канфесійнай палітыкі прагледжваюцца ў гэтых працах праз загады царскага ўрада, св. Сінода, дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў, якія стваралі заканадаўчую аснову для рэлігійнага жыцця тэрыторыі. Іх можна класіфікаваць па некалькіх напрамках. Сярод якіх: а) узмацненне пазіцый праваслаўнай царквы за кошт іншых канфесій; б) прывядзенне межаў і структур «замежных веравызнанняў» у адпаведнасць са структурамі праваслаўных епархій і губерній; в) спробы вырашэння пытанняў забеспячэння духавенства розных канфесій і інш. Акрамя таго, і гэта пацвярждаецца архіўнымі дадзенымі, значная колькасць загадаў не была мэтанакіраванай палітыкай урада, які быў вымушаны рэагаваць на скаргі з боку духоўных асоб рознага рангу. Аўтары, відаць зыходзячы з часу, у якім яны жылі, паказваюць у асноўным станоўчыя моманты палітыкі ўрада ў адносінах да канфесій далучанай тэрыторыі. Але ў пачатку XX ст. погляды даследчыкаў змяніліся і яны ўжо разглядалі і адмоўныя моманты гэтай палітыкі, як гэта робіцца ў працы Г. Шавельскага.

Што ж тычыцца польскай гістарыяграфіі па гісторыі уніяцкай царквы, яна заўсёды прытрымлівалася асобай думкі, якая адрозніваліся ад расійскай. Далучэнне уніяцкай царквы разглядалася адназначна, як яе «знішчэнне»[14]. Але таксама як і расійскія даследчыкі, польскія не заўважалі, або не жадалі гэтага рабіць, спецыфіку канфесійнай гісторыі Беларусі. Яна заключалася ў тым, што уніяцкае насельніцтва, у сваёй асноўнай масе, з-за шматлікіх пераходаў з адной канфесіі ў другую, не бачыла розніцы паміж трыма асноўнымі канфесіямі краю: каталіцтвам, уніяцтвам і праваслаўем.

Па прычыне таго, што каталіцтва лічылася замежным веравызнаннем у Расійскай імперыі, дарэвалюцыйная гістарыяграфія не часта звярталася да яго гісторыі. Ускладненне адносін паміж рускімі (праваслаўнымі па веры) і палякамі (католікамі) выкліка-

ла адпаведную рэакцыю з боку ўрадавых колаў. Так, уціску на каталіцкі касцёл і уніяцкую царкву ў Расійскай імперыі прысвечана брашюра «Prześladowaniu kościoła rzymsko- i grecko-katolickiego i ego wyznańców przez schizme». Гэтая праца выклікала водгукі ў замежным друку і на яе быў надрукаваны «Ответ на изданную за границей брошюру: «О преследовании схизматиками римско- и греко-католической церкви и ея последователей»[15]. Аўтар гэтага адказу паспрабаваў разбіць усе абвінавачванні, якія вылучаліся ў адносінах да праваслаўнай царквы.

Усебаковым даследаваннем XIX ст. па гісторыі каталіцкай царквы была праца Д. Талстога[16], які засяродзіў увагу на ўзаемаадносінах паміж Расійскай імперыяй і Рымам, палітыцы царскага ўрада ў адносінах да каталіцкай і уніяцкай цэркваў. Па яго словах, у пачатку XIX ст. «рускі ўрад на свае грошы ўзводзіў, аднаўляў і падтрымліваў лацінскія манастырскія цэрквы»[17], што сведчыла аб станоўчых адносінах урада да каталіцтва і уніяцтва ў гэты час. Кароткі нарыс па гісторыі каталіцтва ў Беларусі і Літве быў надрукаваны Г. Кіпрыяновічам[18]. Таксама гісторыі каталіцтва ў Літве прысвяціў свой гістарычны нарыс ксёндз К. Прапаланіс[19].

Нягледзячы на тое, што на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў дзейнічаў шэраг каталіцкіх ордэнаў, увагу дарэвалюцыйных даследчыкаў прыцягнуў толькі ордэн езуітаў. Д. Талстой, М. Марошкін, А. Сапуноў[20] пісалі аб гісторыі яго ўзнікнення і дзейнасці, узаемаадносінах паміж Расіяй і Рымам у сувязі з яго скасаваннем, разглядалі сістэму езуіцкай адукацыі і яе ўплыў на маладое пакаленне. Д. Талстой адзначаў, што з боку Кацярыны II рашэнне «пакінуць у Расіі езуітаў было важнай дзяржаўнай памылкай»[21].

Замежныя даследчыкі ў галіне канфесійнай гісторыі, як у XIX, так і ў XX ст., галоўную ўвагу звярталі на розныя аспекты гісторыі каталіцкай царквы. Адной з першых прац, прысвечаных гісторыі гэтай канфесіі ў часы Кацярыны II было даследаванне О. Тэйнера[22]. Аўтар звярнуў увагу на складаныя адносіны паміж царскім урадам і Рымам, з сімпатыяй адносіўся да палякаў, якія змагаліся за сваю веру. Праца С. Шантыра[23] закранула тыя ж пытанні. Значную ўвагу яе аўтар удзяліў становішчу уніяцкай царквы, што наогул характэрна для польскай каталіцкай гістарыяграфіі. Гісторыі каталіцкіх ордэнаў прысвечаны працы С. Заленскага і І. Гіжыцкага (псеўданімы Валыняк, Газдава) і інш.[24]. Становішчу каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі прысвяціў сваю працу і Л. Лескуер[25].

Расійскія і замежныя даследчыкі некалькі прац спецыяльна прысвяцілі ўзаемаадносінам паміж Рымам і ўрадам Расійскай ім-

перыі. Сярод іх працы А. Папова, П. Мута, А. Буду[26]. Гэтыя аўтары засяродзілі сваю ўвагу на канкардаце 1847 г. – першым і адзіным пагадненні паміж Расіяй і Рымам. А. Буду звярнуў увагу на адносіны Папы Рымскага да скасавання уніяцкай царквы, адзначыўшы, што звесткі аб Полацкім саборы 1839 г. і адступленні вышэйшага духавенства ад уніі былі для Папы Рымскага і яго акружэння вельмі балючым ударам[27].

З канца XVIII ст. каталіцкае духавенства пачало ўдзельнічаць у тайных таварыствах, дзейнасць якіх была накіравана супраць расійскіх улад. Стварэнню, дзейнасці і выкрыццю «Віленскай асацыяцыі», сярод членаў якой былі ксяндзы Ф. Цяцерскі, Зюлкоўскі і інш., прысвяціў сваю працу А. Міллер[28]. Ён, выкарыстаўшы архіўныя дакументы, успаміны, перапіску, як яе членаў, так і Вярхоўнага правіцеля Літвы князя М. Рэпніна, Літоўскага губернатара Фрызеля і інш., паказаў адносіны расійскіх улад да гэтага тайнага таварыства і прасачыў лёс яго ўдзельнікаў.

У XX ст. польскія даследчыкі працягвалі традыцыю XIX ст. – разглядалі землі заходніх губерній, як былыя польскія, і адпаведна лічылі каталіцкі касцёл і мясцовае духавенства сугуба «польскім». У цэлым, каталіцкае веравызнанне атаясамлялася з польскай нацыянальнасцю. Адносінам Рыма да паўстання 1830–1831 гг. і яго ўзаемаадносінам з царскім урадам па гэтым пытанні была прысвечана праца М. Жыўчынскага[29], які лічыў, што польскі клір павінен быў быць лаяльным да расійскага цара, каб той не распаўсюджваў праваслаўе і ў Польшчы[30]. Г. Дылянгова[31] разгледзела ўдзел каталіцкага духавенства ў канфедэрацыях і паўстаннях. І прыйшла да высноў, што вышэйшае духавенства заходніх губерняў, у шэрагу выпадкаў, пайшло на пагадненне з царскімі ўладамі, спадзяючыся пры гэтым на невялікія выгады для касцёла і вернікаў, або асабіста для сябе. Ніжэйшы клір, на думку аўтара, не заўсёды актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці. Ён быў расколаты і адна яго частка ішла на катаргу і ў ссылку, а іншыя, наадварот, заставаліся пасіўнымі.

Гэтыя высновы аўтара адвяргаюць панаваўшую ў гістарыяграфіі думку аб тым, што ўсё каталіцкае духавенства прымала актыўны ўдзел у палітычнай барацьбе. Склалася яна, відаць, пад уплывам таго, што царскі ўрад выкарыстоўваў любы ўдзел ксяндзоў і манахаў у тайных таварыствах і паўстаннях, як зачэпку для нанесення ўдара па ўплыву і багаццю каталіцкай царквы заходніх губерняў.

Невялікая колькасць прац па гісторыі пратэстантскай царквы[32] практычна не закранае пытанні канфесійнай палітыкі. Гэта

звязана з тым, што лютэранскіх і рэфармацкіх вернікаў было не шмат і ў асноўным гісторыкі аддавалі перавагу гісторыі гэтых канфесій у часы Рэфармацыі.

У савецкай гістарыяграфіі таксама з'явіўся шэраг прац, прысвечаных канфесійнай гісторыі, у тым ліку і Беларусі. Але значная колькасць іх разглядала гісторыю розных канфесій у часы сярэднявечча, або XX ст. І практычна адсутнічалі працы прысвечаныя канцу XVIII – першай палове XIX ст. Сярод прац даваеннага перыяду, нягледзячы на атэістычны напрамак развіцця гістарычнай навукі, вылучаецца праца М. Нікольскага[33]. Разглядаючы вялікі храналагічны перыяд, аўтар адзначыў палітычную ролю праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі, закрануўшы пры гэтым урадавую палітыку ў адносінах да уніятаў і стараверaў. На яго думку, менавіта ў першай палове XIX ст. праваслаўная царква з'ядналася з дзяржавай да поўнага яе паглынання апошняй[34].

У 70–80-е гг. XX ст. выйшаў шэраг прац па канфесійнай гісторыі[35]. У нейкай ступені працягвае думкі М. Нікольскага калектыўная праца «Русское православие». У асноўным яна прысвечана ролі праваслаўнай царквы ў Расіі і адносінам царскіх улад да яе, а таксама да стараверства і уніяцтва. Як і М. Нікольскі аўтары працы лічаць, што ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. адбываўся працэс далейшага ўмяшання свецкай улады ў справы праваслаўнай царквы, якая імкнулася пераўтварыць усю царкоўную арганізацыю ў разнавіднасць дзяржаўнага апарату[36]. Патрэбна зазначыць, што як на першую, так і на другую працу атэістычны напрамак практычна не аказаў ніякага ўплыву.

Адраджэнне царкоўнага жыцця ў канцы 80-х гг. XX ст. выклікала пасля доўгага панавання ў гістарычнай навуцы атэізму, цікавасць да вывучэння царкоўнай гісторыі. Улічваючы, што савецкія гісторыкі доўгі час не атрымлівалі спецыяльнай падрыхтоўкі для распрацоўкі такога рода тэм, то яны звярнуліся да дарэвалюцыйных расійскіх і польскіх даследаванняў, што аказала ўплыў на іх пункт гледжання. Некаторы ўплыў на погляды гісторыкаў аказала і цікавасць да нацыянальных праблем, перадрукоўка кніг 20–30-х гг. XX ст., у першую чаргу дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Для падрыхтоўкі даследаванняў тэарэтычнага характару і стварэння свайго пункта гледжання патрэбен быў дастаткова доўгі час і праца ў архівах, большасць з якіх пасля 1991 г. аказалася за межамі рэспублікі. Патрэбна адзначыць, што такога рода тэматыка пачала інтэнсіўна распрацоўвацца не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Украіне, Літве і іншых рэспубліках, ідучы як бы адначасова.

Шэраг артыкулаў, у якіх сабраны цікавы фактычны матэрыял і разглядаліся ўрадавыя ўказы па гісторыі праваслаўя, каталіцтва, уніяцтва, стараверства, мусульманства, іудаізму, лютэранства і кальвінізму друкаваўся ў розных зборніках матэрыялаў канферэнцый, перыядычных выданнях і часопісах: «Наш радавод», «Беларусіка», «Беларускі гістарычны часопіс», «Беларуская мінуўшчына», «Спадчына», «Беларускі гістарычны агляд», «Гістарычны альманах» і інш.

У 90-х гг. XX ст. – пач. XXI ст. з'явіліся манаграфічныя і калектыўныя даследаванні, якія былі прысвечаны асобным канфесіям, гісторыі манаскіх ардэноў у Беларусі. Сярод іх працы С. Марозавай, А. Гарбацкага, А. Філатавай, Т. Бліновай, С. Кузняевай, І. Канапацкага[37], якія ахопліваюць дастаткова вялікія адрэзкі часу і таму перыяд канца XVIII – першай паловы XIX ст. не распрацаваны ў іх у поўнай меры.

На думку аўтараў калектыўнай працы «Канфесіі на Беларусі», якія разглядаюць гісторыю ўсіх канфесій Беларусі на працягу XIX–XX стст., спробы царскага ўрада ўсталяваць пануючае становішча праваслаўнай царквы ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. былі няўдалымі, нягледзячы на ўсе складаныя для яе абставіны, самай багатай і ўплывовай заставалася да канца 50-х гг. каталіцкая канфесія[38]. А. Гарбацкі прыйшоў да высноў, што першая палова XIX ст. у гісторыі ўсяго стараверства Беларусі была найбольш складанай і праблематычнай. У гэты перыяд урад стварыў самыя жорсткія і непапулярныя ўказы і законы, якія пазбаўлялі стараверaў іх правоў[39]. С. Марозава палічыла, што самадзяржаўна-сінодавая палітыка уніфікацыі, нівеляцыі, разам з русіфікацыяй царкоўна-рэлігійных структур у Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., прывяла да страты уніяцкімі культавымі інстытутамі сваіх асаблівасцей і пераўтварэння іх у паслухмяных пашыральнікаў «истинно российской веры», якая ў дачыненні да Беларусі стала адной з праяў расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму. Запаланіўшы духоўную інфраструктуру беларускага грамадства маскоўскае праваслаў'е прыўносіла ў яго чужы нацыянальна-рэлігійны ідэал, нішчыла беларускія нацыянальныя традыцыі ў царкве. Стрымліваючы паланізацыю, імперыя, як лічыць аўтар, падвяргала Беларусь русіфікацыі і, залічваючы «ўз'яднаных» у шэраг расійскай народнасці, наносіла ўдар па яшчэ не сфарміраванай беларускай нацыянальнай свядомасці, якая абуджалася ў той час менавіта пад сцягам уніі[40].

Іншы пункт гледжання аб палітыцы адносна уніяцкай царквы прадстаўлены ў артыкуле В. Цяпловай. На яе думку, скасаванне

уніі духоўна злучыла ўсе часткі беларускага народа, якія былі расколаты уніяй, у адзінае цэлае, аднавіла яго цэласнасць. А падрыў паланізму і каталіцызму прывёў да паступовага вяртання беларусаў да вытокаў традыцыйнага для насельніцтва веравызнання, якім было праваслаўе[41].

Непасрэдна канфесійнай палітыцы царскага ўрада ў Беларусі вызначанага перыяду прысвечана манаграфія А. Філатавай, якая вылучыла і даследавала асноўныя напрамкі канфесійнай палітыкі. Сярод іх: уніфікацыя царкоўнага кіравання і структур канфессій; меры па ўмацаванні статуса праваслаўнай царквы і прававое рэгуляванне міжканфесійных адносін[42].

Палітыку царскага ўрада ў адносінах да каталіцкага касцёла разгледзеў у сваёй кандыдацкай дысертацыі І. Ганчарук[43], які адзначыў, што нягледзячы на некаторыя абмежаванні з боку царскага ўрада, каталіцкі касцёл у вызначаны час збярог свае зямельныя ўладанні і кляштары. А духавенству ўлады не перашкаджалі выконваць свае духоўныя абавязкі. С. Васовіч закрануў у сваёй дысертацыі палітыку царскага ўрада ў адносінах да адукацыі праваслаўнага духавенства[44].

На аспекты канфесійнай палітыкі адносна пратэстанцкіх канфесій звярнула ўвагу літоўская даследчыца А. Прашмантайте[45], якая вылучыла асноўныя напрамкі палітыкі па ўсталяванні агульнага кіравання і адзначыла структурныя змены гэтых канфесій.

У кастрычніку 2003 г. у Інстытуце гісторыі Літвы ў Вільнюсе адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя, якая была прысвечана канфесійнай палітыцы царскага ўрада Расійскай імперыі ў XIX ст. Матэрыялы гэтай канферэнцыі былі надрукаваны[46] і сярод іншых вылучаецца сваёй тэарэтызаванасцю артыкул беларускай даследчыцы М. Сакаловай[47]. Аўтар вылучыла асноўныя напрамкі гэтай палітыкі ў Расійскай імперыі. Сярод іх: падпарадкаванне рэлігійных інстытутаў дзяржаве; бюракратызацыя рэлігійных інстытутаў; забеспячэнне лаяльнасці падданых розных канфесій; забеспячэнне верацярпімасці; праваслаўе як дзяржаўная рэлігія.

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі выйшаў шэраг прац па царкоўнай гісторыі[48]. Канфесійную палітыку расійскіх імператараў імкнуўся разгледзець, параўнаць і вылучыць яе адрозненні ў розныя часы В. Фёдараў. Ён адзначыў, што хаця пры Аляксандры I дэкларавалася свабода веравызнання, аднак пры ўмове адданасці манархіі, а галоўнае – без уціску на інтарэсы «господствующей и первенствующей» праваслаўнай царквы. Сутнасць жа канфесійнай палітыкі Мікалая I заключалася ў намеры зацвердзіць нацыя-

нальную і рэлігійную маналітнасць краіны і ўзвышэнні ролі праваслаўнай царквы ў грамадскім жыцці[49]. На думку ж даследчыцы А. Вішленковай, рэлігійная палітыка ўрада Аляксандра I была звернута непасрэдна на падданых Расійскай імперыі. На аснове хрысціянскага экуменізму, як лічыць аўтар, была распрацавана, рэлігійная па сутнасці, праграма палітычнага і сацыяльнага развіцця краіны[50].

Сучасныя ўкраінскія даследчыкі значную ўвагу аддаюць гісторыі уніяцкай царквы. Шэраг артыкулаў па гісторыі канфесій надрукаваны ў навуковым штогодніку «Історія релігій в Україні». Праз гісторыю уніяцкай царквы паспрабавалі разгледзець даследчыкі В. Бубеншчыкаў і П. Кралюк гісторыю не толькі ўкраінскага, але і беларускага народаў. Яны прыйшлі да высноў, што скасаванне царскім урадам уніі ў 1839–1840 гг. на беларускіх землях прывяло да таго, што нацыянальнае жыццё і нацыянальная свядомасць беларусаў у XIX ст. развівалася павольнымі тэмпамі[51].

Сучасная польская гістарыяграфія па колькасці прац па канфесійнай гісторыі самая значная[52]. Адной з грунтоўных прац апошніх гадоў па гэтай тэматыцы з'яўляецца даследаванне М. Радвана. Ён разглядае скасаванне уніяцкай царквы і базіліянскага ордэна як элемент русіфікатарскай палітыкі ўрада, якая мела месца ў XIX ст. у розных формах і тычылася не толькі уніяцкіх епархій, але і Віленскага універсітэта, каталіцкіх епархій, кляштараў і парафіяльных школ[53].

Канцэптуальна пункт гледжання як польскіх, так і расійскіх даследчыкаў не змяніўся. Аўтары працягваюць разглядаць канфесійную палітыку царскага ўрада праз прызму канфесій: праваслаўнай (калі гэта тычылася Расіі), або каталіцкай (Польшчы), асабліва звяртаючы ўвагу на адмоўныя бакі адзін другога. Традыцыйным застаецца і погляд на нацыянальнае вызначэнне народаў праз канфесіі (каталікі – палякі, праваслаўныя – рускія) у дачыненні да вызначанага перыяду. Больш цікавымі, на наш погляд, хаця ў шэрагу выпадкаў і спрэчнымі, з'яўляюцца працы беларускіх даследчыкаў, а значна менш распрацаваны гэты перыяд у літоўскіх і ўкраінскіх гісторыкаў.

У сувязі з рознымі пунктамі гледжання, якія склаліся ў беларускай гістарычнай навуцы, С. Марозава прыйшла да высноў, што з сярэдзіны 90-х гадоў XX ст. беларуская навука зайшла ў тупік у трактоўцы гісторыі канфесій, бо яна не ў стане выпрацаваць адзінага зладжанага і ўзгодненага погляду. А наяўнасць сёння супярэчлівых, узаемавыключных ацэнак праваслаўя, каталіцтва,

уніяцтва толькі падкрэслівае складанасць гэтай праблематыкі. Разнадумства, ідэалагічная і канфесійная ангажаванасць даследчыкаў, на думку аўтара, якая зыходзіць з рэлігійнай, ідэалагічнай і культурнай раз'яднанасці беларусаў, ускладняе фарміраванне адзінай канцэпцыі, з'яўленне якой мела б для станаўлення беларускай нацыянальнай гістарычнай навукі вялікае практычнае і навуковае значэнне. А яе адсутнасць перашкаджае беларускай гістарыяграфіі стаць крыніцай кансалідацыі нацыі, чым з'яўляюцца польская і расійская гістарыяграфіі для сваіх народаў[54].

У такога рода выказваннях адчуваюцца навуковыя спрэчкі на канферэнцыях і ў друку беларускіх гісторыкаў, якія выказвалі розныя думкі наконт «нацыянальнай рэлігіі» беларусаў – уніяцтва. Як для палякаў – каталіцтва, а для рускіх – праваслаўе, так, на думку некаторых даследчыкаў, уніяцтва магло стаць кансалідуючай сілай для беларускай нацыі. Але існаванне розных поглядаў на гісторыю канфесій у Беларусі сведчыць хутчэй аб тым, што навука інтэнсіўна развіваецца, вывучаючы канфесійную гісторыю, і пераходзіць на новы этап ад збору і друкавання фактычнага матэрыялу да яго тэарэтызавання. На царкоўнае жыццё можна глядзець з розных бакоў: з боку урадавай палітыкі, самой канфесіі, асабліва калі з'яўляешся яе вернікам, або свецкага гісторыка.

---

[1] Тихомиров Л. А. Монархическая государственность. СПб., 1992 (упершыню выдадзена ў 1905 г.). С. 465, 489.

[2] Пыпин А. Н. Религиозные движения при Александре I. Пг., 1916.

[3] Извеков В. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889. М., 1889; Рункевич С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг). СПб., 1893.

[4] Шавельский Г. Последнее воссоединение с православной церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910.

[5] Горючко П. Материалы для истории архиерейского дома и монастырей Могилевской епархии конца XVIII и начала XIX столетия. Могилев, 1902; Горючко П. Материалы для истории Могилевского архиерейского хора (1798–1805). Могилев, 1903; Горючко П. Материалы для истории церквей Белоруссии конца XVIII и начала XIX столетий. Могилев, 1903; Горючко П. Секретари Могилевской духовной консистории. 1769–1812 гг. Могилев, 1902; Могилевская епархия. Историко-статистическое описание: В 2 т. Могилев, 1906; Жудро Ф. Основание и первые годы Могилевской духовной семинарии (1757–1880 гг.) // Виленский календарь. Вильна, 1895; Тихомиров Д. Могилевские епископы с краткими биографическими о каждом из них сведениями. Могилев, 1887; Арсеньев В. С. Из прошлого Полоцкой епархии. Витебск, 1900; Глубоковский Н. Н. Архиепископ Смарагд в его деятельности по возсоединению униатов (1833–1837 гг.) // Христианское

чтение. 1914. № 3–5; Сапунов А. Архив Полоцкой духовной консистории. М., 1898; Сапунов А. Исторические судьбы Полоцкой епархии с древнейших времен до половины XIX века. Витебск, 1889; Довгялло Д. И. Полоцкая епархия к 1903 г. Витебск, 1903.

[6] Шавельский Г. Последнее воссоединение с православной церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910. С. 380.

[7] Преображенский И. Отечественная церковь по статистическим данным с 1840–41 по 1890–91. СПб., 1897; Благовидов Ф. В. Обер-прокуроры Святейшего Синода в XVIII и первой половине XIX столетия. Казань, 1899; Покровский И. М. Русские епархии в XV–XIX в., их открытие, состав и предмет: В 3 т. Казань, 1913. Зверинский В. В. Материал для историко-топографического исследования о православных монастырях в Российской империи: В 3 т. СПб., 1890–1897 і інш.

[8] Извеков В. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889. М., 1889.

[9] Там же.

[10] Горючко П. С. Материалы для истории раскола старообрядчества в Могилевской губернии конца XVIII и начала XIX столетий. Могилев, 1902.

[11] Бобровский П. О. Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра 1. СПб., 1890; П. І. Б. Противодействие базилианского ордена стремлению белого духовенства к реформе русской греко-униатской церкви. Вильно, 1887; Шавельский Г. Последнее воссоединение с православной церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). СПб., 1910; Горючко П. С. Из истории воссоединения униатов в Белоруссии. 1780–1805 гг. Киев, 1902; Горючко П. Материалы для истории воссоединения униатов в Белоруссии. 1780–1795 годов. Могилев, 1903; Глубоковский Н. Н. Архиепископ Смарагд в его деятельности по возсоединению униатов (1833–1837 гг.) // Христианское чтение. 1914. № 3–5; Киприанович Г. Я. Жизнь Иосифа Семашки митрополита Литовского и Виленского и воссоединение западнорусских униатов с православною церковию в 1839 г. 2-е изд. Вильно, 1897; Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейших времен до настоящего времени. Вильна, 1895; Коялович М. История воссоединения западнорусских униатов старых времен. Мн., 1999; Морошкин М. Я. Воссоединение унии // Вестник Европы. 1872. Кн. 4, 6, 7, 8; Пятидесятилетие (1839–1885) возсоединения с православною церковию западнорусских униатов. СПб., 1889.

[11] Глубоковский Н. Н. Архиепископ Смарагд в его деятельности по возсоединению униатов (1833–1837 гг.) // Христианское чтение. 1914. № 4. С. 483.

[12] Морошкин М. Я. Воссоединение унии // Вестник Европы. 1872. Кн. 4, 6, 7, 8.

[13] Глубоковский Н. Н. Архиепископ Смарагд в его деятельности по возсоединению униатов (1833–1837 гг.) // Христианское чтение. 1914. № 4. С. 483.

[14] Charkiewicz W. Zmerzch unji koscielnej na Litwie i Białorusi. Słonim, 1929; Chotkowski W. Dziej zniweczenia sw. Unii na Białorusi i Litwie i w swietle pamiątników Siemaszki. Kraków, 1891; Likowski E. Dziej kościoła unickiego na Litwie i Rusi w XVIII i XIX wieku uwazane głównie ze względu na przyczyny jego upadku: W 2 cz. Warszawa, 1906. Cz. 1–2; Likowski E. Plan zniesienia kościoła greko-unickiego w Rosyi. Dokument historyczny. Kraków, 1882; Kolbuk W. Kościoły wshodnie na ziemiach dawnej Rzeczypospolitej. 1772–1914. Lublin, 1992; Kolbuk W. Kościoły wshodnie w Rzeczypospolitej okolo 1772 roku. Struktury administracyjne. Lublin, 1998.

[15] Prześladowaniu kościoła rzymsko- i grecko-katolickiego i ego wyznańców przez schizme. Lwów, 1868; Ответ на изданную за границей брошюру: О преследовании схизматиками римско- и греко-католической церкви и ее последователей. Вильно, 1874.

[16] Толстой Д. А. Римский католицизм в России: В 2 т. СПб., 1876. Т. 2.

[17] Там жа. Т. 2. С. 150.

[18] Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейших времен до настоящего времени. Вильна, 1895.

[19] Propolanis K. Polskie apostolstwo w Litwie (szkic historyczny 1387–1912). Wilno, 1913.

[20] Толстой Д. А. Римский католицизм в России: В 2 т. СПб., 1876. Т. 2; Морошкин М. Я. Иезуиты в России с царствования Екатерины II и до нашего времени: В 2 т. СПб., 1867–1870; Сапунов А. Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке. Витебск, 1890.

[21] Толстой Д. А. Римский католицизм в России. Т. 2. С. 18.

[22] Theiner O. A. Die neusten Zustande der Katholischen kirche beider Ritus in Polen und Russlandseit Katharina II bis auf unsere tage. Augsburg, 1841.

[23] Szantyr S. Wiadomości do dziejów kościoła i religii katolickiej panowanią rosyjskiemu podległych: W 2 cz. Poznań, 1843.

[24] Zaleski S. Jezuity w Polsce. Kraków, 1908; Wołyniak. Notatka o niektorych naszych siędzibach trynitarskich. Kraków, 1912; Wołyniak. Wiadomości o dominikanach prowincji Litewskiej: W 2 cz. Kraków, 1917; Wołyniak. Wykaz klasztorów dominikanskich prowincji Ruskiej: W 2 cz. Kraków, 1923; Wołyniak. Z przeszłości Karmelitów na Litwie i Rusi: W 2 cz. Kraków, 1918; Gozdawa M. Wspomnienie o pijarach witebskich. Kraków, 1909; Historia zniesienia jezuitów w Polsce i ich zachowanie na Białej Rusi. Lwów, 1875.

[25] Lescoeur L. L'Eglise Catholique en Pologne sous gouvernement russe. Paris, 1860.

[26] Попов А. Н. Последняя судьба папской политики в России. 1845–1867. СПб., 1868; История русской церкви. М., 1997. Т. 8. Ч. 2. Boudon A. Stolica swiąta a Rosia. Stosunki dyplomatyczne między niemi w XIX w.: W 2 t. Kraków, 1928–1930; Mout P. La Russie et le Saint-Siége jusqu'au concordat de 1847. Montpellier, 1930.

[27] Boudon A. Stolica swiąta a Rosia. Stosunki dyplomatyczne między niemi w XIX w. Kraków, 1928. T. 1. S. 242.

[28] Miller A. Pierwsza porozbiorowa konspiracja Litewska. Spisek ks. Ciecierskiego przeora dominicanów wileńskich (1796–1797). Studium historyczne. Kraków, 1936.

[29] Żywczyński M. Watykan wobec powstania listopadowego. Kraków, 1995 (упершыню надрукавана ў 1935 г.).

[30] Там жа. С. 59.

[31] Dylągowa H. Duchowienstwo katolickie wobec sprawy narodowej (1764–1864). Lublin, 1983.

[32] Busch G. Materialien zyr gejchechtenen statistis des kirchen und schilmefews. Spet, 1866; Busch G. Materialen zyr geshi kosciol augsburski w Wilnie. Wilno, 1888; Kosman M. Litewska jednota ewangelicko-reformowana od polowy XVII w. do 1939. Opole, 1986; Studnicki W. Kościół ewagelicko-reformowany w Wilnie. Historia – organizacja – swiątynia. Wilno, 1935; Spis synodów i sesji prowincjanych jednoty Litewskiej. 1611–1913. Wilno, 1913; Die reformatorischen Kirchen Litauens. Martin-Luter-Verlag Erlangen, 1998.

[33] Никольский Н. М. История русской церкви. Мн., 1990. (2-е выд. М., 1931.)

[34] Там жа. С. 295.

[35] Даниленко С. Т. Униаты. М., 1972; Религия и церковь в истории России. М., 1975; Русское православие. Вехи истории. М., 1989 і інш.

[36] Русское православие. Вехи истории. С. 318.

[37] Марозава С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596–1839). Гродна, 1996; Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцціі Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001; Гарбацкі А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. Брэст, 1999; Горбацкий А. А. Старообрядничество на белорусских землях. Брест, 2004; Грыгор'ева В. В.,Завальнюк У. М., Навіцкі У. І., Філатава А. М. Канфесіі на Беларусі. Мн., 1998; Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. Мн., 2006; Блинова Т. Б. Иезуиты в Белоруссии. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. Гродно, 2002; Кузняева С. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII – начале XX века. Минск, 1998; Думін С. У., Канапацкі І. Б. Беларускія татары. Мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993; Канапацкі І. Б., Смолік А. І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мінск, 2000.

[38]Грыгор'ева В. В., Завальнюк У. М., Навіцкі У. І., Філатава А. М. Канфесіі на Беларусі. Мн, 1998. С. 31.

[39] Гарбацкі А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. Брэст, 1999. С. 108.

[40] Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001. С. 164, 236–237.

[41] Теплова В. А. Время императора Николая I и цивилизационный поворот в судьбе Беларуси // Россия и Беларусь: от века XIX к веку XXI. Брест, 2004. С. 45.

[42] Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. Мн., 2006.

[43] Ганчарук І. Г. Каталіцкі касцёл на Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. 1772–1830 гг. Мн., 2005.

[44] Восович С. М. Учебные заведения православного духовного ведомства в Беларуси. Конец XVIII века – 1913 г.

[45] Die reformatorischen Kirchen Litauens. Martin; Luter; Verlag Erlangen, 1998.

[46] Metraštis XXVI. Vilnius, 2005.

[47] Соколова М. А. К вопросу о методологии изучения конфессиональной истории // Metraštis XXVI. Vilnius, 2005. С. 477–488.

[48] Римский С. В. Православная церковь и государство в XIX в. Ростов н/Д, 1998; Федоров В. А. Русская православная церковь и государство. Синодальный период. 1700–1917. Москва, 2003; Ислам в Российской империи. М., 2001; Голованов С. Католичество и Россия. СПб., 1998; Андреев А. Р. История ордена иезуитов в Российской империи XVI – начало XIX века. М., 1998; Андреев А. Монашеские ордена. М., 2001 і інш.

[49] Федоров В. А. Русская православная церковь и государство. Синодальный период. 1700–1917. Москва, 2003. С.177, 188.

[50] Вишленкова Е. Заботясь о душах подданных: религиозная политика в России первой четверти XIX века. Саратов, 2002.

[51] Бубенщиков В. В., Кралюк П. М. Греко-католицька церква в етнічній історії українського та білоруського народів. Львів, 2004. С. 153.

[52] Kolbuk W. Kościoły wshodnie w Rzecypospolitej około 1772 roku. Struktury administracyjne. Lublin, 1998; Radwan M. Carat wobec kościoła grecko-katolickiego w zaborze Rosyjskim. 1796–1839. Roma; Lublin, 2001; Zakony i klasztory w Europie środkowo-wschodniej. Lublin, 1999; Churches – States – Nations. Lublin, 2000 і інш.

[53] Radwan M. Carat wobec kościoła grecko-katolickiego w zaborze Rosyjskim. 1796–1839. Roma; Lublin, 2001. S. 142.

[54] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. С. 157, 158.

7.2. Моўнае пытанне ў рымска-каталіцкім касцёле Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.)

Сярод актуальных праблем гісторыі хрысціянскай царквы ў Беларусі, як сведчыць айчынная гістарыяграфія пачатку 90-х гг. XX ст., значнае месца заняла праблема моўнай сітуацыі ў хрысціянскіх святынях. І хаця храналагічна і тэматычна навуковая праблема «русіфікацыі каталіцкага касцёла Беларусі» вужэй, адносіцца да 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. і тычыцца рымска-каталіцкага касцёла Беларусі, яна з'яўляецца складовай часткай агульнай праблемы, вастрыня якой засталася такой жа адчувальнай і ў канцы XX – пачатку XXI ст. Праблема выклікала дыскусію не толькі

(і нават не столькі) сярод навукоўцаў, але і шырокай грамадскасці. На старонках айчыннага друку, таксама як і больш за стагоддзе назад на старонках тагачаснага расійскага друку, разгарнуліся цэлыя «баталіі». Пачатак спрэчкам (якія ўмоўна можна назваць «На якой мове гаварыць з Богам?») паклаў гісторык, вядомы прыхільнік і знаўца беларускай мовы Леанід Міхайлавіч Лыч. Яго артыкулы, прысвечаныя моўнаму пытанню ў хрысціянскіх канфесіях у гістарычным ракурсе, што друкаваліся на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», былі на той час не заўсёды дакладнымі ў навуковым сэнсе, чым выклікалі вострую крытыку з боку праваслаўнага духавенства. Разам з тым, яны з'явіліся тым каталізатарам, што падштурхнуў гісторыкаў да навуковага вывучэння праблемы. Асобныя думкі і меркаванні Л. Лыча па праблеме выліліся ў кнігу, ва ўступным слове якой, звяртаючыся да чытача, аўтар з папрокам піша: «І ў нашыя дні хрысціянскае духавенства Беларусі працягвае здзіўляць увесь цывілізаваны свет сваім упартым нежаданнем пусціць у храмы беларускае слова, весці на ім культурна-асветніцкую працу з вернікамі»[1]. Паважаны даследчык мае рацыю. Разам з тым, відаць, нельга трактаваць праблему так адназначна. Гісторыя сведчыць, што на працягу двух стагоддзяў – XIX і XX – у асяродку хрысціянскага духавенства Беларусі час ад часу з'яўляліся святары, што здзіўлялі сваёй упартасцю ў другім – перамагаючы ўсе перашкоды ўжывалі родную беларускую мову ў набажэнстве.

«Крыкам збалелай душы» назвалі ліст каталіцкага святара Уладзіслава Чарняўскага аб становішчы рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі, дасланы ў 1987 г. на міжнародную канферэнцыю ў Лодзі «Беларусы, літоўцы, украінцы, палякі – перадумовы пагаднення»[2]. Шмат прыкрасцяў і пакут за ўвядзенне ў набажэнства беларускай мовы прыйшлося яму перанесці ад тых, ад каго чакаў ён падтрымкі і дапамогі – іншых каталіцкіх святароў. Вось і нарадзіліся ў душы беларускага святара словы, што не могуць не ўзрушыць: «Чужыя пацеры, чужая царква, чужая вера, чужы святар, чужая Маці Божая і Госпад Бог чужы, або прынамсі польскі»[3]. Характарызуючы рэлігійную сітуацыю ў Беларусі на пачатку XX ст. і пазней, ён з роспаччу адзначае, што пасля Першай сусветнай вайны не далі адрадзіцца беларускаму народу: «Хто? Браты-суседзі. Славяне. «Браты ў Хрысце»… Там на «рускай веры» вырасла бязбожжа – атэізм, тут «польская вера» заткнула рот «братам у Хрысце» – Беларусам»[4].

Грамадская дыскусія 60-х гадоў XIX ст. па пытанні ўвядзення рускай мовы ў каталіцкі касцёл Беларусі атрымала даволі шыро-

кае асвятленне ў гістарычнай літаратуры, як з боку сучаснікаў тых падзей, так і з боку сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. Тым не менш ёсць патрэба звярнуць на яе ўвагу, каб зрабіць параўнальны аналіз з той дыскусіяй, што разгарнулася ў канцы XX ст. Аналіз сведчыць, што моўная праблема засталася такой жа вострай для нашай тэрыторыі, як і раней. Многае мянялася з цягам часу. І перш за ўсё адносіны да самой рэлігіі і царквы. Але, калі на постсавецкай прасторы пачалося рэлігійнае адраджэнне, то разам з вяртаннем хрысціянскіх каштоўнасцей, вярнуліся (праўда, у некалькі іншай трактоўцы) і старыя праблемы. У чым жа бачыцца падабенства і розпнае ў самой праблеме канца XIX – пачатку XX ст. і канца XX – пачатку XXI ст. і ў гістарыяграфічных падыходах да яе асвятлення?

Спачатку аб самой праблеме. На нашу думку, сама праблема і яе вастрыня засталіся, дзякуючы таму, што засталася аснова, база, на якой яна выспявала. База гэтая – нацыянальны акрас, характар рымска-каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы ў Беларусі. Формула «католік – паляк», «праваслаўны – рускі», стаўшая ў XIX ст. класічнай для нашай тэрыторыі, не простая ідэалагічная выдумка. Яна мела пад сабой рэальную падставу. За тыя стагоддзі, што пражылі беларускія землі, згубіўшы сваю дзяржаўнасць, згубілася і беларуская мова, як адзнака нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Не стала лепшай моўная сітуацыя і ў канцы XX ст. Што тычыцца каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы, то і яны па-ранейшым успрымаліся як «польская» і «руская» вера. Што і падштурхнула грамадазнаўцаў і грамадска-палітычных дзеячаў да пошукаў сваёй, «нацыянальнай рэлігіі».

Рознае ў дачыненні да самой праблемы бачыцца ў той галоўнай мэце, дасягнуць якой меркавалася раней і зараз праз вырашэнне моўнай сітуацыі ў святынях. І калі цяпер галоўнай мэтай у вырашэнні праблемы з'яўляецца ўвядзенне беларускай мовы ў хрысціянскія святыні, то раней мэта была іншай. Па-першае, яна тычылася (у той ці іншай меры) усіх канфесій і рэлігій, акрамя праваслаўнай, прычым у цэнтры спрэчак было пытанне ўвядзення рускай мовы. Па-другое, розняцца і грамадскія стратыўдзельнікі дыскусій. Зараз дыскусію распачала і падтрымлівала беларуская нацыянальнасвядомая інтэлігенцыя, апанентамі якой сталі праваслаўныя святары. Раней у спрэчках удзельнічалі прадстаўнікі расійскага (галоўным чынам, так званага «русского общества в Вильно») грамадства разам з праваслаўным духавенствам – на адным баку[5], на другім – абаронцы «польскасці». Галасы на карысць беларускай мовы былі, але, па-першае, вельмі слабыя, па-дру-

гое, нярэдка з наяўнасцю таго ж «русіфікатарскага» паху. Але аб гэтым далей.

Такім чынам, праблема ўвядзення рускай мовы ў каталіцкае набажэнства яшчэ на стадыі яе тэарэтычнай прапрацоўкі выклікала дыскусію сярод сучаснікаў падзей і розныя пункты погляду на яе вырашэнне. Няма адзінства думак сярод даследчыкаў і на сучасным этапе. Разыходжанні, праўда, іншыя. Перш за ўсё – што гэта за праблема, якое месца яна займае сярод іншых праблем. Ёсць розніца і ў тэрміналогіі. Распаўсюджванне атрымалі два тэрміны «русіфікацыя» або «распалячванне» касцёла. Рознае і значэнне, што ўкладаецца аўтарамі ў дадзеныя тэрміны.

Сучасная айчынная гістарыяграфія, на нашу думку, даволі пераканаўча падае гэтую праблему, як складовую частку дзяржаўнай палітыкі па вырашэнні «польскага пытання»[6]. Хаця думка гэтая не новая. Яна з'явілася ў беларускай гістарыяграфіі раней. С. М. Самбук у кнізе «Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века» (Мн., 1980), разглядаючы праблему «самаўладдзе і шляхта», звярнула ўвагу на тое, што палітыка ўрада Расійскай імперыі па абмежаванні ў дзейнасці і правах рымска-каталіцкай царквы ажыццяўлялася скрозь прызму атаясамлення веравызнання з нацыянальнасцю[7]. Пытанне аб увядзенні рускай мовы ў касцёльнае набажэнства не закранаецца ў кнізе, але канцэптуальна яно ўпісваецца ў сюжэт, які характарызуе канфесійную палітыку ўрада Расійскай імперыі з канца 60-х гг. як «стремление облечь свое вмешательство в дела церкви в более мягкие формы»[8]. Так, у параўнанні з рэпрэсіўнымі мерамі супраць касцёла адразу пасля паўстання, умяшанне ва ўнутрыкасцёльныя справы і нават замах на дагматы веры гэта былі і на самой справе больш «мяккія» меры. Але па-сутнасці мянялася толькі тактыка барацьбы. Мэта заставалася ранейшай. Гэтая думка праходзіць у кнізе «Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.): «Пасля таго, як было падаўлена паўстанне 1863 г., палітыка царызма на беларускіх землях прыняла жорсткую накіраванасць на зацвярджэнне тут рускіх дзяржаўных асноў»[9]. Дзеля гэтага, адзначаецца ў кнізе, трэба было задзейнічаць дзве сілы: праваслаўную царкву (як апору ў правядзенні дадзенай палітыкі) і каталіцкі касцёл (як сілу, якую трэба было нейтралізаваць). Упершыню ў гістарыяграфіі планы, накіраваныя на «распалячванне» касцёла, разглядаюцца ў дадзенай кнізе як адно са звёнаў абмежавальнай палітыкі царскага ўрада на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў[10]. Бо расійская дасавецкая гістарыяграфія, звяртаючыся да праблемы, ставіла на мэце даць ідэалагічнае абгрунта-

ванне неабходнасці яе вырашэння. Савецкая гістарыяграфія не звяртала ўвагі на гэты аспект, практычна выключыўшы гісторыю канфесій са сваіх даследчыцкіх праблем.

Каб адказаць на пытанне, чаму менавіта каталіцкі касцёл быў пастаўлены ў эпіцэнтр гэтай палітыкі, думаецца, дастаткова прывесці словы Адама Міцкевіча, якія калісьці ўзяў эпіграфам да сваёй кніжкі расійскі сведка і гісторык паўстання 1863 г. Ратч, а апошнім часам даволі часта цытуюць беларускія гісторыкі: «Што гэта за страшная сіла, якая ўзняла польскі народ, рушыла яго на рускія землі і адкінула за Дняпро рускую народнасць? Гэта – каласальная магутнасць касцёла, які ўзяў пад сваё заступніцтва польскую справу і зрабіў польскую справу сваёй справай».

Генезіс уяўленняў у беларускай гістарыяграфіі аб ролі і месцы каталіцкага касцёла ў праблеме «паланізацыі беларускіх зямель» у перыяд іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі, а пазней у вырашэнні «польскага пытання» даецца ў кнізе А. Смаленчука[11]. Даследчык этнічнай гісторыі Беларусі П. Церашковіч лічыць, што «менавіта палітыка расійскай адміністрацыі аказывала найвялікшы ўплыў на этнанацыянальныя змяненні другой палавіны XIX ст.». Пры гэтым найбольш эфектыўным яе напрамкам аўтар лічыць той, які «ўмоўна можна было назваць «декатолизацией – православизацией»[12].

Зыходзячы з вышэй сказанага, тэрмін «распалячванне» падаецца больш карэктным для навуковага ўжывання. Бо, па-першае, ён выкрывае стратэгічны напрамак палітыкі Расійскай дзяржавы, адлюстроўвае сутнасць праблемы. Па-другое, гэты тэрмін больш шматгранны і не абмяжоўваецца толькі моўным і рэлігійным аспектамі (хаця, мабыць, і стрыжнёвымі на тым этапе) праблемы[13]. Што пацвярджаецца гістарычнымі фактамі. Для прапрацоўкі пытання, аб гэтым сведчаць амаль усе гістарычныя творы, па ініцыятыве віленскага генерал-губернатара фон Кауфмана ў студзені 1866 г. была створана спецыяльная камісія пад кіраўніцтвам «некага» Старажэнкі[14]. Сучаснікі падзей адзначалі, што склад камісіі пастаянна мяняўся, даходзячы іншым разам да дваццаці асоб. Сярод удзельнікаў – вядомыя прозвішчы – Гаворскі, Ратч, Самарын, Бяссонаў і інш. Старажэнка характарызаваўся як галоўны прыхільнік «зрушчэння» касцёла, калі не самы творца»[15]. Праца камісіі і распрацаваны ёю план сведчаць аб тым, што вырашэнне праблемы не абмяжоўвалася ўвядзеннем у каталіцкае набажэнства рускай мовы замест польскай. У кнізе «O języku rosijskim w nabożeństwie katolickiem» (Kraków, 1889) гэты план выглядае

наступным чынам. Па-першае, меркавалася перавесці ў праваслаўе тых католікаў грэчаскага абраду (уніятаў), якія перайшлі ў рымска-каталіцтва ў 1839 г. Па-другое, ліквідаваць Мінскую каталіцкую дыяцэзію. Наступны крок – увядзенне рускай мовы ў дадатковае набажэнства і пропаведзі. Затым прапаноўвалася рэфармаванне структуры падпарадкавання, увядзенне ў склад кансісторый «камісараў ад урада», а таксама рэфармаванне рымска-духоўных семінарый і акадэміі ў тым жа напрамку[16].

Праціўнікі ўвядзення рускай мовы ў каталіцкае набажэнства (як у расійскім грамадстве наогул, так і ў складзе камісіі ў прыватнасці) бачылі ў гэтым не толькі рэлігійныя моманты. Так, адзін з праціўнікаў увядзення рускай мовы ў каталіцкі касцёл І. Аксакаў выказаў свае меркаванні ў шэрагу артыкулаў, якія былі надрукаваны ў газеце «Масква» ў 1867 г. У адным з артыкулаў ён пісаў: «У мове не ўся народнасць. Паданні, створаныя гісторыяй, паняцці і імкненні, што гэтымі паданнямі выхаваны і к мове ў большасці сваёй абыякавыя – вось што галоўным чынам складае народнасць і на чым яна трымаецца. На падставе ўжо гэтай агульнай ісціны веравызнаўчае пытанне ў Заходнім краі не можа быць аддзелена ад пытання аб народнасці»[17].

Праціўнікі ўвядзення ў касцёл рускай мовы лічылі, што пытанне трэба вырашаць у комплексе. Яны ўзгадвалі тры сродкі, якімі, на іх думку, карысталіся палякі для апалячання рускага народа (мелася на ўвазе беларускае насельніцтва каталіцкага веравызнання. – *Аўт.*). Гэта, па-першае, польскі маёнтак з польскім памешчыкам, польскай мовай і штодзённасцю. Па-другое, польская тайная школа. І па-трэцяе, польскі касцёл з польскім ксянзом, польскім малітоўнікам і польскай пропаведдзю. Усе тры сродкі моцныя, але найбольш моцны з іх – польскі касцёл, бо ён мае «божественный авторитет»[18].

Засяродзіць увагу на дадзеным аспекце праблемы нас прымусіла наяўнасць розных пунктаў погляду на яе ў гістарыяграфіі. Сказанае вышэй, што сучасная беларуская гістарыяграфія даволі пераканаўча падае гэтую праблему, як складовую частку дзяржаўнай палітыкі па вырашэнні «польскага пытання», не азначае адсутнасці іншых падыходаў. Так, у артыкуле «О попытке введения белорусского языка в католическое богослужение в 1905 г. (на примере Минской губернии)» аўтар мімаходзь зачапіўшы праблему ўвядзення рускай мовы ў касцёльнае набажэнства ў 60-я гады XIX ст., называе яе «прапановамі аб удаленні польскай мовы з каталіцкай царквы»[19].

Што тычыцца іншага даследчыка, А. Бендзіна, то згодна з яго меркаваннямі, у Расійскай імперыі наогул адсутнічала падстава для правядзення абмежавальнай палітыкі ў дачыненні да каталіцкага касцёла, бо «арганізуючым прынцыпам расійскай палітыкі ў адносінах далучаемых народаў была не этнічная, не рэлігійная, а сацыяльная асіміляцыя…»[20]. Такім чынам, ён лічыць, што ў Расійскай імперыі «… адсутнічала жорсткае супрацьстаянне падданых, што належылі да дзяржаўнай Рускай Царквы, афіцыйна называемай у якасці «первенствующей и господствующей», усім астатнім канфесіям і рэлігіям»[21].

Ці адпавядала гэта рэчаіснасці? Звернемся да думак тых, хто жыў на пачатку XX ст. на гэтай тэрыторыі. Вось што пісаў на гэтую тэму вядомы дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння Антон Луцкевіч[22]: «Урад вырашыў знішчыць тут усё польскае, лічачы Беларусь «искони русским краем», а паколькі прыкметы нацыянальныя і веравызнаўчыя часта змешваюцца і нават атаясамліваюцца, то ўсе рэпрэсіі накіроўваліся адначасова супраць палякаў і супраць усіх наогул католікаў, гэта значыць супраць каталіцкай часткі беларусаў»[23].

І яшчэ адна невялікая вытрымка з «Всеподданнейшего отчёта…» віленскага, гродзенскага і ковенскага генерал-губернатара П. Святаполк-Мірскага Мікалаю II: «Лёсавызначальныя абставіны і ўмовы жыцця мясцовага насельніцтва вымушалі Урад пры выданні тых, або іншых ільготных або абмежавальных законаў па землеўладанні ў Паўночна-Заходнім краі прытрымлівацца не народнасці, а веравызнання … Замацаваўшы з 1863/1864 года пункт погляду на раздзел мясцовага насельніцтва на дзве катэгорыі: частку праваслаўную і частку каталіцкую, Урад наш быў, без сумнення, абцяжараны ў вырашэнні многіх вельмі важных для края пытанняў…»[24].

Вылучаючы агульныя тэндэнцыі сучаснай літоўскай гістарыяграфіі па праблеме канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Літве і Беларусі, даследчык Сталюнас адзначыў на міжнароднай канферэнцыі, якая адбылася ў Вільні 2–3 кастрычніка 2003 г., што Расійская імперыя з самага пачатку мела паслядоўную палітыку, накіраваную на ліквідацыю каталіцтва. Гэтая лінія праходзіла і ў яго дакладзе «Роль имперской власти в процессе массового обращения католиков в православие в 60-е годы XIX столетия». У ім ён адзначае, што падобныя памкненні меліся не толькі ва ўрадавых структурах, але і ў расійскім грамадстве ў цэлым. У 60-я гады XIX ст., адзначае Д. Сталюнас, былі: «прыкметны імкненні раз'яднаць

каталіцызм і польскую нацыянальнасць»[25]. У дачыненні да беларускага насельніцтва ён лічыць, што «мясцовыя чыноўнікі і часткова праваслаўнае духавенства імкнулася да схілення ўсіх беларусаў-католікаў у праваслаўе. Для гэтага яны не толькі заахвочвалі, але і выкарыстоўвалі прымусовыя меры»[26].

Наступствамі вырашэння нацыянальнай палітыкі з боку Расійскай імперыі тлумачыць нямецкі гісторык Эрнэст Крыстоф Сутнер становішча католікоў: «… для неправаслаўных рэлігійных аб'яднанняў асобных раёнаў існавалі розныя асобыя правілы, што тычыліся тых веруючых, якія ў выніку расшырэння тэрыторыі Расіі станавіліся яе падданымі, паколькі царская дзяржава анексіравала іх бацькаўшчыну. Параўнальна лепшым было становішча каланістаў з Захаду: ім падчас вербавання было забяспечана права на рэлігійнае (і этнічнае) самавызначэнне»[27].

Польская гістарыяграфія таксама разглядае моўную праблему ў каталіцкім касцёле ў якасці складовай часткі дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі на далучаных землях. Менавіта ў палітычным становішчы зямель ВКЛ бачаць карані моўнай праблемы ў касцёле прадстаўнікі польскай гістарыяграфіі. Як у літоўскім, так і ў беларускім выпадку, лічаць яны, «былі то справы «narodowościowe», што мелі свой адбітак на касцёльнай арэне»[28].

Аналіз поглядаў сучасных расійскіх гісторыкаў на праблему палітыкі Расійскай імперыі ў дачыненні да Паўночна-Заходняга краю даецца ў кнізе А. Камзолавай «Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ». Агульнае ў іх работах яна бачыць у адмаўленні ад «однозначно негативных оценок» гэтай палітыкі[29]. Што тычыцца нацыянальнай палітыкі даследчыца адзначае, што «Як зарубежныя, так і айчынныя (расійскія. – *Аўт.*) даследчыкі прыходзяць да высновы, што не існавала адзінай палітыкі «русификации» у маштабах усёй Расійскай імперыі, як не было у рускага ўрада і агульнага «руководящего плана» ў адносінах асіміляцыі нярускіх народаў. Існавала толькі агульная доўгатэрміновая стратэгія»[30]. Увядзенне рускай мовы замест польскай у каталіцкае набажэнства даследчыца лічыць найбольш прыкметнай мерай канфесійнай палітыкі апошняй трэці XIX ст.[31]. Аналізуючы падзеі скрозь прызму дзейнасці мясцовай адміністрацыі, яна прыходзіць да высновы, што ініцыятыва віленскага генерал-губернатара Патапава аб замене польскай мовы рускай грунтавалася на імкненні вывесці дадзеную праблему за межы нацыянальнай палітыкі: «… менавіта мова, а не вера, павінна была стаць адным з фактараў русіфікацыі Паўночна-За-

ходняга края, садзейнічаючы, як адзначалася ў афіцыйных дакументах, «разъединению вопроса религиозного от вопроса о народности»[32].

Метадалагічныя падыходы сучаснай расійскай гістарыяграфіі да вырашэння праблемы моўнай палітыкі ў Расійскай імперыі прапаноўвае навуковы часопіс «Ab Imperio». Другі нумар часопіса за 2005 г. прысвечаны тэме «Языки самоописания империи и нации». Галоўны матыў нумара (па ацэнцы падыходаў рэдакцыі часопіса і артыкулаў расійскіх аўтараў) заключаецца ў тым, што прадуманай, мэтанакіраванай моўнай палітыкі ў Расійскай імперыі наогул не было. У адказах прафесара У. Алпатава прадстаўніку рэдакцыі прагучала такая думка: «…мэтанакіраванага і асэнсаванага паварота да нацыянальнай палітыкі ў адносінах мовы ў гісторыі нашай дзяржавы ніколі не было. У царскай Расіі, зразумела, русіфікацыя ішла, іншы раз бывалі даволі актыўныя спробы абрусення. … Але, з другога боку, да таго, каб пераўтварыць усіх падданых Расійскай імперыі ў рускіх, было далёка. І, зразумела, такая мэта на бліжэйшую перспектыву не ставілася»[33]. Сярод тых тэрыторый, на якія распаўсюджваліся «актыўныя спробы абрусення» былі, зразумела, і беларускія землі. Адмаўляючы ў цэлым наяўнасць мэтанакіраванай моўнай імперскай палітыкі і свядомую сувязь яе з палітыкай нацыянальнай, У. Алпатаў тым не менш адзначае, што моўная палітыка ў Расіі была рознай. Залежала гэта ад розных фактараў, сярод якіх ён вылучае два галоўныя. Першы – імкненне да асіміляцыі. Прычым, калі ў дачыненні да насельніцтва Сярэдняй Азіі або Поўначы такая задача не ставілася, то ў дачыненні да беларусаў і ўкраінцаў «пытанне ставілася нават не ў плане асіміляцыі, а ў плане паступовага сцірання адрозненняў унутры рускага этнаса». Другі фактар – страх сепаратызму. У дадзеным выпадку размова ідзе аб польскім сепаратызме, дзе важную ролю адыгрываў рэлігійны фактар. Не адмаўляе У. Алпатаў і тое, што «на захадзе Расійскай імперыі палітыка бывала даволі жорсткай, асабліва ў часы Аляксандра Другога…»[34]. Праўда, нічога асаблівага ў гэтым аўтар не бачыць, больш таго – такі падыход, на яго думку, добра ўпісваўся ў агульнаеўрапейскі кантэкст: «…у той час і ў большасці еўрапейскіх краін моўная палітыка ў адносінах да меншасцяў была даволі жорсткай…»[35].

«Імперскі падыход» да бачання і вырашэння праблемы дэманструе і другі прадстаўнік сучаснай расійскай гістарыяграфіі М. Даўбілаў. Ён прапанаваў паглядзець на праблему ўвядзення рускай мовы ў каталіцкае дадатковае набажэнства як на адно са

звёнаў у ланцугу «вялікіх рэформаў», вылучыўшы канчатковую мэту – вызваленне ад ўлады Папы Рымскага і магчымасць непасрэднага ўздзеяння на рымскіх католікаў імперыі[36]. Тэарэтычнае абгрунтаванне гэтай думкі мы знаходзім у яго артыкуле «Превратности кириллизации: запрет латиницы и бюрократическая русификация литовцев в виленском генерал-губернаторстве в 1864–1882 гг.». У артыкуле адзначаецца: «У працэсе падрыхтоўкі і правядзення рэформ мадэрнізіраваліся глубінныя ўяўленні аб саміх задачах дзяржавы, яе кіруючым патэнцыяле, аб інтэнсіўнасці камунікацыі і шчыльнасці кантакта паміж агентамі ўлады і падданымі. Мерылам эфектыўнасці кіраўніцтва становіцца ўменне ўладаў непасрэдна ўплываць на значныя, больш або менш гамагенныя групы насельніцтва, што з'яўляліся аб'ектам статыстычнага ўліку па розным параметрам – дэмаграфічным, веравызнаўчым, моўным і г. д.»[37].

Падзеі 1905–1907 гг. спрыялі абуджэнню рэлігійна-нацыянальнага руху, што паставіла перад урадам Расійскай імперыі шэраг новых праблем. За перыяд першай расійскай рэвалюцыі было прынята больш 20 законаў і пастаноў па рэлігійным пытанні. Асобае месца сярод гэтых заканадаўчых актаў займае закон ад 17 красавіка 1905 г.[38]. У дачыненні да моўнага пытання ў законе гаварылася: «Признать, что во всякого рода учебных заведениях в случае преподавания в них закона Божия инославных христианских исповеданий таковое ведётся на **природном языке** (падкрэслена мною. – *Аўт.*) учащихся, причём преподавание это должно быть поручаемо духовным лицам подлежащего исповедания и, только при отсутствии их, светским учителям того же исповедания»[39].

Такім чынам, сама пастаноўка пытання – «прыродная мова» – выклікала новы аспект дадзенай праблемы, які раней амаль не адчуваўся – увядзенне ў жыццё католікаў-беларусаў (у тым ліку і касцёльнае) беларускай мовы. Гэты аспект праблемы, хаця і не атрымаў да гэтага часу належнага навуковага асэнсавання, усё ж час ад часу выклікаў і працягвае выклікаць цікавасць гісторыкаў, як айчынных, так і замежных.

Сярод тых, хто першымі засяродзілі сваю ўвагу на дадзенай праблеме, прыкметнае месца займае ксёндз А. Станкевіч. У кнізе «Родная мова ў святынях» ён разглядае праблему галоўным чынам праз лёсы каталіцкіх святароў. З пункту погляду сучаснай гістарыяграфіі гэтая кніжка не з'яўляецца навуковым даследаваннем. Гэта аповед пра падзеі, сучаснікам многіх з якіх быў ён сам. Але тыя, няхай і нешматлікія моманты, да якіх ён звяртаецца, да-

юць магчымасць узняць такія недасследаваныя аспекты праблемы, як роля і месца, што займала моўнае пытанне ў касцёле не толькі ва ўнутранай, але і знешняй палітыцы Расійскай імперыі, дакладней, ва ўзаемаадносінах Санкт-Пецярбургу і Рыма, а таксама месца ў ёй беларускай мовы[40]. Станкевіч прыводзіць дакумент аб звароце царскага ўрада ў Рым з просьбай «скасаваць сваю забарону ад 11.07.1877 г.[41] аб увядзенні расійскай мовы ў касцёл нашага краю без згоды на гэта Св. Айца». Каталіцкія епіскапы Расійскай імперыі атрымалі адказ, які тлумачыў пазіцыю Рыма па дадзеным пытанні ў новых умовах. Відавочна, што галоўнай прычынай гэтых змен з'яўляецца магчымасць расшырэння ўплыву рымска-каталіцкай царквы на рускамоўнае насельніцтва імперыі. Разам з тым, адзначае А. Станкевіч, расійскі ўрад быў незадаволены неадназначнасцю адказу і імкненнем Рыма трымаць пытанне пад сваім кантролем, таму накіраваў другі ліст з просьбай аб увядзенні ў дадатковае набажэнства беларускай і ўкраінскай мовы «спадзяючыся праз гэтыя мовы лягчэй увесці ў касцёл мову расійскую»[42]. Гэты дакумент і адказ на яго з боку Рыма да гэтага часу невядомы айчыннай гістарыяграфіі, таму, лічу неабходным спыніцца на гэтым моманце і перадаць развіццё падзей словамі А. Станкевіча. Ён сцвярджае, што 29 чэрвеня 1907 г. кардынал Мэры дэль Валь накіраваў у адрас рымска-каталіцкіх епіскапаў ліст, дзе высвятлялася, дзе і калі можна было ўжываць у касцёлах мову беларускую і ўкраінскую: «… Цяпер расійскі ўрад прадставіў новую падобную справу, што тычыцца жыхароў тых правінцый, якія завуцца Беларуссю і Маларуссю, каб гэтыя так жа ў дадатковым набажэнстве маглі карыстацца сваім дыялектам (гутаркай). Вось жа ў якіх парафіях мае быць ужываная беларуская ці маларасійская гутарка, з волі саміх жыроў трэба даведацца, такім аднак спосабам, што калі паўстане непаразуменне між духавенствам і веруючымі, каб справа была перададзена найвышэйшаму суду Апостальскай Сталіцы»[43]. Аналіз гэтага дакумента і тое, як ён быў успрыняты каталіцкім духавенствам – справа далейшага вывучэння дадзенай праблемы.

Спробу інтэгрыраваць дадзеныя падзеі ў гісторыю знешнепалітычных адносін (Санкт-Пецярбург – Рым) прадпрымае маладая беларуская даследчыца А. Казачонак. Аналізуючы ролю моўнай праблемы ў ватыкана-расійскіх адносінах, яна прыходзіць да высновы, што дзейнасць рымска-каталіцкага духавенства ў дадзеным напрамку (пасля 1905 г. – *Аўт.*) «рэгулявалася ў большай ступені мясцовым епархіальным кіраўніцтвам, чым ватыкана-расійскімі пагадненнямі». Разам з тым, гэтая праблема патрабуе больш сур'ёзнай увагі з боку даследчыкаў.

Што тычыцца месца беларускай мовы ў рымска-каталіцкім касцёле Беларусі ў XIX – пач. XX ст., то яшчэ некалькі гадоў назад невялікі і даволі разрознены матэрыял не даваў магчымасці вылучыць дадзены аспект у асобны навуковы напрамак. Гістарыяграфія валодала нешматлікімі фактамі, галоўным чынам з твораў А. Станкевіча, і яго сверджэннем, што «на працягу ўсяго XIX ст. беларуская мова мела, хаця і вельмі сціплае, месца ў беларускім касцёле, каб у пачатку XX ст. заняць ужо месца больш пачэснае»[44]. А вось што хавалася за гэтым «вельмі сціплым» месцам, акрамя дзейнасці асобных ксяндзоў-беларусаў было невядома. Не кажучы ўжо пра суцэльны малюнак таго, як беларуская мова змагалася за свае правы ў касцёле. І хаця гэты аспект праблемы яшчэ чакае свайго глыбокага даследавання, пачатак яму ўжо пакладзены. І пакладзены агульнымі намаганнямі беларускіх і літоўскіх гісторыкаў.

У артыкуле літоўскага гісторыка Д. Сталюнаса «Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период великих реформ» звяртаецца ўвага на той факт, што калі ў 1848 г. Мікалай I забараніў ужыванне рускай мовы ў набажэнстве «замежных» веравызнанняў, забарона гэтая не тычылася моў «прочих наречий» і маларасійскай[45]. І можна пагадзіцца з даследчыкам, што прыклады ўжывання ў той час беларускай мовы ў каталіцкім набажэнстве не з'яўляліся выказваннем «белорусофильских побуждений», а простай неабходнасцю – беларусы не разумелі іншых моў. Пераканаўчай падаецца і ацэнка Д. Сталюнаса матывацыі прапановы папячыцеля Віленскай навучальнай акругі А. Шырынскага-Шыхматава аб замене польскай мовы ў каталіцкім набажэнстве (там, дзе жыў «народ русский») мясцовым дыялектам. «Улічваючы, – піша Сталюнас, – погляды А. Шырынскага-Шыхматава на ўвядзенне беларускай мовы ў начальныя школы і выданне «Разсказов на белорусском наречіи», можно сцвярджаць, і ў гэтым выпадку беларуская мова разглядалася толькі як часовая мера, якая павінна была пракласці шлях рускай мове»[46]. Разам з тым супярэчлівым падаецца тэзіс гэтага гісторыка ў дачыненні да другой паловы XIX ст., што з пачаткам «Вялікіх рэформ» сітуацыя змянілася: «Інстытуалізацыя «белорусского наречия» (у школе, касцёле і г. д.) магла разбурыць канцэпцыю трыадзінай рускай нацыі»[47]. І справа не ў самой тэзе – тэарэтычна яна падаецца даволі прывабнай. А ў тым, што аб інстытуалізацыі беларускай мовы ў той час гаварыць заўчасна: яшчэ не наспела сітуацыя ні ў беларускім

грамадстве, ні ў разуменні грамадства расійскага. Упэўненасць жа ў трыадзінстве рускай нацыі была настолькі моцнай, што сумніву не падвяргалася і магчымасць яе падарваць не бачылася. Перакананасць у гэтым у тым, ці іншым выглядзе дайшла аж да сённяшняга дня – ці не лепшае таму пацвярджэнне? На карысць дадзенай гіпотэзе іграюць і сведчанні аб тым, што беларуская мова ў касцёле ў XIX ст. – «толькі эпізоды моўна-канфесійнай сітуацыі таго часу»[48]. А вось што тычыцца таго, што «перспектыва беларускамоўнага касцёла пужала ўлады і праваслаўную царкву», то гэты аспект, думаецца, патрабуе больш глыбокага аналізу. Супярэчлівыя факты, вядомыя сучаснай гістарыяграфіі (нават тая невялікая колькасць, што прыведзена ў дадзеным тэксце), сведчаць, што ўсё было не так проста і адназначна. І калі ў першыя часы знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі ўлады і праваслаўная царква чураліся беларускай мовы галоўным чынам з-за лацінскага шрыфта, баючыся, што пад відам беларускай будзе ўмацоўвацца мова польская і польскамоўны рымска-каталіцкі касцёл, то з увядзеннем кірыліцы гэтая праблема адпала. І мове беларускай надавалася толькі значэнне «мясцовага дыялекта», што сведчыла не аб «польскаці», а аб «рускасці» яе носьбіта. І бачылася яна ўладам толькі ў выглядзе «часовага мастка» для беларусаў-католікаў для пераходу ад польскай да рускай мовы. Менавіта так я разумею той факт, што ў 1848 г. забарона на рускую мову ў каталіцкім касцёле не распаўсюджвалася на беларускую. Так я разумею і прапановы Шырынскага-Шыхматава і перакананні ў сваёй «беларускасці» галоўнага русіфікатара беларускага касцёла Ф. Сянчыкоўскага; дазвол на выкладанне Закона Божага на «прыроднай» мове для дзяцей-католікаў згодна з указам 17 красавіка 1905 г.; зварот урада Расійскай імперыі да Папы Рымскага з просьбай дазволіць увядзенне ў каталіцкае набажэнства беларускай (і маларасійскай) мовы (1907 г.). Хаця і не выключаю, што больш глыбокае даследаванне гэтай праблемы можа ўнесці карэктывы ў яе разуменне і трактоўку.

Такім чынам, гістарыяграфічны аналіз моўнай праблемы ў каталіцкім касцёле Беларусі ў 60-я гады XIX – пачатку XX ст. сведчыць аб даволі высокай навуковай цікавасці да яе як з боку як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. Але, адзначаючы выпрацоўку на сучасны момант агульнапрынятых пунктаў погляду на розныя аспекты праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі, неабходна адзначыць і наяўнасць некаторых момантаў, што «не ўпісваюцца» ў гэтыя рамкі. Прычына гэтага бачыцца ў адсутнасці грунтоўнай прапра-

цоўкі асобных аспектаў праблемы на першым этапе яе распрацоўкі (этапе выяўлення і збора эмпірычнага матэрыялу) і знаходжанні аўтараў пад відавочным уплывам расійскай гістарыяграфіі. Што тычыцца непасрэдна сучаснай расійскай гістарыяграфіі, то ў большасці сваёй яна застаецца на пазіцыях захавання «адзінай і непадзельнай Расіі», апраўдання імперскіх метадаў кіравання шматлікімі нацыямі і народнасцямі, што ўваходзілі ў склад еўрапейска-азіяцкай імперыі Раманавых. Больш абгрунтаванай і аб'ектыўнай падаецца сучасная літоўская гістарыяграфія.

---

[1] Лыч Л. Хрысціянства ў этнакультурным жыцці Беларусі (ад старажытнасці да 1917 г.). Віцебск, 2005. С. 4.

[2] Чарняўскі У. Ліст святара аб палажэньні Каталіцкай Царквы ў Беларусі. Лёндан, 1988. С. 1.

[3] Там жа.

[4] Там жа.

[5] Маючы адну мэту – русіфікацыя беларускага каталіцкага насельніцтва – прадстаўнікі расійскага грамадства тым не менш разыходзіліся ў поглядах на яе ажыццяўленне. Яскрава вылучыліся дзве канцэпцыі. Прыхільнікі першай лічылі, што касцёл павінен заставацца польскамоўным (сярод іх М. Каяловіч, І. Аксакаў, праўда, у далейшым апошні змяніў свае погляды), гаварылі, што ўвядзенне ў касцёл рускай мовы механічна зробіць раўнапраўным становішча каталіцтва і палякаў з праваслаўнымі. А гэта не будзе спрыяць праваслаўю і русізму ў краі. Прыхільнікі распалячвання касцёла (М. Каткоў, П. Бацюшкаў і інш.) сцвярджалі, што беларусы – гэта тыя ж рускія і іх трэба абараніць ад паланізацыі і паступова русіфікаваць, каб у хуткім часе схіліць у праваслаўе. Як адзначае літоўскі даследчык Д. Сталюнас, у расійскім афіцыйным і грамадскім дыскурсах 1860-х гадоў «выкристаллизировались» дзве канцэпцыі нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Адна частка прытрымлівася «традыцыйнага разумення рускасці, галоўным крытэрыем нацыянальнай ідэнтыфікацыі лічачы рэлігію. Аднак пасля так званага Польскага або Студзеньскага паўстання 1863–1864 гг. у расійскі грамадскі і афіцыйны дыскурс усё больш актыўна стала пранікаць больш мадэрнае разуменне нацыянальнай ідэнтычнасці, што абвяшчала галоўным атрыбутам нацыянальнасці ўжо не рэлігію, а мову…» // Сталюнас Д. Идентификация, язык и алфавит литовцев в российской национальной политике 1860-х годов // Ab imperio. 2005. № 2. С. 228.

[6] Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). Мн., 1998; Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 гг. Гродна, 2001; Токць С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (на матэрыялах Гродзеншчыны XIX – першай трэці XX ст.). Гродна, 2002; Яноўская В. В. Хрысціянская царква

ў Беларусі ў 1863–1914 гг. Мн., 2002; Терешкович П. В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. Мн., 2004.

[7] Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980. С. 40.

[8] Там жа. С. 89.

[9] Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). Мн., 1998. С. 71.

[10] Папярэдне гэтая думка была апрабіравана аўтарам – В. Яноўскай (Грыгор'евай) – у 1996 г. на міжнародным хрысціянскім кангрэсе ў Любліне і атрымала падтрымку з боку польскага каталіцкага гісторыка М. Радвана, які таксама займаўся праблемамі канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі на далучаных землях у XIX – пачатку XX ст. Гл.: Grigorjeva V. The Russifikation of the Roman Catholik Church in Belorussia (the Second Haft of the 19^{h} and Beginning of the 20th Centuries) // Churches – States – Nations. Lublin, 2000.

[11] Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 гг. С. 19–21.

[12] Терешкович П. В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. С. 134.

[13] Прадстаўляе цікавасць у сувязі з вышэйсказаным трактоўка тэрміна «русіфікацыя» («zruszczenie») аўтарамі кнігі «O języku rosijskim w nabożeństwie katolickiem». Найперш – лічаць аўтары – гэта ўвядзенне рускай мовы. Згодна з памкненнямі расійскага ўрада мова павінна стаць пануючай у заходніх губернях (як у Маскве, Пецярбургу і г. д.) у войску, школах, прыватным жыцці і нават у касцёле. Русіфікацыя, адзначаецца далей, вядзе за сабой «раскаталічванне» краю, дзе на думку Расіі рэлігіяй прыроднай з'яўляецца праваслаўе.

[14] Асоба гэтая малавядомая, выклікае цікавасць, як з боку айчынных, так і расійскіх і літоўскіх даследчыкаў.

[15] O języku rosijskim w nabożeństwie katolickiem. Kraków, 1889. S. 39.

[16] Там жа.

[17] Цыт. па: Чихачёв Д. Н. Вопрос о расположении костёла в прошлом и настоящем. СПб., 1913. С. 63–64.

[18] Там жа. С. 12.

[19] Табунов В. В. «О попытке введения белорусского языка в католическое богослужение в 1905 г. (на примере Минской губернии)» // Канфесіі на Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Брэст, 2004. С. 251.

[20] Бендин А. Ю. Православная Церковь и проблемы формирования русского национального самосознания: особенности белорусского опыта (конец XIX – начало XX в.) // Россия и Беларусь: от века XIX к веку XXI. Брест, 2004. С. 125.

[21] Там жа.

[22] Рукапіс артыкула А. Луцкевіча быў знойдзены А. Смалянчуком у аддзеле рукапісаў ЦБ АН Літвы. Артыкул датуецца 1910–1911 гг. У 1998 г. ён быў у поўнай адпаведнасці з арыгіналам надрукаваны ў «Гістарычным альманаху», № 1.

[23] Гіст. альманах. 1998. № 1. С. 66.

[24] Бел. гіст. часоп. 1997. № 2. С. 99. (Сам дакумент знаходзіцца ў РДГА ў С.-Пецярбургу. Быў знойдзены і падрыхтаваны да друку беларускімі гісторыкамі М. Бічом і В. Пічуковым).

[25] Сталюнас Дарюс. Роль имперской власти в процессе массового обращения католиков в православие в 60-е годы XIX столетия // Metraštis XXI. Vilnius, 2005. S. 308.

[26] Там жа. S. 344.

[27] Суттнер Ернст Крістоф. Українське християнство на початку III-го тисячоліття: Історичний досвід та еклезіологічні перспективи. Львів, 2001. С. 75.

[28] Studia z historii kościoła u Polsce. W-wa, 1979. T. 5. S. 94.

[29] Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 11.

[30] Там жа. С. 10.

[31] Там жа. С. 319.

[32] Там жа. С. 320–321.

[33] «В современной России нет определённой языковой политики…»: Интервью с Владимиром Алпатовым // Ab Imperio. 2005. № 2. С. 115–116.

[34] Там жа. С. 105.

[35] Там жа.

[36] Гэтыя думкі былі агучаны ім на вышэйзгаданай канферэнцыі ў Вільні ў 2003 г. у дакладзе «Бюрократические дискуссии о проекте введения русского языка в католическое богослужение (1860-е гг.)». Даклад, на жаль, не ўвайшоў у матэрыялы канферэнцыі.

[37] М. Долбилов. «Превратности кириллизации: запрет латиницы и бюрократическая русификация литовцев в виленском генерал-губернаторстве в 1864–1882 гг. …» // Ab Imperio. 2005. № 2. С. 256.

[38] Гістарыяграфічны аналіз, прысвечаны гэтай падзеі даецца ў наступным параграфе. Тут мы сканцэнтравалі сваю ўвагу толькі на тых момантах, што непасрэдна тычыліся моўнай праблемы ў касцёле.

[39] Полное собрание законов Российской империи. Т. XXV. 1905. Отд. 1. СПб., 1909. С. 258.

[40] Гэтыя аспекты ў тым або іншым ракурсе і аб'ёме прысутнічаюць амаль ва ўсіх працах, што тычацца моўнага пытання ў касцёле. Але сістэмнага даследавання па іх пакуль што не маецца ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарыяграфіі.

[41] Маецца на ўвазе Дэкрэт Кангрэгацыі інквізіцыі ад 11 ліпеня 1877 г., які не ўхваляў увядзенне рускай мовы ў дадатковае набажэнства. Адносна дадзенай забароны, або неухвалення з боку Св. Кангрэгацыі сярод царкоўных гісторыкаў Польшчы існуе думка, што такога дакумента не было. І што пасланне Папскага Статс-Сакратара несапраўднае. Але праца ў архівах Мінска, Вільні, С.-Пецярбурга з дакументамі 70-х гадоў XIX – пач. XX ст., выяўленне не толькі дадзенага дакумента, але і шматлікіх ускосных даных, сведчыць на карысць таго, што падзеі гэтыя мелі месца.

[42] Ks. Ad. Stankiewicz. Rodnaja mowa u światyniach. Wilnia, 1929. S. 72.

[43] Ks. Ad. Stankiewicz. Rodnaja mowa u światyniach. Wilnia, 1929. S. 71–72.
[44] Там жа. С. 71.
[45] Сталюнас Д. Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период великих реформ // Ab imperio. 2003. № 1. С. 288.
[46] Там жа. С. 289.
[47] Там жа. С. 290.
[48] Смоленчук А. Попытки введения русского языка в католическое богослужение в Минской и Виленской диоцезиях 60–70-е гг. XIX в. // Lietuvių katalikų mokslo akademijos metraš. Vilnius, 2002. T. 20. S. 145.

7.3. Змены ў стане канфесій на пачатку XX ст.

Галоўнай падзеяй, прадвызначыўшай змену канфесійнага курса ўрада Расійскай імперыі, быў прыняты 17 (29) красавіка 1905 г. «Именной Высочайший Указ Правительствующему Сенату», што вядомы ў гістарычнай літаратуры пад назвай «Об укреплении начал веротерпимости». Сцвярджаць, што аналіз гэтай падзеі займае адпаведнае месца як у дарэвалюцыйнай, так і сучаснай гістарычнай традыцыі, было б перабольшваннем. Бо да гэтага часу сучасная гістарыяграфія не мае спецыяльнай работы, дзе б дэталёва разглядаліся ўсе бакі гэтай з'явы: падрыхтоўка ўказа, аналіз самога дакумента і тых дакументаў, што папярэднічалі ці ішлі ўслед за ім. А галоўнае, няма дэталёвага разгляду тых падзей, што адбыліся пад яго ўздзеяннем. Прычыны тут розныя: бурныя падзеі пачатку XX ст. не спрыялі навуковым даследаванням, захаванасці архіўных спраў. Пазней, у савецкі перыяд, вывучэнне канфесіянальнай гісторыі не лічылася прыярытэтным напрамкам. Відаць таму і атрымалася так, што да гэтага часу ў большасці сваёй гучаць ацэнкі, што былі дадзены падчас саміх падзей праваслаўнымі дзеячамі. Што гэта за ацэнкі?

Абвяшчэнне ўказа ад 17 красавіка 1905 г. без адначасовага рэфармавання праваслаўнай царквы выклікала вялікае незадавальненне з боку праваслаўнага духавенства ўсіх рангаў. Усе яны непакоіліся галоўным чынам па адной прычыне. Паколькі ніякіх рэформ у праваслаўнай царкве не адбылося і яна не гатова да змены канфесіянальнага курса палітыкі ўрада, то ўсе іншыя канфесіі апынуцца ў лепшым становішчы, чым праваслаўная.

Агульная ацэнка самаго акта прынятця ўказа аб верацярпімасці з боку праваслаўных ідэолагаў заключалася ў тым, што яны лічылі гэта непасрэдным уплывам «каталіцкага Захаду». На самой справе гэта было абумоўлена рознымі прычынамі, як знешняга, так і ўнут-

рыдзяржаўнага характару. Трэба адзначыць, што распрацоўка дадзенага дакумента і сапраўды распачалася пад уплывам еўрапейскіх падзей. У краінах Еўропы пачатак XX ст. паклаў канец шматвекавым спрэчкам пра ўзаемаадносіны паміж царкоўнай і свецкай уладамі. У адной з найбольш перадавых еўрапейскіх краін таго часу – Францыі – гэтыя спрэчкі завяршыліся законам 1905 г. аб аддзяленні царквы ад дзяржавы. Праз некалькі гадоў пасля прыняцця ў Расійскай імперыі ўказа аб верацярпімасці праваслаўныя ідэолагі адзначалі: «Разуменне рэлігіі, сутнасць фармальнага прынцыпа свабоды сумлення, ідэя хрысціянскай дзяржавы, спосаб вырашэння веравызнаўчых пытанняў пры ігнараванні, або поўным неразуменні значэння царкоўнай асновы ў хрысціянстве – усё гэта было навязана складальнікам законапраекта з Захаду»[1].

Што канкрэтна лічылі непрымальным для Расіі праваслаўныя ідэолагі? Па-першае, тое, што характэрнай рысай развіцця Заходняй Еўропы быў уплыў рымскага каталіцызму. Менавіта пад гэтым уплывам, сцвярджалі яны, складвалася і развівалася заканадаўства Францыі і іншых краін. Нават сама тэорыя прававой дзяржавы, на думку прафесара Суворава, развівалася ў сувязі з энцыклікай папы Рымскага Пія IX (1864 г.) і пастановай Ватыканскага сабора аб «папской непогрешимости»[2].

Другі фактар, пад уплывам якога складалася еўрапейскае заканадаўства і што таксама праваслаўныя ідэолагі не лічылі магчымым перанесці на расійскую глебу, – гэта пратэст у імя свабоды развіцця асобы, супраціўленне царкоўнаму парадку і вучэнню, якія ажыццяўлялі на яе знешні ціск (гуманізм). Гуманістам чалавек па-за ўплывам царквы ўяўляўся вышэй. Яны імкнуліся паказаць неадпаведнасць многіх сучасных ім царкоўных парадкаў і пастаноў Св. Пісанню, дурное жыццё духавенства і г. д.

У пачатку XX ст. у Заходняй Еўропе ў сферы адносін «царква – дзяржава» назіраўся кірунак не толькі да раздзелу паміж імі, але і да поўнага разбурэння ўсялякіх сувязей паміж дзяржавай і царквой, з мэтай стварэння атэістычнай дзяржавы. Працэс гэты быў складаным і працяглым, і ў залежнасці ад той стадыі, да якой ён дайшоў, разумеўся і сам прынцып свабоды сумлення. Адгалоскі гэтага назіраліся і ў Расіі, а рознагалоссе было тут, бадай, самым палярным. Большасць ідэолагаў праваслаўнай, пануючай у Расійскай імперыі царквы, сцвярджалі адназначна: «Зыходзячы з хрысціянскага разумення прынцыпа свабоды сумлення ... зусім не выцякае, што рэлігіі ў дзяржаве павінны знаходзіцца ў аднолькавым

становішчы і патрабавалі роўнасці правоў». Свецкія дзяржаўныя дзеячы, што прымалі ўдзел у распрацоўцы ўказа аб верацярпімасці, трымаліся іншых меркаванняў: «Пад свабодай сумлення разумеецца свабода ад усялякага прымусу да рэлігійных дзеянняў, якія чалавек не прымае па рэлігійных матывах. І свабоду жыць, абапіраючыся на свае рэлігійныя меркаванні» [3].

Разам з тым і праваслаўныя святары, ва ўсякім выпадку некаторыя з іх, лічылі прыняцце ўказа неабходным, станоўчым крокам урада. Усе гэтыя думкі, спрэчкі выліваліся на старонкі афіцыйнага друку. «Епархиальные ведомости» (Літоўскія, Мінскія, Магілёўскія, Гродзенскія, Полацкія) час ад часу рабілі агляды гэтых публікацый. Напрыклад, у «Минских епархиальных ведомостях» за 1906 г. зроблены такі агляд пад назвай «Зло от манифеста 17 апреля». У ім адзначалася, што праваслаўны святар Амвросій Жалязнякоў на старонках друку выказаў дваякую думку пра маніфест. Па-першае, ён заўважыў, што прыняцце ўказа гэта гуманны акт, які дазволіў кожнаму чалавеку прыняць веру сваіх бацькоў (а больш праўдзіва, удакладняюць яго іншыя аўтары, – выбраць веру «як падказвае сэрца», а не толькі як склалася традыцыйна – веру бацькоў). Другі бок гэтага акта – ён прынёс вялікую шкоду, бо дазволіў пераходы з праваслаўя ў каталіцтва і паставіў праваслаўную царкву ў адно становішча з сектанцтвам[4]. З такой думкай не пагаджаецца свяшчэннік С. Ваяводскі: «Не, – заўважае ён, – праваслаўная царква стаяла і будзе стаяць на сваёй былой вышыні, заўсёды была і будзе пануючай у свеце, але не па знешніх прывілеях, а па духу, па вышыні сваёй дагматыкі і чысціні сваёй маралі»[5].

Думкі пра тое, што праваслаўная царква была пакрыўджана ў параўнанні з усімі іншымі канфесіямі Расійскай імперыі, настолькі трывала ўкаранілася, што мы іх можам сустрэць і ў сучаснай гістарыяграфіі, як царкоўнай, так і свецкай. «Указ ад 17 красавіка 1905 г. і маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. змякчылі або наогул адмянілі ранейшыя законы аб абароне праваслаўя» – такая ацэнка дадзена ў кнізе «История Русской Церкви», што адпавядае афіцыйнаму пункту гледжання Русскай Праваслаўнай Царквы[6]. «Указ аб верацярпімасці – піша канадскі гісторык Д. Паспялоўскі, – даваў свабоду ўсім рэлігіям імперыі, акрамя праваслаўя, якое адно сярод усіх рэлігій застанецца ў палоне дзяржапарата. А калі ўлічыць, што галоўным заканадаўчым органам становіцца Дума, то становішча Праваслаўнай Царквы яшчэ больш пагоршыцца, бо ёю будзе кіраваць не толькі праваслаўны цар, але яшчэ і амаль бязбожная Дума»[7].

Цікава, чаму гэтыя палажэнні аўтар пераносіць толькі на праваслаўную царкву? Структура падпарадкавання ўсіх іншых (неправаслаўных) канфесій Расійскай імперыі заставалася нязменнай пасля ўказа 17 красавіка 1905 г. Аб якой «свабодзе ўсім рэлігіям імперыі» магла ісці гаворка, калі як і раней імі кіраваў дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў. А веравызнаўчыя законы для іх прымала тая ж самая «амаль бязбожная Дума», што і для царквы праваслаўнай. Больш таго ніводны веравызнаўчы закон, якой бы канфесіі ён не тычыўся, не прымаўся без папярэдняга ўзгаднення са Св. Сінодам. Думка іншых канфесій пра той, ці іншы заканадаўчы акт мала турбавала царскі ўрад. Ды і Дума была не такая ўжо і бязбожная, асабліва калі мець на ўвазе Думу 3-га і 4-га склікання. У іх склад уваходзіла даволі значная колькасць духоўных асоб. У сувязі з гэтым П. Мілюкоў піша: «Калі з'явілася Дзяржаўная Дума і руская грамадская думка раздзялілася па палітычным партыям, царква (вядома, маецца на ўвазе царква праваслаўная. – *Аўт.*) была афіцыйна пастаўлена на службу той палітычнай партыі – саюза рускага народа і нацыяналістаў, каторая вяла барацьбу за рэстаўрацыю самаўладдзя. Ужо пры выбарах у III Дзяржаўную Думу духавенства адыграла службовую ролю і адправіла ў Думу каля паўсотні дэпутатаў у расах. У Думе яны не засталіся безгалосымі. Духоўнае ведамства ўнесла законапраекты, што абмяжоўвалі верацярпімасць і свабоды вышэйшага багаслоўскага выкладання. Нават умераная большасць III Думы была настолькі незадаволена гэтай палітыкай, што адмовіла ў крэдытах па смеце Св. Сінода. На выбарах у IV Думу Сінод разам з МУС стварыў з духавенства такі моцны выбарчы механізм, што Думе пагражала наводненасць духавенствам… Самому ўраду прыйшлося абмежаваць іх колькасць да 50»[8].

Найбольш палярныя ацэнкі тычацца тых наступстваў, якія выклікалі змены курса канфесіянальнай палітыкі пад уплывам указа аб верацярпімасці. Аўтары кнігі «Русское православие: вехи истории», разглядаючы ўказ і яго наступствы толькі з аднаго боку – дазволу пераходаў з праваслаўнага ў іншыя хрысціянскія веравызнанні – пішуць: «Усіх ягоных наступстваў урад, відаць, не прадбачыў. У заходніх губернях былыя уніяты падчас Пратасава «воссоединённые» з праваслаўем, пачалі тысячамі пераходзіць у каталіцтва. Усяго за 1905–1907 гг. з праваслаўя ў каталіцтва перайшло звыш 170 тыс. чалавек»[9].

Трэба пагадзіцца з аўтарамі кнігі, што дазвол праваслаўным пераходзіць у іншыя хрысціянскія веравызнанні і на самой справе

быў самай вялікай радыкальнай адметнасцю гэтага ўказа. Але разам з тым не будзем перабольшваць яго наступствы. Падставы для падобнага сцвярджэння бачацца нам у наступным. Указ аб верацярпімасці, хоць і стаў асноватворным у канфесіянальнай палітыцы ўрада Расійскай імперыі напачатку XX ст., аднак не азначаў поўнага адказу ад мінулага. Дазволіўшы свабодны пераход з аднаго веравызнання ў іншае (і галоўнае – з праваслаўя), указ толькі ўскосна аслабляў дзейнасць старых юрыдычных норм. Ён не пахіснуў пазіцый праваслаўнай царквы. Як і да гэтага часу, дзяржаўныя законы лічылі яе «первенствующей и господствующей». Праваслаўная царква, як пануючая, карысталася правам публічнай пропаведзі, з чаго выцякала «неприкосновенность для прозелитизма». Заканадаўча гэта было зацверджана ў статуце духоўных спраў іншаземных веравызнанняў. У ім адзначалася: «У межах дзяржавы адна пануючая праваслаўная царква мае права пераконваць вернікаў іншых хрысціянскіх веравызнанняў і іншаверцаў да прыняцця яе вучэння аб веры»[10].

Гэтае права захавалася і пасля прыняцця ўказа 1905 г. Каб пацвердзіць, што гэта так, звернемся да «журналов» Камітэта Міністраў, што суправаджалі ўказ ад 17 красавіка. У іх гаварылася: «Нязменнымі захоўваюцца і на будучыню перавагі, што даюць Праваслаўнай царкве значэнне пануючай – належнасць да яе Імператара, свабода далучэння паслядоўнікаў і атрыманне грашовых сродкаў для задаволення сваіх патрэб з агульнадзяржаўных даходаў»[11].

Законы, што былі выдадзены ў 1906 г., пацвердзілі вяршынства і пануючую ролю праваслаўнай царквы і акрэслілі межы верацярпімасці, зафіксаваныя ў статутах духоўных спраў іншаземных веравызнанняў. Для розных канфесій працягвалі дзейнічаць розныя правілы ў выпадку пераходу з аднаго веравызнання ў другое. Як і дагэтуль, дзяржава падтрымлівала пераходы ў праваслаўе, пануючай праваслаўнай царкве давалася (у межах усёй імперыі) выключнае права заахвочваць вернікаў усіх іншых канфесій да прыняцця яе вучэння. У расійскіх законах, а таксама ў статуце благачыннай акругі, адзначалася, што мясцовыя губернскія ўлады павінны былі абараняць праваслаўных прапаведнікаў сярод іншаверцаў, аказваць ім усялякую дапамогу[12]. У той жа час духоўныя і свецкія асобы неправаслаўных веравызнанняў не павінны былі спакушаць вернікаў іншых канфесій да змены веры. Парушэнне гэтых установак разглядалася як крымінальнае злачынства[13].

І наадварот, для тых, хто вырашыў прыняць праваслаўную веру, устанаўліваліся льготы. Прадугледжваліся ўзнагароды і для

тых, хто спрыяў павелічэнню колькасці праваслаўных. Напрыклад, стараверы, члены розных сект, нават ізуверскіх (акрамя скапцоў), у некаторых мясцовасцях Расійскай імперыі вызваляліся на 3 гады ад падаткаў. Язычнікі, мусульмане ў выпадку прыняцця хрышчэння (незалежна ад хрысціянскіх абрадаў) карысталіся 3-гадовай падатковай ільготай. Тыя, што не плацілі подацей, заставаліся свабоднымі ад іх назаўсёды.

Заканадаўства не прадугледжвала пераходы з хрысціянскага веравызнання ў стараверства, сектанцтва, нехрысціянскія канфесіі. Не былі распрацаваны заканадаўчыя акты, якія б рэгулявалі пераходы з адной нехрысціянскай веры ў другую, а таксама правілы пераходаў паміж сектамі (акрамя, як адзначана вышэй, пратэстанцкімі). Але, бадай, самая вялікая недапрацоўка расійскага заканадаўства (на момант прыняцця ўказа аб верацярпімасці) – адсутнасць правіл, механізму пераходаў з аднаго хрысціянскага веравызнання (у т. л. і з праваслаўнага) у другое. І яшчэ. Згодна з законамі выхад з якога-небудзь веравызнання ў пазаверавызнаўчы стан не толькі не прадугледжваўся, але нават і забараняўся. Гэта азначала, што свабода рэлігійнага самавызначэння разглядалася толькі ў межах веравызнання (любога), а не па-за імі, што не адпавядае, на нашу думку, уяўленням пра свабоду сумлення.

У адносінах тысяч, нават соцень тысяч, перайшоўшых у каталіцтва. Няўзгодненасць дзеянняў паміж урадам і кіраўніцтвам рымска-каталіцкай царквой (аб пераходах праваслаўных вернікаў у каталіцтва) спараджала шмат непаразуменняў. Лічбы перайшоўшых выклікалі шмат спрэчак, яны і сёння сустракаюцца ў літаратуры розныя, з даволі-такі значнымі разыходжаннямі. Як адзначалася вышэй, аўтары манаграфіі «Русское православие: вехи истории», спасылаючыся на даныя обер-пракурора Св. Сінода сцвярджаюць, што за 1905–1907 гг. з праваслаўя ў каталіцтва ў цэлым па Расійскай імперыі перайшло больш за 170 тыс. чал. Складальнікі даведніка «История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII–XX вв.) в документах Российского государственного архива» адзначаюць (таксама «па афіцыйным даным»), што за 1905–1909 гг. да каталіцкай царквы далучылася 233 тыс. чал.[14]. Значную частку вышэйназваных пераходаў складалі пераходы ў беларуска-літоўскіх губернях. Спасылаючыся на матэрыялы архіваў С.-Пецярбургу і Вільні, В. Яноўская паведамляе аб наступным. Паводле звестак упраўляючага Віленскай рымска-каталіцкай епархіі лічба тых, хто за 1905–1909 гг. перайшоў з праваслаўя ў каталіцтва, склала па епархіі 62 тыс. чал.[15]. Гэтыя

лічбы не стасуюцца з данымі Дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў. Вось гэтыя звесткі. Пачынаючы з 17 красавіка 1905 г. і па красавік 1909 г. з праваслаўя ў каталіцтва перайшлі ў губернях:

Віцебскай	–	8 197 чал., у т. л. 200 сямей;
Магілёўскай	–	1 347 чал., няма звестак;
Мінскай	–	14 846 чал., у т. л. 1724 сям'і;
Кіеўскай	–	1 720 чал., у т. л. 174 сям'і;
Падольскай	–	612 чал., у т. л. 40 сямей;
Валынскай	–	1 314 чал., няма звестак;
Віленскай	–	18 568 чал., няма звестак;
Ковенскай	–	1 123 чал., у т. л. 131 сям'я;
Гродзенскай	–	4 116 чал., у т. л. 6 сямей;
Люблінскай	–	41 288 чал., у т. л. 7 200 сямей;
Сядлецкай	–	106 507 чал., у т. л. 18 565 сямей;
Сувалкскай	–	15 930 чал., у т. л. 2 822 сям'і;
Усяго	–	211 566 чал., у т. л. 30 862 сям'і[16].

Для таго, каб зразумець, чаму ўзніклі такія разыходжанні, трэба прааналізаваць канфесіянальную сітуацыю ў краі на той час. Справа ў тым, што ўказ 17 красавіка не ўтрымліваў правіл пераходаў, што выклікала ўжо праз некалькі дзён з'яўленне распараджэння ў межах рымска-каталіцкай канфесіі. Гэтае распараджэнне дазваляла прымаць у каталіцтва вернікаў усіх канфесій па даволі-такі простай схеме: дастаткова было звярнуцца з заявай да каталіцкага святара аб жаданні перайсці ў каталіцтва. 18 жніўня 1905 г. былі выдадзены часовыя правілы МУС аб пераходзе з праваслаўнага веравызнання ў іншае хрысціянскае і вяртанні з праваслаўя ў нехрысціянскую веру. Аднак каталіцкія святары аж да 1908 г. прымалі вернікаў, кіруючыся распараджэннямі сваіх епіскапаў. У выніку атрымалася так, што адных і тых жа вернікаў і праваслаўная царква, і каталіцкая лічылі сваімі. Спроба ўрэгуляваць дадзенае пытанне была зроблена толькі ў 1915 г., прытым даволі няўдала. 17 ліпеня 1915 г. міністр унутраных спраў кн. Шчарбатаў падпісаў распараджэнне аб прызнанні католікамі (з дня іх фактычнага далучэння) тых праваслаўных, якія перайшлі ў каталіцтва ў тэрмін з 17 красавіка па 1 лістапада 1905 г.[17]. Але дадзенае распараджэнне не вырашыла праблему, бо значная частка змяніўшых веру не змагла яго скарыстаць.

Не менш складанымі і неадназначнымі былі і іншыя моманты, пазначаныя ва ўказе. Вядомы беларускі даследчык А. Грыцкевіч адзначае, што дадзены акт гэта «…уступка расійскага царызму,

зробленая на карысць каталіцкага Касцёла... Паводле ўказа 1905 года праваслаўныя маглі пераходзіць у каталіцтва «без асабістых і цывільных наступстваў», католікам вярталіся зачыненыя касцёлы (за выключэннем перададзеных праваслаўнай Царкве), вывучэнне рэлігіі ў школах дазвалялася весці на роднай мове вучняў, уніятам абвяшчалася амністыя, якую яны скарысталі, прымаючы лацінскі абрад»[18].

Так, гэтым указам і на самой справе была дадзена палёгка каталіцкаму касцёлу. Але мае рацыю польскі даследчык Мар'ян Ракоўскі, адзначаючы, што «1905 і 1917 гг. прынеслі радыкальныя перамены», але «абсалютна спрэчныя і неадназначныя»[19].

Блізкую думку выказвае і А. Смалянчук: «У перыяд першай рускай рэвалюцыі асновы абмежавальнага антыпольскага (антыкаталіцкага) заканадаўства былі знішчаныя. Але адначасова ўлады прадпрынялі актыўныя намаганні дзеля захавання былых падзаконных актаў і інструкцый, якія па-ранейшаму абмяжоўвалі грамадска-палітычнае, культурнае, рэлігійнае і эканамічнае жыццё як польскай грамадскасці краю, так і іншых г. зв. «інародцаў»[20].

І на самой справе, хоць указ аб верацярпімасці і не ставіў сваёй мэтай аслабленне пазіцый праваслаўнай царквы, ён патрабаваў перагляду крымінальных санкцый, якія падтрымлівалі старыя абмежаванні свабоды сумлення. 14 сакавіка 1906 г. была зацверджана пастанова Дзяржаўнага Савета аб узгадненні некаторых заканадаўчых актаў Збора законаў і крымінальнага заканадаўства Расійскай імперыі з указам ад 17 красавіка 1905 г. Галоўным дасягненнем стала адмена пакаранняў за пераходы з праваслаўнай веры ў іншую, а таксама за спакушэнні з праваслаўя ў іншае веравызнанне.

Адносна перадачы будынкаў, што раней належалі католікам. Анатоль Грыцкевіч дадае вельмі слушную агаворку, што католікам вярталіся іх храмы, акрамя тых, што былі перададзены праваслаўнай царкве. Менавіта ў гэтым і заключаецца сутнасць праблемы. Згодна архіўным данным большая частка каталіцкіх касцёлаў і манастыроў пры іх закрыцці перадавалася ў праваслаўнае ведамства.

Зусім не так адназначна вырашалася і пытанне адносна выкладання Закона Божага на роднай мове вернікаў. Не маючы патрэбы спыняцца падрабязна на гэтым пытанні, бо яно будзе разгледжана асобна, адзначым толькі, што каталіцкая царква скарыстала гэтае права, каб выкладаць Закон Божы для вернікаў-беларусаў на польскай мове. Што ж тычыцца амністыі уніятам і скарыстання яе пры пераходзе ў лацінства, то дастаткова параўнаць

лічбы перайшоўшых у рыма-каталіцтва і тых, што былі далучаны да праваслаўнай царквы падчас скасавання уніі (1839 г.). Але нягледзячы на тое, што рэзультатыўнасць дадзенай з'явы была не такой ужо і вялікай (якую б лічбу мы не ўзялі за аснову, яна будзе вагацца ў межах 1–1,5% у залежнасці ад колькасці праваслаўных жыхароў, што жылі ў пяці беларуска-літоўскіх губернях), ёй надавалася вялікая ўвага. Працягвалі друкавацца і артыкулы, што прыводзілі самыя розныя, фантастычныя лічбы тых, хто быццам бы перайшоў у каталіцтва[21]. Адгалоскі тых падзей чуваць і сёння.

Не менш складанай заставалася праблема міжканфесіянальных (змешаных) шлюбаў, якія былі дазволены Св. Сінодам яшчэ ў 1721 г. Але закон прадугледжваў, каб святое таінства шлюбу праваслаўных з хрысціянамі іншых канфесій адбывалася ў праваслаўных храмах і праваслаўнымі свяшчэннікамі[22]. Указ ад 17 красавіка (як і маніфест ад 17 кастрычніка) 1905 г. захаваў перавагу праваслаўнай царквы і рэгулюючую ролю дзяржавы. Як слушна заўважае расійскі даследчык Л. Гарызонтаў: «Ён не ўводзіў новых правілаў, для рэгулявання парадку заключэння «разноверных» шлюбаў і вызначэння канфесійнай прыналежнасці народжаных у ім дзяцей. На стадыі падрыхтоўкі закона важнай зноў апынулася пазіцыя дзяржаўнай царквы, прадстаўнікі якой сцвярджалі, што існуючае заканадаўства ўспрымаецца насельніцтвам як трэба і пужалі міністраў наступствамі яго адмены»[23]. Згодна з гэтымі законамі змешаныя шлюбы (калі адзін з уступаючых у шлюб быў праваслаўным) павінны былі адбывацца па праваслаўным абрадзе, а дзеці, што нарадзіліся ад такога шлюбу, хрысціцца і выхоўвацца па правілах праваслаўнай царквы. У выпадку, калі хтосьці з бацькоў, што быў праваслаўным, пераходзіў у каталіцтва, то і дзеці да 14 гадоў маглі быць пераведзены ў каталіцтва. З дадзенага агульнарасійскага правіла рабілася выключэнне. У Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай губернях заключэнне шлюбу паміж асобамі розных хрысціянскіх канфесій адбывалася па абрадзе і святаром той веры, да якой належала нявеста. Калі святар адмаўляўся, то гэту місію мог выканаць свяшчэннік іншага веравызнання (жаніха). Дзеці, што нарадзіліся ад такога шлюбу, выхоўваліся: сыны – у веры бацькі, дочкі – у веры маці[24].

Беларускі гісторык А. Жлутка звяртае ўвагу на такія цікавыя моманты ў дзейнасці каталіцкага касцёла ў пачатку XX ст. Ён піша: «Пасля рэвалюцыі 1905 г. ва ўмовах адноснай лібералізацыі адбылося пэўнае ажыўленне дзейнасці каталіцкага касцёла на Бела-

русі, былі адроджаныя асобныя парафіі. Узнік і стаў імкліва нарастаць беларускі нацыянальна-культурны рух, якому спачувала і спрыяла частка каталіцкага духавенства»[25]. І гэта сапраўды так. Але калі прааналізаваць падзеі больш уважліва, то добра відаць, што не адбылося асаблівых змен у пытанні пабудовы каталіцкіх храмаў. Па-ранейшаму, толькі праваслаўная канфесія мела ў гэтай справе шырокія магчымасці і падтрымку дзяржавы. Праўда, рост колькасці праваслаўных цэркваў ужо не адбываўся такімі хуткімі тэмпамі, як гэта назіралася пасля паўстання 1863 г. У пачатку XX ст. гэтыя тэмпы былі больш маруднымі. Пра гэта сведчыць прыклад Віленскай губерні. За 1905–1913 гг. у губерні было пабудавана 28 храмаў праваслаўных і столькі ж каталіцкіх. На першы погляд можа падацца, што гэта відавочныя змены канфесіянальнай палітыкі ў кірунку верацярпімасці, стварэння роўных умоў для жыцця-дзейнасці ўсіх канфесій. Але ў дадзенай губерні колькасць католікаў у 2 з лішнім разы пераўзыходзіла колькасць праваслаўных вернікаў, а колькасць каталіцкіх храмаў у 1,5 разы была меншай, чым праваслаўных цэркваў.

У заключэнне хацелася б звярнуцца яшчэ да адной ацэнкі дадзенага дакумента. У кнізе «История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII–XX вв.) в документах Российского государственного архива» адзначаецца: «17 красавіка 1905 года імператар Мікалай II выдаў Маніфест аб свабодзе веры ў Расійскай Імперыі, які прынёс нарэшце доўгачаканае ўраўненне правоў розных веравызнанняў. Больш не павінна было быць прававога пераследу з-за пераходу праваслаўных у другую веру. Маніфест садзейнічаў, да некаторай ступені, нармалізацыі стану Каталіцкай Царквы, хаця некаторыя праблемы ўсё ж засталіся»[26]. Нам падаецца некарэктным весці размову аб «свабодзе» веры, калі не быў прадугледжаны, як ужо адзначалася вышэй, пазаверавызнаўчы стан. Па-другое, «доўгачаканае ўраўненне правоў розных веравызнанняў» так і не адбылося. Што відаць з далёка не поўнага аналізу ўказа. А вось гаворачы пра тое, што «Маніфест садзейнічаў, да некаторай ступені, нармалізацыі стану Каталіцкай Царквы», то тут і трэба перш за ўсё высветліць гэтую ступень нармалізацыі.

Такім чынам, аналіз нешматлікай літаратуры сведчыць, што як напачатку XX ст., так і на этапе сённяшнім уважлівага і аб'ектыўнага аналізу ўказа 1905 г., яго падрыхтоўкі і наступстваў у расійскай і іншай замежнай гістарыяграфіі не адбылося. Змены ў ацэнцы гэтага заканадаўчага акта, яго асаблівасцей для беларускай тэрыторыі, уплыву на канфесіянальную сітуацыю ў краі адбыва-

юцца ў апошнія гады ў беларускай гістарыяграфіі. Маецца на ўвазе перш за ўсё манаграфічнае даследаванне В. Яноўскай. Дзякуючы выкарыстанню вялікага кола архіўных крыніц і іх аналізу, аўтар прыходзіць да высноў, што указ аб верацярпімасці не прынёс жаданага спакою рэлігійнаму жыццю беларуска-літоўскіх губерняў. Пераходы насельніцтва з праваслаўя ў іншыя канфесіі, галоўным чынам у каталіцкую, абвастрыў узаемаадносіны паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам. А тыя ў сваю чаргу сеялі гэтую нецярпімасць сярод вернікаў. Не былі ажыццёўлены і роўныя правы, на якія разлічвалі ўсе канфесіі. Прывілеі па-ранейшым заставаліся ў праваслаўнай царквы. Што да правоў іншых, то праз невялікі адрэзак часу пачаліся адступствы нават ад таго, што даваў указ.

---

[1] Богословский вестник. 1910. М., 1910. Т. 1. С. 83.

[2] Там жа.

[3] Цыт. па: Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. Мн., 2002. С. 74.

[4] Минские епархиальные ведомости за 1905 год. Мн., 1906. С. 478.

[5] Минские епархиальные ведомости за 1905 год. С. 479.

[6] Смолич И. К. История Русской Церкви. М., 1997. Кн. 8. 1700–1917. Ч. 2. С. 311.

[7] Поспеловский Д. В. Русская православная церковь в XX веке. М., 1995. С. 29, 30.

[8] Милюков П. Н. Очерки истории русской культуры: В 3 т. Церковь. Религия. Литература. М., 1994. Т. 2: Вера. Творчество. Образование. Ч. 1. С. 204.

[9] Русское православие: вехи истории. М., 1989. С. 396, 397.

[10] Цыт. па: Яноўская В. В. Назв. твор. С. 75.

[11] Особые журналы Совета Министров царской России. 1907 год. М., 1984. Ч. II. С. 451.

[12] Яноўская В. В. Назв. твор. С. 77.

[13] Там жа.

[14] История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII–XX вв.) в документах Российского государственного архива. СПб.; Варшава, 1999. С. 128.

[15] НГА Літвы, ф. 694, воп, 1, спр. 2954, арк. 110 адв. (Польскія гісторыкі на пачатку XX ст. згадвалі такія лічбы: за 1905–1909 гг. у «Паўночна-Заходнім краі» перайшло ў каталіцтва 56 тыс. праваслаўных. – Wasilewski L. Litwa i Białoruś. Kraków, 1912. S. 86–87).

[16] РДГА у С-Пецярбурзе, ф. 821, воп. 10, спр. 279, арк. 62 адв., 63.

[17] Мяжа 17 красавіка – зразумелая. Гэта дата прыняцця закона аб верацярпімасці. Што да 1 лістапада, відаць, на думку міністра, да гэтага часу, з улікам тэрмінаў тагачаснай службы зносін, мясцовым уладам

і рымска-каталіцкім епіскапам ужо быў вядомы цыркуляр ад 18 жніўня 1905 г., які ўтрымліваў часовыя правілы пераходаў з аднаго веравызнання ў другое.

[18] Грыцкевіч А. Удзел у адраджэнні // Наша вера. 1998. № 2. С. 87.

[19] Ракоўскі М. Супрацьстаянне // Наша вера. 1996. № 1. С. 87.

[20] Смалянчук А. Ф. Польскі грамадска-палітычны рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 года: Аўтарэф. дыс. … докт. гіст. навук. Мн., 2002. С. 17.

[21] Так, у 1914 г. у газеце «Biełarus» (№ 14–15 за 1914 г.) адзначалася, што ў Расіі за 1905–1909 гг. у каталіцтва вярнулася каля 230 тыс. былых уніятаў.

[22] Смолич И. К. История русской церкви. 1700–1917. М., 1997. Ч. 2. С. 307.

[23] Горизонтов Л. Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. М., 1999. С. 93.

[24] Яноўская В. Назв. твор. С. 81.

[25] Жлутка А. Спроба кароткага падсумавання гісторыі каталіцкага Касцёла на Беларусі // Наша вера. 2000. № 4. С. 68.

[26] История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII–XX вв.) в документах Российского государственного архива. СПб.; Варшава, 1999. С. 128.

7.4. Канфесіі ў Беларусі: стан і праблемы сучаснай айчыннай гістарыяграфіі

Навуковая традыцыя вывучэння ролі канфесій у нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі толькі пачынае складвацца. На працягу апошніх двух стагоддзяў месца і роля розных канфесій у мінулым Беларусі ацэньвалася гісторыкамі па-рознаму, зыходзячы з належнасці аўтара да той, ці іншай канфесіі, навуковай школы, яго нацыянальнасці і інш.

Характарыстыка дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі – прадмет асобай размовы і не з'яўляецца мэтай нашага аналізу. Што тычыцца савецкага перыяду, вядома, што вывучэнне канфесійнай гісторыі наогул не ўхвалялася. І абумоўлена гэта было перш за ўсё тым, што афіцыйная грамадская думка ігнаравала такую тэму, як гісторыя Царквы. Гэта цалкам адпавядала афіцыйна пануючаму атэістычнаму курсу. Нават пры падрыхтоўцы прафесійных гісторыкаў рэлігійны фактар ва ўнутранай і знешняй палітыцы ВКЛ, Рэчы Паспалітай практычна не вывучаўся. Не вывучалася і гісторыя Царквы як важнага грамадскага інстытута ў часы Расійскай імперыі. І ўсё гэта нягледзячы на тое, што мелася не толькі навуковая, але і грамадская патрэба. У пачатку XX ст. рух за беларускае

нацыянальнае адраджэнне, які выспяваў на працягу ўсяго XIX ст., набыў даволі масавы характар. Яго мэтай з'яўлялася самасцвярджэнне беларусаў як самастойнай нацыі ў межах этнічнага рассялення, прызнанне факта яе існавання іншымі народамі і дзяржавамі, а разам з тым і права беларусаў на «пачэсны пасад паміж народамі», нацыянальную дзяржаўнасць[1], а значыць і на сваю гісторыю. Для дасягнення пастаўленай мэты трэба было вырашыць шэраг вельмі складаных задач. Адна з іх – пераадоленне адмоўнага ўплыву на фарміраванне і развіццё беларускай нацыі канфесійнага расколу этнасу на праваслаўных і католікаў. Гэты раскол шырока выкарыстоўваўся праваслаўным духавенствам у мэтах русіфікацыі, каталіцкім – паланізацыі беларусаў. Але, нягледзячы на відавочную мэтазгоднасць вывучэння канфесійнай гісторыі, такога напрамка ў савецкай гістарыяграфіі Беларусі не існавала.

Праўда, усё было не так адназначна. І перш чым перайсці да высвятлення стану сучаснай айчыннай гістарыяграфіі па канфесійнай гісторыі Беларусі, маецца патрэба коратка спыніцца на этапах яе станаўлення і эвалюцыі. На сённяшні дзень ужо склалася па-сутнасці агульнапрызнаная перыядызацыя (разыходжанні ёсць, але ў ацэначных палажэннях пры характарыстыцы таго, ці іншага этапа). Найбольш выразна яна пададзена ў артыкуле Святланы Марозавай[2]. Як слушна заўважае аўтар артыкула, распрацоўка канфесійнай гісторыі Беларусі пачынаецца з канца XVIII ст.[3]. Гэта было звязана са зменай палітычна-рэлігійнай сітуацыі ў краі і выклікана патрэбамі ўрада Расійскай імперыі выпрацоўкі палітычнага курса з улікам усіх, у тым ліку і рэлігійных, асаблівасцей далучанай тэрыторыі. Гэты этап (з канца XVIII ст. да пачатку 60-х гадоў XIX ст.), бадай, самы супярэчлівы ў айчыннай гістарыяграфіі (маецца на ўвазе, як сама канфесійная гісторыя перыяду, так і ацэнка гістарыяграфічнай спадчыны XIX ст.).

Другі этап (60-я гады XIX ст. – 20-я гады XX ст.) – найбольш плённы ў распрацоўцы беларускай рэлігійнай праблематыкі[4]. Характэрнай рысай расійскай гістарыяграфіі гэтага перыяду з'яўляецца сцвярджэнне таго, што «… знаходзячыся паміж дзвюма больш моцнымі дзяржавамі, культурамі і рэлігіямі, Беларусь занадта слабая для самастойнасці, не ў стане выпрацаваць нешта сваё, а толькі можа схіліцца да Расіі або да Польшчы»[5]. Гэтыя пастулаты настолькі трывала ўвайшлі не толькі ў расійскую, але і ў еўрапейскую гістарыяграфію, што і зараз амаль цалкам дамінуюць у ёй. Таму, думаецца, неабходна больш уважліва засяродзіць на гэтым увагу.

У апошнія гады часта даводзіцца чуць аб унікальным палітыка-геаграфічным і культурна-гістарычным становішчы Беларусі. Унікальнасць гэтая заключаецца ў тым, што тэрыторыя Беларусі апынулася на памежжы дзвюх хрысціянскіх веравызнанняў, двух светаў – усходнеславянскага і заходнеславянскага – і стала месцам сустрэчы, сутыкненняў і ўзаемадзеяння дзвюх цывілізацый. Усё гэта абумовіла своеасаблівасць і індывідуальнасць духоўнай культуры, канфесійнага фактару і этнічна-нацыянальнага менталітэту беларускага народа.

Праўда, адзінства ў разуменні і характарыстыцы гэтай з'явы не назіраецца, як сярод даследчыкаў нашай краіны, так і з боку нашых суседзяў. У 1995 г. у адным з варшаўскіх часопісаў «Lithuania» быў апублікаваны артыкул пад назвай «Беларусь: абшар культуры плюралізму». Напісаў яго Бруна Дрвескі, аўтар шматлікіх кніг па гісторыі і сацыялогіі. Вось як ён бачыць гісторыю нашай Айчыны: «Гісторыя Беларусі і прыгожая, і цяжкая – нават страшная. Але калі часам здаралася, што беларусы ўдзельнічалі-такі ва ўціску іншых народаў, то выключна з той прычыны, што самі былі змушаныя, змабілізаваныя да таго праз мацнейшых за сябе. Амаль што ніколі беларусы як нацыя не душылі каго-небудзь самастойна. З другога боку, беларусы адыгралі значную ролю ў многіх цывілізацыйных працэсах і ў фарміраванні культурнага абшару на мяжы Усходу і Захаду Еўропы: у развіцці розных версій хрысціянства (праваслаўя, каталіцтва, пратэстанцтва, уніяцтва), прыманні розных іншаверцаў (татараў, караімаў, іудзеяў, армянаў), удзеле ў такіх глабальных плынях, як Рэнесанс, Рэфармацыя, Асветніцтва, розных накірунках сацыялізму… Безумоўна, кожны працэс, у якім удзельнічалі беларусы, часам ішоў «не туды», і на тым шляху было шмат памылак і злачынстваў, шмат чалавечага гора і трагедыі ўсяго народа»[6].

Гэта, як адзначана вышэй, думка, ацэнка гісторыі Беларусі бліжэйшых яе суседзяў – палякаў. Якія ведаюць, вывучаюць яе гісторыю, не адмаўляючы ў своеасаблівасці, адметнасці. Але адметнасць гэтая бачыцца ім у наступным: «… адметнасць гэтай зямлі ўвабрала ў сябе занадта шмат польскіх уплываў, каб быць рускай. Але гэтая зямля адначасова ўвабрала вельмі шмат рускіх уплываў, каб быць польскай»[7].

Як бачым, нават нашы бліжэйшыя суседзі, не адмаўляючы нам у наяўнасці сваёй адметнай гісторыі, усё ж шукаюць ёй месца толькі паміж Расіяй і Польшчай, паміж рускім і польскім уплывамі.

У станаўленні такіх адносін да гісторыі Беларусі, фарміраванні стэрэатыпу ў ацэнцы яе гістарычнай спадчыны даволі вялікая роля належала, на нашу думку, хрысціянскім канфесіям (найперш праваслаўнай і каталіцкай). Праваслаўная царква выхоўвала сваіх вернікаў такім чынам: Беларусь – спрадвеку рускі праваслаўны край, таму і уніятаў, і католікаў мясцовага паходжання трэба вяртаць у веру продкаў. Каталіцкі касцёл галоўным чынам імкнуўся ўтрымаць і распаўсюдзіць свой уплыў на мясцовае насельніцтва. Праўда, і тут усё было далёка не так адназначна.

Характэрнай рысай другога этапа вывучэння канфесійнай гісторыі Беларусі стала нараджэнне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, якую веравызнаўчая праблема цікавіла «найперш з пазіцыі нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, нацыянальнай самадзейнасці беларусаў»[8]. Прадстаўнікі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі (М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, А. Цвікевіч), імкнучыся трактаваць канфесійную гісторыю Беларусі, як працэс адасоблены ад аналагічных працэсаў у Расіі і Польшчы, адмаўляліся ад здабыткаў папярэднікаў, спрабавалі рэвалюцыйна перагледзець тэарэтычныя падыходы да асэнсавання мінулых працэсаў. Мабыць, менавіта гэтае поўнае адмаўленне і выклікала супярэчлівасць і непаслядоўнасць іх уласных поглядаў. Тым не менш, я цалкам пагаджаюся з высновай С. Марозавай, што «гісторыкі нацыянальнай арыентацыі здзейснілі пералом у поглядах на ролю асноўных хрысціянскіх плыняў у лёсе беларускага народу»[9]. Менавіта ў гэтым заключаецца іх унёсак у айчынную гістарыяграфію.

Наступны этап – 30–80-я гады XX ст. – перыяд застою ў вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі. І ў гэтым ёсць згода ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. Існуюць, праўда, разыходжанні ў ацэнцы тых прац, што усё ж выходзілі, няхай сабе і ў рэчышчы навуковага атэізму. Разыходжанні ад поўнага адмаўлення і негатыўнага стаўлення да гэтых твораў да сцвярджэння неабходнасці больш памяркоўных і дыферэнцыраваных падыходаў да іх, выкарыстання таго станоўчага (галоўным чынам, вялікага эмпірычнага матэрыялу), што ўтрымліваюць асобныя працы. Ды і ў характарыстыцы самога гэтага этапа ў канфесійнай гісторыі Беларусі даследчыкі неадназначныя. Каталіцкі святар У. Завальнюк у сваёй кандыдацкай дысертацыі разглядае гэты этап як аднародны, даючы яму цалкам негатыўную характарыстыку: «…метадалагічна-тэарэтычнай асновай гістарычных даследаванняў з'яўляўся класавы падыход, які прыносіў у даследаванні залішнюю палітызаванасць, паказваў

прывержанцаў рэлігійнай ідэалогіі ворагамі савецкай улады»[10]. Ідэалагічнае наступства, сцвярджае У. Завальнюк, узмацнілася ў сувязі з работай і рашэннямі II Ватыканскага Сабора (1963–1965 гг.), які падняў аўтарытэт рымска-каталіцкай царквы ў свеце, у тым ліку і ў вернікаў Беларусі[11]. Што тычыцца прац беларускіх даследчыкаў таго часу, то яны «неслі на сабе адбітак свайго часу, створаных дагматычных схем»[12].

Больш крытычна і дыферэнцыравана падыходзіць да ацэнкі гістарыяграфіі 60–80-х гг. С. Марозава. З аднаго боку, сцвярджае яна, «гістарыяграфія была пастаўлена ў такія ўмовы, пры якіх царкву можна было паказваць толькі як феадальную арганізацыю, вотчынніка і эксплуататара народных масаў». У той жа час, адзначае даследчыца, у гістарыяграфіі 60-х гг. «прасочваецца асцярожная цікавасць» да уніі, а ў 70–80-я гг. Э. Вецер, Н. Высоцкая, Г. Галенчанка, Ю. Лабынцаў, К. Лявонава, А. Мальдзіс, С. Падокшын, Ю. Хадыка даследавалі «культурна-інтэлектуальны набытак асноўных хрысціянскіх культавых інстытутаў як помнікаў беларускай літаратуры, мастацтва, кніжнай культуры. А аўтары першага абагульняючага даследавання развіцця беларускага этнасу прызналі памылковасць тэзісу, што беларусы заўсёды ўяўлялі сабой выключна праваслаўную этна-канфесійную супольнасць…»[13]. Закраналіся пытанні канфесійнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі і ў некаторых працах па гісторыі Беларусі XIX ст.[14], але не адлюстроўвалі з належнай глыбінёй і паўнатой складанае канфесійнае становішча, што існавала ў той час у Беларусі.

Ды і пачатковы перыяд гэтага этапа не быў аднаколерным. І ў той час у Беларусі працягвала існаваць пэўная традыцыя даследаванняў па канфесійнай гісторыі, што было звязана з дзейнасцю асобных вучоных. Несумненна важнейшае месца сярод іх належыць М. Нікольскаму. Даследчык гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта А. Яноўскі адзначае, што нягледзячы на тое, што ў галоўнай сферы сваёй дзейнасці – адукацыйнай і навуковай – БДУ быў вымушаны трымацца антырэлігійных установак, буйнейшы знаўца гісторыі рэлігіі прафесар М. Нікольскі ў 20-я гг. чытаў менавіта гісторыю рэлігіі, а не атэізм[15]. І яго аўтарытэт сярод замежных калег быў даволі моцны, бо навуковыя распрацоўкі вучонага[16] разглядалі таксама гісторыю рэлігій і цэркваў.

Даволі актыўна гісторыя царквы вывучалася даследчыкамі, якія друкавалі свае творы за мяжой, карыстаючыся трапіўшымі на Захад мемуарамі і архіўнымі матэрыяламі[17]. Аднак гэтыя творы былі амаль невядомымі ў Беларусі і толькі ў апошнія дзесяці-

годдзі трапілі ў поле зроку навукоўцаў. «Выдавецкі абсяг рэлігійнага кнігадруку на эміграцыі, – сцвярджае Ю. Гарбінскі, – дастаткова шырокі – ад перакладаў Сьвятога Пісання … да царкоўна-гістарычнай літаратуры»[18]. Па яго падліках за пасляваенны час у замежжы было надрукавана 116 царкоўна-гістарычных кніг, з іх 53 – праваслаўнымі, 52 – католікамі, 7 – пратэстантамі, 4 – іншымі хрысціянскімі суполкамі[19].

Рубеж 1980–1990-х гг. адзначаны вялікімі зменамі ў палітычнай сітуацыі краіны. Што выклікала інтэнсіўны працэс пераасэнсавання айчыннай гісторыі скрозь прызму нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў беларускага народа. З'яўленне магчымасці больш глыбокага даследавання малавывучаных гістарычных падзей, скіроўвае намаганні гісторыкаў на запаўненне наяўных прабелаў. Шэраг праблем, што раней знаходзіліся ў заняпадзе, выходзяць на першы план, займаючы сваё месца сярод прыярытэтных напрамкаў у айчыннай гістарыяграфіі. Менавіта рубеж 1980–1990-х гг. і становіцца часам зараджэння і станаўлення сучаснай школы гістарычных даследаванняў па канфесійнай гісторыі Беларусі. І калі для расійскай гістарыяграфіі ў дачыненні да літоўска-беларускіх тэрыторый характэрнай рысай застаецца даволі моцны ўплыў ранейшых агульнапрынятых палажэнняў, то для беларускай – усплеск розных думак і меркаванняў. Крытычны падыход да ацэнкі мінулых падзей бясспрэчна зацвердзіўся ў беларускай гістарыяграфіі па канфесійнай праблематыцы.

Якія ж канкрэтна поспехі і дасягненні сучаснай гістарычнай навукі ў вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі? Паспрабуем вылучыць галоўныя (на наш погляд) моманты гэтага працэсу. Важнейшым вынікам навуковай распрацоўкі праблемы з'яўляецца публікацыя манаграфічных даследаванняў. «Паказальна, – слушна адзначае С. Марозава, – што новы этап даследавання канфесійнай гісторыі Беларусі адкрыла перавыданне працы М. Нікольскага «История русской церкви» з раздзелам аб Берасцейскай уніі, які па ідэалагічных меркаваннях быў апушчаны ў ранейшых выданнях. Праўда, трэба ўдакладніць, што гэтаму папярэднічала перавыданне вышэйназванай кнігі А. Мартаса «Беларусь в исторической государственной и церковной жизни», якое ажыццявіў Беларускі Экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы ў 1990 г.»[20].

Важным крокам на шляху навуковай распрацоўкі гісторыі канфесій стала першая абагульняючая калектыўная манаграфія «Канфесіі на Беларусі»[21]. У манаграфіі аналізуецца лёс усіх канфесій на працягу даволі-такі вялікага гістарычнага адрэзку часу –

больш двух стагоддзяў. Вялізны масіў архіўнага матэрыялу, які да гэтага часу доўгія гады праляжаў незапатрабаваным у архівасховішчах Мінска, Вільнюса, Санкт-Пецярбургу, быў упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак. І. Трацяк у сваёй кандыдацкай дысертацыі адзначае, што для дадзенай кнігі «характэрна адсутнасць аўтарскіх сімпатый да той, ці іншай канфесіі…, што надае ёй сапраўдную навуковасць, робіць аб'ектыўнай і змястоўнай». Галоўны вынік выдання кнігі, на нашу думку, заключаецца ў тым, што яна актывізавала навуковае вывучэнне ўжо больш вузкіх (у храналагічным і тэматычным плане) аспектаў дадзенай праблемы.

У 2002 г. адзін з аўтараў вышэйназванай манаграфіі В. Яноўская (Грыгор'ева) апублікавала асобную манаграфію[22]. У ёй значна шырэй за кошт увядзення не толькі новых матэрыялаў, але і новых аспектаў (дабрачыннасць, параўнальны аналіз эканамічнага стану цэркваў і духавенства, выдавецкая дзейнасць і інш.) падаецца гісторыя ўсіх хрысціянскіх канфесій у Беларусі, пачынаючы з паўстання 1863–1864 гг. да пачатку Першай сусветнай вайны.

Пашырэнне краязнаўчай базы дазволіла даследчыкам пайсці ўглыб праблемы, што вылілася ў публікацыях шэрагу манаграфій, прысвечаных розным канфесіям, або аналізу асобных аспектаў праблемы. Піянерамі айчыннай гістарыяграфіі ў даследаванні гісторыі і сучаснага стану ў Беларусі стараверства можна лічыць супрацоўнікаў Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі, якія ў 1992 г. апублікавалі кнігу «Старообрядчество в Беларуси»[23]. Зразумела, што ў адной невялікай па аб'ёме публікацыі немагчыма было грунтоўна даследаваць увесь комплекс пытанняў, звязаных з гісторыяй і сучасным станам стараверства ў Беларусі. Але іх праца стала важным штуршком для разгортвання далейшых даследаванняў. Вядучым даследчыкам гэтай праблемы ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, бясспрэчна, з'яўляецца А. Гарбацкі. Яго манаграфіі[24] грунтуюцца не толькі на вялізным архіўным матэрыяле (з архівасховішчаў Масквы, С.-Пецябургу, Мінска, Гродна), але і этнаграфічных экспедыцыях, якія ён сам ажыццявіў. Праўда, не ўсе яго канцэптуальныя падыходы да даследавання праблемы раздзяляюць канфесійныя гісторыкі. Як сцвярджае даследчыца канфесійнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі А. Філатава, «у рабоце захаваўся традыцыйны праваслаўны погляд на стараверства, як бы пакідаючы ў цені своеасаблівасці беларускай тэрыторыі»[25].

Шэраг кніг, што прысвечаны іншым хрысціянскім і нехрысціянскім канфесіям, апублікаваны ў другой палове 90-х гадоў XX – пачатку XXI ст.[26]. У 2001 г. выйшаў у свет энцыклапедычны даведнік «Рэлігія і царква на Беларусі».

Паказчык развіцця той ці іншай навуковай дысцыпліны – напісанне дысертацыйных даследаванняў. За апошнія некалькі гадоў у Беларусі абаронена значная колькасць доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, прысвечаных тым, ці іншым аспектам праблемы[27]. Шэраг тэм знаходзіцца ў распрацоўцы. Па звестках рэспубліканскага навуковага савета па праблеме «Гісторыя Беларусі» ў полі зроку гісторыкаў знаходзяцца пытанні ролі праваслаўных манастыроў у грамадскім жыцці Беларусі XIX – пач. XX ст.; аднаўленне і дзейнасць праваслаўных брацтваў у другой палове XIX ст.; рэлігійная палітыка савецкай улады і яе ажыццяўленне ў заходніх абласцях Беларусі; уплыў рэлігійнага пытання на стан беларускага грамадства ў канцы XVI – першай палове XVII ст.; дзейнасць пратэстанцкай царквы ў Беларусі ў 1943–1985 гг.; ліквідацыя уніяцкай царквы ў Беларусі; міжканфесійныя адносіны ў Беларусі ў другой палове XIX – пач. XX ст.; сфрагістыка рэлігійных устаноў, як крыніца па гісторыі канфесій у Беларусі ў XVIII–XX стст. і інш.

Распачата даследаванне асобных праблем гісторыі праваслаўнай і рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі з боку хрысціянскага духавенства. У дачыненні да гісторыі каталіцкага касцёла ў Беларусі – гэта перш за ўсё публікацыі і кандыдацкая дысертацыя У. Завальнюка. У апошнія гады значна актывізавалася даследчыцкая і выдавецкая дзейнасць праваслаўнай царквы. Навуковыя артыкулы гістарычнага характару друкуюцца ў «Трудах Минской Духовной Академии», аднавіліся «Епархиальные ведомости». Кніжную прадукцыю выдаюць два праваслаўныя брацтвы (Трох Віленскіх пакутнікаў і ў імя Архістраціга Міхаіла), выдавецтвы пры манастырах, Беларускім Экзархаце, шэраг прыватных. За апошнія 15 гадоў імі было выдадзена больш за 340 найменняў кніг духоўнага зместу[28]. Ёсць сярод іх і гістарычныя працы, і кнігі даведачнага характару[29].

Важнейшым напрамкам развіцця гістарычных даследаванняў, устанаўлення ісціны па шэрагу спрэчных пытанняў з'яўляецца супрацоўніцтва свецкіх і царкоўных гісторыкаў. І хаця вопыт яшчэ назапашаны невялікі, але вынікі такога супрацоўніцтва ўжо ёсць. Па-першае, гэта правядзенне канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і выданне тэзісаў выступленняў дадзенай канферэнцыі[30]. І хаця, як і трэба было чакаць, па многіх пытаннях былі выказаны розныя пункты гледжання, дыялог быў вельмі слушным, як для свецкіх, так і для царкоўных гісторыкаў. Дзякуючы супрацоўніцтву з прадстаўнікамі каталіцкай царквы беларускія канфесій-

ныя гісторыкі мелі магчымасць прыняць удзел у шэрагу навуковых канферэнцый, што праходзілі пад эгідай Люблінскага каталіцкага універсітэта і сталі добрай школай для вывучэння праблемы. У 2003 г., дзякуючы супрацоўніцтву і асабістай падтрымцы Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Патрыяршага Экзарха усея Беларусі Філарэта, выйшла кніга «Православные монастыри Беларуси». Кніга разлічана на шырокага чытача, але ў яе аснову пакладзены шматгадовыя архіўныя напрацоўкі гісторыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі – А. Філатавай і В. Яноўскай. Вынікам супрацоўніцтва свецкіх гісторыкаў (у першую чаргу БДУ) з царкоўнымі праваслаўнымі гісторыкамі стала перавыданне кнігі, што была амаль невядомай для беларускай гістарыяграфіі[31].

Што тычыцца вывучэння канфесійнай гісторыі Беларусі ў праблемным зрэзе, то нявырашаных, спрэчных пытанняў, што выспелі к пачатку III тысячагоддзя, значна больш, чым адказаў. Паспрабуем вылучыць найбольш важныя з іх.

Вывучэнне дахрысціянскіх вераванняў старажытнага насельніцтва тэрыторыі сучаснай Беларусі актыўна пачалося ў другой палове XIX – пачатку XX ст. І да сённяшняга дня менавіта дадзены перыяд застаецца найбольш прадуктыўным у адносінах да вывучэння гэтай праблемы[32]. У шматлікіх працах былі зафіксаваны і апісаны тыя рэшткі язычніцтва, што ўсё яшчэ мелі месца ў свядомасці мясцовага насельніцтва. Больш таго, некаторыя аўтары зрабілі спробу прааналізаваць язычніцкія вераванні, прывесці іх у адпаведную сістэму і нават параўнаць з заходнееўрапейскімі. У савецкія часы найбольшую цікавасць уяўляюць творы М. Нікольскага. Праца па праблеме была прыпынена на некаторы час і ажывілася толькі ў 1957 г. у сувязі са стварэннем Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Але найбольшы росквіт гістарыяграфіі язычніцтва назіраецца з пачатку 90-х гадоў.

У навуковым друку, на навуковых канферэнцыях рознага кшталту з пачатку 90-х гадоў даволі актыўна абмяркоўваюцца праблемы дахрысціянскіх (язычніцкіх, або паганскіх)[33] вераванняў старажытнага насельніцтва беларускіх зямель. У кола зроку вучоных трапілі праблемы існавання рунічнай пісьменнасці, касмалагічныя ўяўленні старажытнага беларускага насельніцтва, захаванне язычніцкіх пражыткаў у культуры, рэканструкцыі беларускай абраднасці на аснове фальклору, прысутнасці элементаў індаеўрапейскай духоўнай спадчыны ў фальклоры. Але, нягледзячы на тое, што некаторыя даследчыкі дахрысціянскіх вераванняў жыха-

роў беларускіх зямель сцвярджаюць аб «дастатковай сфарміраванасці беларускай гістарыяграфіі язычніцтва»[34], многія ключавыя пытанні праблемы не атрымалі агульнапрынятага пункту гледжання. Так, у даследчыкаў няма чоткага уяўлення, ці існаваў увогуле ўсходнеславянскі пантэон да таго часу, як яго штучна стварыў князь Уладзімір Святаславіч. Для станоўчага адказу на гэта пытанне, лічыць А. Буглак, у навуцы няма дастатковых падстаў. К канцу I тыс. н. э., сцвярджаюць даследчыкі, ужо сфарміраваліся свае рэгіянальныя пантэоны[35]. Тое, што практычна ўсе ўсходнеславянскія плямёны мелі такія аднолькавыя архаічныя персанажы, як Пярун, Вялес (Волас), Мокаш сведчыць не столькі пра адзіны ўсходнеславянскі пантэон, колькі пра агульную індаеўрапейскую прааснову[36].

Пра «беларускі паганскі пантэон», нікольки несумняваючыся ў яго існаванні, распавядае беларускі археолаг Э. Зайкоўскі[37]. Да вярхоўных багоў ён залічвае Бога (інакш Сварога), Вялеса і Пяруна. Жаночыя пары вярхоўных багоў: у Бога (Сварога) – Лада, у Пяруна – Мокаш (Цёця), у Вялеса – персанаж, якому на змену прыйшла святая Кацярына. Больш нізкі ровень пантэона, сцвярджае Э. Зайкоўскі, значна шырэйшы: ад Дажбога да Бялуна. Менавіта гэты, апошні персанаж, (як і ў цэлым сам падыход да выкладання праблемы) выклікаў нязгоду іншых даследчыкаў: «…Прага аўтара сфармаваць рэтраспектыўным чынам старажытнабеларускі пантэон … часам выяўляецца ў некрытычным падыходзе да разглядаемага матэрыялу. Так, сцвярджаючы, што Бялун – адно з божышчаў беларускага хрысціянскага пантэону, Э. Зайкоўскі даверліва наследуе вядомаму прадстаўніку т. зв. «міфалагічнай школы» А. Кіркору, схільнаму не толькі да празмернай ідэалізацыі міфа, але і да ўласнай міфатворчасці, які ў сваю чаргу «творча дапоўніў»[38] сціслую звестку пра Бялуна, пададзеную І. Насовічам: «Бялун – сівы дзед, які нібыта жыве ў жыце ля дарогі»[39].

Не вызначаны, як у расійскай, так і беларускай сучаснай гістарыяграфіі статус Рода. Як адзначае аўтар кандыдацкага даследавання А. Буглак, у другой палове XX ст., дзякуючы намаганням Б. Рыбакова, пытанне зноў набыло актуальнасць і заняло адно з вядучых месцаў у дыскусіях па славянскаму язычніцтву. Рыбакоў лічыць Рода вярхоўным богам славян, практычна роўным хрысціянскаму Саваофу, а Стрыбог і Сварог – гэта яго эпітэты. Культ Рода, на думку Б. Рыбакова, папярэднічаў культу Пяруна. Сярод прыхільнікаў гэтай версіі ёсць і беларускія аўтары[40]. Праўда, даследчык не ўлічвае апошнія напрацоўкі беларускай гістарыяграфіі.

Так, Э. Зайкоўскі, які ўжо шмат гадоў даследуе праблему, канцэнтруючы сваю ўвагу на рэгіянальных асаблівасцях беларускага язычніцтва[41], наогул не згадвае гэтае прозвішча сярод язычніцкага пантэона. Гэтую функцыю, на яго думку, выконваў «Бог – стваральнік Сусвету і бацька багоў, які жыве на небе і звязаны з гадавымі цыкламі прыроды, які лічыўся ўвасабленнем неба і святла, бацькам Сонца і агню. У летапісах гэты персанаж называецца Сварог»[42].

Няма адзінага погляду і на стан айчыннай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме. Побач з вышэйназваным пунктам погляду існуе і іншы. Адзначаючы шырокі грамадскі інтарэс да архаічных вытокаў этнічнай культуры ў апошнія дзесяцігоддзі ва ўсіх народаў Еўропы, М. Знак лічыць, што Беларусь да нядаўняга часу «быццам стаяла ўбаку ад гэтага інтэнсіўнага агульнаеўрапейскага працэсу самапазнання… Беларускія навукоўцы ўпарта распрацоўвалі толькі адно радовішча Традыцыі – фальклор»[43]. Нешматлікія (у параўнанні з суседнімі краінамі), лічыць М. Знак, манаграфіі апошніх 15 гадоў асвятляюць, як правіла, канкрэтныя сюжэты беларускай этнічнай традыцыі. Спробы стварэння абагульняючых версій, рэканструкцыі «беларускага космасу» здольны хіба толькі заблытаць недасведчанага чалавека[44]. Крытычна ацэньваецца аўтарам і акадэмічная прадукцыя па праблеме.

Адмоўная, па-сутнасці, ацэнка беларускай гістарыяграфіі па праблеме прасочваецца і ў кандыдацкай дысертацыі А. Буглака[45]. Менавіта прасочваецца, бо прозвішчы беларускіх даследчыкаў можна знайсці толькі сярод паслядоўнікаў канцэпцый акадэміка Б. Рыбакова і іншых вядомых расійскіх даследчыкаў, а ніяк ні ў якасці стваральнікаў самастойных версій. Адсутнасць аналізу беларускай гістарыяграфіі спарадзіла супярэчлівыя высновы аўтара. Так, ён сцвярджае, што «праблема існавання адзінага ўсходнеславянскага язычніцкага пантэона да канца XX стагоддзя была вырашана» не на карысць яго існавання, бо да гэтага часу ў розных плямёнах, верагодна, ужо сфарміраваліся свае рэгіянальныя пантэоны[46]. Тым не менш гэта не перасцерагло аўтара ад неадпаведнага метадалагічнага падыходу – аналізу язычніцкага пантэона, прысутнасці ў ім Рода і іншых архаічных персанажаў як адзінага, а не рэгіянальных, з іх адпаведнымі асаблівасцямі. На што здавалася і нацэльвала аўтара правільна пастаўленая мэта – «высветліць асаблівасці вывучэння і ўзровень распрацаванасці асноўных праблем усходнеславянскага язычніцтва ў ***беларускай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі*** (вылучана мною. – *Аўт.*) другой паловы XX ст.»[47].

Розныя падыходы, розныя ацэнкі паказваюць, што праблема існуе, цікавіць, даследуецца. Як навуковая, яна пачала актыўна ставіцца ў 90-я гг. XX ст. Да найбольш істотных дасягненняў яе вырашэння можна залічыць зборнік У. Васілевіча[48], у аснову якога пакладзены этнаграфічны і фальклорны матэрыял XIX ст., дапаможнік У. Коваля[49], дзе на агульным усходнеславянскім фоне шырока прадстаўлены матэрыял па беларускай міфалогіі. Беларускаму абрадаваму фальклору ў агульнаславянскім кантэксце прысвечана даследаванне А. Фядосіка[50]. «Доўгачаканай спробай» адказаць на многія пытанні, што тычацца беларускай міфапаэтычнай карціны свету, назваў рэцэнзент М. Знак энцыклапедычны слоўнік «Беларуская міфалогія» – плён шматгадовай даследчыцкай працы вялікай групы навукоўцаў.

Размову пра ўплыў той ці іншай хрысціянскай канфесіі на Беларусі, іх узаемаадносіны сучасная гістарыяграфія пачынае з моманту прыняцця хрысціянства. Сярод гісторыкаў няма адзінай думкі па пытанні ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях, дакладней, надання яму статуса дзяржаўнай рэлігіі. Адсутнасць пісьмовых сведчанняў спарадзіла розныя, нярэдка супярэчлівыя, версіі. Адны (прыхільнікі існавання адзінай цэнтралізаванай дзяржавы) прызнаюць, што хрышчэнне беларускіх зямель – гэта хрышчэнне Кіева. Іншыя сцвярджаюць аб своеасаблівасці, самастойнасці дадзенага працэсу на беларускіх землях.

Даследчык праблемы фарміравання этнічнага светапогляду беларусаў у IX – першай палове XII ст. А. Багдановіч адзначае, што «з утварэннем Кіеўскай Русі, а таксама ўзнікненнем на тэрыторыі Беларусі Полацкага і іншых княстваў племянная самасвядомасць паступова гублялася. Стала фарміравацца пэўная этнарэлігійная супольнасць новага ўзроўню»[51]. Характэрныя рысы гэтай супольнасці, лічыць аўтар, праследжваюцца ў летапісах, літаратурных помніках XI–XII стст. «Аўтарам гэтых твораў – робіць выснову А. Багдановіч, – аднолькава блізкія і дарагія Кіеў і Полацк, Суздаль і Ноўгарод-Северскі. А гэта магчыма толькі пры ўмове, калі гэтыя гарады з'яўляліся гарадамі адной дзяржавы, якая ўяўляе сабой адзінае цэлае як у палітычных, так і ў тэрытарыяльных этнічных адносінах». Што ж тычылася прыняцця хрысціянства, яно, на думку аўтара, «садзейнічала пэўнай кансалідацыі ўсходнеславянскага насельніцтва ў сацыяльна-палітычную і культурную супольнасць»[52].

Іншая думка прадстаўлена наступнай гіпотэзай. Полацкае княства існавала як самастойная дзяржава, галоўным насельніцтвам

якога былі прабеларускія плямёны крывічоў-палачан[53]. У якасці саюзніка кіеўскіх князёў Алега і Ігара полацкія дружыны ўдзельнічалі ў паходах на Візантыю 907 і 944 гг. Згодна з мірным пагадненнем Візантыя абавязвалася плаціць дань не толькі Кіеву, але і Полацку. А гэта магло быць толькі ў выпадку саюзных, а не васальных адносін Полацка з Кіевам. У 60–70-я гг. X ст. цалкам самастойна княжыў у Полацку Рагвалод. У тай жа час існавала самастойная дзяржава і ў дрыгавічоў з цэнтрам у Тураве[54]. Уладзіміру Святаславічу, які ў той час быў наўгародскім князем і ваяваў з братам Яраполкам за княжацкі трон у Кіеве, удалося захапіць Полацк. Рагвалод быў забіты, яго дачка Рагнеда прымусова стала жонкай Уладзіміра. Але нядоўга Полацк уваходзіў у склад Кіеўскай Русі: прыблізна ў 988 г. (па звестках другіх даследчыкаў у 985 г.) была адноўлена дынастыя полацкіх князёў у асобе Ізяслава – унука Рагвалода, сына Рагнеды і Уладзіміра[55].

Гэты пункт погляду (з улікам розных варыянтаў) знайшоў шмат прыхільнікаў сярод беларускіх гісторыкаў у пачатку 90-х гг. XX ст. Але гэта не азначае, што нарадзіўся ён на пустым месцы. Яшчэ ў канцы 30-х – пачатку 40-х гг., аналізуючы погляды «як старых, так і сучасных» яму гісторыкаў аб палітычнай сутнасці Кіеўскай Русі, акадэмік Б. Грэкаў выказаў думку аб тым, што Полацк быў далучаны да ўладанняў кіеўскага князя толькі пры Уладзіміры I[56] у 980 г. І хаця, на думку Грэкава, Кіеўская дзяржава «сильно способствовала слиянию славянских племен в единый русский народ», ён не мог не падкрэсліць, што «всё же оно не было монолитным ни в смысле этническом, ни в смысле стадиональности культурного развития своих частей, ни в смысле организации власти, осуществляемой из Киева. Это – государство лоскутное в подлинном смысле этого слова, сходное с огромным государством Карла Великого»[57].

Нам падаецца, якую б з прапанаваных версій не прыняць за аснову, існаванне своеасаблівасцей не адмаўляе агульнасці тэндэнцый ва ўсіх гэтых падзеях.

У Кіеўскай Русі хрысціянства было прынята па візантыйскім абрадзе. Праўда, наконт гэтага ў розныя часы існавалі розныя думкі. У шматтомнай працы мітрапаліта Макарыя «История Русской Церкви», першае выданне якой адбылося ў 1857 г., адзначалася: «… з Візантыі прынесена была да нас святая вера, з Візантыі прыйшла першая наша іерархія, ад Візантыйскага патрыярха пачаўся шэраг нашых першасвяціцеляў і Царква Руская наогул была «дщедрию» Царквы Канстанцінопальскай»[58]. Навошта спа-

трэбілася мітрапаліту пераконваць чытачоў у тым, што і так падавалася бясспрэчным? Справа ў тым, што з канца XVI ст. пачала распаўсюджвацца думка аб тым, што ў канцы X ст. Русь была ахрышчана «ў рымскую веру», а яе жыхары першапачаткова былі рыма-католікамі. Гэты пункт погляду меў прыхільнікаў сярод царкоўных гісторыкаў Заходняй Еўропы і ў XVIII – першай палове XIX ст.

Не пагаджаюцца з агульнапрынятай у расійскай гістарыяграфіі думкай аб тым, што Руская Царква была «дщедрию Церкви Константинопольской» і сучасныя ўкраінскія гісторыкі. З самага пачатку, лічыць К. Папас, украінская царква стала часткай царквы Усяленскай[59]. Менавіта тым, што пасля прыняцця хрысціянства Русь не папала ні ў палітычную, ні ў ідэалагічную залежнасць ад Візантыі, тлумачаць украінскія гісторыкі шэраг разыходжанняў і супярэчнасцей у летапісах пры выкладанні падзей, звязаных з хрышчэннем Русі.

Няма адзінага пункту гледжання і аб тым, калі гэта адбылося. Побач з традыцыйнай датай – 988 г. – даследчыкі абгрунтоўваюць як больш раннія, так і больш познія даты. На беларускіх землях афіцыйна хрысціянства было прынята па візантыйскім абрадзе. Годам, калі хрысціянства атрымала тут статус дзяржаўнай рэлігіі, можа лічыцца 992 – год заснавання Полацкай епіскапскай кафедры (гэтая дата на падставе аналізу ўскосных дадзеных зараз прынята большасцю свецкіх і царкоўных гісторыкаў), што традыцыйна лічыцца пачаткам тут гісторыі Праваслаўнай царквы[60].

Лічыцца, што ўвядзенне новай рэлігіі «зверху» не заўсёды праходзіла мірна. У літаратуры, прысвечанай падзеям хрышчэння Русі, часта адзначаецца, што х*рысціянізацыя сустрэла ўпартае супраціўленне мас.* Колькасць сведчанняў гэтага супраціўлення невялікая: «Добрыня крестил новгородцев огнем, Путята мечом», паўстанні валхвоў у Растоўскай зямлі і Ноўгарадзе, выступленне «прароцтва» валхва ў Кіеве. Сюды ж далучаюць і двух варагаў, прынесеных у ахвяру – сведчанне антыхрысціянскага настрою ў Кіеве.

Разам з тым існуе і іншая думка. Пры гэтым яе прыхільнікі спасылаюцца на тыя ж самыя гістарычныя факты, але трактуюць іх па-свойму. Яны сцвярджаюць, што пасля хрышчэння Русі даволі працяглы час не назіралася нецярпімых адносін да язычніцтва, якія характэрны для царквы больш позняга часу. Волхв прапаведвае ў самім Кіеве свабодна (1071 г.), і калі б яго казанне не было рэзкім адмаўленнем грэчаскай экспансіі, падзеі не прынялі б такі

трагічны характар. Паўстанне ў Ноўгарадзе – гэта не выступленне супраць хрысціянства, а адно з першых выступленняў супраць «знатных». На карысць дадзенага пункту погляду выказваецца і наступны довад: само хрысціянства яшчэ не ўкаранілася як след і не мела такіх фанатычных прыхільнікаў, якія б жадалі крыві язычнікаў – усё гэта прыйдзе пазней.

Што тычыцца беларускіх зямель, то ў гістарычнай літаратуры часта згадваецца паданне пра Тураўскія каменныя крыжы і чырвоную ад крыві Прыпяць, што таксама звязваецца з падзеямі ўвядзення хрысціянства. Але пісьмовых сведчанняў пра падобныя падзеі на тэрыторыі Беларусі не захавалася. Думаецца, трэба пагадзіцца з тымі гісторыкамі, якія лічаць, што адсутнасць у летапісах такіх звестак сведчыць аб даволі мірным прыняцці Полацкам хрысціянства і далейшым яго распаўсюджванні[61].

Адна з маладаследаваных праблем у беларускай гістарыяграфіі – гістарычна-геаграфічны аспект хрысціянізацыі тэрыторыі Полацкай і Тураўскай епархій у X–XIV стст. Прарывам у гэтым кірунку можна лічыць даволі грунтоўны навуковы артыкул Р. Баравога, які, выкарыстоўваючы фактычны матэрыял (як з друкаваных, так і архіўных крыніц) і новыя метадычныя прыёмы робіць цікавыя назіранні і слушныя высновы[62]. Гаворачы пра хрысціянізацыю тэрыторыі беларускіх зямель аўтар небезпадстаўна сцвярджае, што кола крыніц, якія адлюстроўваюць гісторыю існавання на землях Беларусі дзвюх канфесій – праваслаўя і каталіцтва – па інфармацыйным змесце прынцыпова непараўнальнае (не на карысць праваслаўю). Менавіта гэта і падштурхнула яго скарыстаць новую нетрадыцыйную методыку – больш агульны падыход да праблемы, у рамках якога магчыма супастаўленне тэматычна разнародных на першы погляд фактаў для рэканструкцыі карціны вывучаемага працэсу. Адзначаючы, што такі падыход заснаваны на прынцыпах комплекснага крыніцазнаўства, даследчык робіць спробу як бы «матэрыялізаваць» працэс хрысціянізацыі, звязаўшы яго з ужо вядомымі элементамі сацыяльна-палітычнай структуры дадзенага рэгіёну[63]. Такі метадычны прыём прывёў даследчыка да наступных высноў. Разам з Полацкам цэнтрамі хрысціянізацыі былі гарады Тураў і Заслаўе (летапісны Ізяслаўль). Менавіта гэтыя тры населеныя пункты – на поўначы, у цэнтры і на поўдні сучаснай Беларусі – трэба лічыць першымі і асноўнымі цэнтрамі хрысціянізацыі тэрыторыі на мяжы X–XI стст. Надалей такімі цэнтрамі становяцца і тыя населеныя пункты, якія выступаюць у якасці цэнтраў удзельных княстваў або называюцца гара-

дамі: Берасце, Віцебск, Менск, Лагойск, Пінск, Друцк, Гародня, Мсціслаў, Наваградак, Слонім і інш. Усяго 36 населеных пунктаў і адзін манастыр сталі вядомымі рэгіянальнымі цэнтрамі хрысціянізацыі беларускай тэрыторыі ў XI–XIII стст.[64].

Царкоўныя гісторыкі (рыма-католікі), а ў апошнія гады і свецкія, спрабуюць даказаць, што хрысціянства ў Беларусі з самага пачатку распаўсюджвалася, як з Візантыі, так і з Рыму. Існуе думка, што к пачатку XI ст. адносіцца ўзнікненне на беларускіх землях першай каталіцкай кафедры – Тураўскай. Падставай для гэтага з'яўляюцца: весткі ў «Киево-Печерском патерике» і іншыя падзеі таго часу. Згодна «Хроніцы» Цітмара Мерзебургскага, Святаполк, сын Уладзіміра, быў жанаты на дачцэ польскага караля Баляслава I. Якая, верагодна, па ўмовах шлюбнага пагаднення, заставался ў рымскай веры і прыехала разам са сваім духаўніком, епіскапам Рэйнбернам. Абвінавачаныя ў змове, Святаполк, яго жонка і епіскап былі заключаны ў турму. Там, па словах Цітмара, епіскап «втайне, ревнуя о славе Божией, совершил то, чего не мог совершить открыто». Словы гэтыя, як і месіянерская дзейнасць Рэйнберна, да гэтага часу выклікаюць спрэчкі. На думку А. Назарэнка, аўтара каментарыяў да «Истории Русской Церкви», сцвярджэнне аб місіянерскай дзейнасці Рэйнберна заснавана на непаразуменні: у Цітмара ідзе гаворка пра казанні сярод паморскіх славян-язычнікаў, да яго прыезду ў Тураў. Не падмацавана крыніцамі і сцвярджэнне аб схіленні Святаполка ў рымскую веру, бо Святаполк і епіскап, як сведчыць Цітмар, былі заключаны ў розныя турмы[65].

Тым не менш, большасць гісторыкаў лічыць, што да канца XIV ст. Беларусь знаходзілася пад манапольным уплывам праваслаўнай царквы.

Што тычыцца больш позняга перыяду, то, як слушна заўважае С. Марозава, 90-я гг. унеслі істотныя карэктывы ў разуменне канфесійнай гісторыі Беларусі і прынеслі ў айчынную гістарыяграфію шэраг новых, цікавых момантаў: аб адметным ад маскоўскага менталіцеце беларуска-ўкраінскага праваслаўя XVI ст. і гістарычнай перадвызначанасці Берасцейскай уніі геацывілізацыйным становішчам Беларусі, новае разуменне контррэфармацыі і каталіцкай рэформы не толькі як сістэмы рэпрэсіўных мерапрыемстваў, але як з'явы, якая разам з рэфармацыяй у XVI ст. прывяла да духоўна-культурнага аднаўлення Еўропы і інш.[66].

Найбольш дыскусійнай праблемай сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, што тычыцца канца XVI – 30-х гг. XIX ст., з'яўляецца

уніяцкая царква, яе месца і роля ў гістарычным працэсе беларускага народа. Больш палярных, а часам і абразлівых у адрас адзін аднаго думак і выказванняў, бадай, не сустрэць ні па якім іншым пытанні. Спынімся толькі на адным з шэрагу дыскусійных аспектаў гэтай праблемы – ацэнцы скасавання уніі ў 1839 г. Вядомая даследчыца гісторыі уніяцкай царквы ў Беларусі С. Марозава, якая з'яўляецца прыхільнікам і адным са стваральнікаў канцэптуальнай мадэлі уніі і народжанай ёю культуры як з'явы гістарычна дэтэрмінаванай, лічыць, што «іх ломка і пагібель – гвалтоўны і штучны працэс, які абярнуўся непапраўнымі разбуральнымі наступствамі для нацыянальнай культуры, вымываннем яе магутнага пласта, што на шмат дзесяцігоддзяў вызначыла развіццё нашай краіны. А разрыў культурнай пераемнасці … асудзіў новыя пакаленні на страту сацыяльнай памяці і з'яўленне феномена манкуртызму»[67].

Палярная думка выказана В. Цяпловай, якая па-сутнасці цалкам супадае з пануючай канцэпцыяй у дасавецкай расійскай гістарыяграфіі і сучаснай праваслаўнай традыцыяй. «Скасаванне уніі, – сцвярджае яна, – духоўна з'яднала ўсе часткі беларускага народа, што былі расколаты уніяй, у адзінае цэлае, аднавіла яго цэльнасць»[68]. Як бачым, у дадзеным выпадку цалкам адмаўляецца не толькі погляд на уніяцкую царкву як на сваю нацыянальную для беларусаў, але не бярэцца нават у разлік і частка беларусаў, што на працягу стагоддзяў спавядала і працягвае спавядаць каталіцтва.

Існуюць розныя канцэптуальныя падыходы, палярнасць думак і па многіх аспектах канфесійнай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Што тычыцца канцэптуальных падыходаў, то тут палярна разыходзяцца погляды царкоўных (праваслаўных) і свецкіх гісторыкаў. Царкоўныя гісторыкі сцвярджаюць, што з «другой паловы XIX ст. да пачатку першай сусветнай вайны адбываецца адраджэнне царкоўнага жыцця на беларускіх землях. Гэты, другі этап перыяду – следства дзяржаўнага і духоўнага адзінства раздзеленых на некалькі вякоў рускіх народаў»[69].

Канцэптуальная ацэнка перыяду з боку свецкай гістарыяграфіі падаецца ў кнізе В. Яноўскай[70], якая лічыць гэты перыяд у канфесійнай гісторыі Беларусі складаным, шматбаковым і зусім не такім аднародным, як гэта падаецца ў праваслаўнай гістарычнай традыцыі. Паказальным у гэтым з'яўляецца наяўнасць розных думак у ацэнцы ўказа ад 17 красавіка 1905 г. і яго ролі ў далейшым лёсе розных канфесій.

Адметнай рысай постсавецкай беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца шырокі дыяпазон даследаванняў не толькі па часе, але

і па аспектах праблемы, што характэрна і для вывучэння канфесійнай гісторыі XX ст. Даследчыкаў цікавяць розныя бакі праблемы: ад аналізу статыстычных дадзеных, стварэння рэлігійных суполак да публікацый, прысвечаных душпастырскай і культурна-асветніцкай дзейнасці духавенства, пачынаючы з пачатку мінулага стагоддзя і да сённяшняга дня. З гэтай нагоды ўяўляе цікавасць кандыдацкая дысертацыя І. Трацяка[71]. Адзначыўшы, што В. Грыгор'евай (Яноўскай) на пачатку 90-х гг. упершыню на парадак дня былі вынесены пытанні навуковага падыходу да дзейнасці беларускіх каталіцкіх святароў, ён пераканаўча паказвае, што культурная спадчына беларускага каталіцкага духавенства ўяўляе сабой з'яву пасіянарнай духоўнай актыўнасці творчай эліты. Іх літаратурная дзейнасць узбагаціла жанры беларускай рэлігійнай літаратуры. Былі створаны пераклады тэкстаў Святога Пісання, катэхізмаў, казанняў з лацінскай, польскай, царкоўнаславянскай, грэчаскай моў на беларускую.

Каштоўная інфармацыя, прысвечаная рэлігійна-нацыянальнай дзейнасці ўдзельнікаў беларускага хрысціянскага руху XX ст. даецца ў кнізе Ю. Гарбінскага[72], а таксама ў зборніку артыкулаў па выніках цыкла семінараў у Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры (з удзелам Беларускай Праваслаўнай Царквы, Каталіцкага Касцёла і Саюза евангелійскіх хрысціян-баптыстаў)[73]. Дзейнасці мітрапаліта Мельхісэдэка прысвечана кніга Т. Процькі[74].

Дзейнасць розных канфесій ў другой палове XX ст. асвятляецца ў рабоце А. Верашчагінай і А. Гурко[75]. Асобныя сюжэты канфесійнай сітуацыі на сучасным этапе раглядаюцца ў работах Л. Землякова, Я. Бабосава, У. Завальнюка[76]. Гісторыі хрысціянскіх святыняў, увайшоўшых у скарбонку сусветнай архітэктуры, а таксама тым, што назаўсёды страчаны, прысвечаны работы А. Кулагіна, Т. Габрусь[77].

Сучасныя этнанацыянальныя працэсы і міжканфесійныя адносіны ў Беларусі даследаваны ў кнізе «Этноконфессиональные процессы в Беларуси и формирование патриотизма» (Мн., 2004), падрыхтаванай калектывам аўтараў. У раздзеле «Рэлігійныя арганізацыі і міжканфесійныя адносіны ў Беларусі» (аўтары А. Гурко, У. Навіцкі, К. Пракошына) даецца характарыстыка сучаснай рэлігійнай сітуацыі, дзейнасці важнейшых канфесій у Беларусі.

---

[1] Біч М. Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. Мн., 1993. С. 15.

[2] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. Т. 4. С. 147–158.

[3] Там жа. С. 147.

[4] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. Т. 4. С. 148.

[5] Там жа. С. 149.

[6] Цыт. па: Наша вера. 2000. № 3 (13). С. 79.

[7] Там жа. С. 74.

[8] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. С. 149.

[9] Там жа. С. 150.

[10] Завальнюк У. М. Адраджэнне і дзейнасць рымска-каталіцкай канфесіі ў Беларусі (сярэдзіна 1980-х–2000 гг.): Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2002. С. 5.

[11] Там жа. С. 5–6.

[12] Там жа. С. 6.

[13] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. Т. 4. С. 152–153.

[14] Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980; Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 2.

[15] Яноўскі А. А. Царкоўна-рэлігійныя аспекты дзейнасці БДУ (1920–30-я гг.) // Канфесіі на Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Брэст, 2005. С. 110.

[16] Никольский Н. М. История русской церкви. М.; Л., 1931; Ён жа. Міфалогія і абрадавасць валачобных песень; Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства. Мн., 1933.

[17] Афанасий (Мартос), арх. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Книга в трёх частях. Буэнос-Айрес, 1966; Гарошка Л., а. Ерархія і некаторыя важнейшыя статыстычныя даныя аб Праваслаўнай Царкве ад Першае Сусьветнае Вайны да нашых дзён. Парыж, 1950; Ён жа. Храналёгія да гісторыі Хрысцьянства на Беларусі. Парыж, 1952; Волаціч М. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква (БАПЦ). Чыкага, 1957; Касяк І. З гісторыі праваслаўнай царквы беларускага народу. Нью-Ёрк, 1956; Пануцэвіч В. Пачаткі хрысьціянства на нашых землях да часоў Усяслава. Чыкага, 1959 і інш.

[18] Гарбінскі Ю. Беларускі рэлігійны друк на эміграцыі (Да праблемы вывучэньня рэлігійнага жыцьця беларускай дыяспары ў сьвеце) // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва. Нью-Ёрк; Мінск, 2004. С. 65–109.

[19] Там жа. С. 90.

[20] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. Т. 4.

[21] Грыгор'ева В. В., Завальнюк У. М., Навіцкі У. І., Філатава А. М. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). Мн., 1998.

[22] Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мн., 2002.

[23] Короткая Т. П., Прокошина Е. С., Чудникова А. А. Старообрядчество в Беларуси. Мн., 1992.

[24] Гарбацкі А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Брэст, 1999; Ён жа. Старообрядчество на белорусских землях. Брест, 2004.

[25] Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. Мн., 2006. С. 11.

[26] Блинова Т. Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990; Яна ж. Иезуиты в Белоруссии. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. Гродно, 2002; Кузняева С. А. Еврейские общины в Беларуси в конце XVIII – начале XX века. Мн., 1998; Марозава С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596–1839). Гродна, 1996; Яна ж. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001; Канапацкі І. Б., Смолік А. І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мн., 2000; Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз). Мн., 1998 (2-е выд. – Мн., 2000) і інш.

[27] Гарбацкі А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.: Дыс. … д-ра гіст. навук. Мн., 1999; Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839): Дыс. … д-ра гіст. навук. Мн., 2002; Марзалюк І. А. Этнаканфесійныя і сацыя-культурныя стэрэатыпы насельніцтва беларускіх зямель у X–XVII ст.: Дыс. … д-ра гіст. навук. Мн., 2003; Земляков Л. Е. Государственно-конфессинальные отношения в Республике Беларусь: Дис. … д-ра полит. наук. Мн., 2000; Васовіч С. М. Навучальныя ўстановы праваслаўнага духоўнага ведамства ў Беларусі. Канец XVIII – 1914 г.: Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2003; Завальнюк У. М. Адраджэнне і дзейнасць рымска-каталіцкай канфесіі ў Беларусі (сярэдзіна 1980-х – 2000 г.): Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2002; Буглак А. А. Усходнеславянскае язычніцтва ў беларускай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі другой паловы XX ст.: Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2003; Свірыд А. М. Уніяцкая царква ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2003; Філатава А. М. Канфесійная палітыка ў Беларусі. 1772–1861 гг.: Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2001; Трацяк І. І. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пач. XX ст. – 1939 г.): Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2000; Сілава С. У. Праваслаўная царква на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2000; Шимукович С. Ф. Деятельность благотворительных учреждений по социальной защите населения Беларуси (90-е гг. XIX в. – июль 1914 г.): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 2000; Ствольгин К. В. Политика освобождения граждан от воинской повинности по религиозным убеждениям в советском государстве (1918–1939 гг.): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 2000; Башков А. А. Предметы христианского культа индивидуального использования конца X–XIV вв. на территории Беларуси (классификация, топография, хронология): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1999; Янушевич И. И. Политика Советского государства по отношению к русской православной церкви. 1917–1927 гг. (на материалах Беларуси): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 1999; Шимукович С. Ф. Деятельность благотворительных учреждений по социальной защите населения Беларуси (90-е гг. XIX в. – июль 1914 г.): Дис. … канд. ист. наук. Мн., 2000.

[28] Гэтая лічба была агучана ў ліпені 2003 г. на чарговых Мінскіх епархіальных чытаннях, прысвечаных аналізу стану вывучэння гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі. У абмеркаванні праблемы прынялі

ўдзел вучоныя-грамадазнаўцы НАН Беларусі, выкладчыкі БДУ, гісторыкі з Польшчы, праваслаўныя царкоўныя гісторыкі.

[29] Церкви и приходы Минска. История и современность. 2-е изд. Мн., 2001; Церкви и приходы Минской епархии. 2-е изд. Мн., 2001; Приходы и монастыри Белорусской Православной Церкви. Справочник. Мн., 2001; Алексеев Л. В., Макарова Т. И., Кузьмич Н. П. Крест – хранитель всея Вселенныя. История создания и воссоздания креста преподобной Евфросинии игумении Полоцкой. Мн., 1996; Жития священномучеников Минской епархии (1-я половина XX века) / Автор-составитель Ф. Кривонос. Мн., 2002. і інш.

[30] Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і праваслаўнай царквы на Беларусі. Мн., 1992.

[31] Беднов В. А. Православная церковь в Польше и Литве (no Volumina Legum). Мн., 2002.

[32] Исследования о вовколаках на основании белорусских поверий // Москвитянин. 1853. Т. 2; Шпилевский П. В. Белорусские народные поверья. СПб., 1858; Романов Е. Р. Белорусский сборник. Могилёв; Витебск; Вильня. 1885–1912. Вып. 1–9; Богданович А. Пережитки древняго міросозерцанія у белоруссовъ. Гродно, 1895; Киркор А. К. Живописная Россия. СПб.-М., 1896. Т. 3; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1887–1902. Т. 1–3; Серпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1903 і інш.

[33] Пытанні навуковай тэрміналогіі даволі складаныя і нераспрацаваныя ў айчыннай канфесійнай гісторыі.

[34] Кудраўцава С. А. Беларуская гістарыяграфія язычніцтва // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: У 3 ч. Мн., 2003. Ч. 1. С. 41.

[35] Буглак А. А. Восточнославянское язычество в белорусской, российской и украинской историографии второй половины XX века: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2003. С. 7.

[36] Там жа.

[37] Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. Мн., 2004. С. 364–365.

[38] Трэба заўважыць, што такі падыход быў уласцівы многім даследчыкам XIX – пачатку XX ст.

[39] Знак М. Міфы, міфалогія і міфолагі // Бел. гіст. агляд. Мн., 2003. Т. 10. Сш. 1–2 (18–19). С. 358.

[40] Буглак А. А. Восточнославянское язычество в белорусской, российской и украинской историографии второй половины XX века: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2003. С. 7.

[41] Зайкоўскі Э. Язычніцтва ў светапоглядзе беларусаў // Беларусь: шляхі абнаўлення і развіцця: Матэрыялы навук. сесіі Аддзялення гуманіт. навук. Мн., 1993. С. 156–158; Ён жа. Касмалагічныя ўяўленні старажытнага насельніцтва Беларусі // Гісторыка-археалагічны зборнік. Мн., 1993. Ч. 1. С. 79–93; Ён жа. Багі старажытнай Беларусі // Роднае слова. 1996. № 8, 12; 1997, № 6 і інш.

[42] Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. Мн., 2004. С. 364.

[43] Знак М. Міфы, міфалогія і міфолагі // Бел. гіст. агляд. Мн., 2003. Т. 10. Сш. 1–2 (18–19). С. 353–354.

[44] Там жа. С. 354.

[45] Буглак А. Восточнославянское язычество в белорусской, российской и украинской историографии второй половины XX века: Автореф. дис. … канд. ист. наук. Мн., 2003.

[46] Там жа. С. 12.

[47] Там жа. С. 1.

[48] Міфы Бацькаўшчыны / Склад. У. А. Васілевіч. Мн., 1994.

[49] Коваль У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы. Гомель, 1995.

[50] Фядосік А. С. Беларускі абрадавы фальклор у агульнаславянскім кантэксце. Мн., 1998.

[51] Богданович А. Б. Формирование этнического самосознания белорусов (IX – первая половина XVII в.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1999. С. 8–9.

[52] Там жа. С. 9.

[53] Штыхаў Г. Вытокі беларускай дзяржаўнасці / Бел. гіст. часоп. 1993. № 1. С. 31.

[54] Біч М. Дзяржаўнасць Беларусі: станаўленне, страта, барацьба за аднаўленне (IX ст. – 1918 год) // Бел. мінуўшчына. 1993. № 5–6. С. 3.

[55] Заяц Ю. Менская зямля: этапы фарміравання / Бел. гіст. часоп. 1993. № 4. С. 9; Г. Штыхаў у арт. «Вытокі беларускай дзяржаўнасці» адзначае, што аднаўленне дынастыі полацкіх князёў адбылося прыблізна ў 985 г.

[56] Греков Б. Д. Киевская Русь. М.; Л., 1944. С. 176; Г. Штыхаў у артыкуле, прысвечаным акадэміку Б. Рыбакову, адзначае, што той лічыў Полацк 8–9 ст. пасяленнем гарадскога тыпу, які ўпершыню быў далучаны да ўладанняў кіеўскага князя толькі пры Уладзіміры Святаславічы (980), а пры Брачыславе Ізяславічы пачаў жыць аўтаномна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1996. С. 167.

[57] Греков Б. Д. Киевская Русь. С. 281.

[58] История Русской Церкви. М., 1995. Кн. 2. С. 111.

[59] Історія релігії в Україні. Київ, 1996. Т. І. С. 241.

[60] Штыхаў Г. Хрышчэнне Русі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 2003. Т. 6, кн. 11. С. 89.

[61] Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. Вільня, 1999.

[62] Баравы Р. Хрысціянізацыя тэрыторыі Полацкай і Тураўскай епархій X–XIV ст. (Гістарычна-геаграфічны аспект) // Бел. гіст. агляд. Снежань, 2003. Т. 10. Сш. 1–2 (18–19). С. 3–28.

[63] Там жа. С. 7.

[64] Там жа. С. 14, 15.

[65] История Русской Церкви. Книга вторая. Коммент. 46. С. 607.

[66] Марозава С. Гістарыяграфія канфесійнай гісторыі Беларусі // Гіст. альманах. Гародня, 2001. Т. 4. С. 156.

[67] Там жа. С. 164.

[68] Теплова В. А. Время императора Николая I и цивилизационный поворот в судьбе Беларуси // Россия и Беларусь: от века XIX к веку XXI. Брест, 2004. С. 45.

[69] Василевич В. Историческое обозрение монастырей Минской епархии. Дис. … канд. богословия. Жировичи, 2000. С. 121.

[70] Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мн., 2002.

[71] Трацяк І. І. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пач. XX ст. – 1939 г.). Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2000.

[72] Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя: Жыццяпісы. Мартыралогія. Успаміны / Аўтар-укладальнік Ю. Гарбінскі. Мн., 1999.

[73] Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў XX стагоддзі. Мн., 2000.

[74] Процька Т. Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну. Мітрапаліт Мельхіседэк. Мн., 1996.

[75] Верашчагіна А. У., Гурко А. В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. Мн., 1999.

[76] Землякоў Л. Я. Беларусь на шляху да свабоды сумлення. Мн., 1996; Ён жа. Рэлігія і грамадства. Мн., 1996; Бабосов Е. М. Динамика религиозности в независимой Беларуси. Мн., 1996; Завальнюк У. Узняліся крыжы над святынямі. Мн., 1998.

[77] Кулагін А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2000; Праваслаўныя храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.

Раздзел 8

ГІСТОРЫЯ ЖАНЧЫН ЯК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

8.1. Праблема інстытуцыялізацыі гісторыі жанчын у постсавецкай і беларускай гістарыяграфіях

З'яўленне тэм і даследаванняў па «жаночай гісторыі/гісторыі жанчын», «гістарычнай феміналогіі», а таксама па «гендэрнай гісторыі» ў беларускай гістарычнай навуцы непасрэдна звязана са станаўленнем такога ж кшталту даследаванняў на ўсёй постсавецкай прасторы, і ў першую чаргу ў расійскай гістарыяграфіі. Улічваючы гэты факт, варта выявіць агульныя тэндэнцыі ў развіцці дадзенай праблематыкі на ўсёй постсавецкай прасторы, а таксама прааналізаваць стан і праблемы ўласна беларускай гістарыяграфіі.

Практычна ўсе даследчыкі ў той ці іншай ступені звяртаюцца як да гісторыі станаўлення жаночых даследаванняў, так і да працэсу інстытуалізацыі «гісторыі жанчын», а таксама да гендэрных даследаванняў і гендэрнай гісторыі. У адпаведнасці з тэматыкай у сваіх публікацыях яны падаюць багатую замежную бібліяграфію па гэтых тэмах. Аналіз публікацый варты, каб прасачыць пэўныя заканамернасці ў развіцці новых навуковых напрамкаў, убачыць праблемы, якія паўстаюць у адносінах да станаўлення гісторыі жанчын і гендэрнай гісторыі на постсавецкай прасторы.

З'яўленне жаночых даследаванняў бярэ пачатак у сацыяльных падзеях 60-х гг. XX ст. Па-першае, гэта маладзёжны рух 1960-х гг. і «студэнцкая рэвалюцыя 1968 г.», якая паставіла пад сумніў усю сістэму вартасцей старэйшага пакалення. А таксама «сэксуальная рэвалюцыя», непасрэдна звязаная з маладзёжнымі рухамі, якая дазволіла адкрыта гаварыць пра праблемы пола. У выніку чаго з'явіўся шэраг растабуіраваных тэм. Па-другое, у гэты перыяд адбылося ажыўленне фемінісцкага руху (другая хваля), які аказаў значны ўплыў на інтэлектуальную сферу ў ЗША і Заходняй Еўропе. Трэба адзначыць, што сам фемінісцкі рух (фемінізм) не з'яўляўся (і сёння не з'яўляецца) аднародным і ўтрымлівае шмат напрамкаў. Аб'ядноўваючым фактарам стала крытыка традыцыйнай патрыярхатнай культуры, акцэнт на самакаштоўнасці жанчыны

і яе права на свабоду самарэалізацыі. У больш шырокім вызначэнні фемінізм – гэта апазіцыя ўсім формам стратыфікацыі на падставе гендэра; перакананне, што біялогія не павінна прадвызначаць падпарадкаваны статус жанчын; прызнанне агульнага досведу і агульных мэт у жанчын, якія робяць высілкі на здзяйсненне перамен[1].

На вылучэнне ў 70-я гг. XX ст. «гісторыі жанчын», як самастойнага навуковага напрамку, акрамя жаночага руху паўплываў крызіс у гістарычнай навуцы. Ён быў абумоўлены ўзросшымі складанасцямі ў гістарычным пазнанні (павялічылася колькасць крыніц, састарэлі метады і метадалагічныя арыенціры)[2]. У выніку пераадолення цяжкасцей такога кшталту у сацыяльна-гуманітарнай галіне ў другой палове XX ст. адбыўся пэўны зрух у тэорыі і практыцы пазнання, перамены ў самасвядомасці суб'екта, разумення магчымых ракурсаў вывучэння аб'екта, г. зв. «пазнавальны паварот». У сусветнай акадэмічнай літаратуры адзначаецца некалькі «пазнавальных паваротаў», якія прывялі да фарміравання новых напрамкаў у даследчыцкай працы: сацыягістарычны, антрапалагічны, культурны, лінгвістычны, нараталагічны, кагнітыўны, новы гістарычны паварот, візуальны і г. д.[3]. На з'яўленне «гісторыі жанчын» найбольш паўплывалі антрапалагічны і культурны павароты[4]. Аднак самы істотны імпульс (якасна новы) для развіцця жаночых даследаванняў, у тым ліку і для гісторыі жанчын, надало з'яўленне ў 70-я гг. XX ст. катэгорыі «пола»/«гендэра» (упершыню ўведзена ў сацыяльныя навукі Эн Оклей)[5]. Стаўшы новым інструментам сацыяльнай дэтэрмінацыі, «гендэр» здзейсніў «нябачную рэвалюцыю ў гуманітарнай навуцы»[6].

Што датычыць непасрэдна гістарычнай навукі, то тут, як слушна заўважыла Н. Пушкарова, прасочвалася істотная заканамернасць: у большасці еўрапейскіх краін станаўленне «гісторыі жанчын» праходзіла адным і тым жа шляхам – вылучэннем уласнай гісторыі «прыгожага полу» з гісторыі агульнанацыянальнай. Аднак, у адрозненні ад іншых новых напрамкаў, «гісторыя жанчын» як навуковы напрамак не была адразу прызнана ні ў адной нацыянальнай гістарыяграфіі. Спробы надаць неафемінісцкай свядомасці гістарычную рэтраспектыву, стварыць «сэксуальна-дэтэрмінаваныя» даследаванні выклікалі ў навукоўцаў-традыцыяналістаў скептыцызм. Такім чынам, «гісторыя жанчын» як мінімум дзесяцігоддзе існавала непрызнанай сусветнай навуковай супольнасцю[7].

Складанасці працэсу інстытуцыялізацыі гісторыі жанчын не перашкаджалі актыўнай навуковай працы ў гэтай галіне і з'яўленню

шматлікіх навуковых публікацый. Сама ж «гісторыя жанчын» ва ўласным развіцці прайшла некалькі якасна розных этапаў. Першы этап ахоплівае канец 1960-х – пач. 1970-х гг. і характарызуецца прызнаннем «нябачнасці» жанчын у гісторыі і сэксісцкай аднабаковасці ведаў пра мінулае. Другі этап прыпадае на пачатак – сярэдзіну 1970-х гг. У гэты перыяд адбываліся спробы стварэння новых даследаванняў. Рабіліся высілкі дадаць у гісторыю жаночыя імёны, аднак «мужчынскія вартасці» ўсё яшчэ ўспрымаліся за норму. З сярэдзіны 1970-х – канца 1970-х гг. адбылося збліжэнне гісторыі і фемінісцкай ідэалогіі. У выніку гэтага, з аднаго боку, адбылося пэўнае адмаўленне ад мужчынскіх асноў перыядызацыі гісторыі. З другога боку, гісторыя жанчын засталася «гісторыяй жаночых пакут». З 1980-х гг. – да цяперашняга часу робяцца спробы вывучаць жанчын у гісторыі і гісторыю жанчын, абапіраючыся на паняцці, выпрацаваныя ў ходзе развіцця жаночых даследаванняў[8].

У сваю чаргу, І. Чыкалава спрабуе падаць этапы развіцця не гісторыі жанчын, а гендэрнай гісторыі. Такім чынам, першы этап – гэта ўключэнне ў гістарычную канву жанчын, выкрэсленых з «мужчынскай» гістарыяграфіі, і стварэнне г. зв. «яе гісторыі». Другі этап характарызуецца спробамі звязаць «жаночую гісторыю» з гісторыяй грамадства. У выніку даследчыкі пачалі займацца вывучэннем гістарычна складзеных адносін панавання і падпарадкаванасці паміж жанчынамі і мужчынамі ў патрыярхальных структурах класавых грамадстваў. Традыцыйны сацыяльна-класавы аналіз яны дапоўнілі фактарам пола, а статус гістарычнай асобы прапанавалі разглядаць як спецыфічную камбінацыю індывідуальных, полавых, сямейна-групавых і класавых характарыстык. Аднак на гэтым этапе паняцце «гендэр» яшчэ не ўвайшло ў навуковы ўжытак. На трэцім этапе адбываецца канцэптуалізацыя паняцця «гендэр» і пачынае складвацца новы навуковы напрамак, дзе цэнтральным прадметам даследавання выступае ўжо не гісторыя жанчын, а гісторыя ўладных узаемаадносін, іерархічных узаемазалежнасцей і ўзаемасувязей паміж мужчынамі і жанчынамі, мужчынамі і мужчынамі, жанчынамі і жанчынамі розных сацыяльных груп з улікам сэксуальнага статуса, расавай/этнічнай прыналежнасці і ўзросту, г. зн. – «дыялагічная» гісторыя сацыяльных зносін[9].

Гістарычны аналіз сведчыць, што станаўленне гісторыі жанчын, а тым больш гендэрнай гісторыі, у постсавецкіх краінах, відавочна адстае ад сусветнай гістарыяграфіі. На думку некаторых даследчыкаў, яе ўзровень параўнальны з узроўнем заходняй феміпі-

нісцкай рэфлексіі канца 70-х гг. XX ст.[10]. Аднак своеасаблівасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ў адрозненні ад краін Заходняй Еўропы і ЗША на постсавецкай прасторы, па-першае, адсутнічае моцны фемінісцкі рух, які мог быць зацікаўлены ў гістарычнай самаідэнтыфікацыі; па-другое, постсавецкія гісторыкі атрымалі грунтоўную тэарэтычна-метадалагічную спадчыну заходняй гістарыяграфіі. Зыходзячы з гэтых акалічнасцей, перад даследчыкамі паўстае праблема інстытуцыялізацыі новага навуковага напрамку, які не мае моцнага сацыяльнага і ідэалагічнага абгрунтавання, а таксама праблема карэктнай адаптацыі тэрміналогіі і метадалогіі. Адзін са шляхоў вырашэння гэтых складанасцей гісторыкі бачаць у пошуку вытокаў гісторыі жанчын у айчыннай гістарыяграфіі. Найбольш паспяхова гэтая праблема распрацоўваецца расійскімі даследчыкамі. Для беларускай гістарыяграфіі гэтыя даследаванні дастаткова актуальныя, калі браць пад увагу статус беларускіх земляў у Расійскай імперыі канца XVIII – пач. XX ст., і ў час існавання СССР.

Так, паводле Н. Пушкаровай, жаночая гісторыя, не будучы так названай, існуе ў Расіі на працягу амаль двухсот гадоў, г. зн. з пачатку XIX ст. Канцэптуальнае яе абагульненне пачалося ў апошняй чвэрці XX ст. (як і ў заходняй гістарыяграфіі), пры гэтым даследчыцкія задачы супадалі[11].

На нашу думку, найбольш дасканалы аналіз станаўлення расійскай гісторыі жанчын зрабіла І. Юкіна[12]. Варта адзначыць, што ў сваіх разважаннях яна зыходзіла з разумення гісторыі жанчын з аднаго боку, як новай даследчыцкай стратэгіі і метадалогіі, якія вызначаюць жанчыну ў якасці аб'екта даследавання; з другога – як асобнага напрамку ў гістарыяграфіі. Такім чынам зараджэнне новага навуковага напрамку датуецца сярэдзінай XIX ст. Менавіта ў гэты час, дзякуючы канцэпцыі лібералізму з яе асноўнымі ідэямі пра роўнасць, свабоду і г. д., адбывалася змена даследчыцкай парадыгмы[13]. У выніку адной з даследчыцкіх задач расійскіх гісторыкаў стаў пошук жанчын у сваёй мінуўшчыне. Такім чынам, у расійскай гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. з'явіўся новы аб'ект даследавання – жанчына, а прадметам даследавання стала яе месца ў гістарычным працэсе, яе ўплыў на сацыяльныя, культурныя, палітычныя і эканамічныя сферы жыццядзейнасці грамадства[14].

Гэты вывад зроблены не на пустым месцы. Яму папярэднічалі ранейшыя напрацоўкі ў дадзеным напрамку. Так, расійскі даследчык Д. Мардоўцаў прапаноўваў разглядаць гістарычную эпоху

праз ролю ў ёй жанчыны. Гэты падыход, сцвярджае І. Юкіна, і ёсць прапанова новай метадалогіі.

У канцы XIX – пач. XX ст. пачаўся якасна новы этап у развіцці жаночых даследаванняў у Расіі. Ён азнаменаваўся ўваходам у гістарычную навуку жанчын-гісторыкаў, што прывяло да з'яўлення «альтэрнатыўнага жаночага пункту гледжання»

У выніку расійская гісторыя жанчын пачала развівацца ў напрамку пошуку вытокаў і прычын полавай няроўнасці, падпарадкаванасці і дыскрымінацыі жанчын. З'явіліся новыя навуковыя тэмы – правы жанчын, жаночая сацыяльная актыўнасць, уплыў жанчын на жыццядзейнасць грамадства і г. д. Аналізуючы напрамкі і тэмы тагачасных даследаванняў, І. Юкіна прыходзіць, на нашу думку, да дзвюх важных высноў. Па-першае, у той перыяд паняцце «жаночая няроўнасць» становіцца як прадметам, так і катэгорыяй аналізу. А па-другое, спробы пераасэнсаваць традыцыйны падзел полавых (гендэрных) роляў у расійскім грамадстве прывёў да таго, што катэгорыя «пол» становіцца адным з ключавых інструментаў сацыяльна-гістарычнай дэтэрмінацыі[15]. Такім чынам, гісторыя жанчын як практыка напісання гісторыі жанчынамі і пра жанчын, з'явілася ў Расіі ў канцы XIX ст. і яе развіццё адбывалася ў непасрэднай сувязі з жаночым (фемінісцкім) рухам, была ім запатрабаваная і падтрыманая[16].

Зварот да жаночай праблематыкі ў савецкай гістарыяграфіі пачаўся ў 1970–1980-х гг. З'явіліся гістарычныя працы, дзе жанчыны пачалі разглядацца як паўнавартасная сацыяльная сіла і суб'ект сацыяльных змен. Такую якасную змену ў даследаваннях І. Юкіна тлумачаць вонкавымі прычынамі. У гэты час у заходняй гістарыяграфіі з'явіліся манаграфічныя працы замежных даследчыкаў, якія былі прысвечаны расійскім жанчынам і расійскаму жаночаму руху XIX – пачатку XX ст. Па сутнасці гэта быў выклік, і савецкім гісторыкам прыйшлося на яго адказваць. У выніку з'явіліся нешматлікія працы расійскіх аўтараў (Г. А. Цішкіна, Э. А. Павлюченко, Н. Пушкаровай). Аднак мае рацыю І. Юкіна, што працы замежных і савецкіх даследчыкаў якасна розніліся. Замежныя даследчыкі, звяртаючыся да тэмы падпарадкаванасці жанчын у патрыярхатным расійскім грамадстве, а таксама да тэмы жаночага супраціву і практыкі абароны сваіх правоў, абапіраліся на фемінісцкую ідэалогію. У працах савецкіх даследчыкаў падобнай рэфлексіі практычна не было. Выключэннем І. Юкіна лічыць працы Н. Пушкаровай, у якіх фемінісцкая рэфлексія прысутнічала ў імпліцытным выглядзе. Менавіта з даследаванняў Н. Пушкаровай

пачаўся адыход ад гісторыі апісальнай, пабудаванай на марксісцкай метадалогіі, у бок да «новай гісторыі жанчын»[17].

Асноўная праблема, якая на сёння паўстала перад даследчыкамі, што займаюцца вывучэннем жанчын у гісторыі – гэта інстытуцыялізацыя новага навуковага напрамку ў айчынных гістарыяграфіях на ўсёй постсавецкай прасторы. І. Юкіна для вырашэння гэтай праблемы прапанавала падысці з пункту гледжання інстытуалізацыі любой новай навуковай вобласці і прапанавала наступную схему:

вызначэнне статуса новых ведаў і іх месца ў рамках ужо складзеных навуковых дысцыплін;

дакладнае фармуляванне таго, што з'яўляецца аб'ектам даследавання, а што з'яўляецца прадметам даследавання;

фармуляванне даследчыцкіх задач новага напрамку навуковых ведаў;

вызначэнне метадалогіі(й) навуковага пазнання;

фармаванне паняційнага апарату;

вызначэнне метадаў тэарэтычнага і эмпірычнага даследавання;

вызначэнне асноўных напрамкаў новай навуковай дысцыпліны;

накапленне даследчыцкай базы (артыкулы, даследаванні, манаграфіі)[18].

У адносінах да гісторыі жанчын (гендэрнай гісторыі) гэтая схема дае нам магчымасць убачыць на якім этапе інстытуалізацыі знаходзіцца гэты навуковы напрамак ў сістэме нацыянальных гістарыяграфій, а таксама ўдакладніць некаторыя дэфініцыі.

Праблема паўстае пры спробе вызначыць статус і месца гісторыі жанчын ў рамках ужо складзеных навуковых дысцыплін. Узнікае пытанне: гэты напрамак з'яўляецца гістарычнай субдысцыплінай, ці субдысцыплінай жаночых (гендэрных) даследаванняў. Наступная праблема паўстае пры спробе дакладна вызначыць аб'ект даследавання гісторыі жанчын. З аднаго боку відавочна, што аб'ектам з'яўляецца «жанчына». Аднак адсутнасць звычкі дакладна артыкуляваць аб'ект і прадмет даследавання часткай даследчыкаў прыводзіць да таго, што некторыя аўтары аб'ект «жанчыну» называюць «прадметам» або «цэнтральным прадметам». Яшчэ больш складанай з'яўляецца праблема вызначэння менавіта прадмета даследавання гісторыі жанчын. Гэта адлюстравана нават у тэрміналагічных разыходжаннях адносна самой назвы новага навуковага напрамку: «жаночая гісторыя», «гісторыя жанчын» або «гістарычная феміналогія».

Тое, што тычыцца тэрмінаў «жаночая гісторыя» і «гісторыя жанчын», англамоўны варыянт «women's history» дае магчымасць

падвоенага перакладу – «жаночая гісторыя» і «гісторыя жанчын». На думку В. Шутавай, пераклад «women's history» як «гісторыя жанчын» з'яўляецца граматычна больш карэктным, аднак ідэалагічна магчыма выкарыстанне тэрміна «жаночая гісторыя». Даследчыца прытрымліваецца пазіцыі, што гісторыкі фемінісцкага напрамку ў 60–70-х гг. XX ст. сцвярджалі, што ўся гісторыя па сутнасці з'яўляецца «гісторыяй мужчын» і, адпаведна, прэзентуе «мужчынскі погляд». Таму ў супрацьвагу «мужчынскай гісторыі» з'явілася «гісторыя жанчын» і, адпаведна, прэзентацыя «жаночага погляду» на гістарычныя працэсы. Гэтую з'яву В. Шутава вызначае як устаноўку на стварэнне асобнай «жаночай гісторыі», якая ў заходняй гістарыяграфіі панавала да сярэдзіны 70-х гг. XX ст.[19].

Некалькі з іншых пазіцый да гэтага пытання падыходзіць І. Юкіна. Яна пагаджаецца, што з'яўленне «гісторыі жанчын» у замежнай гістарычнай навуцы было прызнаннем таго факту, што ўся папярэдняя гістарыяграфія па сваёй сутнасці з'яўлялася гісторыяй мужчын. На яе думку, тэрмін «жаночая гісторыя» хутчэй адлюстроўвае ідэю адсутнасці жанчын у гісторыі, і, адпаведна, адсутнасць у гістарыяграфіі «жаночага погляду». Тэрмін «гісторыя жанчын» ужо прэзентуе «жаночы погляд», і гэтым не толькі ідэалагічна, але і метадалагічна прынцыпова адрозніваецца ад «усеагульнай». У сваіх разважаннях І. Юкіна прыходзіць да высновы, што «гісторыя жанчын» утрымлівае ўласную ідэалогію, метадалогію і выкарыстоўвае спецыяльныя метады даследавання, што характарызуе яе як навуковы напрамак. На яе думку сінанімічнае выкарыстанне тэрмінаў «жаночая гісторыя»/«гісторыя жанчын» з'яўляецца практыкай станаўлення айчыннай «гісторыі жанчын»[20]. (Аўтар дадзенага артыкула падзяляе думку І. Юкінай і лічыць, што ў рамках айчыннай гістарыяграфіі і ў акадэмічным асяродку больш карэктна выкарыстанне тэрміна «гісторыя жанчын»).

Тэрмін «гістарычная феміналогія» ўведзены ў навуковы ўжытак Н. Пушкаровай. На яе думку, «гісторыя жанчын» абмяжоўвае свой прадмет даследавання менавіта «прыгожым полам», і ў гэтым сэнсе з'яўляецца часткай інстытуцыялізаванай навукі – феміналогіі. У такім выпадку «гістарычная феміналогія» вывучае змены апасродкаванай жанчынамі рэчаіснасці «ў прасторы» і «ў часе» (г. зн. з улікам геаграфічнага, этнакультурнага і храналагічнага фактараў). Прадметам даследавання «гістарычнай феміналогіі» з'яўляюцца жанчыны ў гісторыі, а таксама гісторыя змен іх сацыяльнага статуса і функцыянальных роляў[21].

Аналагічнае вызначэнне «гістарычнай феміналогіі» змяшчае і «Словарь гендерных терминов». Пры гэтым паняцці жаночая гісторыя/гісторыя жанчын спецыяльна не раскрываюцца, а падаюцца як сінонімы вышэйназванага тэрміна[22]. Аднак самі аўтары слоўніка адзначаюць, што тэрмін «гістарычная феміналогія» прызнаецца не ўсімі даследчыкамі.

Варта адзначыць, што сёння існуе тэндэнцыя ўспрымаць гісторыю жанчын як папярэдніцу або складовую частку гендэрнай гісторыі. Аргументацыю супраць такога стаўлення прыводзіць І. Юкіна, апелюючы да вышэй прыведзенай схемы інстытуцыялізацыі новай навуковай вобласці. Яна сцвярджае, што нават пераадолеўшы «метадалагічны тупік» і абапіраючыся на катэгорыю «гендэр», гісторыя жанчын не стала гендэрнай гісторыяй, бо не змяніла аб'ект даследаванняў і не пачала даследаваць абодва пола. Каб адзначыць якасныя змены ў гэтым навуковым напрамку і надаць яму перспектыву развіцця, І. Юкіна ўводзіць тэрмін «новая гісторыя жанчын» і прапануе наступнае вызначэнне: «новая гісторыя жанчын» – гэта междысцыплінарны навуковы напрамак, бо, з аднаго боку, з'яўляецца субдысцыплінай гістарычнай навукі, з другога боку – субдысцыплінай жаночых і гендэрных даследаванняў. Адначасова «новая гісторыя жанчын» з'яўляецца новай даследчыцкай стратэгіяй, заснаванай на гендэрнай метадалогіі і фемінісцкай ідэалогіі. Аб'ектам даследавання з'яўляецца жанчына, а прадметамі – не толькі ўсе аспекты яе жыццядзейнасці, але і інстытуты ўлады і сацыяльнага кантролю, якія рэгулююць нераўнамернае размеркаванне матэрыяльных і духоўных дабротаў. Адпаведна павінны даследавацца фактары, што непасрэдна вызначаюць аспекты жыццядзейнасці жанчын (формы, метады, механізмы прыгнёту і ўзнаўлення няроўнасці)[23].

Як бачна з вышэй сказанага, у дачыненні да расійскай гістарыяграфіі можна выкарыстоўваць тэрмін «новая расійская гісторыя жанчын». Бо яна, па-першае, адразу ўключыла ў свой ужытак гендэрныя тэорыі і гендэрны паняційны апарат, выпрацаваны ў заходняй гістарыяграфіі; а па-другое, гэты тэрмін можа быць дарэчным у расійскай гістарыяграфіі з улікам этапаў станаўлення і развіцця гісторыі жанчын у Расіі, пачынаючы з XIX ст.

Прычыны маруднага працэсу інстытуалізацыі «гісторыі жанчын» або «гендэрнай гісторыі» на постсавецкай прасторы ў значнай ступені крыюцца ў навуковай сферы, калі ў савецкі перыяд безумоўнай перашкодай для развіцця «гісторыі жанчын» як субдысцыпліны гістарычнай навукі было панаванне класавага пады-

ходу да аналізу гістарычных з'яў. На сёння адной са складанасцей з'яўляецца непрызнанне новай фемінісцкай і гендэрнай метадалогіі ў гістарычнай навуцы, што цягне за сабой непрызнанне навуковасці такіх даследаванняў у акадэмічным асяродку.

Н. Пушкарова звярнула ўвагу на праблему, якая крыецца ў самой «прыродзе» гістарычнай навукі, а менавіта на праблему канкрэтнага прымянення яе дасягненняў. Калі жаночыя або гендэрныя даследаванні сацыёлагаў, псіхолагаў, медыкаў і дэмографаў могуць мець канкрэтнае прымяненне, то «гістарычныя распрацоўкі, асабліва тыя, што датычаць даўно мінулых часоў, уяўляюцца непатрэбнай раскошай»[24]. У выніку заказ і падтрымка з боку дзяржавы распрацоўкі новых напрамкаў і тэм у гістарычнай навуцы могуць быць мінімальнымі, аднак такая запатрабаванасць можа сыходзіць з боку грамадства. Пры адсутнасці значнага жаночага руху на ўсёй постсавецкай прасторы гісторыя жанчын як субдысцыпліна не можа атрымаць з гэтага боку сур'ёзнага рэсурсу для свайго развіцця. Вынікам вышэйпералічаных складанасцей з'яўляецца тое, што колькасць даследчыкаў, якія працуюць у рэчышчы гісторыі жанчын невялікая і, адпаведна, з'яўляецца нязначная колькасць навуковых артыкулаў, публікацый і тым больш манаграфій. У выніку неабходная даследчыцкая база накопліваецца марудна.

У такіх умовах мае рацыю І. Чыкалава, якая лічыць, што абнаўленню навуковай праблематыкі, тэарэтычнаму пераасэнсаванню і канструяванню прадмета даследаванняў гісторыі жанчын і гендэрнай гісторыі спрыяе міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне[25]. Аднак трэба ўлічваць, што на сёння прафесійныя гісторыкі ў найменшай ступені ўцягнуты ў гэтыя міждысцыплінарныя жаночыя і гендэрныя даследаванні, а ў працэсе напісання гісторыі жанчын з выкарыстаннем фемінісцкай і гендэрнай метадалогіі актыўна ўдзельнічаюць філосафы і сацыёлагі[26]. Паўстае пытанне, на колькі навукова, з пункту гледжання гісторыі як навукі, ствараецца такая гістарыяграфія. Бо нам усё ж такі трэба ўлічваць спецыфіку філасофіі і сацыялогіі як навуковых дысцыплін, якія імкнуцца да генералізацыі, у той час як гісторыя застаецца ідэаграфічнай дысцыплінай.

Пералічаныя складанасці характэрны для ўсіх постсавецкіх гістарыяграфій. Разам з тым, працэс станаўлення гісторыі жанчын у беларускай або ўкраінскай гістарычнай навуцы мае шэраг адрозненняў. Што тычыцца жаночай праблематыкі ва ўкраінскай гістарыяграфіі, Н. Чухім адзначае, што яна не з'яўляецца новай,

бо яе распрацоўвалі яшчэ даследчыкі XIX ст. Праўда такія даследаванні звычайна былі складовай часткай абагульняючых прац, і толькі ў апошні час пачалі з'яўляцца асобныя працы, прысвечаныя жанчынам[27]. Аналізуючы ўкраінскую гістарыяграфію, Н. Чухім выдзяляе два асноўныя напрамкі, у рамках якіх вывучаецца гісторыя жанчын. Па-першае, гэта гісторыя вядомых жанчын, якія пакінулі свой адбітак у гісторыі. На думку даследчыцы, такі падыход цалкам супадае з метадамі традыцыйнай гісторыі, якая з'яўляецца гісторыяй палітыкі, дыпламатыі, эканомікі, афіцыйнай культуры, дзе жанчыны прадстаўлены як выключэнне. Н. Чухім лічыць, што ў такім выглядзе гісторыя жанчын – гэта гісторыя субгрупы ў палітычнай гісторыі. Другі напрамак – гэта гісторыя жанчын у той сферы, дзе іх прысутнасць можна выявіць толькі метадамі культурна-гістарычнага аналізу, г. зн. у сферы побыту і сям'і[28].

Аналізуючы развіццё ўкраінскай гістарычнай навукі, Н. Чухім заўважыла, што сам «працэс узнаўлення нацыянальнай гісторыі наглядна прадэманстраваў універсальны механізм выключэння жанчын з гістарычнага працэсу і ігнаравання іх як суб'екта нацыі»[29]. У выніку даследчыца, звяртаючыся да пытання, што ляжыць у аснове сістэмы бачання, якая выключае жанчын з гістарычный рэальнасці, засяродзілася на самім механізме выключэння з навукі пэўных фактаў. На яе думку, гэты механізм з'яўляецца больш універсальным і характэрным не толькі для навукі, але пазнання ўвогуле. Выключэнне пэўных фактаў (у дадзеным выпадку выключэнне жанчын з гісторыі. – *А. Н.*) адбываецца тады, калі яны не могуць быць упісаны ў рэчаіснасць, «паколькі сваёй прысутнасцю яны яе разбураюць... а такое знішчэнне факту прыводзіць да дэканструкцыі канкрэтнага аб'екта і не патрабуе прызнання яго існавання»[30]. Н. Чухім адзначае, што выключанасць жанчын з гісторыі не з'яўляецца простай і абсалютнай, аднак жанчыны ўключаюцца ў гістарычную рэальнасць у той ступені, у якой іх існаванне не супярэчыць агульнай канструкцыі гэтай рэчаіснасці[31].

Тэму выключэння жанчын з гістарычнага працэсу ў перыяд аднаўлення беларускай нацыянальнай гісторыі закранула беларуская даследчыца А. Гапава. Аналізуючы афіцыйныя навуковыя выданні па гісторыі Беларусі апошніх гадоў, яна сцвярджае, што жанчын там няма, акрамя ўзгадак у раздзеле «Культура». Аналагічная сітуацыя склалася і ў навукова-папулярнай літаратуры. Прыводзячы як прыклад навукова-папулярнае выданне «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі»[32], А. Гапава сцвяржае, што гэты твор

уключае толькі адзіную «жаночую» дату – год нараджэння Ефрасінні Полацкай, «і больш ніякіх узгадак, чым была занята гэтыя дзесяць стагоддзяў палова насельніцтва»[33].

Безумоўна, інстытуалізацыя гісторыі жанчын у беларускай гістарыяграфіі адбываецца марудна. Пры гэтым акрамя тых абставін і цяжкасцей, якія ўласцівы для расійскай гістарыяграфіі, можна вылучыць характэрныя менавіта для беларускай. Па-першае, у айчыннай гістарыяграфіі гісторыя жанчын не мела даследчыцкіх традыцый і папярэдніх этапаў развіцця. Па-другое, беларускія гісторыкі не атрымалі такога выкліку з боку замежнай гістарыяграфіі, як рускія даследчыкі ў 80-я гг. XX ст. Відаць таму першапачатковы даследчыцкі інтарэс прыцягнулі менавіта тэарэтычныя аспекты новай дысцыпліны, а таксама гісторыя жанчын іншых краін. У выніку пачала ўзбагачацца беларуская гістарыяграфія па праблемах замежных краін.

У рамках уласна гісторыі Беларусі даследчыцкая праца ідзе менш актыўна, што тлумачыцца пэўнымі складанасцямі. На нашу думку, галоўная прычына заключаецца ў тым, што адсутнічае фундаментальная эмпірычная база, а працэс яе стварэння патрабуе руплівай працы як па пошуку новых крыніц, так і па пераасэнсаванні ўжо вядомых. З улікам мізэрнай колькасці спецыялістаў, якія працуюць у гэтым напрамку, і адпаведна невялікай колькасці публікацый, гэты працэс становіцца доўгатэрміновым. З іншага боку, напрацоўкі і публікацыі, якія непасрэдна тычацца гісторыі жанчын у розныя перыяды гістарычнага развіцця Беларусі, паднятыя ў іх праблемы асвятляюцца ў адзінкавых спецыялізаваных навуковых зборніках[34] (якія практычна з'яўляюцца ўласнай ініцыятывай). Безумоўна, большасць публікацый носяць хутчэй наратыўны характар, бо ў адпаведнасці з даследчыцкай задачай – у канкрэтны гістарычны перыяд зрабіць жанчын бачнымі – пабудаваны на эмпірычным матэрыяле. Аднак жаданне паскорыць развіццё гісторыі жанчын і вывесці яе на ўзровень гендэрнай гісторыі пры слабой даследчыцкай базе, можа пагражаць простым калькаваннем тэарэтычных мадэлей як з заходняй гістарыяграфіі, так і з расійскай, з-за чаго можа быць згублена спецыфіка і ўнікальнасць беларускай гісторыі жанчын.

---

[1] Пушкарева Н. Гендерная проблематика в исторических науках // Введение в гендерные исследования: Учеб. пособие / Под. ред. И. А. Жеребкиной. Харьков, 2001. СПб., 2001. Ч. I. С. 278–279; Темкина А. А. Женское движение как общественное движение: история и теория // Гендэрная

реконструкция политических систем / Ред.-сост. Н. М. Степанова и Е. В. Кочкина. СПб., 2004. С. 41–75; Чикалова И. Р. Женская и гендерная история на постсоветском пространстве // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. Вып. 1. С. 5; Чикалова И. «Бархатная революция» в политической и исторической науке // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2004. Вып. 3. С. 5–13.

[2] Пушкарева Н. Л. Гендерные исследования: рождение, становление, методы и перспективы // Вопросы истории. 1998. № 6. С. 76–77.

[3] Зверева Г. И. «Чужое, свое, другое...»: феминистские и гендерные концепты в интеллектуальной культуре постсоветской России [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gender.ehu.by (08.03.2005).

[4] Пушкарева Н. Л. Гендерные исследования: рождение, становление, методы и перспективы // Вопросы истории. 1998. № 6. С. 76–78; Шутова О. М. Устная и гендерная история в свете антропологизации историографии // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. Вып. 1. С. 55–62.

[5] Феминология: Словарь терминов / Под общ. ред. О. Н. Пищулиной. Харьков, 2002. С. 49.

[6] Пушкарева Н. Л. Как женщин сделать видимыми // Женщины в истории возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. С. 20–21.

[7] Там жа. С. 31.

[8] Пушкарева Н. Как женщин сделать видимыми… С. 48–49.

[9] Чикалова И. Р. Женская и гендерная история на постсоветском пространстве // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. Вып. 1. С. 13–14; Чикалова И. Бархатная революция в политической и исторической науке // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2003. Вып. 3. С. 21.

[10] Юкина И. Проблемы становления российской истории женщин // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. С. 76.

[11] Пушкарева Н. Л. Гендерные исследования: рождение, становление, методы и перспективы // Вопросы истории. 1998. № 6. С. 81.

[12] Юкина И. И. Проблемы становления российской истории женщин // Женщины в истории: возможность быть увиденными. Мн., 2001. С. 74–84; Юкина И. И. «Новая история женщин» России [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gender.ehu.by (08.03.2005).

[13] Юкина И. «Новая история женщин» России…

[14] Юкина И. И. Проблемы становления российской истории женщин // Женщины в истории: возможность быть увиденными. Мн., 2001. С. 77; Юкина И. «Новая история женщин» России…

[15] Юкина И. «Новая история женщин» России…

[16] Юкина И. И. Проблемы становления российской истории женщин // Женщины в истории: возможность быть увиденными. Мн., 2001. С. 78–80; Юкина И. «Новая история женщин» России…

[17] Юкина И. «Новая история женщин» России…

[18] Там жа.

[19] Шутова О. М. Устная и гендерная история в свете антропологизации историографии // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн.: БГПУ, 2001. Вып. 1. С. 64–65.

[20] Там жа.

[21] Пушкарева Н. Л. Гендерная проблематика в исторических науках // Введение в гендерные исследования: Учеб. пособие / Под ред. И. А. Жеребкиной. Харьков: ХЦГИ, 2001; Ч. I. СПб.: Алатея, 2001. С. 281, 283.

[22] Словарь гендерных терминов / Под ред. А. А. Денисовой. М., 2002. С. 119–120.

[23] Там жа.

[24] Пушкарева Н. Л. Гендерные исследования: рождение, становление, методы и перспективы // Вопросы истории. 1998. № 6. С. 81.

[25] Чикалова И. Р. Женская и гендерная история на постсоветском пространстве // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн.: БГПУ, 2001. Вып. 1. С. 8; Чикалова И. «Бархатная революция» в политической и исторической науке // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн.: БГПУ, 2004. Вып. 3. С. 20.

[26] Юкина И. «Новая история женщин» России…

[27] Чухим Н. А. Присутствие в истории: опыт методологического анализа // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн.: БГПУ им. М. Танка, 2001. С. 90.

[28] Там жа. С. 86.

[29] Там жа. С. 85.

[30] Чухим Н. А. Присутствие в истории: опыт методологического анализа // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн.: БГПУ им. М. Танка, 2001. С. 89–90.

[31] Там жа. С. 85.

[32] Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862–1918): Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня, 1999.

[33] Гапова Е. Кроя края Европы // Женщины на краю Европы. Мн., 2003. С. 12.

[34] Выпускі зборніка навуковых артыкулаў «Женщины в истории: возможность быть увиденными» / Пад рэд. І. Р. Чыкалавай, а таксама выпускі альманаха «Иной взгляд».

8.2. «Жаночае пытанне» ў расійскай, польскай і айчыннай гістарыяграфіях

Вывучэнне месца і ролі жанчын (галоўным чынам дваранак) у грамадстве Расійскай імперыі канца XVIII – першай паловы XIX ст. прыцягвала ўвагу айчынных і замежных (польскіх і расійскіх) гісторыкаў. Сучасная, расійская гістарыяграфія вылучае некалькі этапаў станаўлення жаночай праблемы. Пачаткова яна прысутнічала ў працах, прысвечаных побыту рускага народа, біяграфічных даследаваннях ролі ў гісторыі найбольш вядомых прадстаўніц слабога полу[1]. Але ўжо да сярэдзіны XIX ст. у якасці прадмета даследавання сталі вылучаць сацыяльныя аспекты жыццядзейнасці жанчыны і на першы план выйшла «жаночае пытанне» і праблемы эмансіпацыі[2]. У другой палове XIX ст. расійскія гісторыкі сталі больш засяроджваць увагу непасрэдна на жанчыне, яе ўплыве на сацыяльную і культурную сферы жыцця расійскага грамадства. Усе тагачасныя даследаванні «жаночага пытання» ў Расійскай імперыі праводзіліся мужчынамі, што дае падставу некаторым сучасным даследчыкам сцвярджаць пра прэзентацыю мужчынскага погляду на гэтую праблему[3].

З развіццём фемінісцкага руху ў Расіі ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'явіліся працы жанчын-даследчыц[4], якія звярнулі ўвагу на праблему вытокаў жаночага нераўнапраўя і праблему жаночай працы[5]. Аднак дадзеныя пытанні не атрымалі свайго далейшага развіцця, бо ў савецкай гістарыяграфіі жаночая тэма лічылася неактуальнай і адпаведна непрэстыжнай[6]. Калі жаночае пытанне і закраналася, то толькі ў кантэксце сацыяльнай барацьбы і развіцця дэмакратычнага руху ў Расіі[7] (пры гэтым беларускія тэрыторыі не закраналіся). І толькі ў постсавецкія часы, дзякуючы дэмакратызацыі гістарычнай навукі, развіццю міжнародных сувязей, жаночая тэма ў расійскай гістарыяграфіі зрабілася зноў актуальнай. Праблемы, якія пачалі падымацца ячшэ ў XIX ст., дзякуючы новым метадам і падыходам, атрымалі працяг і развіццё ў працах сучасных расійскіх даследчыкаў.

Можна вылучыць некалькі напрамкаў вывучэння жаночай праблематыкі ў расійскай гістарыяграфіі. Найбольш распрацаванай з'яўляецца тэма выхавання і адукацыі прадстаўніц слабога полу. Так, развіццё жаночай адукацыі і звязаныя з ёю праблемы сталі ключавой тэмай манаграфіі А. Ліхачовай «Матэрыялы да гісторыі жаночай адукацыі ў Расіі (1086–1856))»[8]. У ёй даследчыца разгледзела пытанне станаўлення сістэмы жаночай адукацыі ў су-

вязі з патрэбамі расійскага грамадства і дзяржавы ў з'яўленні «новай» жанчыны. Пры тым, што аўтарка ў сваёй працы абапіраецца на шырокае кола крыніц (у тым ліку і тых, што датычаць заходніх губерняў), пераважна яна аналізуе менавіта падзеі ў цэнтральных губернях Расійскай імперыі. У дачыненні да беларускіх зямель М. Ліхачова пры ўвядзенні фактычнага матэрыялу адмовілася ад каментароў. Аднак, дзякуючы шматлікім дакументам, пададзеным у манаграфіі, магчыма заўважыць, што калі ў цэнтральных расійскіх губернях у якасці галоўнага клопату грамадства выступала менавіта неабходнасць «адукаваць» жанчын, то ў заходніх губернях іх трэба было «перавыхаваць» і адукаваць правільна – у адпаведнасці з патрэбамі не столькі грамадства (патрэбы грамадства заходніх губерняў аўтарка не вызначыла), колькі з інтарэсамі Расійскай дзяржавы.

Непасрэдна станаўленню жаночай адукацыі ў заходніх губернях прысвечана манаграфія Г. Кіпрыяновіча «Да гісторыі жаночай адукацыі ў Заходняй Расіі»[9]. Аўтар абапіраўся на даследаванне М. Ліхачовай, але звярнуў спецыяльную ўвагу на складанасці арганізацыі жаночай адукацыі, з якімі сутыкнуўся расійскі ўрад на беларускіх землях. Адной з галоўных праблем быў супраціў беларускага грамадства новым тэндэнцыям у сістэме жаночай адукацыі. Паводле Кіпрыяновіча, мэты расійскай адукацыйнай палітыкі ў дачыненні да жанчын не былі дасягнуты.

Праблема жаночай адукацыі ў Расійскай імперыі застаецца актуальнай і ў сучаснай расійскай гістарычнай навуцы. Аднак варта адзначыць, што ў XX ст. гісторыя жаночай адукацыі рэдка выступала як тэма самастойных даследаванняў[10]. Таксама істотна, што пераважная большасць даследчыкаў не звярталі належнай увагі на спецыфічную сітуацыю беларускіх зямель.

У якасці асобнага аспекту жаночай гісторыі расійскія даследчыкі выдзялялі праблему становішча жанчыны ў расійскім грамадстве, звяртаючы галоўную ўвагу на яе духоўнае жыццё і той добраўтваральны ўплыў, які жанчыны рабілі на мужчынскую частку грамадства. Асноўнымі катэгорыямі аналізу ў даследаваннях былі паняцці маральнасці, духоўнасці, высакароднасці, самаадданасці, пабожнасці і г. д., а самі аўтары вылучалі, стваралі і замацоўвалі вобразы стэрэатыпных жаночых паводзін[11]. Падобны ж характар вельмі часта мелі і жаночыя біяграфіі[12]. Адметнай рысай такіх даследаванняў з'яўляўся іх выразны маралізатарскі характар.

Сучасныя расійскія даследчыкі імкнуцца комплексна вывучаць становішча жанчыны ў XIX ст. як прыватнай асобы, так

і ў аспекце сямейнага статуса, ролі ў грамадстве. З найбольшым поспехам у гэтым напрамку працуе Н. Пушкарова. Даследчыца не толькі дае грунтоўны фактычны матэрыял, але інтэрпрэтуе яго пры дапамозе спецыяльных метадаў жаночых і гендэрных даследаванняў, псіхагістарычных падыходаў. Новае прачытанне мемуарных крыніц, аналіз сацыяльнага кантэксту, сямейнай і пазасямейнай практыкі стварае ўмовы для вывучэння жанчыны як асобнага прадмета гістарычных даследаванняў[13]. З іншага боку, Пушкарова робіць спробу вызначыць асаблівасці развіцця жаночай актыўнасці ў Расіі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы. Адной з такіх асаблівасцей было тое, што ў XIX ст. эталонам паводзін у грамадстве (а для жанчын асабліва) сталі адносіны ў імператарскай сям'і і тыя пазасямейныя функцыі, якія выконвалі сужэнцы. Другой асаблівасцю, лічыць Пушкарова, было тое, што змена гендэрнай мадэлі ў XIX ст. адбывалася як эмансіпацыя жаночай часткі грамадства праз намаганні з боку мужчын[14].

Неабходна адзначыць, што ў пераважнай большасці расійскіх даследаванняў жаночай гісторыі XIX ст. (як дарэвалюцыйных, так і сучасных) жанчына выступае ў якасці пасіўнай фігуры, на якую накіраваны высілкі грамадства і дзяржавы, яе ж уласныя памкненні, рэальная актыўнасць і патэнцыйныя магчымасці застаюцца часцей па-за колам даследаванняў.

У развіцці польскай гістарыяграфіі праблемы таксама можна вылучыць некалькі этапаў. Згодна з даследаваннем Н. Гардзіенкі[15] «жаночае пытанне» ў польскім грамадстве паўстала яшчэ ў XVIII ст. і мела свой лагічны працяг у XIX ст. З аднаго боку польскія аўтары спрабавалі ацаніць тую ролю, якую жанчыны адыгралі ў грамадстве Рэчы Паспалітай у папярэднія часы[16], з другога боку звярталіся да літаратурных і мемуарных твораў сучасніц.

Таму, што «жаночае пытанне» ў грамадстве Рэчы Паспалітай паўстала яшчэ ў XVIII ст., у значнай ступені спрыялі грамадска-палітычныя працэсы, якія адбываліся ў дзяржаве напярэдадні і ў час падзелаў. Як і ў Расійскай імперыі, «жаночае пытанне» ў грамадскай думцы найперш ўздымалася як праблема адукацыі і выхавання. Аднак спецыфічнай рысай дыскурсу былой Рэчы Паспалітай у XIX ст. было вылучэнне трывалай сувязі паміж зместам і характарам жаночай адукацыі і праблемай «патрыятызму». Полька павінна была быць не толькі адукаванай, але грамадзянкай і патрыёткай, што істотна адрознівала яе ад рускай жанчыны, якая ўспрымалася толькі як жонка або маці патрыёта. У выніку ў польскай гістарыяграфіі праблема выхавання і адукацыі жанчын, зас-

таючыся ключавым момантам «жаночага пытання», мела спецыфічнае адценне.

Жанчыны былой Рэчы Паспалітай уключыліся ў дыскусію наконт прынцыпаў выхавання. Актыўнай педагагічнай дзейнасцю займалася Клементына Гофманава[17]. Яе погляды адносна зместу і прынцыпаў жаночай адукацыі мелі вялікі ўплыў на польскамоўную грамадскасць, у тым ліку і беларускіх зямель. Яна выступала не толькі за свецкае выхаванне дзяўчын, але таксама за іх патрыятычнае выхаванне. К. Гофманава заклікала да аб'яднання сямейнай і грамадскай сфер жыцця жанчыны на падставе пачуцця патрыятызму і карысці для айчыны. Выступаючы за эмансіпацыю, аўтарка яшчэ не бачыла жанчыну роўнай мужчыне ў межах палітычных ці дзяржаўных пытанняў, лічачы, што «жанчына не можа пісаць законаў, кіраваць народамі, бараніць або павялічваць роднай зямлі... тыя, што заняліся палітыкай сталі небяспечнымі»[18].

Сучасніца Гофманавай Е. Зямецкая[19] спрабавала скласці псіхалагічны партрэт жанчыны свайго часу і на падставе гэтага вызначыць асноўныя напрамкі яе выхавання. Галоўнае адрозненне ў меркаваннях дзвюх дзяячак палягала ў вырашэнні пытання «жанчына і сям'я». Так, калі Гофманава імкнулася прапанаваць жанчыне сумяшчэнне сямейнага і грамадскага, то Зямецкая да такога сумяшчэння ставілася адмоўна, сцвярджаючы, што «сям'я ў нашым грамадстве не мае павагі, бо жанчына бачыць сувязь хатняга жыцця з агульным»[20].

Цікавасць да дзейнасці жанчын і жаночых рухаў паўстала ў асяродку польскіх гісторыкаў у міжваенны перыяд. У 50–70-я гг. XX ст. жаночая тэма закраналася найперш у сацыялагічных і статыстычных даследаваннях, а галоўнымі тэмамі прац гісторыкаў былі: жаночы рух, грамадскія пазіцыі жанчын, іх удзел у пераўтварэнні радзімы, сям'я і гаспадарка. У гэты час польскія даследчыкі пераважна звярталіся да біяграфій вядомых дзяячак. Якасна новы этап у польскіх даследаваннях наступіў у 90-я гг. XX ст., калі пачалося вывучэнне жаночай праблематыкі ў кантэксце сацыяльнай і гендэрнай гісторыі. Больш разнастайнай стала тэматыка гістарычных даследаванняў. Навукоўцы звярнуліся да вывучэння праблем змены ролі жанчыны ў грамадстве XIX ст., яе прававога і грамадскага статуса, да адносін паміж мужчынамі і жанчынамі, змен у спосабе мыслення жанчын, новых з'яў у галіне адукацыі, занятасці і культуры працы, да публічнай дзейнасці; інтэлектуальнай і культурнай творчасці, шлюбных адносін і г. д.[21].

Тэма жаночай адукацыі, як ключавога моманту «жаночага пытання» ў першай палове XIX ст., была і застаецца папулярнай у польскіх даследчыкаў. Так, К. Мразоўская[22], Р. Врачынскі[23], А. Віняж[24] разглядалі развіццё жаночай адукацыі на польскіх землях як у сувязі з патрэбамі самога польскага грамадства, так і ў сувязі з палітыкай Расійскай імперыі і праз гэтую прызму спрабавалі паказаць жанчыну як прадукт адукацыі і непасрэдную ўдзельніцу выхаваўчага і адукацыйнага працэсаў.

З вывучэннем згаданай вышэй праблемы жаночага «патрыятызму» ў польскай гістарыяграфіі звязаны таксама блок даследаванняў ролі жанчыны ў грамадскай дзейнасці, яе грамадскіх пазіцый і праблемы эмансіпацыі. Так, Р. Чэпюс-Растэніс[25], Б. Сухадольскі[26], Д. Маркоўская[27] імкнуліся паказаць узаемасувязь паміж жаночай актыўнай патрыятычнай пазіцыяй, якая адлюстроўвалася як у сям'і (функцыі выхавацелькі), так і ў грамадскай дзейнасці і нават у літаратурнай творчасці. Бурлівыя падзеі (нацыянальны супраціў і рэпрэсіі) першай паловы XIX ст. не толькі не стрымлівалі актыўнасць, але і спрыялі павышэнню аўтарытэту жанчын у польскамоўным грамадстве, што знайшло адлюстраванне ў складванні вобразу «Маткі-полькі», а таксама ў з'яўленні своеасаблівай, адрознай ад еўрапейскай, польскай эмансіпацыі, якая характарызуецца як «вымушаная».

Пытанню ўдзелу жанчын у палітыцы прысвечаны артыкулы Я. Шкаўронка[28], М. Нятыкша[29] і В. Слівовскай[30]. Варта адзначыць, што ў адрозненне ад XVIII ст., у першай палове XIX ст. адкрытая жаночая палітычная дзейнасць была практычна немагчымай, з аднаго боку, з-за абмежаванняў палітычных практык для жанчыны ў Расійскай імперыі, а з другога боку – грамадства яшчэ не ўспрымала прадстаўніц слабога полу ў якасці ўдзельніц канспірацыйных арганізацый. У выніку актыўны ўдзел асобных дзяячак у палітычнай апазіцыі пачаўся толькі ў перыяд паміж паўстаннямі, калі яны сталі перавозіць сакрэтную карэспандэнцыю і нелегальныя выданні, падтрымлівалі кантакты з эміграцыяй.

Агульнае, што падкрэсліваюць даследчыкі, – гэта неверагодны ўздым жаночай грамадскай актыўнасці ў час паўстання 1830–1831 гг. Менавіта гэтай праблеме прысвечана грунтоўная манаграфія А. Бараньскай[31], у якой даследчыца вызначыла тыя сферы, у якіх жанчыны выявілі сябе найбольш актыўна. Гэта і разнастайная дабрачынная дзейнасць (збор ахвяраванняў на патрэбы краю, арганізацыя медычнай дапамогі, апека над ахвярамі паўстання), і ўдзел жанчын у палітычным жыцці. Вялікае значэнне мае выву-

чэнне аўтаркай патрыятычнай агітацыі, прызначанай для жанчын як асобнай сацыяльнай групы. Даследчыца прыйшла да высновы, што за гэты кароткі перыяд патрыятызм ператварыўся ў «традыцыйную» цноту полькі, якая адрознівала яе ад прадстаўніц іншых народаў. Самі ж жанчыны адначасова выступалі як аб'ект прапаганды і як стваральніцы грамадскай думкі. Так, яны актыўна бралі ўдзел у г. зв. «жаночай палеміцы», у цэнтры якой знаходзілася пытанне магчымых і прымальных форм жаночага патрыятызму (маецца на ўвазе пытанне пра ўдзел жанчыны непасрэдна ва ўзброенай барацьбе). Неабходна адзначыць, што А. Бараньская выявіла, што ўдзел жанчын ва ўзброенай барацьбе, як правіла, меў месца менавіта ў заходніх губернях Расійскай імперыі, г. зн. беларускіх землях, што было своеасаблівай формай вымушанай самаабароны з-за «варварскіх рэпрэсіяў» расіян у дачыненні да сем'яў паўстанцаў. Пераважна жанчыны выконвалі функцыі сувязных, кур'ераў, правадніковў, правозілі зброю або даставалі інфармацыю. Непасрэдны ўдзел прадстаўніц слабога полу ва ўзброенай барацьбе звычайна звязваўся з асобай Эміліі Плятэр, чый вобраз «дзяўчыны-змагара» пачаў складвацца яшчэ ў час паўстання і стаў устойлівым стэрэатыпам[32].

Нягледзячы на тое, што аўтарытэт жанчын у час паўстання значна вырас і за імі пачалі прызнаваць прынцыповую ролю ў набыцці будучай незалежнасці, Бараньская заўважыла, што паўстанцкая актыўнасць шляхцянак была ў вялікай ступені «спадчынай матак», г. зн. – традыцыяй. Уплыў нацыянальнай традыцыі на стварэнне грамадскага вобраза жанчыны ў грамадстве былой Рэчы Паспалітай абумовіў слабасць барацьбы яго прадстаўніц супраць сацыяльнай няроўнасці, бо такая барацьба адразу ўспрымалася як антынацыянальнае выступленне. І хаця праявы падобнага змагання за правы мелі месца бліжэй да канца XIX ст., характэрныя рысы яе закладваліся менавіта ў часы паўстання.

Відавочна, што даследаванне Бараньскай мае значэнне не толькі для польскай гістарыяграфіі, але і для беларускай. Праўда, аўтарка зрабіла заўвагу, што дзейнасць жанчын на «літоўска-рускіх землях» патрабуе асобнага даследавання, і ўзгадвала падзеі тут толькі ў якасці ілюстрацыі. Дадзеная акалічнасць не дае магчымасці для адназначнага пераносу сфармуляванай Бараньскай мадэлі паводзін польскіх жанчын на прадстаўніц грамадства заходніх губерняў, але стварае выдатныя падставы для навуковага пошуку.

Такім чынам, у адрозненне ад расійскай гістарыяграфіі, якая пераважна разглядала гісторыю жанчын праз прызму інтарэсаў

Расійскай імперыі, польскія даследчыкі вывучалі гэтую гісторыю з пункту гледжання традыцый і інтарэсаў былой Рэчы Паспалітай. Гэта вылучыла на першы план побач з даследаваннем задач і зместу жаночай адукацыі, увагу да характару сацыяльнай і палітычнай ролі жанчын. Пры гэтым жаночая актыўнасць разглядалася дастаткова шырока, закранала як літаратурную і дабрачынную дзейнасць, так і непасрэдны ўдзел у палітычных падзеях у часы паўстанняў.

Варта адзначыць, што большасць польскіх аўтараў бачылі прычыны эмансіпацыі жанчын менавіта ў іх удзеле ў вызваленчым руху (у той ці іншай форме). Пры гэтым адзначаецца «вымушаны» характар гэтай эмансіпацыі, калі з-за рэпрэсій жанчыны бралі на сябе «ўласцівыя» мужчынам абавязкі (асабліва ў сямейнай сферы), што рабіла адбітак на ментальнасць жанчын і іх атачэння. Безумоўна, высновы польскіх гісторыкаў грунтуюцца найперш на матэрыяле ўласна польскіх крыніцаў, аднак іх варта ўлічваць і пры даследаванні ролі жанчыны ў грамадстве беларускіх земель XIX ст., калі ўплыў традыцыйных польскіх стэрэатыпаў і грамадскай думкі былой Рэчы Паспалітай тут быў надзвычай моцны.

Айчынная гістарыяграфія не мае грунтоўных прац па гісторыі жанчын XIX ст. Жаночая праблематыка ў савецкія часы ў асноўным праходзіла фрагментарна, у кантэксце даследаванняў іншых сацыяльных і культурных з'яў. Сярод такіх прац трэба адзначыць манаграфію С. Вальфсона, прысвечаную гісторыі сям'і і шлюбу[33]. Аўтар з пазіцый класавай барацьбы паказвае гісторыю барацьбы за раўнапраўе, станаўленне фемінісцкіх рухаў у Еўропе і дае характарыстыку жанчыне ў буржуазным грамадстве. У апошнія дзесяцігоддзі жаночая праблематыка дзе-нідзе закраналася ў сувязі з даследаваннем гісторыі культуры[34], адукацыі і асветы на беларускіх землях у першай палове XIX ст.[35].

У канцы 90-х гг. XX ст. са з'яўленнем у сучаснай беларускай гуманістыцы такога напрамку, як гендэрныя даследаванні, беларуская гістарычная навука ўзбагацілася новым напрамкам – гендэрнай гісторыяй. У выніку даследчыкі атрымалі магчымасць азнаёміцца з выбранымі перакладамі або інтэрпрэтацыяй замежных публікацый, прысвечаных катэгорыі «гендэр» у гістарыяграфіі. Спробы прымянення новых тэорый, падыходаў і метадаў адлюстраваны ў разнастайных зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый або адмыслова прысвечаных «гендарнай гісторыі» і фемінісцкім пытанням, або маючых адпаведныя секцыі. Пры гэтым крытыку спецыялістаў па гендэрных даследаваннях выклікае

тое, што большасць публікацый прыходзіцца на традыцыйных гісторыкаў, якія сутыкаюцца з пола-ролевымі і полаўзроставым падзелам даследуемых груп і грамадстваў, але не выкарыстоўваюць гендэрныя метады[36].

Безумоўна выкарыстанне гендэрнага падыходу ў вывучэнні гісторыі Беларусі XIX ст. дае магчымасць зрабіць прадметам даследавання менавіта жанчын, у іншым ракурсе разгледзець асноўныя гістарычныя з'явы і падзеі на беларускіх землях, сфармуляваць новыя гістарычныя праблемы. У якасці прыкладу можна прывесці артыкул Л. Старцавай[37], у якім зроблена спроба разгледзець праблему жаночай творчасці ў сферы музычнага мастацтва, яе ўплыў на развіццё музычнай культуры і выхаванне маладога пакалення ў рэчышчы гендэрнай тэорыі. Аўтарка раскрывае і сацыяльную значнасць жаночай творчасці, што стала «глебай», на якой выраслі многія геніяльныя музыканты, «бо жанчыны атрымаўшы сваю адукацыю ў сям'і, ад сваіх матак, перадавалі яе сваім дзецям як нейкія сакраментальныя веды»[38]. Пры гэтым даследчыца адзначае, што выйсце жанчыны за межы хатняй прасторы не парушыла гендэрнай іерархіі тагачаснага грамадства, жанчына выконвала традыцыйную ролю гаспадыні і «музы натхняльніцы».[39] Аднак недахоп імперычнага матэрыалу робіць высновы аўтаркі недастаткова абгрунтаванымі.

Роля двараніак у развіцці музычнай культуры ў беларускіх губернях разглядалася Н. Анофранка. Аўтарка заўважае, што музычная творчасць, якая з'яўлялася складовай часткай свецкага і культурнага жыцця, нярэдка абгрунтоўвалася дабрачыннымі мэтамі. У выніку такая філантрапічная дзейнасць не толькі павышала сацыяльную значнасць жанчын, але стымулявала набыццё імі навуковых і прафесійных ведаў[40].

У цэлым трэба адзначыць, што праблемы жаночай адукацыі і выхавання, культурнай і дабрачыннай дзейнасці, фарміравання светапогляду і пачуццёвай сферы, а таксама матрыманіяльныя адносіны ў першай палове XIX ст. не набылі ў сучаснай гістарычнай навуцы дастатковага раскрыцця[41]. Сучасныя гісторыкі не звярнулі ўвагі на такія праблемы як хабітус прадстаўніц набілітэта, іх уплыў на фарміраванне грамадскай думкі і настрояў у час вайны 1812 г. і паўстання 1830–1831 гг.[42].

Тым не менш, пастаноўка такіх праблем можа ўзбагаціць беларускую гістарыяграфію ў цэлым, бо ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі вымушала насельніцтва былой Рэчы Паспалітай прыстасоўвацца да новых умоў эканамічнага,

палітычнага і сацыяльнага жыцця. Жанчыны таксама былі ўцягнуты ў працэс складвання новых сацыяльных, эканамічных, палітычных сувязей. На беларускіх землях яны былі ўключаны ў некалькі эмансіпацыйных працэсаў – агульнаеўрапейскі і распачатае ў Рэчы Паспалітай пад яго уплывам усведамленне грамадзянскай ролі жанчыны, а таксама пераасэнсаванне месца жанчыны ў грамадстве самой Расійскай імперыі. У выніку развіцця адзначаных эмансіпацыйных працэсаў, а таксама пад уздзеяннем сацыяльна-эканамічнай, культурнай і палітычнай спецыфікі мясцовага шляхецкага асяроддзя ў перыяд канца XVIII – першай паловы XIX ст. месца і роля дваранак на беларускіх землях мелі шэраг асаблівасцей, як у параўнанні з папярэднімі часамі, так і адносна іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Аналіз сучаснага стану айчыннай гістарыяграфіі сведчыць, што гэтыя асаблівасці, як дарэчы і праблема ў цэлым, яшчэ не атрымалі належнай увагі даследчыкаў.

---

[1] Юкина И. И. Проблемы становления российской истории женщин // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И. Р. Чикаловой. Мн., 2001. С. 76.

[2] Там жа. С. 77.

[3] Там жа.

[4] Лихачева Е. Материалы для истории женского образования в России (1086–1856). СПб., 1899; Щепкина Е. Н. Из истории женской личности в России. СПб., 1921.

[5] Там жа. С. 78–79.

[6] Юкина И. История женщин России. Проблема становления // Женщина. Образование. Демократия: Материалы 3-й междунар. междисциплинарной науч.-практ. конф. (8–9 декабря 2000 г.) Мн., 2000. С. 268.

[7] Тишкин Г. А. Женский вопрос в России в 50–60 гг. XIX в. Л., 1984.

[8] Лихачева Е. Материалы для истории женского образования в России (1086–1856). СПб., 1899.

[9] Киприанович Г. Я. К истории женского образования в Западной России (Историческая записка ко дню 50-летия Виленской, Гродненской и Ковенской гимназий). 1860–1910. Вильна, 1910.

[10] Лотман Ю. М. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII–XIX стст.) СПб., 1997.

[11] Шашков С. С. Очерки истории русской женщины. Издание исправленое и дополненое, с прибавлением статьи «Русская проституция». СПб., 1872; Щепкина Е. Н. Из истории женской личности в России. СПб., 1921; Лотман Ю. М. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII–XIX стст.) СПб., 1997. С. 46–75.

[12] Мордовцев Д. Л. Русские женщины нового времени: В 3 т. СПб., 1874; Шашков С. С. Исторические судьбы русской женщины. СПб., 1872; Дубинский М. Женщина в жизни великих и знаменитых людей. Мн.,

1996 (перавыданне); Дубински М. Женщина в жизни великих и знаменитых людей. СПб., 1900; Павлюченко Э. А. Женщины в русском освободительном движении: от Марии Волконской до Веры Фигнер. М., 1988.

[13] Пушкарева Н. Л. Частная жизнь русской женщины: невеста, жена, любовница (X – начало XIX ст.) М., 1997.

[14] Пушкарева Н. Л. «Дерзкие и беспокойные» («Женская история» России 1801–1905 гг.: формы социальной активности) // Отечественная история. 2002. № 6.

[15] Гардзіенка Н. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII ст. Дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2003.

[16] Там жа. С. 11.

[17] Tańska K. Pamiętniki Klementyny z Tańskich Hoffmanowej. Berlin, 1849. T. III.

[18] Там жа. S. 187.

[19] Ziomięcka E. Myśli o wychowaniu kobiet. W-wa, 1843.

[20] Там жа. S. 157.

[21] Żarnowska Anna. Studia nad dziejami kobiet w dzisiejszaj historiografii polskiej // Kwartalnik Historyczny. 2001. № 3. S. 99–116.

[22] Mrozowska Kamila. Kobiety polskie w nauce i oświacie // Kobiety polskie. Praca zbirowa. W-wa, 1986. S. 242.

[23] Wroczyński R. Dzieje oświaty polskiej 1795–1945. W-wa, 1987.

[24] Winiarz A. Kształcenie i wychowanie dziewczat w Księstwie Warszauskim i Królewstwie Polskim (1807–1905) // Kobieta i adukacyja na ziemiach polskich w XIX i XX w. W-wa, 1992. T. 2. Cz. 2. S. 5–27.

[25] Czepulis-Rastenis R. Pierwsze pokolenie literatek polskich // Kobieta i adukacyja na ziemiach polskich w XIX i XX w. T. 2. Cz. 1. S. 305–321.

[26] Suchodolski B. Kobieta polska – los i powołanie // Kobiety polskie. Praca zbirowa. S. 11–26.

[27] Markowska D. Rola kobiety polskiej w rodzinie // Kobiety polskie. Praca zbirowa. S. 189–192.

[28] Szkowronek J. Debiuty polityczne kobiet w epoce porozbiorowej i początkach epoki poroziorowej 1772–1831 // Kobiety i świat polityki. Polska na tle porównanczym w XIX i w początkach XX wieku. W-wa, 1994. T. III. S. 29–45.

[29] Nietyksza M. Tradycyjne i nowe formy aktywności publicznej kobiet w warunkach zaborów // Kobiety i świat polityki. Polska na tle porównanczym w XIX i w początkach XX wieku. T. III. S. 83–99.

[30] Śliwowska W. Kobiety w konspiracjach patryotycznych lat czterdziestych XIX wieku (Ewa Fielinska, Eleonora Wolańska i inne) // Kobiety i świat polityki. Polska na tle porównanczym w XIX i w początkach XX wieku. T. III. S. 45–59.

[31] Barańska A. Kobiety w powstaniu listopadowym 1830–1831 // Źródła i monografie № 168. Lublin, 1998.

[32] Филипович Х. Дочери Эмилии Плятер // Женщины на краю Европы. Мн., 2003. С. 334–351.

[33] Вольфсон С. Я. Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці. Менск, 1937.

[34] Масленнікава В. П. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980; Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982; Капилов А. Л., Ахвердова Е. И. Музыкальная культура Беларуси XIX – нач. XX веков. Мн., 2000.

[35] Кузняева С. А. Асвета на Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя: тэндэнцыі развіцця // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён: Зб. артыкулаў. Мн., 1992. С. 92–102; Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 года. Мн., 1985. С. 186–192; Жаночая асвета на беларускіх землях у канцы XVI – першай палове XIX стагоддзя // Адукацыя і выхаванне. 1998. № 9. С. 120–126.

[36] Рогач С. Н. Традиционные «гендерные истории»: постсоветская перформативность «гендера» // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. научн. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Мн.: БГУ, 2004. С.170–172.

[37] Старцова Л. О женском музицировании // Женщины на краю Европы. Мн., 2003. С. 118–130.

[38] Там жа. С. 127.

[39] Там жа. С. 122.

[40] Анофранка Н. Удзел жанчын у культурным жыцці Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: Материалы междунар. научно-теоретич. конф., 30–31 окт. 2003 г.) Витебск, 2003. С. 428–430; Анофранка Н. В. Свецкая жаночая дабрачыннасць у першай чвэрці XIX ст. // Гісторыя, якой няма ў падручніках. Мн., 2002. С. 60–68. Анофранка Н. В. Свецкая жаночая дабрачыннасць у першай чвэрці XIX ст. // Гісторыя, якой няма ў падручніках. Мн., 2002. С. 60–68.

[41] Анофранка Н. Мемуары Евы Фялінскай аб жыцці шляхцянак у пачатку XIX стагоддзя // Гісторыя выдавецкай дзейнасці ў Польшчы і Беларусі ў XVI–XX стагоддзях. Мн., 2003. С. 108–113.

[42] Анофранка Н. В. Шляхцянкі-полькі ў грамадскім жыцці Беларусі канца XVIII ст. – 1813 г. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Мн., 2001. С. 110–114.

8.3. Шлюбнае заканадаўства Расійскай імперыі і яго дзеянне на тэрыторыі Беларусі

У XVIII–XIX стст. у Расійскай імперыі быў выпрацаваны і замацаваны (як у грамадстве, так і ў заканадаўстве) пункт гледжання на шлюб як на царкоўную таямніцу. У сувязі з гэтым прызнаваўся толькі адзіны спосаб заключэння шлюбу – царкоўнае вянчанне і бласлаўенства. Прадстаўнікі розных веравызнанняў карысталіся рознымі правіламі, зыходзячы з таго, што «розныя рэ-

лігіі разумеюць мэту шлюбу па-рознаму»[1]. Найбольшую ўвагу расійскіх правазнаўцаў прыцягвалі прававыя нормы, што рэгулявалі шлюбныя адносіны ў афіцыйна прызнаных хрысціянскіх канфесіях (праваслаўнай, рымска-каталіцкай і евангелісцкай). Параўнаўчы аналіз заканадаўчых актаў, што тычыліся асобных хрысціянскіх канфесій, або асобных рэгіёнаў Расійскай імперыі, даваў магчымасць даследчыкам знайсці агульнае, вылучыць асаблівасці шлюбнага заканадаўства. Але перш чым перайсці да аналізу гістарыяграфічных праблем, неабходна коратка спыніцца на аглядзе гэтых заканадаўчых актаў.

Асноўнай нарматыўнай базай шлюбнага права з'яўляўся «Звод законаў грамадзянскіх Расійскай імперыі» (Т. Х. Ч. 1. «Законы грамадзянскія»). У аснову гэтага заканадаўства была пакладзена 50-я глава «Кормчей книги», на падставе якой розныя бакі шлюбнага права былі ўвасоблены ў новую форму і перайшлі ў Звод законаў грамадзянскіх Расійскай імперыі 1832, 1842, 1857 гг. (далей Звод законаў. – *Аўт.*) без істотных змен. Менавіта 50-я глава «Кормчей книги» паўплывала на паняцце пра сутнасць шлюбу, на форму яго ўсталявання, вызначэнне і ўмовы ўступлення ў шлюб, спосабы знішчэння шлюбных адносін.

Другой крыніцай шлюбнага права з'яўляўся «Статут духоўных спраў замежных веравызнанняў» Т. XI. Ч. 1. Звода законаў Расійскай імперыі, у якім былі змешчаны шлюбна-сямейныя правілы для прадстаўнікоў евангелісцкай царквы ў Расіі. У сваю чаргу гэтыя правілы былі ўзяты са «Статута Курляндскай кансісторыі» (1798 г.) і «Статута евангеліка-лютэранскай царквы» (1832 г.).

Трэцяй крыніцай было «Prawo o małżeństwie» (Палажэнне аб саюзе шлюбным). Гэты законапраект быў складзены ў 1836 г. спецыяльна для Царства Польскага. У аснову гэтага нарматыўнага акта было пакладзена шлюбнае права каталіцкай царквы, прынятае ў 1542 г. на Трыдзенцкім саборы. Адпаведна ўсе шлюбна-разводныя справы таксама былі аддадзены ў кампетэнцыю каталіцкай царквы. Разам з тым «Палажэнне аб саюзе шлюбным» было ўзгоднена з агульным расійскім заканадаўствам. Напрыклад, узрост шлюбнага паўналецця нявесты[2]. Таксама былі ўзяты правілы маральнага характару – муж абавязаны любіць і паважаць сваю жонку, а жонка павінавацца мужу як галаве сям'і, быць у любові, павазе і вернасці (арт. 106 і 107 Т. Х. Ч. 1 Звода законаў). Са статута для лютэранскай царквы было ўзята палажэнне пра неабходную згоду апекуноў на шлюб. Можна меркаваць, што ў кананічнай частцы «Палажэнне аб саюзе шлюбным» было сапраўдным для каталікаў усёй Расійскай імперыі.

Вышэйназваныя прававыя акты дзейнічалі на тэрыторыі ўсёй імперыі, у тым ліку і ў заходніх губернях, але тут былі і свае асаблівасці. Нягледзячы на тое, што расійскае заканадаўства адмяніла ўсе нормы Статута ВКЛ па крымінальных справах, да 1840 г. асабістыя правы сужэнцаў і асабліва маёмасныя правы вызначаліся па Статуце і рэзка адрозніваліся ад агульнаімперскіх[3]. Апошняе паслужыла сур'ёзным аргументам для адмены дзеяння Статута, што знайшло адлюстраванне ў друку. У часопісе «Чтения Московского Общества Истории и Древностей» быў змешчаны артыкул невядомага аўтара «Пра неабходнасць знішчэння асобных правоў у губернях ад Польшчы вернутых». Асноўным недахопам аўтар артыкула лічыў асаблівасці падзела бацькоўскай спадчыны паміж братамі і сёстрамі: «У імперыі дочкі могуць прэтэндаваць на 1/14 нерухомай маёмасці і 1/8 рухомай маёмасці. Па польскім (г. зн. па літоўскім) законе ў маёнтку маці яны атрымліваюць спадчыну ў роўных долях з братамі, а ў бацькоўскім – ¼ частку спадчыны… Такое драбленне маёмасці ёсць вынік рэспубліканскіх тэндэнцый польскага заканадаўства і несумяшчальна з манархічным праўленнем»[4]. Далей аўтар адзначае, што абдзяленне дочак робіць рускія законы «найлепш за польскія яшчэ і ў тым сэнсе, што яны добраўтваральна адлюстроўваюцца на сямейным ладзе, бо дочка, якая не мае ўласнай маёмасці, мацнейшая ў сваіх сямейных цнотах. Думка пра немагчымасць асобнага існавання спыняе разбэшчанасць... Чым менш уласная маёмасць жанчыны, тым больш для яе неабходна прывязанасць да мужа, тым больш трывалае пачуццё маральнасці»[5]. Гэтай заўвагай, адзначалі расійскія правазнаўцы, абмяжоўвалася крытыка мясцовых законаў заходніх губерняў[6].

У Расійскай імперыі не было супрацьлегласці паміж дзяржаўным і царкоўным шлюбным заканадаўствам, гэта значыць паміж царкоўным шлюбам і грамадзянскім. Але ў вызначэнні паняцця «шлюб» сярод расійскіх правазнаўцаў не назіралася адзінства. На думку К. Пабеданосцава, шлюбам з'яўляўся саюз мужчыны і жанчыны, які асвячаўся грамадскай свядомасцю, і праз гэта набываў юрыдычны характар. Правазнаўца звярнуў увагу на дагаварны характар шлюбных адносін, маючы на ўвазе, што муж і жонка бяруць на сябе пэўныя ўзаемныя абавязкі, як у маральным сэнсе, так і ў адносінах да маёмасці[7]. Шлюбныя адносіны былі па сваёй сутнасці асабістымі, цэласнымі і пастаяннымі, і з-за гэтых якасцей з'яўляліся асноўным элементам грамадскіх і дзяржаўных адносін[8]. Ролю дзяржавы К. Пабеданосцаў бачыў у тым, што яна вы-

значала формы і ўмовы, пры якіх саюз дзвюх асоб увогуле мог называцца сямейным[9]. Аднак непасрэдна ўмешвацца ў сямейныя адносіны дзяржава магла толькі ў двух выпадках: калі «сямейная аўтаномія сутыкалася з аўтаноміяй дзяржавы», калі ў сям'і адбываліся злоўжыванні ўладай альбо занядбанне сямейных абавязкаў у такой ступені, што гэта пачынала цалкам адмаўляць асновы сямейнага жыцця[10].

І. Аршанскі найперш у шлюбе бачыў дагаварны элемент, бо галоўнай умовай заключэння шлюбу з'яўлялася згода дзвюх асоб, а тыя абавязацельствы, якія ўзнікалі паміж сужэнцамі, рабілі шлюб у поўным сэнсе інстытутам права[11]. Аднак звяртаючыся да расійскага заканадаўства, ён заўважыў, што не было «ніводнага заканадаўства, у якім царкоўны бок шлюбу пераважаў бы да такой ступені над грамадзянскім, альбо лепш сказаць, паглынаў бы апошні, як у заканадаўстве рускім»[12]. У выніку гэтага «паглынання» грамадзянскія законы з'яўляліся не самастойнымі юрыдычнымі нормамі, абавязковымі для ўсіх грамадзян Расійскай імперыі, а толькі «абстракцыяй агульнахрысціянскіх правілаў» і таму мелі сілу для кожнага веравызнання толькі згодна з яго царкоўнымі правіламі[13].

І. Аршанскі сцвярджаў што, нават абараняючы сямейны саюз ад правапарушэнняў, расійскае заканадаўства зыходзіла не з агульначалавечых маральных і прававых поглядаў, а са спецыфічнага царкоўнага пункту гледжання, і такім чынам ахоўвала менавіта царкоўны бок шлюбу[14]. Толькі ў выпадку шлюбу паміж праваслаўнымі і прадстаўнікамі іншых хрысціянскіх веравызнанняў рэгулюючыя нормы набывалі некаторы свецкі характар, бо такія шлюбныя саюзы супярэчылі канонам праваслаўнай царквы, якая забараняла змешаныя шлюбы. А значыць іх дазвол быў выкліканы выключна інтарэсамі дзяржавы[15].

Зусім іншы сэнс паняццю «шлюб» надаваўся ў царкоўнай трактоўцы. Найбольш яскрава ён адлюстраваны ў вызначэнні М. Гарчакова: «Шлюб альбо сужэнства ёсць усталяваная ад Бога таямніца, у які мужчына і жанчына ўступаюць па асабістаму іх жаданню, адкрыта выяўленаму перад святаром і царквой, уступаюць ў непарыўны саюз любові і сяброўства для ўзаемнай дапамогі, для прадухілення непрыстойнасцей у жыцці і для нараджэння дзяцей, у імя божай славы»[16].

Нягледзячы на тое, што ў аснову шлюбнага права Расійскай імперыі былі пакладзены царкоўныя правілы, дзяржава пэўным чынам спрабавала ўплываць на ўсталяванне матрыманіяльных ад-

носін. Каб зразумець, якім чынам гэта адбывалася, правазнаўцы спрабавалі вылучыць свецкі элемент у шлюбным заканадаўстве і абгрунтаваць матывы такой з'явы. У Зводзе законаў Расійскай імперыі ўмовы заключэння шлюбу, якія фармуляваліся як адсутнасць пэўных перашкод, амаль цалкам былі ўзяты з царкоўнага права. Найбольш грунтоўна іх класіфікацыю і тлумачэнне даў М. Сувораў[17]. Паводле яго, перашкоды падзяляліся на тыя, якія знішчалі шлюб, і тыя, якія толькі перашкаджалі заключэнню шлюбу. Існавалі перашкоды божага права і перашкоды чалавечага права, якія ў сваю чаргу маглі насіць публічны або прыватны характар[18]. Безумоўнымі перашкодамі для заключэння шлюбу з'яўляліся: няздольнасць або немагчымасць свядомага і свабоднага волевыяўлення, адсутнасць неабходнага ўзросту, фізічная няздольнасць да сужэнскага жыцця, наяўныя матрыманіяльныя сувязі, вычэрпанасць колькасці шлюбаў, духоўны сан і манаства, розніца ў веравызнаннях, злачынствы, кроўнае і некроўнае сваяцтва[19].

Сярод пералічаных умоў найбольшую цікавасць у даследчыкаў выклікалі праблемы свабоднага волевыяўлення і абавязковая згода бацькоў або апекуноў на шлюб, а таксама пытанне шлюбнага паўналецця.

Зыходзячы з кананічнага права, няздольнасць або немагчымасць свядомага і свабоднага волевыяўлення з'яўлялася безумоўнай перашкодай да шлюбу. Гэта магла быць аб'ектыўная няздольнасць волевыяўлення, у выпадку вар'яцтва або псіхічнай хваробы (у праваслаўнай царкве). У заходне-кананічным вызначэнні перашкодай, акрамя відавочнага вар'яцтва, лічыўся любы ненармальны стан (напрыклад, ап'яненне альбо стан усыплення)[20]. Немагчымасць свабоднага волевыяўлення магла быць выклікана і падаўленнем волі праз гвалт або прымус. Хоць у адпаведнасці з расійскім заканадаўствам любы прымус да заключэння шлюбу – фізічны гвалт альбо пагрозы – з'яўляўся крымінальным злачынствам (і такі шлюб мог быць прызнаны ад пачатку несапраўдным)[21], асноўная складанасць, на думку К. Пабеданосцава, заключалася ў тым, што ў большасці выпадкаў прымус быў маральны і рэдка суправаджаўся матэрыяльнымі прыкметамі. Правазнаўца адзначаў, што там «дзе воля падуладнага маўчыць… там немагчыма бачыць прымус»[22]. Найчасцей маральны прымус мог адбывацца з боку бацькоў і апекуноў. Яго не толькі цяжка было даказаць, але, у адпаведнасці з расійскім заканадаўствам, дзецям было забаронена падаваць скаргі на бацькоў.

У сувязі з праблемай свабоднага волевыяўлення К. Пабеданосцаў убачыў яшчэ адзін важны момант. З аднаго боку, закон патрабаваў

для заключэння шлюбу свабоднага волевыяўлення, з другога – прадугледжваў, што ў некаторых выпадках гэтае волевыяўленне магло быць абмежавана па сямейных або дзяржаўных меркаваннях (напрыклад, адсутнасць узросту грамадзянскага паўналецця або ваенная і дзяржаўная служба. – *Аўт.*). У выніку складвалася сітуацыя, калі волевыяўленне тых, хто жадаў пабрацца шлюбам, павінна было дапаўняцца «пануючай» воляй (бацькоў, апекуноў або начальства). Юрыдычна гэта было афармлена ўказам ад 1 студзеня 1835 г., які канчаткова забараніў дзецям (і не толькі непаўналетнім) заключаць шлюб без бацькоўскай згоды[23]. На думку К. Пабеданосцава, гэты ўказ быў саступкай патрыярхальным сямейным традыцыям рускага грамадства з боку дзяржавы, нягледзячы на тое, што супярэчыў кананічнаму праву.

Праблема шлюбнага паўналецце была выклікана тым, што яно лічылася розным для розных канфесій. Так, у праваслаўнай царкве ўзрост шлюбнага паўналецця для мужчын быў 15 год, а для жанчын 12 (13) год; у каталіцкай – для мужчын 14, жанчын – 12 год; у евангелісцкай – 16 год для ўсіх[24]. Толькі ў 1830 г. выйшаў Высачайшы ўказ, паводле якога духавенству ўсіх хрысціянскіх канфесій забаранялася вянчаць шлюбы, дзе асобе мужчынскага полу было менш за 18 год, а жанчыне менш за 16 год[25]. Гэта дало падставу І. Аршанскаму ўбачыць парушэнне прынцыпу аўтаноміі розных веравызнанняў у шлюбных справах. Таксама ён адзначаў, што парушэнне ўзроставай мяжы пры заключэнні шлюбу прадстаўнікамі розных канфесій прыводзіла да розных наступстваў. На яго думку, грамадзянскі закон з большай ахвотай умешваўся ў сферу сямейнага жыцця іншаверцаў, чым праваслаўных: «Там ён не так сароміцца адступаць ад рыгарызму царкоўнага погляду на шлюб, як ў шлюбным праве праваслаўных»[26].

Калі дзяржава ў некаторай ступені магла ўмешвацца ў працэс заключэння шлюбаў і дзяржаўныя пастановы нават маглі супярэчыць кананічнаму праву, то скасаванне шлюбных адносін традыцыйна знаходзілася пад юрысдыкцыяй царквы. Ужо з часоў Пятра І дзяржаўная ўлада імкнулася зацвердзіць гэта канадаўча. У XIX ст. гэтыя тэндэнцыі пашырыліся. 1 студзеня 1805 г. было забаронена вырашаць разводныя справы праваслаўных без папярэдняга разгляду і пастановы Св. Сінода. А Статутам духоўных кансісторый (1841 г.) і Указам пра шлюбныя справы (1850 г.) канчаткова была афармлена царкоўная юрысдыкцыя ў шлюбных справах, якая была цалкам адмежавана ад свецкай юрысдыкцыі.

Падрабязна прычыны і працэс скасавання шлюбу па канонах праваслаўнай царквы апісаў А. Загароўскі[27]. У праваслаўным кананічным праве падставамі для знішчэння шлюбу, акрамя смерці, з'яўляліся: пралюбадзейства, якое павінна было быць засведчана духоўным судом (аднак ненатуральныя сувязі не з'яўляліся падставай для скасавання шлюба), бігамія (двухшлюбнасць), няздольнасць да сужэнскага жыцця, якая існавала да шлюбу, а не набытая імпатэнцыя; прысуд да катаржнай працы; нежаданне сужэнца-нехрысціяніна жыць з хрысціянінам; пераход у манаства абодвух сужэнцаў. М. Суораў, разглядаючы правілы скасавання шлюбу, звярнуў увагу на розніцу, якая існавала, як у падставах для разводу, так і ў формах скасавання шлюбных адносін у розных канфесіях. У рымска-каталіцкай царкве, напрыклад, шлюбны саюз мог спыніцца толькі са смерцю аднаго альбо абодвух сужэнцаў. Пралюбадзейства, зланамернае пакіданне, апастазія (як адступленне ад дагматаў і пераход у іншае веравызнанне), замах на жыццё сужэнца, заразная хвароба (маецца на ўвазе венерычныя захворванні. – *Аўт.*) маглі быць толькі падставай да сепарацыі (фактычнага разлучэння сужэнцаў) без скасавання самаго шлюбу[28].

У адрозненне ад католікаў пратэстанты мелі нашмат больш падстаў для фактычнага разводу (калі шлюб цалкам скасоўваўся). Гэта – парушэнне сужэнскай вернасці, зланамернае пакіданне сужэнца, адсутнасць больш за 5 год, агіда або няздольнасць да сужэнскага жыцця, невылечная заразная хвароба, вар'яцтва, разбэшчанае жыццё, жорсткае або небяспечнае для жыцця абыходжанне, даказаны намер пазбавіць сужэнца годнасці, цяжкія злачынствы.

Нягледзячы на розніцу ў падставах для скасавання шлюбу ў розных канфесіях, агульным было тое, што скасаванне шлюбу залежала не ад асабістага жадання аднаго з сужэнцаў і нават не ад іх узаемнай згоды, а выключна ад рашэння духоўнага суда сваёй канфесіі.

Свецкія правазнаўцы ў сваім аналізе засяроджваліся ў асноўным на саміх падставах скасавання шлюбу. Так, К. Пабеданосцаў звярнуўся да праблемы пралюбадзейства, якое лічылася злачынствам супраць шлюбу як у свецкім, так і ў кананічным праве. З-за гэтага іскі аб пралюбадзействе маглі падавацца або ў крымінальны, або ў духоўны суд. Але правазнаўца адзначыў, што звярнуцца можна было толькі ў адну інстанцыю, бо «немагчыма дапусціць падвоенае пакаранне ў двух судах за адно і тое ж злачынства»[29]. Нягледзячы на тое, што пралюбадзейства лічылася злачынствам, яно, таксама

як і полавая няздольнасць, судовы прысуд і пазбаўленне ўсіх правоў стану, аўтаматычна не рабілася падставай для разводу, а залежала ад жадання невінаватага сужэнца[30].

Калі ўмовы заключэння шлюбу ў расійскім заканадаўстве дакладна рэгламентаваліся, то абавязкі сужэнцаў у сямейным саюзе былі пазначаны вельмі лаканічна. С. Пахман тлумачыў гэта тым, што ў парадку заключэння і скасавання шлюбу існавалі розныя правілы, у той час як правы і абавязкі сужэнцаў у сям'і былі аднолькавымі для прадстаўнікоў усіх канфесій[31]. Фактычна яны былі змешчаны ў двух артыкулах Звода законаў, якія і былі прадметам аналізу правазнаўцаў. Артыкул 106 вызначаў абавязкі мужа наступным чынам: «Муж абавязаны любіць сваю жонку як сваё ўласнае цела, жыць з ёй у згодзе, паважаць, абараняць, прабачаць яе недахопы і палягчаць яе немачы. Ён абавязаны забяспечваць жонцы пражытак і ўтрыманне ў адпаведнасці са сваім станам і магчымасцямі». Абавязкі жонкі былі змешчаны ў артыкуле 107, паводле якога: «Жонка абавязана павінавацца свайму мужу як галаве сям'і. Знаходзіцца да яго ў любові, павазе і ў неабмежаванай паслухмянасці, быць прывязанай і ва ўсім дагаджаць як гаспадыня дома».

Змест гэтых артыкулаў, як адзначалі правазнаўцы, даваў падставы для шырокага тлумачэння правоў і абавязкаў сужэнцаў, таму найперш паўстала пытанне пра размеркаванне ўлады ў сям'і. На думку К. Пабеданосцава: «Раўнавага асабістых адносін ва ўсякім натуральным саюзе дасягаецца адзінай уладай, якую закон замацоўвае за той асобай, якой яна належыць па прыродзе. У сям'і гэтая ўлада і па прыродзе, і па закону належыць мужу, у выніку ўлада мужа набывае якасць безумоўнай улады». Аўтар не адмаўляў, што ўлада мужа ў прыватных выпадках можа быць цяжкай для жонкі, але яна магла вызваліцца з-пад яе толькі з разбурэннем шлюбнага саюзу. На думку К. Пабеданосцава, змягчэнне ўлады мужчыны залежала не столькі ад закона, колькі ад змягчэння грамадскіх нораваў[32]. Правазнаўца таксама адзначаў, што, абараняючы ўладу мужа, у астатнім дзяржава прытрымлівалася палітыкі неўмяшальніцтва ў сямейныя адносіны, бо ў адваротным выпадку «было б патрэбна паставіць каля кожнага сямейнага ачага асобны трыбунал і варту»[33].

І. Аршанскі не спасылаўся на «натуральнасць» улады мужа, а хутчэй схіляўся да таго, што ўлада давалася яму заканадаўствам, і ў выпадках нязгоды адносна агульных сямейных спраў воля мужа пераважала над воляю жонкі. Ён бачыў замацаванне

ўлады за мужам і ў тым, што ён без спецыяльнага ўпаўнаважання з боку жонкі мог прадстаўляць яе ў судзе і распачынаць пераслед за знявагу яе годнасці. На думку І. Аршанскага, гэта тлумачылася тым, што, нягледзячы на адсутнасць у расійскім заканадаўстве ідэі «вечнага непаўналецця жанчыны» і абстрактную роўнасць палоў у адносінах да маёмаснай і юрыдычнай праваздольнасці, на практыцы заканадаўцы былі вымушаны прызнаць слабасць і бездапаможнасць жанчын, іх падпарадкаванае становішча нават пасля дасягнення паўналетняга ўзросту[34].

Такім чынам, узаемныя абавязкі сужэнцаў правазнаўцамі разглядаліся праз прызму безумоўнай улады мужа над жонкай і яе бездапаможнасці і падпарадкаванасці. Абавязак «любіць», які быў прадэкларацыяваны ў двух вышэйназваных артыкулах быў пададзены неакрэслена, але, будучы не юрыдычнай нормай, а маральнай, дыскусій не выклікаў. Таксама не ўзнікала дыскусій у адносінах да абавязку ўзаемнай аднолькавай сужэнскай адданасці, якая лічылася цалкам натуральнай. Аднак, што тычылася абавязку сумеснага жыцця, то ў асяродку юрыстаў існавала некаторае рознагалоссе адносна гэтага прадмета[35].

Не абмінулі правазнаўцы ўвагай і іншы бок узаемаадносін сужэнцаў – іх правы. Зыходзячы з таго, што муж меў безумоўную ўладу над жонкай, яго правы правазнаўцамі не разглядаліся, у адрозненне ад правоў жонкі.

Правы жонкі былі дастаткова канкрэтныя. Яна мела права на імя і званне мужа, пры гэтым грамадскі статус мужа перадаваўся ёй незваротна ў тым выпадку, калі яе грамадскі статус быў ніжэйшы. У выпадку, калі яна ад нараджэння стаяла вышэй за мужа, то не губляла сваіх правоў пасля шлюбу. Жонка таксама мела права на матэрыяльнае ўтрыманне ад мужа. Аднак, на думку І. Аршанскага, закон звяртаў асноўную ўвагу на сродкі асобы, якая давала пражытак (г. зн. на сродкі мужа), а не на патрэбы жонкі[36]. Таму, паводле расійскага заканадаўства, жонка мела права патрабаваць ад мужа ўтрымання толькі ў адпаведнасці з яго маёмасным становішчам. Калі ж муж не меў дастаткова сродкаў, то «яна павінна была быць задаволеная неабходным для жыцця»[37].

Спрэчным момантам І. Аршанскі лічыў права жонкі на выхаванне дзяцей і іх падпарадкаванасць ёй. У заканадаўстве спецыяльна не агаворвалася, што дзеці павінны больш падпарадкоўвацца бацьку, чым маці[38]. Але муж меў права пасля вызначанага ўзросту забіраць дзяцей ад жонкі. Найбольшую цікавасць у правазнаўцаў выклікалі маёмасныя адносіны сужэнцаў. Характэрнай рысай

расійскага заканадаўства было тое, што шлюб ніяк не змяняў іх маёмаснае становішча. І. Аршанскі адзначаў, што ў адрозненне ад заходнееўрапейскіх заканадаўстваў, у расійскім практычна адсутнічалі акты, якія рэгламентавалі маёмасныя адносіны сужэнцаў. Такую сітуацыю ён тлумачыў не ўсведамленнем заканадаўцаў пра неабходнасць пакідаць за жанчынай поўную маёмасную свабоду, а адсутнасцю дастатковых матываў умешвацца ў вобласць адносін сужэнцаў, якія непасрэдна не закраналі дзяржаўных інтарэсаў.

Калі разглядаць сямейныя адносіны ў дачыненні да крымінальнага права, то паўставала яшчэ адна праблема – месцажыхарства жонкі і яе падсуднасць. Паводле закона, жонка павінна жыць там, дзе і муж, таму яна падсудна той жа судовай акрузе. У такім выпадку паўставала пытанне: калі жонка жыве асобна, то ў якой акрузе яна павінна была быць падсудная – па месцы фактычнага пражывання або па месцы пражывання мужа[39]. К. Пабеданосцаў сцвярджаў, што «... так як муж і жонка падзелены ў маёмасных правах, то няма падстаў уісках па маёмасці прыцягваць жонку па месцы жыхарства мужа, калі яна жыве асобна, хоць бы жонка і не магла апраўдаць перад законам свайго асобнага пражывання… Калі трэцяя асоба спаганяе доўг з жонкі, якая справа суду, ці выконвае яна свае абавязкі ў адносінах да мужа і жыве з ім разам, ці не»[40]. Гэтага ж пункту гледжання прытрымліваўся і І. Аршанскі.

У сувязі з крымінальным правам існавала яшчэ адна праблема, самая хваравітая для расійскага грамадства, на якую звярнуў увагу А. Савельеў. У судовай практыцы ўсталяваўся погляд на мужа і жонку, як на нешта адзінае, як на асоб, якіх у асабістых адносінах нельга было супрацьставіць адзін аднаму. Таму, кіруючыся такім меркаваннем, суд не прымаў іскаў па асабістых крыўдах паміж сужэнцамі. Выключэннем з’яўляліся толькі гвалтоўныя дзеянні, небяспечныя для жыцця аднаго з сужэнцаў, альбо злачынствы супраць шлюбу. У выніку, сужэнец, зневажаўшы другога словам або дзеяннем, але без фізічнага гвалту, не падвяргаўся пакаранню. Таксама правазнаўца заўважыў, што у час следства і судовых працэсаў улада ставілася больш лагодна да прадстаўнікоў праваслаўнага веравызнання. Ён адзначыў, што ў праваслаўных назіралася даволі шмат злачынстваў супраць шлюбнага саюзу, але разам з тым па злачынствах такога рода выносілася безліч апраўдальных прыгавораў[41]. Праўда, А. Савельеў абмінуў увагай прадстаўнікоў евангелісцкай царквы, якія мелі права распачынаць шлюбнаразводныя працэсы пры жорсткім і зняважлівым стаўленні другога сужэнца.

Разглядаючы правы і абавязкі жонкі, правазнаўцы наблізіліся да таго, каб паспрабаваць паставіць праблему жаночай праваздольнасці. На думку М. Уладзімірскага-Буданава, істотнай рысай расійскага права ў яго гістарычным развіцці з'яўлялася «магчымае набліжэнне да прызнання роўнай праваздольнасці за мужчынам і жанчынай». Але ён заўважаў, што становішча жанчыны як дачкі і жонкі не давала абшара для дакладных назіранняў за ўплывам пола на праваздольнасць[42].

Яшчэ адна праблема, якую не маглі абысці ўвагай правазнаўцы – гэта спадчыннае права дачок. Згодна з расійскім заканадаўствам кожная дачка пры жывых сынах (г. зн. сястра пры браце) атрымлівала з усёй родавай нерухомай маёмасці – 1/14, а з рухомай – 1/8 частку[43]. На думку І. Аршанскага, немагчыма было растлумачыць імкненне абмежаваць пераход маёмасці ў рукі членаў сям'і жаночага полу, бо палітычнае значэнне землеўладання, якое цягнула за сабой абавязак службы, знікла з расійскага права. Правазнаўца сцвярджаў, што «ідэя раўнапраўя палоў у атрыманні спадчыны дапускаецца там, дзе гэтае раўнапраўе невыгодна жанчыне, але ніколі там, дзе яно можа быць для яе выгодна» [44].

Такім чынам, праблемы развіцця шлюбнага заканадаўства ў Расійскай імперыі ў XIX ст. дастаткова актыўна даследаваліся як свецкімі, так і царкоўнымі правазнаўцамі. Практычна ўсе аўтары адзначалі не толькі пераважанне рэлігійнага элемента ў шлюбе, але і яго ўмацаванне ў XIX ст.

Варта адзначыць, што ў сваіх даследаваннях расійскія правазнаўцы практычна не ўлічвалі асаблівасці некаторых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Такім чынам, заходнія губерні не падпадалі пад асобны аналіз, пры тым, што на гэтай тэрыторыі, дзякуючы полінацыянальнаму і поліканфесійнаму складу насельніцтва, нормы шлюбнага права былі больш стракатымі, чым ва ўласна расійскіх губернях. У выніку па-за ўвагай расійскіх даследчыкаў засталася праблема заключэння шлюбаў паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Таксама не былі разгледжаны наступствы адмены норм Статута ВКЛ у адносінах да жанчын, якія значна згубілі ў сваіх спадчынных і маёмасных правах.

---

[1] Горчаков М. О тайне супружества. Происхождение, историко-юридическое значение и каноническое достоинство 50-й (по спискам патриархов Иосифа и Никона 51-й) главы напечатанной Кормчей книги. СПб., 1880. С. 425.

[2] Пахман С. В. История кодификации гражданского права: В 2 т. СПб., 1876. Т. 2. С. 426.

[3] Нольде А. Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском (Вып. I. Попытка кодификации литовско-польского права). СПб., 1906. С. 151, 219.

[4] Цыт. па: Нольде А. Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском... С. 226.

[5] Нольде А. Э. Назв. твор. С. 226.

[6] Там жа. С. 226.

[7] Победоносцев К. К курсу гражданского права. Вторая часть. Права семейные, наследственные и завещательные. СПб., 1875. С. 10.

[8] Победоносцев К. Назв. твор. С. 2.

[9] Там жа. С. 17–18.

[10] Там жа. С. 3, 5.

[11] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву семейному и наследственному. СПб., 1877. С. 4.

[12] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву обычному и брачному. СПб., 1879. С. 260.

[13] Там жа. С. 263.

[14] Там жа. С. 266.

[15] Там жа. С. 261.

[16] Горчаков М. Назв. твор. С. 304.

[17] Суворов Н. С. Учебник церковного права. М., 1902. С. 353.

[18] Там жа. С. 354

[19] Там жа. С. 355.

[20] Там жа.

[21] Там жа.

[22] Победоносцев К. Назв. твор. С. 19, 23.

[23] Победоносцев К. Назв. твор. С. 25.

[24] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву обычному и брачному. С. 264; Суворов Н. С. Назв. твор. С. 356.

[25] Суворов Н. С. Назв. твор. С. 356.

[26] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву обычному и брачному. С. 384.

[27] Загоровский А. О разводе по русскому праву. Харьков, 1884.

[28] Суворов Н. С. Назв. твор. С. 388–392.

[29] Победоносцев К. Назв. твор. С. 93–94.

[30] Там жа. С. 91–92.

[31] Пахман С. В. Назв. твор. С. 30–31.

[32] Победоносцев К. Назв. твор. С. 99.

[33] Там жа. С. 108.

[34] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву семейному и наследственному. С. 71, 73–74.

[35] Савельев Ал. Юридические отношения между супругами, по законам и обычаям великорусского народа. Нижний Новгород, Думина, 1881. С. 56.

[36] Оршанский И. Г. Исследования по русскому праву семейному и наследственному. С. 75, 82.

[37] Оршанский И. Г. Исследования по русскому праву семейному и наследственному. С. 83.

[38] Там жа. С. 95.

[39] Там жа. С. 12.

[40] Цыт. па: Оршанский И. Г. Исследования по русскому праву семейному и наследственному. С. 13–14.

[41] Савельев Ал. Назв. твор. С. 90.

[42] Владимирский-Буданов М. Ф. Обзор истории русского права по лекциям. Вып. II: История русского уголовного права и процесса. Киев, 1886. С. 61–62, 177.

[43] Свод Законов гражданских Российской империи. СПб., 1857. Т. 10. Ч. 1. Законы гражданские. Ст. 1130.

[44] Оршанский И. Г. Исследование по русскому праву семейному и наследственному. С. 355, 367.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

У апошнія дзесяцігоддзі ў айчыннай гістарыяграфіі з'явілася імкненне да пераасэнсавання навуковага і сацыяльнага-ідэалагічнага статуса гістарычнай навукі. Імкненне гэтае спалучаецца з агульным ростам цікавасці да сучасных сацыялагічных, філасофскіх, тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, спробамі выкарастання іх для гістарычнага аналізу. З улікам гэтага галоўнай мэтай дадзенага даследавання ставілася не падрабязнае гістарыяграфічнае апісанне ўсяго корпуса прац па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., а аналіз тэарэтычных падыходаў да вывучэння ключавых праблем гісторыі. У якасці такіх вузлавых праблем былі абраны праблемы: тэрыторыя і насельніцтва; нацыянальная і саслоўная палітыка царскага ўрада ў Беларусі (1772–1860 гг.); ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі; рынак Беларусі; гістарыяграфічныя і метадалагічныя праблемы вывучэння грамадскіх рухаў Беларусі ў XIX ст.; гісторыя жанчын (канец XVIII – першая палова XIX ст.); беларуская культура ў кантэксце развіцця славянскіх культур; некаторыя праблемы канфесійнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. і стан сучаснай айчыннай гістарыяграфіі па канфесійнай гісторыі ў цэлым; беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст.

Атрыманыя вынікі далі магчымасць высветліць наяўнасць шматлікіх падыходаў і меркаванняў па тых ці іншых праблемах, розных канцэптуальных ацэнак падзей гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., а таксама выявіць тыя праблемы, што патрабуюць далейшага навуковага вывучэння. Вузлавымі праблемамі сучаснай айчыннай гістарыяграфіі па вывучэнні грамадскіх рухаў вызначаны класіфікацыя, перыядызацыя, аналіз прычын і эфектыўнасці грамадскіх рухаў. Аналіз перыядызацый гісторыі грамадскіх рухаў паказаў, што яны ажжыццяўляюцца, у большасці выпадкаў, як «маральны» наратыў у рамках фармацыйных падыходаў. Аднак менавіта пераход да структурнага наратыву і распрацоўка метадалагічных аспектаў

перыядызацыі гістарычных працэсаў могуць стаць новым стымулам у стварэнні і верыфікацыі эмпірычна і тэарэтычна вывераных інстытуцыянальных перыядызацый гісторый грамадскіх рухаў Беларусі, на базе якіх характар працяглых гістарычных працэсаў робіцца больш заметным, а дзяленне на «перыяды» менш ацэначным.

У айчыннай гістарыяграфіі пры аналізе прычын узнікнення грамадскіх рухаў спалучаюцца падыходы класічнага гістарызму і вылучэнне структурных, перш за ўсё эканамічных фактараў. Культурна-ідэалагічныя фактары часта разглядаюцца як эпіфенамены глыбінных сацыяльных і эканамічных працэсаў. Пытанне аб індывідуальнай матывацыі таксама застаецца без адказу ці, у лепшым выпадку, даецца ў рамках тэорыі рацыянальнага выбару і класавых канфліктаў. Неабходным элементам пры даследаванні прычын фарміравання і актывізацыі грамадскіх рухаў павінна стаць удакладненне сувязей (пераходных ступенек) паміж глабальнымі эканамічнымі, дэмаграфічнымі, культурнымі і сацыяльнымі зменамі і непасрэднымі «перадумовамі» канкрэтных гістарычных рухаў.

Гістарыяграфічны аналіз па гісторыі жанчын (канец XVIII – першая палова XIX ст.) дазволіў высветліць, што на постсавецкай прасторы ў адрозненне ад заходніх краін адсутнічае ўплывовы фемінісцкі рух, які мог бы даць дадатковы імпульс для развіцця гэтага навуковага напрамку. У той жа час постсавецкія даследчыкі атрымалі значную тэарэтычную базу як у сферы гісторыі жанчын, так і ў сферы гендэрнай гісторыі. На дадзены момант асноўныя дыскусіі вядуцца адносна інстытуалізацыі дадзеных дысцыплін, а таксама адносна тэарэтычных аспектаў.

Аналіз працэсу станаўлення гісторыі жанчын у Беларусі выявіў яе адставанне, да прычын якога можна аднесці асаблівасці, што звязаны з гістарычным развіццём Беларусі ў XIX–XX стст., а таксама мэты, якія паўсталі перад беларускімі гісторыкамі пасля атрымання краінай суверэнітэту. Айчынная гістарыяграфія да гэтага часу не ўтрымлівае грунтоўных прац па гісторыі жанчын XIX ст. Жаночая праблематыка ў асноўным праходзіць фрагментарна, у кантэксце даследаванняў іншых сацыяльных і культурных з'яў. Прычым аўтары гэтых матэрыялаў падаюць жанчын як пасіўны аб'ект, на які накіраваны высілкі грамадства і дзяржавы або як ілюстратыўны матэрыял.

Аналізуючы літаратуру, прысвечаную распрацоўцы і ажыццяўленню палітыкі царскага ўрада ў Беларусі ў 1772–1860 гг., можна вылучыць тры перыяды яе станаўлення:

1795–1917 гг. – у гэты час ішло даволі інтэнсіўнае вывучэнне падзелаў Рэчы Паспалітай у расійскай, польскай, французскай, англійскай і нямецкай гістарыяграфіях;

1918–1990 гг. – вывучаліся толькі некаторыя аспекты праблемы, ды і то галоўным чынам за межамі СССР. Савецкая, у тым ліку і беларуская гістарыяграфія, абмяжоўвалася ўключэннем асобных аспектаў у калектыўныя працы, абапіраючыся ў большасці сваёй на дарэвалюцыйную гістарыяграфію;

1991–2005 гг. – зварот да актыўнага вывучэння ўсяго комплексу праблем. Разам з працягам выхаду работ, характэрнай рысай якіх з'яўляецца апісальнасць, айчынная гістарыяграфія пачынае ўсё больш звяртацца да тэарэтычнага абгрунтавання праблемы. Найбольш спрэчным пытаннем нашага часу застаецца пытанне аб паланізацыі і русіфікацыі культуры Беларусі. Сучасныя беларускія гісторыкі, імкнучыся да кардынальнага пераасэнсавання савецкай гістарыяграфіі, у якой уплыў рускай культуры падаваўся аднабакова – толькі як станоўчы фактар – беспадстаўна сцвярджаюць, што, дзякуючы палітыцы Мікалая I, пачалася жорсткая русіфікацыя, якая на ўсіх этапах з'яўлялася тормазам развіцця беларускай нацыянальнай культуры.

Праведзены аналіз гісторыка-эканамічных прац дазволіў высветліць, што большасць з іх, нягледзячы на відавочны ідэалагічны адбітак часу, падкрэсліваюць адметнасці беларускіх эканамічных рэалій. У працах дасавецкіх гісторыкаў, эканамістаў, статыстыкаў нарадзілася канцэпцыя разгляду Беларусі, як поля барацьбы паміж расійскім і польскім капіталамі. З некаторымі інтэрпрэтацыямі гэтае палажэнне перайшло і ў савецкую гістарыяграфію. На працягу XX ст. панаваў тэзіс аб каланіяльным становішчы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. І толькі ў апошняе дзесяцігоддзе з'явіліся абгрунтаваныя доказы эканамічнай самадастатковасці Беларусі.

Пры разглядзе прамысловасці Беларусі найбольш складаным месцам з'яўляюцца крытэрыі яе ацэнкі. Агульнарасійскія меркі не вельмі стасуюцца з эканамічнымі рэаліямі Беларусі. Асаблівасці развіцця беларускай прамысловасці, адсутнасць у ёй некаторых галін, сведчаць не пра яе адсталасць, а пра натуральныя эканамічныя працэсы, якія ў ёй працякалі і якія садзейнічалі росквіту эканамічна абаснаваных напрамкаў прамысловага развіцця.

У аграрным сектары эканомікі Беларусі намаганні сялянскіх і абшарніцкіх гаспадарак разглядаюцца часцей за ўсё паасобку. Гэта яўны адбітак шматгадовага панавання ідэалагічных, класавых падыходаў аўтараў. Між тым на аграрным рынку абодва тыпы сель-

скагаспадарчых вытворчых адзінак не толькі спаборнічалі, але і ўзаемадзейнічалі паміж сабой, паступова займаючы на ім асабістыя эканамічныя нішы. Дыскусійным застаецца пытанне аб глыбіні пранікнення капіталістычных адносін у сельскую гаспадарку Беларусі.

Што тычыцца навуковай традыцыі вывучэння ролі канфесій у нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі, то яна толькі пачынае складвацца. Можна сцвярджаць, што на сённяшні дзень існуе пасутнасці агульнапрызнаная перыядызацыя (разыходжанні, праўда, ёсць, але галоўным чынам у ацэначных палажэннях пры характарыстыцы таго, ці іншага этапа). Першы этап (з канца XVIII ст. да пачатку 60-х гг. XIX ст.) можна ахарактарызаваць як самы супярэчлівы (маецца на ўвазе як сама канфесійная гісторыя перыяду, так і ацэнка гістарыяграфічнай спадчыны XIX ст.). Другі этап (60-я гг. XIX ст. – 20-я гг. XX ст.) з'яўляецца найбольш плённым у распрацоўцы беларускай рэлігійнай праблематыкі з боку расійскай гістарыяграфіі. Яе пастулаты аб тым, што Беларусь, знаходзячыся на міждарожжы Усходу і Захаду, паміж дзвюма моцнымі дзяржавамі, культурамі і рэлігіямі, не ў стане выпрацаваць нешта сваё, самастойна заявіць аб сабе, а толькі можа схіліцца да Расіі або да Польшчы, настолькі трывала ўвайшлі не толькі ў расійскую, але і ў еўрапейскую гістарыяграфію, што і зараз амаль цалкам дамінуюць у ёй. Разам з тым менавіта гэтаму перыяду мы павінны быць удзячны за нараджэнне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, якую веравызнаўчая праблема цікавіла найперш з пазіцыі нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. Прадстаўнікі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі (М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, А. Цвікевіч), імкнучыся трактаваць канфесійную гісторыю Беларусі, як працэс адасоблены ад аналагічных працэсаў у Расіі і Польшчы, адмаўляліся ад здабыткаў папярэднікаў, спрабавалі рэвалюцыйна перагледзець тэарэтычныя падыходы да асэнсавання мінулых працэсаў. Што і выклікала супярэчлівасць і непаслядоўнасць іх уласных поглядаў. Тым не менш, гісторыкі нацыянальнай арыентацыі здзейснілі пералом у поглядах на ролю асноўных хрысціянскіх плыняў у лёсе беларускага народу і менавіта ў гэтым заключаецца іх унёсак у айчынную гістарыяграфію.

Наступны этап – 30–80-я гг. XX ст. – перыяд застою ў вывучэнні канфесійнай гісторыі Беларусі. Рубеж 1980–1990-х гг. становіцца часам зараджэння і станаўлення сучаснай школы гістарычных даследаванняў па канфесійнай гісторыі Беларусі. І калі для расійскай гістарыяграфіі ў дачыненні да літоўска-беларускіх

тэрыторый характэрнай рысай застаецца уплыў ранейшых агульнапрынятых палажэнняў, то для беларускай – усплеск розных думак і меркаванняў. Крытычны падыход да ацэнкі мінулых падзей бясспрэчна зацвердзіўся ў беларускай гістарыяграфіі па канфесійнай праблематыцы.

Гістарыяграфічны аналіз моўнай праблемы ў каталіцкім касцёле Беларусі ў 60-я гады XIX – пачатку XX ст. сведчыць аб даволі высокай навуковай цікавасці да яе як з боку айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. Але адзначаючы выпрацоўку на сучасны момант агульнапрынятых пунктаў погляду на розныя аспекты праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі, вызначана і наяўнасць некаторых момантаў, што «не ўпісваюцца» ў гэтыя рамкі. Прычына гэтага бачыцца ў адсутнасці грунтоўнай прапрацоўкі асобных аспектаў праблемы на першым этапе распрацоўкі (этапе выяўлення і збора эмпірычнага матэрыялу) і знаходжанні гэтых аўтараў пад відавочным уплывам расійскай гістарыяграфіі. Што тычыцца непасрэдна сучаснай расійскай гістарыяграфіі, то ў большасці сваёй яна застаецца на пазіцыях захавання «адзінай і непадзельнай Расіі», апраўдання імперскіх метадаў кіравання шматлікімі нацыямі і народнасцямі, што ўваходзілі ў склад еўрапейска-азіяцкай імперыі Раманавых.

Даволі актуальнай у цяперашні час з'яўляецца праблема развіцця беларускага нацыянальнага руху ў пачатку XX ст. Даследаванне гэтай праблемы дазволіла зрабіць навукова абгрунтаваную выснову, што гістарычныя парадыгмы «заходнерусаў» і «нашаніўцаў» былі вельмі падобнымі, большай часткай узятыя з расійскай гістарыяграфіі, асабліва гэта тычыцца перыяду ВКЛ. І першыя, і другія абвяшчалі, што беларусы мелі сваю эліту ў старажытнасці, але яна спаланізавалася і напачатку XX ст. беларусы апынуліся без эліты. Розніца была ў тым, што «нашаніўцы» мову і культуру ВКЛ называлі беларускай, а «заходнерусы» – рускай. Такім чынам і «нашаніўцы», і «заходнерусы» прапаноўвалі сябе на ролю эліты краю, хоць апошнія не лічылі Беларусь самадастатковай нацыяй, а разглядалі яе ў расійскім кантэксце.

Сучасная айчынная гістарыяграфія звярнула ўвагу і на такі цікавы момант: у ёй адзначаецца, што кіраўнікі «Нашай нівы» мелі шмат агульнага, у ідэйным плане, з поглядамі О. Баўэра на нацыянальнае пытанне і на нацыю як такую. Хоць гэтую сувязь яшчэ трэба дэталёва даследаваць, каб адказаць на пытанне, якім чынам і наколькі глыбока браты Луцкевічы маглі пазнаёміцца з яго ідэямі. Ідэя Баўэра, што сацыялізм сярод іншага азначае і росквіт на-

цыянальнага жыцця, патэнцыйна была вельмі карысная для нашаніўцаў, у тым сэнсе, што давала ім пэўныя светапоглядныя асновы для нацыянальнай працы. Наколькі яны былі адэкватнымі – гэта асобнае пытанне. Устаноўлена таксама, што пры перанясенні на беларускую глебу ідэі сацыялізму спрычыніліся (як на тэарэтычным, так і на практычным узроўні) да ўтварэння стэрэатыпу «сялянскасці» беларусаў, як іх нацыянальнай рысы, а таксама да таго, што практычна ўвесь беларускі рух пайшоў у рэчышчы левай ідэалогіі.

ЗМЕСТ

Уступ *(Яноўская В. В.)* 3

Раздзел 1. **Тэрыторыя і насельніцтва Беларусі ў ацэнках гістарыяграфіі** 5
1.1. Тэрытарыяльная палітыка ўрада Расійскай імперыі *(Філатава А. М.)* 5
1.2. Колькасць і склад насельніцтва як прадмет гістарычнага даследавання *(Насытка Я. П.)* 20
1.3. Дэмаграфічныя працэсы *(Насытка Я. П.)* 36
1.4. Міграцыі *(Насытка Я. П.)* 47

Раздзел 2. **Саслоўная і нацыянальная палітыка царскага ўрада ў Беларусі: напрамкі і перспектывы вывучэння. Беларускі нацыянальны рух** 66
2.1. Саслоўная палітыка *(Філатава А. М.)* 66
2.2. Нацыянальная палітыка *(Філатава А. М.)* 78
2.3. Беларускі нацыянальны рух: асноўныя напрамкі развіцця 87

Раздзел 3. **Ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі: навуковая спадчына** 108
3.1. Вайна 1812 г. і Беларусь *(Ерашэвіч А. У.)* 108
3.2. Палітыка царскага ўрада ў час паўстання 1830–1831 гг. Эміграцыя з беларускіх зямель *(Філатава А. М., Матвейчык Д. Ч.)* 130
3.3. Духавенства і паўстанне 1863–1864 гг. *(Яноўская В. В.)* ... 150
3.4. Беларусь у Першай сусветнай вайне (*Рудовіч С. С.)* 164

Раздзел 4. **Рынак Беларусі: асвятленне праблемы ў працах эканамістаў і гісторыкаў** *(Кіштымаў А. Л.)* 193
4.1. Інстытуцыялізацыя праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі 193
4.2. Асноўныя этапы развіцця і галіновая характарыстыка народнай гаспадаркі Беларусі 200
4.3. Рынак працы і сацыяльна-эканамічная арыентацыя народаў Беларусі 214

Раздзел 5. **Гістарыяграфічныя і метадалагічныя праблемы вывучэння грамадскіх рухаў на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.** *(Сакалова М. А.)* 228
5.1. Гістарыяграфічны і агульнатэарэтычны кантэкст вывучэння грамадскіх рухаў 229
5.2. Грамадскі рух як аб'ект гістарычнага даследавання 240
5.3. Класіфікацыя грамадскіх рухаў 255
5.4. Перыядызацыя гісторыі грамадскіх рухаў 271
5.5. Аналіз прычын і ацэнка эфектыўнасці грамадскіх рухаў .. 288

Раздзел 6. **Культура Беларусі як гістарыяграфічная праблема**. 304
6.1. Палітыка царскага ўрада ў галіне культуры *(Філатава А. М.)* 304
6.2. Беларуская культура ў славянскай гістарыяграфіі XIX – пачатку XX ст.: метадалагічныя падыходы да вывучэння праблемы *(Філякоў У. Г.)* 314
6.3. Беларуская культура ў люстэрку рускага і ўкраінскага друку XIX – пачатку XX ст. *(Філякоў У. Г.)* 329

Раздзел 7. **Некаторыя праблемы канфесійнай гісторыі Беларусі** 341
7.1. Канфесійная палітыка на беларускіх землях пасля далучэння да Расійскай імперыі *(Філатава А. М.)* 341
7.2. Моўнае пытанне ў рымска-каталіцкім касцёле Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) *(Яноўская В. В.)* 354
7.3. Змены ў стане канфесій на пачатку XX ст. *(Яноўская В. В.)* 370
7.4. Канфесіі ў Беларусі: стан і праблемы сучаснай айчыннай гістарыяграфіі *(Яноўская В. В.)* 381

Раздзел 8. **Гісторыя жанчын як гістарыяграфічная праблема** *(Анофранка Н. В.)* 404
8.1. Праблема інстытуцыялізацыі гісторыі жанчын у постсавецкай і беларускай гістарыяграфіях 404
8.2. «Жаночае пытанне» ў расійскай, польскай і айчыннай гістарыяграфіях 417
8.3. Шлюбнае заканадаўства Расійскай імперыі і яго дзеянне на тэрыторыі Беларусі 427

Заключэнне *(Яноўская В. В.)* 440

Навуковае выданне

Анофранка Наталля Васільеўна
Ерашэвіч Аляксандр Уладзіміравіч
Кіштымаў Андрэй Леанідавіч і інш.

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы

Рэдактар *Т. П. Пятровіч*
Мастацкі рэдактар *В. А. Жахавец*
Тэхнічны рэдактар *Т. В. Лецьен*
Камп'ютэрная вёрстка *Л. В. Харытонава*

Падпісана ў друк 27.10.2006 г. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Рызаграфія. Ум. друк. арк. 23,52. Ум. фарб. адб. 23,94. Ул.-выд. арк. 21,0. Тыраж 150 экз. Заказ 317.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». ЛИ 02330/0131569 ад 11.05.2005 г. 220141, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 40.

Надрукавана ў РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука».